Алесь Савіцкі

# ПАМЕРЦІ ЗАЎСЁДЫ ПАСПЕЕШ



АЛЕСЬ САВІЦКІ

# ПАМЕРЦІ ЗАЎСЁДЫ ПАСПЕЕШ

РАМАН

МІНСК
«МАСТАЦКАЯ ЛІТАРАТУРА»
1983

Бел 2
С 13

РЭЦЭНЗЕНТ УЛАДЗІМІР ЛАРЧАНКА

С $\frac{4702120200-097}{М 302(05)-83}$ 25—83

© Выдавецтва «Мастацкая літаратура», 1983.

## 1

Жоўтая віхлястая маланка бліснула за адчыненым акном, покпуў недзе зусім блізка, за хлеўчуком, прыглушаны стрэл ракетніцы, і Марыля прамовіла, уздыхнуўшы:

— Каб ім і на тым свеце гэтак свяціла. Зноў пачалі...

— Ч-чорт.— Артур адхіснуўся ад акна, стаў пасярод пакоя.— Няўжо нашых заўважылі?

— Не. Патрулям свецяць. Як патрулі выходзяць з гарнізона, дык адразу і кінуць.

— Дарэмна, мабыць, адчыніў акно.

— Ды не відно ж з насыпу...

Марыля, аднак, зачыніла акно, і святло ракеты як бы адсунулася, прыгасла. Бялявае, як з-за туману, яно злівалася з водсветам далёкага пажару за лесам, і дзверы з пакоя ў сенцы выдавалі дрогкія, яны як бы ціха вагаліся, пагойдваліся і ўвесь час як бы пакручваліся, соўгаліся на падлозе рагатыя, нейкія дужа тоўстыя цені ад альясу і герані, што стаялі ў вазончыках на падаконніку. Артур апынуўся як бы ў самым цэнтры гэтай дзіўнай пакручастай і звілістай мярэжкі, і Марылі здалося, што з-пад шырокіх масніцын лезуць праз шчыліны чорныя гадзюкі, звіваюцца вакол сынавых ног і ён не можа скрануцца з месца. Белае святло цяпер сутаргава зыбалася і трымцела за акном, і сынаў твар здаваўся дзіўна зжоўклы, як змярцвелы. Марыля кінулася да сына, прыгарнула да сябе, нібыта бараніла ад бяды, трымала моцна, углядаючыся ў вочы, потым абмацала плечы, галаву.

— Чаго ты мяне абмацваеш? — ён паспрабаваў вызваліцца з матчыных абдымкаў.

— Штораз, сыночак, ты нейкі быццам чужы, калі зірну. А як памацаю, дык і супакойваюся,— сказала яна, і голас яе адразу паспакайнеў.— Лоб шыро-окапькі, як у таткі нашага, бровачкі быццам з дзеразы звітыя, носік роўненькі... І плечы — Пахомкавы: крутыя, моцныя. І штораз як вышэйшы робішся. Вось, ужо на галаву вышэйшы супраць мяне —

бацьку дагнаў. І вочы як паболынталі. І чорнымі выдаюць. А яны ж у цябе бацькавы — сінька.

Расчулены, ён зняў матчыны далоні з пляча, прыціснуў іх да сваіх грудзей:

— І ў цябе яны цёмныя зараз. Ракета свеціць — з таго гэта. О-о, ты ўся дрыжыш, як ад холаду!

— Штоночы ж вось гэтак калоцішся.

Яна зноў прыціснулася да яго, быццам і сама баранілася ад бяды, і ён зноў адчуў пад сваімі далонямі схуднелыя, як высахлыя зусім, матчыны плечы і бачыў яе не такой, як яна была зараз,— уявіў сабе маці на ганку роднай хаты, дзе яна заўжды чакала яго са школы. Помніліся зараз толькі сонечныя дні, калі маці стаяла на ганку радасная, прыгожа апранутая — нібыта заўжды, калі ён бег са школы дамоў, свяціла сонца.

— Ой, матулька мая, матуля,— Артур быў збянтэжаны нечаканым матчыным парываннем.— Колькі ж табе тут жахаў даводзіцца перажываць! — Парывіста абняў маці за плечы, пацалаваў.— І ўдзень і ўночы — бяда побач. Вось яна, свеціцца... А мяне слухаць не хочаш. Колькі я прасіў, даводзіў...

— Каб туды, да вас,— Марыля хітнула галавой у бок акна.— А што там? Меней жахаў? Меней кулі тамака ў вас свішчуць?

— Ха! Ды там — зона партызанская — пад самыя Ушачы і далей, пад Лепель. Дзесяткі кіламетраў — мірнае жыццё. Людзі спакойна жывуць і працуюць.

Марыля прытоена ўздыхнула:

— На станцыі людзі баялі, што Ушачу яны бомбамі ўсю выпалілі.

— Лухта!

— А ля Дзвіны? Ты ж сам казаў, што ўсе пайшлі з трохкутніка, што выперлі яны вас з полацкага бору начыста...

— Лухта! Звычайны партызанскі манеўр! Быў бор наш. І цяпер ён наш!

Сухасць у сынавым голасе не пакрыўдзіла, болей здзівіла Марылю. Ніколі ж раней гэткай цвёрдасці ў голасе не было. А тут і рэзкасць, і загаднасць нейкая камандзірская, і ўпэўненасць... А з чаго дзівіцца? Мужчына ён, Артур! І — камандзір!.. Нібыта дзесяць гадоў пранеслася, як дзень, пранеслася, з таго часу, як яны ехалі цягніком на Гродна і Артур, бы горкае хлапчанё, збіраў асколкі ад бомбы, збіраў, быццам знайшоў забаўку нейкую, і яна, Марыля, сварылася, загадвала, каб і на крок ад яе, маці, не адыходзіў... А цяпер — мужчына. Мужчынская сталасць, як тады ў Гнацюка, у го-

ласе, у абліччы, у кожным руху. Нават Гнацюк яго з павагаю слухае — той самы Гнацюк, які тады, у вагоне, з ім, Артурам, як з маленькім, у шашкі гуляў. А цяпер Артур сказаў, каб Гнацюк коней падводзіў бліжэй да чыгункі, і той адразу пагадзіўся, не запярэчыў, пайшоў з хаты... Во каб Пахом зірнуў на Артура зараз! Ды каб шчэ — Марат пабач. Захар казаў, што Марат — на знішчальніку ваюе. I ўжо — лейтэнант. Ажно не верыцца. Каб жа толькі і далей сынкам шчасціла, і Марацiку і Арціку... Гэта добра, што Артур побач з Гнацюком — са шчаслівым чалавекам калі ідзеш, бяда не зачэпіць. А ў хахла гэтага лёс шчаслівы. Хай жа ім усім шчасціць там, за чыгункаю. Ля чыгункі, паблізу хутара, засад няма — яна, Марыля, усё добра выгледзела ўвечары. Але як ты бяду ўгледзіш, калі ўночы па незнаёмых мясцінах ідзеш? Добра, што Тося з імі пайсці адважылася. Няхай ідзе, у яе вока пільнае, слых добры, і дарогі яна тут павывучала скрозь. Трэба толькі Артура супакоіць, каб не злаваў залішне — знерваваны чалавек неасцярожлівы. I што, прынамсі, яна крыўднага сказала? На станцыі людзі рознае малолі, мелюць і не сёння скончуць: на чужы раток, як гаворыцца, не накінеш платок. А слухаць усё трэба, толькі, ведама, лухту з праўдай не блытаць...

— Лухту, сынок, я не слухаю,— прымірэнча прамовіла Марыля.— Але ж я ўся сэрцам проста збалелася, калі здымак у газеце пабачыла. Дужа там на цябе чалавек падобны. I на Дзімку. А дзяўчына, што хлеб на стол кладзе,— Рымачка, яе абліччa мне падалося. Я газету тады на яйкі выменяла. Яна ёсць, я табе яе зараз пакажу...

— Якая газета? Які здымак?

— Іхняя, ведама ж, газета. I здымак: партызаны, што здаліся ля Дзвіны, сядзяць у нямецкай сталоўцы, ядуць. Усе вясёлыя, смяюцца...

— I яна ў цябе? — глуха і з недаверам спытаў Артур.— Давай яе сюды!

— Ды вось яна, на этажэрцы ляжыць,— Марыля зашамацела газетаю, якую вобмацкам, але адразу знайшла на вузенькай, ля сцяны, этажэрцы,— і, спахапіўшыся, замітусілася: — О-ой, з гэтай газецінаю дурной вэждгаемся. Яешаньку зараз, сынок, спяку. Умомант — трэску на прыпечку запалю. На куханьцы акна няма, можна агонь паліць... Дзе ж яшчэ паясі — ноч жа табе ісці...

— Мне — яешанькай ласавацца, а хлопцам — на зямлі ляжаць? Не-е, матуля. Малако ёсць? Глытну крыху. I — усё.

— З хлебцам, сынок, з хлебцам тады...

Марыля хуценька паліла ў кубак малака, адкроіла лусту хлеба. Артур адкусваў прагна хлеб, вялікімі кавалкамі, запіваў малаком і, не прысеўшы, увесь час пазіраў у акно, прыслухоўваючыся да таго, што робіцца на падворку. Паспрабаваў прачытаць газету, сунуўшы яе да самай шыбы, пад мігатлівае святло, але тут жа засіснуў яе ў кішэню:

— Не відаць нічога. Заўтра, пры дні, мы пачытаем з хлопцамі. Парагочам уволю...— і, спытаў зусім іншым голасам, заклапочаным і строгім: — Як цяпер цягнікі? Не дужа гоняць?

Марыля стаяла побач, з гладышом у руках, таропка расказвала пра тое, як рамантавалі чыгунку, пра цягнікі, што ідуць густа ўдзень, але дужа марудна на тых месцах, дзе былі ўзарваны рэйкі, пра міны ля пераезда — іх угледзела ўчора Тося,— і Артур слухаў, час ад часу перапыняў кароткімі запытаннямі, і гэтыя запытанні былі рэзкія, у іх гучала ўсё тая ж загаднасць, што і напачатку. Марылю цяпер сынаў голас не дзівіў, яна ганарылася, што сын гэткі мужны, упэўнены, і ад яго ўпэўненасці сама рабілася спакайнейшая. Увесь час карцела папытаць, павошта яны ідуць за чыгунку, у тыя мясціны, адкуль нядаўна давялося адступіць. Але нешта ўвесь час замінала ёй, і ўрэшце яна зразумела прычыну: паўплываць, нешта змяніць яна не ў стане і няма патрэбы залішнімі пытаннямі хваляваць сына, пазаляць. Ён, ведама ж, атрымаў загад і гэты загад выконвае...

— От жа лаўкачы! Ха-ха! — і Артур засмяяўся, але ціха, як бы тоіўся ад маці.

— Ты чаго? — Марыля не зразумела сынаў гарэзны настрой.

— Ды газетка гэтая, матуля. З аднаго боку — перабілі, маўляў, усіх партызан начыста. З другога боку — запрашаюць здавацца ў палон. Не з добрай жыткі тое робіцца. Гарыць, гарыць у іх пад нагамі зямелька!

— А ты мне скажы вось, што тамака вунь гарыць? За лесам. На Вуглы, здаецца, напрамак...

— Правільна арыентуешся, матуля. Фрыцы сёння ўвечары на Вуглы навяліліся. Але наша застава ім уклеіла. Беглі, аж свяцілі пяткамі...

— А чаго ж вёска гарыць?

— Яны, гады, спецыяльна тэрміткамі па хатах лупяць. І кулямі запальваючымі. А ўзвады нашы падкацілі — папылілі без аглядкі...

— Як пачалі вы рэйкі падрываць, дык салдаты на станцыі бы звяры парабіліся.

— А што, прыгожая тады ночка была? І разумееш — на

ўсёй жа чыгунцы скрозь. Усе атрады пайшлі — узвадамі. Кожнаму атраду — сотня метраў. І ўсе рэйкі — пад качалку.

— Мы з Тосяй на падлозе ляжалі. А выбухі — быццам у палісадніку. І шыбы звіняць. А ранкам варта на чыгунку до-оў-га ўзысці баялася.

— Шчэ ім і не тое будзе, от пабачыш. Неша яны будуць ныліць на свой фатэрлянд!

Марыля слухала сына, і ёй увесь час здавалася, што ён гаворыць толькі на тое, каб заспакоіць, пасяліць у матчыным сэрцы добрую надзею, і нечакана зрабіла выснову, якая яе напалохала: там, дзе крываваць барвамі неба, не ўсё ідзе ладам. Тое, што партызаны перапраўляюцца за чыгунку вялікай групаю, з конямі, таксама ішло на пацверджанне яе здагадкі, і яна спытала, тоячы сваю ўстрывожанасць і баючыся, каб гэты яе неспакой не пашкодзіў сыну:

— Скажы, сынок, а з фронту якія весткі? Баялі людзі, што нашы наступаць узяліся пад Віцебскам. Але блага ўсё было, адступаць давялося...

Ён адказаў упэўнена, і зноў у голасе прагучала сталасць, якая здзівіла яе на пачатку гаворкі і ў якой цяпер была як бы незадаволенасць, што яго вымушаюць даваць непатрэбныя тлумачэнні:

— Разведка боем — звычайная рэч на фронце. Пад Віцебскам яна і была.

— А на Украіне як?

— І там — парадак. Кіеў сёлета будзе вызвалены — напомні маё слова. Ім жа зараз пад Курскам і Арлом да-аюць копаці — лупцуюць і ў хвост і ў грыву. Цяпер у нас — сіла. І до-обрая сіла!

— Гэта добра, што сіла ў нашых ёсць. Людзі ў гэта вераць. Захар жа хоць здаровы?

— Здаровы. І мне Рыма сказала, што дзядзька Ціхан неўзабаве вернецца з Масквы. У нас цяпер аэрадром — прыма. Першы гатунак.

Спакою не было, сынавы словы яшчэ больш яе растрывожылі, і яна, нечакана падумаўшы, што, магчыма, Ціхан нешта дазнаецца пра Пахома — з Масквы ж чалавек едзе! Там жа пра ўсё можна дазнацца! — сама спалохалася, што можа зараз напытаць пра тое Артура, таропка пацікавілася:

— А зараз жа вы куды? — і спахапілася, што не мае права на роспыты.— Калі чакаць — хоць прыблізна...

— Калі чакаць? — Артур марудзіў з адказам, піў малако маленькімі глыточкамі, рабіў толькі выгляд, што спяшаецца апаражніць шклянку.— Праз тыдзень. Мы да Дзвіны дойдзем, паглядзім, як там і што, і — назад,— і паўтарыў рашуча

і цвёрда: — Праз тыдзень нас чакай. Якраз у сераду. Знак дасі, калі ў засаду тут яны сядуць. Роўна а першай. Лямпаю мігнеш двойчы, як і раней рабіла...

— Добра, сынок, добра.

Яна ведала, адчувала, што ён не сказаў усяе праўды, і не напракала, не патрабавала ад яго нейкіх тлумачэнняў. Сынок вернецца праз тыдзень. Тады ўжо яна ў яго аб усім распытае, і ў яго не будзе патрэбы нешта ўтойваць. Ды, зрэшты, навошта ёй ведаць, што там трэба рабіць сыну ля Дзвіны? Хай толькі вернецца жывы і здаровы.

— Калі мы знак убачым — павернем лявей, на Арэхаўна,— сказаў Артур.— Гэты хутар з таго боку добра відаць.

— Чаго ж ты не ясі?

— Пад'еў слаўна, дзякую. Смачнае малако. І хлябец свежанькі. Шлычыха пякла? Яе хлеб адразу пазнаеш, ён не гэткі, як ты пячэш. Твой — з кменам і ўнутры і паверху.

— Спяку, сынок, спяку з кменам. Будзеш ісці назад — з сабою і возьмеш.

— Навошта? У нас хлеба хапае. Шлычыха зноў там, у братавай?

Яе здзівіла, што ён зноў папытаў пра гэта, але нічога не сказала, патлумачыла памяркоўна:

— Там, сынок, там. Дзетак жа глядзець трэба. Як Хведара пахавалі, дык яна болей у братавай і жыве.

— Звяры. Без зброі ж чалавек ішоў!

— Ён жа ім і рабіў — хмыз яшчэ на трыста метраў наабапал чыгункі сякуць. Большыя якія алешыны ён паабцярэбліваў — дроўцы ж. А ім, бачыш, запякло, што без дазволу: загад жа ссякаць і на месцы пакідаць.— Марыля глуха закашлялася — шархоткія колцы дзерлі, распіралі грудзі.— Раўлі, кажуць, з пасыну. А потым зладжыўся, гад, ды з карабіна — у патыліцу куля...

Марыля зноў закашлялася і, кашляючы, падумала пра тое, што ўсё гэта ўжо вядома Артуру, што не трэба перад дарогаю казаць сыну пра благое, пра смерць таго Хведара, якога сын аніколі і не бачыў.

— Застудзілася ты, матулька,— сказаў Артур заклапочана.— Дзе ж собіла?

— Хмыз калі церабілі. Нешта мільганула на ўзлеску, дык варта нас усіх на зямлю паклала — як не з палову гадзіны ляжалі. А зямля з ночы ўжо і халодная. І ўгрэтыя, распараныя мы працаю былі...

— За ўсё ім адплата блізка! За ўсё!

— Яшчэ малачка, сынок, напі.

— Назад пойдзем — увесь гляк апаражню. Хадзем, самы раз ужо...

У пакоі — ракеты даўно згаслі — было цёмна, быццам знадворку адразу і ва ўсіх вокнах зачынілі аканіцы. Марыля, як малога, узяла сына за руку і гэтак вяла яго і на падворку, і на сцежцы ад хаты, цераз сад, ля старых яблынь. Нічога падазронага вакол яна не прыкмячала, але ішла асцярожна, часта сцішала хаду, прыслухоўвалася, з трывогаю азіралася на барвовую падкову над лесам. Выпадкова трапіла пад нагу сухая галіна, хруснула з кароткім слабым трэскам, Марыля спуджана прыгнулася — ля нізкага сліўніка акрэсліліся цёмныя постаці. Ад напружання, з якім углядалася, у яе імгненна забалелі вочы, у грудзях пакаціліся шархоткія колцы кашлю, і Марыля, каб суняць яго, сціснула вусны з такою сілаю, што забалелі губы і сківіцы; шархоткія колцы раставалі, стала дыхаць лягчэй.

— Коні. Нашы,— прамовіў Артур і, рэзка пацягнуўшы, вызваліў сваю руку з матчынай.

Марылю сынава рэзкасць пакрыўдзіла, але яна тут жа ўпотай і ўсміхнулася. Камандзір жа! А яна, як малога, за руку яго вядзе!

— Тосі лепей пасля ўсіх пайсці,— папрасіла Марыля пошапкам, разумеючы, што ніхто не павінен пачуць, як яна ўмешваецца ў сынавы справы.— Раптам ліха якое — пакажа людзям, куды адыходзіць. Да насыпу я вас даваду. Як пяройдзеце спакойна — тады вярнуся.

— Ды заставайся тут, матуля!

— Да насыпу пайду. Адтуль і вярнуся!

Марыля заўпарцілася — аніякія пярэчанні сына яна не паслухае. Вырашыла разам да насыпу ісці! І пойдзе! Пераканаецца, што ўсё добра,— назад паверне. А добра будзе толькі тады, калі яна, Марыля, пойдзе наперадзе. І кашаль ёй ужо не замінае, суняўся, праклятый, быццам напалохаўся. І цяпер, за сліўнікам у канцы саду, пойдуць яны не вузкай лагчынкаю, а павернуць на палосу ссечанага яшчэ вясною маладога таполевага параснiку, які няроўнымі лаўжамі горбіцца ў цемры.

Артур збочыў са сцежкі, наважыўся абмінуць маці, і параснік гучна зашамацеў пад нагамі. Марыля схапіла сына за руку:

— Ты куды? За гэтымі лаўжамі — міны. Дрот паміж імі ў папярэдзелак нацягвалі яны...

— І ты яго бачыш?

— Ноччу не заўважыш. Удзень пагледзелася...

Марыля ўпэўнена шнуравала далей. Але час ад часу азі-

ралася, таропка паглядала па баках. Нешта невядомае ўвесь час як бы замінала ёй, і яна ліхаманкава шукала гэтае «нешта», пераканаwная, што небяспеку заўважыць своечасова, абміне.

Шэрыя нізкія лаўжы скончыліся, Марыля прыпынілася, углядаючыся ў ледзь бачны чорны шнурок наперадзе.

— Насып,— яна працягнула руку, быццам абмацвала гэты далёкі яшчэ шнурок, потым абсачыла неба за спіною, уздыхнула.— Блага — зарава за плячыма. Як памацнеў пажар.

— Думаеш, нас відаць з чыгункі?

— Не, мабыць. Пакуль мы ў лагчыне — не відаць адтуль. І добра, што коні падковамі не тупацяць.

— Партызанскія коні — чыгунку ведаюць,— і спытаў, крыху счакаўшы: — Рушым? Здаецца, ціха. І на насыпе пуста.

Марыля марудзіла, чакала, падпарадкоўваючыся нейкаму невядомаму пачуццю, што прымусіла яе спыніцца. Гэта былі і асцярожлівасць, і нешта яшчэ, як трывога, і нежаданне паслаць сына наперад, застацца без яго. У сынавай гарачнасці ёй пачулася небяспека.

— Пуста? Але ж можа стацца, што будзе і густа. Варта няхай пройдзе. Недзе ж стаіліся патрулі.

— Залеглі над насыпам і пахропваюць,— пажартаваў Артур.— Ды яшчэ насвістваюць...

Марыля зазлавала. Іш, карціць усё яму паказаць сваю смеласць, вопытнасць. І можа, о-ой можа праз гэтую сваю гарачнасць наскочыць на якую-небудзь бяду.

— Расхрабрыўся занадта. Не ў меру расхрабрыўся,— цішком папракнула сына.— Трэба агледзецца, паслухаць...

Углядалася ў цемру, услухоўвалася, па-ранейшаму злавала, і сэрца ціснула згрызота. Гэтулькі дзён — месяц жа лічы! — не бачыліся. А яна што робіць? Сварыцца ўзялася. Навошта? Яна ж не павінна злаваць, не мае права сварыцца. Пнецца ён сваю смеласць паказаць? Натуральна, ведама ж. Нецярплівы, гарачы, неасцярожны? Таксама зразумець трэба. А ёй, мудрэйшай за яго, недаравальна паддавацца нецярплівасці, фатыгоўству нейкаму, трэба яго навучыць асцярожнасці, развазе, вытрымцы. Недзе ж ёсць патрулі, аб якіх ён гэтак пагардліва гаворыць. Ёсць! І, напэўна ж, не спяць пад насыпам — вывучыла Марыля іх пораў. Уночы яны з насыпу ні нагой — сваіх жа мін апасаюцца. Сустрэнуцца, разыдуцца і сойдуцца зноў толькі праз паўтары гадзіны — гэты час і трэба выкарыстаць. І нельга, нельга на чыгунку лезці, пакуль варта не пройдзе. Чортаў ветах гэты — заявіўся ж! Вечар

жа хмарны быў, а тут калі не трэба, дык і неба зусім ачысцілася...

Марыля са злосцю зірнула на неба. Хмары ляцелі імкліва, дужа грывастыя, з драпымі закрайкамі. Няяркі, з вострымі канцамі ветах быццам абсякае, кроіць хмары, і сам ад удараў аб іх гайдаецца, трымціць, і, здаецца, зараз дугнецца ў апошні раз і зваліцца долу, на гэтыя слупкі ля насыпу. Але адкуль там слупкі павырасталі? Ніякіх жа слупкоў тут, ля насыпу, няма! І за насыпам — таксама няма!

«Небачка! Гэта ж вартавыя. Патрулі сунуцца па шпалах! А гэты падніманца ўдумаў!..»

Марыля ўчапілася ў сынава плячо, прыгнула Артура да зямлі, халодным шэптам дыхнула ў твар:

— Ідуць!

— Дзе?.. Ч-чорт, сапраўды! Чацвёра толькі... Гэта не страшна. Ссячом, калі што,— і падцягнуў бліжэй аўтамат да сябе.— Змяцём з дарогі. І — наперад!

— Ці-іха. Не варушыся.

— Коні... Каб жа не заржаў каторы.

— Аўтамат закрый. Бліснe шчэ.— Марыля паклала руку на нямецкі аўтамат, які Артур трымаў ля грудзей, намагалася схаваць яго ад ветахавага святла.

Ад стылага холаду металу па скуры пакацілася халодная дрыготка. Дзіва нейкае! Нічога ж не палохалася Марыля, калі выходзіла з хаты, калі ішла ля ссечанага хмызу наперадзе ўсіх, не збаялася нават, калі ўбачыла ахову чыгункі... А вось дакранулася да халоднага, як бы вільготнага металу, сэрца сціснулася, непрыемная зябкасць асела ля локцяў. І толькі адна-адзінюсенькая думка, да звону ў вушах думка: каб жа толькі не кінулі ракеты. Калі зараз пыхне яна — са станцыі ці з гарнізона,— з насыпу заўважаць коней. Людзі прыціснуліся да зямлі — яны непрыкметныя. А коні — як на далоні будуць. Трэба, мабыць, іх ля сліўніку было кінуць, хай бы там стаялі. Але ж тады пакуль да іх дабяжыш! Не, усё правільна яна робіць!.. Зараз пройдзе варта... Пройдзе!..

Патрулі ішлі павольна, як бы абмацваючы кожную шпалу. Зрэдку, надкінутыя ботамі, каменьчыкі стукалі па рэйках, і тонкае цвыньканне металу тут жа раставала ў цемры, быццам скатвалася за насып і там знікала ў расплывістым і дрогкім ветахавым святле. Каб жа толькі не кінулі ракеты. Каб жа шпарчэй крочылі патрулі. Яшчэ каб якую сотню метраў яны прайшлі — тады абыдзецца. Тады ўзгорачак будзе захінаць коней, іх ужо не ўгледзіш з насыпу... Добрае месца яна, Марыля, выбрала — пакаты гэты ўзгорачак ратуе... Але ж чаго каменьчыкі не цвынькаюць? Спынілася варта? Не, пайшла

далей. Далей пакрочыла... Вось няхай Арцік глядзіць, як гэта важна — своечасова спыніцца, агледзець усё, зручны момант ухапіць. А каб не яна, Марыля, а Тося побач з Артурам? Маладыя абое — гарачыя галовы! — хіба ж чакалі б яны? Насып убачыўшы, адразу б шуснулі наперад. І сутыкнуліся б з аховай абавязкова! Хай бы скасілі, скажам, патрулёў гэтых. А далей?.. Злева і справа вышкі ахоўныя! Асвецяць ракетамі, жарнуць з кулямётаў, як толькі сігнал патрулі дадуць — адсюль тады ўжо не выпаўзеш... А яна, Марыля, патрулёў абдурыла: калі цяпер і ракета пыхне — бяды вялікай не будзе: узгорачак ратуе.

Марыля ўзышла на насып разам з сынам. Чатыры цені, след у след, амаль нячутна перайшлі рэйкі. Нейкі час былі відаць белаватыя доўгія мяхі, прыкручаныя да сёдлаў, але і яны расталі ў цемры, і ў Марыліна сэрца пракраўся жах. Маленькая жменька партызанаў ідзе. Напачатку здавалася, што шмат іх. А яны, выяўляецца, толькі ўчатырох...

«Небачка! Сцеражы іх, сцеражы кожнага!..»

Ля Марылі спыніўся Гнацюк, паціснуў руку, падзякаваў, крыху павагаўся, збіраючыся нешта дадаць яшчэ, але нічога не сказаў, толькі хутка і нязграбна пацалаваў у скронь і саскочыў з насыпу. Марыля збянтэжылася і тут жа разгубілася яшчэ больш, адчуўшы на сваёй шыі халодныя Тосіны рукі.

— Я з імі вярнуся,— пошапкам паабяцала Тося.— Са мною ім будзе шчасціць. Як зараз вось...

Марыля, спяшаючыся, наказала:

— Знак мой пільнуй. Ля дзічкі на паваротку дарогі спыніся — адтуль хату добра відаць. Якраз гэтае акно, левае...

— Ведаю, ведаю. Спачатку сама перайду, потым ужо іх павяду...

— Не паспелі нагаварыцца? — напусціўся на Тосю Артур. Але гэта прагучала і папрокам маці, і ён, адчуўшы гэта, дадаў мякчэй: — Коні могуць не туды павярнуць. Ты ж абяцала на сцежку іх вывесці,— і павярнуўся да маці, парывіста абняў яе.— Да сустрэчы, матуля. Дамоў бяжы!

Марыля ўскінула рукі, каб прытуліць сына да сваіх грудзей, але зрабіла гэты крок запозпена — Артура ўжо на насыпе не было,— і яе рукі схапілі паветра. Яна гэтак і стаяла нейкі час, разгубленая сардэчнай удзячнасцю Гнацюка, збянтэжаная Тосінай ласкавасцю, стаяла з працягнутымі перад сабою рукамі, глядзела на чорную і пустую стужку насыпу, падзеленую цьмянымі палосамі рэек, бынцам чакала і спадзявалася, што сын зараз вернецца. Імгненнае і сухаватае расстанне з сынам — спехам, як адчэпнае, пацалаваў, кінуўшы «дамоў бяжы», сігануў цераз рэйкі і знік за насыпам! —

аглушыла Марылю. Ад рухавага парывання, з якім яна хацела абняць сына, выкаціліся з грудзей, расперлі горла шархоткія колцы, стала адразу цяжка дыхаць, і яна сагнулася, затуляючы рот рукамі, намагаючыся спыніць, задушыць кашаль, што неадчэпна рос усярэдзіне, аддаваў цяжкім тлумам у галаў.

«Нельга кашляць! Ніяк нельга! Трэба бегчы адсюль. Дамоў бегчы!..»

Марыля спаўзла з насыпу, крочыла таропка, потым, прыгінаючыся, пабегла ўсё шпарчэй і шпарчэй, заціскаючы рот далонямі. У галаве муцілася, колкія шархоткія колцы дзерлі горла, але яна не спынялася, гнала сябе наперад, нічога не заўважаючы вакол, чуючы адно толькі — блізкі ўжо грукат цягніка. Ёй падалося, што колы грукочаць і за спіною, і злева, і справа і вольная ад грукату, толькі прастора перад ёю, і яна імкнулася туды, наперад, каб адбегчыся як мага далей ад насыпу, схавацца і ад жалезнага грукату, і ад кашлю, які ледзь стрымлівала.

Дабегла да сліўніку, ля якога нядаўна стаяла з сынам, азірнулася і, страціўшы раўнавагу, бразнулася на зямлю. Халодная трава астудзіла твар, праяснілася віроўвая, але адна-адзіная думка, што трэба нацягнуць на галаву кофту, каб не было чуваць кашлю.

Не выцягнуўшы рукі з рукавоў, яна задрала кофту, абкруціла галаву і адразу зайшлася ў глыбокім і працяжным кашлі. Кашаль распіраў грудзі, выварочваў усё нутро, дзёр горла, і Марылі на імгненне падалося, што рэха яе кашлю вяртаецца з зямлі несціханым жалезным грукатам.

«Цягнік жа гэта... Цягнік коціць!»

Толькі цяпер дапяла, што кашаль ніхто не мог пачуць і раней, калі яна бегла ад насыпу, і, натуральна, не пачуе цяпер, і села, скінула кофту з галавы. Адразу выразна акрэсліліся шаты яблынь у садзе, і Марыля зарадавалася, што дабегла да сядзібы і, урэшце, можа адкашляцца як след і гэта ўжо ніяк не зашкодзіць сыну. Ён ужо далёка ад чыгункі, і ён зробіць тое, што яму загадана зрабіць, і зробіць паспяхова, і шчасліва вернецца, і яна, Марыля, яго дачакаецца. Яму пашчасціць, абавязкова пашчасціць, бо ён, яе сын, і разумны, і кемлівы, і смелы. А гэткіх — удача любіць. Пудлівых удача пабойваецца, уцякае яна ад іх...

Вярнуўшыся дахаты, Марыля доўга сядзела на ганку, сядзела ў чаканні невядома чаго. Яна разумела, што сынава група добра перайшла чыгунку, гэтак жа добра пайшла і далей — ніводнага ж стрэлу не прагучала з таго боку,— і цяпер, напэўна ж, недзе ў небяспечным месцы. Трэба пайсці ў

хату — прастуджаная ж, усё хрыпіць у грудзях,— лягчы адпачыць, хоць заснуць якое каліва. Што яна выседзіць тут, на золкім перадранішнім ветры? Што выгледзіць у тым баку, куды пайшлі партызаны? Хіба прыгасіць гэтым сядзеннем хваляванне і неспакой, што жывуць, не пакідаюць сэрца?..

Зноў прайшоў цягнік, кароткім ланцужком буркатнула і аціхла далёкая кананада, і, калі аціхлі татаканне колаў і гул далёкіх выбухаў, стала чуваць, як блізенька, быццам над самай патыліцаю, нястомна точыць старое бярвенне шашаль — вур-р, вур-р, вур-р.

Марыля зайшла ў хату, легла не распранаючыся на ложак, акрыла старой коўдраю азяблыя ногі. Сцішылася і тады зноў пачула знаёмае сухое храбусценне ў сцяне за спіной ложка: «Вур-р, вур-р, вур-р...» Спакойнае, нейкае са спагадаю вуркатанне ўлагоджвала, гнала ў сон, і Марыля зморужыла вочы. Нягоды і трывогі вайны як бы адсоўваліся, некуды адступалі, і Марыля сунулася ў свет мройнага дзіўнага ўяўлення аб усім тым, што было вакол. Нібыта вось выправіла яна сыноў у школу, і чакае іх, і ведае, што вяртанне хлопцаў дамоў, магчыма, будзе не вельмі дакладнае ў часе, але несумненнае. Затым, неўзабаве пасля вяртання дзяцей са школы, прыйдзе дамоў Пахом, кіне сваё першае і нязменнае — «як наша школа?» — і, слухаючы гаворку сыноў, будзе мыцца, пацвельвацца са школьных нягод, ухваляць поспехі і падбадзёрваць, што ўсё будзе ў хлопцаў добра, толькі трэба навуку «не пускаць пустапасам» і «рукам работку даваць». Можа, гэтае бацькоўскае «рукам работку даваць» хлопцы болей любілі, чым школьныя заняткі. Заўжды, дужа ахвотна, разам з бацькам яны і пілавалі, і шчапалі дровы, і складалі паленца да паленца, потым падграбалі смецце, збіралі трэскі ў скрыню, пілавінне ссыпалі ж асобна, у шырокі кош з дранкі, і потым вясною, калі вярталіся нечаканыя прымаразкі, спальвалі ў садзе — ратавалі яблыневую квецень ад холаду. Рабіць тое даводзілася заўсёды на досвітку, і яны з мужам заўсягды сварыліся, калі збіраліся ўспорваць дзяцей.

«Не хочацца ж іх і будзіць. Дужа ж салодка спяць».

«А не набудзім — накрыўдзяцца. Учора ж над кожнаю яблыняй пілавінне падрыхтавалі».

Пахом гаворыць гэта і вагаецца, папраўляе коўдру, што спаўзла на падлогу, і Марыля цягне мужа з пакоя. Ад іх гаворкі дзеці прачынаюцца. І вось яны ўжо ў садзе — запальваюць пілавінне пад дрэвамі. Дым кудлаты, як туман, усплывае над белымі шатамі яблынь. Хлопцы дурэюць, носяцца ў садзе, варушаць кійкамі дымныя вогнішчы, усё вакол у дыме,

і нават сонца, што чырвонай патэльняю сядзіць на даляглядзе, таксама, здаецца, спавіта дымнымі скруткамі.

«Бачыш? Добра, што пабудзілі іх! Лета наперадзе — насненоць адаспацца».

«Дзеці... Горкія ж яшчэ дзеці. Дым па садзе ганяць — ім і забаўка радасная!»

«Хіба ж толькі дым ім даспадобы? Работка ім па душы. З таго, хто рэдка бачыць, як сонца ўзыходзіць,— добрага мужыка не вырасце».

«Я думала, каб таполле сёння пасячы».

«На тое і сякеру нясу. Да снядапку мы гэтае таполле ўпарадкуем...»

Пахом працуе на падворку. Кладзе таполіны на бярозавы кругляк, адной рукой трымае, а другой — ча-ах сякераю! Сякера бліскае на сонцы, звініць ад удару, і лёгка, са звонам разлятаюцца на бакі роўныя, як адмераныя, палепцы.

«Сячы таполіны лёгка. Шкада толькі. Навошта ж было глуміць? А ты зірні, колькі ж гэта чужынцы добрых таполяў паглумілі! Маглі расці, веццем шапацець, сэрца радаваць таполі... А вось ляжаць палепцамі, ад зямлі да самага франтона — вялізны і добры гай...»

Сапраўды, вырасла паляніца на ўсю сцяну хлевушка, пад самы франтон; канцы палепцаў вострыя, як пікі, тырчаць і не белыя, а быццам цёмнай вохраю пафарбаваныя — фарба мясцінкамі толькі, як плямы крыві. І неба над вільчыкам хлевушка барвовае. І на дзічцы, што стаіць пры самым вугле хлевушка, барвовы водсвет: квецень, што бліжэй да франтона, барвовая, а ў бок гародчыка — белая...

Пахом удзюбнуў сякеру ў бярозавы кругляк, дзівіцца.

«Сад яшчэ чорны стаіць, а дзічка — зацвіла. Відаць, ад хлевушка ёй цёпла. Добра, што мы яе не ссеклі».

«Гэта я, Пахомка, настаяла».

«Ты ў мяне мудрая. І ад усіх прыгажэйшая. На ўсім свеце гэткай прыгожай няма».

«Хіба шукаў ты, на тым «усім» свеце?»

«Шукаў. І за тое, што шукаў,— узнагарода. Цалуй мяне зараз жа!»

«Дзеці ж бачаць. Што ўдумаў!..»

«Пойдзем тады да студні. Там я і вадзіцы нап'ю...»

Сцежка да студні роўная, спрэс у лапушыстым трыпутніку. Пад клёнамі галёкаюць дзеці — пабеглі цяпер туды, і туды, на клёны, сплывае дым ад вогнішчаў, і клёны быццам плаваюць у грывастым тумане, і вершаліны іх зыбаюцца на сонечных промнях. Дымам патыхае ад ручніка, які Марыля бярэ з парэнчаў тэрасы. Пахом, жартуючы, тузае ручнік за

чырвоныя матузы, і яна не аддае ручнік, трымае моцна, і ён тузае мацней, і яна ледзьве не валіцца на цыбулю на градах.

«Нешта рэ-эдзенька цыбулька, галубка, расце. Амаль уся — рукамі найшла».

«Рэшткі гэта. Добрую, паганцы, усю яны павысмаргвалі — калі толькі ў зялёнае бралася. Ходзяць, ходзяць па насыпе, а потым — шусь у гародчык. І слова не скажы, калі жыць хочаш».

«Падавяцца яны нашай цыбулькаю. Усё наша ім колам у горле стане...»

«Цішэй, Пахомка, ахова пачуе!»

«Хай чуе — мы не ў чужых. На сваёй зямлі мы — хай ведаюць. О! Конаўка гэтак і вісіць, дзе я начапіў!..»

Пахом, у расхрыстанай кашулі, з рукавамі, закасанымі па локаць, мыецца ля студні — чэрпае з вядра поўныя прыгаршчы, гучна форскае. А яна стаіць побач, як змярцвелая: за дзічкамі, усцяж плота, марудна рухаецца ахова чыгункі. Патрулі ідуць, як прывіды, след у след — белыя маскіровачныя халаты, чорныя аўтаматы на грудзях. Яна развяла рукі па баках, закрывае і плячыма і рукамі Пахома. Пахом перастаў форскаць, сцягнуў з яе пляча ручнік, узмахнуў ім, і патрулі, быццам спалохаўшыся гэтага руху, шуснулі пад дзічкі, расталі за белым разлівам квецені.

Пахом угледзеў вяроўку, што віецца на зрубе,— на вяроўцы раней апускалі ў студню бляшанку з малаком.

«А малачко дзе?»

«Хаваем. Ратунку ад гэтых, з насыпу, не было — выжлукцяць начыста. Цяпер схованка ў сліўніку ёсць. Глыбокая. У зямлі».

Пад сліўнікам утульна, ціха шапаціць лістота. Пахом п'е малако з конаўкі буйнымі глыткамі, мружыць ад асалоды вочы. Потым, калі Марыля зноў налівае малако, узнімае конаўку перад сабою, быццам поўную чарку.

«За маю шчаслівую дарогу. І за тое, каб вы хутчэй прыехалі да мяне. Я вас абавязкова сустрэну. Толькі вам не трэба бавіцца тут...»

«Як жа не бавіцца? У Мараціка экзамены. І Арціку экзамены трэба здаваць. Тады ўжо, як заняткі скончацца, мы і прыедзем».

«Мне цяжка без вас. Маркотна і сумна. І дарэмна, мабыць, я адчыніў акно...»

Вецер садраў з пляча ручнік, закрыў Марылі твар, і яна, нічога не бачачы, лавіла, як сляпая, створку акна. Дзынкнула, насыпалася на зямлю пабітае шкло. Пахом смяяўся з таго, што яна забедавала.

«На шчасце гэта. На шчасце, калі старое шкло пабілася!»

Дурэючы, ён узняў яе на руках, і яна таксама пачала смяяцца, сцёбала яго ручніком, а вецер адкідваў ручнік, і чырвоныя з жоўтым матузы чапляліся за падаконнік, за створку акна, якая бэхала і бэхала з гучным звонам...

Марыля прачнулася ад гэтага бэхання створкі, ляжала нерухома, слухаючы. У галаве звінела, у грудзях шалёна калацілася сэрца, як быццам бегла на высокую гару, узбегла, а далей ужо ногі не рухаюцца, адно толькі стаіш, хапаючы паветра шырока адкрытым ротам. Сутонне ў кутках пакоя, падлога ж ля стала дужа чыстая, прапізліва ярка асветленая.

«Сонца свеціць, раніца ўжо...»

Узлакаціўшыся на беражок падушкі, Марыля глядзела на шырокі, як бы дымны прамень святла з акна, што прадзіраўся праз рагатыя альясы на падаконніку, пераскокваў стол і па гарбатай спінцы крэсла скочваўся на вузкі зрэбнік на падлозе.

Створка акна пагойдваецца і рыпіць рытмічна, быццам маснічыны пад цяжкімі, але дужа сцярожлівымі крокамі. Цяпер, як адарваная, гучна бэхнула зноў, і акно зачынілася, як бы нехта піхнуў раму знадворку.

«Пахом! Пахом жа на двары!»

Разумела, што падманвае сябе, што няма, не можа быць Пахом тут, на падворку, і, усё яшчэ пад абладаю сну, кінулася да акна, піхнула рукою абедзве створкі адразу.

«Небачка! Снег!..»

У канцы падворка, ля хлевушка, паўкругам ляжаў нейкі белы пласт, і каламажка з альхоўнікам, здавалася, не стаіць на месцы, а коціцца па дзіўнай і нечаканай, але густой і блішчастай белі. Рэзала ўвачу ад гэтага зіхатлівага, як снегавога, бляску. Ды не, які ж гэта снег — густая раса зіхаціць на траве пад сонцам!..

Зноў Марыля, трымаючыся рукамі за падаконне, доўга кашляла. Але кашаль быў не такі, як уночы, глыбокі, колкі, і яна зразумела, што застудзілася яшчэ больш, седзячы ўночы на ганку. І нейкая паганая кволасць у руках, млявасць у целе, дужа цяжкія парабіліся ногі.

У хляве працягла мыкнула карова, просячыся на выпас, сакаталі, лопалі крыллем куры — клопаты і турботы новага дня клікалі. Марыля вынесла з хаты даёнку і, радуючыся, што пакрысе адступае з цела млявасць, памалу ўзялася адчыняць шырокую, на доўгіх завесах браму хлява.

Брынькалі, звінелі па баках даёнкі тугія малочныя струменьчыкі, і Марыля нечакана аж схамянулася ад думкі, якая, прынамсі, узнікала і раней, але цяпер была дужа ясная і

ўстрывожыла незвычайна: чаго яна прыкіпела да чужога ёй хутара? Шлычыху можна зразумець — дзядзькава хата, спадчына ўсё ж нейкая. А яе, Марылю, што тут вабіць? Думала Пахома дачакацца? Ці проста як схавалася ад навалы? Не, гэтак нельга развяжаць. Тут, на хутары, стала яна на ногі пасля запалення лёгкіх, якое скруціла яе назалетась — каб не сырадой, каб не масла, што не шкадавала Шлычыха, не ачуняць бы ёй. А Толічак Чэсін! Яны, Марыля і Шлычыха, тут яго выхадзілі, ад хваробы ўратавалі. Цяпер Толічак далёка — адправіў яго Захар разам з параненымі партызанамі за лінію фронту на самалёце. Як прадбачыў усё Захар, што знікне, невядома куды кіне лёс Чэсю — хай хоць хлопчык уратуецца. І ёй, Марылі, як лягчэй ад таго: хлопчык ад бяды далёка. Каб яна, Марыля, у стане была, каб у яе ўладзе было — яна б усіх сваіх людзей ад бяды ўратавала. І робіць яна гэта, штодня робіць — ніводнага разу хлопцы з атрада Захара на фашысцкія засады ў гэтых месцах ля чыгункі не наляцелі. Не, з гэтага хутара ёй няма куды ісці: тут хоць зрэдку, але ж бачыць Артура. Тут і добрую вестку пра Марата пачула. І Пахома яна тут дачакаецца — на гэтым хутары ёй шчасціць. А тое, што працы процьма, што цяжка невыносна штодня фашыстаў бачыць, штодня ля смерці хадзіць — дык дзе ж цяпер лёгка!..

Здалёку, але раптоўна прарвалася татаканне колаў, і Марыля выйшла з хлява. Лёгка і шпарка кацілася па рэйках дрызіна, быццам плыла над насыпам. На дрызіне сядзелі салдаты, карабіны трымалі тырчма, як чорныя кійкі, і Марыля глядзела на салдат, прыціскаючы даёнку да грамы абедзвюх... 

руч. Падобна, што спыняецца дрызіна, спыняецца ля таго месца, дзе ўночы Артур пераходзіў чыгунку. Заўважылі сляды?.. Не, не спынілася, пакацілася далей. Значыцца, нічога не заўважылі. Насып там стоўчаны рамонтнікамі, перакапаны рыдлёўкамі... Але ж гэта — старыя сляды. А новыя, тыя, што засталіся пасля ночы? Ды яшчэ ад конскіх капытоў! На лугавіне, на роснай траве сляды могуць застацца... Трэба праверыць! Трэба, калі што, загладзіць, зацерці сляды, каб ніякага знаку не было!

Марыля гнала карову на выпас не сцежкаю праз сад, а ўскрай гародчыка, адразу ў нізіну — хутчэй убачыць тое месца, дзе вяла яна партызанаў! На насыпе сляды — хай сабе. Галоўнае, каб паблізу хаты не было, каб ахова не здагадалася, адкуль ішлі партызаны. І здаецца, ніякіх слядоў нідзе па лугавіне не відно. А мо далей, пад пагоркам? Не, там таксама нічога не прыкметна, крыху ўгрэтая сонцам трава высахла, выраўнялася — ніякіх слядоў, ніякага знаку, што

поччу па ёй ішлі людзі. Ад капытоў вось толькі маленькія ямінкі. Але ж не паўсюль, і не адразу іх заўважыш!..

Марыля прысела на кукішкі, пагладзіла рукою траву ля ямінкі, потым знайшла больш вузенькі след, з крапачкамі ў два радочкі — абцас выціснуў. Сынаў гэта след — Пахомавы ж боты на ім! Небачка! Глядзі ж, каб удача ішла па гэтых слядах! Хай вось гэткая маладая травіца кладзецца адразу па іх і адразу выпростваецца, адводзіць убок клятых чужынцаў!..

Супакоеная, з ціхай і светлай радасцю ў душы, Марыля вярнулася дамоў. Памыла твар халоднай вадой са студні, распаліла на прыпечку трэскі, пашаткавала на патэльні ўчарашнюю бульбу, што засталася ад вячэры. Снедаючы, думала пра сына зноў, спакваля прыгадвала, як пачула яго крокі ля хаты і адразу іх пазнала, як ён піў малако, як жартаваў, як ішоў побач з ёю да чыгункі. Якая ж яна дурная, што не прымусіла сыночка з'есці яешаньку. Гэта ж на сухенькіх трэсачках — міг адзіны. Болей яна, вось як толькі ён вернецца, не выпусціць сыночка галодным з хаты, згатуе яешаньку, якую Артур упадабаў яшчэ з малых год, будзе сядзець побач і глядзець, як сын возьмецца есці, будзе ўважна слухаць, слухаць кожнае слоўца... Але ўсё тое — потым, праз тыдзень. А гэты тыдзень шчэ трэба пражыць. Прынамсі, не заўважыш, як дні пралятуць — працы процьма. Сёння ёй трэба пачысціць хлявок, перабраць у паграбку старую бульбу — вядры чатыры яе там, не болей,— паабломваць параст-кі, абжаць траву ля сліўніку. Не, увесь гэты клопат і пачакаць можа. Галоўнае сёння — альхоўнік перакінуць на падворак. Учора Марыля вазіла яго з Тосяй — ахова папярэдзіла, каб сёння альхоўнік быў звезены з дальніх вырубак. Вазіць, праўда, далекавата — павысякалі параснік усцяж чыгункі цяпер ужо амаль пад самы лес. Хоць і кепскія дровы з таго параснiку, але ж дзе ўзяць лепшыя? Без дроў зімою нагараваліся — у печы праз дзень толькі палілі. Таму зараз трэба па альхоўнік кінуцца, хлявок і трава пачакаюць, і бульба не перастоіць. А дроўцы не выхапіш — ахова прыпрэцца. І галоўнае — зімою закукуеш — паседзелася ў халоднай хаце. Можа, дарэмна яна шчыруе, гэтак далёка наперад глядзіць? Артур казаў той раз, што да Новага года фронт пасунецца, чужынцаў адсюль пагоняць. Але ж ён і летась тое ж самае казаў. Так што зімаваць, напэўна, тут давядзецца. Зрэшты, калі не яна, дык Шлычыха з Тосяй застануцца — як ім без дроў? Не выключана, што пасля вайны і яна тут з Артурам асядзе на першым часе. Месца тут

добрае, прыгожае. Станцыя блізка. А далей — відаць будзе...

Гэты клопат падахвоціў Марылю да працы, і яна, ускінуўшы вяроўку і сякеру на лёгкую ручную каламажку, рушыла на вырубку. Дарогаю пабедавала: кепска, што Тосі няма і Шлычыхі нешта не відаць, хоць і абяцала, што вернецца ранкам — утраіх яны хутка і лёгка падчысцілі б сваю дзялянку. Але шкадаваць ёй не выходзіць, яна будзе працаваць і адна, будзе працаваць да змогі. Абы там, у Артура, усё было добра, усё ладам ішло.

Усе дзялянкі былі яшчэ ўчора падчышчаны, і заставалася непрыбранай толькі адна вузкая палоска — Марыліна. Ніхто з хутаран, што працавалі тут учора, не зачапіў з Марылінай дзялянкі ні каліўца, і гэта цяпер яе непрыемна кальнула: кожны сваё падгроб — і дамоў. Нейкія ваўкаватыя людзі жывуць тут, на хутарах пад лесам, зусім не падобныя на былых Марыліных суседзяў — там, на завулку, кожны і папытае, і параіць нешта, і дапаможа, калі ўбачыць, што ты адна рвешся над чым-небудзь цяжкім. А тут быццам ваўкі: сабе ўхапілі — цілісь на свой двор, ніхто не абазваўся і словам, не папытаў, чаго яна адна, без Шлычыхі, як пачувае... Можа, яно і натуральна ўсё: яна тут новы чалавек, невядома, адкуль прыбілася, хутаранцы пабойваюцца, тояцца, разумеючы, што за кожным хутарам ахова чыгункі цікуе. А некаторыя, магчыма, думаюць, што яна, Марыля, на гатовае прыляцела, чужое захапіла. Не будзеш жа крычаць, даводзіць, што не патрэбна ёй гэтая хата, што яна жыве тут часова толькі, на чужое не кваціцца. Але ж сваю душу, клопат свой людзям незнаёмым не адкрыеш. І яна, Марыля, правільна робіць, што аніякіх знаёмстваў на хутарах не шукае. Захар яе папярэджваў, каб сядзелі яны з Тосяй ціхутка на хутары, каб кожны бачыў, што гаруюць дзве хворыя кабеты з малой дзяўчынаю. Яна, Марыля, павінна і далей гэтак рабіць, каб і каліўца падазронасці не лягло на хату, да якой выбіта партызанская сцежка. І Марыля на тым тыдні разумна зрабіла, калі на ахову чыгункі насядала, вымольвала альхоўнік на дровы, а раней выпрошвала кавалак лугавіны ля чыгункі, каб сена карове накасіць — чалавек пра жыццё думае. І падставы для гэтае настойлівасці ёсць: гаспадарку жанчыны вядуць, гаруюць без гаспадара, але ўсе загады ўлады выконваюць, малако ад кароўкі штодня на станцыю здаюць, падатак за зямлю ўплачаны...

Марыля спачатку абцерабіла альхоўнік, потым перацягнула на палянцу ў канец дзялянкі, бліжэй да роўнага месца,

нагрузіла і адвезла да хаты адну каламажку, потым другую. Нагрузіўшы трэцюю, апошнюю, узялася завязваць вяроўку.

Падсунула сякеру пад вяроўку, упрэглася ў тоўсты вяровачны хамут. Каламажку яна па падворку не разгружала, паставіла ля сцяны хлява. Пасячы і ўпарадкаваць дровы яна наспее пазней, у вальнейшы час. Зараз жа трэба падбегчы на выпас, падаіць Красулю і перціся на станцыю, здаваць ранішні і дзённы надоі. Спознішся два разы, не здасі малако ў вызначаны час, і на трэці раз позніцца ўжо не давядзецца — фашысты, у адпаведнасці з абвешчаным загадам, кароўку забяруць. А без кароўкі кепска, і кароўка дужа дойная: частку малака Марыля са Шлычыхай штодня ўтойваюць, робяць масла, перапраўляюць яго потым у атрад. І калі зойдзе ўночы Артур: пачаставаць ёсць чым сыночка і яго сяброў.

Са станцыі, здаўшы малако, Марыля наважылася была пайсці карацейшай дарогаю, праз тупік, каб сабраць ля ручая шчаў'я. Але яе запыніў вартавы — стаяў ля першага вагона кароткага санітарнага цягніка, якога ўчора тут не было. З чатырох вялізных грузавікоў з брызентавымі фурамі паверсе згружалі і пераносілі ў вагоны параненых. Яна адразу здагадалася, што на насілках салдаты не з фронту, а адтуль, з партызанскай зоны, і яе пацягнула падысці бліжэй, добра разгледзець. Нейкае як бы шкадаванне міжвольна сціснула сэрца, калі яна ўбачыла плямы свежай крыві на забінтаваных галовах, руках, нагах.

«Вернецца каторы дамоў без рукі ці нагі... Цяжка жыць будзе...»

Жаласлівасць узнікла толькі на кароткі міг, яе адразу ж сцерла, закрэсліла нянавісць. Дома хай бы сядзелі! Ніхто іх, гэтых салдат, што едуць цяпер дамоў спрэс у акрываўленых бінтах, сюды не клікаў, не запрашаў!..

Вартавы зноў замахнуўся на яе прыкладам, гыркнуў злосна, пагнаў назад. Яна, зазлаваўшы, перадражніла:

— Цурук, цурук... Каб цябе, гада, да скону дзён паўсюль цурукалі. Каб цябе самога на гэтых насілках неслі!

Вартавы дужа ўважна, але скоса глядзеў на яе. Потым варухнуліся ва ўсмешцы яго тоўстыя губы, і яна заўважыла незразумелую, зусім непрыхаваную тугу ў вялікіх карых вачах.

— Папясуць, папясуць... Аніхто не адкруціцца, так што, пакуль ногі носяць, габлюй, кабета, дамоў,— вартавы параіў без злосці, азіраючыся на зялёныя вагоны з чырвонымі крыжамі, а яна глядзела на яго, прыгаломшаная.— І слоўцамі асцярожна кідайся, калі не хочаш кулю схапіць,— і, заўва-

жыўшы афіцэра, які саскочыў з прыступак другога вагона, гыркнуў зноў па-нямецку, злосна: — Цурук! Цуру-ук!..

Марыля скоранька пашыбавала прэч ад тупіка, потым, мінуўшы станцыю, пайшла пакрысе, адпачываючы ў хадзе. На паваротцы дарогі, дзе трэба было вярнуць па сцежку да хутара, яе дагнаў грукат колаў. Цягнік толькі што выправіўся са станцыі, не набраў яшчэ хуткасці, і колы татакалі запаволена, не глушачы натужны дых паравоза. У прагале пасадак мільгануў спачатку адзін, потым другі чырвоны крыж на вагонных барташінах, і яна праводзіла іх радасным позіркам, з помслівай думкаю пра тых, каго везлі ў вагонах. Што, адстраляліся? Гэтыя ўжо не будуць чыніць людзям гора. А неўзабаве і ўсіх астатніх звязуць туды, адкуль яны пачыналі свой ганебны шлях, на якім іх чакала смерць.

«А сыночкаў маіх кулі не зачэпяць. І Пахомку бяда абміне. І ўсё ў іх будзе добра, будуць хадзіць яны па зямлі, радавацца сонцу, слухаць спевы птушак...»

Ад няспешнай хады, ад паветра, прапахлага водарам сена, ад журкання маладых шпакоў, што шэрымі камячкамі сноўдалі ў вузкіх пракосах, зноў ажывалі, плылі ўспаміны пра жыццё ў роднай хаце. Як жа тады было весела і слаўна, калі прыехаў з акадэміі Пахомаў брат. А Важнік тады прыходзіў са скаргаю на Артура. Не, ён не скардзіўся, проста раіўся з Пахомам, шчырую гаворку вёў. Пазней, калі Важнік пайшоў, а Захар з Ягорам кінуліся ў рыбу, яны з мужам сядзелі на прыступках тэрасы, і Пахом ёй, Марылі, прачуханца даў за тое, што яна, нейкім плёткам паддаўшыся, да вайны пачала рыхтавацца, запасы такія-сякія зрабіла... Не, гэта ж у бацькавай хаце Ягора сустракалі! І ўночы туды ж з Дзвіны рыбакі вярнуліся — добрых самоў улавілі. І назаўтра юшку ў садзе варылі, і ўвечары, калі сонца схавалася за клёнамі, спявалі песні, розныя байкі плялі, жартавалі...

Ранкам яна прачнулася — добра помніцца гэта! — няма побач мужа, сядзіць пры акне, якое адчынена нахлашч, глядзіць у сад, задуменны, заклапочаны. Урэшце заўважыў, што яна не спіць, павярнуўся, і вось тое і цяперся перад вачыма — асветлены сонцам, ласкавы твар, усмешка ў вачах, зыркія, як срэбрам насыпаныя, яблыні ў садзе...

Усхваляваная ўспамінамі, Марыля неўпрыкмет хуткай хадою прашнуравала нізіну, спынілася на момант ля масточка — вузенькага, на два аполкі,— праз амаль перасохлы ручай. Тут, лічы, амаль ужо і дома яна, вунь ужо і страха відаць, знаёмая, з аблупленым комінам. На добры лад, дык даўно трэба было б тоії комін падправіць, пакласці колькі новых цаглін па краях. Але ж дзе ты цяпер тыя цагліны знойі-

дзепі! І страха не вельмі надзейная, пасечаная кулямі амаль скрозь...

«Нехта крычыць у тым баку, ля хаты. Шлычысін голас, здаецца...»

Марыля перабегла масточак, узбегла з нізіны на пагорак і спынілася, як не ўмлела ад таго, што ўбачыла. Бяжыць Шлычыха за Красуляй, то ўмольна, ласкава кліча яе, то пачынае лаяцца, грозіцца тоўстым дубцом. А карова, бы ашалеўшы, імчыць да насыпу праз тапалевую вырубку, валачэ на доўгай вяроўцы загнуты крукам жалезны прэнт — выдрала з зямлі; прэнт то зачэпіцца за пянёк, то саскочыць, узляціць высока, бліснуўшы вышараваным завостраным канцом.

«Я ж моцна, як звычайна — па самы крук! — увагнала ў зямлю прэнт. Авадні, мабыць, апанавалі. Але ж не дамоў прэцца, ад заедзі ратуючыся!..»

Паважылася гукнуць Шлычысе, каб тая не бегла, спынілася,— Марыля зараз улупіць напярэймы! — і гэтак, з адкрытым ротам, асела на сцежку ад жаху. Наперадзе з трaскотным грукатам выдралася з зямлі полымя, жоўтае, з бруднай кучомкай дыму ўверсе, і праглынула Шлычыху. Дым, у якім знікла Шлычыха, расплываўся, бы сціснуты з бакоў, нізка над зямлёй вузкім парасонам, і абрысы гэтага парасона дзіўна і хутка змяньваліся: вось нейкія грывастыя звівы скруціліся ў цэнтры, разваліліся, выкінуўшы ў трох напрамках вострыя пікі, доўгія і тоўстыя; пікі гэтыя ўвачавідкі таншэлі, як бы накручваючыся, плылі над зямлёй, і перад адной з іх, павернутай ад насыпу, імчала, быццам ратуючыся ад колкага вастрыя дымнай пікі, Красуля, бегла дзіўным галопам, часта і высока падкідваючы доўгія заднія ногі; з-пад капытоў ляцела ў паветра чорнае ашмоцце дзірваноў.

Вочы толькі зафіксавалі гэта, а розум усё яшчэ аніяк не мог аналізаваць, звязаць усё ў нейкую пэўную і канкрэтную выснову, і Марыля сядзела на зямлі, дыхала прагна, хутка і нічога не адчувала, акрамя таго, што паднябенне імгненна высахла, аж закарэла, і што зараз, варта толькі ёй закрыць рот, яно разваліцца і забрыньчыць, як шкляное.

## 2

Захар, бы зачараваны, сачыў, як марудна і няўмольна прабівае сабе дарогу новы дзень. Спачатку пасвятлела неба над возерам, потым бляклым ліловым паўкругам запунсавеў далягляд над полем, і яго няроўная падкова імкліва гусце-

ла, мяняючы рапейшы колер на аранжавы. Раптоўна зусім аціхла буркатанне кананады, далёкай і кволай, як з ляпотаю, пакрысе зусім суняўся вецер, і неяк дзіўна было бачыць, як шпарка імчаць па небе хмары, за якімі, як і ўначы, бег, цяпер зусім бляклы, як вымаклы, абляпаны белай пенай, пяроўны сярпок маладзіка. І хмары былі цяпер зусім не такія, як уночы,— далёкія, расплывістыя, падобныя на дым; здавалася, што адтуль, з таго боку, дзе займаецца світанак, бясконца коцяцца чорна-шэрыя скруткі дыму, быццам гарыць вялікае вогнішча за лесам — агню не відно, а дым усё гоніць і гоніць, і ён адціскае ўдалеч чорную палосу ночы. Нейкая як бы дымная гаркавасць была разліта ў паветры — знаёмы пах восені, калі на гародах пякуць у прыску бульбу, спальваюць жоўта-белы, хрумсткі і бязважкі агурочнік.

Захар зірнуў на суседнюю хату, дзе кватаравалі камісар і начальнік штаба. Слабы водбліск зары мільгануў па шыбах сярэдняга акна, як хтосьці закурыў у хаце. Не, падалося — нахіліш галаву і зноў змрочна чарнее акно.

Гучна прашамацеўшы ў лістоце, чмякнуў на дол буйны яблык. Захар знайшоў яго, пакачаў па мокрай ад начнога дажджу траве, абцёр у далонях, узяўся есці. Ад сакавітай і дужа халоднай кісліны адразу праяснілася ў галаве, неяк нават халадней зрабілася, і Захар пашкадаваў, што выбег у сад у адной кашулі, не надзеўшы скуранкі.

«Жывая Гайдаш! Жывая...»

Ён толькі цяпер зразумеў, што менавіта з гэтай думкай прачнуўся, выходзіў у сад, і цяпер яна, гэтая думка, зноў упарта і няўхільна пашырала ў грудзях радасць, як бы адсоўвала за нейкую мяжу горыч благіх вестак. Ён нечакана прыйшоў да высновы, якая неаднойчы прымушала яго задумвацца: добрыя і благія весткі амаль заўжды ў жыцці неяк чаргуюцца, адны змяняюць другія, і прадугледзіць парадак гэтых змен аніколі не ўдаецца яму. Толькі што радаваліся — і ў атрадзе радаваліся, і ў вёсках, і хадзілі ўсе, як на свята! — з нагоды салюта ў Маскве войскам, якія вызвалілі Арол і Белгарад, на тым жа тыдні радаваліся! І вось мінуў тыдзень, і Яштокін, які быў на нарадзе ў штабе брыгады, прывёз сумную вестку: другая калона мабілізаваных была расстраляна з паветра фашысцкімі самалётамі, уратавалася толькі маленькая група людзей, якую вывеў за лінію фронту Шлык. Маўджуда была цяжка паранена, яе пакінулі ў вёсцы, і лёс яе цяпер невядомы. А ўчора Юрша прывёз з партызанскага аэрадрома два лісты — адзін ад Шлыка, які піша жонцы і дачцэ, другі — ад Гайдаш, на яго, Захарава, імя. Гайдаш паведамляла — старонка з вучнёўскага сшытка, спі-

сапая алоўкам,— што іх калона цалкам і добра перайшла лінію фронту, што ніхто не быў параненым, ніхто не захварэў, што яна ваюе цяпер на Цэнтральным фронце, што падала рапарт, каб яе направілі зноў сюды, у партызанскі атрад, што вернецца яна абавязкова. Хай сабе крыху пазней, але ўсё роўна — вернецца!

Апошняе слова яна падкрэсліла двойчы, паставіла два клічнікі, і гэтыя дзве рыскі пад словам «абавязкова», і гэтыя тлустыя, як намаляваныя, клічнікі Захара ўзрушылі незвычайна. Стоячы цяпер у садзе, на халаднаватым ветры, ён нечакана адчуў, што ўзрушэнне, якое перажыў, калі ўпершыню ўзяў з камісаравых рук пакамечаны, складзены трохкутнічкам ліст, не прайшло, што яно жывіць успаміны і ад гэтых успамінаў то сумна, то радасна, то горка.

Вецер шкуматаў каўнер кашулі, у грудзіну запаўзала зябкасць. Але Захар не рухаўся з месца, стаяў, марудна жаваў сакавіты яблык, добра саспелы, з чорнымі семкамі ўсярэдзіне. Павыбіраў з агрызка семкі, пералічыў і паклыпаў да кудлатага агрэсту. Калупнуўшы мыском бота зямлю, ён паклаў у ямінку семкі, прысыпаў іх зямлёю і адчуў сябе неяк вальней, быццам зрабіў нешта дужа важнае, дзеля чаго прачнуўся і выходзіў у мокры ад дажджу сад, і пацёгся зноў у хату.

Сяннік на ложку быў халодны, быццам уночы Захар на ім і не спаў. Скінуўшы боты, Захар уціснуўся ў яго, павярнуў поверх коўдры скуранку. Калі папраўляў скуранку, намацаў у кішэні ліст і ўголас хмыкнуў. З чаго ты гэтак усхадзіўся? З чаго гэтак усхваляваўся, атрымаўшы нечаканы ліст ад Гайдаш?.. Ну, жывая! Ну, хоча вярнуцца ў атрад! Натуральна ўсё: два ж гады ў атрадзе правяла, зраднілася з атрадам і людзі яе ведаюць!

Усё было правільна ў гэтых разважаннях. Але недзе за імі, у незразумелай праекцыі, стаяла, прытоілася хваляванне, якое давялося яму перажыць на беразе Дзвіны, калі калона знікла ў цемры ночы, жылі папрокі, якія ён рабіў сваіму сумленню неаднойчы, і ён нічога не мог зрабіць зараз, нават на каліва нешта змяніць у той праекцыі, у ранейшых сваіх думках. Ён разумеў, што павінен нешта змяніць у тых думках, нешта змяніць у сваёй душы, і не толькі не ведаў, як тое зрабіць, але і ўвогуле не ведаў, што канкрэтна трэба мяняць, перарабляць, рабіць больш пэўным і цвёрдым.

Захар прыдрамаў, трымаючы руку на кішэні скуранкі, адчуваючы пад пальцамі хрумсткі трохкутнічак. У сне да яго прыйшла Гайдаш, і ён, быццам уяве, адчуваў дотык яе мяккіх пальцаў на скронях і за вушмі, пазнаваў іх, гэтыя

пальцы, намагаўся ўцячы ад іх, і яго спыняў ціхі і ўмольны шэпт:

— Піце, таварыш камандзір... Лекі добрыя. І не гаркавыя...

Паспрабаваў расплюшчыць вочы. Павекі цяжкія, як зліпліся. У вузкую шчылінку паміж іх убачыў газнічку на стале ля вузкага акна, бярвенне сцен, галаву Гайдаш. Гайдаш схілілася над ім, і промні хісткага полымя газнічкі залачонымі стрэлкамі трымцяць на яе валасах.

«Як спалохана яна дыхае! І якія пяшчотныя і мяккія ў яе пальцы!..»

У целе была сіла, і ён яе адчуваў, калі ўзяў з яе рук кубак. Але піць з яго было немагчыма, кубак звінеў гучна, як лёд у праломцы, які ён малаціў галавой, адпіхваў рукамі і нагамі.

— Піце,— настойліва патрабуе Гайдаш.— Піце!

— Толькі каб цёплае што...

— Гэта ж з тэрмаса і наліла. Разведчыкі тэрмас прынеслі. Піце, таварыш камандзір! Неабходна! Гэта — загад!

Як смешна гучыць «гэта — загад» у яе вуснах. Але ён выпівае адзін кубачак, другі... І ўсё глядзіць на Гайдаш, дзівячыся, як не пазнаючы яе. Нейкая ж дужа яна прыгожая зрабілася. Зусім не гэткая была яна там, на лузе, калі ён насварыўся на яе.

— Гожая ты,— сцвярджае ён услых.— Гожая. І добрая душою...

А вочы Гайдаш жорсткія, бровы выгнуліся тоўстым і няроўным шнурком.

— Таварыш камандзір! Я іду з калонаю!

— З Лавягіным дамаўляйцеся,— Захар гаворыць наўмысна незадаволена, каб яна не здагадалася пра тое, што ён думае.

Тоўсты няроўны шнурок броваў нерухомы, як скамянеў. А голас — звонкі, як напятая, да апошняга, струна:

— Я іду з калонаю! Аддайце загад!

Яна ўжо не слухае яго, яна ідзе, і ён хоча запыніць, сіліцца загадаць Гайдаш застацца. Але словы асядаюць у горле, і ён парываецца бегчы за ёю следам. Ногі непаслухмяныя, ён не можа скрануць іх з месца, і ўсё вакол звініць, і ён, правальваючыся ў нейкае светлае звонкае кола, ліхаманкава мацае і леваруч і праваруч, спрабуючы адшукаць нейкае апірышча, учапіцца за яго, каб выдрацца з гарачага кола.

Захар ускочыў у сне, сеў і адразу прачнуўся, і сон адлянеў, і ён радаваўся, што гэта саснілася. От жа заспаў дык за-

спаў! Сонца ў хаце, сонечныя плямы рассыпаны на падлозе, скуранка ўгрэлася сонцам, аж гарачая. Матляецца фіранка на адчыненым акне, і за ёю то адкрыецца, то знікне постаць Гусарава, які стаіць пад яблыняй.

«Яштокін казаў, што Гусараў сёння ўранні прыедзе ў атрад. Не, гэта Юрша навіну прывёз — бачыў Гусарава на аэрадроме. А ён, Захар, спіць і начальства не сустрэў!..»

Нацягваючы боты, пачуў галасы Юршы і Яштокіна — Гусараў спрачаўся, нешта даводзіў, але з жартамі, без строгасці ў голасе. Здаецца, у добрым настроі прыкаціў.

Ледзь Захар з'явіўся на ганку, Гусараў вітаў яго вясёлым воклічам:

— Ну-у, камандзір, распаўнеў ты, жывучы на выгодзе. Спіш і не бачыш, што мы тут сад латашым. Прыкмячаеш? — Гусараў пастукаў ботам па лазовіку, з каптуром нагружаным яблыкамі.— Поўным кашом багацце цягаем!

Побач са старым лазовікам, які быў амаль з усіх бакоў, і асабліва густа ля ручак, аплецены белым дротам, Гусараў выглядаў франтам: начышчаныя да бляску хромавыя боты, сінія галіфэ з тонкім чырвоным кантам, пад зеленаватым бушлатам — новы, ваеннага крою, фрэнч з кішэнямі на грудзях і стаячым тонкім каўняром. Прышыты толькі, мабыць, сёння ранкам белы падкаўнерык ляжаў, аднак, няроўна, і таму дбайна, да сінечы, выгаленыя шчокі быццам перакасіліся; прыдаўленым пасярэдзіне здаваўся і падбародак, асветлены сонцам і бліштасты; бліпчаў і кончык носа з тонкімі чуйнымі ноздрамі, а ў засені ад казырка вайсковай фуражкі нерухома стаіліся падобныя на неспелы агрэст вочы.

Аблічча Гусарава блага стасавалася з вясёлай гаворкай, з тым, як ён сябе паводзіў, і было ў ім, гэтым абліччы, нешта робленае, як бы ўвесь час напуўся чалавек нешта ад усіх утоіць, паказаць у нейкім пэўным, яму толькі вядомым, святле. Захар даўно, не сёння і не ўчора, прыкмеціў схільнасць Гусарава ва ўсім паходзіць на Ціхана і заўжды ўпотай пасмейваўся, бачачы марнасць яго намаганняў.

«Вялікім стратэгам пнецца сябе паказаць...»

Цяпер жа ў абліччы Гусарава прабілася нешта новае, сваё, выразная і блага прыхаваная, амаль непрытоеная туга, неражытыя і незагоены боль, і Захар нечакана падумаў пра тое, што дужа ж мала, дакладней аніколі, глыбока не цікавіўся асабістым жыццём гэтага чалавека.

«А няма ў мяне патрэбы гэтае жыццё ведаць...»

Варухнулася ў душы старая непрыязнасць, якая, прынамсі, не мела пад сабою грунтоўнай падставы, і Захар, ві-

таючыся з Гусаравым за руку, прамовіў з жартаўлівай павучальнасцю:

— У гэтага багацця ёсць гаспадар, і ў яго, калі хочаце ведаць, не дужа-ткі разгуляюцца аматары пажывіцца.

— А хіба ж ёсць яны, акрамя нас?

Яшчокін, выбраўшы з лазовіка самы буйны і чырванабокі яблык, сказаў, як бы падтрымліваючы Захараву думку, але і ў піку гусараўскаму жарту:

— Было б багацце — аматары падгрэбці яго да сябе бліжэй адразу знойдуцца.

З саду ішоў Падрэз, цягнуў, трымаючы аберуч перад сабою, вядро ігруш, маленькіх, але жаўтлявых, як напшігаваных чыстым, толькі штоператопленым воскам.

— Дулечкамі частуйцеся,— гасцінна сказаў ён, стаўляючы вядро побач з лазовікам.— Дажджы цярэбяць іх, як боб, асыпаюцца. Каб раней дажджы, дык буйнейшыя б былі,— і раптам уздыхнуў, у голасе загучала туга і скруха: — А мае як там дулечкі жывуць? Хто іх там да ладу давядзе?.. Не сцерпіць душа, мабыць, паплятуся дамоў...

— Усё па сваім садку бядуеш,— папракнуў Гусараў.

— Ведама! А як жа не бедаваць? Сваё, не чужое ж...

Падрэз прамовіў гэта з выклікам, пакрыўджаным тонам, і Гусараў адчуў, улавіў яго настрой. Але ён нічога не сказаў, глядзеў толькі ў спіну Падрэзу, які шпараваў да хаты, потым прамовіў, як бы дакараючы чалавека, які не пагадзіўся з ім і якому даравäць тое было яму цяжка:

— Мітынгуе Важнік, відаць, у Мураў'ях. Гэта ён любіць!

— Адтуль учора людзі прыходзілі. Прасілі, каб не бурылі стрэхі. Важнік тады ж, з імі, і паехаў.

Гусараў, шырока размахнуўшыся, шпульнуў агрызак за яблыню, выхапіў з лазовіка чырванабокі яблык, сказаў, абціраючы яго аб падкладку зеленаватага, з вузкім шэрым каўняром бушлата:

— Загад ёсць загад. Што, цяжка растлумачыць народу?

— Растлумачвалі. А людзі што? Гэта, маўляў, камандзір роты прыдумаў. Усё на яго, Пажогу, вернуць.

— Ну і дэмакраты,— з пагардай сказаў Гусараў.— З-за нейкай адной ялінкі ніколі лесу не бачаць. Дзеля іх карысці загад. А яны — у хамут. Слабая, значыцца, прапаганда!..

Захар не ўмешваўся ў гаворку. Схіліўся над вядром, выбіраў ігрушу, намагаючыся прыгасіць непрыязнасць да Гусарава. Вось жа як дзіва нейкае — зусім, ну зусім не мяняецца чалавек! Нібыта час і не ўладарны над ім. Гэткая ж, як тады, на пачатку лета, у садзе Падрэза, катэгарычнасць ва

ўсім. Нават цяпер дык яна і яшчэ больш надкрэсленая, выпірае з кожнага слова, яшчэ больш заняты зрабіўся ў сваёй ахвоце быць падобным на Ціхана, надрабляе і голас, і рухі, і рэзкасць у сваіх вызначэннях і выразах. Узяў вось Падрэза пакрыўдзіў. А старому хіба салодка тут, у чужой хаце? Праўда, сваякі нейкія тут у яго, але ж гэта не свая сядзіба! Ведама ж, пра свой куток думае, пра гародчык, пра садок, дзе ўсё сваімі рукамі насаджана... І ён, Падрэз, мог, між іншым, папракнуць Гусарава, што гэта, маўляў, не па сваёй ахвоце даводзіцца бедаваць па сваёй хаце — стаяў жа штаб атрада. Як там было заставацца? Ды першы паліцай яму б кулю ўсмаліў. Так што дарэмна Гусараў Падрэза папракнуў. А гэтае стаўленне да мураў'ёўцаў? Вяскоўцы прыходзілі не скардзіцца, а прасіць, каб стрэхі з хат не бурылі. Але ж іншага выйсця няма. Чарга з кулямёта запальваючымі кулямі, і хата гарыць, за ёй другая — палову Вуглоў гэтак выкаціў агонь. А пасёлак ля Мураў'ёў колькі фашысты ні абстрэльвалі — стаіць. Там стрэхі даўно паскідалі, пяску, дзірваноў замест іх навярнулі — цалюткія будынкі стаяць. І людзей таму трэба скрозь перакопваць, нельга ж усё загадам, прымусам — страху, якую твае ўласныя рукі будавалі, не гэтак проста бурыць. А Гусараў гэтага не разумее.

Нечакана прыгадалася прымаўка, якой Файзуло ляпнуў Гусарава ў трохкутніку, на пасяджэнні выязнога бюро райкома — «З крывога коміна і дым крывы». Сапраўды, нібыта ўвесь час атрымлівае ён, Гусараў гэты, нейкія крывыя, далёкія ад сапраўднасці звесткі і, грунтуючыся на іх, дзейнічае, гаворыць, жыве.

«Гусараў, значыцца, нязменны. А ты? Дужа ўжо ты зменлівым сябе лічыш!..»

Раптоўна гэтая думка нечакана павяла развагу Захара зусім у іншае рэчышча. Тое, што Захар перажыў нядаўна ў сне, яшчэ не зусім адляцела, было ў сэрцы, і ён са здзіўленнем зразумеў, што думае пра Гайдаш інакш, зусім не так, як думаў тады, у садзе Падрэза, калі Файзуло спрачаўся з Гусаравым. Тады ён, Захар, быў задаволены, што ўдала і лёгка разблытаў вузельчык, які замінаў яму кіраваць атрадам, проста жыць незалежна, жыць толькі ў сваім горы, нікога не падпускаючы і блізка да свае бяды. Тады ён супакойваў сваё сумленне тым, што аніякага вузельчыка няма, што ён прыдумаў яго, што Гайдаш пайшла на баявое заданне, якое выканае і вернецца. Хай сабе потым, калі Гайдаш была ўжо ў дарозе з калонаю, ён папракаў, лаяў сваю слабасць і непаслядоўнасць, але ж ён верыў, яго ніхто не зможа папракнуць у легкадумнасці. Тады на першым плане, паў-

сюль і скрозь, на адзіноце і сярод людзей, заўжды былі думкі пра сям'ю, скруха і туга па Зінаідзе і дзецях, а думкі пра Гайдаш не прымаліся ўсур'ёз, заставаліся ўвесь час як бы ўбаку, былі нечым другарадным. Цяпер жа ўсё як бы перакруцілася: скруха і туга засталіся, нават намацнелі і білі ў сэрца яшчэ больш балюча, але білі здаля, як бы адольваючы думкі пра ліст Гайдаш, які ляжаў у кішэні скуранкі.

— Што добрага чуваць на фронце, таварыш Гусараў? — падаў голас Юрша, і Захар быў удзячны яму за тое, што ён наводзіць Гусарава на асноўную гаворку. Гусараў жа не на тое прыехаў, каб яблыкаў пакаштаваць!

— Там — не ў нас. Поспех за поспехам,— сказаў Гусараў, гледзячы на яблык, які быў заціснуты ў правай руцэ; выгледзеў самае смачнае месца, адкусіў.— Курская бітва, як вам вядома, скончылася. Учора ўвечары перадалі: вызвалена Ельня,— ён памарудзіў, пажаваў яблык.— Шматпакутная Ельня. Там, мабыць, жывога метра зямлі не знойдзеш... А сёння ранкам — новая радасць: вызвалены Таганрог. Ідзе паспяховы наступ на Марыупаль.

Яштокін уголас зарадаваўся:

— Калі гэтак добра пойдзе і далей, дык мы на кастрычнік па хатах разыдземся!

— А Берлін? — кінуў, як выклік, Юрша.— Не-е! Ты як хочаш, а я ў Берлін павінен падскочыць. Хочацца мне па іхніх вулках патэпаць.

— Ён — хоча! Адпаасобнік гэткі адшукаўся! Я што меў на ўвазе? Адтуль, з Берліна, па хатах сваіх шухнем!

Гусараў скептычна ўсміхнуўся:

— Варажыла бабуля, на ноч гледзячы! Дай бог, каб налета туды нам убіцца,— Гусараў неяк вяла ўзмахнуў рукою, і Захар заўважыў, што гэты рух як загіпнатызаваў Яштокіна і Юршу, яны стаіліся ў напружаным чаканні.— Дарэчы, нам дык увогуле пра іншае трэба думаць. Першае: новы этап «рэйкавай вайны» — да яго будзем рыхтавацца. Ведаеце, дарэчы, колькі рэек было ўзарвана ў першую ноч «рэйкавай вайны»? Чатырыста дваццаць тысяч рэек!

— Беларускімі партызанамі?

— Не толькі. Усімі атрадамі, што дзейнічаюць у тыле ворага. І, кажуць, начальнік рамонтных чыгуначных брыгад пасля той ночы скардзіўся: калі яны, маўляў, гэта паўтораць, дык у Германіі не хопіць рэек аднавіць чыгунку. Так што можна лічыць, што адзін залп у маскоўскім салюце — у нашу чэсць!

Яштокін задаволена пацірае рукі:

— Ім, рамонтным брыгадам, мабыць, і не сніцца, што іх чакае наперадзе!

— І не павінна сніцца,— строга перапыніў яго Гусараў.— Я чаму еду сам у кожны атрад і вяду гаворку толькі з кіраўніцтвам? Звесткі пра новую аперацыю на рэйках нікуды не павінны прасачыцца. Загад адтуль,— Гусараў торкнуў рукою ўгару.— Вельмі строгі загад: абсалютная сакрэтнасць падрыхтоўкі аперацыі «Канцэрт»! Каб грымнуць дык грымнуць.

— А што людзям казаць? — незадаволеным голасам спытаў Яштокін.

— Нічога. Ты ж увесь атрад не павядзеш на чыгунку?

— Вядома, не ўвесь. Тол даручаем найбольш кемлівым, смелым.

— Вось ад кожнага з іх і патрабуй высокага майстэрства падрыўной справы. А пра тое, што намячаецца «Канцэрт»,— ані слоўца. Нікому! У атрадзе пра яго павінны ведаць толькі камандзір, камісар, начштаба. Падрыўнікам настаўце задачу непасрэдна ў дзень «Канцэрта». На маршы. Бо замахваемся на вельмі вялікае: увогуле спыніць чыгунку. Спыніць — і кропка!

— Яшчэ каб два разы ўсе атрады схадзілі, дык ёй і канцы.

— Шапказакідацель у цябе, камандзір, начальнік штаба!

— Рэаліст,— пажартаваў Захар.— Праўда, змрочны крыху.

— Не змрочны, сказаў бы я, а рамантычны. Два разы схадзілі б... А каб на гэтыя два разы толу даставіць — два тыдні трэба самалёты ганяць. І яшчэ невялічкая, як кажуць, драбяза: тол гэты трэба ж яшчэ і вырабіць... Ну, але з гэтым усё ясна. Ёсць яшчэ не менш важны клопат.— Гусараў узняў правую руку з адстаўленым указальным пальцам, быццам на нешта паказваў на яблыні, галіны якой звісалі ў яго над галавой, зноў авалодаў увагаю ўсіх, але сказаў, звяртаючыся толькі да аднаго Юрпы: — Учора ўвечары брыгада Жалезняка разам з радыёнаўцамі размалаціла станцыю Крулеўшчына...

— Радыёнаўцы? Якія гэта радыёнаўцы? — Захар здзівіўся шчыра.

— Былыя «народнікі», як іх у нас завуць. Цяпер — першая антыфашысцкая брыгада Радыёнава. Ён — кадравы афіцэр. Маёр. На іх узбраенні — народ у яго ўвесь кадравы, з былых ваеннапалонных нашых — адных толькі гармат каля трыццаткі. Сіла?

— Парачку гарматак нам бы ў атрадзік,— летуценна прамовіў Яштокін.

— Іш ты! Каб і ноўна, і роўна, і кверху дном? Гэтак не будзе.

— Чаму?

Гусараў развёў рукамі:

— Не я тое вырашаю. Гэтую сілу, як мне вядома, пусцяць на рэйд вакол Мінска. Граміць, змятаць буйныя гарнізоны. Частку людзей, праўда, раскідаюць па брыгадах.

— На перавыхаванне? — Яштокін кінуў гэта з'едліва.— Цяпер спахапіліся, калі фронт грукае ў зад. Чаго ж яны летась не пераходзілі да партызан? Летась дык нас смалілі, ганялі па лясах.

— Ацалеў жа. І не схуднеў ты ад таго гаияння,— падкалупнуў Гусараў.

— Я — ацалеў. Затое з кожнага ўзвода — па добрай дзесятцы выбілі!

— Слухай, камісар,— незадаволена, не таячы свайго незадаволення, прамовіў Гусараў.— Я летась шчэ табе казаў: узмацняй палітыка-выхаваўчую работу. Аніякіх жа вынікаў,— і строга паглядзеў на Яштокіна.— Гэтыя свае думкі — адкінь. Так, яны — «народнікі» гэтыя — узялі зброю ў ворага. Узялі, каб ўратаваць жыццё і шчэ паслужыць Радзіме, змыць сваёй уласнай крывёю ганьбу, маладушша, палон. Ты што, хочаш адмовіць ім у гэтым? Мы, партызаны, даравалі ім усё. Яны— у адным з намі страі, роўныя з намі. Роў-ны-я! Гэта — загад! — павярнуўся да Захара, сказаў мякчэй, з даверам, але начальніцкія, загадныя ноткі ў голасе засталіся: — Цяпер планы па сяўбе азіміны. У вас жа гора за ўсіх. Ужо цэлыя сельсаветы адсеяліся цалкам.

Юрша патлумачыў, заўважыўшы, што Захару няёмка слухаць папрокі Гусарава:

— Добра ім за нашай спіною. А ў нас? Большасць жа вёсак — насупраць гарнізонаў ды ўсцяж чыгункі. Удзень паспрабуй там, на полі, патэпаць. Уночы даводзіцца.

— Значыцца, трэба ўночы больш людзей і цягла паставіць,— перапыніў яго Гусараў, і Захар зразумеў, што перапыняць яго, спрачацца з ім зараз — марная праца.— Планы кожная вёска павінна выканаць, у абавязковым парадку. Гэта задача ідзе наперадзе «Канцэрта» — на тое і арыентуемся. І кожная вёска ў нас на ўліку. Памятайце, і няхай гэта ўвойдзе ў розум кожнага: сеем ужо мірны хлеб! Мірны хлеб! Збіраць яго будзем на вызваленай, вольнай зямлі!..— і нечакана змяніў гаворку, нагнаўшы лагодную ўсмешку на твар: — Але, можа, хоціць аб задачах? У якой хаце сёння

бліпцы на сняданак? — зірнуў па ручны гадзіннік, потым пляснуў даланёю ў жывот, паправіў жоўты рэмень, які правіс ад цяжкога трафейнага парабелума.— Вось яго, сябры мае, шчэ анікому перахітрыць не ўдавалася: надышоў час — запраўляй касцёл. З'ем, здаецца, зараз і чорта з рагамі,— затыніў руку на чорнай кабуры, вышараванай з аднаго боку да белі, паляпаў даланёю па ёй, паляпаў гэтак жа, як толькі што ляпаў па жываце.— Штораз здзіўляюся, як гэта яны прадумаліся пістолю сюды, на левы бок, чапляць? Мы на правым баку цягалі — бліжэй, маўляў, пад правую руку. А на левым, выяўляецца, зручней, і хутчэй рука паспявае,— і зноў нагнаў на твар завучаную лагодную ўсмешку, павёў носам.— Ну, дык з якой хаты блінцамі патыхае?

— Наша гаспадыня дранікі сёння пячэ,— сказаў Яштокін.— Калі ласка, на сняданак...

— Улляна Пятроўна цябе, начштаба, штодня блінцамі корміць. Дагадзіў, мабыць? Прызнавайся!

Яштокін сумеўся ад гэтай дасведчанасці Гусарава,— ведае нават імя па бацьку гаспадыні, дзе ён з камісарам кватаруе! — але тут жа ўзяў сябе ў рукі, адказаў з выклікам:

— Не асмельваюся дагаджаць. Вы ж ад нас патрабуеце крыштальнай маральнай чысціні.

— Ён у нас проста душэўны і робіць па гаспадарцы. З таго і маем блінцы амаль штодня,— падрабляючыся пад гусараўскі тон, сказаў Юрша.— Хадзем, Захар Елісеевіч. Разам паснедаем.

— Памыю твар хоць... Вы ідзіце. Я зараз прыскочу...

Захар пайшоў да паркана, дзе на шырокім учарнелым услоне стаяла дзяжа з вадой. Пры хадзе ён скінуў скуранку, садраў кашулю, застаўся ў споднян, шэрай, трафейнай, і закасаў рукавы. Упёршы далоні ў зямлю і абапіраючыся толькі на іх і мыскі ботаў, ён адціснуўся на руках у два разы больш, чым звычайна, упрэў ад стомы, потым старанна і моцна мыў твар халоднай вадою, ліючы яе з драўлянага карца, і, схапіўшы з шулы адзенне, памкнуўся да хаты.

Узяўшыся за халодную ручку дзвярэй, ён, атарапелы, супыніўся — з шыбы, якая напацела знутры тэрасы, утаропіўся на яго нейкі барадач, у расхрыстанай споднян кашулі, з ускудлачанымі валасамі, што доўгай грываю спадалі на лоб, густа абсыпаны буйнымі бліпчастымі пацеркамі. Вялікія цёмныя вочы глядзелі з-за шкла на Захара ва ўпор, і ён схамянуўся, выпусціў ручку, міжвольна пацягнуўся да рэмення, дзе вісеў парабелум. Мужчына за шыбай зрабіў той жа рух, і Захар уголас засмяяўся:

— Сябе ўжо, братачка, не пазнаў!

Адразу, як толькі адчыніў дзверы, Захар убачыў на стале гуркі і місу з бульбай, глытнуў водару смажанай на сале цыбулі, які моцна даў у нос, і таропка прайшоў у вялікі пакой, дзе ў прасценку паміж вокнамі вісела люстэрка. Упершыню за ўсё сваё партызанства ён гэтак уважна вывучаў свой адбітак. Ніткі сівізны былі асабліва прыкметны ў барадзе — не галіўся з таго дня, як пайшла з калонай Гайдаш,— і ён, адкінуўшы з ілба валасы, цярнуў ручнікам па твары. Не, яшчэ пабольшала сівізны, як ускудлаціў валасы. Нос неяк дзіўна завастрыўся, бровы быццам яшчэ больш патаўсцелі, амаль сышліся на пераноссі. І вочы нібыта выцвілі, як сышла з іх сінеча. Здаецца, ён дужа на бацьку робіцца падобны. У таго і вочы і бровы пад старасць гэткія ж парабіліся...

«Да д'ябла бараду! Далоў яе трэба! Не стары я!..»

У думкі гэтыя нечакана ўвайшла зноў Гайдаш. Ён неспадзеўкі адчуў, што хоча выглядаць, калі яна заявіцца ў атрад, маладым, дужым, абаяльным.

«З Гусарава трэба прыклад браць. Той за сваім выглядам сочыць нават і праз меру».

Толькі надумаў і адразу зарадаваўся, пракаўтнуўшы сліну, пачаў ярасна расціраць шыю каляным зрэбным ручніком, гукаў гаспадыні, якая завіхалася ля печы:

— Снедаць, Лявонаўна, з камісарам буду. Гусараў прыкаціў — ля начальства трэба ацірацца.

Гаспадыня, з вілкамі ў руках, стала ў праёме драўлянай пераборкі, што аддзяляла кухоньку ад залы з бакоўкаю.

— А што ж сюды не запрасіў? Свежанінка вось на патэльні. І свой інтэрас ёсць — Гусарава вашага трэба пабачыць.

— На Пётра свайго будзеш скардзіцца?

— А навошта? На Пётра ў мяне і свая зброя ёсць,— яна патрэсла вілкамі.— Хачу, каб камандзіра «Мсціўца» ён прыціснуў, пашараваў...

— Ёсць хіба за што?

— Пастаўку несправядліва бяруць. Сястра ўчора з Ніскуноў прыходзіла. Жаліцца мне, а сама бела як ліпіначка. Мужык у Аўдолі ў арміі. Два сыны — у партызанах. Ды яшчэ ў хаце чацвёра драбнятак, як куранятак. І ёй — роўную з Гэлькай пастаўку: і на малако, і на бульбу, і на хлеб. А Гэльчын брат — паліцыянт. І чатыры дзеўкі — кабыліцы — штовечар п'юць і паюць. Маглі б і болей за Аўдолю з малымі куранятамі і бульбы здаць, і ячменю натаўчы, і сена накасіць. А яны што? У працы калі ўпрэюць? Скулле!

А настаўку — роўную здаюць. Справядліва? — і чакала, адставіўшы вілкі ўбок і на іх абапіраючыся.

— Зусім несправядліва,— пагадзіўся Захар. Ён наважыўся быў і далей гаманіць з гаспадыняю, даведацца больш падрабязна аб усім, але згадаў, што Гусараў жа, напэўна, чакае, і таропка паабяцаў: — Я Гусараву дала́жу.

— Дала́жу — адно. Трэба, каб захады прыняў.

Было ніякавата, быццам ён, Захар, сказаў адчэпнае, нічога канкрэтнага не параіўшы гаспадыні, і ён зноў, але цяпер з націскам, паабяцаў:

— І дала́жу. І на абедзе сюды яго, да вас, заваляку. Так што свежаніпка не прападзе. А як за стол сядзе — вы яму на Аўдоліных нотах і пайграйце.

— Ды я ўжо грукну ў бубен. Хаї толькі заявіцца. Узялі ды Гэльку з гэтай гаротніцаю ў адну пітку паставілі. Несправядліва!

— Усё будзе па справядлівасці. Абяцаю!

Захар, выходзячы з хаты, намысліў адразу ж расказаць Гусараву пра гаворку з гаспадыняю. Але не зрабіў гэта за сняданкам — яго ўжо чакалі, спехам пасадзілі за стол, уцягнулі ў размову вясёлую і жартоўную, нават з чаркаю,— не зрабіў і пазней, калі яны з Гусаравым ехалі верха на конях у Мураў'і. А там дык і ўвогуле гаворка з гаспадыняй і зусім вылецела ў яго з галавы.

Вывернуўшы з бярэзніку на вузкі выган ля аселіцы, Захар пачуў людскі гармідар, потым згледзеў ля першай хаты, што стаяла ў нізіне, як бы адскочыўшы ад вёскі, жанчын, якія тоўпіліся вакол Важніка. Крыху воддаль, на зялёным замшэлым граніце, сядзеў Пажога, круціў цыгарку.

— Ну, што я казаў? — у радаснай урачыстасці выгукнуў Гусараў.— Мітынгуе! Але ж, на жаль, не ён кіруе мітынгам. Яго, здаецца, па ўсіх правілах цісвуць кабеты!

Цяпер быў ужо чуцён пранізлівы, рэзкі жаночы голас, які выбіваўся з бязладнай, нецярплівай людской гамапы:

— Прыйшлі ў маю хату і б'юць майго тату. І-іш, распараджальнікі вышукаліся!

— А як згарыць? Лепей будзе?

— Хай са страхой гарыць,— напірала жанчына.— Як мне ў ёй жыць, без страхі? У людзей — мужчынкі, яны сабе стрэшкі ўмомант скідаюць. А мне, кабеце адзінокай, як страху на месца прыладзіць?

— Узвод дапаможа. Камандзір жа роты вам абяцае. Так, таварыш Пажога?

— Я ж і кажу: усёй ротаю навалімся на страху.

Гусараў, які чуў адказ Пажогі, кінуў жартаўліва, саскокваючы з каня:

— Страха не вытрывае роты гэткіх малайцоў!

Пажога не разгубіўся, знайшоў адказ адразу ж:

— Вытрывае, калі на зямлі ляжаць будзе.

Гусараў сказаў ціха, але з пагрозаю:

— Страха павінна ляжаць там праз паўгадзіны!

— А што я магу? Уперлася ж баба, як кабыла ў дышла!

— Канчайце, канчайце гэты кірмаш. За вярсту гармідар чуваць. Народ зараз з усяго наваколля набяжыць. Што, ля кожнай хаты гэтак мітынгуеце?

— Не, толькі ля гэтай.

Важнік, парукаўшыся з Гусаравым, папрасіў Пажогу, папрасіў разважліва, памяркоўна, але з намерам, каб кожнае слова было чуваць гаспадыні хаты:

— Хай стаіць страха. Загадайце сваім людзям ісці па ўзвадах. Але, калі, крый божа, загарыцца ў часе бою, каб аніводны чалавек і блізка да хаты не падыходзіў. Хай гаспадыня тады адна агонь гасіць.

— Не навучыліся шчэ, гляджу, з народам гаварыць,— ціха папракнуў яго Гусараў і, адкрыўшы планшэтку, выцягнуў блакнот і пачаў нешта пісаць у ім. Скончыўшы, алоўкам паманіў гаспадыню да сябе і, калі яна наблізілася і стала побач, працягнуў выдраны з блакнота аркушок.— Гэты дакумент захавайце. Пасля вайны падойдзеце з ім у сельсавет — навюсенькую страху дзяржава наставіць. Новая ж лепей. Праўда ж? — і зноў спытаў пераможна, з усмешкай пазіраючы, як кабета хавае паперчыну пад крысо чорнай, спрэс у латках паддзёвачкі.— Дык што, бурым страху?

Жанчына заўсміхалася, са згодаю махнула рукою, паклыпала да хлеўшка не азіраючыся.

— З якога боку браць? — гукнуў Веліканец, які стаяў ужо на драбінах, прыстаўленых да краю страхі.— Мо падсячом спачатку кроквы? Які загад, таварыш камроты?

Пажога засмяяўся:

— Валі валом, а потым разбяром,— і, пыхнуўшы сінім пахкім дымам, ціха паведаміў Захару: — Гнацюк вярнуўся. Адсыпаюцца хлопцы на сене ў Плігаўцы.

Захару падалося, што Пажога панізіў голас знарок, каб Гусараў нічога не пачуў, і спытаў таксама цішком:

— Усё ў парадку?

— Жартуюць: як у танкавых, маўляў, часцях. Стаміліся дужа: толькі на сена ляглі — захраплі. Я ўжо іх і не тузаў. Усе жывыя, дык хай і адсыпаюцца.

Гусараў набліжаўся да іх, энергічна ўзмахваў рукою ў такт словам, павучаў Важніка:

— Галоўнае — неракапаць. Вось яна напярчыну атрымала — неракапалася: парадак будзе. І — супакоілася. І народ не бударажыць. Да кожнага чалавечага сэрца ёсць ключык. Задача райкома — гэты ключык знаходзіць. І заўсёды мець яго ў руцэ.

Важнік пажартаваў:

— Дык як жа тады ваяваць? Страляць, скажам, трэба, а рукі — ключыкамі занятыя!

Гусараў пагразіў яму пальцам:

— О-ой, сакратар! Усцца ён, як ластаўка перад дажджом. Глядзі, каб не было табе, як таму цыгану на полі.

— А яму як было?

— Це-есна,— працягнуў Гусараў.

— У нас жа вунь: праста-ора.— Важнік павёў рукою наўкола сябе, як бы запрашаючы Гусарава падзівіцца, якая шырокая прастора вакол вёскі.

Гусараў, абсякаючы жарты, сказаў строга:

— З таго, што прастора, дык ты, скажу табе шчыра, і спіш у шапку. Са стрэх — праблема! З прыёмам у партыю па атраду — праблема! Абком вас на якую лінію нацэльвае? Каб у кожным узводзе — свая партгрупа. А ў вас?

Падкрэслены, двойчы паўтораны зварот на «вы» — гневаецца Гусараў, цяпер яму пярэчыць небяспечна. А Важнік — прэ напралом. І што ён хоча давесці? Ён, Захар, таксама казаў, што трэба больш актыўна прымаць людзей у партыю. І Пажога на гэтым настойваў. А Важнік усё па-свойму хоча паставіць, усё патрабуе: прыём у партыю — не канвеер. Вось хай цяпер і папацее. Гусараў з яго стружачку па-агоніць!

Гусараў сеў на замшэлы граніт, на якім перад гэтым сядзеў камандзір роты, кіўком галавы паказаў Важніку на месца побач — размова ў іх намячалася доўгая. Захару карцела яе паслухаць, але жаданне хутчэй убачыць Артура, дачуцца пра тое, што робіцца ў трохкутніку, перамагло, і ён сказаў Гусараву, што хоча падскочыць у Плігаўку, а потым вернецца.

— А навошта вяртацца? — Гусараў быў нават задаволены, што Захар зараз з'едзе.— Мы з Важнікам туды следам прыкацім...

Апошнія словы Гусарава амаль заглушылі звонкае візгатанне — Веліканец выдзіраў іржавы цвік,— потым трэск і грукат: ляцелі на дол, ламаючыся, кроквы страхі.

Ускочыўшы ў сядло, Захар адразу пагнаў каня алюрам,

але яшчэ нейкі час чуў за спіною ўдары сякеры, трэск сухой дзеравіны, прапізлівае вісгатанне цвікоў, якія жывасілам драў Веліканец. Потым гукі разбурэння адразу зглухлі, прапалі, і за нізінкаю, на бярозавым узлеску, дзе на маладых арабінах густа рдзелі буйныя гронкі ягад, ён учуў бязладны посвіст драздоў, заслухаўся, апусціў повад, не падспешваў каня, ехаў ціха, мерна ківаючыся ў сядле.

На наваротку ўзлеску, якраз насупраць другой хаты Плігаўкі, які захіпуў доўгі, з саламянай страхою хлеў, Захар убачыў Артура. Артур сядзеў на зламанай летась у навальніцу асіне з вялікай гронкаю чырвоных рабінавых ягад у руках. Павярнуўся ён да Захара не адразу, як не заўважаў яго, але потым падхапіўся, ускочыў і ступіў насустрач на дарогу.

— А мне сказалі, што спяць хлопцы як пшаніцу прадаўшы,— сказаў Захар, саскочыўшы з каня і абдымаючы Артура.— Чаго не спіцца?

— Ліха яго ведае. Прыдрамаў — адразу і падняўся, як хто гукаў...

Захар нечакана прыгадаў, як улетку, калі яны выбіліся з трохкутніка, ён, наведваючы заставы атрада, наляцеў на Артура і Рыму, якія сядзелі якраз тут, ля гэтай, зваленай перуном асіны, і наважыўся быў пажартаваць — не спіцца, маўляў, бо месца, дзе з Рымачкаю быў, цягне! — і стрымаўся, разважыўшы, што пакрыўдзіць чалавека, які вярнуўся з адказнага і небяспечнага задання.

— Саспела? — спытаў ён і адшчыкнуў з гронкі шчопаць ягад, кінуў у рот, жаваў, чамусьці баючыся распытваць Артура.— І смачная, глядзі ты. З таго птушкі яе і латошаць...

— Дакладваць аб выніках?

— Дакладваць будзе Гнацюк. Ты — пра галоўнае. Пра Чаславу...

Артур таксама кінуў у рот шчопаць ягад і, крывячыся ад кісліны, пакруціў галавою адмоўна, не пакідаючы надзеі на добрую вестку:

— Ані... Каб табе знак — анідзе і нічога. Дзве патайныя нашы зямлянкі — нечапаныя: там аніхто не быў. Па вёсках — не чуваць. У Ліцвінаве і Зуях — бяда: нехта пад выглядам партызан арудуе. Хаты трасуць, кароў, свіней забіраюць. Тое, што фашыст не забраў, што ад яго схавалі на лясах,— гэтыя падчышчаюць...

— Ці не Багдан? — мімавольна вырвалася ў Захара. Ён сеў на пашчапаны камель асіны, раскілзаў каня, пусціў нанасвіцца — пад маладымі рабінкамі густа буяла не пабітая прымаразкамі трава.

— Не, не ён. У Зуях бы яго адразу пазналі. Група ходзіць незнаёмых — чалавек з дваццаць. І што дзіўнае: кароў набралі ў чатырох гаспадароў. Усе чатыры — сем'і партызанскія. Мы тройчы засады рабілі. Як папярэдзіў іх хто — група тая анідзе не абазвалася...

Захар, разумеючы, што на месцы Артура зрабіў бы, відаць, тое ж самае, папракнуў:

— Рабіць тыя засады не трэба было. Я ж вас папярэджваў: не выяўляць сябе, выконваць асноўнае заданне.

— А мы яго і выконвалі. І выкапалі. Праверыўшы склады, нават і блізка да іх не падыходзілі — навошта ж след лішні пакідаць. Здаля ўбачылі: неруш, збожжа ляжыць цалюткае.

— Пад Шо заходзілі?

— Так. Маці, праўда, я не казаў, не адважыўся. У іх жа там бяда... А-а, дык гэта ўжо вядома. У Тосі як мову адняло, толькі вачыма зыркае. А гаварыць — не гаворыць.

— Трэба ім ісці адтуль.

— Матуля не хоча. А цяпер дык і ўвогуле яе з хутара не скранеш. Тосю ж адну яна не аставіць...

— А што ў Пятроўцах і Завалынцы?

— Ціха. Але вяскоўцы з недаверам пазіралі на нас. Кінулі, маўляў... Ды цяпер гэтыя бандзюгі, што нашым імем прыкрываюцца. Трэба ўзяць роту — і туды. Пералавіць, расстраляць. Усіх пад качалку!..

Захар слухаў Артура, і на сэрцы было пагана. Адчуванне свае ўласнае віны — ва ўсім, літаральна ва ўсім, пра што казаў Артур! — выспявала ўпарта і нястрымана, нібыта ён, Захар, і сапраўды быў вінаваты ў тым, што недзе знікла Чэся, што па вёсках шнырыць нейкая банда, што трагічна загінула жонка Шлыка. Захар разумеў, што гэтая яго згрызота зусім не абгрунтаваная, што аніякіх папрокаў ён не заслугоўвае. Але думка пра тое, што нехта там, у трохкутніку, лічыць яго ўцекачом, бязвольным камандзірам, які не абараніў вяскоўцаў ад чужынцаў, не пакідала яго, зламала, спараджала гаркоту і крыўду, і ён пакутаваў зараз гэтак жа, як пакутаваў заўсёды, калі стаяў ля магіл на пахаванні партызан свайго атрада. Апошні час па пахаваннях, якія, праўда, пасля пераходу чыгункі былі рэдкімі, ён са здзіўленнем заўважаў, што боль страт глыбока не запаўзае ў сэрца, хутка сплывае, адціснуты клопатам новых дзён і трывог. Цяпер жа боль быў незвычайна востры, ён цяжка асядаў у сэрцы, і Захар здагадваўся, што ён, гэты боль, будзе жыць у душы доўга, след ад яго не загладзіцца.

— Кінулі нас...— Захар нетаропка паўтарыў Артуравы

словы і песпадзеўкі для самога сябе прызнаўся: — Гэтая думка мяне мучыць, даўно ўжо мучыць. Разумеў і раней: гэтак, напэўна ж, вяскоўцы скажуць. А цяпер вось ты пацвердзіў... Віна, ведама ж, на мне ляжыць...

— Віна? На вас, дзядзька Захар? Ніхто гэтага не гаворыць. Нават і слоўца пра гэта я не чуў.

— Сэрца гаворыць маё. Штодня. І каб жа ты ведаў, дарагі Арцік, як мне хочацца туды, да Дзвіны. Вось, здаецца, каб убачыў яе, каб вадзіцы з крынічкі ля Дзвіны папіў — нанова б нарадзіўся...

Артур выгукнуў хутка, з вясёлым запалам:

— А чаго чакаць? Бяром роту — і туды! Дарога праверана, закрыўшы вочы, павяду!

Захар прыгарнуў Артура да сябе, хацеў быў пасмяяцца з яго наіўнай прапановы, і раптам з горыччу вырваліся, наўпярэк волі, зусім іншыя словы:

— Добра быць маладым! Шкада толькі, калі малады, гэтага не заўважаеш і не разумееш. Пазней спасцігаеш, не малады ўжо калі...

У расшпіленай скуранцы — Артур скамечыў яе плячом — зашамацеў, нават вылез адным куточкам ліст Гайдаш. Захар запхнуў яго глыбей у кішэню, і ад дотыку да мяккай паперы з сэрца раптоўна сплыла радасць, што выклікала наіўная Артурава прапанова. Пайсці да Дзвіны... Як ты пойдзеш туды? Па-першае, Гусараў не дазволіць. Па-другое, ёсць шмат іншых прычын, якія ад яго, Захара, нават ад Гусарава не залежаць. Як гэта казаў сёння Гусараў? «Твой атрад стаіць ля паўночнай брамы ў наш партызанскі край». І не яго гэта словы — па нарадзе ў штабе брыгады ішла пра тое гаворка. Паспрабуй пакінь гэтую браму адкрытай — гэта ж як здрада будзе. А ўвогуле, усё дзіўна неяк складваецца ў Захаравым жыцці партызанскім. Там, ля Дзвіны, калі Ціхан бачыў партызанскія акопы, ён казаў пра браму. Відаць, гэткі ўжо твой лёс, дружа, стаяць заўсёды ля брамы. А спярша заўсёды куды грукаюць? У браму, ведама ж! Хай сабе! Але тую банду ля Дзвіны зла віць трэба! Роту не здымеш з абароны. А ўзвод ён пашле! Ён, Захар, давядзе гэта Гусараву. А тады, злавіўшы банду, у тых вёсках, дзе яна рабавала людзей,— і судзіць і расстраляць.

— Пайшлі,— паклікаў Захар Артура.— Хочацца на Гнацюка зірнуць. Хопіць яму па вуха ціснуць.

Захар узняўся, пацмокаў губамі, і конь, завеськаўшы цуглямі, паслухмяна прытупаў да зламанай асіны, стаяў, аддана наставіўшы вялікія бліскучыя вочы на свайго гаспадара.

3

*БЛАКНОТ РОМЕЛЯ. Старонка шостая.*

«Каб спазнаць радасць і гора, прыходзіць у гэты свет чалавек. І самы мудры з мудрых не ў стане набудаваць свой лёс іначай. І самы разумны сярод разумных памрэ гэтак жа, як памрэ апошні дурань,— несмяротных няма.

Цяпер, калі зляцела з мяне амаль усё шалупінне, якое пагналі мне ў галаву тыя, хто лічыў сябе разумнейшымі ад усіх, я спасцігаю сапраўдную мудрасць зямлі, якую, мабыць, наканавана, у свой час, спасцігнуць кожнаму: чалавек — таямніца, якая чалавеку непадуладна.

Дзеля чаго ж тады чалавек?

Хачу спасцігнуць людзей, якія вакол мяне, і не магу. Шмат разоў мне здавалася, што я, урэшце, дапяў да гэтае таямніцы. Але пачынаўся новы дзень, і ўсё тое, што я спасцігнуў учора, выглядала наіўным і смешным.

Гэтак, прынамсі, і сёння. Ад месца, дзе я зараз, чыгуначная станцыя, калі напрамкі, кіламетры чатыры: пры ціхім надвор'і чуваць татаканне колаў з чыгункі, з дрэва дык і цягнік добра набачыш. Па загаду камандавання брыгады атрад літаральна зарываецца ў зямлю тут, на гліністых выспах паміж азёрамі: акопы поўнага профілю, хады злучэнняў, бліндажы, кулямётныя кропкі, фугасы на месцах, дзе могуць прайсці танкі. Учора мне здавалася, што ўсё гэта мае сэнс: злева і справа іншыя атрады робяць тое ж самае — мора крыві давядзецца праліць таму, хто паспрабуе адолець гэтае азёрнае дэфіле, каб трапіць у партызанскую зону. А яна, тая зона,— на дзесяткі кіламетраў. Гэта — неверагодна. Гэта — немагчыма сабе ўявіць. Той, хто не бачыў, не паверыць. А я — бачыў: двойчы мы ездзілі на конях ва Ушачы. Гэта — былы раённы цэнтр, і ён у партызанскіх руках. Чырвоныя сцягі над будынкамі. Школы, дзе ідуць заняткі... І гэта — тыл арміі, якая лічыць сябе пераможцай? Дзікае парушэнне ўсіх законаў, па якіх павінна ісці вайна!

Але гэта — учарашнія думкі. Сёння з чыгункі даў колькі залпаў бронецягнік: снарады ўзаралі тарфяную багну за возерам, а пяць, здаецца, ляглі ў ваду, і возера зрабілася белае ад рыбы. О, майн гот! Той, хто не бачыў, не паверыць: тлустыя, як паленцы, ліны і карасі, ляшчы — шырынёю з рыдлёўку, шчупакі — адной рукою не ўзняць... Цэлы ўзвод шуснуў на возера па здабычу. Усе галёкалі, жартавалі. А я глядзеў на гліністыя выспы, бачыў не рыбу — абаронцаў акопаў, якія ляжаць пузам дагары. Пяць такіх вось залпаў, і

што застанецца ад гэтых партызанскіх дотаў, кулямётных кропак? Марную працу робіць атрад. Няўжо камандзіра не навучыў горкі вопыт акопаў ля Дзвіны? Пайсці і сказаць?

Увечары еў дзівоснага смаку рыбу, і намер гэты вылецеў з галавы. Ляшчоў Шлык абмазваў глінаю і клаў на гарачае вуголле: гліна цвярдзела, і рыба спякалася, быццам у гаршку,— белая, духмяная, аж растае на языку. І яшчэ — кварта ляснога шнапсу. І ўсё туманілася ўваччу, як наплыло. Зоры ажно скакалі ў трыснягу, зялёным нават уночы.

Ранкам, калі ўзышло сонца, я, разам з усімі, рабіў працу, якую лічу марнай. Няўжо яны не разумеюць, што, паказваючы сябе ворагу цалкам — самалёты з дзесяткі разоў праляталі над гэтымі выспамі,— добраахвотна рыюць сабе магілы?

Дзікая зямля. Дзікія людзі. Хто, калі зможа цалкам спасцігнуць і душу яе, і сэрца іх? Майго асабістага розуму тут мала!..»

## 4

Зляжалы жвір насыпу быў цвёрды, як страмбаваны, і апошнюю, чацвёртую, толавую шашку на стыку рэек Артур прысыпаў даўжэй, чым усе папярэднія — балелі абадраныя пальцы. Падсыпаючы і падграбаючы колкі, непадатны жвір, ён увесь час пазіраў управа, дзе мініравалі масток Траян і Жаўрук. Да масточка яны падышлі ўсе ўпяцёх, раскруцілі дрот, заставалася пакласці на ўстоі тол, і Артур вырашыў, што зробіць гэта лёгка і ўдвух — Клубіча і Чуркіна ён паслаў улева ад масточка,— і сам, каб не губляць час, пачаў ладзіць зарад на стыку рэек. Здаецца, хопіць ужо жвіру: надзейна ляжыць тол. Але ж не запаліш шнур, трэба чакаць хлопцаў ад масточка. А яны нечага там валаводзяцца.

Са станцыі і з бункераў злева раз за разам узляталі ракеты, амаль несціхана сакаталі кулямёты. Доўгія ленты трасірак праносіліся часам зусім блізка, і разрыўныя кулі з сухім трэскам лопаліся ў гушчары ахоўных пасадак.

Прыгнуўшыся, да Артура падбег Жаўрук, прысеў побач.

— Што вы там марудзіце? — Артур чыркануў карабком па запалцы, прыстаўленай да зрэзанага наўскос шнура.

— Дроту поўна пад масточкам. Кручана-перакручана.

— Гарыць. Каціся з насыпу!

— Можна і не спяшацца цяперака!

— Уніз, кажу! Пад адхон!

Пераскочыўшы рэйкі, яны скаціліся пад адхон. Трава ля насыпу, закіданая пяском першых выбухаў, была шархот-

кая, смярдзела дымам, і ад яго слязіліся вочы, драла горла. Артур разгроб траву рукою, прыціснуўся шчакой да зямлі; над каляным холадам травы зямля, прапахлая горкім дымам, была дзіўна цёплая.

— З дротам яны справіцца не могуць,— буркатнуў Артур, нацягваючы каўнер фрэнча на шыю.— Прыкрый, прыкрый галаву.

— З дротам лёгка справіцца. А яны ж на яго гранаты папавешвалі. Добра, што Дзімка заўважыў. Каб не ён — канцы нам усім.

— Зараз, як тут грымне, падбяжым. Падрыўнікі ліпавыя, гранатам рады не дадуць. Нацягні, кажу, каўнер.

— Не дужа яго нацягнеш. Нейкія кароткія фрэнчы пачалі фрыцы шыць. Каўнерык, бы акравак.

— Трэба ж было мерку ім паслаць, каб на цябе і шылі. Цяпер вось і пакутуй.

— Нічога, нядоўга ўжо засталося, сцерпім неяк...

Артур шчыльней нацягнуў на патыліцу каўнер трафейнага фрэнча, патрос галавой, страсаючы халодны дробны жвір, што насыпаўся з каўняра, і сціснуўся, прыціскаючыся шчакою да зямлі, прапахлай горкім дымам. Ён ведаў, што зараз на насыпе загрымяць выбухі, але не чакаў іх і неяк імгненна адасобіўся ад усяго. І Жаўрук, які ляжаў побач, уціскаючыся ў адхон насыпу, і каляровыя ленты трасераў, што па-ранейшаму па ўсіх напрамках кроілі неба,— усё гэта было побач і, разам з тым, дужа далёка, як бы адсунутае некуды за дрогкую цемру ночы.

У белаватым, з жоўтымі плямамі святле ракеты дзіўна зыбаўся далёкі грабеньчык лесу. Дзве старыя бярозы, што стаялі адзінока пасярод поля, здавалася, зусім да лесу падціснуліся, як бы напалохаўшыся свае адзіноты. Але ад лесу яны далёка, і, калі павярнуць управа, можна выбіцца на знаёмую сцежку да хутара. Ён, Артур, сёння абавязкова туды заскочыць — маці чакае. І, ведама ж, нервуецца, пакутуе, баіцца, каб з ім, Артурам, не прычынілася якая-небудзь бяда. Але ж ніякай бяды з ім не прыключыцца, бо з ім замова ад ліха, замова, якую пры кожнай сустрэчы робіць Рыма. Ён звычайна смяяўся з тае замовы, пацвельваўся і верыў толькі ў добрае. Дзіўна абвострана ўспрымаючы небяспеку на заданнях, ён ганарыўся, што лоўка выводзіць групу з рызыкоўных сітуацый, клапаціўся аб сваіх людзях і трывожыўся, але добра разумеў, што аніякая небяспека для яго асабіста болей не існуе: калі ён, прыцярушыўшы саломай спарады ў фурманцы, садзіўся на іх верхам, каб не раскатваліся на паваротках дарогі, калі потым выплаўляў з іх тол у старой

калгаснай кузні на ўзлеску ля балацінь, калі закладваў міны ці ляжаў у засадзе па гравійках — паўсюль і заўжды з ім была Рыма. Яму заўсёды мроілася, што яна і сапраўды пабач, ласкава паглядае, пазірае за ім з клапатлівай трывогаю, і яму хацелася, каб яна бачыла яго толькі мужным, смелым, удачлівым.

Яна была з ім і цяпер, і ён чуў яе голас — голас быў, як заўсёды, выразны і чоткі,— і ён нідзе і ніколі не губляўся, бо жыў у сэрцы. І гэткім жа выразным быў Рымін твар: ён бачыў Рыміны вочы, бачыў яе губы, бачыў рукі, што знаёмымі рухамі папраўлялі валасы, адчуваў на сваёй шыі дотык яе пальцаў, адчуваў на сваіх губах знаёмую п'янкасць яе пацалункаў — усё гэта таксама жыло ў сэрцы.

Над галавой тройчы, як бы адно ў адным, пыхнула грымлівае белае святло, выгнулася, быццам вырвалася з-пад шчакі зямля, гарачая пругкая цеплыня ўдарыла па шыі, з нудным віскатам панесліся ў ноч каменьчыкі, узнятыя выбухамі. Выбухі грымелі адзін за адным і справа і злева, але гэтыя тры былі яго, Артуравы, і ён гэта добра адчуваў. Але ж дзе чацвёрты? Ён жа мініраваў усе чатыры стыкі!.. Мо што-небудзь з дэтанатарам? Але ж не павінна: пяньковыя шнуры — усе чатыры — свяціліся чырвонымі светлякамі, калі ён бег з насыпу. А мо бікфорд падвёў?

— Паглядзімо зараз на тваю работку! — Жаўрук пачаў узнімацца.— І — на мост. Трэба ж неяк яго дабіць.

Артур схапіў Жаўрука за нагу, і той заваліўся на бок, паехаў па насыпе ўніз, лаяўся:

— Ты нагу мне ледзь не адарваў!

— Хочаш, каб галаву адарвала? Мая ж чацвёртая маўчыць!

— У-ух, пень маржовы! А мне здавалася, што тры наставіў. Во-ось калі!..

Грымліва і ярка пыхнула белае святло над галавою. Артур міжвольна заплюшчыў вочы, але позірк паспеў схапіць празрыстае, чорнае па краях полымя і зялёна-белыя скруткі дыму, што грывамі паўзлі з насыпу. Густы россып жвіру пабарабаніў па плячах і патыліцы, халоднымі колкімі пацеркамі пакаціўся за каўнер; нізка, як не над самай галавой, праўуркатаў кавалак рэйкі, плёхнуўся непадалёк у траву.

— Гэтая пянька нас некалі перахрысціць,— пязлосна бурчаў Жаўрук, абтрасваючы з валасоў жарству.— Сядзем — прадчувае маё сэрцайка — з ёю пад манастыр. З бікфордам працаваць — мілы дзянёк. А гэтую вяроўку запаліш — яна табе ні мычыць ні целіцца. А некаторыя ж яе прапагандуюць

унь як! Напрапагандуюць — ініцыятары! — па сваю галоўку!..

Артур пакруціў галавою: у яго гародчык камень кінуты! І да чаго ж злапомны гэты Жаўрук: абы з чаго, нават з ветру, ён табе шпільку скруціць і падпусціць. Бач, цяпер вось да пяньковых насадак чэпіцца. Праўда, іх у групе сустрэлі неахвотна: трэба вельмі старанна зразаць бікфордаў шнур, асцярожна надзяваць пяньковую насадку. Але ж гэта — загад: бікфорду не хапае. Артур жа, пераняўшы вопыт Траяна, хутка налаўчыўся працаваць з пяньковымі насадкамі і ўсяляк прапагандаваў гэтую навіну ў падрыўной справе — ёсць шмат часу ў запасе, калі вядзеш мініраванне, можаш не дужа спяшацца ля рэек, зрабіць усё грунтоўна,— і яго ініцыятыву ставілі ў прыклад. З групы толькі адзін Жаўрук не прымірыўся з пяньковым шнурам, усё бурчыць, усё шпількі совае то Артуру, то Траяну.

Пакідаючы тонкі зорны след у чорным небе, узляцела ад лесу чырвоная ракета — сігнал на адыход. Артур занепакоіўся — зараз узвады здымуць заслоны ад станцыі і бункераў злева, а Траян усё поркаецца з тым масточкам! — і ўскочыў на насып. Ракета ападала да зямлі марудна, быццам чаплялася за дымныя скруткі, што распаўзаліся ў вышыні, і ў яе святле зорна зіхацелі рваныя прабоіны на рэйках.

— Бачыш? — Жаўрук, укленчыўшы, нахіліўся над рэйкаю.— Двухсотграмоўка — сіла! Дзве рэйкі — ча-арах! А яечка гэтае — слабіна, толькі дзюрачку прабівае. Нейкі тылавы тэарэтык прыдумаў гэтае яечка. Семдзесят пяць грамаў — на гэткую сталюгу.

— А ты ручкі не шкадуй, болей жвіру падграбай. Тады — вынік. Хадзем, хадзем далей — пабачыш. Ну, зірні. Зарад не слабы — трушчыць як мае быць. Так што не шкадуй жвіру. І ручкі белыя свае.

— Ёсць, таварыш камандзір. Другім разам увесь насып па адно гэтае яечка навярну!

Знаёмая жартаўлівасць, падкрэсленая пачцівасць, якія ніколі раней не крапалі і вытокі якой Артур добра ведаў — Артур маладзейшы за Жаўрука амаль на пяць гадоў! — і да якой ставіўся заўсёды паблажліва, чамусьці цяпер пакарабаціла, і ён прыкусіў губу, стрымліваючы жаданне вылаяцца. Але тое, што ён перасіліў сябе, узрадавала, надало голасу простую, падкрэслена загадную строгасць:

— На мост! Хутчэй на мост! Нейкая там замінка...

Пераскокваючы шпалы, яны пабеглі да вузкага чыгуначнага віядука. Унізе, у траншэі, падобнай на падкову, што разразала дарогу, цьмяна паблісквала вада; на грэбені пад-

ковы, што канцамі ўпіралася ў насып, курыўся дым, як туман, і здавалася, што з насыпу сцякае ў траншэю маленькі жвавы ручаі.

На шпалах, звесіўшы галаву і рукі пад чорным зеўралам віадука, нерухома ляжаў Клубіч. Артур, ледзь не наляцеўшы на яго, спыніўся, бухнуўся на калені.

— У нас норма! Норма,— глухавата гукнуў Клубіч, хоць Артур нічога і не папытаў.— Гатова, Дзімок? — Клубіч яшчэ ніжэй звесіў галаву, апусціў аўтамат пад шпалы.— За ствол чапляйся. Я — выцягну!

Нібыта з-пад зямлі паказалася галава Траяна. Трымаючыся за Клубічаў аўтамат, а потым за канцы шпал, ён хутка ўскараскаўся на насып, лаяўся:

— Гады праклятыя! Пазамуроўвалі ўсе шчылінкі. Няма куды і міну ўваткнуць. Ледзь прыстроіў.

— Запаліў? — Артур зазірнуў пад шпалы, але нічога не ўгледзеў у цемры.— Ты там падпаліў? Сюды не выводзіў шнура?

— Там, дзе Траян — спявай пад баян.

— Тады адыходзім. Адзін за адным. І старой сцягою толькі!

Артур бег ад насыпу апошнім, замыкаючы ланцужок — усе беглі адзін за адным, не збочваючы са старога следу,— час ад часу азіраючыся на светлую лінію насыпу. У святле ракеты, што зноў узляцела са станцыі, паміж грудкамі сухога альхоўніку бліснула тонкая нітка дроту. Вось яна, старая знаёмая! І як жа лоўка замаскіравана! Каб не ракета са станцыі — можна было і не заўважыць. А паспрабуй — зачапі! Колькі ўжо гэткіх пастак, пастаўленых лоўка і хітра, спрактыкавана абмінуў ён, Артур, кіруючыся завядзёнкаю, якую строга захоўваў: на чыгунку — першым, з чыгункі — апошнім.

За паласою ссечанага альхоўніку пачалася пожня, няроўная, уся ў куп'і, акаймаваная з аднаго боку рэчышчам старога ручая, пазначанага старымі нахілымі вербамі. Артур параўняўся з імі, азірнуўся зноў, і тады яркае аранжавае святло грымліва разарвала цемру ночы; ад выбуховай хвалі выгнулася голле вярбы, нешта ў сярэдзіне яе трэснула і зашурхацела. Кароткая ўспышка на міг высветліла ў цемры дужа блізкі насып з чорным правалам віадука, дзіўна бліскучы дах хаты ўдалечыні і гарбатую ад куп'я і дзіўна белую, як крэйдаю насыпаную, пожню, зацягнутую грывастым бляклым дымам; потым цемра ўсё зноў паглынула.

Траян аблегчана і радасна ўздыхнуў:

— Цяпер і па душы спакойна — канцы масточку. Бягу, ведаеш, а сэрца ёк ды ёк. Што, думаю, як не дыміць шнур?

— Пяньковы, ды каб не дыміў? — з робленым здзіўленнем выгукнуў Жаўрук.— Пяньковы шнур — любата!

— Ты — дабярэшся. Пастаўлю табе некалі пяньковы!

— Жарты адставіць,— спыніў вясёлую гаману Артур.— Загад такі: мы з Траянам — на хутар, аддамо ліст. Жаўрук і Клубіч — да конеў. Чакайце нас у лесе.

— А як не дачакаемся?

— Заііcці і выйсці — мігам.

— Але ж бліпцы за гэты час не спякуцца.

— Якія бліпцы?

— Цешчавы, Дзімок. Без іх цябе ж з хутара не вырвеш.

Траян сказаў дзіўна хрыплаватым, як нешта сядзела ў яго горле, голасам:

— Паганец ты, Жаўрук. Ты што, не ведаеш? З памяці тваёй дзіравай вылецела?

— Даруй, Дзімка. За дурное слова — даруй...

Траян нічога не адказаў, моўчкі шуснуў у цемру, і Артур кінуўся следам. Ён ледзь паспяваў за Траянам, які амаль упрыдбег сунуўся рэчышчам старога ручая, упэўнена арыентуючыся ў начной цемры. Некалькі разоў з бункера, які маўчаў дагэтуль, ударылі кулямёты, і каляровыя ленты трасераў, нейкія кароткія, як адсечаныя, слаліся ля зямлі. Узляцелі дзве, як спараныя, ракеты са станцыі, але згаслі адразу ў вышыні, і цемра згусцілася вакол, як пацяжэла.

Крыху спагадзя яны выбіліся на сцежку, добра прыкметную ў начной цемры, крыху, але яшчэ шпарчэй, прайшлі па ёй, і перад імі раптоўна акрэсліліся абрысы хаты і доўгай пуні з вастраверхім дахам; да франтона пуні, зашытага дошкамі толькі з аднаго, правага, боку, былі прыстаўлены драбіны з шырокай і доўгай перакладзінаю ўверсе. Траян, угледзеўшы абрысы знаёмай сядзібы, ірвануўся наперад.

Артур затрымаў яго:

— Паслухаем. Агледзецца трэба...

— Навошта? — Траян быў здзіўлены.— Бачыш акно? Адчынена. І на прызбе Тося сядзіць. На звычайным месцы.

Першая за ўсю ноч, зялёная нейкая і маленькая, узляцела ракета з бункера на правы бок ад узарванага віадука, і ў яе дрогкім святле затрымцелі дужа белыя, як аснежаныя, пуня і хата, і белым агнём пыхнула шыба крайняга акна, адчыненага; пад ім на прызбе — цяпер і Артур гэта ўбачыў — скурчылася маленькая дзявочая постаць.

— Тося!.. Гэта, Тосечка, мы,— паклікаў Траян і кінуўся на падворак.

Прыслухоўваючыся і азіраючыся, Артур марудна набліжаўся да хаты. Прыглушаныя, падобныя на плач, воклічы і радасна-здзіўлены голас Траяна заглушыў ціхі шэпт справа, з адчыненага акна:

— Арцік! Сыночак!..

Артур прыпаў да адчыненага акна, і рукі маці абвілі яму шыю; маці пяшчотна і ласкава гладзіла яго валасы, абмацвала лоб і шчокі.

— Жывы, дзякуй небачку! Жывы і здаровенькі. У хату, сыночак! У хату скоранька. Не стой на падворку...

Артур ускочыў на нізкі, у адну прыступку, каменны ганак, націснуў знаёмую клямку і ўвайшоў у хату. Ад густога паху засмажанай з салам і цыбуляю бульбы адразу запыла ў жываце, рот запоўніла сліна, і ён гучна пракаўтнуў яе, і маці пачула гэта.

— Згаладаўся ты, мой родненькі. Бульбачкі зараз паясі.

І ў голасе маці, і ў яе абдымках — з нейкай новай пяшчотаю, паспешлівых, парывістых — адчувалася ўстрывожанасць, палахлівасць і адчайная таропкасць.

— Як табе наш канцэрт, матуля? — Артур спытаў бадзёра.— Гэта якраз тое, што я табе абяцаў.

— А дзе ж вы ішлі? На пожню, што насупраць масточка, ты не хадзі. Яны, звяругі, там, ля альхоўніку, міны панастаўлялі.

— Што за вербамі пожня? Куп'ё там, як гарбы. На гэтай?

— На гэтай, сынок, на гэтай. А ты што? Ці не там і пайшоў сёння?

— Не-е, у нас свае сцежкі!

Ён адказаў па-ранейшаму бадзёра, але ў сэрца запоўз непрыемны халадок. Яны ж толькі што беглі па пожні! Усе ўчатырох беглі. Да чыгункі — па пожні той гарбатай. Назад — па ёй таксама! Адну міну, праўда, ён заўважыў, зусім выпадкова заўважыў, бо бліснула ў святле ракеты драціна. А каб не бліснула? І не адна ж яна там, тая драціна! Двойчы, значыцца, ён сёння ля саменькай бяды прайшоў. А ўсё з таго, што напачатку не заскочыў сюды, на хутар!..

— Ты чаго не ясі, сынок? — Марыля занепакоілася.— Бульба цёплая. Патэльня ў печы была. А малачко халодненькае. Ты ж любіш халодненькае.

— Трэба Дзімку паклікаць. Што ж гэта я адзін тут рассядуся?

— Ты еш, сыночак, еш. А я — пакліч яго...

Яна пайшла з хаты, тут жа вярнулася, сказала:

— Кажа, што зараз ідзе. А ты еш, сыночак. Малачко халодненькае. Праўда ж?

— Першакласнае малачко,— і, запіваючы бульбу малаком, зноў папытаў: — Дык як табе наш канцэрт, матуля?

Глуха тукнуў па конаўцы гарлач — Марыля далівала малако,— потым прагучаў яе занепакоены голас:

— Гэта ж увесь далягляд свяціўся. Значыцца, там, дзе грыміць,— таксама рэйкі рвяцца?

— А як жа! — Артур прамовіў гэта важна, яму хацелася, каб яго словы гучалі важка, каб маці адчула і яго дасведчанасць і значнасць у тым, што цяпер адбываецца вакол.— Гэты наш канцэрт — вялікая дапамога фронту. А нашы гоняць фрыца скрозь. Пад Магілёвам ужо шмат гарадоў нашых, беларускіх, вызвалена. І, ведаеш, Італія фюрэру дулю паказала. Капітуліравала. Ручкі ўгору — больш не ваюю супраць Расіі. Вось як!

— Гэта ўсё, Арцік, добра. Але ж ты — асцярожненька. Паўсюль — асцярожненька. Куды не трэба, не ідзі. Прашу цябе...

Пасля слоў пра вялікія поспехі на фронце — пра падзеі пад Магілёвам ён, праўда, сказаў крыху больш, чым ведаў! — было непамысна слухаць матчыны парады. Але і абражаць яе, крыўдзіць не хацелася, і ён перавёў гаворку на іншае:

— Чаго ж Дзімка не ідзе? Пайду паклічу.

Марыля затрымала сына:

— Паспее. Хай лепей з Тосяю пасядзіць. Можа, хоць крышку яна ачуняе. Як села звечара, дык і сядзіць на адным месцы — не скранецца. І амаль нічога і не гаворыць. Я ўжо і баюся, каб галаву не замуціла... А вось з ім — чуеш жа? — гаворыць!.. Ты еш, еш! Бульбачка з малачком смачная. Я ж штовечара — патэльню ў печ. Усё слухаю, ці не ідзеш...

Бульба, сапраўды, была смачная, і смачны быў духмяны і мяккі хлеб, і смачным было халоднае, астуджанае ў сенцах, малако, і Артур еў з прагнай асалодаю. Але з кожнай хвілінаю ў яго душы расло і мацнела нядобрае і прыкрае адчуванне свае ўласнае віны ў тым, што здарылася нядаўна непадалёк ад хутара. Каб ён, Артур, быў больш настойлівы, каб ён своечасова выканаў тое, што прасіў Шлык узімку, калі калона пераходзіла чыгунку за Дзвіною!..

Дапіўшы малако, Артур адставіў конаўку і, абціраючы далонёю губы, на нейкі міг спыніў рух рукі, сціснуў вусны і гэтак сядзеў, уражаны нечаканымі ўспамінамі, што абрынуліся, як хваля. Зламаная асіна, гронкі рабіны, посвіст снегіроў, сумны голас дзядзькі Захара пра сваю віну ў тым, што здарылася ў трохкутніку. Тады гэта здавалася Артуру дзіўным. А цяпер ён пачынаў разумець Захаравы словы, і

гэтае разуменне прымушала яго пакутаваць, цягнула за сабой успаміны пра тое, што было даўно, яшчэ напрадвесні. Маці нешта гаворыць, ён чуе яе голас, але сэнс слоў не разумее — ён жыве ва ўспамінах, і ад іх яму непамысна і горка.

...Дзіўна жоўтая поўня вісіць у белаватым, як падфарбаваным, небе. Зырка зіхаціць снег. Зоркі ледзь прыкметныя, іх, здаецца, згасіла сваім святлом гэтая жаўтлявая, з мудрагелістымі цёмнымі звілінамі поўня. Затое выразна відаць чорная вужака калоны, што выпаўзае з узлеску на аснежанае поле. Калона — амаль трыста чалавек, і ўсе, акрамя групы суправаджэння, без зброі — паспяхова і без прыгод перайшла Дзвіну, гравійку, цяпер павінна пераскочыць чыгунку з Полацка на Бігосава, за якой зноў зона партызанская.

— Хутчэй, хлопцы. Хутчэй,— просіць Шлык, які толькі што вярнуўся ад чыгункі — роўная лінія насыпу ледзь відаць у канцы поля. Нахіліўшыся да Артура, дадае з трывогаю, але ціха, каб ніхто не чуў: — Ці праскочым, га? Дужа ж расцягнуліся.

— Паўгадзіны ў нас — вярняк. Раней патрулі не наскочаць.

— Прытаміліся людзі. Усё ў цалік ды ў цалік — бегчы не змогуць, калі якое ліха...

Шлыкава трывога перадаецца і Артуру. Але ён тоіць яе, маўкліва глядзіць на цёмныя постаці мужчын, што рухаюцца па снежным цаліку. Добра табе — у цябе зброя. А ў гэтых?.. Толькі хатулькі за плячыма — харч на сем дзён. За гэтыя сем дзён калона павінна пратэпаць амаль дзве сотні кіламетраў і перайсці лінію фронту на левы бок ад Віцебска. Шлык ужо хадзіў з гэткай калонаю, паспяхова вярнуўся назад. Тады ён быў вясёлы, жартаваў, падбадзёрваў людзей. Чаго ж ён сёння гэтак устрывожаны?.. Але ж і ў цябе на сэрцы неспакой. А што казаць пра людзей, якія ў калоне? Кожнага ж, ведама, гняце трывога, але, мабыць, мацней ад усяго — невядомасць. Розныя ж чуткі папаўзлі пасля таго, як з першай калоны вярнуліся ў атрад толькі дзесятак чалавек. Можа, з таго ў гэтай калоне за ўсю дарогу на кароткіх прывалах зусім не было чуваць ні жартаў, ні смеху.

— Што папрашу,— гаворыць Шлык і кладзе руку на Артурава плячо,— скажы маёй кабеце, каб ішла ў атрад. З Тосяй хай ідзе. І Марыля няхай ідзе, няма там чаго рабіць адным на хутары. Бы па лязу ходзяць,— і ўжо больш настойліва і патрабавальна: — Калі затрымаюся, няхай не сядзяць. Скажы камандзіру, што дужа прасіў, каб ён іх у зону забраў.

— Добра, скажу.

Таропкім маршам калона адолела насып — яна ўжо хавацца за нізкім чорным параспікам па той бок чыгункі. Шлык, моцна абняўшы Артура, зноў робіць напамінак:

— Скажы Захару, што я дужа прасіў. І сам з вока маіх не скідай. Добра?

— Абяцаю.

Аддаляючыся, прападае рыпенне снегу. Цішыня. Толькі аднастайна гудуць і пазвоньваюць на слупах правады. Не, вось слабы, адрывісты звон на рэйках. Патруль ідзе! Белыя прывіды ўзнікаюць на роўным шнурку насыпу, быццам злёгку зыбаюцца ў цьмяным снегавым зіхаценні. Справа ад жаўтлявага кола поўні, з аднаго боку як бы белага чамусьці, чыркнула неба кароткая знічка.

Што яшчэ казаў у тую ноч Шлык? Яшчэ што-небудзь прасіў?.. Здаецца, болей нічога не прасіў і не казаў. Ён пабег тады наўздагон калоне, і дужа гучна рыпеў снег пад яго валёнкамі. Як выразна рыпіць ён цяпер, гэты снег!.. Які табе снег! Маці крочыць па хаце, і маснічына парыпвае... Чаго ж Шлык тады гэтак настойліва прасіў, каб жонка яго пайшла ў партызанскую зону, не заставалася на хутары? Няўжо прадчувала бяду яго сэрца?.. Позна, братачка, ты разважаеш пра гэта! Тады трэба было больш настойліва ўсё казаць. А ён што зрабіў? Ён жа разам з Тосяй і смяяўся, калі Шлычыха казала, што нікуды з хутара не пойдзе, што тут, маўляў, і кароўка, і хлебец і ён, Артур, без іх прападзе, бо аніхто яму гэткіх дакладных звестак пра міны і засады не перадасць. А яно вунь як павярнулася: сваю міну Шлычыха і не заўважыла!..

«Велізар мне сказаў, што тут пойдзе, як назад вяртацца будзе. Мне яго дачакацца трэба...»

Гэтым Шлычыха тады ўсіх пераканала, і Артур больш не настойваў. А трэба было! Трэба было не яе слухаць, а тое зрабіць, што Шлык прасіў. Тады, магчыма, і не здарылася б бяда на пожні. Хаця хто ж ведае. Не зачапіла б Шлычыха тую міну, дык ты ці хто-небудзь з тваіх хлопцаў сёння на яе мог наскочыць. Шлычыха, значыцца, сваёй смерцю некага ўратавала...

«А я ліст ёй нясу... Ды не ёй, Тосі Захар прасіў перадаць. Каб чытала...»

Бульба ў роце зрабілася цяжкая, нейкая гарачая, і ён запіў яе малаком і прамовіў дужа таропка, быццам у чымсь апраўдваўся перад маці і прасіў прабачыць, што самае важнае гаворыць з гэткім спазненнем:

— А ў мяне Шлыкаў ліст ляжыць... Пераслаў з самалётам. Дзядзька Захар сказаў Тосі перадаць...

Марыля ўспалашылася:

— Ні-ні! Заўтра я перадам. Ці яшчэ пазней,— і спытала ўстрывожана: — У яго, Велізара, усё добра?

— Ліст жа напісаў. Значыцца, жывы. Вароты пад Віцебскам напрадвесні закрылі намёртва. Цяпер там фронт не пяройдзеш. Але, думаю, не ў тым прычына: людзі па фронце патрэбны...

Марыля ўзяла ліст, але сынаву руку не выпусціла, ласкава пагладзіла яе і нічога не сказала. Маўчаў і Артур, і яму чамусьці зноў прыгадалася тая размова ля чыгункі за Дзвіной, і зрабілася горка ад думкі, што ён не выканаў сваё абяцанне, як бы забыўся на яго, і зараз сядзіць у хаце, есць бульбу, а на падворку пудзіцца ў вялікім горы Шлыкава дачка, якой ён, Артур, нават не сказаў сёння аніводнага слова спагады. Спагады? А чаго яна варта, тая спагада, калі чалавека няма? Словы спагады толькі абудзяць новы боль, маці тут разумна робіць, што нават ліст не хоча зараз аддаваць...

— Не дачакалася кабета,— самотна прамовіла Марыля.— А як жа верыла, што жывы Велізар! А яно гэтак заўжды: той, у каго верыць, заўжды да гнязда вяртаецца...

Артур з цяжкасцю дапіў малако, асцярожна паставіў шклянку на стол. Значыцца, маці ўсё яшчэ верыць! Верыць, спадзяецца, не хоча лічыць і не лічыць праўдаю тое, пра што казаў Файзуло. А можа, гэтак і лепей? Дзе ж лепей? Штодня вярэдзіць сэрца, штодня жывіць яго надзеяй на тое, чаго ўжо няма, што ніколі не вернецца і не спраўдзіцца? Файзуло, мабыць, зрабіў памылку, трэба было і ёй, маці, расказаць гэтак жа, як расказаў яму. А ён усе неяк няпэўна: пасля бою, маўляў, яны адыходзілі ў лес, што здарылася з Пахомам — дакладна невядома... Навошта ён хлусіў ёй?.. Навошта?.. А сам ты навошта праўду ёй не кажаш? Маўчыш жа вось, што стаяў ля бацькавай магілы?.. Нават і ў тваім сэрцы час ад часу, неспадзеўкі, бліснe нейкая падзея, нейкая патаемная думка праскочыць пра магчымае дзіва: не бацька пахаваны ў той магіле ля возера! Бацька жывы, вернецца!.. Але ж нікага цуда не будзе: узяла чалавека зямля, дык назад не верне!..

Яго нечакана спалохала жорсткасць, з якой ён бязлітасна закрэсліў надзею маці, і, як спахапіўшыся і дакараючы сябе і за гэтую жорсткасць, і за тое, што не выказаў праўды, што не выканаў абяцанне, якое даў Шлыку ў тую ноч ля чыгункі за Дзвіною, сказаў цвёрда:

— Табе, матуля, трэба перабірацца ў атрад. Вам няма чаго тут рабіць. Скажы Тосі — і поїдзем разам з намі. Зараз!

— Яна не поедзе. Я ўжо яе пыталася.

— Нічога добрага вы тут не дачакаецеся!

— А хто ж ведае, дзе таго, добрага, дачакаешся? А мне дык тут і лягчэй... На паязды гляджу штодня. Народнікі з аховы станцыі наведваюцца. Ёсць некаторыя, што былі ў тых баях пад Гродна.

— Ты ўсё яшчэ спадзяешся...

Артуру зрабілася невыносна цяжка ад свайго папроку. Ён як бы пакрыўдзіў маці сваімі словамі, як бы прызнаўся, што сам асабіста даўно пахаваў бацьку і раіць ёй зрабіць тое ж самае, закрэсліць надзею, паберагчы сэрца.

— Спадзяюся. На добрае калі спадзяешся, дык і лягчэй тады жыць...

— Баюся, каб позна потым не было. Яны ж, напэўна, нагоняць людзей прэч ад чыгункі. Могуць жа і ў лагер пхнуць...

— Як людзям, гэтак і мне. І Тосю ж адну я не кіну... Ты лепей ідзі і Дзіму пакліч. Сядзіць жа галодны...

У матчыным голасе была знаёмая цвёрдасць, і ён ведаў цяпер зусім дакладна: яна не зменіць свайго рашэння, не пераробіць. Настойваць, нешта патрабаваць — толькі пакрыўдзіш яе.

Артур узняўся, адчыніў дзверы і нос у нос сутыкнуўся з Тосяй, якая вяла за руку Траяна. Ён саступіў ім дарогу на ганку, даючы магчымасць увайсці. Словы спачування нарадзіліся нечакана, але ён адкінуў іх, прамовіў тое, чаго казаць маці не раіла:

— Табе ліст ад бацькі, Тосечка. Бяры.

— Я ведаю. Дзякую,— прамовіла яна, беручы ліст. Голас гучаў ціха, але без скрухі, нават жвава.

— Яна ведае. Я сказаў ёй,— паспешліва пацвердзіў Тосіны словы Траян.— Ты будзеш на падворку? Падазроная нейкая ціша. Ці стаміліся ўжо страляць і ракеціць?

— Перакусі і поедзем. У нас мала часу.

Траян буркатнуў незадаволена:

— Знойдзецца і час. Пасядзі крышку. Я зараз...

Артур сеў на краёк прызбы, на душы было прыкра. Навошта ён зрабіў гэты напамінак, што мала часу? Сабе дык хапіла часу, сядзеў, раскошваючы, аплятаючы бульбачку з малаком. Адно толькі добра зрабіў, што пра ліст сказаў, хоць маці і прасіла маўчаць. Але ж як маўчаць, калі яна ўжо ведае? Дзімка паспеў пахваліцца. І, відаць, правільна зрабіў...

«Ён яе кахае...»

І тое, што ён ведаў, што не было для яго навіною, нечакана выклікала дзіўоснную спагаду і цеплыню да чалавека, які быў зараз далёка адсюль і які быў быццам побач,— ён думаў

пра Рыму, думаў узнёсла, з радасцю. У белаватым святле поўні падворак выдаваў чыстым, бы зацярушаным рэдкім белаватым пылам. Шырокай плямаю чарнела нізкая кадзь, прыціснутая да прызбы, насыпаная з каптуром нейкім каменнем. Не, не каменне гэта. Буракі! Ён выцягнуў з цэбра халодны важкі бурак, патрымаў яго ў руцэ, паклаў на месца; бурак пакаціўся, мякка бэхнуў аб сценку цэбра. І гэта быў адзіны гук, які злавіў яго слых. Сапраўды, нейкая незвычайная і загадкавая цішыня. Ніколі ж гэтага раней не было. Стаміліся, мабыць, як казаў Траян, і страляць і ракеціць...

Незвычайная і загадкавая цішыня здзіўляла, але не выклікала вялікай трывогі і заклапочанасці. Па-сапраўднаму трывожыла зусім іншае — упартасць маці, яе жаданне заставацца тут, на хутары. А гэта — неразумна, заставацца тут. Ён тады яшчэ, як толькі маці пасялілася тут, не хацеў, каб яна жыла паблізу чыгункі, а яна заўпарцілася, нечым спакусіла яе Шлычыха, калі паказвала ўтульны садок, старанна дагледжаны гародчык. Не, не садок і гародчык пераканалі тады маці — гора Шлычыхі. Выпадкова ўвечары нейкай дурной куляю, што прыляцела невядома адкуль, забіла Зосю, Шлычысіну сястру. На чыгунцы была страляніна, і куля напаткала Зосю на ганку, калі яна ішла ад хлява, падаіўшы карову. Яна бразнулася, нават не крыкнула, на ганку, і малако разлілося ля яе галавы, і яна гэтак і ляжала ў малацэ. А сёлета, зусім нядаўна, Шлычыха ўзбілася на міну... Смерць ходзіць вакол гэтай хаты. Маці нельга заставацца тут, яе трэба забраць у атрад, далей адсюль. А там, у атрадзе, што? Меней небяспекі? Няхай не меней, галоўнае — забраць яе адсюль... Пагаварыць з Тосяй, пераканаць і яе — хай разам і перабіраюцца... Не, трэба спачатку сказаць Траяну, хай ён ёй падкажа — яна яго паслухаецца... А можа, маці і сапраўды тут лягчэй жыць? Яна глядзіць на цягнікі, і ёй, мабыць, думаецца, што цягнікі прывязуць ёй радасную вестку. Якую? Адкуль? Бацькі няма! Файзуло гэта добра ведае. І каб жа толькі ён адзін стаяў ля магілы... А вось і ты сам зноў узбіўся на нейкую мройную надзею. Сэрца зноў на нешта спадзяецца, у нешта верыць. Дык чаго ж ты хочаш ад маці? Яна, відаць, гэтак жа, як і ты, спадзяецца... Гэтак жа? Не-е, яна ж нічога не ведае з таго, што ты ведаеш, яна не проста спадзяецца. Яна — верыць! Яна ж і сказала: у добрае, маўляў, веру... А можа, яна ўжо ведае сваю бяду, разумее, што не можа яе адолець, але не хоча верыць у гэта, суцяшае сябе, супакойвае, каб хутчэй і лягчэй праходзілі, міналі дні? Але як жа будуць яны лягчэй праходзіць, тыя дні? Удзень з падворка бачыш і насып і патрулёў, і штодня з бункераў набя-

гаюць фашысты, грабуць малако, яйкі... Уночы п'еш малако ты... Удзень, значыцца, п'юць яны, п'юць, седзячы за тым жа сталом, за якім толькі што сядзеў ты, за якім зараз сядзіць Траян, п'юць з таго ж кубка, які ты толькі што трымаў у руках! І маці штодня павінна дрыжаць, гледзячы, як цягнуцца да хаты фашысты? Не, трэба неадкладна забіраць яе адсюль! Яе нічога тут не трымае. Не, прывязалася яна да гэтага хутара, тут хварэла, тут паправілася, тут аб табе ж клапоціцца, міны выглядае. А можа, ты нечага яшчэ не ведаеш? Так, дружа мілы, не ведаеш, не ведаеш шмат. Не ведаеш, якая горкая трывога гняце матулю штодня, як баліць у яе сэрца, чакаючы тае хвілінкі, калі ты прыйдзеш, жывы і здаровы... Яна, напэўна, не хоча ісці адсюль толькі з таго, што баіцца заўжды: пойдзе, мауляў, сынок усляпую, на бяду наскочыць. Дзеля таго каб не здарылася гэтая бяда, яна і сядзіць тут, на хутары, і ахвяруе сабою штодня. А ўсе гэтыя спасылкі на цягнікі і чаканне — толькі адгаворка, толькі зачэпка, каб адсюль не выбірацца. Трывога за цябе, каб не было з табою бяды,— галоўнае, што трымае маці тут!

Ён розумам спасцігаў гэта і раней, а цяпер спасціг сэрцам, і нечакана адкрыццё ашаламіла яго, выклікала ў сэрцы ніколі раней не знаны боль. Як жа ён раней не мог зразумець гэтую простую рэч? Гэта ж і ёсць праўда, да чаго ён цяпер дапяў, і праўда гэтая простая і ўсё растлумачвае. І трэба нешта неадкладна прыдумаць, каб забраць маці адсюль. Але што? Адзіная, мабыць, спадзяванка — слова Тосі, трэба яе настройваць, каб не сядзела тут, каб ішла ў атрад!

Артур рашуча ўзняўся. Ён зараз пагамоніць з Тосяй, яе ён перакапае! Ён не будзе чакаць, пакуль гэта зробіць Траян.

Нячутна адчыніліся дзверы, з хаты выслізнуў Траян.

— Можам ісці,— прамовіў ён ціха.— Мы тут з табою засядзеліся...

— А яны? Пакідаць іх тут нельга!

— Марна ўсё. Тося і слухаць не хоча. Адно цвердзіць: вернецца татка — з ім і пайду ў атрад.

— А хто ведае, калі ён вернецца?

Быццам у адказ, блізенька на насыпе, па левы бок ад хаты, загрукацеў кулямёт. Доўгая чарга абарвалася раптоўна, а светлякі трасірак несліся, быццам наўздагон адна адной, і знікалі ў чорнай высі раптоўна, як правальваліся за нейкую высокую чорную сцяну.

— Рухаемся,— сказаў Траян незадаволена, аніяк не адказваючы на запытанне Артура.— Дарогу ў атрад яны і без нас ведаюць. Калі спатрэбіцца — пойдуць...

Моўчкі мінулі сад, моўчкі выбіліся на поле, пакінуўшы ззаду роўныя палосы ссечанага альхоўніку. Зноў забубнілі кулямёты, але далёка, за станцыяй, і там жа, толькі воддаль ад чыгункі, раз-пораз ірвалі начную цемру сполахі выбухаў.

— Усё на той бок кідаюць,— вызначыў Артур.— А нам сёння пашэнціла.

— А ты быццам і незадаволены,— пачаў Траян і раптам збіўся на ярасны шэпт: — Кладзіся! Мі-іна!

Пад нагамі ўвесь час шурхацела каляная трава, і шурханне з высі, пранізлівае, з прыглушаным тонкім візгатам, абрынулася на Артура раптоўна, і ён бразнуўся на дол, дзе стаяў. У той жа міг справа, як з-пад зямлі, выдралася белая, з яркай чырвонай плямай пасярэдзіне маланка, колкія цвікі працілі ногі і плечы, і Артуру здалося, што гэтыя цвікі зрушылі яго з месца і зноў кінулі на траву, як бы ўдушваючы ў дол, і цяпер у тых месцах, дзе вастрыі цвікоў прабілі ногі і плечы, нарадзіўся пагапы глыбокі боль.

— Зачапіла мяне,— прастагнаў Артур.— Па нагах, халера, секанула.

Траян мудрагеліста мацюкнуўся, злосна патрос кулаком у бок станцыі:

— Сволата... Падкалоднікі клятыя. У іх жа лугавіна прыстраляна. Ведаюць, што да лесу адыходзім. Вось і смаляць.

— Дапамажы ўзняцца... Ао-у-у... Не магу... Не магу ісці...

— Бярыся за шыю рукамі. За маю шыю трымайся. Я панясу. Ці не, лепей на плашч кладзіся. Я пацягну...— Траян садраў з сябе плашч, пасцяліў яго на зямлі.— Да лесу я цябе датралюю...

— Лепей бяжы адзін. Бяры каня і — сюды.

— Толькі ты тут і ляжы. Нікуды не паўзі. У цемры тады цябе не знайду.

— Якая табе цемра! Святла тут хопіць. Імчы, Дзімка!

— На гранату яшчэ. На ўсялякі выпадак...

Нейкі міг Артур бачыў, як расплываецца ў цемры чорная пляма — постаць Траяна. Потым, нейкі час спагадзя, пыхнула ракета са станцыі, за ёй другая, з бункера за чыгункай, і ад святла трава наўкола здавалася белым колам, які разрастаўся і шырыўся. Але ў гэтым коле нічога жывога ўжо не было відаць, толькі нерухомым частаколам шчацініўся пасьсякапы альхоўнік, паката горбіліся нізкія купіны, падобныя на людзей, што скурчыліся і спяць на зямлі. Абрысы купіны справа былі надзвычай выразныя, вельмі падобныя на чалавечую постаць.

«Як нехта сапраўды ляжыць там. Не, узняцца сіліцца...»

Пераадольваючы боль, што ўсё глыбей і глыбей запаўзаў у плечы, Артур наставіў аўтамат па баявы ўзвод, паклаў палец па дужку, пад якой быў спуск, прыцiснуўся шчакою да халоднага прыклада і ляжаў, узіраючыся, як вакол яго звужаецца кола дрыготкага ракетнага святла; ракета ляціць да зямлі, а кола святла ўсё вузейшае і вузейшае, быццам цемра, што стаіць за ім, упарта піхае кола наперад, як бы сціскаючы яго.

5

У паласе святла, што прабівалася ў дот праз вузкую амбразуру, галава Чэсі была высветлена няроўна — добра асветлены вочы, нос, шчокі і падбародак, а валасы патаналі ў паўзмроку,— і Багдан ажно сцяўся ад раптоўна адкрытага ім падабенства: Захаравы вочы, Захаравы бровы, Захараў позірк. Чэся як не заўважала Багдана, глядзела на нейкую кропку там, за амбразурай дота, быццам прыкіпела да таго, што ўбачыла.

«Яны ўсе гэтыя, Круппі гэтыя,— адзін на аднаго падобны і тварамі і ў паводзінах...»

Думка гэтая супакоіла, і адчуванне таго, што аднекуль з цёмнага кутка дота на яго зірнуў Захар, растала. З прагнай увагаю і замілаванасцю, быццам бачыў упершыню, Багдан вывучаў Чэсін твар. Гожая лінія падбародка, бухматыя чорныя бровы папізу белага чыстага лба, вочы сіне-сінія, амаль блакітныя, як неба ў жнівеньскі ранак, калі сонца вісіць над Дзвіною, губы падобны на маладую вішнёвую лісцінку, разарваную напалам і прыхопленую ўжо восеньскай барвою...

«Я цалаваў гэтыя вусны. І яны таксама цалавалі мяне...»

Думка асела ў душы болем, вострым, нясцерпным, і Багдан не змог утоіць ціхі, пакутны стогн, але тут жа зразумеў, што павінен гэта неяк патлумачыць, павярнуўся, сеў, пачаў расціраць правы локаць:

— Занямела рука. Ажно мурашы папаўзлі — доўга на цэменціку не паляжыш.

— Смачнае піва. Нават калі і халоднае,— прамовіла Чэся, адпіўшы крышку з кацялка, які трымала на каленях абедзвюх руч.— Добра, што ты чабору назапасіў. Мы яго з сабою возьмем, тут не пакінем...

Стаўляючы пагбапы салдацкі кацялок на цэментаваную падлогу, Чэся нахілілася, твар яе на імгненне знік з паласы святла, потым зноў выразна акрэсліўся, і Багдан аж заміргаў

ад здзіўлення. Як новы твар у Чэсі, незнаёмы зусім. І вось кожны раз — ужо хутка два месяцы, як яны тут, ва ўзарваным доце,— калі ўбачыць, што па яе глядзяць, твар набывае гэтае незнаёмае адценне, быццам каменее, і кожны раз бы зусім іншы, чужы чалавек перад табою.

— Цяжка было сказаць, каб нітво падаў,— папракнуў Багдан, перастаўляючы кацялок бліжэй да сцяны.— От жа натура!

— Я табе тое ж кажу: мне трэба болей рухацца. Хоць пакрысе, тады хутчэй на ногі стану.

Ён, спрабуючы супакоіць яе, сказаў тое, што казаў ёй ужо шмат разоў:

— Галоўнае — есці паболей. Ад гэтага — сіла,— і дадаў памяркоўна, без папроку, нават са смяшком: — Ты мяне слухай. На ногі ты ўжо ўстала — гэта пачатак. Цяпер сілы набраць, каб у дарогу рушыць. Тыдні два яшчэ — і рушым. Таму і кажу: бяры яшчэ яйка. Ты ж іх любіш. Ды з хлебам. Свежанькія яйкі — куркі мае план добра разумеюць. План ім у дзюбку — яны яго і выконваюць.

— Адкуль яйкі грабеш? Хоць бы раз праўду сказаў.

— Птушкаферму завёў. Перадавую па ўсіх паказчыках.

Яна хмыкнула:

— Не мялі лухту, мялоп!

— Дзе ж лухта! Птушкаферму з табой цяпер маем. Шпітальная птушкаферма на пяць галоў. На вялікі жаль, аднак, пеўня няма.

Чэся прамовіла з асуджэннем, пядобразычліва:

— Усё жыццё тваё вось гэтак — з выбрыкаў — і складаецца. Па-людску патлумачыць не можаш?

Багдан уздыхнуў, сэрца надціснуў знаёмы боль — Чэсін тон зноў адкідаў яго ад шчырасці і гаворкі на роўных. Дурны ты, Багдане! Дурны непапраўна! Колькі разоў за гэтыя два месяцы ты рызыкаваў сваім жыццём дзеля жанчыны, якая не прызнае, не хоча і аніколі, відаць, не прызнае роўнага ёй чалавека? Нават і не злічыш. Рызыкаваў, калі цягнуў на руках параненую Чэсю да Дзвіны. Рызыкаваў, калі, па загаду Захара, шукаў яе па беразе, потым, амаль да світання, плыў па Дзвіне на дзіравым чоўне, спыняўся ў кожнай затоцы, абмацваў ледзь не кожную лапіну асакі. Рызыкаваў, калі знайшоў Чэсю — яна даплыла-ткі да ручая, дзе спадзявалася знайсці атрад, даплыла, прыкруціўшы сябе рэменем да нітоў бруса,— і пераправуляўся на правы бераг ракі, пераправуляўся амаль пры дні ўжо. А на тым тыдні, калі пайшоў у Зуі па хлеб? Ледзь жа не трапіў у лапы да нейкіх бандзюкоў, прыняўшы іх у вячаровым сутонні за сва-

іх, за партызан. У самы апошні міг, калі быў ужо гатовы бегчы праз сад да падворка, дзе пахаджвалі ўзброеныя людзі з чырвонымі палоскамі на шапках, завагаўся, залёг за стажаркаю. Потым пачуў жаночы лямант, убачыў кабету, якая бегла за ўзброенай чацвёркаю, спрабуючы адбіць рудую карову, прывязаную да калёс доўгай вяроўкаю. Калёсы каціліся шпарка, аслабелая вяроўка нацягнулася і адкінула жанчыну на ўзбочыну. Багдан, адпаўзаючы ў нізіну за стажаркай, нейкі час чуў працяглае, як па нябожчыку, галашэнне. Ён ведаў, што дарога, па якой каціліся калёсы, вядзе ў бок бору, і, урэзаўшы напярэймы, засеў на ўзлеску.

Аніякага пэўнага плана ў яго не было, карцела толькі хутчэй даведацца: што гэта за людзі, адкуль, куды кіруюцца? Праз нейкі час згледзеў знаёмыя калёсы, за якімі бегла, на вяроўцы, карова, згледзеў іх на пагорку, дзе дарога разгаліноўвалася — улева, да Дзвіны, і сюды, пад узлесак,— і зразумеў, што адлегласць паміж ім і калёсамі павялічылася. На калёсах высокі грубаваты голас — нечым дужа ж знаёмы голас! — выводзіў песню пра тое, што «...наступала цёмная хмара, стаў дождж накрапаць», і Багдан зноў ускочыў на ногі, зноў пусціўся напярэймы. Ён бег, высільваючыся, і спахапіўся толькі тады, як выскачыў на чыстае поле. Нейкі міг стаяў, аслупянеўшы,— траха ж не ў самы горад успёрся! — а потым бразнуўся на зямлю, напоўз назад, пад выратавальныя галіны ялін...

Не, не адразу, адным словам, прыгадаеш і падлічыш іх, тыя дні рызыкі. А якая падзяка за іх? Ніводнага ж дня Чэся ласкава не зірнула на яго, Багдана. Ніводнай цёплай ноткі не пачуў ён у яе голасе за ўвесь гэты час. Так, непапраўная дурнота, гэтая яго наіўная спадзяванка, што нешта зменіцца ў іх адносінах з Чэсяй, што благое мінулае будзе закрэслена. Наадварот, закрэслена ўсё тое добрае, што ён зрабіў. А ён жа ўратаваў ёй жыццё! Ён жа не аднойчы ўжо давёў ёй, чаго варты! Ён жа не кінуў яе ў бядзе! Каб не ён — даўно б не было яе ў жывых, сатлела б у тым ручаі, скапала б яшчэ раней, там, у той варонцы ад бомбы...

Ён не казаў ёй гэтага ніводнага разу, але ж яна бачыла ўсё, бачыць штодня і яго клопат, і павагу, і сціпласць, і жаданне заўсёды і ва ўсім падбадзёрыць. А колькі ён па начах мыў бінты, колькі варыў святаянніку, варыў па начах таксама, паставіўшы кацялок на самаробную грубку, якую склаў у кутку дота! Удзень агонь ён ніколі не паліў, баючыся, каб хто-небудзь не заўважыў дым над разбураным дотам. Удзень з дота не вытыркаўся, выпаўзаў толькі па начах, нават святаяннік не лупіў непадалёку ад дота, каб аніякага следу не

пакідаць. А яна? Усё воўкам пазірае, быццам ён, Багдан, знарок яе заціснуў у гэтую камяніцу, прымусіў пакутаваць, нудзіцца, стагнаць ад болю... Ды, зрэшты, хай сабе: сілком жанчыну да добрага не прымусіш. І лёс ёсць лёс — тут ужо анічога не напішаш. Так што яшчэ тыдні са два — і канец. Чэся зможа ісці, і яны рушаць за чыгунку, у атрад, і ён, Багдан, скажа Захару, што выканаў яго загад. І гэта будзе ўжо самай апошняй кропкаю над тым благім, што было ў Багданавым жыцці. Хай на яго, Багданавай, віне абарвалася адно жыццё. Цяпер ён як бы вярнуў тую страту людзям і Захару: вось яна, Чэся, жывая, здаровая, і жыццё ёй уратаваў Багдан!..

Гэтыя думкі неяк адразу ўзвысілі яго, прыйшла ўпэўненасць, сышла з душы гаркота, якую пакінуў нядобры Чэсін позірк, і ён сказаў, выбраўшы з шапкі яйка і пакручваючы яго ў руцэ:

— Маё жыццё не з выбрыкаў, як ты кажаш. Не сваё дрэва ўзяўся секчы — з таго і пайшла ўся свістапляска. Я табе як прылада нейкая быў, каб свой уласны лёс бліжэй да сонца закінуць. І гэта натуральна: рыба ж шукае, дзе глыбей,— не я гэта прыдумаў...

— Не, Багданка, не пра сонца я тады думала: дурная была, маладая, неразумная — з таго ўсё. З таго, Багданка, у нас усё скруцілася, перавярнулася гэтак, што і сам чорт рогі зверне. Адно аднаго нам не варта вінаваціць. І ты не думай, што я твайго сэрца не бачу. Ба-ачу! І жыццё мне не хто іншы ўратаваў,— яна дакранулася да яго рукі, і ён нечакана сумеўся, разгубіўся, пачуўшы ласкавасць у голасе і згледзеўшы, як па-новаму, са спагадаю засвяціліся яе вочы.— А вось шчыра сказаць не хочаш...

Бліснулі і згаслі, як знічка, і ласкавасць, і спагада, і шчырая зацікаўленасць, і ён, адчуўшы гэта, спытаў зусім хмурна:

— А што я павінен табе сказаць?

— Птушкаферма адкуль у цябе з'явілася?

— Ды Банюньскія гэта куркі,— ён адразу палагаднеў.— Калі вёскі гарэлі — яны ад агню, як ачмурэлыя, разбегліся. Потым на старыя котлішчы вярнуліся, бы пагарэльцы. Розных жа гаспадароў куркі, а, быццам людзі, да сваіх попелішчаў ціснуцца, табунком, ля бульбяных награбкоў і трымаюцца.

— Зімой прападуць.

— Ха, зімой! Да зімы мы іх усіх на булёнчык пусцім!

Яна ўпершыню за ўвесь час іх жыцця ў гэтым узарваным доце засмяялася.

— Ты, Багданка, увішны надзіва. Дзе ні павернешся — за нешта зачэпішся. Я б аніколі не дадумалася сюды зашыцца. Дзівосны прытулак. І наўкола — пустэча. Суха, цёпла. Напач калі амбразуру закрыем — горача нават робіцца. І вось жа не ўзяў яго і выбух.

— Я і сам дзіўлюся, чаго ён ацалеў,— фашысты ўзрывалі ўсё добрасумленна. Памятаю, як цыпкі з патронамі шукалі па дотах, дык вужом паўзеш усярэдзіну. А ў гэтага толькі тую сценку патрушчыла, дзе дзверы былі. Ды расколіны па кутках. І ведаеш што? Патронаў тут не было — адны страляныя гільзы. Ву-унь, поўны кут іх...

Яна аглядала дот, кожны кут, сцены, быццам упершыню зайшла сюды, і ўсяму дзівілася, сказала пераконана:

— Надзейна будавалі, аднак.

— Не на вецер клалі дзяржаўныя пазыкі. Сюды, на гэтыя доты, ішло ўсё першакласнае: і жалеза, і цэмент, і камень.

— Смачна гэта, сырыя яйкі з хлебам.

— Хлеб у нас гэты апошні. Сёння ўвечары пайду пад Кушлікі,— і дадаў разважліва, як бы раячыся: — Не, за Дзвіну, мабыць, трэба. Гэтак і зраблю.

— А на птушкаферму?

— Там — пуста. Учора ж быў. Хай нанясуць яшчэ. Увосень куркі слаба нясуцца...

Багдан жаваў хлеб, запіваючы яго сырымі, без солі яйкамі, і глядзеў на вузкую светлую шчыліну амбразуры. Святло як попельнае зрабілася — сутоньваецца ўжо. У лесе, мабыць, ужо і зусім цёмна. А Чэсін твар бляклы, яна ўся неяк змізарнела, быццам ссохлася за гэты час жыцця ў доце. Толькі вочы, нібыта вуголле, блішчаць. І яна, увогуле, уся вось гэткая, як яе вочы: імпэтная, упартая, колкая і нязломная. Добра, што яна прымусіла яго паесці — смаката незвычайная, гэтыя свежыя яйкі з чорным жытняком. Э-эх, каб ён удзень паслухаў яе і паспаў крыху — ноч жа цалкам давядзецца тэпаць. Але неяк абыдзецца, не першая ноч без сну. Галоўнае, добра пад'еў — сіла ажно выпірае. Цяпер, пакуль яшчэ светла, трэба і аўтамат паглядзець, каб бы гадзіннічак быў!..

Ён выцягнуў з аўтамата дыск, адкрыў крышку і, тукаючы пальцам па тупых жоўтых кулях, пералічыў патроны. Потым, націскаючы спружыну, па аднаму выцягваў іх, старанна праціраў і зноў стаўляў на ранейшае месца.

— Можа, не варта табе сёння за Дзвіну ісці,— прамовіла Чэся, і ён не зразумеў, пытаецца яна ці просіць не ісці туды.

— Карціць дакладна ведаць, хто ж гэта там людзей рабуе.

— Пачакай. Праз тыдзень і я з табою пайду. Адзін ты што ім зробіш?

Багдан закрыў крышку дыска, паставіў яго на месца, лёгка прыстукваючы далонёю па канцы; суха клянцнула зашчэпка.

— Ну, калі яны там учатырох толькі — адной чаргі дастаткова. А калі аспоўная банда ў засадзе? Тады цябе адразу на відэлец насадзяць. Трэба асцярожна дзейнічаць. А што я хачу высветліць? Які шлях у іх. Колькі іх. Адкуль прыходзяць і куды знікаюць. У Елісеевіча гэтыя пытанні адразу ўзнікнуць. А што мы адкажам? Анічагуткі. Камандзір мне, ведаеш, што скажа? Яловы ты разведчык, корань табе ў душу...

— Табе, можа, тады надалося, што на пагорку ўжо як тры фурманкі каціліся?

— Можа, і здалося, сутоньвалася над ракой. Але мне думаецца, што гэта — «народнікі». У Экімані іх рота стаіць — адтуль, мажліва. Можа, шукаюць сувязі з партызанамі. А яго, атрада ж, няма.

Чэся сказала грэбліва:

— Прыдумалі ж, халера ім, і назву — народная армія. Жменька людзей, якія заблыталіся.

— Ты не ведаеш, які гэта сіроп — палон. У яго ўскочыш — ура! Кацёл з варам, што чэрці на тым свеце грэюць, дзіцячы сподачак з манкаю ў параўнанні з палонам. А тут — зброю даюць. Ды кожны разумны сабе скажа: бяру яе ў рукі — і дулю вам. Ты зірні на Ромеля пашага!

— Ромель — немец. Ён жа з іншай, варожай, арміі.

— Хай сабе. Але ж мазгі яму жыццё перавярнула? Перавярнула. Ён у які цяпер бок глядзіць? У наш!

Яна сказала ўпарта, зацята, як бы патрабуючы ёй не пярэчыць:

— Ромель не нашай зямлі чалавек. А тут — нашы былі людзі. Ім, «народнікам» гэтым, я б не давярала. Той, хто здрадзіў аднойчы, здрадзіць і ў другі раз...

Чэсіны словы непрыемна зачапілі яго, у душы абудзіўся стары, але, як здавалася, зусім прыгаслы, загоены боль, і яму зрабілася тужліва і крыўдна. Боль, выяўляецца, жыў, бы вугалле пад попелам, а вось зварухнулі той попел, і пячэ вугалле, і дыміць... Што ні кажы, але на вайне абставіны часцяком мацней за тваю ўласную волю. Вось ён, Багдан, быў у загарадцы. А другі, скажам, трапіў у палон паранены ці ад жаху скамянелы. Так што, пад адзін грабеньчык стрыг-

чы ўсіх? І на ўсё жыццё з таго — пляма, якую не адскрэбці, не адмыць аніякай вадою? Несправядліва гэта! Там, у палоне,— трэба ж улічваць! — толькі дзве дарогі перад табою: памірай ад голаду ці рабі тое, што загадваюць. І толькі дурны не спакусіцца ўзяць зброю, набраць сілу, а потым супраць ворага яго ж зброю і крутнуць!..

— Гэтых «народнікаў» трэба разумець,— прамовіў ён з націскам, як бы падкрэсліваючы, што яна разважае павярхоўна, слаба ведаючы тое, пра што гаворыць.— І вельмі строга іх не судзіць. Паглядзець, з усіх бакоў паглядзець спярша...

— Я не кажу, што іх трэба судзіць. Але верыць... Я ўсё магу даравць. Але толькі не здраду. Гэтага нельга дараваць аніколі. Салдацкі лёс суровы: альбо перамагай, альбо памірай. І спасылкі на абставіны, на выпадак — не да твару салдату. А мы з табой — салдаты!..

Яна як бы прызнавала цяпер роўнасць паміж імі, як бы закрэслівала яго старую віну за тыя дні палону, і ён зразумеў яе парыванне, але стаяў на сваім:

— Калі шугае вялікі агонь, у ім аднолькава гарацъ і сухія і мокрыя дровы...

Думка была не яго ўласная, яе некалі выказвала Маўджуда, і ён паўтарыў яе цяпер, як бы паклаў мяжу паміж сабою і Чэсяй, і з болем у сэрцы падумаў пра тое, што гэтак блага абышоўся з жанчынаю, якая яго, відаць, па-сапраўднаму кахала. Нейкае дзіва адбываецца з ім. Была гаранка побач — ён зненавідзеў яе, яна яму замінала, ён вінаваціў яе ва ўсіх сваіх няўдачах і памылках, нават у тым, што яна абвастрыла, паглыбіла непаразуменне паміж ім і Чэсяй, разумеў, што гэта не адпавядае сапраўднасці, па-дурному чапляўся за старое каханне і топіў, ламаў новае, на якое не меў права ўзнімаць руку. Цяпер на месцы чалавека, якога можна было ў нечым абвінаваціць, у нечым папракнуць, апынулася Чэся, але ў яе адрас ён аніякіх абвінавачванняў не рабіў. Ён анічым не папракаў цяпер і Маўджуду, і думкі пра яе былі светлыя, шчырыя, як пра дні пагодныя, сонечныя, хараство якіх ён не разумеў, калі яны былі, і якім цяпер не суджана болей аніколі вярнуцца і ўсцешыць душу. Няма Маўджуды. З цяжкай ранай, якая была ў яе, чалавек не выжывае. І ён, Багдан, мабыць, аніколі і не даведаецца, дзе і кім была яна пахавана, аніколі не ўбачыць магілы чалавека, які па-сапраўднаму кахаў яго. Дзіўная рэч гэтае каханне чалавека! Яно нібыта цень: аніколі не дагоніш, аніколі не ўхопіш рукою, не затрымаеш...

— Ты ў агонь не кідайся па-дурному,— папрасіла Чэся.— Спачатку ўсё разведай як след... Калі чалавек, не разведаў-

ны ўсё як след, рушыць у дарогу — абставіны, як з ветру, заявяцца. Я ў гэтым перакапалася...

Ён не пагадзіўся з ёю, але змоўчаў, вырашыў нічога не даводзіць, не спрачацца. Ніхто не пераканае яго, што чалавек можа скінуць з разліку абставіны, выпадак. Лёгка ёй казаць: не разведаўшы ўсё як след... А ты паспрабуй, разведай усё і ва ўсіх выпадках! Разведаць — прайсці, значыцца, шляхі невядомыя. А хто загадзя скажа табе, што там, наперадзе, чакае?.. Калі ты ідзеш па тых невядомых шляхах першы — цябе, першага, бяда і стрэне. Можаш лічыць тую бяду выпадковасцю. Што ад гэтага зменіцца? Нічога. Затое той, хто ідзе следам за табою, выкарыстае твой вопыт незалежна ад таго, колькі за той вопыт заплачана, можа зрабіць так, каб гэткі ж выпадак ужо не нарабіў новай бяды. А калі гэтага вопыту не маеш, калі ідзеш першым? Выпадак цябе падкаравуліць, стрэне, бо ў чалавека не бывае ўся дарога гладзенькая, без выбоінкі, ды каб увесь час сонца над ёю... Што ж тады атрымліваецца? Няма, значыцца, ратунку ад выпадковасці?.. Не-е, ёсць ратунак! Ёсць! Ты прыгадай, калі бяда цябе спаткала! Калі губляў асцярожлівасць, траціў пільнасць, быў неабачлівы. Скажы, дзюбнула б цябе бяда на пачатку вайны, на тым злашчасным хутары, каб не развесіў ты па-дурному вушы, каб не кінуўся, бы дурное куранятка, на ласкавы голас? І хіба ж гэтак, як сёння, ішло б тваё жыццё, каб зацугляў ты тады сваю дурную рэўнасць, каб па-разумнаму паставіўся да страты Чэсі, каб хоць крышку быў цярплівы і мужны? Так што мае рацыю Чэся, вельмі слушна яна табе гаворыць. А ты, часцяком, як і не слухаеш, спрабуеш толькі сябе перакапаць...

Намысліў пагадзіцца з Чэсяй і зноў, міжвольна, дзівячыся з таго, што гаворыць, паўтарыў яе словы:

— Абставіны, як з ветру, заявяцца...

На яе твары прамільгнула ўсмешка задаволенасці, Чэся як бы ўхваляла тое, што ён пагаджаецца з ёю. Але ў голасе яе загучала скруха:

— Вайна... Людзі штодня гінуць. І сам побач з бядою жывеш. А да смерці аніяк не прывыкнеш. Мсціслава калі павесілі, дык я была думала, што звар'яцею. Але ж вытрывала, перажыла... Нейкія дзівосныя сілы ў чалавечым сэрцы схаваны! Цяпер Толічка свайго згадаю — жыць і жыць хочацца. Усё думаю, як на ногі яго пастаўлю, як у людзі выведу... І табе, Багданка, я ўдзячная. Нават болей не за тое, што цяпер ратаваў, а за тыя словы там, ля цыганкі. Калі з калонаю я ішла...

— Якія словы?

— Тваё абяцанне Толічка дагледзець.

— А-а... Гэта, між іншым, шчасце тваё, што ён там, за лініяй фронту. Ты ж бачыш, што робіцца наўкола? Грыміць жа штодня. То ў адным кутку яны партызан прыціскаюць, то ў другім, то ў трэцім... І адсоўваюць пакрысе і ад чыгункі, і ад буйных дарог. Звужаецца і звужаецца кола.

— Нічога, да вясны пратрымаемся.

— А што вясною?

— Што вясною? — яе вочы пакругэлі ад шчырага здзіўлення, і твар набыў па-дзіцячы наіўны выраз, які Багдана заўжды крапаў і які бачыць даўно не даводзілася.— Вясною лясы родныя схаваюць. Вясною фронт пойдзе. Вясною ад кола блакаднага — цю-цю-цю,— і, гучна пацокаўшы языком, яна са строгім павучаннем дадала: — Вясну ніхто і ніколі не стрымае. Вясна якое хочаш кола разарве.

— Што нам з тае вясны, калі нас не будзе?

— Мы будзем, Багданка! Будзем! — і, нечакана, голас яе палагаднеў: — Ты зняверыўся, бо пакутаваць шмат давялося. І з твару неяк зблажэў апошнім часам,— і навярнулася, глядзела на яго спачувальна і добра, потым сказала з падкрэсленым выклікам, але незлосна: — Слаўная яна была жанчына. Чулая. І добрая дужа...

Апошнія словы прагучалі пачаткам пэўнага сцверджання, выказаць якое нешта ёй замінала, і гэтае сцверджанне, як яму падалося, ён зразумеў. Маўджуда, маўляў, была і чулая, і добрая, і ты, як бачыш, яе не варты аказаўся.

Прыдуманае ім сцверджанне набыло пэўнасць і цвёрдасць, і ён канчаткова цяпер паверыў у тое, што жыццёвы Чэсін шлях назаўжды разышоўся з яго шляхам і аніштo ўжо іх не зблізіць, і, паверыўшы, пакутаваў моўчкі, але дужа востра, як ніколі раней.

«Без Чэсі мне будзе цяжка. І, апрача яе, мне аніхто не патрэбны...»

Багдан не хлусіў сабе і ведаў гэта дакладна.

Але ён нечакана, як бы спатыкнуўшыся на праўдзе, якую сам і адкрыў, спалохаўся, зразумеўшы, што ў ціхіх словах Чэсі прагучала больш ярасці, чым у тым адчайным папярэджанні, якое яна зрабіла ў страшэнным сваім узрушэнні.

«Мсціслава калі навесілі, дык я была думала, што звар'яцею».

Так, гэты боль будзе з ёю ўсё жыццё. І гэты боль будзе прыгнятаць і яго, Багдана, і ад гэтага болю, чужога яму болю, анікуды схавацца нельга, нельга ўцячы, як і нельга перарабіць самога сябе.

Ён падумаў яшчэ пра тое, аб чым намагаўся не думаць,

што ўсе апошнія дні не давала яму спакою, што ён упарта сіліўся не браць пад увагу — падумаў пра Чэсінага сына, і гэтая думка набыла выключную важнасць, і яму зноў зрабілася жахліва і неяк моташна. Ён жа зусім павыключаў яго з сваіх рашэнняў і выснеў! Не, гэтага не скажаш, каб ужо зусім і начыста павыключаў. Але на першым месцы яны, гэтыя думкі, не стаялі аніколі — на першае месца ён звычайна ставіў сябе і Чэсю. А менавіта ён, хлопчык, які далёка цяпер адсюль, павінен быў стаяць на пачатку ўсіх тваіх разважанняў; не толькі Чэсін боль, але і боль гэтага хлопчыка павінен усё вызначаць у тваім лёсе. Памятаеш, што казаў табе бацька? І ты ж абяцаў яму, што зробіш усё паводле бацькавых слоў. І чаго ж не ў памяці словы Маўджуды пра закон гор, які сурова карае чалавека, што разбурыў чужы дом?.. Ты ж часцяком ажно калаціўся ад напамінкаў пра законы гор, і заўсёднае імкненне Маўджуды прымусіць цябе жыць па тых законах прыводзілі цябе да шалу. Ты лічыў, што жывеш па сваіх законах, і гэта, прынамсі, заканамерна і правільна: у кожнага чалавека ў сэрцы свой закон, па якім ён і жыве. Які закон — гэткі і чалавек!..

У душы ён не лічыў сябе благім чалавекам, ён пачаў нават глыбока паважаць сябе за тое, што не кінуў Чэсю ў бядзе, што жорстка асудзіў сябе за памылкі, якія зрабіў у жыцці. Але цяпер гэтае пераконанне ў сваёй дабрыні не даходзіла да галавы, як бы супынілася на паўдарозе, упёршыся ў новыя думкі і новую развагу.

— Трэба збірацца і рухацца...

— Не, не! Паспі хоць якое каліва,— сказала Чэся, і ён быў падумаў, што яна стамілася і хоча заснуць.

— Кладзіся і спі. Рану ўжо сёння перавязваць не будзем. Як вярнуся, тады і перавяжам, пры дні каб. І свежага святаянніку згатуем. Дзівосныя лекі гэтая трава. Аніколі не думаў.

— Я кажу, што табе трэба паспаць, хоць якое каліва. Паспрабуй заснуць. Я пасяджу.

— Дзе ж тут заснеш!

— А ты паспрабуй. Загадай сабе...

— Ты ўсё па загаду любіш.

— А хіба блага, калі на добрае загад? Добра. Спі, Багдане, спі...

Сухая асака, якой Багдан нарэзаў ля балаціны на ўзлеску яшчэ тады, як толькі прыбіўся сюды, да гэтага дота, была як жывая, у сцяблінах ішла свая, не скончаная жытка. Багдан не варушыўся, ляжаў нерухома, закінуўшы рукі пад галаў, зморшчыўшы вочы, і нейкія дзіўныя, прыгаслыя гукі, надоб-

ныя па журботную, разарваную ветрам песню, увесь час жылі ў пасохлых сцяблінах: яны то прападалі, знікалі зусім і нечакана, на зусім новай ноце, як раптоўны павеў ветру над ранішнім трысняговм, нараджаліся, зноў раставалі, і было зусім немагчыма злавіць і месца і імгненне, дзе яны пачыналі сваё жыццё. Шолахі ссохлай травы закалыхвалі, і ён, нацягнуўшы на сябе стракатую посцілку, якую выпадкова знайшоў у садзе непадалёк ад попелішча, закрыўшы кепкаю вочы, як праваліўся ў нябыт, адразу адключыўся ад усяго рэальнага, адключыўся цалкам ад сваіх трывожных і неспакойных думак.

І гэтак жа хутка, як і праваліўся ў сон, ён прачнуўся і не адразу дапяў, што гэта з ім адбываецца, ці ява гэта, ці сніцца яму ўсё, што ён адчувае і чуе. Чэсіны рукі папраўлілі на ім посцілку, нацягнулі яе вышэй, затуляючы шыю і плечы, потым лёгка кранулі валасы — папраўлялі кепку, што спаўзла з вачэй і завісла на правым вуху.

Адчуў, як тарганулiся яго ўласныя губы, і тут жа ўчуў шалхаценне — Чэся адсунулася паспешліва і парывіста, быццам напалохаўшыся, што ён не спіць, прачнуўся і прыкмячае яе ласкавасць.

Ён вырашыў утоіць, што ведае пра гэты яе клопат, заварушыўся, выцягнуў рукі з-пад галавы і сеў, пазяхаючы.

— Усё. Цяпер ужо не заснеш болей. Але спаў, быццам у прорву праваліўся. Нават нешта вярзлося. Доўга я спаў?

У доце было цёмна, шчыліна амбразуры ледзь акрэслівалася, і твар Чэсі ён амаль не бачыў, толькі крыху свяціліся белыя шчокі, а вочы як зусім зніклі, схаваліся.

— Паўгадзінкі спаў, не болей,— сказала яна заклапочаным голасам.

— І дастаткова. Цяпер ноччу буду бадзёры. Трэба ісці. Пакуль шчэ да Дзвіны датэпаю.

— Старой дарогаю пойдзеш? — спытала і тут жа сама і параіла: — Ідзі зноў ручаём. Ён нейкі шчаслівы, мне здаецца. Тады, як з калонаю ішлі, добра ўсё было. І гэтыя разы ты шчасліва праходзіў.

— Не, гэтак не пайду. Далёка — гэткага кругаля даваць. І ацямнела добра — можна і напрамкі ўрэзаць.

— Я цябе праводжу...

Яна папрасіла ціха, і гэтая ціхая ўмольнасць яго расчуліла, перакапала канчаткова, што Чэсін ласкавы клопат аб ім не сасніўся, што ўсё было ў сапраўднасці — і рух посцілкі, і лёгкі дотык яе пальцаў да валасоў, і спуджанасць, і тое, як яна замкнулася, быццам улезла ў ракавіну, хаваючы сваё парыванне.

— Шчэ чаго прыдумаеш? Кладзіся і спі.

— Дзе ж тут заснеш. Калі ты звычайна, сыдзеш, дык і сон знясеш. Сяджу і чакаю...

Раней яна пра гэта аніколі не казала, і цяпер Чэсіна прызнанне яго расчуліла, збянтэжыла, але прызнавацца ў гэтым ён не хацеў, разумеючы, што сваім прызнаннем толькі прымусіць яе апраўдвацца і хлусіць.

— Табе што, жахліва адной сядзець?

— Чаго гэта жахліва? Аўтамат калі ёсць... Аўтамат каля сябе пакладу — чаго мне тады баяцца!

Але за гэтым прызнаннем быў сполах. Яна, напэўна ж, штораз застаючыся адна, пакутавала ад жаху, а ён, выпраўляючыся ў дарогу, аніколі яе не супакойваў, не падбадзёрваў, адно толькі і раіў, каб клалася і спала.

— Гэта ты разумна гаворыш. Калі зброя ў руках — аніякі тады чорт не страшны. А па-другое, сюды і ўдзень аніхто не накажацца — між людзі пабойваюцца. Гэта ж мы праверылі: удзень тут хоць у бубен грымі. Можаш і агонь раскласці.

— Расхрабрыўся,— распеўна працягнула яна.— Ты, глядзі, асцярожна ідзі. Прыглядайся ўважней — ноч жа!

— А я ўночы гэтак жа, як і ўдзень, бачу — прызвычаіліся вочы,— пахваліўся ён.— А чуваць уночы — лепей увогуле. Гукаў жа зусім мала — усё спіць. Дапраўды, кладзіся і спі,— і, закінуўшы за плечы аўтамат, прапанаваў: — Во, пасцілкаю давай ухутаю...

Яна адмовілася ад яго паслугі, потым сказала тое, што яго дужа ўразіла:

— Я выйду разам з табою. Услед пагляджу... Калі, кажуць, мужчына выпраўляецца ў дарогу і жанчына стаіць ля парога, ён шчасліва вяртаецца.

— Не чуў пра гэткае. Хадзіў жа дагэтуль у дарогу. І нічога, вяртаўся.

— А я, калі папраўляцца пачала, следам, як ты поїдзеш, дапаўзу да праломкі — і гляджу...

У яго перахапіла дыханне, ён збянтэжана пракаўтнуў нейкі сухі камяк, што скаціўся аднекуль з паднябення, прапанаваў, адкашляўшыся:

— Давай дапамагу. Трымайся за маё плячо.

Яна абаперлася аб яго руку, але потым вызваліла, як спалохалася гэтай блізкасці, памалу сунулася ля сцяны, трымаючыся за жалезную арматуру, якую, месцамі, выперла выбухам.

— Я сама. Сцяну гэтую ўжо вывучыла.

— А як адна потым дойдзеш? Хопіць сілы?

— Хопіць. Пастаю, крыху падыхаю. А ты ідзі, хай табе шчасціць і сёння...

Крыху адышоўшыся ад дота, Багдан азірнуўся, убачыў ледзь прыкметную ля чорнай сцяны постаць Чэсі, згледзеў узнятую на развітанне руку, салютнуў у адказ і даў нырца ў густы маладым соснік. Колькі крокаў ён прабег гэтак, сагнуўшыся, потым, калі соснік парадзеў, выпрастаўся, паправіў за спіной аўтамат і тут жа перакінуў яго на грудзі. Радасна і гулка грукацела сэрца. Ён зноў азірнуўся, убачыў расплывістую чорную пляму дота ў густым вечаровым сутонні і з радасным здзіўленнем прыгадаў і ласкавы Чэсін клопат, і развітанне, і трывогу, якая гучала ў яе голасе, і адчуў сябе чалавекам упэўненым, незалежным, якому шчасціла і будзе шчасціць далей.

Ён ішоў смела, хуткім размашыстым крокам, арыентуючыся на прыкметы, якія былі толькі яму і вядомыя: вось пахілая сасонка, якую, мабыць, нейкі звер спрабаваў сагнуць, але яна не паддалася, упёрлася голлем у зямлю і стаіць; вось дрэвы роўныя, растуць дужа шчыльна, як звязаныя і пераплеценыя галінамі; далёка за імі пунсавее цёмна-аранжавая паласа згаслага дня.

Багдан прыпыніўся на момант, памацаў рукою маладыя сасновыя парасткі-свечачкі, адчуў іх вільготную і як бы цёплую мяккасць. Змакрэлай далонёю абцёр твар, і тады раптоўна, з новай сілаю, выбухнула ў сэрцы радасць расстання, якую ён перажыў незаўважана, якая цяпер адкрылася перад ім ва ўсёй прыгажосці і зычыла змены ў яго лёсе — ён з выключнай сілаю адчуў гэта,— змены вялікія, абяцала добрыя шчасныя дні.

І ён у гэтыя дні паверыў.

## 6

*БЛАКНОТ РОМЕЛЯ. Старонка сёмая.*

«Убачыць сёння свой заўтрашні дзень — гэтага не суджана нікому. Праўда, быў час, калі я, засынаючы ўночы ў абдоймах сваёй жонкі, дакладна бачыў, што чакае мяне заўтра, што я буду рабіць, чаго дасягну. Але тыя дні — далёка. Гэтак жа далёка, як і мая наіўная вера ў наш «бліцкрыг», у тую вар'яцкую задуму маланкавай вайны супраць Масквы.

Маскву я не бачыў.

Маскву я не ўбачу ніколі.

Да гэтай высновы я зноў дайшоў сёння, калі працаваў разам з Падрэзам на полі — аралі зябліва. Кліп ворыва невя-

зікі, па левы бок ручая, ля якога растуць вольхі, старыя, уперамешку з клёнамі. Па правы бок — зялёнае вялізнае, ажно да самага лесу, роўнае поле азіміны: руні ўжо высокая, у далонь амаль, і яе быццам крывёю пакрапілі — вецер паразносіў кляновыя барвы.

Вецер натрос некалі кляновых семкаў сюды, на поле, якое давялося нам араць, і яны прараслі. Некаторыя клёнікі — як не ў калена ўжо — стаялі радочкам па канцы поля, што нахата скочваецца да ручаіны. Большыя клёнікі Падрэз павыкопваў,naпepacaджваў бліжэй да ручая ў ямінкі, якія падзёўб нямецкім цесаком — посіць цясак на рэмені.

Цясак здаўся мне дужа знаёмым. Ці не Куртаў гэта цясак — вартавога, які быў забіты ў тую жахлівую ноч, калі гарэў наш штаб?

Падрэза мая ўвага занепакоіла.

— Знаёмы? — папытаў ён, перахапіўшы мой позірк.— Улетку на чыгунцы сабе прыдбаў. Нямецкі, ведама.

— Нямецкі,— пагадзіўся я.— Выдатная сталь.

— Майстры вы добрыя, гэта ўсім вядома.

Мне не зрабілася лягчэй з таго, што памыліўся — не Куртаў гэта цясак! — і Падрэзава ўхвала не ўсцешыла сэрца. Мяне страшэнна ўразіла тое, што ён сказаў, калі раўнаваў зямлю ля перасаджанага клёніка:

— Трэці год дрэўцу. Равеснічак вайны. Мале-енечкі. А з яго у-унь які волат выцерабіцца...

Схмурылася неба над лесам, сыпанула з высі белыя крупы, і яны не раставалі, ляжалі ў барознах, калі мы даворвалі кліп зябліва. Я глядзеў на белыя крупы на чорнай раллі, і на сэрцы было дужа самотна, прыкра, пагана. Мяне не палохала блізкая ўжо зіма — дзве зімы я перажыў тут, у рускіх снягах, і прызвычаіўся да сцюжы: ёсць і кажух добры, і боты, і вушанка. Мне было не па сабе, як і кожны раз, калі паўпярок сэрцу мой розум дакопваўся да высновы, якая мне зусім і не патрэбна — да высновы непазбежнасці іхняй перамогі ў гэтай калатнечы.

Семка з клёна зваліласа ў той год, калі мы пачалі свой «бліцкрыг». Яно прарасло, пакуль ліецца наша і іхняя кроў, пацягнулася ў рост, і, ведама ж, як кажа Падрэз, з яго з часам «выцерабіцца волат».

Так, усё вялікае робіцца паступова: яно, вялікае, павінна спачатку нарадзіцца, пакутаваць, потым набраць сілу і толькі затым — расквітнець.

Гэта — закон прыроды, і чалавек над ім не ўладарны. А мы змыслілі гэты закон пераскочыць.

У імя чаго? Навошта?..»

## 7

На паваротцы дарогі, слаба ўезджанай, разрэзанай шырокімі палосамі ад палазоў, развалкі занесла крыху, і Захар ледзь не зваліўся на дол, у размяклы снег. Багдан жа нават і не пахіснуўся, сядзеў нерухома, нават аўтамат у яго на грудзях не зварухнуўся, быццам быў прыклееny да кажушка, і Захар, зірнуўшы на чырвоныя ад холаду Багданавы рукі, якія моцна сціскалі лейцы, адчуў, як зварухнулася ў сэрцы нядобрае пачуццё. Хай сабе ён, Захар, яму абыякавы. Дык жа ж Чэся ляжыць у сене, хоць зірнуў бы на яе, хоць бы пацікавіўся, ці добра ёй! Мог жа і да гаворкі агульнай далучыць. Дык не ж! Закапыліў губу і сядзіць, бы ідал каменны. Гэтак вось Кандрат тады ў хаце сядзеў ля стала. Уночы. Калі ён, Захар, зазірнуў у акно. Дзіўна! Шмат жа часу сплыло пасля той веснавой ночы, шмат вялікіх і малых падзей пакруцілася, а вось гэтая драбніца накрэпка ассела ў памяці. І сапраўды, дужа ж Багдан на свайго бацьку зрабіўся падобны. Стуленыя, крыху прыгорбленыя ўвесь час плечы, чырвоная моцная шыя, радкаватыя ў два колеры — знізу, над тоўстай губою, светлыя, а бліжэй да носа рудыя, як агняныя,— вусы. І шчэць на даўно не голеных шчоках гэткая ж. Нос вось толькі на Кандратаў не падобны: у таго шырокі, ноздры як надрэзаныя, а ў гэтага — доўгі, сіні, з нейкай хваравітай пухлінкаю на кончыку. Два рубцы, улетку зусім не прыкметныя, цяпер, на холадзе, рэзка акрэсліліся, барвовымі вужакамі ідуць ад вялікай радзімкі пад правым вухам на лоб, быццам шыюцца пад старую, крыху цеснаватую Багдану аблавушку, надаюць твару выраз бязлітасны і жорсткі.

— Вось гэтак, таварыш камандзір, мы тут і жылі,— сказаў Багдан і, пачухаўшы мезенцам бровы, зыркнуў на Захара.— Дзейнічалі, як абставіны падказвалі. Адно мяне ўсцешвае, што загад я ваш выканаў...

Лёгкая снегавая манка па-ранейшаму несціхана ўсё падала, сыпалася з замглёнай высі, нізкай, завіслай над полем, асядала на конскай хрыбціне, на сене ў развалках і чамусьці прападала, як выпарвалася адразу, на Чэсінай хусцінцы, шэрай, запраўленай над каўнер рудаватага, палапленага на рукавах і плячах кажушка. Вочы ў Чэсі былі закрытыя, яна пібыта спала, і Захар зноў падзівіўся, згледзеўшы, як высах і змізарнеў Чэсін твар.

«Бы з пергаміну ў яе шчокі...»

Рыпеў пад палазамі снег, але не звонка, як у мароз, а натужна, працягла, з нейкім надрывам. Ад гэтага рыпення Захару рабілася самотна, прыцiскаў цяжкі неадчэпны одум.

Дужа ж, відаць, неабачліва зрабіў ён, Захар, што кінуў узвод ля Пятроўцаў, калі сустрэў Багдана і кінуўся з ім за Дзвіну. Неяк дужа няўтульна пачуваеш сябе, калі не ведаеш, што робіцца наўкола. А ён жа, не разведаўшы анічога, кінуўся адразу з Багданам за Дзвіну. Магчыма, памылку ён зрабіў яшчэ і раней, калі перакапаў Гусарава і з узводам першай роты пайшоў у гэты рэйд па месцах былой дыслакацыі атрада. Хай сабе ён не злавіў тую банду, што шнырыць па вёсках, выдаючы сябе за партызан. Затое цяпер ён ведае аб ёй шмат! Затое ён стрэў Багдана! І тое, што ён кінуўся з Багданам за Дзвіну,— не памылка: ён знайшоў Чэсю — як жа было чакаць, як сядзець па месцы, калі дачуўся ад Багдана, што Чэся жывая! — і вось цяпер яны едуць разам. Неўзабаве яны будуць ужо ля Пятроўцаў, дзе ён спыніў на адпачынак узвод Файзуло, узмоцнены падрыўной групай.

А на душы — неспакой. Радасць сустрэчы з сястрой улеглася, а неспакой застаўся, жыве і нібыта прыходзіць не адкуль здаля, а бруіцца ад гэтай, крыху прыгорбленай, Багданавай постаці. І дужа дзіўна: удзячнасці Багдану — Захар ужо ва ўсіх падрабязнасцях ведаў, што давялося ім перажыць за гэты час! — удзячнасці зусім, здавалася б, натуральнай за тое, што ён ураТаваў Чэсю, няма ў Захаравым сэрцы. Нібыта ўсё менавіта гэтак і павінна было здарыцца: Багдан знойдзе Чэсю, уратуе ад бяды, потым сустрэне Захара і даложыць, што загад яго, камандзіра атрада, выкананы. І зноў жа дзіва: вайсковая ўдача нібыта крочыць следам за Багданам. Гэта ж амаль немагчымае ён зрабіў — уночы адшукаў параненую Чэсю, пераправіў за Дзвіну, лячыў, уратаваў ад вернай і непазбежнай смерці. Цяпер з гэтай бандаю. Захар жа ўжо тры дні гойсае па ўсіх напрамках па былой партызанскай зоне — ніякага следу. А ён, выяўляецца, высачыў банду, ведае і колькі чалавек у ёй, і адкуль выплывае раптоўна, і куды гэтак жа раптоўна знікае, і нават прозвішча «капітана» — Паліванаў! — які ўзначальвае банду, ведае. Ведае і пабачыў яго!

— Рызыкоўна ты, аднак, дзейнічаў,— сказаў Захар і нечакана сумеўся ад думкі, што заўсёды, калі побач з ім Багдан, яму, Захару, не вельмі шанцуе.— Магчыма, яны, паліванаўцы гэтыя, цябе заўважылі, але не чапалі?

Багдан не зварухнуўся, але адказаў адразу ж:

— А які ім інтэрас? Заўважыць і не чапаць? Не-е, яны мяне не прыкмецілі.

— Тады чаго зніклі? — напытала Чэся, не змяніўшы паставы і не адкрыўшы вачэй.

— Яны не зніклі — у іх расклад такі,— сказаў Багдан,

але на Чэсю не зірнуў.— Чатыры дні іх не было відаць? Не было. Сёння, значыцца, павінны паявіцца. Я ўжо вывучыў: на пяты дзень яны на гэты, левы, бок Дзвіны арудуюць. Апошні раз я пад самай Экіманню залёг. Дачакаўся: едуць. І ўсё тая ж песня, хахлацкая: «О-ой, наступала цёмная хмара...» Палівапаў яе заводзіць — голас высокі, моцны. Я гэтага падкалодніка добра разгледзеў, калі на вышках у Баноні ляжаў — яны ўдзень туды прыехалі...

— Шчасціць табе,— шчыра прамовіў Захар.

— Ды не, проста ўсё — навука плюс цярпенне. Я тады ў Экімані чатыры гадзіны на золі калеў. І гэтулькі ж — у Баноні. Але — дачакаўся свайго Палівапава. Ён мардаты, з вусамі. І да яго як прылеплены маленькі тоўсценькі бобік. Касароты, з бародкаю.

— Гэтак блізка ад іх быў?

— Усіх можна было пагаліць з аўтамата. Мог і рукою за вуха схапіць. Ці за вусы. У тоўсценькага левае вуха вось тут падкарочанае,— Багдан, не паварочваючыся да Захара, правёў указальным пальцам па вуху.— Як падрэзанае тут у яго вуха...

Дарога крута павярнула ў бок Дзвіны, разматвалася папад самым узвалам. Цёмная плынь ракі выдавала нерухомай, і адбіткі заснежаных дрэў былі выразныя на вадзе, як намаляваныя. Лёд ляжаў толькі ў затоках, няроўны, як скамечаная фальга.

Злева, не дужа далёка, бабахнуў вінтовачны стрэл, працяглае рэха адгукнулася за ракой, як паўторанае тройчы. Захар саскочыў з развалак, хітнуў галавой у той бок, дзе прагучаў стрэл:

— Відаць, яны?

— Наўрад. Банда без грому дзейнічае,— сказаў Багдан і не змяніў паставы, нават не павярнуўся і не варухнуўся.— Недзе ля Ліцвінава стралялі.

— А хто? Там нашых няма.

— Стрэлы цяпер паўсюль. Быццам і страляць няма каму. А яно як з ветру часам: бэх ды бэх...

Зноў, усё ў тым жа баку, прагучаў стрэл, і цяпер гэта Багдана занепакоіла, ён таксама саскочыў з развалак, нацягнуў лейцы.

— З нямецкага карабіна ўлупілі,— вызначыў ён упэўнена і прапанаваў таропка: — Падскочым туды? Гэта недзе ля Ліцвінава.

— Не, узвод трэба па трывозе ўзнімаць,— не пагадзіўся Захар.— Але ж як паведаміш? — і раптоўна прыняў рашэнне, якое выспела ў ім нечакана: — Чэся! Гані ў Пятроўцы!

А мы — пеша. Малаверагодна, што перахопім, але якое лепшае рашэнне тут ты зпоідзеш?

— Аніякага,— адказаў Багдан і, нібыта менавіта ён павінен быў усё вырашыць, кінуў лейцы на рукі Чэсі.— Гані! — і дадаў загадна: — Гані, Чэсечка!

— Хай Фаізуло ўзнімае ўсіх. І — на Ліцвінава!

Багдан адразу падправіў Захара:

— На Ліцвінава — хай пяток чалавек. А ўсіх — берагам. На тую дарогу, што за ручаём на Экімань выводзіць. Фаізуло ведае!

Захар пе аспрэчваў таго, што сказаў Багдан, і не ўдакладніў, чаму трэба дзяліць узвод на часткі. Зміікіціў адразу, што Ліцвінава трэба абціснуць з усіх бакоў. Асноўная частка ўзвода — ад дарогі на Экімань. Другая група — па Банонь. Ён з Багданам — заходзіць па прамой ад Дзвіны. У выпадку бою — усе гэтыя часткі могуць лёгка сысціся.

«А ў яго варыць галава, у гэтага Багдана!»

Захар падумаў гэта, шпуруючы следам за Багданам, які кумільгам пусціўся ад дарогі па цаліку, кіруючыся не ў бок лесу, за якім прагучаў стрэл, а да густога ланцужка нізкарослых вольхаў. Развалкі ўжо схаваліся ўдалечыні, затуленыя вербалозамі, і Захар чуў цяпер толькі тупаценне Багданавых ног, якое неяк цішэла, і раптам убачыў, што пачынае адставаць. Дыхаць рабілася ўсё цяжэй, а Багдан шчэ нават паддаў хады, імчаў лёгка, хутка і прыгожа. Захар ужо не захапляўся разумным рашэннем, якое падказаў Багдан і якому ён падпарадкоўваўся напачатку з ахвотаю і падзякаю. Цяпер, выбіўшыся з сілы, ён падумаў аб ім са злосцю.

«Адседзеўся ў доце, выгуляўся, нічога не робячы, дык цяпер і прэцца, як бугай...»

Думка была непераканаўчая, злаславасць у ёй ён адразу адчуў і зразумеў і папракнуў сябе з той жа злоснасцю, з якой толькі што лаяў Багдана. Сам, галубок, вінаваты. Прывучыў сябе да седала, да сядла — апошнія ж месяцы з каня і не злазіў. А трэба было вось гэтак, пожкамі тупаць, пожкамі...

— Чаго ты ў поле верпеш? — гукнуў ён у спіну Багдана. Той не адказаў, і тады Захар зноў гукнуў, спадзеючыся, што той зараз спыніцца, пачне нешта тлумачыць і ў яго будзе нейкі міг перадыхі: — Нам жа па лес і трэба.

— На дарогу зараз выскачым.

— А навошта?

— У засаду заляжам. Хай лепей яны пад кулі падлятаюць.

Нізкарослыя вольхі з кожным крокам да іх выцягваліся, шырэлі, і тое, што напачатку здавалася Захару тонкім лан-

цужком, было ў сапраўднасці густым хмызняком, які разразала слаба і няроўна ўезджаная дарога — два ці тры сляды ад палазоў. Сярод вольхаў пракідаліся і вярбняк, і чаромха, і гнуткія вербалозы, і ля правай узбочыны стаялі дзве старыя, з абламанымі вершалінамі, таполі.

Багдан высунуўся з хмызу і тут жа шуснуў назад, прысеў, сіпатым голасам паведаміў:

— Бяжыць! Жанчына нейкая бяжыць!

— Дзе? А-а... Праўда, бяжыць.— Захар таксама цяпер згледзеў жанчыну, якая, накульгваючы, сунулася па правай узбочыне і, відаць, не бачыла іх.— А куды дарога? Ці не на Пятроўцы?

— Можна і на Пятроўцы. Толькі ад павароткі трэба ўлева ўзяць. Праз поле, без дарогі...

— Трэба спыніць.

— Ведама ж. Нешта ж даведаемся...

Захар наважыўся першым выскачыць на дарогу, але трапіў у нейкую глыбокую калдобіну ля дарогі, замеценую снегам, пакаўзнуўся, асеў на дол. Жанчына не бачыла яго, бегла, апусціўшы галаву, махала-размахвала пярэстай хусткаю, якую трымала ў левай руцэ, і здавалася, што яна ўвесь час нешта змахвае, сцірае з твару.

Багдан, абмінуўшы Захара, скочыў на дарогу; жанчына спынілася, потым зрабіла крок назад, потым другі, пайшла, адступаючы, пакуль не прыхінулася плячыма да дрэва, і стаяла, быццам баялася паваліцца.

— Хто? — Багдан ірвануў да яе.— Адкуль? Куды?

— Ліцвінаўская я... З Ліцвінава,— і змоўкла, углядалася ў Захара, які выкараскаўся з яміны і стаяў, атрэхваючыся.— Ой, таварыш Крупня. Я ж вас ведаю! Гэта ж вы сход у нас праводзілі, калі аблігацыі мы здавалі... А вы ж мне руку шчэ паціскалі, дзякавалі, што аблігацыі здаю... А яны, аблігацыі, мужавы, не мае ўласныя... Я тады не сказала...

— А куды цяпер імчыце? — перапыніў жанчыну Багдан.

— У Пятроўцы. У штаб!

— Які там штаб? — цыкнуў на жанчыну Багдан.— Чый?

— Як гэта «чый»? Атрадны. Шчэ пазаўчора баялі ў нас, што наш атрад зноў тут.

— Які гэта «наш»? — насядаў Багдан.

Жанчына пачала завязваць канцы хусткі на падбародку, якую ўскінула на галаву: канцы ўвесь час выслізгвалі з рук, як бы хто-небудзь нябачны іх тузаў, і яна, урэшце, злавіла іх, заціснула шырокім вузлом.

— Я ж вас ведаю, таварышок! Вось камандзір атрада стаіць, Захар Елісеевіч. А вы снарады ў кузні плавілі. Мая дач-

ка шчэ вам малако прыносіла. Няўжо не памятаеце? — і раптам тузанула круты вузел, канцы хусткі, як падхопленыя ветрам, раскруціліся, і яна зноў іх злавіла, але не вязала ў вузел, трымала рукою, зыркала злосна і непрыветна.— Як за аблігацыі, дык і падзяка і словы добрыя, калі вам аблігацыі былі патрэбныя... А кароўку мне райком выдзеліў па загаду, бо дзеці малыя... І ўсе тое ведаюць. А цяперака мне за ўсю вёску пастаўку цягнуць? Хай жа тыя патрасуцца, у каго дзетак малых няма. А ёсць жа тыя, што і з бобікамі звязаныя. Дык іх жа не чапаюць. Ім дык усё можна. А мне? За ўсю вёску мясную пастаўку здавай? Не паверу, што гэты загад бытта з таго, што райком часова кароўку выдзеліў. Трэба ж мяне было папярэдзіць, загадзя сказаць...

Багдан узарваўся:

— Што здарылася? Па-людску вы можаце паведаміць? — папрасіў цішэй, адчуўшы на сваім плячы Захараву руку: — Гаварыце толкам.Спакайней гаварыце. Карову, значыцца, забралі. Хто забраў?

— Дык жа ж і кажу: вашыя, са зброяй. На конях прыкацілі... Я ўжо і маліла і прасіла. Равуць: у пастаўку, мамаша, бяром!.. За ўсё — мне. За ўсю вёску — мне здаваць у пастаўку. А чаго ж я павінна за ўсіх?.. Мой Міхал у арміі, можа, даўно галоўку дзе-небудзь наклаў, мяне, з малымі, гараваць пакінуў...

Багдан, груба вылаяўшыся, сказаў:

— Гэта яна. Банда гэта, таварыш камандзір атрада!

Захар моцна націснуў Багданава плячо, быццам адсоўваў Багдана ад жанчыны далей, спытаў, намагаючыся казаць спакойна:

— Калі, скажыце нам, гэта здарылася? Колькі іх было?

Жанчына ўсхліпвала, выціраючы канцікам хусцінкі вочы. Доўгія саламяныя валасы яе растрапаліся, крылом апалі на твар, закрываючы лоб і бровы, і яна сутаргавым рухам адкідвала іх назад: пальцы ў яе былі кароткія і тоўстыя, у глыбокіх чорных рэпінах, нібыта жанчына толькі што палола грады. Потым яна сціснула валасы ў адзін жмут, твар яе адкрыўся цалкам, і на Захара ўмольна зірнулі немігатлівыя і бліскучыя, крыху раскосыя вочы.

— Вось цяпер я прыгадаў вас,— сказаў Захар, адчуваючы сябе прыкра пад гэтым немігатлівым цяжкім позіркам. Не, ён не памыліўся. Сапраўды, на сходзе, дзе вяскоўцы ўпасілі сродкі на танкавую калону, гэтая жанчына першай здавала аблігацыі, і яго тады яшчэ здзівілі крыху раскосыя яе вочы і высокі, у плямах лоб з бялявымі дужкамі броваў.— Вольга Сямёнаўна... Пачопка ваша прозвішча?

— Але... Вольга Сямёнаўна,— пакорліва нагадзілася жанчына, і ў яе вачах мільганула здзіўленне, што Захар памятае і прозвішча і імя па бацьку.— Вы скажыце ім, што яны нядобра робяць. Навошта ж кароўку забралі...

— Вернуць вам кароўку,— цвёрда паабяцаў Захар, хоць зусім не ведаў, калі і як гэта можа зрабіцца.— Але што вас папрашу? Вы куды беглі? У Пятроўцы, кажаце? Туды і бяжыце. Там — наш узвод. Ён, мабыць, ужо сюды едзе, па Ліцвінава — вы з ім не размінецеся. Усё раскажыце камандзіру. Разумееце?

— А чаго ж не разумець, таварыш Крупня? Разумею, разумею. Я скаранька пабягу. Скаранька...

Пачопка ўвішна пашыбавала дарогаю, і Захар запытальна паглядзеў на Багдана. Трэба было прымаць пэўнае рашэнне, рашэнне неадкладнае, і гэтага рашэння ў яго не было. Адно толькі разумеў: у Ліцвінава яны спазніліся. Бегчы туды патрэбы няма.

— Дык што? На Маразы? — спытаў Захар, яшчэ не ведаючы, што рабіць і якое рашэнне прыняць.— Калі іх там не нагонім — пішы прапала. З Маразоў чатыры дарогі па лясах — свішчы ў хвост.

— Свіснуць — лёгка. А вось бегчы — цяжка. І не блізка.

— Дык яны ж там, напэўна. У Маразах!

— Відаць,— неяк абыякава прамовіў Багдан, і ў яго голасе прабіліся іранічныя ноткі.— Нават і дакладна можна сказаць: там яны. П'юць ды закусваюць. Самі, як той казаў, ядуць, а нам не даюць.

— Э-эх, каб на конях,— тужліва вырвалася ў Захара.

— Тут не тое, што раней было,— іранічныя ноткі ў Багданавым голасе памацнелі, ён гаварыў з перавагаю, якой ганарыўся, не таячыся.— Коней цяпер у вёсках не знойдзеш: тых, што ацалелі, у глушэчу хаваюць, падалей ад гэтай навалачы... Адна ў нас надзея — свае ўласныя рысакі,— Багдан двойчы тупануў правай нагою.— Калі не падвядуць — нагэнціць. Кіламетраў якіх шэсць нам трэба праскочыць...

Задума Багдана яшчэ не зусім выкрышталізавалася для Захара, ён як не давяраў ёй, лічыў, што бегчы далей гэтак жа, як яны беглі толькі што, не дужа разумна, бо сілы не хопіць.

— А далей? — спытаў ён і чакаў тлумачэнняў.

— На Экіманскую дарогу каб нам паспець. І — перастрэць. Калі Файзуло іх з Маразоў турне — яны ў гэты бок кінуцца. А не турне — той жа сэнс: дарогі Экіманскай ім не мінуць. Так што рвём кінцюры, корань ім у душу!

Багдан паправіў аўтамат за плячыма і, не чакаючы згоды Захара, саскочыў з дарогі і мітнуўся ў хмыз. Захар кінуўся следам, але нават і не сіліўся дагнаць яго — выращыў берагчы сілы. Шэсць кіламетраў яшчэ прабегчы ў тым жа шалёным алюры — не заспяваеш. А дзе шэсць, па словах Багдана, можа быць і ўсе восем — гэтаму алешю лішні кіламетр прабегчы лёгка.

Захар пачынаў разумець, што Багдан зноў прапанаваў адзіна правільнае рашэнне, і зноў пачуваў сябе нядобра. Атрымліваецца, што ён, Захар, падначалены, што яму загадваюць і ён гэтыя загады выконвае. Нібыта Багдан — камандзір. І пярэчыць нельга. І спрачацца не выходзіць. Шукаць коней — марна патраціш час. На Маразы кінуцца — спознішся ўсё роўна. Ды і Файзуло туды, напэўна ж, раней іх паспее. Значыцца, задума перастрэць тых трох на Экіманскай дарозе — адзіная, мабыць, надзея на поспех. Але ж адкуль Багдан ведае, што яны паедуць той дарогай? А раптам у Маразах уся банда? І гэтая троіца да іх далучыцца, і яны рушаць на Пятроўцы? А ён, Захар, раздрабніў узвод, як знарок, падставіць пад удар маленькія групкі, якія вытрымаць сур'ёзны бой не змогуць?..

Ён пачынаў злавацьна Багдана, пачынаў злаваць на тое, што гэтак лёгка пагадзіўся з ім, не схацеў, не прымусіў сябе нават падумаць як след, паразважаць. Але ж дзе ты будзеш разважаць! Тут кожная хвілінка — усё можа вырашыць. Не, прынята рашэнне, і яго трэба трымацца. Трэба паспець!

Яны беглі моўчкі, беглі прыгожым параснікам, дзе ўсё часцей жаўцелі вербалозы, потым пайшлі маладыя вольхі, роўныя, як падстрыжаныя. Выбегшы з яго, Багдан прапусціў Захара наперад сябе, кіўнуў галавою на маладыя сасонкі, якія збягаў з накатага пагорка на роўнае белае поле.

— Бачыце?

Захар нічога не ўгледзеў сярод зялёных маладых дрэўцаў і толькі потым, як перавёў позірк далей, убачыў удалечыні за асьнежанымі дрэвамі сіратлівыя каміны спаленай вёскі.

— Зуі! — міжвольна вырвалася ў Захара. Ён адразу пазнаў і гэты накаты пагорак, і гэтыя сасонкі, і белае поле з левага боку. Жахлівым чорным венцом дыбіліся абпаленыя яблыні ў садах, і на іх не відно снегу, быццам дрэвы гарачыя і снег толькі што растаў на іх — галіны масляніста пабліскваді.— Аніводнай хаты!

— Хаты? Аніводнага хляўка не пакінулі — усё пад качалку.

— За ляском жа дарога,— сказаў Захар, прыгадваючы, як зусім нядаўна, улетку, ездзіў па ёй з Банопі на Пятроўцы.

Зноў беглі моўчкі, і Захар не без зайздрасці глядзеў на Багдана, які вырваўся наперад, імчаў па-ранейшаму лёгка, і на галаве ў яго ўжо не было шапкі. Захару падалося спачатку, што Багдан згубіў яе, але ўбачыў, як той пнецца заціснуць яе ў кішэню, і таксама садраў з галавы шапку, потым іррвануў, расшпіліў на шыі каўнер. Бегчы палегчала, але праз нейкі час зрабілася яшчэ цяжэй. Ногі правальваліся ў мяккі тарфяпік, зусім не змерзлы, а толькі прыцярушаны снегам, і там, углыбі, як прыліпалі да нечага. Потым тарфяпік скончыўся, ногі ступілі на цвёрды, абдзьмуты вятрамі груд, які зазвінеў пад абцасамі.

Багдан усё гэтак жа, як і раней, шпураваў наперад, быццам зусім не стаміўся і толькі што пачаў бегчы. У яго руках была заціснута шапка, якую ён цяпер выцягнуў з кішэні, але на галаву не надзяваў, хлопаў ёю сябе па грудзях, быццам забаўляўся нейкай гульнёю, і ва ўсім яго абліччы была дзіўная бесклапотнасць. Бяжыць сабе, па баках не аглядаецца, нават, як знарок назад не азірнецца.

І менавіта гэтая зацятасць узарвала Захара.

— Чакай, Багдан! — паклікаў ён і тут жа зразумеў: напракаць Багдана, што ён вельмі хутка бяжыць, і, тым больш, ушчуваць няма падстаў. Але знайшоўся, спытаў заклапочана, камандзірскім тонам:— Гранаты маеш?

— Адна эфачка!

— Трымай пад рукамі. І аўтамат на баявы пастаў.

— А навошта?

Здзіўленне на Багданавым твары і ў голасе было шчырае, без падробкі. Гэткае парады ён, мабыць, не чакаў, спадзяваўся, што яму загадаюць бегчы цішэй.

— А што, у вас, у разведцы, заўсёды гэтак?

— Як тое — «гэтак»? — Багдан не зразумеў Захара і быў у сваім здзіўленні шчыры.

— Ды плююць на перасцярогу!

— Перасцярогу мы паважаем,— сказаў Багдан сур'ёзна і, быццам просячы прабачыць ранейшую раздражнёнасць, пагадзіўся:— Перасцярога бяды ніколі не чыпіць... Толькі тут патрэбы пакуль што не бачу,— аднак запусціў руку ў кішэню, выцягнуў і зноў паклаў гранату на ранейшае месца.— Вось як сосьнічак гэты мінём — тады глядзець трэба пільна. А тут — роўнядзь, усё відаць здаля. І мы да іх не падступімся, і яны нам каршэнь не падпякуць...

За соснікам,— як толькі наблізіліся да яго, Багдан перагнаў аўтамат на грудзі — пустым і сцішаным, быццам нежывым, зноў пачалося поле, але вузкае, спрэс пакраплёнае густымі ланцужкамі заечых слядоў. У канцы поля, бліжэй

пад нізіну, амаль не прыкметную, снег як хто падзёўб чорнымі сіметрычнымі ямінкамі.

— Густа яны тут поркаліся! — Багдан азартна глядзеў на гэтыя чорныя ямінкі.— Здагадваецеся, хто тут раскошваў?

— Дзікі,— адразу вызначыў Захар.

— Яны. Тут бульба расла. А як вёску спалілі, дык яе ніхто і не давёў да ладу — дзікі арудавалі. Цяпер нах яе чуюць, памятаюць, што салодка было, а ўзяць — дулю. Прамерзла зямля...

Багдан прапанаваў зрэзаць вугал, і яны, мінуўшы поле, павярнулі крута ўлева і пацяпькі прабіліся яшчэ праз адзін кліп маладога сосніку, на галлі якога зусім не было снегу, і апынуліся ў бярэзніку. За бярэзнікам, рэдкімі купкамі, далёка адна ад адной, раслі разгалістыя маладыя ялінкі.

— Паспелі, здаецца.— Багдан спыніўся, абцёр спацелы твар шапкай, потым зухавата кінуў яе на галаву, засмяяўся.— Чы-ысценька! Нечапаная дарожка!

— Дарога? А дзе яна? А-а, праўда...

— І каб дзе слядочак. Значыцца, і ўчора і сёння тут аніхто не ехаў. Снег жа ляжыць нечапаны...

Вузкая селавая дарога была амаль не прыкметная. Снег, што сеяўся ўвесь учарашні дзень, густа зацерушыў яе, зараўнаваў нават узбочыны — роўная лугавіна, калі зірнеш, паміж бярэзнікам і купкамі маладых яліп. Толькі справа, у лесе, нізкім і рэдкім, як працярэбленым, свяціўся прагал, па якім пралегла дарога, ды злева, на грудку, акрэсліваліся абрысы старых і не вельмі густых прысад.

— Пазіцыя ў нас не вельмі здатная,— праказаў Захар, азіраючыся.— Мы як на сподачку тут.

— І яны — таксама. На адным сподачку і змесцімся.

— А калі туды? — Захар паказаў рукою на рэдкаваты, аснежаны лясок, у якім знікала дарога.

Багдан пакруціў галавой, не пагадзіўся:

— Там было б добра, калі яны ляском пакоцяць. А ім жа можна і адтуль! Ву-унь, ускрайкам поля — вяскоўцы там звычайна едуць. А тут, гэтай дарогаю, даўней на машынах каціпі, бо полем гразка дужа і вясною і ўвосень...

— Калі ты гэта ўсё вывучыў? — Захар быў здзіўлены дасведчанасцю Багдана.

— Людзей слухаў, людзі ўсё ведаюць,— і, быццам прыняўшы канчатковае рашэнне, якому Захару трэба было падпарадкоўвацца, сказаў:— Пад гэтымі ялінкамі і сядзем. Схованачка някепская...

Багдан першы шуснуў пад голле дзвюх ялінак, што раслі, як блізняткі, аднолькавыя, нібыта ішлі ад аднаго кораня.

Снегу там амаль не было, і сухое шыгалле нават не змерзлася, ляжаць на ім было мякка і зручна. Стомленыя, збітыя ў шалёнай хадзе ступакі адпачывалі, адразу разамлелі і размяклі; пакрысе супакойваўся ўзвінчаны бой сэрца, плечы не ціснуў колкі мокры цяжар. Каўпер кашулі, астываючы, рабіўся калянным, студзіў шыю, і Захар зашпіліў яго, узяў на ўсе гузікі сваю старую скуранку, пад якой быў наддзеты кароткі без рукавоў кажушок, і сцішыўся, зморжыў нават вочы.

Дзіўная якая цішыня наўкола. Анічога ж нідзе не чутно, толькі нясціхана цэдзіцца аднекуль прыглушанае шалахценне. А-а, гэта снегавы пылок церусіцца па галінах, цячэ тонюткай ніточкаю паміж празрыста-зялёнымі іголкамі, нават не ўвесь асыпаецца ўніз, узвіваецца, вісіць у паветры. Вока злавіла нейкі рух, быццам гайдапулася галіна над Багдапавай галавой, і Захар узяў яе рукою і прыгнуў. Светлы прагал, праз які ён бачыў поле і бярозавы ўзлесак, пашырэў, і гэтае святло як апаліла яго.

— Едуць,— ціха працягнуў ён, неадрыўна цікуючы белага каня, што трухаў усцяж бярозавага ўзлеску. Каб не чорныя развалкі, дык ён, пэўна б, падумаў, што белы конь нейкі прывід, што памроіўся яму нечакана.

Багдан, як і не спаў перад гэтым, адкрыў вочы, імкліва прыўзняўся на локцях.

— Дзе?

— Усцяж бярэзніку. Сюды развалкі і коцяць...

Багдан сагнуў галінку, што замінала яму бачыць, радасна вохнуў:

— Яны! Коцяць, галубочкі! Каняка мне знаёмая!

— Не варушыся! Не варушыся!

— Ды не заўважаць, таварыш камандзір! Далёка!

— Дзе ж — далёка. Зараз тут будуць.

— І кароўка ззаду тупае. Усё правільна! Усё правільна казала Сямёнаўна. А-ай, добрай душы жанчынка! Тры галубочкі і коцяць!

— Аднаго ж толькі бачу.

— Гэта — з лейцамі. Два на сянцы раскошуюць. Але чамусьці не спяваюць. Звычайна яны з песняю коцяць. О-о, напахадзіў я за імі. У нас з Чэсяй ужо быў план. Каб з вамі не стрэліся, дык заўтра б мы яго і ажыццявілі.

— Які план?

— Гэтак вось — перастрэць. Але перад самай Экіманню. На пагорачку — адтуль хаты пасёлка ўжо відаць. А з пагорачка — нізінка малая, і ў ёй — масточак. Там мы думалі — ча-арах. І — пізінаю — у лес. Там яны едуць, бы па сваім

двары коцяць. Адно — гарлаюць, зброю нават у руках не трымаюць.

— Дык і тут тое ж самае. Два гэтыя, на сене, быццам спяць...

Захар добра бачыў людзей на развалках толькі на самым пачатку, тады неяк адразу ўсё як аддалілася — замінала сонца, якое было якраз у тым баку, пад бярозавым гайком, ля якога каціліся развалкі. Адзін з лейцамі ў руках сядзіць у перадку, карабін вісіць на грудзях. Два ляжаць у фурмана за спіною, ляжаць неяк дзіўна, быццам прыцэльваюцца, і нейкія аднолькавыя — адзенне нейкае цёмнае на кожным...

Захар занепакоіўся, інстынктыўна прыціснуўся да зямлі, высоўваючы перад сабою аўтамат.

— Падобна, управа вернуць.

— Нізіна. Яны зараз па ёй паедуць.

— А раптам заўважылі?

— Не-а,— задаволена прасіпеў Багдан.— З нізіны яны сюды выкіруюць. Лепшай дарогі тут няма.

І зноў — у каторы ўжо раз за гэты дзень! — здзіўленне ахапіла Захара. Усё ведае гэты Багдан. Вунь, сапраўды, хаваюцца развалкі, быццам паціху правальваюцца пад зямлю, толькі конская хрыбціна відаць ды раз-пораз узлятае над белым аснежаным грэбенем пагорка галава каня. А цяпер зноў памалу выплываюць.

— Бачыце? — урачыста запытаўся Багдан.— Што я вам казаў?.. Шчэ і спяваюць, гады нечаныя. Не, не тая песня, што звычайна.

Сумятлівае аддаленае бомканне ўдарыла ў скроні Захару; непрыемна заныла пад сэрцам.

— Як параўнаюцца з намі — выскачым. Адначасова толькі, Багдане!

— Конь каб не спудзіўся. Тады — не дагонім.

— Куля дагоніць. Але без каманды — не страляць! Пакуль усё не высветлім...

Развалкі, не спыняючыся, каціліся ўсё бліжэй і бліжэй да яліпак-блізнятак, і Захар бачыў ужо твар чалавека, які цяпер не сядзеў, а напаўляжаў, уціснуўшыся левым локцем у сена; лейцы ён закінуў за спіну, і яны спаўзлі, віселі няроўна, чапляючыся адным канцом за прыклад карабіна. Развалкі часам дугаліся, і тады лейцы ўзнімаліся над сенам, і зноў кладаліся на яго, звісалі з левага пляча фурмана.

Калі Захар падскочыў да развалак, а Багдан схапіў каня за аброць, фурман зусім не спалохаўся, закамандаваў гучна і працягла:

— Т-тпру-у-у! Стаяць, табе кажу!..

— Хто такія? — строга і загадна спытаў Захар і падкрэслена марудна адцягнуў затвор аўтамата.— Куды едзеце?

— Т-тпру-у, табе кажу,— зноў вельмі гучна закрычаў на каня фурман, хоць патрэбы ў гэтым зусім не было — Багдан трымаў левай рукою аброць; Захару падалося, што фурман знарок павысіў голас, знарок гукнуў на каня гэтак гучна, каб пабудзіць людзей, якія спалі на развалках.— А вы хто такія?

Запытанне прагучала хрыпата, на вельмі высокай ноце, і Захар не памыліўся: фурман сваім крыкам хоча пабудзіць людзей, што з ім побач!

— Заварачвай каня,— загадаў Захар хутка, але ўпэўнена і строга.— У Ліцвінава вернемся — даведаецеся, хто мы такія.

— У мяне, дзякуй богу, ёсць каму камандаваць! Выконваем загад толькі капітана Паліванава.

— А рагуля? — Захар кіўнуў галавой на карову, якая цягнулася пысаю да канюшыны ў развалках.— Таксама гэтага Паліванава загад выконвае?

— Не-е,— засмяяўся фурман і, напраўляючы карабін, локцем неўпрыкмет штурхануў чалавека, які ляжаў, зарыўшыся ў сена, за яго спіною з правага боку развалак. Потым ён сціснутым кулаком ссунуў фуражку амаль на патыліцу, і на белым, зусім не загарэлым, ілбе засталася тоўстая чырвоная меціна; светла-шэрыя, як вадзяністыя вочы пад рудымі касмыкаватымі бровамі хітра і насмешліва вузіліся.— Рагуля змабілізавана ў паліцэйскай хаце па загаду капітана Паліванава.

— Які тут ён, Паліванаў гэты? Пабудзі!

— Паліванаў у штабе. А штаб — далёка.

— А наш — блізка,— сказаў Багдан, тузануўшы лейцы.— Адпусці, не цягні лейцаў!

— А ты тутака не камандуй дужа. Раскамандаваўся, іш ты,— прамовіў фурман, хаваючы пад робленай насмешлівасцю і дабрадушнасцю неспакой і трывогу.— Я толькі свайго штаба загады выконваю. Загад капітана Паліванава можа адмяніць толькі ён сам.

— Нічога, мы — адменім,— паабяцаў Багдан і пачаў заварочваць каня.— Чуў загад? У Ліцвінава едзем. Вось гэты загад дык і сапраўды не адменіш.

— Гэ! Ты! Прэч ад каня! — і фурман, не здымаючы лейцы з шыі, нацягнуў іх левай рукою, спрабуючы перашкодзіць Багдану, а правай, сціснутай у кулак, штурхануў людзей, што спалі ў сене.— Па-адымайся, хлопцы! Трывога! Падымайся!

Багдан імкліва смаргануў аброць; конь не стаяў на мес-

цы, ірваўся наперад і, асаджаны Багданам, дыбіўся, матаў галавою. Фурман, выпусціўшы лейцы і рвучы з шыі карабін, брудна вылаяўся:

— Прэч... Прэч ад каня! Жарну зараз — і мазгаўня твая на вецер! Прэч, кажу, ад каня!

«Ён стрэліць. Стрэліць без ваганняў...»

Нейкі міг, абяззбросены гэтай думкаю, Захар стаяў, як не на сваіх нагах, што зрабіліся непаслухмяныя і адцяжэлі, потым імкліва рынуўся наперад, схапіў левай рукою рулю карабіна, які фурман усё яшчэ не садраў з пляча, а правай — свой уласны аўтамат Захар трымаў за шыйку прыклада — памкнуўся згрэбці аўтаматы з развалак. Адзін аўтамат ляжаў на перадку, амаль побач, другі быў крыху прыцярушаны сенам, і паверх выбіўся толькі зашмальцаваны рэмень. Захар падчапіў указальным пальцам гэты рэмень, потым мезенцам зачапіў той аўтамат, што ляжаў ля краю развалак.

Гэты асцярожны рух Захаравай рукі адразу і ўсё зыначыў. Чалавек з правага боку развалак ускочыў, растрэсваючы сена, учапіўся ў рэмень аўтамата, пацягнуў яго к сабе, і Захар аўтамат выпусціў. Другі аўтамат шмякнуўся ў снег ля Захаравай правай нагі, Захар мыском падчапіў яго і адкінуў, але зрабіў гэта імкліва, парывіста, ледзь не выпусціўшы свой уласны аўтамат з рукі.

«Страляй!..»

Побач з гэтай мільганула, добра не акрэсліўшыся, яшчэ і другая думка, думка пра тое, што ён, Захар, удзельнічае ў дзіўнай і незразумелай гульні, дзе ўсё неверагоднае, несапраўднае. У сэрцы жыў пратэст, нежаданне націскаць на спуск, мройная надзея на тое, што ёсць яшчэ нейкае, не вядомае пакуль што яму, выйсце, што ўсё тут, на гэтым полі, вырашыцца іншым шляхам, памяркоўна, без стрэлаў і крыві. Але сполах, няпавісць у сп'янелых вачах, перакошаны злосцю твар чалавека, які выдраў у Захара свой аўтамат, і рух затвора, які смаргануді тоўстыя чырвоныя пальцы, вярнулі Захара ў свет рэальны.

«Вораг! Гэта — вораг!»

Сутаргава ўскінулася рука, палец націснуў каляны халодны спуск, і аўтамат затросся, і ствол яго як бы адкінуў чалавека на дол, а потым зваліў на канюшыну другога, які рвануўся з развалак на Захара. Захар, адчуўшы знаёмы штуршок прыклада ў плячо, убачыў дугу чорных гільзаў, што хруснамі ўзляцелі ў паветра.

«Не прамазаў... Я іх скасіў...»

Захар не паспеў яшчэ добра асэнсаваць, што адбылося. Востра дайшло да сэрца толькі адно: аўтамат змоўк, быццам

заткнуты хрыпатым крыкам болю і роспачы — дзіка крычаў фурман. У той жа міг руля карабіна выслізнула з Захаравай рукі.

Спалохаўшыся гэтага крыку, конь ірвануў і папёр. Багдан зваліўся на дол, але лейцы не выпусціў, і яны перакруціліся з рэменем карабіна, засмаргнуліся ў фурмана па шыі, сцягнулі яго з развалак, і цяпер конь траляваў іх абодвух. Багдан узорваў снежны цалік спіной, бездапаможна размахваў рукою, спрабуючы злавіць другую ляйчыну, а фурмана цягнула ніцма, і ён намагаўся вышэй узняць галаву, каб не араць носам снег. Фуражка не звалілася, моцна сядзела на яго галаве, толькі павярнулася казырком на патыліцу, ствараючы ўражанне, што перакруцілася сама галава.

— Сто-ой! Тпру-у-у,— закрычаў Захар, разумеючы, аднак, што крыкам тут рады не дасі.— Тпру-у-у!..

Развалкі не аддаляліся, крута нацягнутая Багданам ляйчына заварочвала каня ўправа, і ён кружыў вакол Захара. Захар рынуўся напярэймы, схапіў адну ляйчыну, потым другую, з усяе моцы нацягнуў іх, і конь адразу спыніўся. Багдан вёртка ўскочыў на ногі, выдраў карабін у фурмана — нейкім цудам той сцягнуў яго з пляча і ўчапіўся быў рукою ў рукаяць затвора,— дулам піхнуў у спіну, прыціснуў да зямлі; потым лоўка абмацаў фурманавы кішэні і толькі тады загадаў працягла і злосна, падрабляючыся пад той голас, што нядаўна гучаў па развалках:

— Па-адымайся!

Фурман узняўся, абцёр мокры ад расталага снегу твар далонёю; пальцы ў яго дрыжалі; ён спалохана глядзеў на Захара, быццам чакаў ад яго паратунку, чакаў абароны ад свайго ўласнага карабіна, які быў цяпер у Багданавых руках.

— Ну, узняўся. Чаго яшчэ хочаш? — з выклікам спытаў фурман, скоса зыркнуўшы на грэбень пагорка, быццам быў там нейкі паратунак.

— Прозвішча?! — зноў працягла і злосна гаркнуў Багдан.

— Мазаляка.

— Хай сабе. Хоць ведаем, што брэшаш. Дзе Паліванаў твой? Дзе ўсе астатнія?

Фурман перавёў позірк на Багдана, як бы зазлаваўшы на Захара і страціўшы надзею нешта пачуць ад яго, усміхнуўшыся нахабна, без жаху, зноў скоса зыркнуў на грэбень пагорка і потым тупа ўтаропіўся на забітых, якія ляжалі на снезе як бы крыж-накрыж:

— Ляжаць жа вось. Не бачыш? Ляжаць, твае месца заняўшы...

Багдан закінуў аўтамат за плечы, узяў карабін абедзвюма рукамі, паабяцаў без пагрозы, ціха, як бы шкадуючы, што змушаны гэтае абяцанне рабіць:

— Ты ў мяне кроўю пасмяешся зараз!

— Шчэ пабачым, хто будзе кроўю смяяцца,— у голасе фурмана прагучала настырнасць і пагроза.— Гэта савецкія салдаты ляжаць! А вы... Вы, не разабраўшыся, страляць? Якое права?.. Забойства...

Спакойным, але цвёрдым і ўпэўненым рухам рукі Багдан, нават не змахнуўшы снег з рукаяткі затвора, загнаў патрон у патроннік карабіна і скрывіўся. Але голас яго загучаў нават неяк даверліва, быццам Багдан казаў па сакрэту, паведамляў нешта такое, пра што ніхто іншы, апрача іх, не павінен і чуць:

— Ты думаеш, што я дарма ўвесь час хаджу за вамі па пятах? А-а, ты і не ведаў. А я ўсё ваша воўчае племя вывучыў. Я нават ведаю, якія гузікі ў цябе на споднiках.— Багдан на момант змоўк, потым, пастукваючы ўказальным пальцам па бакавіне спуска, параіў усё тым жа даверлівым тонам, але цяпер словы кладаліся неяк жорстка, як бы вызвоньвалі: — Дзе Паліванаў — ты зараз скажаш. І дзе ўсе астатнія — таксама скажаш зараз жа, не марудзячы...

Багданава гаворка з фурманам даходзіла да Захара як здаля — ён, неяк дзіўна саслабеўшы, стаяў нерухома, апусціўшы аўтамат руляй уніз,— глядзеў на карабін у Багданавых руках і нечакана прыгадаў, што вось з гэткім жа карабінам за плячыма выводзіў у сорак першым свой атрад у лес з Віцебска, які быў ужо ахоплены агнём. Потым карабін змяніў на трафейны аўтамат і ўрэшце вось на гэты, айчынны, што верна служыць яму ўжо два гады. Ніколі ж, здаецца, не быў ён гэткі цяжкі, як зараз. І як голасна гаворыць Багдан! Крычыць, крычыць... А трэба ж прэч адсюль, надалей ад гэтага месца. Калі гэтыя паліванаўцы недзе непадалёк, дык яны, пачуўшы стрэлы, сюды і прыкацяць. Магчыма, Мазаляка на гэта і разлічвае. Нешта ён быццам і паспакайнеў, жаху таго, ранейшага, у вачах ужо і не прыкметна. Не! Наадварот, жах скруціў яго. І глядзіць Мазаляка на забітых дзіўна неяк. Забітыя людзі ляжаць. А каб крывіначка дзе на снезе! Чысценькі снег вакол, бялюткі...

Язык быццам прыкарэў да каляпага паднябення, потым зварухнуўся, дакрануўся да халодных, як з лёду, зубоў і сам зрабіўся халодны і непаваротлівы яшчэ больш; нешта ўсё бомкала, звінела ў скронях, і Захар разгублена, з нейкай вострай, ніколі раней не знанай палёгкаю зірнуў на забітых, якія ляжалі дзіўна блізка, амаль упобачкі, толькі ногі раскіданы

ў розныя бакі і падобны па крыж. Боты кірзавыя, халявы ў іх наношаныя, але тоўстыя гумовыя падэшвы моцныя, як новыя, з блішчастымі крапачкамі цвікоў... І дзіўна падобныя твары забітых, неяк аднолькава адтапырваюцца, быццам скрыўлены грымасаю, губы, і з-пад іх вылузваюцца жаўтлявыя, як абыржавелыя, зубы...

Колькі пабачыў забітых Захар за гэтыя гады — нават і не злічыш. І смерць чужынцаў і сваіх людзей аніколі не ўражвала яго гэтак моцна, як зараз. А можа, гэта свае?.. А што як, анічога не праверыўшы як след, паверыўшы яму, Багдану, паклаў ён на гэтым полі ні ў чым не вінаватых людзей?..

Варухнулася ў душы даўняя непрыязнасць да Багдана, да старога Кандрата, якога ўжо няма на зямлі, і Захару зрабілася нядобра. Усё, выяўляецца, не можаш дараваць Кандрату, што не стрымаў стары свае слова, якое даў табе на беразе Дзвіны ў час крыгалому, і не адшукаў здрадніка? Дык адшукаўся ж той здраднік — ляжыць жа ў зямлі Шпітка: праверана і пераправерана, што ён падвёў бяду да Зінаіды! З Мсціславам толькі не ўсё высветлілася... Але ж старога тут нельга вінаваціць. Чаго ж тады ты цень старога Кандрата зноў варушыш? І на Багдана ты ўвесь дзень сёння зуб точыш? Але ж гэты чалавек колькі дабра табе зрабіў! Нават Чэся на яго ласкава паглядае! А ў тваім сэрцы ўсё нейкая паганая заскарузласць жыве, точыцца, бы шашаль у старым бервяне.

— Я скажу! Я скажу!.. Я вам усё скажу! Не забівайце! — Мазаляка сыпаў скорагаворкаю, потым бухнуўся на калені перад Багданам.— Паліванаў не рускі. Ён — фашыст! І гэтыя — таксама,— ён па чарзе, быццам пералічваў забітых, торкнуў рукою спачатку на аднаго, потым на другога.— Фашысты гэта. Атрад быў улетку створаны. Пад Смаленскам. Потым пад Расонамі і Асвеяй былі. Цяпер — сюды перакінулі. Атрад увесь фашысцкі. Цалкам.

— Акрамя цябе, разгрыба? — з'едліва спытаў Багдан і сплюнуў.— Ты, значыцца, не фашыст?

— Не! Мяне прымусілі. Сілаю ўвапхнулі. З палону. Я ўвесь час — з коньмі...

— Паліванаў дзе? — спытаў Захар; язык у яго ўсё яшчэ быў непаслухмяны, неяк клеіўся да калянага, бы з дрэва, паднябення.— Дзе ваш Паліванаў?

— У горадзе. Заўтра атрад ідзе на Астроўшчыну. Увесь атрад пойдзе. Дзевятнаццаць чалавек. Паліванаў павядзе.

— А чаму сёння ўтрох? — паспяшаўся, апярэджваючы Захара, запытацца Багдан.

— Мы без дазволу — свая ініцыятыва. Карову ўзялі, каб

па гарэлку памянуць. У Экімана ўжо дамовіліся. Пятнаццаць літраў.

Багдан аж свіснуў ад шчырага здзіўлення:

— Ую-ю-ю... За гэткую рагулю — толькі пятнаццаць літраў?

— Ну, закусь яшчэ абяцалі. Сала, яйкі...

— Сала ён жарэ, яйкі! Р-разгрыба слюнцявы! Г-гад!

— Адставіць, Роўда! — загадаў Захар, канчаткова вызваляючыся ад незразумелага здранцвення.

Багдан як і не чуў загаду, піхнуў руляю карабіна Мазаляку, але цяпер не ў спіну, а неяк спадніза — дапамагаў яму ўзняцца з зямлі,— потым садраў з яго рэмень.— Рукі — назад!

Мазаляка пакорліва заклаў рукі за спіну, звёўшы пальцы ў замок, і Багдан перавязаў запясці рэменем:

— Будзе падзейней. З ваўкамі — па-ваўчынаму і жыць.

Багдан пазносіў на развалкі зброю, дзелавіта агледзеўшы кожны аўтамат, спытаў, зыркнуўшы на Захара з увагаю і пачціва:

— Едзем, таварыш камандзір?.. А пра гэтых вараннё паклапоціцца. І ваўкі хай пагавораць уночы — яны тут зграямі чэшуць!..

— А дакументы? — Захар паглядзеў на забітых, якія цяпер здаваліся змізарнелымі і яшчэ больш жахлівымі.— Абшукай. І забяры дакументы, якія знойдзеш!

Мазаляка ўзняў галаву, сказаў таропка:

— Дакументаў у нас няма. Дакументы толькі ў Паліванава. У аднаго яго ёсць...

— Паліванаў — сапраўднае прозвішча? — спытаў Захар з адчуваннем таго, што размаўляць з гэтым нагандам яму брыдка.

— Мне невядома. Не ведаю! Дакладна не ведаю!

Багдан выцяў Мазаляку прыкладам, і той паваліўся на развалкі, як бы радуючыся з таго, што цяпер ён будзе далей ад Багдана.

— Не брашы, га-ад! — Багданаў голас зазвінеў на высокай ноце.— Праўдай шчэ можаш сабе жыццё сваё паганае ўратаваць!

Захар зазлаваў, кінуў рэзка:

— Колькі разоў табе паўтараць? Кінь, табе кажу, фашыстоўстваваць! Бяры адвязвай рагулю. Адвядзеш у Ліцвінава.

— А вы куды?

— Напярэймы ўзводу. Трэба іх папярэдзіць.

Багдан хутка і лоўка адвязаў вяроўчыну і, наматваючы канец яе сабе на правае запясце, параіў:

— Вы, таварыш камандзір атрада, глядзіце за ім, гадам. Каб не збег!

Шчырая, але наіўная парада насмяшыла Захара. Ён зыркнуў на Мазаляку, які ляжаў плазам, звесіўшы галаву, бынцам сілячыся хапянуць ротам снегу, і перайначыў сваё рашэнне:

— Давай гэтаму паганцу вяроўку ў зубы. Хай вядзе рагулю і на месца паставіць. І прабачэння ў гаспадыні папросіць!

— Ён папросіць,— аж узгарэўся ад радасці Багдан.— Папросіць!

Захар сеў у разваляі; тузануўшы лейцы, гігікнуў, і конь адразу рвануў і панёс шпарка. Ляцеў з-пад капытоў снег, часам буйныя камякі падалі на сухую капюшыну ў развалках, скатваліся, валіліся на дол, накідаючы на сене дробнае белае сяйво.

Назаўтра, яшчэ ў прыцемках, Захар, паверыўшы Мазаляку — яго доўга распытвалі ў Пятроўцах, і ён нічога не ўтойваў, пацвердзіў тое, што ўжо расказаў, і паведаміў шмат новага пра банду, якая выдае сябе за партызанскі атрад,— засеў з узводам Файзуло і падрыўнікамі ў засаду на дарозе, што вядзе з горада на Астроўшчыну. Месца выбралі зручнае — дарога вілася па нізіне і паабапал былі пагоркі, парослыя густымі маладымі сасонкамі.

У напружаным і трывожным чаканні прайшло шмат часу. Апоўдні, страціўшы ўсялякую надзею, Захар паважыўся быў зняць засаду, паслаў Санько з загадам адводзіць сакрэт з трох чалавек, якія стаіліся за паваротам дарогі. Санько не паспеў далёка адысці, як сакрэт даў умоўны сігнал — заўважана банда, якая выехала з Экімані на чатырох развалках. Развалкі падпусцілі блізка і ўдарылі амаль ва ўпор. Узяць Палівапава жывым — гэта Захар загадваў усім — не ўдалося: кулямётная чарга разнесла галаву.

## 8

Апоўдні Артур прыдрамаў крыху, і яму зноў саснілася тое, што ўжо снілася неаднойчы і снілася ўчора: ён плыве пад вадой, і нехта ўсё піхае яго ў плечы, ціспе на дно, і зверху траскотня, аж коле ў вушах, лопаюцца на плыні разрыўныя кулі, і дыхаць няма чым, а вынырваць на паверхню нельга, трэба адплысці як мага далей ад рачнога ўзвалу,

з якога строчаць з аўтамата варожыя парашутысты і дзе стаіць палутарка, з-пад якой Артур сігануў у вір, паспеўшы перад гэтым кінуць гранаты.

Ён прачнуўся, як і звычайна прачынаўся ў гэтых выпадках, з шалёным грукатам сэрца, перасохлым ад смагі горлам і мокрай ад поту патыліцай. Цяпер, аднак, да ўсяго гэтага дадаўся яшчэ боль у левай назе — ужо болей месяца нага апіяк не можа загаіцца,— і ён, прыўзняўшыся, асцярожна павярнуў яе ад сцяны на сярэдзіну ложка.

«Я прыціснуў нагу да сцяны. Таму, мабыць, і разбалелася гэтак моцна...»

Змяніў паставу, і боль пакрысе пачаў раставаць. За пераборкаю нешта вызвоньвала і шурхацела. Гаспадар, падобна, сякеру вострыць — збіраўся ж біць кабанчыка. Ранкам, запаліўшы ў печы дровы, стары адаграваў ля агню зламанае паждачнае тачыла, скардзіўся ўсё, што дзве бутэлькі самагонкі — «апошнія, сабе бярог» — давялося аддаць за гэты сточаны па краях на бліпец, рудаваты паждак. Цяпер, відаць, узяўся вастрыць сякеру ці яшчэ што-небудзь: метал жа звініць па каменю. Нажы, мабыць, точыць — гаспадыня ранкам бурчала, каб натачыў, бо нажы шчарбатыя, бульбіну не ўрэзаць. Дзіўна як звініць метал па паждаку. А як аціхне, дык нешта дужа тоненька тукае і тукае: «тук-тук-тук...» Але, падобна, і не за пераборкаю, а як хто знадворку ў акно пастуквае, знак нейкі дае...

«Э-э! Сінічка прыляцела!»

Артур знерухомеў, баючыся спалохаць сінічку. Сядзіць, як прыклеілася, на краечку шыбы і дзяўбе, дзяўбе струхлелую раму, спалохалася нечага, пырхнула, на бэз пераляцела...

Ён крута павярнуўся, і зноў забалела, пагана заныла нага. Але затое цяпер ён добра бачыў галіны бэзу, на якіх скакала, вёртка круцілася сініца. А вышэй, на карычневых шышках пасохлай кветені, нерухома, як намаляваныя, спаважна сядзяць чырванагрудыя снегіры. Не, варушацца, але неяк не адразу, а быццам па чарзе, саступаючы месца: пацягнецца каторы галоўкаю да гонкага карычневага верацяна, возьме яго ў куртатую тоўстую дзюбку і зноў нерухомее, сядзіць, толькі сеецца цемнаваты пылок ад патрушчанага моцнай дзюбкаю семка.

Артур цікаваў чырвоныя жывыя камячкі на аснежаных галінах бэзу пад акном, і яму здавалася, што чуецца яму не шорханне паждака і цвыньканне металу за пераборкаю, а ломкае храбусценне пасохлых семкаў бэзу ў птушыных дзюбках. Сэрца падціснула скруха ад успамінаў пра далёкае.

Ён згадваў зноў рэчку, дзе цудам уратаваўся ад куль, згадваў Падрэзаву хату, у якой апынуўся. Дзе б быў ён, каб не напаткаў яго Падрэз па досвітку пад сасной, там, у лесе, адкуль Траян пабег у горад паведаміць пра тое, што здарылася з атрадам зніштальнікаў?.. Ці ёсць бэз ля той, Падрэзавай, хаты? Не, не ў памяці гэта. А вось ля дзядулевай хаты бэз помніцца — гэткі ён там, як тут, ля хаты Селівончыка. Дужа знаёмая тоўстая пасохлая квецень — відаць, цвіў бэз і яго ніхто не чапаў.

Гэткія ж і снегіры, як тады, калі сядзеў дзядуля на ложку і гаварыў пра сваё жыццё, калі даручаў першае баявое заданне. Першае і апошняе: у той дзень дзядуля і загінуў...

Дзіўнае нейкае, непрыемнае і трывожнае супадзенне: і тады, зімою, ляжаў ён з хворымі нагамі, і цяпер ляжыць... А ўсё — выпадковасць, выпадак, які аніяк не патлумачыш. Не, даражэнькі, патлумачыць можна, нават вельмі лёгка можна патлумачыць. Шуснулі тады зніштальнікі ў раку, ашалеўшы ад радасці, што ваду пасля цяжкага бадзяння па лесе ўбачылі,— нават вартавога не выставілі. А ты сам? Машыну шараваў, толькі тыя колы брудныя і бачыў. А трэба было наўкола глядзець. Трэба было памятаць, што не на пагулянку пайшлі — дэсантнікаў варожых лавіць. А некаторыя ж з вас, зніштальнікаў, пацвельваліся ў адкрытую. Парашутысты варожыя? Дэсантнікі? Лухта! Паклёпнікі напрыдумлялі. Цяпер жа разам ляжаць на дне таго віру: і той, хто не верыў, і той, хто верыў у рэальнасць бяды. А гэтая міна, што ўдарыла, калі ішлі з Траянам ад хутара! Ты занозна ўчуў, як шарахцела яна, тая міна! Ішоў, расчулены гаворкаю з матуляю, задаволены, што група ўзарвала масток, што гэтулькі рэек узлупілі. Ішоў, пра Рымачку марыў, пра стрэчу з ёю, пра пяшчотныя яе рукі і вусны... Ішоў, пільнасць адкінуўшы, губы развесіўшы, вырашыўшы, што ўжо недасягальны, што бяда не дагоніць, не зачэпіць... Не, галубок! Зачапіла! Дагнала! І заўсёды гэтак будзе, пакуль галоўнага не спасцігнеш: калі хочаш застацца жывы, ты першы павінен заўважыць бяду, заўважыць і апярэдзіць яе...

Тукнулі дзверы, за пераборкаю на момант аціхла тонкае дзвынькание металу па наждаку, загучаў знаёмы голас — Падрэз вітаўся з гаспадаром хаты. Неўзабаве ён і сам увайшоў у пакой, павітаўся, сеў да Артура на ложак, выцягнуў з левай кішэні кажушка два яблыкі, потым два гэткія ж дастаў з правай, паклаў іх на крэсла, побач з копаўкай, у якой кіслі лекі, якія зрыхтаваў яшчэ ўчора ўвечары Падрэз.

— Прыгожыя яблыкі,— сказаў Артур, шчыра падзякаваў, узяў адзін, разглядаў.— Як толькі што з саду.

— Гэта з Вуглоў. Нядаўна адтуль,— Падрэз зайшоўся ў глухаватым кашлю, твар яго здрабнеў, густа ляглі на ім зморшчынкі.

— Мяне лечыце, а самі вось як!

— Кха-ак... Кха-ак... І чорт жа яго ведае з чаго? Хаця, з таго, што гадо-очкі,— заціснуў кашаль, спытаў спачувальна: — Як пачуваеш? Ты мала, Селівончык скардзіцца, спіш. Трэба і ўдзень спаць — раны ад сну добра гояцца.

— Заснеш, дык лухта розная ў галаву лезе. Сёння зноў вярзлося: пад вадой плыву, з берага парашутысты па мне строчаць ды кулі на дно цісвуць — гэткі цяжар ад іх.

— Хай усе яны, гіцалі, на вадзе спякуцца. Табе ж з чаго яны павінны сніцца? Сумленне ў цябе чыстае.

Падрэз дужа састарэў, як бы звяў. І смешна, як ён спрабуе яго, Артура, супакоіць. Сказаў жа толькі на тое, каб суцешыць, каб ад думак трывожных адцягнуць.

— Крыўдна,— прызнаўся Артур, не жадаючы хлусіць старому.— Хлопцы мае ваююць, па чыгунку ходзяць. А я? Ляжу, бы жмура сляпая.

— Каб ведаў, дзе паваліцся, дык саломкі б, напэўна ж, не пашкадаваў бы. І ты на свае раны солі не пасыпай. Яны ж гояцца!

— Раны гояцца, дык цяпер скулле бок абсела...

Падрэз схіліў галаву, быццам да печага прыслухоўваўся, глядзеў-вывучаў цёмныя шляпкі цвікоў у маспічыне ля сваіх ног. Нечакана пажартаваў:— Скулле — не мулле, калі ўжо села, дык зносіш,— і заўсміхаўся:— Не бядуй, Сцёпка! Зажыве попка. А як возьмеш гаравапь — яна будзе нарываць. Змікіціў?

Артур сказаў з тугой у голасе:

— Каб быў здаровы, дык і мікіціць няма чаго.

Падрэз жартаўліва, але неадабральна ўзарваўся:

— Што ты сабе сэрца вярэдзіш штодня?

— Ды гэта ж не я, а яно мяне ўсяго вярэдзіць. Адно і робіш, што ляжыш ды разважаеш.

— А ты менш разважай. Узяў — песню зацягнуў. Паглядзі на Роўду. Як не стрэну — усё нешта пад нос мурлае. І разумна робіць. Да таго, каб ведаў, хто спявае, бяда не чэпіцца. Няўтульна ёй з песняй. Дай жа хоць на нагу зірну,— ён прыўзняў з Артуравай нагі рудую, у белыя палосы коўдру, задаволена пацокаў языком:— Цэ-цэ-цэ — будзе нам масліцэ. Бачыш, як гояцца? Зусім ужо чырвань з нагі сагнала. Мае лекі і тады цябе ўратавалі. Сіла ў гэтай травіцы, о-ой сіла! Бачыш, як сцягнула рану?.. І што скажу зноў? Ні, ні часцей

адвар, каб усю копаўку — за дзень. І скулле тады — па мулле. Па-аконіцца!..

Артур, каб не крыўдзіць старога, адпіў колькі глыткоў смолкага бура-зялёнага пітва з конаўкі:

— Даўкасць нейкая ад яго ў горле. І гаркавасць у роце доўга...

— Квецень верасовы дадаў — з таго... Во, каб табе мядку верасовага, якім я тады цябе лячыў! Дык гэтыя фрыцы клятыя павыдзіралі рамачкі. Зглумілі, пamарозілі пчолак...

— Скончыцца вайна, новых заведзяце...

Сказаў знарок, шапуючы старога, і адразу, але моўчкі, пашкадаваў, адчуўшы, што цяпер зноў давядзецца выслухваць усе падрабязнасці: і як у сорак першым увосень, калі рана ўдарылі маразы, фашысты выдзіралі рамкі з вулляў — мёд даставалі,— і як Падрэз кінуўся ратаваць пчолак, і як салдат стоўк яго прыкладам па горкі яблык... За гэтыя дні, што Артур ляжыць у Селівончыкавай хаце, стары шмат разоў расказваў тую гісторыю — пачне абы з чаго, а па яе абавязкова ўзаб'ецца. Упершыню Артур пачуў яе летась, калі зайшоў у Падрэзаву хату. Стары вельмі ўзрадаваўся, убачыўшы нечаканага госця, як і не верыў, што бачыць Артура са зброяй — пасля той восені, калі ён прывёз хворага Артура ў горад да маці, гэта была іх першая сустрэча. Але і тады і пазней Артур выслухваў адно і тое ж: як старому не пашэнціла ў дарозе з горада — ахова бункера ля чыгуначнага пераезда адабрала і каня і калёсы і самога ледзь не забіла, палічыўшы за партызанскага сувязнога,— як паскочылі фашысты ў канцы лістапада ў вёску, як рабавалі вяскоўцаў, як бурылі-дабівалі Падрэзаву пасеку, як ён, змардаваны, плакаў, збіраючы па садзе рамкі, з якіх жыўцом павыдзіралі соты, і зграбаў са снегу пчолак, якіх ужо нішто не магло ўратаваць...

На гэты раз стары парушыў сваю завядзёнку, не ўзяўся прыгадваць той жахлівы дзень, а неяк паспешліва пагадзіўся з Артурам:

— Завяду, гэта ўжо точна. І пядоўга, зусім пядоўга чакаць. Кіеў — вызвалены. Што цяпер на чарзе? Мінск. Орша дзе? Віцебск дзе? Магілёў дзе? Руку працягні — і дастаў,— і раптам нахіліўся да Артура, сказаў цішком, нібыта апасаўся, што яго можа нехта падслухаць:— Дамоў іду, даражэнькі ты мой. Дамоў...

Артур паглядзеў на старога з недаверам:

— Як гэта — «дамоў»? За чыгунку? За Дзвіну?

— Развітацца зайшоў. Добрага табе пажадаць. Зноў Файзуло туды хлопцаў сваіх вядзе. Я — з імі,— і дадаў з гона-

рам, памякаючы на вялікую тайну, якую адкрываць, ведама ж, не можа:— Заданне ад камандзіра маю...

— Там жа небяспечна,— адно і мог сказаць Артур.

— Не. Цяпер, як бандыцкай той гамарні Захар свечку наставіў,— яны маленькай групкаю не сунуцца. А на вялікую ў іх сілы нямашака — усе ля фронту таўкуцца. Яго, фронт, падпіраюць. А ён жа, ведаеш, чуваць,— і зноў, як бы паведамляў незвычайную таямніцу, дадаў ціхутка, як не пошапкам:— Сёння ранкам, калі ядловец сек, пачуў: бу-бу-бу... З глыбіні. З зямлі. Малоцяць нашы!..

Адкуль Падрэз ведаў, што далёкая кананада, якую давялося пачуць у лесе,— гул нашых, а не фашысцкіх гармат? Не ведаў, безумоўна, дакладна. Але гэтую яго наіўную веру Артур прыняў бясспрэчна: усё тое, што гуло і грымела недзе ўдалечыні, атаясамлівалася толькі з той сілаю, якая пішчыць, гоніць чужынцаў прэч.

Нечакана навалілася дрымота, але спакойная, нейкая ціхая, без дурнога, і ён нібыта ўсё разумеў, усё чуў і некуды плыў на мяккай гонкай плыні. Калі адкрыў вочы, дык на двары ўжо сутоньвалася, але яшчэ было светла, і бэз быў добра відзён, толькі як нейкі патаўсцелы за гэты час. Гэткім жа — як раздаўся ўшыркі — яму здаўся і гаспадар хаты, які стаяў ля ложка: жытнёвага колеру валасы Селівончыка — толькі што з-пад шапкі — былі ўскудлачаныя; заружавелыя ад марозу шчокі маліпавымі аладкамі падпіралі тоўсценькі, яечкам, нос; гэткі ж — маліпавы — бляск быў нават і ў вачах. Доўгімі мурашамі бялелі па ватоўцы рыскі попелу, і Артур, учуўшы пах дыму і паленага шчэцця, здагадаўся: гаспадар смаліў кабанчыка. Гаспадыня даўно на тое падбівала, а ён усё цягнуў, маўляў, на згон зімы кабанчыка кокнем — хай сала паболей парасце. А цяпер жа — снежань!

— Што, сынок, табе? — спытаў Селівончык.— Чаго клікаў?

— Не, не клікаў я. Прыдрамаў толькі, як Падрэз пайшоў.

— А мне пачулася добра: клічаш. Дык падумаў, што трэба чаго. Голасна гэтак прасіў. Але што — я не сцяміў.

Артур сказаў, адчуваючы сябе непамысна — зноў даў клопату гаспадарам хаты! — і гэтае адчуванне ў яго жыло ўжо тыдні са два, з таго дня, калі ён убачыў, што блага гояцца раны і давядзецца ляжаць:

— Мабыць, саснілася мне нешта. Прабачце.

— Ды добра, што паспаў,— сказаў Селівончык, тасуючы ў руках пук кароткага шчэцця, потым пачаў завязваць яго кароткай шпагацінаю, якую выцягнуў з кішэні; шпагаціна ўвесь час выпадала з пальцаў, але ўрэшце ён злаўчыўся, звя-

заў канцы, сказаў, быццам падводзіў вынік свайму занятку:— Добрая шчэць. Я летась узяўся валёнкі дратваю падшываць, дык усю хату апароў — каб табе шчацінка. А без яе — труба. Цяпер вось пазапасіў. І шчэць добрая, і сала на кабанчыку ладнае. На два... Не, во,— ён выставіў руку, у якой была заціснута шчэць.— Без малога — на чатыры пальцы...

— Вы ж ладзіліся не ў снежні кабанчыка кокнуць!

— Хведар падбіў. Але, відаць, яно і правільна. Раптам навалач фрыцаўская накоціць? Кабанчыка ж не схаваеш. А па сальца ў мяне спратка ё — аніякі фрыц не знойдзе!

— У нашы сілы, значыцца, не верыце. Фрыцаў баіцеся.

Селівончыка гэта пакарабаціла, і ён сказаў з папрокам:

— Табе, хлопча, сілы трэба хутчэй набіраць. Хведар, скажу табе, усе вушы прадудзеў: свежанінкі каб хлопцу, свежанінкі. Ад яе, ад свежанінкі, хлопец на нозі мігам устане...

Артур ледзь не засмяяўся ўголас, зразумеўшы, што ў вытокаў рашэння, якое прыняў Селівончык, быў Падрэз. Ён, значыцца, падбіў гаспадара хаты не чакаць канца зімы і забіць кабанчыка зараз, гэта яго, Падрэзавы, думкі ўводзіла гаспадыня хаты ў вушы свайму мужу! Зрабілася няёмка: колькі клопату гаспадарам хаты з ім, нядужым і хворым!

— Мяне павязуць у брыгаду,— зманіў Артур, вырашыўшы, што адразу, як толькі прыйдзе Чэся заўтра рабіць перавязку, скажа ёй, каб забіралі яго ў брыгадны шпіталь.

— Дзе там, у брыгадзе, усім месца, хлопча? Не адзін ты гэткі. Чакай, ці не Роўда? — і Селівончык жвава падбег да акна.— Багдан коціць!

На падворку затупалі капыты, заржаў конь. У сенцах пачуліся воклічы гаспадыні і забухаў Багданаў смех; бразнуў clясак, грукнулі дзверы, і ў пакой уваліўся Багдан з трафейным аўтаматам цераз плячо і шэрым згорткам у руках. Пераклаўшы згортак у левую руку, ён, ляпаючы правай далонёю то па грудзях, то па каленях і выбіваючы чачотку, фарсіста выплыў на сярэдзіну пакоя.

— Узнімайся, казача! Надзявай абнову, што шле табе камандаванне,— развінуў згортак, патрос у руках новае шыкоўнае галіфэ, зробленае з цёмнага, шараватага сукна.— І — урэжам полечку, каб аж дыба падлога стала!

— З якога гуляння, Багдане? — папытаў Селівончык, зацікаўлена, з захапленнем пазіраючы на штаны ў Багданавай руцэ.

— Гульнуў, бацька, як голы ў крапіве! — Багдан узяў конаўку, згроб яблыкі, пераставіў усё гэта на падаконне і на спінку крэсла павесіў новыя штаны. Потым наклаў аўтамат

побач з яблыкамі, схапіў Селівончыка ў абдымкі.— Залаты ты чалавек, бацька! Слава табе ў вяках.

— А я што? А што я? — Селівончык, збіты з панталыку Багданавым напорам, нечаканым і незразумелым, разгубіўся.

— Ты — бог! Ты самы мудры з усіх багоў! Можа, у мяне поўны год язык па свежанінку свярбіць. І — калі ласка! А шчэ калі над яе чарку?.. Маеш, га?.. Толькі не скупіся. Як чорту, душу закладу. Маеш, бацька? Ну, на поўную шчырасць, на поўны давер?

— Чаго няма, таго няма!

— Ведаеш, бацька, які сёння дзень? Новы гімн краіна спявае,— і, расставіўшы рукі, патрэсваючы імі, узнімаў усё вышэй і вышэй, як бы ўзнімаючы мелодыю песні: — «Союз нерушимый республик свободных сплотила навеки великая Русь...» Навекі з'ядпала, бацька. Разумееш? А ты — паўлітэркі шкадуеш!

— Каб жа была,— і сумна паківаў галавою.— Можа, як у Фаміча расстарацца? — спытаў, як бы раячыся з сабою, і сам жа сабе і адказаў:— У гэтай жмэнды ёсць зелле.

— Калі ён тварыў самагонію?

— На тым тыдні — яго чарга набегла. Толькі як да яго падступіцца? На соль, казаў, выгнаў кроплю, на адзежу якую...

Багдан злавіў тужлівы позірк Селівончыка, скіраваны на спінку крэсла, рашуча трахнуў галавой, садраў штаны са спінкі крэсла, скруціў жмутом:

— Нясі! Дзве бутэлькі адваліць — здавай. Меней — назад нясі! Заданне яснае?

— А як жа... Во, хлопча... Кажаш, што камандаванне зрабіла...

— Ха, камандаванне! Майстэрня пашыла! Назва аперацыі баявой, якую праводзім? «Штаны»! — і ў шчырым даверу прыклаў руку да грудзей.— Каб мы, баявыя адважныя партызаны, не ўзнялі чарку за наш новы Дзяржаўны Гімн?.. Галоўнае тут што? Таго Фаміча нам раскокаць. Цягні туды, мігам імчы штаны, бацька! Памятай: галоўнае — манеўры! А я гаспадыньцы з дроўцамі памагу. Сухенькіх надцягну, каб над патэльняю акурат былі.— Багдан, узяўшы старога за плечы, ласкава, памалу падпіхваў да дзвярэй і, выправіўшы гаспадара, стаяў пасярэдзіне пакоя, глядзеў на Артура, пасміхаўся, і абветраныя губы ў яго ўвесь час неяк сутаргава торгаліся, на абсівераных шчоках гарэлі чырвоныя плямы.

Бесцырымоннасць, з якой Багдан заўсёды размаўляў з Селівончыкам, на гэты раз кінулася ў вочы, была нейкая

абразлівая і непрыемна ўкалола, быццам ён і сам нанёс абразу гаспадару хаты.

— Нядобра ты з ім. Навошта гэтак?

— Селівон — дух з яго вон! — Багдан засмяяўся.— Хай пашпігуе гэтую жмэнду! Э-эх, абмыем мы сёння тры вялікія падзеі: тваю хуткую папраўку, кабанчыка і, галоўнае, штаны. Майстэрня два дні да поту ўлягала — асабісты камандзіраў заказ!

— Будзе нядобра, Багдан. Ты вечна што-небудзь учмурыш.

— Скрабець ён сабе галаву, як перад свадзьбаю! Я казаў табе, чым мой старшына кіраваўся, як мы матагонкі палкавыя ладзілі? Вайна — х...., асноўнае — манеўры. І мы манеўр робім. І вернуцца твае штаны з прываркам. І сёння ўвогуле мы з табою павінны пчолкамі гудзець. Дакуменцікі на нас найшлі — самалёцікам паляцелі. На ордэны! Табе — за чыгунку. Мне — што банду тую высачыў.

— Памятаю, учуў тое прозвішча, дык і не паверыў. Нейкае мілае, свойскае і добрае — Палівапаў...

Багдан мацюкнуўся:

— Ён гэткі ж Палівапаў, як я — японскі мікада. Фашыст. Гэтулькі людзей нашых пазабівалі па вёсках. Мазаляку Ціхан, кажуць, адразу ў самалёт пасадзіў — за лінію фронту адправіў.

— А я б гэтаму гаду — кулю!

— Шкада і кулі. З яго, між іншым, звесткі патрэбныя вывудзяць. Ён шмат чаго ведае.

— А мне ўсё неяк не па сабе. Паслаў ты Селівончыка...

— А мне — сохне ў роце. Ты што тут п'еш? — ён узяў конаўку з падаконня, глынуў і тут жа сплюнуў.— Цьфу... У гэткі дзень такую бурду піць?.. Нас, дружа, якое свята чакае? — і нахіліўся, і гэтак жа, як нядаўна Падрэз, узрадаваным пошапкам паведаміў навіну:— Фронт зрушыўся. Гарадок нашы ўзялі — наступ цяпер на Віцебск пойдзе. Брыгадзе заданне — рыхтаваць пасадачныя пляцоўкі на дэсант. Дзве дывізіі чакаюць. А потым яны і ўсе атрады зоны — на Полацк. Каб з тылу — па Віцебску. Вось гэта — манеўр! Усім манеўрам — манеўр! Э-эх, ды каб выгарала!

— А я — ляжу! Ды калі ж яна загоіцца,— і Артур, у роспачы, пляснуў далонёю па коўдры. Пальцы зачапілі параненую нагу, але ён не скрывіўся ад болю, схаваў яго ад Багдана.— Не-е, калі раптам тут усё пачнецца — на мыліцах папаўзу!..

— Цярпі гора, дружа, пі салодкі мёд.— Багдан паглядзеў на трафейны гадзіннік з металёвай бранзалеткаю, што віссеў на

руцэ.— Гэты Селівон — дух з яго вон, гадзіну ўжо швэндаецца. Баюся, што ні курчаці, ні парасяці нам не ўсміхнецца. Трэба самому падбегчы і за бараду Фаміча патрэсці.

— Ідзі і цягні штаны дамоў. Бо дойдзе да Файзуло — скандал палучыцца.

— Ляжы, ляжы. Не будзем мы, дружа, за чарку рабіць вялікую сварку...

Зарыпелі і бразнулі, зачыніўшыся за спіною Багдана, дзверы. Потым зноў зарыпелі дзверы, пачуліся за пераборкаю на кухні вясёлыя галасы — Багдан нешта даводзіў гаспадыні, жартаваў; грукнулі дровы; зноў, не зарыпеўшы, аднак, мякка бэхнулі дзверы — Багдан пайшоў з хаты, на падворку нешта засвістаў вясёлае, гуллівае, заспяваў. Потым голас яго аціх. За пераборкаю былі чуваць асцярожныя крокі гаспадыні; бразнула патэльня; топка вякнула дужка вядра, і Артур адчуў, што зараз не ўтрымаецца і заплача. Заплача ад радаснай навіны, якую прынёс Багдан, ад тугі і адчаю, ад скрухі, якая, выяўляецца, не прайшла аж з таго часу, калі Падрэз сказаў пра тое, што фронт зрушыўся. Але тады ўсё гэта было няпэўнае. А Багданавы звесткі дакладныя, наступ пад Віцебскам ідзе. Пасадачныя пляцоўкі рыхтуюцца не на тое, каб у забаўкі гуляць: значыцца — дэсант. А потым — і вялікі наступ. Дзіўна, ніякага ж прадчування не было, што ён гэтую радасную навіну пачуе. Наадварот, усю раніцу прыкра было, пагана на душы, потым сон гэты дурны, затым сумныя ўспаміны развярэдзілі сэрца. А цяпер — радасць, быццам абвал які. Гэта ж тое, што чакалі даўно і прагна, што чакалі штодня, чакалі з трывогаю і надзеямі... І вось — дачакаліся: пачынаецца наступ! А ён, Артур, усё лечыцца. Фронт, значыцца, ён гэтак, у ложку, і стрэне?!.

Ён рыўком адкінуў коўдру, апусціў ногі на падлогу, учапіўся спачатку ў спінку ложка, потым абапёрся аб сцяну і гэтак стаяў нейкі час, чакаючы, пакуль прыціхне боль і не будзе кружыць галаву. Здаецца, палегчала. Цяпер — яго новы крок. Акно зусім блізка — ён дойдзе туды. Абавязкова дойдзе! Дойдзе, і тады ўсё зменіцца, ён будзе дужым, моцным, і боль адступіцца, знікне назаўсёды!..

Разумеў, што думкі яго наіўныя. Але па-ранейшаму быў пад абладаю сваёй дзіўнай задачы, якую сабе паставіў, і надзея ўпарта і неадчэпна вяла яго наперад. Надзея цяпер набыла зусім пэўныя, канкрэтныя рысы — акно. Але не тое акно, што было на левай сцяне і бліжэй і пра якое ён напачатку быў падумаў, а тое, што на правай, значна далей, заастаўленае кусцістай геранню. Боль у назе то ўзнікаў, то рас-

таваў, і тады Артур рабіў новы крок, упарта пабліжаючыся да пастаўленай мэты.

«Вось яно, маё жаданае акно!»

Артур пасунуў вазончык з геранню, зморухомеў, здзіўлена ўзіраючыся ў шыбу. Боль у назе раставаў, спаўзала з душы туга, і ўсё неяк адразу, рашуча і неверагодна змянілася ў змрочнай смузе, што асела над полем за садам; нешта дужа светлае, хоць і без пэўных абрысаў, бачылася цяпер яму ў пагусцелым сутонні, і ад гэтага светлае і радаснае пачуццё ўлівалася ў сэрца, іначыла настрой, як бы выводзіла на новую дарогу, па якой Артур мог ісці ўпэўнена, хутка, смела, гэтак жа, як ішоў дагэтуль.

Пах свежаніны, смажанай з цыбуляю, заказытаў ноздры. Пухнуў рот ад сліны, жывот надціскаў голад, і гэтае адчуванне, адчуванне таго, што дужа хочацца есці, Артура вельмі здзіўляла і радавала — гэткага даўно ўжо не было з ім.

«Хведар падбіў...»

Згадалася прызнанне Селівончыка, расстанне з Падрэзам. Якая натура! Якая добрая душа ў гэтага Падрэза! Другі раз на крутой паваротцы лёсу побач з табою ідзе чалавек, які сапраўды па-бацькоўску да цябе ставіцца. Дзівосная натура! А Селівончык! Гэта ж ён кабанчыка зацісвуў, Падрэзавай настойлівасці паддаўся, паверыў, што свежанінка, ды маладая шчэ, яго, Артура, на ногі паставіць.

Знаёма зарыпелі дзверы драўлянай пераборкі, і гаспадыня, стоячы на парозе ў нешырокім дзвярным праёме, які быў зацягнуты квяцістай шторкаю, хоць былі і дзверы і адзін канец шторкі вісеў на ручцы, заклапочана запыталася:

— А дзіцятка ж маё! А навошта ж ходзіш, не ляжыш?

— Спіна ўжо баліць ад ляжання. І загадала медыцына, каб пакрысе рухаўся, каб хадзіць не адвучыўся. Каб ногі крэплі...

— Акрэпнуць, дзіцятка маё, акрэпнуць. Насмажыла любовінкі мя-якенькай і смачнай. Пойдзем з'ясі.

— Дзякую. Потым, як гаспадар вернецца.

— Уга! Яны — вернуцца. Да таго Фаміча мой — быццам у вір галавой. Не дачакаешся цяперся. Так што хадзем, паясі, золатца маё. Ці лепей сюды, на ложак, табе паднясу...

Вочы гаспадыні, светла-карыя, заклапочаныя, свяціліся ласкавасцю, і ён аж скалануўся ад падабенства, якое заўважыў нечакана. Гэтак жа глядзела на яго маці, калі перад вайною, на Дзвіне, ён моцна падрапаў нагу на нейкай драціне, адчапляючы вуду.

— Навошта? Я сам! Мне ўжо добра.

— Дзе ж добра, дзіцятка маё. Белы, як вапна, стаіш. Бярыся во за плячо...

Гаспадыня ўзяла яго руку, і ён, намагаючыся не застагнаць ад болю, які ўзнік, ледзьве нага зварухнулася, пакрочыў з асцярогаю ад акна. Распаласаваная левая калашына — Рыма, калі была на тым тыдні, наважылася яе сшыць, але ён не дазволіў сшываць, каб лягчэй было нацягваць на параненую нагу,— матлялася, нібыта ад ветру, ціха ляскала паназе, і ад гэтага ляскання боль прыглушаўся, слабеў, і Артур ступаў амаль цвёрда, радуючыся, што менавіта вось з гэтае хвіліны, калі ён ступіў ад акна, усё ў яго пойдзе на добры лад.

Гаспадыня паліла яму над цэбрам, і ён памыў рукі і твар, адчуў сябе яшчэ больш бадзёра і моцна і, намагаючыся зусім не кульгаць, падсеў да стала. На вялікай чорнай патэльні буйнымі кавалкамі румянілася, быццам ружовілася ад сонца, свежаніна, у гліняной місе горбілася квашаная капуста з ружовымі колцамі морквы; паміж патэльняй і місай ляжаў бохан жытняку.

Гаспадыня ўзяла нож, адкроіла ад бохана дзве тонкія лусты і, насцярожыўшыся, павярнула галаў да дзвярэй, за якімі пачуліся мужчынскія галасы.

— Ну, дзякуй богу, валакуцца і мае работнічкі...

Дзверы адчыніліся нахлашч, і следам за гаспадаром у хату ўваліўся Багдан, у здзіўленні развёў рукамі:

— Бачыш, Ігнась, што ён робіць, калі гаспадара няма ў хаце? — і заліўся радасна-ўзбуджаным смехам:— За сталом арудуе! Ды на поўную губу кладзе! Гуляй, Ульяна, яшчэ дахаты рана!

Гаспадыня несла ад печы чыгунок з бульбаю, спынілася на момант і напусцілася на мужа:

— Што, ужо сербануў дворнай пахлёбкі?!.

— Не, гаспадынька, не! — Багдан узяўся горача пераконваць гаспадыню.— Бег дамоў гаспадар, бы на крылах. А пад крыламі — ячкі, што піхаюць плечкі,— і ён, выцягнуўшы з адной кішэні пляшку самагонкі, а з другой — яшчэ адну, паставіў іх самавіта ля патэльні.— Каб добра жылося, каб сала ў хаце вялося!..

Багдан паводзіў сябе, быццам у роднай хаце, пасмейваўся, жартаваў, пускаў кпікі ў адрас Артура і гаспадароў хаты, і гэта было дужа натуральна, нікога не абражала, стварала атмасферу добразычлівасці і свята. Увішна наліваючы самагонку ў келіхі з тоўстага рабрыстага шкла, якія гаспадыня паставіла на стол, Багдан усё ў той жартаўлівай манеры запэўніў Селівончыка:

— Манеўры, бацька, ты правеў выдатна. Наляцела, як кажуць, каса на камень. Каса — напалам. А камень — звініць,— і, убачыўшы, што Артур свой келіх закрыў рукою і адсунуў, здзівіўся:— А навошта ж тады рысака ганялі ў гэткую далеч? — Багдан абурaўся шчыра.— У гэткі дзень ды не выпіць? Грэх! Далоў руку,— і, просячы надтрымкі, павярнуўся да гаспадыні:— Улляна Мікітаўна! Патлумачце, даражэнькая, гэтаму неразумнаму!

— Яно не зашкодзіць табе, дзіцятка маё,— папрасіла гаспадыня, зграбаючы на талерку да бульбы тоўстыя, падзіва роўна пакроеныя кавалкі свежаніны.— Тады і бульбачкі і свежанінкі ў ахвотку паясі...

— Во, разумна робіш,— узрадаваўся Багдан, калі Артур скінуў сваю руку з чаркі, хутка і вельмі ўвішна дапаўна наліў яе.— У славу фронту, які грыміць,— і ўрачыста ўзняў чарку:— Каб сёлета фюрэру, паганцу, поўны і канчатковы канец!

Гаспадыня працягнула свой келіх, папрасіла лагодна:

— Налі, Багданачка, і мне, хоць і няможна. Ныркі гэтыя мае, каб ім добра было...— і заўсміхалася.— Я по-оўненькую вып'ю, каб сёлета наша зямелька чыстая ад чужынца была... І каб сыночкі нашы жывыя вярнуліся. І Паўлічак. І Уладачка.

— Яны ж на адным танку служаць. На фронт — адразу, з першага дня,— удакладніў Селівончык.

— Пра гэта гаворка — наперадзе. Наперадзе гаворка пра слаўных нашых танкістаў,— паабяцаў Багдан, чокаючыся з усімі па чарзе.— За сыноў вашых, дарагая Улляна Мікітаўна, мы асобна ўрэжам... З песняю! «Б-броня кре-епка...»

Застолле ішло весела. Багдан увесь час быў у цэнтры ўвагі, і Артур зайздросціў яго здольнасці знаходзіць агульную гаворку з людзьмі. З якою ўвагаю слухае яго Селівончык! А гаспадыня! Глядзіць замілавана, грабе з патэльні на Багданаву талерку — ані не пустуе талерка! — то кавалак свежанінкі, то бульбінку, то капустку, то хлеба лусту падсуне, раіць ласкава, бы роднаму: «Еш, сыночак. Бульбінку шчэ, сыночак...» Шчырая, добрая яна жанчына, гэтая Улляна Мікітаўна! І ён, Артур, дужа добра зрабіў, што яе паслухаў, выпіў чарку. Хораша адразу на душы зрабілася. І нага амаль зусім не баліць. Толькі крыху кружыць галаву. І дзіўная млявасць скавала цела. Ліпнуць, склейваюцца вочы. А Багдану ж — каб што! Ані ў адным воку ад выпітага. Толькі зачырванеўся, голас яшчэ больш жвавы зрабіўся. Рагоча. Гаспадару нешта даводзіць узяўся. Цяпер падхапіўся, бярэ

з цвіка ў сцяне сваё кароценькае паліто з тоўстым чорным каўняром.

— Чтэры, як тоі поляк казаў, хвілі — і тут я зноў. Адна нага тут, другая там. Бульбачку тады я і прыкончу. Во, нават астыць не паспее.

— А я кажу: не хадзі,— паспрабаваў утрымаць Багдана Селівончык.— Не дасць Фаміч болей ані кроплі. Я і гэтае ледзьве ў яго вымаліў.

— Багдану — маліць? Э-э, не! Багдан умольваць не любіць. Фаміч — раднюсенькі мой, мілюсенькі! — сам панясе. Панясе, калі манеўр належны зробім разумна. Ён калі абяцаў разлічыцца цалкам?

— На тым тыдні. Бо зараз ёсць у яго літра, але, казаў, «на дзела важнейшае прыгатавана».

Багдан закіпяціўся:

— Важнейшае дзела, чымся наша, хіба ёсць? Няма, бацька дарагі ты мой! І не адгаворвай: манеўр Багдан робіць!

Багдан, быццам узняты ветрам, вылецеў з хаты. І адразу, як нешта зламалася ў дзівоснай машыне, адкуль неслася добрая і наладжаная мелодыя,— за сталом запанавала цішыня. Потым гаспадыня сказала, што кубелец з салам трэба перанесці з варыўні ў халодныя сенцы і добра акрыць на ноч, каб каты не паўлязалі. Селівончык са згодаю матнуў галавою, кінуў кароткае «але, зробім», затым, як бы раячыся з жонкаю, прамовіў:

— Хлеў хай гэткі і стаіць. Вясною чысціць будзем.

— А зараз табе цяжка?

— Ды не, няцяжка. Лепей тады ўжо адразу — гной на грады. Болей карысці...

Гаворка ішла нейкая нацягнутая, робленая, як быццам нехта ці нешта замінала ёй, і Артур палічыў сябе вінаватым, падзякаваўшы, пачаў узнімацца.

— Пайду паляжу,— прамовіў ён і дадаў шчыра:— Паеў добра, дык адразу размарыла. У сон цягне, млявасць... Паляжу лепей...

Селівончык з гатоўнасцю ўзняўся.

— Паляжы, голубе, паляжы. Кладзіся, ведаеш, і — да раніцы каб. Вось гэта — дзела! Самае важнае дзела. Памагу табе да ложка дачыкіляць...

Загрукалі боты ў сенцах, загучаў Багданаў голас, і праз міг ён сам, нахлапіч адыніўшы дзверы, як рабіў звычайна, уваліўся ў хату. За ім следам, неяк дужа асцярожна, ступіў праз нізенькі парог Фаміч, ціха зачыніў дзверы, апусціў клямку бязгучна: Фамічовы вочы, бліскучыя, як мокрыя вішні, глядзелі насцярожана, але весела.

У Багданавых руках быў шэры згортак; яго, адвёўшы рукою ўбок шторку ў праёме пераборкі, ён кінуў на ложак у пакоі, дзе звычайна ляжаў Артур, пачаў распранацца. Абвясціў:

— Добрыя весці ёсць у нашага дарагога таварыша Фаміча!

Селівончык падазрона зыркнуў на Фаміча, спытаў цвёрда:

— Весці? А чаму ты іх не казаў? Толькі ж мы з табою гаманілі.

Багдан сеў за стол на сваё ранейшае месца, з якога нядаўна ўскочыў і пабег з хаты, паківаў пальцам Селівончыку:

— Харошыя весці, калі запрашаюць сесці,— і загадна махнуў рукою Фамічу:— Стаяць ёй тут, Міхалыч, нашай артылерыі!

Твар Селівончыка падабрэў, было відаць, што гаспадар хаты збіраецца сказаць нешта прыветнае. Гаспадыня, аднак, яго апярэдзіла, запрасіла Фаміча садзіцца за стол:

— Калі ласка, сусед. На бульбачку гарачую. І свежанінка ё...

Багдан зноў загадаў Фамічу, але цяпер яго голас гучаў стражэй і больш настойліва:

— Давай, галоўны калібр — на прамую наводку, Міхалыч!

Фаміч, разгладзіўшы кароткую і рэдзенькую, клінцом, бародку, з падкрэсленай маўклівай самавітасцю паставіў на стол дзве пляшкі самагонкі. На адной рудзела, абадраная па краях, але чыстая, як новая, этыкетка, на другой жа этыкетка была некалі белая, але з нейкім тонкім і дужа мудрагелістым малюнкам па краях і цяпер замусоленая, прадраная пасярэдзіне, і здавалася, што прадрапана наскрозь нават шкло.

— Гэта што? — Селівончык паглядаў то на Багдана, то на Фаміча.

Фаміч адказаў з выклікам, быццам намагаўся ўпікнуць гаспадара за нешта даўняе, ім толькі і вядомае:

— Каб ты ведаў: слову Фаміча можна верыць. Я табе абяцаў літру? Абяцаў. Вось і стаіць зелле, як і згаворваліся з табою.

— А з якое нагоды гэткая ўвішнасць? Абяцаў жа на будучым тыдні, помніцца.

— Зараз даведаешся. Распрануся толькі, калі не супраць.

— А ты што фыркаеш, нібыта пан у мужыцкай хаце? Увайшоў — садзіся, кажух скінуўшы,— сказаў Селівончык і паляпаў рукою па краёчку лаўкі, што стаяла ўсцяж сцяны пад акном.

Багдан узяў у Фаміча латаны-пералатаны кажух, павесіў яго на той жа цвік, дзе вісела яго паліто з тоўстым чорным каўняром, патлумачыў, паціраючы рукі:

— З якое нагоды? З радасці, бацька, з радасці. Ужо гэткую радасць перажыць — словамі тут і не скажаш...

Фаміч сеў на краёк лаўкі, абапёрся правым локцем аб падаконне і адразу — ківель у бок Багдана:

— Гэты прыбег — просіць паўлітэрку — кампрэс, кажа, яму на раны,— ківель у бок Артура.— Маўляў, Ігнась просіць у лік тоі, у лік доўгу майго табе. Ну, даў гэтую,— ён узяў бутэльку з белай наклейкаю, прадранай пасярэдзіне, потым паставіў на ранейшае месца на стале.— Пайшоў ён,— ківель галавой у бок Багдана.— А праз хвіліну — шусь у хату. Як снег белы, без шапкі. Крычыць: «Фрыцы! Пруць сюды фрыцы! Бяры сваю пляшку — аддавай штаны — Артура трэба з хаты вывозіць». І сапраўды — без адзежы як хлопцу? Бяры, кажу. А ён мне пляшку — у рукі совае: бяры, маўляў, куды мне яе цяпер. А сам — да акна. Бачыш, крычыць, фрыцы ідуць. Гляпуў я — самлеў: фрыцы, усе ў чорным, пруць ад лесу. А што да чаго — толькі потым сцяміў. Ну-у, мікіцёр! Ну-у, баламут! Ну-у, брахун!

Багдан з сур'ёзным выразам твару разглядаў рудую, абадраную па краях этыкетку, намагаючыся прачытаць тое, што на ёй напісана. Здавалася, ён дужа гэтым адным і заклапочаны, каб дакладна прачытаць словы на этыкетцы. Але варта было на міг Фамічу змоўкнуць, як тут жа ўзяўся адказваць Фамічу, але казаў так, нібыта размаўляў толькі з бутэлькаю, усяляк намагаючыся яе перакапаць:

— Баламут і брахун, значыцца? Зараз будзем разбірацца, што тут і да чаго,— і пакручваў у руцэ пляшку з рудой этыкеткаю.— Гэтую пляшку ты мне ў кішэню піхаў? Толькі праўду кажы, як было.

— Піхаў.

Багдан паставіў бутэльку на стол, пастукаў па этыкетцы сагнутым у крук пальцам:

— Ад яе я адмаўляўся?

— Адмаўляўся.

— Хто мне яе ў кішэню ўсадзіў? Ты?

— Я. Бо разгубіўся і напалохаўся. А як жа было не злякацца? Як падалося, што фрыцы гэта ў вёску ўваходзяць,— не ведаю, што і рабіў...

Багдан сказаў урачыста:

— Цяпер пойдзем далей. Калі я ў акно глядзеў, ішлі ад Дзвіны людзі ў чорным адзенні?

— Ішлі, я ж гэта ўжо казаў.

— Значыцца, не хлусіў Багдан?
— Не хлусіў.
Багдан зноў спытаў з націскам:
— Праўду я табе казаў, што мой сябар параненых ляжыць у Ігнасёвай хаце?
Фаміч прызнаўся асуджана:
— Праўду.
— А ўяўляеш, дарагі ты мой! — Багданаў голас узняўся, аж вібрыраваў.— Сапраўдная трывога раптам. І мой дарагі сябар,— ківень галавой у бок Артура,— мужны твой абаронца застаецца ў падраных, да бою штанах не прыдатных. Ты разумееш цяпер, з каго хацеў штаны садраць? — Багданаў голас грымеў з робленым пафасам.— Значыцца, хто баламут? Хто брахун? Хіба не той, хто за нейкую паршывую пляшку хацеў раздзець народнага мсціўца, які праліў кроў, за ўсіх нас праліў сваю маладую кроў?
Фаміч ашалела глядзеў на Багдана, ён не чакаў такой павароткі, аніяк не мог дапяць, дзе праўда тут, у гэтым допыце, дзе жарт. На яго твары, шырокім, даўно не голеным, пачалі гусцець чырвоныя плямы, яны паўзлі да носа, потым як пераскоквалі на лоб, на якім яшчэ не адпала чырвоная палоска ад цеснай шапкі. Вузкія, абсівераныя па куточках і парэпаныя губы саўгануліся — Фаміч збіраўся нешта запярэчыць.
— Ты, Міхалыч, не хацеў рабіць благое,— апярэдзіў яго Багдан.— Ты не хацеў учыніць ганьбу нашай святой барацьбе — сквапнасць твая хацела. Але яе — няма! Не бачу яе. І вось, каб ведаў, паважаю цябе глыбока за што? — Багдан, счакаўшы, пакуль Фаміч разгублена націсне плячыма, адказаў на сваё запытанне ўрачыста:— За тое, што сквапнасць сваю турнуў ты, даў ёй пад самае дыхала. Разумна зрабіў, павер мне,— і падсунуў пад руку Фамічу пляшку.— Лей — не жалей: хоць сілы страцім, але дно пабачым!
Фаміч, урэшце, сцяміў, што ўсё гаворыцца ў жарт, твар яго палагаднеў, губы расцягнула ўсмешка, і ён пацёр іх тыльным бокам далоні, крыху крывячыся — губы, мабыць, балелі; наліваючы гарэлку ў келіхі — келіх, які падсунуў Багдан, ён наліваў у апошнюю чаргу,— гаварыў у захапленні:
— О-о-ох, люблю я галавастых! Мікіцёраў гэткіх — па душы яны мне. Я і сам, калі ў маладосці, рызы-ыкант быў. Памятаеш, Ігнась? Але ж гэткага,— паказаў пляшкаю на Багдана,— гэткага мне не даводзілася нават і ўгледзець...
Артуру карцела сядзець і слухаць, глядзець на Фаміча, на разгарачоны твар Багдана, на хітраваты бляск у яго вачах. Але нага пачала нечакана балець, і гэты боль пашыраўся,

поўз вышэй калена, галаву кружыла, і ён падняўся. Багдан з гатоўнасцю кінуўся да яго. Але Артур адмахнуўся ад дапамогі:

— Я — сам, сам... Ногі ўжо добра тупаюць. Сядзі з імі...

Багдан як бы і ўзрадаваўся, адразу плюхнуўся на лаўку, рэзаў на талерцы танюткімі скрылікамі кавалак свежаніны — рыхтаваў закусь — і ўважна, але ўпотай пасмейваючыся, слухаў гаворку Фаміча. Дзіўна той гаворыць — таропка, паспешліва, быццам намагаецца пераканаць гаспадара хаты, што ён у добрым настроі, што лічыць за вялікую радасць і гаварыць з ім, і сядзець тут, за сталом, трымаючы чарку ў руках.

— Слыш, Ігнась, якія ён мне ляткі наставіў? Гэта ж было думаў, што няма чалавека, які б мне латку прышпандорыў. А ён злаўчыўся, стаячаму лапці падплёў!

— Ты толкам раскажы,— папрасіў Селівончык, і было відаць, што яму па душы чуць ад Фаміча прызнанне ва ўласнай прамашцы.

— А што я раблю? Я ж кажу: стаю ля акна, як даварапы. Куды кінуцца бегчы — не ведаю. Што ўхапіць у рукі — розуму не дабяру. Адно толькі гляджу, як людзі гэтыя ў чорным усё бліжэй, бліжэй... І на вуліцы вось ужо!.. І ён, мікіцёр гэты,— з імі рукаецца, і адзенне на ім — чорнае. Тады толькі дапяў: адзенне на іх звычайнае, а выдае — чорным. Сутонне, і лес чорны здаецца таксама. З хаты выбег,— Фаміч перадыхнуў, заліўся смехам, але смех гэты быў нейкі як бы вінаваты,— рагатаць пачаў. Ад радасці, ад жаху перажытага, ад думкі пра тое, што мікіцёру гэтаму пляшку лепшага першачку сілком жа ўвапхнуў у кішэню,— смех мяне сагнуў. Ах, мікіцёр! Ах, рызыкант! Як пад'ехаў. Якую латку ўляпіў! Гляджу на яго, за жывот бяруся ад смеху — ажно слёзы на вочы... Ну, мікіцёр, будзь здаровенькі! Каб галіфэ зносу не было! За гэта — чарку і пусцім!

Вясёлую, са смехам, Фамічову споведзь і прапанову ўзняць чарку Багдан перапыніў патрабавальна і безапеляцыйна:

— Чарку, Міхалыч, узнімем за танкістаў Селівончыкаў. Паўлюка і Уладзіміра! З гэтых кубкаў шкляных яны за сваю дарогу ў саракавым пілі. Хай жа яна, дарога шчаслівая, іх сюды зноў і вядзе — да бацькоўскай хаты! А бацькі — іх стрэнуць. Як герояў! Як вызваліцеляў! Як мужных франтавікоў! Ну, урэжам, каб адразу дно ўбачыць!

Ён кульнуў чарку, глынуў залпам, цмокнуў у дно. А гаспадыня гучна пацалавала Багдана ў шчаку, абняла абедзвюма рукамі ласкава:

— Дзякую, Багданачка! Словы твае сэрца сагрэлі... Добрай душы ты чалавек. Ну, як родны ты мне сыночак! Каб сто гадочкаў табе неба адмерала. І адмерае — за дабрыню, за шчырасць...

Звінелі чаркі. Вясёлы гармідар на кухні то як праваліваўся кудысьці, то зноў набіраў сілу, як надпалены вясёлым рогатам Багдана, і ад яго, Артуру здавалася, трасецца, час ад часу ўздрыгвае пераборка, абклееная шпалерамі. Артур ляжаў на ложку, задаволена слухаў і гэты звон чарак, і вясёлы гармідар, і смех Багдана. Карцела чуць усё тое, пра што гамоняць на кухні. Але замінала санлівасць, яна навальвалася, наплывала хвалямі. Галасы за пераборкаю ўсё мякчэлі, цішэлі, потым загучалі тонюткa-тонютка, і гэтая слабенькая ніточка напіналася, звінела і раптам парвалася і растала.

## 9

*БЛАКНОТ РОМЕЛЯ. Старонка восьмая.*

«Пад раніцу мне сасніўся пачварны сон: ляжу ў труне. Труна на краёчку глыбокай магілы, на самай вяршыні глiністай выспы, што па правы бок ад возера. Ляжу я мёртвы, але ўсё бачу, усё чую. Захар Крупня гаворыць развітальную прамову — добрыя, справядлівыя словы. І я ад тых слоў заплакаў.

А потым да труны падбегла мая жонка. Узялася суцяшаць. Слёзы мне насоўкаю павыцірала і кажа:

— Узнімайся. Хадзем дамоў.

— А як існі, калі я ляжу ў труне? Ты хіба не разумееш?

— Я разумею,— спакойна сказала мне жонка.— Але чалавек павінен паміраць на зямлі сваіх бацькоў — гэтак ідзе спрадвеку!..

І я — узняўся. І мы — пайшлі над лясамі і палямі, і ўнізе, пад намі, плылі азёры і рэчкі, але дарога нам скрозь была роўная і лёгкая. І яна неўзабаве прывяла да нашага дома. Дом усё той жа, ані не змяніўся за гэты час: спічасты дах з чырвонай чарапіцы, шырокія вокны, з роўненькіх плітак сцежка аж пад самы ганачак ад жалезнай брамкі.

— Ты стаміўся,— сказала жонка.— Кладзіся, адпачні...

Знаёмыя падушкі з пуху. Пярына з пуху. І лёгкая мяккая коўдра... І жонка, якая лягла побач, была гэткая ж мяккая, ласкавая і гарачая!.. Я галубіў яе, і яна ўсё нешта мне шаптала і шаптала, і словы яе абміналі мяне, некуды адляталі... О, майн гот! Вельмі ж яна была пяшчотная!

Потым па бранвевіку прыкаціў Курт. Ён стукаў у дзверы, стукаў у вокны — шыбы ўсе палалі агнём.

З гэтым я і прачнуўся. Курт знік адразу ж — я ведаў, што гэта сон. А жонка ўсё яшчэ была ўва мне — пяшчотаю сваёй, гарачымі вуснамі, прагнымі ласкавымі рукамі, прагным целам. І я доўга не мог сцяміць, сон гэта ці ява... Потым сцяміў: ява — побач.

На падлозе, у супрацьлеглым кутку хаты, на саломе храплі партызаны з гаспадарчага ўзвода — яны нядаўна ў атрадзе, я нават не ведаю іх прозвішчы. Ціха нацягнуў боты, апрануў кажух і выслізнуў на падворак.

Ноч была на зыходзе. Пурпуровы далягляд над блізкім лесам, здавалася, трымцеў ад гулу матораў. Высока ў небе ішлі самалёты, і я адразу вызначыў: не нашы. У рускіх самалётаў своеасаблівы гул.

Мяне трэсла быццам у ліхаманцы: нібыта і сапраўды пасля любошчаў на мяккай пуховай пярыне выбег на мароз. Сэрца маё дзерлі туга і адчай. Каб мне хто сказаў: ты вольны, маўляў, можаш ісці дамоў... Я б, без ваганняў, рынуўся напрамкі. Я б ішоў гэтак жа, як ішоў у сне, і мяне анішто б не запыніла.

Я глядзеў на неба, і мне хацелася раўці ад болю. Доўбня! Ты ж некалі ўспорваў носам філасофскія глыбіні, спрабуючы спасцігнуць, дзеля чаго ў гэтым свеце чалавек. А ўсё ж проста, як рыпенне снегу пад ботамі: чалавек толькі аднойчы нараджаецца на зямлі, і нараджаецца толькі на тое, каб кахаць і галубіць жанчыну, якая яму па душы, гадаваць дзяцей, якіх яна яму народзіць, спаць пад дахам свайго ўласнага дома, дзе ёсць хлеб і табе, і жонцы, і дзецям і які ты зарабіў сваім мазалём.

Усё ж астатняе — падман і лухта!

Хто будзе сцвярджаць нешта іншае — таго трэба знішчаць, як хваробу, што можа запаскудзіць зямлю».

## 10

Захар доўга і ярасна круціў ручку тэлефоннага апарата, які вісеў на сцяне штабной хаты. Але ў трубцы толькі нешта хутка пазвоньвала, гуло, нібыта недзе далёка ўзнікалі і адразу раставалі галасы, і гэтае загадкавае жыццё мембраны прываблівала, прымушала трымаць трубку ля вуха, не кідаць яе на тоўстае вечка старога рычага, спрэс у цёмных плямах — метал даўно і моцна саржавеў.

Слухаючы далёкае, вельмі невыразнае, але таямнічае і

загадкавае шалахценне, Захар зрэдзь часу зыркаў то на назбіваны рычаг, з якога нядаўна зняў трубку, у якой загучаў і нечаспадзявана некуды знік сухі і патрабавальны, з металічнымі ноткамі, голас Гусарава, то ў акно, на пустую вуліцу вёскі, над якой асела хмарнае студзеньскае неба, то на Яштокіна, які горбіўся над сталом. Пачуўся нейкі новы гук, танюткі, і яго злавіла правае вуха, не закрытае тэлефоннай трубкай, і Захар не адразу здагадаўся, што гэта рыпіць у руках Яштокіна пяро, а здагадаўшыся, уголас рагатнуў.

Яштокін і на імгненне не ўзняў схіленай над сталом галавы, выціснуў запытальнае:

— Чуваць? — счакаў і, не пачуўшы адказу, папрасіў:— Скажы Гусараву, што справаздачу робім. Заўтра адправім.

Захар зноў рагатнуў, і тады Яштокін узняў галаву; русявыя, каротка падстрыжаныя валасы былі патапыраныя; стомленыя, падобныя на карычневыя бубінкі вочы глядзелі з недаўменнем:

— Вясёлае нешта пачуў?

— Пяро рыпіць — гэта і пачуў. Неяк звягліва рыпіць — ажно, відаць, Гусараў там пачуў і трубку кінуў...

— Што ён казаў? Напэўна, справаздачу цярэбіць з мяне,— і доўга, з асалодаю, вылаяўся — адвёў душу:— Каб яны спрахлі, гэтыя справаздачы. А ён у іх упёрся, як чорт у грэблю. Ну, паяўнасць патронаў — разумею. Колькі і калі расходвалі — трэба ведаць. А норма харчавання партызана ў баявы і небаявы час? Лухта! Дык не, пішы, што партызан у дні бою будзе есці, а што — калі бою няма. Дык як жа той нормы прытрымлівацца, калі ў Плігаўках ідзе бой, а ў Мураўях ціха. Смешна!

— Усё пнешся напляваць проці ветру?

— Ды разумна хачу сілы свае расходаваць. Не на гэтае...— і зноў вылаяўся, згроб паперы са стала, патрос імі.— Каму карысць? Каму карысць з гэтай пісаніны?

— Спяваная песня, дарагі дружа!

— Хай сабе. Але — у апошні раз ён яе ў мяне чуе...

Нечакана ў трубцы пачуўся далёкі голас Гусарава, і Захар замахаў рукамі на Яштокіна — прасіў памаўчаць.

— Слухаю, слухаю вас,— пракрычаў у трубку Захар.— Добра, добра цяпер чуваць,— паківаў рукою Яштокіну, потым павадзіў пальцам па сцяне — прасіў аловак і кавалак паперы. І калі Яштокін прынёс яму аловак, паўтарыў зноў у трубку:— Чую добра. І — запісваю...

Але на паперы вывеў толькі дзве лічбы — адзінку і двойку. Потым падзяліў іх тлустай рыскаю, абвёў кожную лічбу колцам, затым злучыў іх роўнай лініяй і пад ёй паставіў

тоўсты пытальнік. Гусараў працягваў гаворку, і Захар намаляваў яшчэ адзін пытальнік, меншы, падобны на расплывістую коску, і пад ім правёў дзве тлустыя лініі, паставіўшы ў канцы тлусты, з буйнай кропкаю ўнізе клічнік.

Скончыўшы размову, Захар павесіў тэлефонную трубку на рычаг, нейкі час моўчкі глядзеў у акно на пізкае зімовае неба. У цішыні, што панавала ў пакоі, гучна рыпела пяро — Яштокін усё нешта зацята пісаў і пісаў,— і гэтае рыпенне наводзіла на сумную развагу аб загадах, якія толькі што Захар атрымаў са штаба брыгады. Прыйшла спагада да абурэння Яштокіна; праўду ён гаворыць, чысцюткую праўду. Крукам жа сядзіць над рознымі справаздачамі, закапаўся ў паперах, у рознай дробнай пісаніне канцылярскай. А тут — новыя складаней. Першае — план эвакуацыі людзей і маёмасці з вёсак у лес на выпадак наступлення немцаў. Другое — план правядзення інструктыўнай нарады асоб, якія адказваюць за гэтую эвакуацыю. Трэцяе — тэрмінова, не пазней заўтрашняга дня, далажыць пісьмова аб наяўнасці супрацьтанкавых фугасаў, якія яшчэ не пастаўлены перад лініяй абароны. Чацвёртае — справаздача аб забеспячэнні людзей у ротах абуткам і адзеннем. Сумная гаворка! І адзіна светлае, што ўсхвалявала і ўзрадавала, Гусараў сказаў у канцы — войскі Беларускага фронту вызвалілі Калінкавічы і Мазыр. Назвы гэтых новых гарадоў, вызваленых ад фашыстаў, спачатку ўсхвалявалі, а потым прымусілі задумацца. Чаму Мазыр, а не Полацк, скажам? Чаму?.. Дзівак. Наступ на Віцебскім напрамку не меў вялікага поспеху. Пасадачныя пляцоўкі, якія рыхтавалі для высадкі дэсантаў, спачатку размяклі ў адлігу, потым іх занесла снегам. Відаць, па вялікі поспех і не было аніякіх разлікаў у Галоўнага камандавання. Быў, мабыць, нейкі іншы разлік, табе не вядомы. Ты толькі можаш пра нешта здагадвацца, ведаць жа нешта пэўнае немагчыма. Пэўнае толькі вось яно, на гэтай паперцы. О-ох, узвіпціцца зараз Яштокін, калі пачуе пра новыя справаздачы, якія давядзецца яму складаць. Але гэта — потым! Спачатку — радаснае трэба яму перадаць: новыя ж гарады чыстыя ад фашыстаў.

— Калінкавічы і Мазыр? — Яштокін ажно ўсхапіўся з месца, падскочыў да Захара, нібыта адпіхнуў яго ад сцяны, на якой вісела невялічкая, з геаграфічнага падручніка, карта Беларусі, вадзіў пальцам, пагладжваў лініі і назвы гарадоў на паперы.— Ну, яшчэ адно свята на нашай вуліцы! Ды дзе ж адно? Два! Ды якія! А ведаеш, дажывём жа мы з табою, калі і пра іх пачуем,— і закрыў далонёю кавалак звілістай сцяжкі Дзвіны і назвы гарадоў на беразе яе — Полацк і Віцебск.— Дажывём!

— Дажывём,— паабяцаў Захар і зноў падумаў пра тое, што зараз, калі паведаміць пра новыя справаздачы, Яштокін узвінціцца, пачне абурацца.— Дажывём, калі ты справаздачы будзеш добра складаць. Паслухай, што зноў ад нас запатрабавалі...

Захар, аднак, памыліўся, калі думаў, што Яштокін сустрэне патрабаванне складаць новыя справаздачы хваравіта. Але здзівіўся, як імкліва чэзла, знікала радасць з твару Яштокіна, знікала, быццам кожнае слова пра змест гаворкі з Гусаравым адсякала ад твару былое радаснае ажыўленне.

— Пацеха з меха,— неяк стомлена і абыякава прамовіў Яштокін, калі Захар змоўк.— Замест таго каб мне, начальніку штаба, распрацоўваць баявыя аперацыі, вадзіць людзей у бой і пра яго рабіць справаздачу, я што раблю? Паперчыны крэмзаю,— і нечакана, у вялікім роздуме, спытаў: — А ты не лічыш, што паспяшаліся там,— узняў палец угару,— паспяшаліся там з расфарміроўкай Цэнтральнага штаба партызанскага руху?

— Не, не лічу. Усё кіраўніцтва ўскладзена цяпер у нас на абком партыі. А ім — ЦК кіруе. Непасрэднае кіраўніцтва...

Сказаў і ўбачыў: не памыліўся. Адбываецца тое, што ён і прадбачыў: пачырванеў Яштокін, суровыя складкі пайшлі ля носа, вочы глядзелі колка.

— Непасрэдна намі кіруе хто? — і глядзеў на Захара, настойліва і патрабавальна, як бы прымушаючы яго маўчаць і не пярэчыць.— Гу-са-раў! А мы ж яго ўдоўж і ўпоперак як аблупленага знаем і ведаем. Паперчыну дасі своечасова — добра кіруеш. Затрымаўся са справаздачаю, нават дробязнаю, добрага слова не вартаю,— блага кіруеш, кепска кіруеш. Неаператыўны работнік,— апошнія словы Яштокін прамовіў, падрабляючы інтанацыю Гусарава.

— Не перабольшвай, не перабольшвай. У-ух, як угрэўся ад абурэння — ажно пар з яго верне!

Яштокін не прыняў жарт, прайшоўся па хаце ад акна да акна, спыніўся ля тэлефоннага апарата, пастукаў па ім кулаком.

— Шчэ гэтая бандура клятая над маёй галавою завісла. Без яе добра было, помніцца. Не-е, не трэба было Цэнтральны штаб ліквідоўваць. Яго кіраўніцтва мне па душы было. А цяпер мы ўжо і на партызан не падобны: тэлефон, справаздача, парада...— і раптам, са стогнам, але без падробкі, шчыра і настойліва папрасіў: — Слухай, Захар! Пашлі ты мяне ўзводным. У які хочаш узвод! З песняй пайду, далібог!

Захар засмяяўся:

— Тое мудрона, што па лёдзе зварона. А ты дык і ў паветры кашу зварыш.

— А што, гэтак ужо дурное пляту?

— Ды не скажаш... Але, наслухаўшы, ажно рукі свярбяць: толькі ў розуму, што ў яго!

Яштокін цяпер узарваўся па-сапраўднаму:

— Значыцца, наша дзела цялячае, як гаворыцца,— пасўся і ў хлеў?! Але папомні, Захар, папомні: мы кроў'ю вялікай будзем плаціць за гэтыя справаздачы, паперкі, канцыляршчыну гэтую,— і злосна, нахабна вылаяўся і, адразу астыўшы неяк, паабяцаў цвёрда:— Ноч спаць не буду, а дакладную Ціхану наганю. Хопіць завальваць штаб канцыляршчынай,— і, спыніўшыся ля Захара і гледзячы на яго ва ўпор, спытаў, як стрэліў:— Падпішаш? Подпіс свой паставіш побач з маім?..

Захар вытрымаў гэты позірк. Напачатку было жаданне засмяяцца, па-сяброўску паляпаць Яштокіна па плячы. Але нешта ў звужаных шалам вачах Яштокіна яго спыніла, і ён дзелавіта паабяцаў:

— Пастаўлю!

— Дзякую...

— Пастаўлю. Але...— маўчанне было не міжвольнае, Захар разумеў, што трэба тлумачыць не сваю згоду, а нечым іншым пераканаць, знайсці нешта такое, што Яштокін можа зразумець з даверам і не пакрыўдзіцца. Патрэбных, пераканаўчых слоў, аднак, не знайшлося, і Захар давёў сваю думку да канца:— Але да адной справаздачы ты пастаўся з душою. Адзенне, абутак — тут дакладны ўлік не толькі не зашкодзіць, але і патрэбны. Хай кожны камандзір узвода дасць дакладную справаздачу. А Давід — аб нашых наяўных магчымасцях, каб ведаць, на што мы можам разлічваць, што папрасіць у брыгады.

— Прасілі ж,— перапыніў яго Яштокін.— Што атрымалі? «На месцы вышуквайце».

— Папросім яшчэ. Не разваліміся. І трэба пісара табе ў штаб. Хай ён паперу крэмзае. Дасі заданне — ён і зробіць.

— Вось з гэтым я згодзен! Разумнага, пісьменнага хлопца ўзяць — табе ж гэта я аднойчы казаў...

— Згодзен? Тады закрывай сваю канцылярыю. І — паедзем. Я — да Пажогі, пагляджу, як там з фугасамі. Ты, прыхапіўшы Давіда, па майстэрнях. Зноў усё памацай сваімі рукамі. Калі ты апошні раз у Вуглах быў?.. Бачыш, за тры тыдні — мора вады збегла. А ўвечары ўсё абгаворым. І камісара паслухаем — з канферэнцыі ён, напэўна ж навіны прывязе...

Яны разам выйшлі са штабной хаты і раз'ехаліся ў розныя бакі. Дарогаю да возера, дзе ў пясчаным кар'еры, старым, даўно парослым гонкім альхоўнікам, была наладжана выплаўка толу з мін і снарадаў, Захар адно і рабіў, што думаў над гаворкаю з Яштокіным. Думка, якую выказаў Яштокін і з якой Захар пагадзіўся, цяпер навяла на нечаканы роздум. Добра, ён, Захар, падпіша дакладную на імя Ціхана. Атрымаюць яны неўзабаве, за подпісам Ціхана, кароткі адказ. У лепшым выпадку ім памяркоўна растлумачаць памылковасць пазіцыі камандавання атрада. А карысці? Боты з паперы не пашыеш. І штаны не скроіш. А майстэрні працуюць слаба. Дакладней, працуюць яны няблага, але мала сыравіны, а тая, што ёсць, таксама добрага слова не варта: няма патрэбных хімікатаў, скуру добрую не вырабіш... Магчыма, Захар зрабіў памылку, што адпусціў Яштокіна аднаго: трэба было разам падскочыць сюды, да возера, дзе выплаўляюць тол, а потым разам адшукаць Давіда і паехаць па майстэрнях. Давід, ведама ж, пачне маляваць Яштокіну ружовыя планы, не паскупіцца на абяцанні і запэўніванні — гэта ў яго атрымліваецца няблага. А магчыма, і добра, што ён не паехаў разам з начальнікам штаба: праз тыдзень пасля Яштокіна Захар сам паедзе, правядзе камандзірскую інспекцыю працы гаспадарнікаў. Трэба, трэба ізноў іх варушыць і варушыць, бо наперадзе — вясна. А яна, напэўна ж, прынясе баі, доўгія дарогі па лясах, балотах. Гэта ж нейкае дзіва, лічы, што амаль год стаіць нязломнай партызанская абарона. А вясною? Памятаеш, колькі гадзін цягнуўся бой у акопах ля Дзвіны? Палову дня! Прыблізна і тут, калі рушыць сіла і танкі, разнясуць яны ўшчэнт акопы і бліндажы на гэтых пагорках. Доўга тут не ўтрымацца. Аніяк не ўтрымацца!..

Ён сам спалохаўся сваіх думак, пачаў пераконваць сябе, што нельга параўноўваць бой у трохкутніку ля Дзвіны з тым, што ёсць зараз. Там — дзве роты, раскіданыя па трох напрамках. Тут — стабільная лінія абароны. Злева, справа — суседнія партызанскія брыгады. Не роты, не атрады — брыгады! За спіной — на дзесяткі кіламетраў! — партызанская зона, і на краі яе таксама лінія абароны. Спрабавалі, спрабавалі неаднойчы ўварвацца фашысты — назад каціліся. І яшчэ як каціліся! Забітых забраць не паспявалі!..

Не супакоіўся, а яшчэ больш расхваляваўся. Прыўзняўся на страмёнах, агледзеўся навокал, быццам хацеў адразу ж сябе пераканаць, што без падстаў, зусім без падстаў яго трывога. Сапраўды, аніякай трывогі не згледзіш. Ціша, прыгажосць... Сінеюць лясы за чыстай белай роўнядзю возера,

маўкліва горбяцца пад снегавой беллю крутыя глiністыя пагоркі, рудой шчоткаю стаіць па азёрных берагах пасохлы леташні чарот. Злева — возера. Справа — возера. Паміж імі спадае ў нізіну з гэтых гліністых крутых пагоркаў дарога. Паспрабуй успаўзі па ёй на пагоркі пад прыцэльным агнём кулямётаў і аўтаматаў. Ды мінамёты жарнуць, ды брапябойкі ўлупяць... Не-е, адсюль атрад, з акопаў гэтых, якія і не відаць у снезе, лёгка, смехам ды спехам, не сапхнеш!..

Супакоены крыху, Захар памалу наблiжаўся да пізенькай драўлянай будыніны, складзенай — па жывую нітку — са старых дошак, з пакатым дзіравым дахам, над якім віўся ў розных месцах слабенькі дымок. Неяк незаўважна, але імкліва змянілася над галавой неба, зусім не тое ўжо, што вісела над штабной хатай. Хмурына парадзела, выразна акрэсліўся сонечны дыск, без промняў, прыгаслы, бы ўспаўзала па вечаровае неба поўня.

Захар злез з каня, вёў яго за павады і ўжо бачыў полымя горна, жаўтлявае, гэткага ж колеру, што і сонца. Полымя горна ў чорным праёме дзвярэй здавалася падобным на сонца, якое то затуляць, то адкрыюць хмары — гэткае ўяўленне стварала ўчарнелая ад дыму дзверына, якая памалу гайдалася разам са старым шворнам, сагнутым і абыржавелым, як з гліны зробленым, і які быў прыладжаны наўскасяк, быццам звязаў дошкі.

З будыніны пачулася песня, старая і добрая, вельмі знаёмая Захару — ва ўзводзе Файзуло яе часта спяваў Гнацюк.

В часовне дывчына пісню співае,
А козак чуе — сэрдэнько мрэ...

Захар пачуў песню і адразу пазнаў голас Багдана, саскочыў з каня, ішоў паціху, дзівячыся з таго, што ўпершыню чуе незразумелую тугу ў Багданавым голасе. Звычайна любіць вясёлае, заліхвацкае, каб з подсвістам, з размахам, на захапленне і зайздрасць усім. А тут — як сабе спявае,— і скруха, і нейкі адчай, і горкая незразумелая туга. Па кім жа ён пудзіцца гэтак? Па гаранцы той? Па Чаславе? Гаранка яго, боўдзілу, як сляпая кахала. І Часлава неяк падабрэла, заўжды з цёплынёю гаворыць аб ім, і ён, Захар, неаднойчы бачыў іх разам, ідуць, гамоняць, як нікога наўкола не заўважаюць. Няўжо вярнулася каханне? Ды няма, няма там чаму вяртацца! Гэта, аднак, толькі табе і здаецца, цябе, старога дурня, дзівіць! А яны — маладыя! А ён — муж ёй быў.

І ад песні, поўнай тугі і скрухі, што нібыта нікуды не адплывала, а вісела ў ціхім марозным паветры, знаёмы боль апёк Захарава сэрца. Каму табе спяваць вось гэтак? Калі?..

Усё, дружа, адспяваў сваё. Якую песню цяпер ты не пачуеш — былое ў ёй табе памроіцца, старое зачэпіць і шчасныя і горкія дні нагадае...

Зноў узнік знаёмы боль даўняй горкай страты — нібыта ўчора ўсё здарылася з жонкаю і дзецьмі, нібыта ўчора ён страціў іх. Ён зазлаваў на сябе: колькі разоў казаў, колькі разоў загадваў сэрцу маўчаць, не вярэдзіць старое, не чапаць! Не малое ж дзіцятка — не вернеш, не направіш. Дык не, зноў узяўся падразаць сабе апошнія крылы!

Баронячыся ад болю, прыгадаў Гайдаш, падумаў пра яе добра, ласкава. Але думка пра Гайдаш была падобна на далёкую знічку на чорным небе — мільганула, растала, аніякага следу не пакінула, і засталася толькі самота. Але ад яе, гэтай самоты, асядала на сэрцы жахлівая горыч, якую ён да гэтага дня аніколі яшчэ не ведаў.

«Я проста дужа стаміўся. Вельмі стаміўся ад усяго...»

Яму хацелася зараўці ад болю, бразнуцца на дол, схавацца, зарыцца ў халодны снег, растаць у ім, знікнуць адразу і назаўсёды. І ён, мабыць, гэтак і зрабіў бы, бразнуўся б у снег, каб не тузануў за повад конь, не пацягнуў наперад.

Песня раптоўна абарвалася, яе замяніў мілагучны свіст, але мелодыя заставалася ўсё тая ж, толькі ўвівалася на яшчэ больш высокую ноту, гучала доўга, працяжна, яшчэ больш тужліва і адчайна, і яна набліжалася — Багдан выходзіў з будыніны. Ён ішоў, трымаючы перад сабою і прыціскаючы да жывата скрынку плаўленага толу. Багданаў твар быў мурзаты, у чорных пісягах.

— Каша, здаецца, падгарэла крышку,— пажартаваў Захар, павітаўшыся.— Нешта ж дужа колер у яе падазроны.

— На колер увагі не звяртаем. Галоўнае — вага. А яна — у наяўнасці: чацвёртая талерачка!

Ён паставіў скрыню побач з іншымі, што выстраіліся ля пустых снарадных балванак. Ва ўсіх трох скрынях — пустыя снарадныя балванкі, быццам паркančыкам, абгароджвалі іх — пасярэдзіне ярка жаўцелі прамавугольнічкі шашак прасаванага толу з драўлянымі тычкамі, якія ставілі перад заліўкаю — дзюрачкі для дэтанатараў. Багдан прысеў на кукішкі, па чарзе пакратаў іх, як бы выкручваючы драўляныя тычкі.

— Калі не паспееш пакруціць, дык схопіць намёртва, халера, бы з металу,— патлумачыў ён, хоць Захар добра гэта ведаў.— А ў гэтай мэдхен дзіўны тол, між іншым. Нейкі ружовы. У снарадах дык жоўты, як прасаваны. А тут — ружовы. Як і кава ў іх цяпер — суцэльная падробка. Сурагат! Але

не шкадуюць — шчодрыя людзі. Бачыце, колькі ўжо наплавілі?

— Мы ім гэтае багацце і вернем.— Захар, сагнуўшыся побач з Багданам, сачыў за яго рукамі, потым перавёў позірк на чацвёртую скрыню, дзе, застываючы, тол пабліскваў зіхатліва, як рудая вада ў каляіне дарогі, што сціснута марозам; правёў пальцам па ўзорыстай паверхні ў скрыні — тол быў гладкі і цёплы, як угрэтая кафля.— Прыгожа застывае. Як сняжынкі па ім зверху.

Багдан злосна сплюнуў:

— У роце ўсё лупіцца ад гэтых сняжынак!

— А малако вы п'яце?

— Чорт яго тут будзе піць на марозе, тое малако! Во, каб шалёнай кароўкі малачка!

Захар пагразіў Багдану пальцам:

— Хочаш, каб гэтак, як у Глыбачцы, было? Бачыў я тое месца, паглядзеў: толькі яміна ад кузні засталася...

— Без вопыту хлопцы ўзяліся.— Багдан грэбліва махнуў рукою.— Навошта ж было па два снарады піхаць у горан? Адкрывальнікі-шукальнікі! А як жа: адкрыццё зрабілі, выплаўку наскорылі! А скоранька толькі кошкі цалуюцца. Затое ж дзеткі — сляпыя ідуць...

Аніхто дакладна не ведаў усіх абставін, пры якіх здарылася бяда ў глыбачанскай кузні, дзе няўдала выплаўлялі тол са снарадаў,— сведак не засталося. Магчыма, усё было гэтак, як кажа Багдан, і таму Захар сказаў памяркоўна:

— Правільна. Сведак у кузні не засталося. Але ж ёсць другія сведкі, і яны бачылі, што пілі хлопцы, перад тым як у кузню пайсці. А чалавек нападпітку — яму і мора ў калена!

— Галоўнае — вопыт! Калі яго маеш — самае глыбокае мора пераплывеш на адным пальцы. А няма вопыту? І самы добры плыт не ўратуе...

У Багданавым пярэчанні былі і крыўда, і пейкая зларадласць, і падкрэсленае фатыгоўства, і адкрытая фанабэрыя. Лёгка, маўляў, павучаць, папярэджваць, калі ты не дыхаеш смярдзючай атрутай, калі не стаіш ля агню, які можа кожны міг узвіцца смяротнай віхураю.

І чамусьці менавіта зларадласць, а не пейкія іншыя пачуцці, зларадласць, якую цяжка было зразумець і да выток аў якой дакапвацца зусім не хацелася, япчэ больш акрэсліла ў Захаравым сэрцы стому і абыякавасць. Нарадзілася патаемная думка пра тое — колькі разоў яна прыходзіла ўжо, падціскала, прыгнятала і гнула? — што смяротная віхура для яго, Захара, не самае горшае. Ну і што? Бліспе агонь, імгнен-

па спапяліць усё: і стому, і клопат, і тугу, і сардэчны боль, і самоту.

«І яны будуць разам са мною...»

Ён зноў падумаў пра жонку і дзяцей і нечакана адкрыў не вытокі свайі уласнай стомы і абыякавасці да ўсяго, а прычыны раздражнёнасці Яштокіна, яго гнеўнае абурэнне з нагоды нейкіх паперчын. Ён, як і ты, Захар, стаміўся. Стаміўся ад таго, што вочы замнога і дужа часта бачылі смерць блізкіх людзей,— гэта толькі здавалася табе, што ты прызвычаіўся да смерці і не баішся яе, а ва ўсіх другіх людзей усё ідзе інакш! — стаміўся ад пахаванняў, стаміўся ад слоў, якія даводзілася казаць ля вялікіх і малых магіл, стаміўся чакаць новыя добрыя зводкі з франтоў, стаміўся абнадзейваць людзей, стаміўся глядзець у іх вочы, засмучаныя і спустошаныя.

Захар зразумеў гэта, і тады адбылося нешта дзіўнае. Захар адразу адчуў сябе заспакоеным — зноў жа зусім нечакана! — і ведаў зусім дакладна, што яго заспакоіла не раптоўная думка пра жонку і дзяцей, дакладней, магчымасць быць разам з імі, быць там, па-за межамі рэальнага, а гэтая Багданава зларадпасць, нават не яна сама, а цвёрдае пераканание, што гэтую Багданаву зларадпасць Захар ніколі не пусціць у сваё сэрца.

— Артур там? — Захар запытаўся бадзёра і зарадаваўся, што голас яго гучыць упэўнена.

— Там. Ён жа ўжо і да вас сабраўся бегчы з цыдулькаю — ляжала ў гэтай мэдхен-грэтхен.— Багдан, папоркаўшыся ў кішэні, выцягнуў вузкі аркушок паперы, скручаны, як цыгарка.— Узрывацель выкруцілі — яна там. Я адразу змікіціў — з таго, мабыць, і не гакнула яна.

Захара ўсяго перасмыкнула:

— А ты чаго дагэтуль маўчаў? Такое дзела, разумееш, а ён бы вады ў рот набраў.

— Там жа нічога сакрэтнага і важнага няма.— Багдан глядзеў спакойна і неабуральна.— «Я кляну Гітлера!» Гэта толькі і напісана. Артур адразу прачытаў — у яго галава варыць. Шпрэхае добра...

Артур пераклаў дакладна — гэта Захар зразумеў адразу, як толькі развінуў шчыльна скручаную паперку. Адпусціў краёчкі, і паперка, вужакаю, скруцілася, і зноў на Захаравай далоні ляжала кароткая шараватая цыгарэціна. Захар зноў развінуў яе, зноў прачытаў і асцярожна паклаў у кішэню скуранкі. Трэба будзе неадкладна пераправіць нечаканую знаходку Гусараву. Чамусьці падумаў не пра Ціхана, а пра Гусарава і застаўся незадаволены сабой. Чаго гэта — адразу

Гусараву? Адправім заўтра ў штаб брыгады, разам з паперамі Яштокіна.

— Цяпер фюрэра ўзяліся клясці,— зларадна праказаў Багдан.— Раней трэба было. Калі спахапіліся! Цыдулькі ўзяліся пісаць!

— А ты ведаеш, чым рызыкаваў той, хто гэтую цыдульку напісаў і ў бомбу паклаў?

Багдан сказаў злосна:

— Каб ён вось гэтак, як мы з Артурам, рызыкнуў разочак — даўно і адразу б паразумнеў!

Цяпер Захару хацелася спрачацца з Багданам, даводзіць, як глыбока ён памыляецца. Гэткіх вось бомб, што не ўзрываюцца, робіцца ўсё больш і больш. Вунь, ляжаць балванкі трох снарадаў — білі з бронецягніка, і яны не ўзарваліся. Цяпер гэтая бомба, якую кінулі на тым тыдні з самалёта — цалялі ў штабную хату. Добра, што не ўзарвалася. А каб гакнула? Відаць, не сядзеў бы Захар тут, ля гэтых скрынак з плаўленым толам!

З будыніны пачулася нешта не зусім выразнае — ні то скарга, ні то лаянка, ні то запытанне,— і Захар таропка прапанаваў:

— Пайшлі туды. Ён жа нас кліча!

— Хадзем, хадзем, паглытаем гэтай трасцы!

Прытоеная зларадпасць зноў прагучала ў голасе Багдана, скрывіла яго губы, але цяпер яна аніяк не закранула Захара. Глытнуўшы горкага смярдзючага дыму, які сінім туманам вісеў у будыніне, Захар закашляўся, але не паскардзіўся, сказаў Багдану па-сяброўску, як бы падкрэсліваючы, што разумее цяжкасць працы, якую той робіць, і ставіцца да яе з павагаю:

— Не мёд тут, аднак...

Захар павітаўся з Артурам, стаў побач. Карцела папытаць пра здароўе, але своечасова стрымаўся, прыгадаўшы, як хваравіта адрэагаваў той, калі Захар аднойчы — ды пры ўсіх! — пачаў распытваць, ці пабольваюць раны, ці не зарана ён вярнуўся ў сваю падрыўную групу, і, стрымаўшыся, злавіў Артураў пагляд, скіраваны ў адну кропку. Вялізны корпус авіяцыйнай бомбы быў бліскучаста-чорны, з мядзяным абадком каля пагнутага стабілізатара, але той бок, які лізаў чырвоны агонь горна, сінеў, на ім праступалі то фіялетавыя, то аранжавыя плямы, скручваліся і зноў расплываліся, як каляровыя карункі машыннага масла на вадзе.

Артур рытмічна націскаў левай рукою на драўляны дышаль, мяхі горна сіпата чаўкалі, рыпелі, і полымя, штуршкамі, паўзло па адной, звернутай у бок дзвярэй, бакавіне бом-

бы. З другога боку, якраз пад драўляным дышалем, гэтак жа, як і полымя, штуршкамі, круціўся няроўнымі колцамі белы дым, марудна ападаў з цаглянага пода ўніз і, падхоплены струменем паветра з дзіравых мяхоў, узвіваўся і рэдкім попельным сяйвом поўз уверх, пад столь; суцэльнай столі ў кузні не было, а толькі чарнелі пад дзіравым дахам два брусы, шырокія, як дошкі, з якіх звісалі скруткі дроту, і белы дым закручваўся ў іх і знікаў.

Летась ля Дзвіны, упершыню ўбачыўшы снарад, пакладзены ў агонь горна вясковай кузні, Захар перажыў нагапае пачуццё. Гэта, прынамсі, быў не жах, не трывожнае чаканне невядомага, а нейкая непрыгожая будзённасць блізкага суседства са смерцю, разуменне таго, што чорны, абыржавелы метал павінен абарваць, зруйнаваць часцінку самага прыгожага на зямлі — жыццё чалавека. Гэткае ж адчуванне асабліва востра ўразіла нядаўна ля Глыбачкі, калі ён, Захар, убачыў глыбокую чорную яміну, што засталася на месцы былой вясковай кузні.

Цяпер смерць зноў была побач, перад вачыма, але ў прыгожай абалонцы, ільсняна чорная, размалявапая зіхатлівымі языкамі барвяна-сіняга агню. Захар адчуваў яе прысутнасць, і ў гэтым адчуванні цяпер не было ні жаху, ні трывожнага чакання невядомасці: ён бачыў яе, смерць, але глядзеў цяпер на яе вачыма чалавека, які спасціг у жыцці ўсё, што суджана яму было спасцігнуць і атрымаць. Разуменне гэтага не толькі ўзвысіла яго над сваёй уласнай стомай і абыякавасцю, над жахам смерці, але, галоўнае, перакапала яго ў рэальнай магчымасці свае ўлады над сілай, якая хавалася пад фіялетавым ад агню металам, магчымасці выкарыстаць гэтую сілу там і тады, як гэтага яму і схочацца.

— Не падгарэла каша, шапоўны кашавар? — спытаў Багдан у Артура, спытаў прыблізна гэтак жа, як Захар нядаўна запытаўся ў яго самога, і ў яго голасе не прагучала цяпер ні падробкі, ні фатыгоўства.

— Павярнуць адзін не здолеў. Не асіліў гэтую мэдхен. Хвост замінае.

Багдан зарагатаў:

— Каб жывая была мэдхен-грэтхен, дык, напэўна ж, на дапамогу не паклікаў бы. Каб без хваста, каб сама ножкамі тупала.

Артур адбіў жарт і зрабіў гэта стала, па-мужчынску:

— У гэтым адкіданні ты спец, калі з ножкамі. Ды калі не пячэцца. А гэтую ж галаруч не ўхопіш.

— Спрабаваць трэба, раю спрабаваць!

Багдан параіў гэта з націскам, укладваючы ў свае словы жартоўны сэнс. Артур жа сказаў з пачуццём свае мужчынскае годнасці:

— Шкада... А раптам скрыню абернеш...

— Дзе абцугі?.. Ага... Ну, р-разам!..

Доўгімі чорнымі абцугамі Багдан націснуў стабілізатар бомбы, і яна лёгка павярнулася: з гарлавіны на бляшаным жолабе ў драўляную скрыню, якая стаяла на падстаўцы ля бакавіны горна, жвавай ручаінкаю пакаціўся расплаўлены тол; на краёчках скрыні ён ужо застыў і быў белаваты, а ўсярэдзіне зіхатліва пабліскваў, як разагрэты полымем воск пад кнотам свечкі.

— Вось чаго яна баялася.— Багдан зыркнуў на Захара задаволены, як бы чакаючы ўхвалы свайму ўмельству і ўвішнасці. Не пачуўшы, аднак, аніякай ухвалы, дадаў больш стрымана, але без крыўды: — Цяпер можа і паболей даваць агню. Гэта напачатку асцярожна трэба. Ад сцёнак тол адскочыў— гані ва ўсю іванаўскаю. Праверана-дамерана,— і загадна кінуў Артуру.— Давай мне дышаль, пагапяю крышку. А ты мне цыгарку скруці ды паветра глытні свежага,— і зноў прытоеная ўсмешка, але цяпер ужо нейкая спакайнейшая, без зларадпасці, з'явілася на Багданавым твары.— А мо камандзіру даручым дышаль? Праўда, рабацёшка пыльная тута ў нас.

— Не мянці языком,— здушаным голасам сказаў Артур і, адкашляўшыся, дадаў стражэй, па-камандзірску: — Ты скрыню і шашку падрыхтаваў? Ідзі рыхтуй. Зараз трэба будзе стаўляць.

— Ляжаць гатовенькія.

— Тады сюды нясі, каб пад рукою была...

Артур сказаў гэта строга, загадна, і Захар зноў падзівіўся, як стала, па-мужчынску гучыць Артураў голас. Не хацелася саступаць Багдану ані ў чым, і Захар паклаў руку на цёплы дзяржак дышля.

— Нам абы рабацёшка была. Нас рабацёшкаю не спалохаеш. Саступі, саступі месца... Быў час, я сырадойчык у вас зарабляў. Памятаеш? Ці ўжо і не ў памяці, на што камандзір ваш здатны?..

— Самы час яго папіць, сырадойчыку,— сказаў Багдан, быццам і не пачуў таго, пра што сказаў Захар, быццам не яму было адрасавана пытанне — аніводны мускул на твары не зрушыўся ў замяшанні ці разгубленасці.— Не пашкодзіла б і да нашай малочніцы падскочыць. Каб сырадойчык не перагрэўся ў хаце...

Багдан рушыў, і Захар зрабіў ківок у яго спіну:

— Ласы, гляджу я, да сырадойчыку!

— Каб жа толькі сырадойчык! Зоська — вось дзе загвоздка!

— Якая Зоська? Адкуль?

— З Быстрыцы.— Артур весела, але грэбліва хмыкнуў, вачыма паказаўшы на дзверы.— Ад лесу першая хата... Не, што гэта я пляту! Ад возера першая хата,— і зноў хітнуў галавой у бок пагорка, які быў відзён праз адчыненыя дзверы.— На дні пяць разоў злётае. Напрамкі лупіць. Вунь, сцежку прабіў ужо ў снягах.

— Чакай, якая Зоська? Сачыўкава дачка?

— Ну.

— І ён туды па пяць разоў лётае? Гэта ты нешта перабольшваеш.

— Пераменшваю — гэта будзе дакладна.

— А што яна, Зоська?

— Яна? Млее па ім!

Напачатку было жаданне абсячы Артура. «Млее па ім...» Усё ён ведае, у кожную шчыліну нос суне. Каму там млець? Дзіцятка ж горкае — ці ёсць хоць дваццатка?.. Хаця ёсць. Напэўна ж, ёсць. І — прыгожая дужа, тут ужо трэба прызнацца: бялявая, каса тоўстая, як не ў пояс. Цяпер, праўда, яна касу ў вянок скруціць на патыліцы, галаву высака нясе, хада няспешная, быццам плыве дзяўчына... А Багдану? Яму ж недзе пад трыццатку? Ды не, адкуль! На два гады і старэйшы за Чаславу. А ёй жа — дваццаць шосты. Так, недзе пад самую трыццатку гэтаму лайдаку. А Зоська — дзяўчынка. Не, гэта такой яна здавалася раней, да смерці бацькі. А цяпер састарэла неяк, сагнулася нават. Калі ён, Захар, яе апошні раз бачыў? На тым тыдні, здаецца! Так, на тым тыдні... Як жа яна галасіла па бацьку!.. Сачыўка загінуў не ў баі, выпадкова зусім — вёз дровы да пякарні ўранні. А тут два самалёты паляцелі, кінулі бомбы — адна трапіла дакладна ў зямлянку, дзе была пякарня,— ударылі з кулямётаў. Конь, спалохаўшыся, панёс па лесе — ацалеў. А Сачыўка, хоць і ляжаў за саснoй, зваліўшыся з фурманкі, загінуў — пацэліла ў шыю куля з самалёта.

Дым трапіў у вочы, Захар прыплюшчыў іх, нібыта ўяве ўбачыў бялявую дзяўчынку, што прыклепчыла ля брацкай магілы — хавалі забітых у часе бамбёжкі пякарні разам на вясковых могілках. Перад пахаваннем прайшоў дождж. Свяціла сонца, мокрая трава зіхацела, і Захару на нейкі момант здалося, што ад горкага галашэння трымцяць на сцяблінах травы зіхатлівыя смарагдавыя кроплі. Захар паважыўся быў — дагэтуль яскрава лягло ў памяць — пасядзець ля

брацкай магілы, суцешыць дзяўчыну. Але замест гэтага адразу, як толькі скончылася пахаванне, ускочыў у сядло і пагнаў каня. Нават і сёння ён не можа растлумачыць тое сваё непарыванне. Што кіравала ім тады? Жаданне схавацца? Не, нешта зусім іншае гнала яго тады падалей ад вясковых могілак, гнала цераз поле, дзе ўсё зіхацела зыркімі сонечнымі фарбамі... Нешта ж гнала!.. Але што? Што прымусіла яго кінуць каня наўгалоп, адчайна тузаць і тузаць павады?.. Пачаў даканвацца калі! З усяго ты сабе сэрца рвеш... Лепей на Багдана зірні! Вось хто жыве ў радасці ды ў смешачках. І ўдача на яго, мажліва, таму і коціць хваляю. Ты хіба думаў тады, на беразе Дзвіны, што жывы ён вернецца? Нават шкадаваў: на верную смерць, маўляў, чалавека паслаў. А ён вярнуўся! Вярнуўся з Чаславай, якую ўратаваў ад смерці немінучай. Цяпер — Зоська гэтая! Няўжо ён і ёй, як гарапцы, гаротніцы гэтай, жыццё зглуміць удумаў? Не-е! Ён, Захар, гэтага яму не дазволіць!

Што і як зрабіць, якія захады прыняць, Захар не ведаў і пакуль што не збіраўся ламаць галавы над тым. Вырашыў думаць пра іншае, уважна вывучаў кароткі дзяржак драўлянага дышля, падобнага на старое тапарышча, вышараванае і адпаліраванае чалавечымі рукамі да бляску. Колькі гадоў стаяў у кузні гэты дзяржак?.. Колькі разоў кавальскія рукі трымалі яго?.. Колькі падкоў, лемяхоў, сякер і розных іншых прылад хлебаробскае працы, што гартаваліся на гарачым вуголлі горна, бачыў гэты стары дышаль, маўклівы сведка добрай, мірнай працы, патрэбнай чалавеку?.. Мабыць, дзіўна яму, дышлю, глядзець цяпер на гэтае льсняначорнае страшыдла, якое прыляцела сюды з чужой, далёкай зямлі... Сапраўды, снарадаў і мін — сваіх і нямецкіх — паваўплаўлялі тут шмат, а вось гэткае дзіва ўпершыню тут смаліцца...

Хрыпата, з адрывістымі падгалоскамі, быццам цяжкахворы стары, сіпелі дзіравыя мяхі. Дробныя аранжавыя іскры ўзляталі над вуголлем, барвяна-сінія языкі полымя ўзвіваліся, выцягваліся і трымцелі, спавіваючы бомбу з абодвух бакоў. Ля пагнанага стабілізатара курыліся скруткі попельнага дыму, а з гарлавіны, адкуль жвавай рудаватай ручаінкаю каціўся па жолабе расплаўлены тол, поўз жаўтлявы, белы па краях туманок. Над жолабам таксама слаўся тонкі, падобны на туманок, дым, як бы чапляўся за расплаўлены тол, і той замаруджваў свой рух, каціўся павольна, увачавідкі гусцеў. Час ад часу ў гарлавіне бомбы булькацела, пырскі толу ляцелі на вуголле, згаралі імгненна, як узрываліся, і чорна-сіні дым падкідвала ўверх, і ён змешваўся з жаўтля-

вым, і гэтыя хвалістыя, няроўныя скруткі, нагойдваючыся, усплывалі не ўверх, над чорныя, закапцелыя брусы, а цягнуліся да сцяны, над мяхі горна, услед за попельнымі паласамі, што бруіліся ад пагбанага стабілізатара.

Пяршыла ў горле, едкая і смярдзючая горыч сушыла паднябенне. Артур закашляўся, потым вылаяўся:

— Каб ён спрах, гэты ружовы тол. І дыму ж не багата. А — не прадыхнуць. У горле бы рашпіль ходзіць. Да спараднага дык мы неяк прызвычаіліся...

— Ідзі туды,— Захар паказаў рукою на адчыненыя дзверы.— Ці пачакай, разам пойдзем...

— Агонь нельга спыняць. Без нагляду тут не пакінеш. Зараз Багдан падменіць. Мы па чарзе ўвесь час...

З Багданам Артур сутыкнуўся ў дзвярах, той уважшоў размашыстым крокам, направіў скрыню, куды бег ручаёк расплаўленага толу, сказаў, атрэхваючы рукі:

— Дзень пакруцішся — тыдзень, лічы, адзежа паленым смярдзіць. І рукі. І скура з іх лупіцца...

Багдан хутка і неяк фасоніста, быццам пахваляўся і ганарыўся тым, што паказвае, згінаў і разгінаў пальцы левай рукі, на якіх белымі струпамі бухмацілася скура.

— А рукавіцы? — Захар прыгадаў, што Яштокін даваў распараджэнне Тарлеру забяспечыць рукавіцамі людзей, якія выплаўляюць тол.— Што, не прывезлі іх вам?

— Давід баіцца сюды ездзіць.

— Хай сабе. Але рукавіцы вам павінны былі даставіць— я іх на свае вочы бачыў. А вы абодва — галаруч!

— Дзе ж абодва! — Багдан шматзначна чмыхнуў.— Утрох! Разам з камандзірам атрада.

— Гэта выпадковасць, што я тут апынуўся зараз.

— Усіх нас тут, на зямельцы гэтай, выпадковасць падпільноўвае звычайная,— Багдан уздыхнуў і тыльным бокам далоні пацёр падбародак.— Толькі аніхто не ведае: дзе, калі, як. Калі галава мая, скажам, пакацілася, дык хіба ж не ўсё роўна, колькі тае скуры на пальцах у мяне...

Нешта зусім новае, не знанае Захарам раней, адкрывалася ў гэтым дужа сур'ёзным Багданавым маналогу, і гучаў ён шчыра, зусім без кепікаў. І шчырая заклапочанасць на твары, прытоены сум, і туга ў вачах, і шкадаванне, і стрыманы боль...

«Ён дужа змяніўся, гэты Багдан. І я, выяўляецца, зусім мала ведаў яго. А мо да гэтай высновы прыйшла і Часлава?..»

Варухнулася даўняя, як закарэлая, непрыязнасць да Багдана. Што было б, як павярнулася б жыццё гэтага чала-

века, каб тады, вясною, ён, Захар, застаў у Кандратавай хаце і Багдана?.. Відаць, застрэліў бы іх абодвух. Відаць?.. Ды застрэліў бы там жа, у хаце! Без ваганняў і сумненняў! А што змянілася б ў тваім асабістым жыцці, каб гэта і здарылася?.. Што зараз было б у тваіх думках пра гэтага чалавека?.. Непрыязнасць? Раўнадушша і абыякавасць? Ці тое ж самае, што і цяпер?.. Не адкажаш... А вось Часлава ясна, цвёрда сказала: каб не Багдан, ты мяне, дарагі Захарка, жывой не пабачыў бы ніколі. Яму, маўляў, жыццём абавязана...

Зноў варухнулася нязгода з тым, што ён зрабіў тады вясной на беразе Дзвіны, нязгода незразумелая, аніяк не патлумачаная ні раней, ні цяпер. Захар рашуча, нават з адчайнай злосцю, закрэсліў развагу і шкадаванне. Хопіць! Нельга бясконца вяртаць і вяртаць сябе ў тыя дні! Няма іх, тых дзён! Адышлі, адляцелі ў нябыт!

— Хопіць! Кропку на гэтым ставім! Кропку! — Багдан гукнуў узрушана, але патрабавальна, амаль загадна.

Нейкі міг Захар няўцямнымі вачыма глядзеў на кароткі калок, які піхаў яму ў рукі Багдан. Кропку? На чым Багдан раіць ставіць кропку? Але ж не раіць — патрабуе! Быццам падслухаў яго, Захаравы, думкі, пагадзіўся з імі, вынес адпольскавы прысуд.

— Кропку дык кропку!

Захар трымаў у руках завостраны, як піка, калок, не ведаючы, што з ім рабіць. Успаміны, разарваныя Багданавымі словамі, яшчэ жылі ў душы, перажытае ў тую далёкую ноч у Кандратавай хаце яшчэ вярэдзіла сэрца. Але над ім, тым перажытым, ужо выразна акрэсліваўся сэнс гэтага, рэальнага, дня: ён, Захар, стаіць ля кавальскага горна, які перацягнулі ўлетку ад Быстрыцы сюды, у кар'ер ля возера, і Багдан патрабуе калком прыўзняць стабілізатар бомбы. Выплаўка толу скончылася. Усё, трэба на гэтым ставіць сёння кропку.

— Кропку дык кропку,— паўтарыў ён радасна, адчуваючы, што з Багданам яму працаваць добра.

Захар падважыў бомбу калком, і тады з гарлавіны яе, разам з дымам, шуснуў на жолаб жвавы карычневы струмень і тут жа абарваўся, і пыркі сыпанулі на вуголле, і яно задыміла густа, з дробным трэскам, і гэты, над вуголлем, чорны дым змяшаўся з рудым дымам, які вісеў над горнам.

— Цяпер пацягнем нашага роднага кабанчыка,— Багдан ускінуў на стабілізатар драцянае кольца, перакруціў яго васьмёркаю і, забіваючы ў верхняе вечка калок, гукнуў: — Артур! Габлюй сюды! Дапаможаш!

Захар папракнуў з выклікам:

— Ужо без яго дык і не асілім. Брыся!

— Асіліць дык асілім. Але ж і с... намылім, калі сарвецца гарачанькі кабанчык наш...

Лаянка не абразіла, наадварот, спарадзіла, як пярэдка здаралася ў гэткіх сітуацыях, нешта накшталт даверу да чалавека, які мае вопыт. Яны неслі на кароткім калку бомбу, якая і без толу была цяжкая, і Артур падтрымліваў яе загнутым і ўстаўленым у горлавіну прэнтам. Ад рудога дыму, што ўсё яшчэ выматваўся з горлавіны і поўз па льсняна чорных сценках і потым колцамі злятаў са стабілізатара, у Захара слязіліся вочы. Адзін бок бомбы быў барвяна-сіні, быццам агонь біў адтуль, з сярэдзіны, і ад яго патыхала гарачынёй; драцяное вечка шкрабала стабілізатар, і ў сярэдзіне бомбы, як у бочцы, ажываў вясёлы гуд, быццам там, у сярэдзіне, нехта кратаў туга нацягнутую струну.

— Кідаем разам,— папярэдзіў Багдан і закамандаваў працягла: — Го-о-оп!

Яны кінулі пустую бомбу ля спарадных балванак, складзеных, як дровы, штабяльком і якія паспелі ўжо абыржавець. Разагрэты метал сіпеў, плавіў снег, белая пара па міг ахутала ўсю бомбу, потым стабілізатар выплыў з яго, быццам узнімаўся ў паветра па белай грывастай хвалі.

Багдан, выцягваючы з драцянога вечка калок, пакруціў бомбу, яна зачапіла стабілізатарам снарадную балванку, што ляжала пад снегам, і штабялёк пабурыўся, пустыя снарады пакаціліся з гулкім працяглым бомканнем, і Захару падалося, што ў сярэдзіне металёвага корпуса парвалася тая струна, якая звінела, калі яны неслі бомбу ад горна; ён нават прыгнуўся, быццам спрабаваў яшчэ злавіць вухам гуд дзіўнай струны, пачуў толькі ціхае сіпенне талага снегу. Снег цяпер добра растаў, і бомба быццам зменшылася, асеўшы ў глыб снегавой тоўшчы, размяклай і шэрай.

З будынiны праставаў Артур, пёр на выцягнутых перад сабою руках скрыню. Тол запоўніў яе не да самага верху, і ён, паставіўшы гэтую, апошнюю, скрыню побач з іншымі, пабедаваў:

— Крышку і не хапіла.

— Напішы фюрэру скаргу,— пажартаваў Захар.— Няхай большыя бомбы кідае.

Багдан заўважыў, распраўляючы стомленыя плечы і дыхаючы на ноўныя грудзі, сказаў, як бы падкрэсліваючы, што ён, Захар, гаворыць непатрэбшчыну:

— А чаго пісаць? Самі дойдзем. Мы з ім там пагаворым,— і раптам голас яго памякчэў, злосць у вачах знік-

ла: — А пакуль туды, дык мы зараз у Быстрыцу рванём. Ды сырадойчыку ўлупім,— ён зачэрпнуў у прыгаршчы снег, размяклы ля бомбы, цёр ім брудныя жылаватыя рукі, і твар яго дзіўна змяньваўся, вочы хітравата вузелі.— Дазвольце, таварыш камандзір, на вашым канёчку крутнуць? Мігам гарлач з сырадойчыкам тут будзе. І вам будзе добра, і на нас яно не паўплывае блага,— і адразу разбэшчаная іронія загучала ў яго голасе: — Усё жыццё тады буду памятаць, што на камандзірскім рысачку і я арлом лётаў...

З Багданавых далоняў скатваліся камячкі амаль чорнага снегу, сцякалі і падалі на дол буйныя кроплі бруднай вады, і Захар як не ў адкрытую, грэбліва перасмыкнуўся, зразумеўшы, што той хоча пагарцаваць па Быстрыцы на камандзірскім кані.

«Ох і гусар! О-ох і рвач!..»

Багдан як бы ведаў, што не дачакаецца дазволу ад Захара, але па ўсім было відаць, што ад свае, заманлівай для яго, задумы ён не адмаўляецца.

— А галоўнае, гаспадыньку маладую шкада. Яна ж, нас не дачакаўшыся, сырадойчык сама сюды прыпурыць,— і, акінуўшы доўгім позіркам поле і дарогу да вёскі, зірнуў на трафейны гадзіннік, начэплены на левую руку.— А навошта ж ёй ножкі маладыя гэткім грудам збіваць і ламаць,— і раптам вылаяўся: — Ну, халера, не чыкае дрэнь гэтая фрыцаўская зноў. Здохлі стрэлачкі. З чаго?

— Зразумець не можаш? — спытаў з уяўнай лагодаю Артур.

— Не магу. Але ж чыкалі, пакуль не здохлі.

— А цяпер не будуць. Бо ты ў гадзіннікавых справах — дуб.

— Э, лягчэй на паваротах,— Багдан выглядаў на трохі ачумелага, як бы сам яшчэ не верыў у тое, што пачуў.— Бо вуха тваё можа зрабіцца таўсцейшае за той дуб.

— Не аб дрэвах гаворка,— прамовіў Артур, вочы яго смяяліся.— Сэнс абрэвіятуркі, выяўляецца, не ведаеш. Файзуло як гаворыць? Дурань удывіцельна бальшоі: дуб, значыцца.

— Бяром па ўзбраенне гэты твой дуб,— Багдан не пакрыўдзіўся, з сілаю патрос гадзіннік, прыклаў руку да вуха; вочы набывалі ранейшы хітраваты выраз.— Чык-чык-чык,— і ў голасе загучала шчырая, нічым не азмрочаная радасць.— Па-айшоў, душа лубэзны! Ад Багданавай рукі, ведаеш, і мёртвы ў скокі пойдзе!

«Як у старога Кандрата рукі,— міжвольна і нечакана падумаў Захар, сам здзіўлены сваім неспадзяваным і непа-

трэбным адкрыццём.— У таго былі гэткія ж жылаватыя, учэпістыя...»

Старая, як закарэлая, непрыязнасць зноў варухнулася ў душы. Дзіўны, між іншым, у Багдана і позірк: усё разумее чалавек, бачыць, насмейваецца, ведаючы, што ўсё будзе гэтак, як яму асабіста хочацца. Захар неспадзеўкі зларадна надумаў: не, не заўсёды, галубок, табе будзе скрозь абломвацца, усё па тваім жаданні пойдзе!

Перамагло ў Захара зусім іншае, перамагло нечакана, але рашуча і канчаткова — хацелася пасядзець з Артурам, пагаманіць, каб побач не было гэтага чалавека, які абавязкова выкліча непрыязнасць, настроіць амаль варожа. Хай ідзе! Хай едзе ў Быстрыцу! Хай хоць у багну коціць, толькі не стаіць тут слупам, не свідруе сваімі нахабнымі вачыма!

— Можаш... — Захар стомлена махнуў рукою і з усмешкаю падумаў, што з ахвотаю даў бы Багдану за яго брахлівы сарказм выспятка ў азадак.— Толькі каня не гані! Чуеш? Як па сваім уласным, трухай! Павалу каб!..

— Ёсць! Ехаць, бы на сваім родным канёчку, берагчы і галаву і капыты. Ну, дарагі мой, рушылі патрошку...

Багдан амаль імгненна схапіў павады, лоўка і фарсіста ўскочыў у сядло, ласкава крануў з месца. Спачатку ён ехаў ціха, час ад часу азіраючыся, быццам збіраўся пачуць ухвальнае слова за тое, што дакладна выконвае загад. Але, крыху праехаўшы, гігікнуў, прышпорыў каня і памчаў.

Захар прасачыў за белым воблачкам пылу, што віссеў, раставаў пакрысе над дарогай, але аніводнага слова ў Багданаў адрас не прамовіў. Заклапочана параіў Артуру, які асклізнуўся на расталым снезе і ледзь не бразнуўся на дол:

— Ты цяжкія скрыні дарэмна валачэш. Хай гэты цягае, ён, бачу, не вельмі тут і пацее.— Захар мыском бота падгроб снег да бомбы; гарачы метал засіпеў, белая пара, цяпер радзейшая, закруцілася вакол пагнутага стабілізатара, зноў ствараючы ўражанне, што бомба не ляжыць на месцы, зрушылася, узнімаецца ў паветра.— Пасля рапення крышку пасцеражыся. Хіба Часлава табе гэтага не казала?

Артур ляноціна адмахнуўся:

— Пацеха, а не варэнікі, як Гнацюк кажа. Усе — раяць. Усе — клапоцяцца! Не-е, з Багдана мне трэба прыклад браць. Ён усялякім парадам — выспятка ў азадак. І — будзь здароў!

— Дурында! — у Захаравай глотцы нешта аж ціха прысвіснула.

— Ён ці я?

— Ты. І скажу чаму. Каму зайздрыў? Ды ён жа сам у сябе ўсю сваю радасць скраў. Кульнуў яе пад адхон...

— Можа, з таго ён гэткі і вясёлы?

— Ды які ж ён вясёлы? Ён цяпер усю сваю нескладуху ў фатыгоўства хавае. Няўжо не бачыш?

— Палохаюць мяне, палохаюць нескладухаю!

Захар шчыра ўздыхнуў:

— Яна для вока маладога, без вопыту, невідочна. Гэта ты май на ўвазе.

— Нічога, нажывём вопыт!

— Ведама, нажывеш...

Захар зноў падгроб ботам снег да бомбы. Вылузнуўся з мокрага цёмнага месіва ўломак цэглы, ён пашараваў яго падэшваю. Самі па сабе нарадзіліся параўнанні, якія карцела выказаць Артуру адразу, выказаць у форме бязлітаснай і сяброўскай. Жыццё чалавечае, маўляў, не цэгла, з уломкаў якіх шчэ можна нешта і збудаваць,— тут, калі ўжо зламаў, дык не склеіш, не зробіш нанова; і здароўе ў чалавека адно-адзінае на ўсё жыццё, і да яго трэба ставіцца з яшчэ большай ашчаднасцю, бо яго калі ўжо ўдруз расшкуматаў, дык не складзеш, нічога добрага з уломкаў яго не збудуеш — усё жыццё абрыдне, ніякая радасць у сэрца не праб'ецца.

Доказна, здавалася, усё склалася, неракапаўча. Але спыніла развага, якая незаўважна і цалкам праглынула доказнасць і нават мэтазгоднасць задумы. Што яму, Артуру, з твае неракапаўчасці? Каго ён слухаў, калі закахаўся ў Рыму? Толькі сябе. Каго ён слухаў, калі адмовіўся ляцець насля ранення за лінію фронту? Толькі сябе. Каго ён слухаўся, калі, яшчэ зусім саслабелы, пайшоў сюды, да горна, узяўся плавіць тол? Толькі сябе. Штодня, ведама ж, ён знаходзіў у сваім сэрцы свае доказы, свае перакананні, і яны бралі верх над усёй сталай і мудрай развагаю, над яго, Захаравым, вопытам. Але ж гэта толькі частка з таго, калі твой вопыт, тваё веданне жыцця не бралася пад увагу ім, маладым, і ён не памыляўся. Ён дакладна разгадаў патаемнае жаданне Захара трымаць яго надалей ад Рымы, потым жаданне адправіць у тылавы шпіталь, потым не пусціць сюды, да кавальскага горна... А ўсе яго, Захаравы, жаданні былі прасякнуты толькі адным — уберагчы ад бяды. А хто ведае, дзе чакае чалавека бяда?.. Э-э, не, дружа! Гэта ўжо тэма не новая ў тваіх развагаханнях, ты не раз і не два прымушаў сваё сэрца корпацца тут, нудзіцца, пакутаваць, нічога добрага не знаходзячы, апрача болю і пакут...

— Ці не Багдан імчыць? — выгукнуў Артур і тут жа дадаў у захапленні, радуючыся, што знайшлася магчымасць схавацца ад навучанняў, не спрачацца з камандзірам атрада і

це злавэць яго: — Ён! І гарлач цурыць! У руцэ, у левай руцэ трымае!

І гэтая шчырая, ніяк не схаваная радасць была як бы адказам на ўсе павучанні, на ўсе выказаныя і яшчэ не выказаныя патрабаванні, і Захар чамусьці з горыччу падумаў: «Пляменнік твой даўно дарослы і самастойны чалавек. Пад уплыў Багдана ён не трапіць. Колькі шчэ ты будзеш сабе гэта даводзіць?!»

Здаля даляцеў мяккі тупат капытоў, вясёлая песня, якую гарланіў на ўсё поле Багдан, і Захар нечакана ўголас засмяяўся, адчуўшы і канчаткова зразумеўшы наіўнасць свае спробы запатрабаваць ад Артура будаваць сваё ўласнае жыццё па вучнёўскіх мерках, якія жорсткі час пазломваў, перавярнуў даўно і адкінуў.

## 11

За кудлатымі вербамі, што ад самага млына цягнуліся паабапал рэчкі да самага возера — возера з трох бакоў было атулена лясамі, а з чацвёртага падціснута рэчкай і драўляным будынкам старога млына,— увесь час бегла вялізная амаль аранжавая поўня, і ад яе святла незамерзлая вада за вадазлівам выдавала далёкай і загадкавай, бы чорная прорва. Там, у той прорве, зацягнутай па краях белымі туманнымі кудламі, гучала ціхае бомканне, і Захар не адразу здагадаўся, што гэта звініць лёд, які плынь крудзіць і малоціць аб вызубраныя закраіны палонкі. Ён чуў яшчэ, як па той бок плаціны, у драўляным будынку млына, з кімсьці хмурна гаворыць Шлык, як хтосьці лена яму пярэчыць. Нечакана ўзнікла памяркоўная, без напружання, сварка, і Захару яна была добра чуваць.

«Вайна ўсё спіша».

«Каму — спіша. А каму і запіша».

«А хай па кожным баку маім піша, нават на пятках! Абы — да перамогі дажыць!»

«Дажыў, будзем лічыць. А далей?»

«Далей, бацька? Ну-у, дзівіш ты мяне сёння!»

«Бачыш? А сам і не ведаеш!»

«Вельмі нават добра ведаю! Далей — сонца, бацька! На сто гадоў сонца будзе людзям у хаты. На тысячы гадоў — сонца!»

«Гэта — людзям. А ты, дажыўшы да таго светлага дня, што робіш асабіста?»

«Я?.. Тыдзень вось тут, на беразе ля млына, пузам уверх

буду ляжаць і песні спяваць. Нагой шчэ ў вадзе пабоўтаю. Але — зрэдку, каб пяткі не падгарэлі!»

«А млын?»

«А што млын? Хай круціць жорны і мліва дае. Вада, як ведаеш, не стамляецца».

«Адкуль жа тое мліва, калі ты — ляжыш?»

«Стой, бацька! Гэта — другі пункт гаворкі!»

«Раўней, прашу цябе, кладзі. Раўней, каб людзям потым не перараблялі».

Галасы зглухлі, нехта ціха пасвістваў у млыне, зрэдзь часу нешта бразгацела там, па той бок вузкай плаціны. Захар быў цяпер нібыта адгароджаны ад усіх гэтых гукаў, жыў толькі адзінай мелодыяй радасці, якая зноў абудзілася ў душы.

«Добры яна мне ліст прыслала. І галоўнае — прыслала!»

У тых кароткіх радках, якія ён прачытаў перад пачаткам нарады ў штабе брыгады, нічога новага, як і ў папярэднім лісце Гайдаш, не было: жывая, маўляў, здаровая, ірвецца сюды, у атрад. Але гэтыя будзённыя і простыя словы як бы нанава нарадзілі яго на свет, перайначылі ўсё, перарабілі, і ён, яшчэ не зусім верачы ў тое, што гэтак уладарна ўварвалася ў яго душу, пачынаў разумець, што гэты выбух спеў у ім даўно, прарастаў і набіраў сілу з таго імгнення, калі кволая постаць Гайдаш растала ў шэрані за Дзвіной; ён разумеў яшчэ, што надзея на гэты выбух жыла, але ён усяляк гасіў у сабе гэтую надзею, хоць часам і даваў ёй волю, не пярэчыў, каб яна жыла ў сэрцы.

Калі пачыналася нарада ў штабе брыгады, неба было хмарнае. Цяпер жа нечакана апагодзілася, моцны паўночны вецер за нейкую гадзіну разадраў густую туманную коўдру, і ў чорнай высі, якая адкрылася паўсюль раптоўна і наблізілася, імкліва несліся кудлатыя хмары; паміж імі, у чорных вокнах чыстага неба, зіхацелі буйныя, дзіўна белыя зоркі і таксама не стаялі на месцы, а рухаліся, як бы ўвесь час адплывалі, не губляючы свайго зіхатлівага белага бляску.

Захар ведаў, што гэта падман зроку, што зоркі нерухомыя, а імкліва імчаць сівыя, як з пены, драныя па краях хмары, і сачыў не за імі, а за тымі зыркімі кропачкамі святла, якія ўзнікалі нечакана і нанова, і дзівіўся іх імкліваму руху, няспыннаму і бясконцаму, і сам быў у палоне магутнага дзівоснага парывання.

Раней яму ўвесь час здавалася, што ён імкліва, як вось гэтыя белыя кроплі мігатлівага зорнага святла ў чорных прагалах між хмар, ляціць у нейкую прорву, ляціць няспынна, і гэтае адчуванне жыло з ім, калі ён удзельнічаў у баях, калі

займаўся рознымі арганізацыйнымі і гаспадарчымі справамі атрада, калі вучыў людзей, якія нядаўна прыйшлі ва ўзводы, біць ворага; ён звычайна клаўся адпачываць і ўзнімаўся ў новы дзень усё з тым жа адчуваннем гэтага бясконцага руху. Горыч непапраўнай страты — а яна ва ўсе дні невыводна жыла ў ім! — з сэрца не знікла і цяпер, але ў Захара з'явілася такое адчуванне, што гэты рух запыніўся і пачаўся новы рух, зусім у іншым напрамку, не ўніз, у тую чорную і неаглядную прорву, а ўверх, да святла, да сонца, і сіла гэтага руху была моцная і ўладарная, і ён, апіяк не адкідаючы старую горыч, не толькі падпарадкоўваўся гэтаму руху, але і сам усёй душою прагнуў яго.

— Моцны дужа вецер. Гэта кепска...

Захар схамянуўся, убачыўшы побач з сабою Шлыка і пачуўшы яго голас. Спытаў, хоць яшчэ не адключыўся ад сваіх разваг і добра не сцяміў, што да чаго ў Шлыкавым запытанні:

— Кепска, гаворыш?

— Але... Садзіцца самалёту цяжка. Узлятаць лягчэй. А вось сесці — цяжка.

Захар толькі цяпер даняў: пра самалёт гаворка, пра той самалёт, на якім павінен прыляцець сёння ноччу Ціхан. Ён зыркнуў на аранжавае кола поўні, якая па-ранейшаму скакала па верхавінах вербаў, і падзівіўся з магутнага падману зроку. Вецер гайдае голле вербаў, а ўражанне зусім іншае і дужа ж моцнае — кола поўні скача па тонкіх, гнуткіх галінах. А цяпер вось адарвалася ад макавінак, як адштурхнулася ад вербаў, паўзе ўвышыню.

— А ты ўсё пахваляўся: сігнальная сістэма, маўляў, сігнальная сістэма. Калі хочаш — самалёт пасадзім.

— Гэтак і ёсць!

Захару карцела жартаваць, і ён сказаў смехам:

— Ромель усяму галава. Каб не ён — дроўцы б палілі.

— І без яго б абышліся. І без яго б паладзілі,— хмурна, пакрыўджаны сяброўскай шпількаю, сказаў Шлык.— І гэткага, як у нас, ідзе ў іншых брыгадах няма. Хочаш — з млына адключы і ўключы. Хочаш, калі нявыкрутка,— на возеры. Гэта не вогнішчы запальваць ды тушыць...

Пра новую сігнальную сістэму на брыгадным аэрадроме Захар ведаў даўно — яна жывілася ад дынама-машыны, якую з дапамогай Ромеля адновілі на гэтым старым млыне. Ведаў і тое, што да гэтай працы Шлык далучыўся даўно — адразу ж, як толькі вярнуўся з-за лініі фронту. Даведаўшыся пра смерць жонкі, ён зрабіўся нейкі неўраўнаважаны, кідаўся на ўсе заданні, прасіўся ў кожную групу, якая ішла ў разведку

ці па чыгунку, і паводзіў сябе там не проста рызыкоўна, а безразважна, быццам знарок падстаўляў сябе пад кулі. Захар зразумеў, што трэба ратаваць чалавека, і папрасіў Гусарава даручыць Шлыку абслугу брыгаднага аэрадрома, і той на гэта пагадзіўся адразу ж, без ваганняў, нічога не распытваючы.

Шлык паспакайнеў тут, на аэрадроме, уцягнуўся ў працу, ухапіўся за ідэю аднавіць дынама-машыну, якую нагледзеў у старым млыне. Ідэя ж падключыць да гэтай працы Ромеля належала Шлыку, і Захара напачатку гэта дужа здзівіла, ён нават апасаўся, каб не прыключылася якога самасуду, усяляк супраціўляўся, пакуль не атрымаў строгі загад Гусарава часова адкамандзіраваць Ромеля з разведузвода атрада ў распараджэнне Шлыка, які цяпер займаў не зусім звычайную ў партызанскіх умовах пасаду — камандзір аэрадрома.

Захару кінулася ў вочы, што Шлык па-свойму ўспрыняў яго маўклівую развагу, пакрыўдзіўся. Захацелася неяк рэабілітаваць сябе, і ён, са смяшком, сказаў шчыра і даверліва:

— Гэта я ўсё знарок, дарагі Велізар. Гусараў кажа, што мне вымову трэба даваць: гэткага, маўляў, высокага майстра, як Шлык, дагэтуль хаваў! І людзям не паказваў!

— Цяпер — майстар! А напачатку ж і слухаць не хацеў, калі я пра дынама гаворку завёў. «Сыты байкамі! Сыты!»

Шлык досыць ёмка і ўдала перадражніў Гусарава, падробіўшы яго голас амаль дакладна, і Захар развесяліўся:

— І я, прынамсі, не дужа-ткі веры́ў. Электрычная сігналізацыя замест вогнішчаў? Заманліва! Але ж — з чаго? Як? На байку, ведама ж, было падобна.— Захар ухваліў сябе, зразумеўшы, што робіць правільна, не таячы свайго былога недаверу да Шлыкавай задумы аднавіць на млыне дынама-машыну.— А цяпер — схіляю галаву. Можа, уключыш? Раптам самалёт не прыляціць, дык хоць пабачу на свае вочы, як яно, гэтае тваё дзіва, свеціць...

— Не ўжо! Сваю ручку прыкладзіце. Каб у другі раз сумненняў не склалася. Каб не думалася, што чартаўшчына тут нейкая робіцца...

Густая Шлыкава барада ад святла поўні льснілася, блішчастымі былі і вусы, доўгія, загнутыя ўніз. Палагаднелі, здаецца, і вочы, у якіх, калі ён быў у атрадзе, асела адчайная туга, вачніцы тады здаваліся чорнымі ямінамі, у якіх не было вачэй. Захар наважыўся быў пажартаваць, што праца на аэрадроме пайшла Шлыку на карысць, а вопыт з аднаўленнем дынама-машыны прыдасца пасля вайны, калі пачнецца аднаўленне, але спахапіўся і прыкусіў губу. Напамінак пра

аднаўленне, пра будаўніцтва пасля вайны абудзіць у Шлыкавым сэрцы боль даўняй бяды і боль бяды блізкай, якую давялося перажыць не вельмі даўно, калі ён даведаўся пра трагічную смерць жонкі.

Яны перайшлі масток цераз вузкую плаціну, спыніліся ля дзвярэй млына, і Захар сказаў весела:

— За давер — дзякую. Але ўжо зволь мяне — сам уключай, калі ласка.

— Ды проста ж усё. Рубільнік толькі націснуць. Ромель пакажа гэта.

— Дзяжурыць ён ля таго рубільніка?

— Не, запасны пульт правярае. Рубільнік у нас запасны будзе. Сто працэнтаў гарантыя!

Захар прамовіў з робленай бояззю:

— Ну-у, калі ўжо і запасны пульт, дык я і ўвогуле не дакрануся. Раптам націсну — не загарэлася. На каго тады ўсе шышкі? Захар, маўляў, па цікаўнасці сапсаваў. Так што — сам дзейнічай!

Шлык знік за дзвярыма млына, і тут жа па возеры пыхнуў ланцужок жоўтых і чырвоных агнёў. Агні згаслі, зноў запаліліся, гарэлі імгненне, але святло іх уразіла гэтак моцна, што Захар нават быў падумаў, што ўсё гэта яму намроілася, што давялося ўбачыць нешта зусім нерэальнае.

З млына выбег Шлык.

— Алес прыма? — коротка і ўрачыста спытаў ён.— Праўда ж, здорава?

— Здорава? Не тое слова, дарагі таварыш камандзір аэрадрома,— у шчырым захапленні прызнаўся Захар.— Казачнае відовішча. Вочы ж адвыклі ад электрыкі. А тут — гарыць. Табе кожны скажа: казачнае відовішча! Між іншым, некалі ж было: вісіць сабе лямпачка, як сонца свеціць, а ты і не заўважаеш. Але ж я, прызнаюся шчыра, не думаў, што ты гэткі цягавіты. І настойлівы!

Шлык быў задаволены ўхвалою, але прыняў яе, як і належыць сапраўднаму і вялікаму майстру,— сціпла, нават раўнадушна.

— І не параўнаеш жа з вогнішчам,— сказаў ён памяркоўна, быццам гаворка ішла пра нешта дробязнае, зусім не вартае сапраўднай і вялікай увагі.— Вогнішча як схаваеш умэнт, калі фрыц наляціць? А тут — тэхніка. Зараз Ромель запасны рубільнік праверыць.

— А навошта запасны? — спытаў Захар знарок, каб працягнуць гаворку, якая Шлыку была вельмі па душы.

— Трэба, каб ужо надзейна. Самалёт пойдзе садзіцца, а

ў нас, крый божа, нешта нарвалася. Рызыкаваць тут нельга... Во, свеціць!

Зноў за цёмнай сцяной пасохлага чароту на белай азёрнай раўніне, якая адсюль, ад дзвярэй млына, амаль не загароджвалася шатамі старых вербаў, двойчы запаліліся каляровыя гірлянды. Захару зноў, як і перад гэтым, падалося, што ён убачыў не сігнальныя лямпачкі партызанскага аэрадрома — цяпер, у зімовы час, яго перанеслі на возера,— а далёкі і незнаёмы горад.

«Горад, дзе нарадзілася Гайдаш...»

Ён змружыў вочы, і думкі лёгка, без усялякага напружання перанесліся ў той горад, які намроіўся яму сярод сігнальных агнёў партызанскага аэрадрома на белай роўнядзі возера. З гэткай жа лёгкасцю ён уявіў сабе вулкі, па якіх хадзіла Гайдаш, і яму здалося, што ён і сапраўды апынуўся ў тым горадзе, што побач ціха крочыць Гайдаш, але нічога не гаворыць, нічога не тлумачыць. Не, цяпер яна нешта гаворыць, і гаворыць неяк узбуджана, быццам злуе, што ён слухае і не разумее яе... І глядзіць з асуджэннем, строга вельмі і патрабавальна.

Уяўленне было гэткае выразнае, што ён здрыгануўся, пацёр вочы і сапраўды пачуў рэальныя, не прыдуманыя ім галасы, але сярод іх голасу Гайдаш не чулася — рухаліся па дарозе да млына развалкі, і на іх гамանілі. За сцяной чароту, на белай раўніне возера, ужо аніякіх агнёў не было, яны згаслі, і ён не заўважыў, калі гэта здарылася. Дзівосны горад, які Захар збудаваў у сваім разгарачоным уяўленні, разбурыўся, і ён не сіліўся аднавіць яго.

Па дарозе, што лягла па ўзгорку, які быў добра высветлены поўняй, рухаліся развалкі, і цяпер іх ужо добра было відаць, і ўсё выразней чуўся мяккі тупат капытоў, рыпенне снегу пад палазамі, галасы людзей. Здаецца, Чаславы голас чуцен? Так, яна гэта — вязуць параненых да самалёта. Але ж як Шлык там апынуўся? Толькі ж тут быў, ля млына, а ўжо на дарозе стаіць, і Часлава з ім гамоніць...

Захар паднёс гадзіннік пад самыя вочы. А першай жа гадзіне самалёт чакаюць. Гэтулькі часу наперадзе, а яна, Часлава, параненых ужо вязе. Загадана ж даставіць пад самы прылёт, каб не мерзлі людзі. А яна — усхапілася, усё не церпіцца... І яшчэ адны развалкі едуць, а за імі і трэція. І зноў гэты глухаваты, як здушаны, Шлыкаў голас! Чаго ён там мітынгуе, гэты аэрадромны камандзір? Здаецца, патрабуе нешта ад Чаславы?.. Так, патрабуе павярнуць развалкі ў вёску... А навошта? Каб потым зноў сюды коней гнаць і людзей марозіць?

Захар, амаль подбегам, кінуўся да першых развалак, якія спыніліся перад павароткаю ўпіз, на бераг ракі — усцяж ракі ішла дарога па возера,— потым запаволіў хаду, пайшоў нетаропка, нават не прыслухоўваючыся да галасоў. Наблізіўшыся да развалак, наважыўся быў пасварыцца — якая патрэба была гэтак рана людзей параненых па мароз са шпіталя выпіхваць?! — і, заўважыўшы на развалках зусім не дарослыя постаці, а нейкія маленькія, якія былі захутаны ў цёмныя лахманы і вытыркаліся з-пад сена, прыцярушанага снегам, асекся, спытаў развалліва і памяркоўна:

— Што тут у вас? Пароць гарачку пачалі... Загад жа ёсць!

Часлава сказала хутка, паспешліва:

— Гэта — дзеці. Мы ж дзяцей вязём. З дзіцячага дома. Параненыя ляцець адмовіліся, усе ў адну дудку: заўтра паляцім. А дзяцей — сёння адправіць.

— З дзіцячага дома? Іх жа ўсіх адправілі.— Захар усё яшчэ не дапяў як след, пра што гаворыць Часлава.— У снежні адправілі дзяцей...

— Гэта не тыя. Гэтыя — з горада Лядаўна. Фашысты бралі кроў у іх для сваіх параненых. Потым — у роў ля Дзвіны. Разведка іх і ўратавала...

— Разведка?.. Наша?.. Хто ж туды, у горад, пасылаў? — Захар злаваў. Ён жа ўчора аніякіх распараджэнняў не даваў, калі выпраўляўся ў штаб брыгады. А разведка, выяўляецца, за Дзвіну пайшла, дзяцей уратавала. Яго камандзірскі загад даставіць параненых на аэрадром а дванаццатай гадзіне пехта ўжо адмяніў, і ён пра тое таксама пакуль што нічога не ведае дакладна.— Хто вадзіў разведчыкаў?

— Пажога вадзіў. Але дзяцей Багдан знайшоў. Ён спачатку ў Запалоцце адзін хадзіў.

— А хто яго туды, у горад, пасылаў?

— Вам Пажога ўсё дакладна раскажа. Я толькі тое ведаю, што нешта там, на чыгунцы, у іх не ўдалося. Багдан тады самастойна рушыў у горад. Не ведаю, як ён там, ля рова, апынуўся, не ведаю...

— Самастойны скрозь, гэты Багдан твой.

— Ён не мой,— адсекла Часлава.— Хопіць мне яго на шыю саджаць!

— Хто ж яго табе саджае? Самі вы там усё мудрагеліце...

Пад'ехалі яшчэ адны развалкі, трэція, і Захар, не жадаючы, каб хто-небудзь іншы чуў іх размову з Чаславай, спытаў, нагнаўшы ў голас загадную заклапочанасць:

— Колькі малых тут?

— Дванаццаць. Знясіленыя жахліва. Нават на ножках стаяць не могуць.

Захар, угледзеўшыся, спытаў цяпер разгублена, адкінуўшы сваю загадную заклапочанасць:

— Ці не памарозілі вы іх дарогаю? Здаецца, не варушацца зусім. Аніхто.

— Яны спяць. Мы іх малачком цёплым у атрадзе паілі. Вось і спяць,— і павярнулася да Шлыка: — Чакайце, тут жа, на млыне, цёпла. Дык навошта ж тады ў вёску? Туды ды назад ганяць. А тут яны сагрэюцца...

Шлык адразу пагадзіўся, замітусіўся:

— Праўда ж, навошта нам на марозе малых цягаць? Камора цёплая, адразу сагрэюцца, паспяць. А тады — у самалёт...

Дзяцей зносілі ў камору, дзе ў свой час памольшчыкі складвалі мяхі са збожжам. Калі рамантавалі і наладжвалі дынама-машыну, тут зрабілі майстэрню, ацяплілі яе — прабілі ў сцяне акенца і ў яго вывелі, гнуты ў два калены, бляшаны комін ад грубкі, змайстраваны з бочкі ад саляркі, павесілі пад столлю электрычную лямпачку, і цяпер яна мігатліва асвятляла маленькае памяшканне.

Захар выцягнуў з сена тоўсты, але дужа лёгкі згортак, перавязаны кавалкам ляйчыны, узняў яго на рукі. Уваходзячы ў камору, ён нахіліўся, каб не стукнуцца галавой аб вушак, прыціснуў згортак да сябе, і тады ў глыбі яго, пад адзеннем, зварухнулася жывая істота, і слабы хлапечы голас паклікаў:

— Та-а-атачка!

Сцены і падлога каморы гулі і дрыжалі ад гулу вады і трансмісіі, што працавалі за сценкаю ў дальнім канцы млына. Але Захару — ён апусціўся на калені — падалося, што дрыготка ідзе з яго ўласнага, Захаравага, нутра, што ў яго ўласнай сярэдзіне ўсё гудзе і дрыжыць; гарачыня шуганула ў скроні, і каляныя абручы знаёма перацiснулі галаву.

Цяжка дыхаючы, Захар паклаў згортак на падлогу, схіліўся над ім, ліхаманкава, з нейкім незразумелым жахам пачаў развязваць ляйчыны, потым развінуў драную хустку, канцы якой былі завязаны ў хлапчука над пахаю. Захар не бачыў, як у камору партызаны заносілі другіх дзяцей, не заўважаў нават, калі занеслі іх усіх. Потым як адкрыўся ў яго зрок, і ён бачыў, як Часлава лоўка і хутка развязвае рознага колеру і памераў хусткі і нейкія лахманы, якімі былі ўкручаны дзіцячыя галоўкі, чуў галасы і са здзіўленнем заўважаў, што ўсё вакол зноў успрымаецца ім неяк атуманена, замаруджаным, як не сваім слыхам: чуе галасы і не разумее

іх, бачыць рухі Эсіных рук, спрабуе рабіць усё гэтак жа, а ў яго нічога не атрымліваецца, доўгія махры хусткі выслізгваюць, не паддаюцца, усё больш і больш заблытваюцца. Не, урэшце! Адвязалася, спаўзла, як адвалілася, хустка!..

Стаіўшы дыханне, ён да болю ў вачах углядаўся ў худзенькі, з вострым носікам тварык, на якім чарнелі вузенькі і незнаёмы, ніколі раней не бачаны, сярпок губ і цёмныя правалы вачніц. Хлопчык спаў і, відаць, мармытнуў роднае яму слова, наклікаў татку праз сон. Але Захар прагна слухаў, чакаючы, што нешта пачуе і яшчэ, углядаўся ў палахлівыя цені на шэрых, як попелам пасыпаных, шчоках і адчуваў цяпер толькі боль у каленях і трымценне падлогі, няроўнае нейкае, з перападамі, што аддавала ў паясніцу.

Захар узняўся і, перасіліўшы немачнасць у нагах, зрабіў крок да дзвярэй. Рыпенне старых завесаў — ён адчыняў дзверы асцярожна, апасаючыся пабудзіць дзяцей, што спалі ля сцяны на падлозе — супала з колкім болем у сэрцы, і ён міжвольна прыціснуў правую руку да грудзей, спрабуючы яго супяць, зменшыць.

Партызаны — сядзелі на разваллках ля млына і курылі,— заўважыўшы Захара, дружна ўскочылі і сталі, быццам у чаканні нейкага загаду. Захар, узіраючыся ў срабрыста-белую ў святле поўні роўнядзь возера, дужа блізкую і гладкую, як стол, папытаў, ці не ляціць самалёт, пачуў дружны адказ, што нічога пакуль што не чутно, і моўчкі падыбаў далей.

За вербамі дарога крута вярнула ўправа, у шырокую бясконцую палосу пасохлага чароту і трыснягу, і ён, увайшоўшы ў яе, спыніўся, быццам адкінуты назад моцным парывам ветру з белай раўніны. Кудлатыя мяцёлкі трыснягу матляліся на тонкіх высокіх сцяблінах, быццам няспынна прыгладжвалі, змяталі снег з крывых, пагнутых і надламаных чарацін, і яны гнутка выслізгвалі з-пад гэтых мяцёлак, выпростваліся і зноў згінаміся, і драўляны шоргат пасохлых сцяблін змешваўся з мяккім шалахценнем зярністага снегу, які дуйка несупынна гнала, несла з возера сюды, пад бераг.

Зледзянелыя мяцёлкі хвастанулі Захара па твары, і снег пачаў раставаць на лбе. Халодныя каляныя кроплі каціліся па веі, расплываліся па шчоках, і нейкая туманная смуга засцілала вочы, і ўсё наўкола неяк зыбалася і дрыжала. Але Захар упарта пёр і пёр наперад, гнаў сябе без мэты, ярасна, з адчаем падстаўляючы твар пад удары колкіх зледзянелых мяцёлак трыснягу; ногі ўсё часцей блыталіся ў сплячэннях чарнаватых сцяблоў, перакручаных ветрам, прысыпаных снегам, і, урэшце, ён трывала зачапіўся правай нагой і грым-

пуўся на зыбкі пласт, выцягнуўшы наперад рукі, быццам заграбаючы пад сябе дарогу, якую не змог адолець.

З посвісту ветру, з шалахцення пасохлых чарацін і мяккага шорхання сыпкага, крохкага снегу зноў склаўся далёкі, заглушаны покліч «та-а-атачка!», зноў усплыў, выразна стаў перад вачыма Захара выраз схуднелага дзіцячага тварыку, зморшчанага, як бы зleпленага з шэрай гліны. І чамусьці менавіта тут, пад зорным і чыстым небам, на гэтай адзіноце сярод тужлівых пошумаў ночы, Захару зноў, але з выразнасцю незвычайнай, адкрылася простая і горкая праўда яго ўласных страт, і ён, як ніколі раней, яскрава ўбачыў тую неадольную мяжу, што лягла паміж яго мінулым і сучасным, мяжу, якую яму ніколі, мабыць, не суджана закрэсліць ці перайсці; усё тое, што раней было толькі ў гадзіны абвостранай пакуты, цяпер ён спасціг астуджаным розумам, і новы боль, яшчэ больш жахлівы, чым той, які яму даводзілася перажываць, ударыў у сэрца, і ён зразумеў не толькі няўмольную непазбежнасць гэтага болю, але і тое, што гэты боль ён разлічвае цяпер узваліць і на сэрца другога чалавека — на сэрца Гайдаш.

«Але ж ці ёсць у мяне на гэта права? Ці маю я права перакладаць хоць часцінку свае ўласнае пакуты на плечы чужыя?..»

Запытанне, якое насіў у сэрцы і аб існаванні якога добра ведаў, ён цяпер паставіў перад сабою бязлітасна, з адчаем. І адказу не шукаў і не чакаў. Не шукаў і не чакаў, бо проста не хацеў іх чуць нават са сваіх вуснаў.

Нечакана для самога сябе ён зрабіў адкрыццё дзіўнае, і быў ім жахліва ўражаны: боль, што працінае яму сэрца зараз, зусім не падобны на той боль, які даводзілася пераносіць раней; у ім, гэтым болю, няма адчаю, ёсць чоткае разуменне таго, што гэта ўсведамляе і другі чалавек і што ў яго, Захара, няма, не было і не будзе права аддзяляць свой боль ад болю іншых людзей, тых бацькоў, якія не ведаюць, дзе іх дзеткі і што з імі дзеецца, не было і не будзе права аддзяляць свой уласны боль ад болю гэтых маленькіх істот, якія ляжаць у каморы старога млына і верацы у шчаслівы лёс сваіх бацькоў; у яго, Захара,— і гэта была дужа важная часцінка адкрыцця, якое ён зрабіў,— няма, не было і не будзе права сумнявацца ў тым, што Гайдаш не зможа яго зразумець у гэтых яго сумненнях і гэтым яго адкрыцці, што яе другі ліст трэба толькі разумець так, а ніяк не інакш.

«Гэта праўда! І няма аніякай патрэбы сябе мучыць!..»

Ён цяпер ні пра што не думаў, ляжаў нерухома, і дуйка пакрысе заносіла яго снегам, і ён чуў, як шамаціць па ску-

рапцы снегавая крупа, як над самым вухам пазойліва і басавіта стогне і гудзе ад ветру зламаная сухая чараціна. Ён вобмацкам знайшоў яе, націснуў, і чараціна суха хруснула. Але басавіты гул не спыніўся, памацнеў, каціўся цяпер долам і з высі, і Захар ускочыў.

«Самалёт!.. Над возерам ляціць самалёт!..»

Ён прагна абсачыў позіркам чорную высь неба, нічога там не ўбачыў, апрача зорак і поўні, якая цяпер была нейкая цьмяная, бы заштрыхаваная бляклай фарбаю, потым зрабіў крок наперад, а потым, адкідаючы рукамі гнуткія шархоткія сцябліны, рынуўся не па старых слядах, а напрамкі, праз чарот, у той бок, адкуль вецер гнаў гул матора. Дзіўна блізкія, запаліліся сігнальныя агні, і Захару на міг падалося, што яны, часам правальваючыся ў снегавыя гурбы, коцяцца яму насустрач. Не, яны далёка, гэтыя сігнальныя агні. Дакладней, не далёка, а з правага боку. Матор цяпер грыміць на высокай і працяглівай ноце — сеў, значыцца, самалёт. Так, вось рухавікі ўвогуле выключылі, агні згаслі...

«Праваропіў пасадку, расцяпа!..»

Захар, раззлаваны ўшчэнт, выбег з чароту — ён, аказваецца, ляжаў на самым краёчку палосы пасохлага чароту — і адразу ўбачыў самалёт. У-ух! Ён жа блізенька зусім, падобны на дзіўную вялізную птушку, што расправіла крылы перад узлётам! І здаецца, што і людзі ля яе стоўпіліся — Шлык, відаць, са сваёй камандаю. А ён, Захар, спазніўся. Быў жа бліжэй ад усіх да сігнальных агнёў, а вось жа змудрыўся спазніцца. Крыўдна!

Захар ірвануўся наперад, двойчы паваліўся, але імгненна ўскокваў і, выбіўшыся на цвёрды, абдзьмуты вятрамі лёд, памчаў да самалёта з усяе моцы, з кожнай хвілінаю радуючыся ўсё больш і больш. Ён ужо бачыў, што ля самалёта нікога няма, што ён не спазніўся, нават апярэдзіў людзей, якія беглі цяпер з боку млына. Так, ён раней ад усіх дабяжыць да самалёта! Вось яно, чорнае доўгае тулава, і ён, Захар, дакранецца да яго першы! Дзіўна, шмат жа разоў сустракаў самалёты, што прылягалі з-за лініі фронту, а вось гэткага адчування радаснага ніколі раней не было. Не, хлусіш, дружа! Штораз, як толькі пачуеш гул матора, убачыш абрысы знаёмых крылаў, нешта адразу іначыцца ў сэрцы, аж слёзы на вочы!.. А сёння ж — Ціхан прылятае!

Ён пазнаў Ціхана адразу, як толькі той саскочыў з куртатай лесвічкі, якую апусцілі з самалёта, кінуўся да яго з абдымкамі. Адчуў незнаёмы пах табакі, машыннага масла — гэтыя пахі ішлі ад каўняра кажуха, які быў на Ціхану не-

зашпілены,— адчуў нешта новае і незнаёмае ва ўсёй Ціханавай паставе.

— Здароў, здароў, дарагі. Абдымкі — потым,— неяк суха, быццам быў вельмі незадаволены абдымкамі, прамовіў Ціхан і ўзяўся —нібыта адпіхнуў Захара — зашпільваць кажух.— Усе — на выгруз!

Захара пакрыўдзіла сухаватасць сустрэчы, сухаватасць падкрэсленая, зусім непрыхаваная. Гэтулькі ён чакаў Ціхана! Чакаў той мінуты, калі пабачыць яго ўзрадаваны твар, пачуе дабрадушны і ўпэўнены голас... Як падмянілі Ціхана! І гэты штуршок рукой...

Захар разгубіўся і знямеў. Але разгубіўся і знямеў не ад руху Ціханавай рукі, падобнага на штуршок, не ад незнаёмага аблічча, нейкіх чужых пахаў, якія ішлі ад Ціханавага адзення,— убачыў дзяўчыну, якая саскочыла на лёд возера.

«Гайдаш?! Яна! Яна прыляцела!»

Сухая палыновая гаркота забіла рот, сэрца гэтак жа шалёна, як грукатала толькі што, калі ён імчаў да самалёта, білася ў грудзях. Захар прагна і часта глытаў марознае паветра, а прамовіць нічога не мог, глядзеў на белы кажушок Гайдаш, і першай думкай была дзіўная думка, неверагодная, але яна ўразіла і шмат што патлумачыла адразу ж.

«Ціхан з таго і злуе, што Гайдаш да мяне вяртаецца!..»

Яго самога дужа здзівіла і сама думка, і сцвярджэнне, нечаканае ў гэтай сітуацыі,— «да мяне вяртаецца». Але ён падумаў менавіта гэтак, што, маўляў, не ў атрад Гайдаш вяртаецца, а вяртаецца да яго, і звязаў гэта з настроем Ціхана і ўсё і адразу яму дараваў. І тут жа пядобра зарадаваўся, быццам помсціў яму за афіцыйнасць сустрэчы, за гэты зняважлівы штуршок рукою. Хай злуе Ціхан! Гайдаш вярнулася! А гэта — галоўнае!

Ён глядзеў, як яна ідзе, папраўляючы доўгую сумку на шырокім рэмені, які быў закінуты за плечы, як спынілася, гукнуўшы чалавеку, які спускаў па кароткай лесвічцы на лёд возера нейкія нерацісныя пасярэдзіне згорткі:

— Асцярожна! Там — плёнка! Гэта нельга кідаць! І колькі ж мне казаць? Кінаапаратура — не гранаты! Кідаць яе нельга!

Голас быў незнаёмы, але Захар усё яшчэ не верыў, што памыліўся, што не Гайдаш бачыць, а нейкую жанчыну, зусім яму не знаёмую.

— Люда! — паклікаў Ціхан і засмяяўся: — Чаго ты, таварыш Сухава, з маімі хлопцамі чубішся? І там, дарогаю, і тут — ваюеш. А хто здымаць будзе? О-ой, глядзі, адна застанешся.

— І адны не прападзём! Ацалеем! Няўжо сумняваецеся?

Ціхан нічога не адказаў, загадаў чалавеку, які стаяў побач з ім і якога Захар не адразу пазнаў:

— Велікапец! Кіпааператара — на першыя сані. Каб і яна і ўсе скрыні былі цалюткія. І прасачыце, каб адразу шыфроўка пайшла: выгрузіліся, чакаем. Абавязкова паведаміце пра каляровасць сігналаў, каб лётчыкі садзіліся спакойна,— і папракнуў Гусарава, які толькі што падкаціў у лёгкім вазку і з якім павітаўся сухавата: — Колькасць сігналаў паведамілі. А пра колер — каб табе слоўца. Я і сам быў напалохаўся...

— Будуць яшчэ самалёты? — спытаў Гусараў падкрэслена і афіцыйна, прымаючы папрок.

— Адзін. Там чакаюць ад нас паведамлення. Бо груз вязуць дужа адказны і важны. Грымучы груз!

— Бранябойкі?! — вырвалася ў Захара міжвольна. Ён пачуваў сябе дужа ніякавата, быццам Ціхан адгадаў яго патаемную трывогу перад гэтым, радасць і потым раптоўную разгубленасць. Стаяць моўчкі побач з Ціханам было неяк нядобра, быццам ён чакае ад яго нейкай прыхільнасці, і не проста чакае, а хоча яшчэ і падкрэсліць, што мае на прыхільнасць абсалютнае права.

— Мацней за бранябойкі. Кніга таварыша Сталіна аб Вялікай Айчыннай вайне.

Гусараў працягла і выразна прысвіснуў, і гэта дужа не спадабалася Ціхану, ён рэзка павярнуўся, сказаў непрыветна:

— Колькі параненых у брыгадным шпіталі? — Ціхан, пачуўшы адказ, крыху памаўчаў, быццам абдумваў тое, што сказаў яму Гусараў, потым загадаў зноў: — Прасачыце, каб яны былі праз паўгадзіны тут. Хопіць паўгадзіны?... Вось і добра,— і зноў палагаднеў, зрабіўся сяброўскім і заклапочаным яго голас: — Правільна, што дзяцей адправім. Шкада толькі, што Сухава не змагла зняць. Але ж не чакаць да раніцы.

— Знойдзецца, што здымаць. Хай толькі паспявае. І на ленту не скупіцца...

І зноў заўвага Гусарава не спадабалася Ціхану, і зноў голас яго змяніўся на загадны і жорсткі:

— Што здымаць Сухавай — ёй лепей ведаць. Вы зараз, галоўнае, прасачыце за дастаўкай параненых сюды,— і, як бы адразу адключыўшыся ад гаворкі з Гусаравым, паклікаў Захара: — Пайшлі, ёсць і к табе слоўца...

Ціхан ішоў, спыняючыся ля кожных развалак, быццам пералічваў дзяцей — іх перадавалі з рук на рукі, і яны знікалі ў чорным чэраве самалёта. Захар увесь час трымаўся

крыху ззаду, але добра чуў, як Ціхан размаўляе з партызанамі, як нешта раіць лётчыкам. Усё больш і больш трапляючы пад дзіўную абладу абаяльнасці знаёмага і роднага голасу брата, ён усё яшчэ не мог патлумачыць сабе вытокі сухасці, з якой Ціхан стрэў яго, не мог пазбавіцца ад пачуцця дзіўнага і незразумелага падману, які перажыў на сваёй уласнай волі. Як ён адразу не зразумеў, што не Гайдаш прыляцела? Як пераблытаў яе з жанчынай зусім не знаёмай, з чалавекам, якога анікалі дагэтуль не бачыў? Хаця, што ж тут дзіўнага! Ён толькі што думаў пра Гайдаш, думаў шмат, і таемная думка, што ён стрэціць яе, жыла ў сэрцы, жыла наўпярок цвярозым доказам і разважанням, і сэрца было гатова да салодкага падману.

«А можа, яно гэтак і лепей...»

Думка прымірыла яго і з падманам, і з наіўнай і беспадстаўнай спробай абвінаваціць Ціхана, па-свойму патлумачыць змены, што адразу кінуліся ў вочы.

Калі самалёт узляцеў і гул матора растаў удалечыні і развалкі, цяжка гружаныя, марудна папаўзлі з возера на дарогу, Ціхан, паклаўшы руку Захару на плячо, сказаў мякка і ласкава:

— Ну, дарагі ты мой, цяпер рыхтуйся пачуць навіны!

Крыўда, якую прынесла сухаватасць першых хвілін сустрэчы, прайшла, і Захар наважыўся быў сказаць нешта шчырае, але, наўпярок волі, сарваўся з вуснаў папрок:

— Прыляцеў, значыцца, не з адным гонарам начальніцкім!

Ціхан сказаў шчыра, без нотак апраўдання:

— Гэтых малых гаротнічкаў пабачыў — усе навіны з галавы павыляталі. Ажно сэрца зайшлося... Гэткае могуць зрабіць з дзецьмі толькі нелюдзі. Ім, звярам, нічога не даруем,— і дадаў заклапочана і строга, са шкадаваннем: — Кепска, што ноч... Зняць бы кожнае дзіця на плёнку ды свету паказаць: вось, глядзіце, што робяць фашысты на нашай зямлі... Ну, нічога, Сухава, мне сказалі, аператар таленавіты і смелы. Яна марна плёнку не зрасходуе.

— А дзе тыя здымкі дзеліся? Фатаграфавалі ж дзяцей летась. Тых, што з дзетдома выхапілі.

— Не летась, а — улетку. Тыя здымкі ўжо ў газетах. Хай сусвет паглядзіць, які наш рахунак фашызму...

Захар сказаў, азіраючы зусім чыстае, густа зорнае, без адзінай хмурыначкі, начное неба:

— Каб жа толькі шчасліва даляцелі дзеці.

— Самалёт гэты надзейны. І лётчык — першы клас,— і раптам засмяяўся знаёма, дабрадушна і абаяльна, здзівіўшы

Захара рэзкай пераменаю настрою.— Няўжо і сапраўды з мяне гонар начальніцкі выпірае?

— Цяпер — не. А як прыляцеў — нават уночы відаць было!

— Якая тут ноч! Светла, бы ўдзень!

— А я быў падумаў: падмянілі Ціхана.

— Улічым, братачка, тваю грунтоўную, хоць і беспадстаўную, у мой адрас крытыку,— зноў пажартаваў Ціхан і зноў у яго гаворцы прабілася сур'ёзнасць, якая на пачатку сустрэчы гэтак збянтэжыла Захара.— Хоць, шчыра кажучы, часу на тое зусім няма. На мне цяпер адказнасць за дзеянні ўсіх партызанскіх брыгад у нашай зоне. Аж да Дзвіны.

— І хто ж на цябе такую адказнасць усклаў?

— Цэнтральны Камітэт.

— Скла-даная задача. Тут свой самалёт трэба мець, каб своечасова паспяваць туды, куды трэба. Але гэта — не рэальна. Самы надзейны тут сродак — рысак. Аджалкую табе свайго ўласнага!

— Абыдземся і без яго. У кожнай брыгадзе — свой радыёперадатчык. Вось гэта — рысакі. А каб кожнаму атраду — радыёсувязь? Вось тады — узаемадзеянне. Вось тады — каардынацыя. І табе скажу шчыра: да гэтага набліжаемся...— Ціхан памарудзіў, потым дадаў ціха зусім, хоць яны былі адны на возеры і апошнія разводкі хаваліся за цёмнай стужкай чароту ля берага: — Загадана трымаць у поўнай гатоўнасці леташнія пасадачныя пляцоўкі. Мяркую — дэсантны корпус. Разумееш падзеі?

— Навіна-а-а!

— Ёсць і яшчэ. Ты думаеш, што я з пустымі рукамі прыехаў? Трымай падарунак! — Ціхан скінуў з пляча палявую сумку, начапіў Захару на плячо, рашуча перапыніў пярэчанні: — Не ад мяне падарунак! Зірні на пісталет у сумцы, ён — з гравіроўкаю: «Захару Крупню — за мужнасць». Няўжо не пазнаеш почырк? Ягораў жа размах!

— Ты бачыў Ягора?

— Бачыў. З Залатой Зоркаю наш Ягор пахаджвае. Яго дывізія зараз — рэзерв Галоўнага камандавання Беларускага фронту. Вось яно як! А карты ў сумцы? Навюсенькія. Асабіста табе пасылае!

— Ведаю: праўду гаворыш. А як і не верыцца.

Ціхан прамовіў са смяшком:

— Роўна Веліканец. Ён, калі сігнальныя агні пабачыў, ледзь носам ілюмінатар не высадзіў. Куды заляцелі, крычаў! Гэта ж — фрыцы!

— Добра відаць з вышыні?

— Першы клас. Гэткаму аэрадрому можна пазайздросціць.

— А казаў, што колер агнёў табе не па душы!

— Што колер агнёў не паведамілі — памылка. Сам разумееш, чаго варта часам нават дробная памылачка...

Зноў у Ціханавым голасе прабілася строгасць, і пераход да яе ад мяккасці і дабрадушнасці непрыемна ўразіў Захара. Нешта ўсё ж адбылося з Ціханам. Нешта? Адказнасць за лёс тысяч людзей, клопат, трывога — трэба ўсё гэта разумець. Дзіўна, аднак. Штораз, сустракаючыся з Ціханам, ён, Захар, напачатку не пазнае яго, бачыць у ім нешта новае, нязвыклае, і штораз спрабуе сабе патлумачыць гэта адным і тым жа, і адразу сябе пераконвае, і штораз пачуе ад яго тое, што і ўразіць, і ўсхвалюе. З Ягорам вось сустрэўся! Э-эх, каб і Пахом быў жывы!.. Ды бацька і маці... І дзіўна, смерць бацькоў ужо неяк адсунулася, нібыта адбылася дужа даўно... А вось Пахомава смерць — быццам учора грымнула гэтая жахлівая вестка. І смерць Зінаіды і дзяцей... Ведае, што няма іх, а ўсё вярэдзіць сэрца нейкая незразумелая надзея, якую цяжка патлумачыць. Чаму ж цяжка? Сэрца не хоча зміры́цца з гэтай цяжкай стратаю...

— А які наш Марат малайчына!

— Што, яго таксама бачыў?

— Не, чытаў Указ — ордэнам Леніна ўзнагароджаны. Два «месеры» ссадзіў на тым тыдні. У баях пад Гарадком.

— Трэба паведаміць Марылі. Яна, разумееш, як прыкіпела да таго хутара. Прасіў сто разоў: кідай усё, ідзі ў атрад.

— Прасіў... Загадаць трэба!

— Тут загадам рады не дасі...

Захар пачаў расказваць пра смерць Шлычыхі, пра апошнія баі, якія давялося весці атраду, і Ціхан слухаў уважліва, час ад часу перапыняў і перапытваў. Пра бой пад Шавялямі і Дзягілямі, дзе другая рота страціла семнаццаць чалавек, патрабаваў расказаць падрабязна. Моўчкі выслухаўшы апавяданне пра трагедыю гэтых вёсак — паляцеўшы па досвітку, карнікі пастралялі і жанчын і дзяцей і спалілі ўсё, што магло гарэць,— Ціхан прамовіў ціха і сумна:

— Невясёлыя навіны ты падрыхтаваў, дужа невясёлыя. Калі па семнаццаць чалавек атрад будзе губляць штодня — далёка не паедзеш. Адзін-адзінюсенькі застанешся!

Папрок не меў падстаў, пакрыўдзіў, і Захар палічыў мэтазгодным апраўдацца зараз жа, адразу і ва ўсім.

— За апошні месяц у атрад улілося сорак восем новых байцоў,— прамовіў ён з гонарам.— Мы думаем ствараць трэцюю, камсамольска-маладзёжную, роту. І яшчэ — аддзяленне

бранябойшчыкаў. Будзе дазвол і бранябойкі — створым хоць сёння! — І, злуючыся на самога сябе, хмыкнуў незадаволена і ўслых выказаў тое, што гэтую незадаволенасць выклікала: — Збіраўся ж у цябе пазней прасіць зброю. Пасля вячэры. Гусараў хоча накарміць цябе вячэраю шыкоўнай. Яешня — па-партызанску...

— Не гарыць тая яешня. Спачатку — самалёт стрэпем. А ён,— Ціхан паўглядаўся на ручны гадзіннік,— ён неўзабаве і тут. Дарэчы, на ім ляціць і твая Фаізуліха...

— Ванда?! — Захар выгукнуў радасна, як не паверыў.— Вось гэта падаруначак для Файзуло майго!

— Ніякі яна не «падаруначак», а радыстка асноўнай радыёстанцыі «В 100-А». Чуў пра такую тэхніку?.. Не чуў, не чуў, не прыгадвай — не было шчэ гэткай. Пабачыш, сувязь у нас будзе і ўночы і ўдзень. Як па тэлефоне.

— Хутчэй каб. Бо з тэлефонам — адны пакуты. Хутчэй дабяжыш, чым дазвонішся ў брыгаду. У роту, да Файзуло, лягчэй. У яго, праўда, апаратура класная — з Фарынаўскага блокпаста хлопцы прыцягнулі.

— Файзуло трэба даўно на атрад ставіць. Перакінем яго ў другую брыгаду...

— Не аддам! — Захар выгукнуў у запале, абурана.— Абяззброіць лепшую роту? — і, спахапіўшыся, што паводзіць сябе і неразумна і нетактоўна, паправіўся: — Ды ён і сам не поїдзе. Хаця... Хіба толькі ў той атрад, дзе Ванда будзе.

— У атрад яна не трапіць. Яе радыёстанцыя непасрэдна ў аператыўнай групе.

— Удар для Файзуло.

— Нічога, перажыве,— са смяшком кінуў Ціхан і, нечакана для Захара, даючы зразумець, што не хоча больш размаўляць пра Ванду, вярнуўся да ранейшай гаворкі, спытаў з развагаю: — Як жа вы пусцілі іх у Шавялі? А што застава ў Дзягілях? Праспала?

Рэзкае, з адценнем пагарды пытанне непрыемна ўкалола Захара, і ён зыркнуў на Ціхана з асуджэннем. Лёгка папракаць! Лёгка павучаць, калі сам далёка ад бяды!

— Па заставе ўдарылі з тылу,— прамовіў ён стрымана, адкладваючы падрабязнасці бою на час спакойнай гаворкі за вячэраю.— Застава пільнавала дарогу. А яны пайшлі не дарогаю. Па балатах.

— Па дрыгве?

— Балаты прамерзлі — праїсці скрозь можна. Снег пасля адлігі асеў. Навука, адным словам, нам добрая... І — крывавая.

— Застава білася?

— Да апошняга патрона. Не адступілі. Палеглі ўсе дзевяць.

— Чарот...

— Што? — Захар спачатку не зразумеў, пра што сказаў Ціхан.

— Таямніча, кажу, чарот шухціць. Пасля ветру, дык ад яго цеплынёю патыхае.— Ціхан спыніўся, слухаў, як шархаціць сцяна пасохлых, дужа цёмных сярод белых снягоў сцяблін, потым папрасіў, як загадаў: — Раскажы пра Шавялі і Дзягілі. Падрабязна.

Услухоўваючыся, як і Ціхан, у сухі пошум цёмных сцяблін, у журботныя ўсхліпы ветру над снягамі, Захар глядзеў на дарогу, што, як з цёмнай брамы, выматвалася з чароту па белую роўнядзь возера, на кола поўні, што, як скамянелае, абкружанае рэдкімі, як прыгаслымі, зоркамі, сіратліва вісела ў халоднай і маўклівай высі, астуджанай зімовым ветрам, па густое ззянне над цёмным лесам буйных і блізкіх зорак, якія быццам сыпаліся, скатваліся ў мройную бель за гнуткай сцяною шурхоткага трыснягу, і адчуваў, як глухая, звярыная журба кладзецца яму на сэрца. У нейкае адно імгненне ён як бы нанава перажыў бой у полі за Дзягілямі, дымныя чорныя квадраты попелішчаў на месцы вясковых хат, ярасную сутычку ў рэдкім бярэзніку пад Шавялямі, дзе другая рота сышлася з фашыстамі ўрукапашную і змалаціла іх ушчэнт, пахаванне семнаццаці герояў таго дня ў брацкай магіле над возерам, гаротны покліч невядомага хлопчыка, падобнага тварыкам на дзядулю, горкі боль адчайнай развагі, уведаны тут, у сухім чароце пад посвіст марознай дудкі, хваляванне ад пачутага гулу самалёта, крыўду ад сухасці сустрэчы, сустрэчу і апаламляльную радасць навін, якія прывёз Ціхан,— усё гэта разам грымлівай цяжкай хваляю абрынулася на Захара, і ён, адчуваючы балючы і горкі яе цяжар, які прыгнятаў і знясільваў, неспадзеўкі і чотка спасціг вытокі нейкага, як бы хваравітага стану свае душы, яснай вастрынёю зразумеў, што не зможа расказаць ні пра гэтыя падзеі разам, ні пра кожную з іх паасобку. Расказаць — перажыць усё зноў. А ў яго няма сілы на тое, яму патрэбна хоць кропелька чуласці, нейкае, хоць маленькае, каліўца цеплыні, спагады, ад якой, нібыта добрае паліва ад агню, запаліліся б, ажылі б у сэрцы новыя падзеі.

— Я раскажу потым. Пазней...

— Раскажаш пазней. Ты даруй, што загадваў.

— Добра, што ты прыехаў,— ціха прамовіў Захар і прыткнуўся лбом да Ціханавага пляча, потым апусціў галаву ні-

кэй, упёрся ёю ў самыя грудзі: — Дужа добра, што ты прыехаў...

— Цяжка табе было тут,— ні то прызнаў, ні то запытаўся Ціхан і зноў паўтарыў, але цяпер сцвярджальна: — Цяжка. І прызнаць гэта не сорамна.

— Цяжка ад страт. Канца ім няма...

— Цяжка і мне,— прамовіў Ціхан даверліва.— Ты адзіны, каму кажу і прызнаюся ў гэтым. А чакае нас у бліжэйшы час не лепшае. Зусім не лепшае... І вось жа ўвесь час сябе пераконваю: будзёншчына ж гэта, жыццё наша партызанскае. А — няма палёгкі.

— Ведаеш, як мой Файзуло гаворыць? Ідзеш паляваць лісіцу — бяры зброю на льва.

— Гэта, дарагі мой, не простая задача.

— Адно і робім, што задачы рашаем. Мне ўжо гэта часам пачынае дакучаць.

— Вясною будуць задачкі, якімі мы з табою ніколі не займаліся. Але адно суцяшае, што фронт побач. Ёсць дамоўленасць: з паветра нашы самалётамі дапамогуць, калі ўжо дужа нас пачнуць ціснуць.

— Вясною мне іхняе цісканне — дым. Вясною нас не ўхопіш! Вясною, як гаворыцца, кожны кусцік начаваць пусціць.

— А ты ўсё той жа. Аптыміст. Вялікі і адчайны аптыміст!

Ціхан, як малога, пагладзіў Захара па скроні. Далонь яго была каляная, але дужа цёплая, і ад гэтага дотыку, знаёмага з маленства, Захару, як некалі ў часе рапішняй размовы ля ручая, зрабілася лёгка, растаў цяжар, які прыгнятаў яму сэрца, і ён цяпер канчаткова паверыў, што перамагае горыч доўгай і тужлівай адзіноты і пачынае жыць як бы нанава.

## 12

*БЛАКНОТ РОМЕЛЯ. Старонка дзевятая.*

«Нельга, кажуць людзі, тройчы выпрабоўваць лёс.

А я ўжо трэці раз сустракаю вясну ў Расіі — гэта факт, які, думаецца, патлумачыць усё, што можа са мною здарыцца.

Хай бы лепей — не здарылася нічога.

Нейкія дзіўныя, незразумелыя прадчуванні. Я ўжо ведаю сябе — яны прыходзяць да мяне вясною. І ўсё пачалося не ўчора, усё пачалося з той ночы, калі — сасніцца ж такая

чартаўшчына! — жонка загадала мне ўстаць з труны і мы пайшлі з ёю дамоў.

Дарога, па якой мы з ёю ішлі, і зараз у мяне перад вачыма. Нават удзень змружу вочы — бачу.

Дзіўны той сон паступова зрабіўся явай.

Мне абрыдла цяпер усё, апрача аднаго — хачу дамоў! Хоць на гадзінку, хоць на імгненне ўбачыць родныя вочы, дакрануцца да мілых вуснаў, пачуць пах каштана ля ганка, убачыць дачку... Гэтым жыве душа. Гэтым жыве сэрца. А розум заняты іншым: розум узважвае, нагадвае пражытыя гады, нібыта хоча ва ўсім паспавядацца. Але ж толькі перад богам чалавек спавядаецца ва ўсім. І толькі ад чалавека залежыць, якая будзе яна, гэтая апошняя гаворка з небам. Без яе чалавек не павінен знікаць з зямлі.

Шлык пасмейваецца з маіх разважанняў. Гаворка з небам? А што небу да цябе? Яно, неба, заўсёды было, маўляў, раўнадушнае да таго, што робіцца на зямлі і што рабілася.

Вельмі зацята адстойваў гэта ён сёння, калі мы дэманціравалі сігнальную сістэму. Аэрадром перанесены на ранейшае месца — вялізнае поле за возерам ля бярозавага гаю,— і сігналізацыю мы перацягнулі туды даволі хутка і лёгка.

Шлык здзіўляе мяне моцна. Здзіўляюць і думкі гэтага славяніна, і стаўленне да працы, і яго самабытны, гнуткі, надзіва, розум. Як, напрыклад, чалавек малаадукаваны мог дадумацца да таго, што не адразу цюкнула ў голаў нават мне — чалавеку з высокай адукацыяй! — калі мы даводзілі да ладу дынама-машыну на млыне. У разабраным выглядзе ён генератар аніколі не бачыў раней, а вось жа змікіціў і мне падказаў, як можна лёгка замяніць шчоткі і з чаго зрабіць ізалятары.

Але шмат у чым яны, рускія, адстаюць ад нас. І ў гэтым сэнсе гаворка пра «вышэйшую» расу мае рацыянальнае зерне. Не можа быць так, каб людзі былі ўсе роўныя і геніяльныя. Нехта здольны зрабіць адкрыцці, нехта ўбачыць тое, чаго не бачаць дзесяткі іншых, і менавіта геніі і творцы павінны ісці наперадзе, весці за сабою іншых: гэта і ёсць гісторыя. У кожным руху не ўсе могуць ісці ў першым ланцужку, нехта заўсёды накрочыць наперадзе, нехта апынецца пасярэдзіне, а нехта будзе плесціся ззаду, бо неба не ўсіх надзяліла аднолькавым розумам, здольнасцямі, проста фізічнай сілаю, урэшце. Гэта — закон краін і народаў, і ён незалежна ад нас існуе, ёсць і незалежны ад таго, прымаеш ты яго ці адвяргаеш.

Але сёння мне хочацца напляваць на ўсе законы, якія існуюць, бо хачу адно — дамоў! Толькі дамоў!..»

13

У трубцы хрыпела, голас на тым канцы дроту быў ледзь чутны, потым мембрана гучна шчоўкнула, шархаценне растала, і Захар выразна і добра пачуў злосную лаянку камбрыга.

— Чаму адступіў? — Гусараў гаркнуў і мацюкнуўся.— Хто дазволіў? Загад ведаеш?

— Ведаю. І адступілі з тактычных меркаванняў.

— Кепска чуваць... Паўтары! З якіх, з якіх меркаванняў?

— З тактычных, кажу. Правераных практыкаю. З тактыч-ных — чуваць ці не? — меркаванняў!

— Гавары грамчэй! З як...

Голас знік зноў, і Захар чакаў, прыціскаючы трубку да вуха.

«Гусараў — не Ціхан. З новым камбрыгам цяпнем гарачка...»

Абурэнне не аціхала, расло, паліла горыччу. Лёгка там Гусараву абурацца і націскаць. Але калі разважаць спакойна, дык і ты на яго месцы быў бы не лепшы, гэткія ж пытанні кідаў. Цяпер Захар злаваў на сябе, не на Гусарава. Паведаміў Файзуло, што рота здала абарону за Быстрыцай з тактычных меркаванняў, і ён, Захар, не разабраўшыся як след, прыняў гэтую фармуліроўку, пачаў уводзіць гэтую думку і ў вушы Гусараву. Добра, што сувязь абарвалася. А каб запатрабаваў тлумачэнняў камбрыг? Што яму адкажаш? Баі ўжо ідуць другі тыдзень. Патроны на зыходзе. На бранябойкі засталося па два дзесяткі. Да ротнага мінамёта — яшчэ менеі мін. Хоць бы падаслалі які атрад на дапамогу! Але каго падашле Гусараў, калі ўся брыгада завязла ў баях? Па ўсіх напрамках з раніцы да вечара грыміць і грыміць...

Зірнуўшы на Яштокіна, які стаяў ля адкрытага акна штабной хаты, Захар, быццам раячыся з начальнікам штаба і просячы ў яго добрай парады, паўтарыў тое, што запытваўся Гусараў:

— Чаго адступіў? — нядобра хмыкнуў.— Прыязджай і зірні!..

Шчоўкнула ціха мембрана, і Захар з усяе сілы прыціснуў трубку да вуха. Праз хрыплы трэск рантам зноў прарваўся настойлівы і напружаны, яшчэ больш узвінчаны, голас Гусарава:

— Ты мяне чуеш?.. Не адступаць! Не адступаць ні на крок! Загад усё той жа, каб ані кроку назад. Боепрыпасы пасланы. Чуеш? Пасланы патроны. Штаб злучэння абяцае падтрымку з паветра. Чуеш? Будуць самалёты. Пакажаш аб'ск-

ты для бамбёжкі. Сігналы не забыў? Глядзі, каб на тваіх акопах не жарнулі — мокрае месца застанецца!.. Як настрой у людзей?.. Камісар там? На нараду яго прышлеш сёння ўвечары. А сам заставайся. І меней у штабе сядзі. У мяне ўсё. Цябе цяпер слухаю...

— Калі будуць самалёты? — Захар быў узрадаваны, што непрыемны і крыўдны допыт скончыўся і што тон Гусарава памякчэў.— Калі чакаць?.. Трэба ж дакладна ведаць!..

У трубцы пачуўся шоргат, быццам хрыплы трэск, які перад гэтым ажно аглушаў, цяпер адкатваўся па дроце, потым шоргат паслабеў яшчэ больш і знік зусім. Захар патрымаў на руцэ змоўклую трубку, зноў прыклаў яе да вуха і, зразумеўшы, што тэлефонная сувязь з брыгадай цяпер канчаткова перарвалася, зазлаваў, кінуў трубку на рычаг тэлефона, які вісеў на жоўтай дошцы са слядамі старой пабелкі на кантах; трубка сарвалася, загайдалася на шнурку, і Захар нават не памкнуўся пачапіць яе зноў. Зрабіў гэта Яштокін. Ён узняў трубку, марудна раскруціў шнур, прыклаў гэтак жа марудна да вуха, паслухаў і моўчкі прыладзіў яе на рычаг.

— Ажыла? — падкалоў яго Захар.— Выкінуць трэба гэтую бандуру ўвогуле. Хай бы вочы не мазоліла.

— Не ажыла, бо сваё ўжо аджыла,— нечакана зрыфмаваў Яштокін.

Тое, што Яштокін гэтак спакойна разважаў пра тэлефон — зусім нядаўна гэты апарат на шырокай жоўтай дошчачцы быў яго гонарам,— што ніяк не адрэагаваў на размову Захара са штабам брыгады, быццам зусім ёю не цікавіўся, узбунтавала Захара, і ён выліў рэшту свайго гневу на таго, хто быў не далёка, а побач.

— Ахвовы няма, дык і аджыла! А колькі разоў я казаў: зрабі на лініі засаду, злаві ты мне гэтых рэзчыкаў! А ты што казаў?

— Казаў, што лепей ветру ў полі шукаць. Ды, зрэшты, заўтра нам гэты тэлефон, можа, і не спатрэбіцца. Без яго дык і жыць будзем спакайней...

Спакойная шчырая заўвага Яштокіна абяззброіла Захара, і ён адчуў сябе ніякавата. Не ён, Яштокін, вінаваты, што Файзуло адвёў роту з першай лініі абароны за Быстрыцай. І дзіўна: ён, Захар, гэтак жа крычаў на Файзуло, як толькі што крычаў на яго самога Гусараў. Твая ярасць, бачыш, як бумеранг ударыла цяпер і па табе. Прыйшло ў галаву нечаканае: у тым, што здарылася на пясчаных пагорках за Быстрыцай, вінаваты болей ад усіх ён, Захар. Ён думаў пра тое месца, дзе карнікі нанясуць асноўны ўдар па абароне атрада? Думаў. Сказаць, што ведаў дакладна, не скажаш. Але ж

прадбачыў! І гэтую магчымасць яны ў сваім штабе абмяркоўвалі неаднаразова. Хаця, праўда, ён разлічваў, што ўдар будзе наносіцца ўсцяж дарогі. А яны пайшлі полем, па чыстым месцы. Горкі ўрок над Дзягілямі, значыцца, нічога табе не даў? Не, чаму ж! І гэта таксама прадбачылі, і абарона была там таксама. Але трэба было зняць пару ўзводаў з абароны першай роты і паслаць на дапамогу Файзуло.

«А я не зрабіў гэтага. Простага і патрэбнага!»

Ён цяпер разумеў не толькі сваю памылку, але і прычыны яе. Баяўся ўдараў па флангах, пагроза якіх была і цяпер застаецца зусім рэальнай? Хай сабе, баяўся. Але ж чаго ты адмовіўся ад падтрымкі франтавых штурмавікоў з паветра, падтрымкі, якую Ціхан абяцаў цвёрда яшчэ за тыдзень да бою? Паверыў, значыцца, у свае сілы. Палічыў, што не маеш права на гэта, бо тады баі ішлі ўжо скрозь па ўсіх межах партызанскай зоны, на мясцінах больш цяжкіх і не выгодных для абароны, чым гэты кавалак зямлі паміж азёрамі? Не, проста Гусараў націснуў на нарадзе на самалюбства, патрабуючы, каб ніхто не спадзяваўся «на дзядзьку добрага», разлічваў на свае сілы, на свой вопыт, на сваё майстэрства... І ты вырашыў падкрэсліць, што і вопыту і майстэрства камандаванне твайго атрада, маўляў, мае дастаткова... Хопіць, можа?.. Хопіць вышукваць прычыны таго, што было і мінула. Ад таго, што ён, скажам, цярэбіць гэтыя прычыны, дык Файзуло ні холадна, ні горача. Не, у любым выпадку будзе горача Файзуло, будзе горача ім усім. Так, дружа, не ты, а Ціхан усё прадбачыў тады на возеры. «Вясною будуць задачкі, якімі мы з табою аніколі не займаліся». Ціханавы словы, Ціханава прадбачанне! І тое, што адбываецца зараз, не проста лакальная блакада асобных раёнаў: пачаўся наступ агульны, наступ на ўсю партызанскую зону.

— Ты чуў? — спытаў Захар у Яштокіна, спытаў без раздражнення, разумеючы, што злаваў дарэмна, без падстаў.— Не адступаць патрабуюць. А на тактычныя і іншыя меркаванні болт кладуць, як гаворыцца.

— Гусараву, з вышыні, болей відаць, мабыць. Мы ж толькі свае акопы бачым.

— Паеду да Файзуло. Трэба яго падбадзёрыць. Э, Юрша наш коціць. Зараз даведаемся, што там першая рота парабляе...

Стоячы ля адчыненага акна, Захар глядзеў, як камісар лоўка саскочыў з каня, кінуў повад на шула паркана, прывітальна патрэсваючы рукою. Крыху пакорпаўшыся ля парожка тэрасы, Юрша хуткім крокам увайшоў у пакой.

— Добрыя навіны вязеш, камісар? — спытаў Захар і па-

пракпуў сябе, што лезе з запытаннямі, не даўшы нават Юршу адпачыць.— Ціха ў першай роце?

— Ціха. Пастралялі крышку. З мінамётаў сёння нават не лупяць. Незразумела. Толькі вось гэтага не шкадуюць. Засыпалі, як снегам.

Юрша кінуў на стол Яштокіну стос фашысцкіх лістовак, перавязаных крыж-накрыж брудным бінтам. Убачыў на стале ў кухні гляк з малаком, наўшоў туды, вярнуўся са шклянкай у адной і тоўстай лустай чорнага хлеба ў другой руцэ, з'еў засаб, адкроіў яшчэ адну лусту, памянеў, узяўся жаваць спакайней.

— Не надакучыла ім паперу псаваць? — Захар выцягнуў са стосу адну лістоўку, засмяяўся.— У-ух ты! Цяпер нават са здымкам! Слухайце, панове! А здымачак стары. Паглядзі, камісар!

Лістоўкай зацікавіўся і Яштокін, стаў побач з Захарам, разглядаў яе, спытаў, узіраючыся ў здымак:

— Няўжо новага не знайшлося? — і адразу ж ажывіўся, прыгадаўшы, што гэткі ж быў і ў газеце, якую Артур аднойчы прыцягнуў з хутара.— Точна! Стары здымак!

— Ну! Кепска, значыцца, з фотаздымкамі ў фрыцаў.

Юрша сказаў з дакорам:

— Слабая падстава для радасці нам. З фотаздымкамі кепска, дык затое са снарадамі добра. Учора ж увечары Пажогаву абарону малацілі як? Усе пагоркі, бы плугам, узаралі. І сёння — цалюткую гадзіну. З мінамётаў, праўда. Байцам прыгладжвалі тое, што недарабілі ўчора.

— Страты сёння былі?

— Адзін паранены. Але — цяжка. Адправілі ў брыгадны шпіталь. Дзіўна, што вас не бамбілі. Самалёты сюды навярнулі.

— Яны над намі прайшлі.

— А грымела нібыта ў вас. Мы лічылі, што зноў штабную хату малоцяць.

— Гэта ля Глыбачкі бамбілі,— сказаў Захар, разглядаючы лістоўку ўважна. Лістоўкі, у якіх заклікалі партызан здавацца ў палон, дзе іх, як гэта падкрэслівалася буйным шрыфтам, чакае добрае жыццё, фашысцкія самалёты кідалі ўсё часцей і часцей, і прыклады змест іх Захар добра ведаў, тым больш што пісалася ўсё быццам адной рукою і па стандарту. Пагартаўшы цяпер лістоўку, ён раптам здзівіўся ўслых: — Адна-а-ак!..

Захараву ўвагу прыцягнулі, набраныя буйным шрыфтам, радкі, што ў ранейшых лістоўках не сустракаліся: «Кожнаму, хто заявіцца да нямецкіх улад з гэтай лістоўкаю, якая

ёсць самы надзейны пропуск, цвёрда гарантуецца поўнае і пажыццёвае дараванне знаходжання ў партызанскім атрадзе, бо яно, знаходжанне ў партызанах, ёсць вынік прымусу і адурманьвання сталінскай прапагандай. Гарантыя распаўсюджваецца і на камандзіраў, за выключэннем жыдоў і камісараў».

— Што цябе зацікавіла? — Юрша пачаў ладкаваць стос лістовак у палявую сумку.— Трэба, думаю, пераслаць у штаб злучэння. Гэткіх, думаю, у іх няма... Што, Захар, вывучаеш гэтак уважна?

— Бядую, камісар: твае справы храновыя. Нам з Яштокіным гарантуецца поўнае і пажыццёвае дараванне таго, што былі ў партызанах. А табе — дулю!

— А-а! — Юрша зарагатаў.— Хоць і крыўдна — перажывём!

— Ло-оўка, між іншым! — Захар патрос лістоўкаю.— Не на стандарту ўжо смаляць, павучыліся. Бачыш, як вернуць? Не разлічвайце, маўляў, на падтрымку, Сталін вас кінуў на волю лёсу. Мы расцісием вас танкамі і гарматамі. І толькі самы апошні дурань будзе глуміць сваё жыццё і жыццё сваіх дзяцей і бацькоў... Падумайце, узважце. І — кідайце зброю. Жыццё даражэй, чым дзесятак патронаў і старая вінтоўка...

— У першай роце пяюшку склалі пра гэтую лістовачку,— сказаў Юрша.— Жываты парвеш. Памятаеш той рэфрэнчык? «А не нужна нам райская житуха». Дык тут яшчэ мадней...

За акном грымнулі ў два ланцугі моцныя блізкія выбухі, і шыбы ў вокнах нудна затрымцелі. Потым выбухі як аддаліліся, а трымценне шкла засталося ў пакоі, быццам недзе па кутках увесь час нешта тапютка трымцела і пазвоньвала.

— Трэба перабірацца ў лес,— Юрша зашпіліў палявую сумку, паставіў яе на краёк стала.— Вяскоўцаў адправілі — разумна. А самі рызыкуем невядома дзеля чаго.

— Вось дзеля яго, роднага нашага,— Яштокін узняўся з-за стала, уручыў Юршу дакладную аб наяўнасці патронаў у ротах, потым патукаў далонёю ў жоўтую дошку, на якой вісеў тэлефон.— Крыж наш родны...

Юрша сказаў, разглядаючы паперы, якія ўручыў яму Яштокін:

— Ён сваё адслужыў, дык дзякуй яму. І выручаў ён нас, шмат, няма чаго наракаць.

— Нам абяцаюць радыстку,— прамовіў Захар, азіраючы сіратліва-пустынную вуліцу пасёлка.— Атрымаем сувязь — пяройдзем у зямлянкі. У лес вялікі і родны свой. База наша нас чакае.

— А мне ў вёсцы дык і лепей. У зямлянцы я не магу спаць — ніяк не высыпаўся,— прызнаўся Яштокін, і гэта выклікала саркастычны смех Юршы.

— Пабудуем табе хату. Палац у лесе будзе стаяць. Размаляваны.

Зноў загрукалі выбухі, звонка затрымцелі шыбы ў вокнах. Крыху пагадзя пачуўся гул самалёта, ён набліжаўся, мацнеў.

Яштокін высунуў галаву ў акно — выглядаў, дзе ляціць самалёт, і гэта зноў выклікала смех у Юршы:

— Схавай галаву, начштаба. Шпокне ён зараз табе па ёй, і застанецца атрад без галавы.

— Ёсць у яго клопат — не мая галоўка яму баліць. Не, сюды, паразіт праклятры, верне...

Грымлівая нота матора нарастала, загула высокай басавітай струною. Захар узяў з падаконніка ракетніцу, сунуў яе ў палявую сумку, сказаў таропка:

— Я — да Файзуло.— Павярнуўся да Юршы, параіў: — І табе няма чаго тут рабіць — гані ў брыгаду. З Гусаравым асабліва чубіцца не варта табе, гэта май на ўвазе. Выдраць пабольй патронаў для бранябоек — вось задача,— і, кіўнуўшы галавой на тэлефон, які маўкліва вісеў на сцяне, дадаў: — А начштаба хай пасядзіць гадзіну якую ля тэхнікі. Раптам абзавецца...

Ад гулу матора трымцелі цяпер у хаце нават сцены.

— Сюды, гад, ляціць,— вызначыў Яштокін і пачаў збіраць са стала паперы, якія былі неахайна раскіданы, і гэта выклікала цяпер ужо смех Захара.

— Хавай, хавай іх! Надзейна каб ляжалі. А то рване ветрам — прапала канцылярыя...

Прыглушаная гулам матора, недзе далёка ўвысі, слаба прагучала доўгая кулямётная чарга, потым, следам за ёю, мякка запокалі — таксама слабыя — выбухі, і гул самалёта пачаў аддаляцца.

— Тэрміткі кінуў, гад кляты! — Яштокін вылаяўся і гэтак жа, як нядаўна Захар, высунуўся ў акно траха не па пояс.— Запаліў, гад, хату ля возера.

Яны ўсе ўтрох выскачылі на ганак. Чорны слупок дыму ўздымаўся ў канцы пасёлка. Вецер ламаў яго, гнуў у розныя бакі, але дым упарта рваўся ўгару, і здавалася, што пажар пачаўся ў розных месцах.

— І яшчэ хата гарыць. Другая.— Захар паказаў рукою ўправа ад дымнага слупка, дзе таксама пачаў расплывацца дымны султан, але не чорнага, а нейкага бурага колеру.—

Трэба клікаць людзей. Слыш, камісар, заскоч у лес, мабілізуй людзей, хай паспрабуюць атушыць.

— Тушы ці не тушы, а той край ужо не ўратуеш. Добра, калі сюды зможам агонь не пусціць,— і Юрша, ускочыўшы на каня, пагнаў у бок лесу.

Адвязваючы повад свайго каня, што стаяў у засені старога клёна насупраць хаты, Захар паглядзеў па дарогу, дзе раставаў пыл ад конскіх капытоў, і памарудзіў, паставіўшы нагу ў стрэмя. Як бы нешта важнае не сказаў камісару. Вось быццам і круціцца, круціцца ў галаве, а не схопіш, не ўловіш вёрткую, зусім невыразную думку. Здаецца, папярэдзіў, каб не чубіўся з Гусаравым. Юрша і сам ведае, як трымацца, калі Гусараў пачне ўшчуваць, што рота Захаравага атрада здала пазіцыі. Галоўнае — рота зрабіла правільна. Усё яшчэ наперадзе: адступленне, наступ, манеўр...

«Вялікі і адчайны аптыміст...»

Ціханавы словы згадаліся, і горкі папрок іх Захар адчуў цяпер з новай сілаю і балюча. Ён ускочыў у сядло, з месца рвануў гопкай рыссю. За аселіцай апусціў повад, даў волю каню, які, застаяўшыся ў засені клёна, бег роўна і добра. Захар часта азіраўся, дым гусцеў ля возера, як бы набіраў сілу магутны пажар, і яму зрабілася не па сабе.

«Уцякаеш, аптыміст, ад агню?..»

Нядобра сціснулася сэрца: сапраўды, калі збоку зірнуць — ён уцякае ад агню. Гараць вясковыя хаты, хаты людзей, якім ён не аднойчы казаў, што атрад будзе абараняць вёску да апошняга патрона, не пусціць сюды фашыстаў. Так, пакуль што не пусціў. А хаты — гараць. І нічога ж не паробіш. Ну, добра, кінецца ён туды, да агню, адзін. Чым дапаможа? Трэба галоўнае глядзець — акопы, лінію абароны. Калі давядзецца і далей адступаць, адступаць гэтак жа, як адступала рота за Быстрыцай, дык гарэць будзе не адна хата. Уся вёска пойдзе дымам, не ацалець тады і тым, хто зараз схаваўся ў бярозавым гаі за вёскаю. А за тым гаем — яшчэ вёскі. Адным словам, за спіною атрада — жанчыны, дзеці, бабулі...

Справа за дарогай у небе грувасціліся вялізныя грывастыя белыя воблакі. Дакладней, не воблакі, якія звычайна плывуць у вясновым небе, а нейкія сіза-белыя гурбы, неахайна скіданыя адна на адну, і яны сціскалі, напаўзалі на сонца з двух бакоў. Блакітная прастора паміж воблакамі ўсё вузела і вузела, і здавалася, што змяншаецца і сонца. Але промні яго даўжэлі, рабіліся ўсё гусцейшыя і ярчэйшыя і як бы адпіхвалі воблакі ад сябе, і на зямлю праз закрайкі воблакаў прарываліся дымныя снапы жаўтлявага сонечнага святла.

Дзіўнае адчуванне на міг агарнула Захара. Ззаду дым і

агонь. Наперадзе, злева і справа, далёка, праўда, грыміць бясконцым ланцугом кананада. А тут — мірнае поле, грувасцяцца воблакі ў небе, сонечныя промні лашчаць маладыя жыты. І жаўранак звініць. Побач жа гараць хаты, віхурыць агонь бяды, а жаўранак — спявае! Быццам іспуе для яго толькі вось гэты кавалачак поля... Не, змоўк, быццам і не было... А воблакі ўсё паўзуць і паўзуць, промні сонца даўжэюць.

«Калі воблакі не схаваюць сонца, я перажыву вайну. Жывым застануся. І мяне не заб'юць...»

Наіўная і смешная думка збянтэжыла Захара. Зірнуўшы яшчэ раз на блакітны прагал паміж воблакамі, ён болей не ўзнімаў галавы, пазіраў па сіні лес наперадзе, глядзеў на жоўтую дарогу, з якой вецер, месцамі, віхурыў і гнаў пыл на густое і рослае ўжо жыта, але па тых цёмных палосах, што гусцелі на зялёным выгіпастым дыванку азіміны, разумеў, што робіцца ўвысі над яго галавой. Нібыта адбітак вясновай зямлі там, фарбы зямныя туды пераскочылі. Вось зусім сцямнела азіміна ўдалечыні, у канцы поля, дзе на ўзмежку ля крушняў шнурам зеляпеюць дзічкі, якія вось-вось расквітнеюць; вось цёмная палоса ўпарта і няўхільна паўзе сюды, у бок дарогі, на светлы краёк маладога жыта; і вецер дужа ўзмацнеў, гайдаюцца, гнуцца пад ветрам гнуткія вастраверхія сцябліны, як бы адпіхваюць ад сябе цень; зменлівы, няўстойлівы цень увесь час і вось загайдаўся, напоўз ад дарогі ў бок крушняў, да тых дзічак на вузкай мяжы ў канцы поля, паўзе ўсё далей і далей, і ўсё святлейшыя фарбы струменіць зямля.

Захар узрадавана глядзеў на дзіўны рух ценяў на густых рослых жытах, глядзеў, баючыся зірнуць на воблакі ля сонца. Але ён добра разумеў, што там, увысі, нешта адбылося, адбылося добрае, тое, чаго яму і хацелася ўбачыць, але ўсё аніяк не мог прымусіць сябе ўзняць галаву. Потым адважыўся, запракінуў галаву рэзка, аж хруснулі шыйныя пазванкі, і ў радасным шалу зароў на ўсё горла:

— Адкаці-і-і-лiся!

Тых, ранейшых, воблакаў на небе ўжо не было. За гэты кароткі час, што ён глядзеў на маладыя жыты і аглядаў наваколле, аграмадныя белыя гурбы, нагрувашчаныя адна на адну, як бы разваліліся, але не распаўзліся, а толькі змянілі і месца, і абрысы, і афарбоўку. Ранейі сіза-белыя, накіданыя пластам, яны цяпер сцямнелі, стаялі як бы тырчком і былі белыя толькі на краях, а ўсярэдзіне ссінелі, зрабіліся падобныя на вясновы снег ля дарогі, забруджаны, накраплены дажджом і падталы ад цяпла; воблакі ўвачавідкі зменьвалі

абрысы, быццам раставалі, і блакітны прасцяг вакол сонца пашырэў, залачоныя промні цяпер упіраліся толькі ў адну аблачыну справа, а ніжняя частка яе, як адвальвалася, вісела, бы ўздзетая на вузкі востры прамень.

«Значыцца, буду жывы...»

Ён разумеў, што ўсё гэта гульня, дзіцячы наіў, але тое, што адбылося ў сэрцы, было ўжо непадуладна яму. Наўпярок волі, наўпярок разважанням цвярозым і лагічным гэтая, патаемная, дзіўная і смешная, думка пра шчаслівы свой лёс ужо адваявала сабе месца, засела ўчэпіста, трывала, і, што самае дзіўнае, ён не вельмі-ткі пнуўся ніпчыць яе і бурыць: ён мірыўся з ёю гэтак жа, як мірыцца дарослы чалавек з наіўным і бясшкодным свавольствам дзіцяці.

За бярэзнікам, што нізінаю ўшчыльную падыходзіў да дарогі, з рэзкім траскотным гулам адна за адной узарваліся дзве міны, і Захар адразу вызначыў, што выбухі грымнулі недзе ля партызанскай абароны. Ён павярнуў каня з дарогі і пагнаў усцяж бярэзніку, потым выбіўся на знаёмую сцежку і неўзабаве пад'ехаў да пагорка, апаясанага, як перавязанага, акопамі. З грэбня пагорка, ад нізкіх шэрых валуноў, яму насустрач бег Файзуло, загадваў не выязджаць з бярэзніку на чысты, без травы, гліністы схіл. Дзе-нідзе на схіле зялёнымі плямамі, бліпчастымі ад сонца, выбіліся лісцінны падбелу.

— Тут кідайце каня. Далей — нельга! — Фуйзуло ўзяў каня за аброць. З глыбіні бярэзніку выбег малады хлопец з карабінам за плячыма, і Файзуло кінуў яму на рукі повад.— Адгані за пагорак. Прывяжаш там, дзе нашы стаяць. Толькі добра прывяжы!..

— Як настрой? — спытаў Захар, з асалодаю ступаючы па цвёрдай зямлі.

— Калі палкаводзец разумны — ногі ворага задраны ў неба,— прымаўкай адказаў Файзуло, але быў ён дужа заклапочаны і незадаволены.

— А якія ж мы з табою палкаводцы? Ці самі будзем ногі задзіраць у неба?

Файзуло няпэўна паціснуў плячыма: Захаравы словы нечым пакрыўдзілі яго, і ён гэта не ўтойваў.

— Зараз самі ўсё пабачыце...

Ад валуноў, замшэлых і зеленаватых, пачыналася вузкая і неглыбокая траншэя, зробленая яшчэ ўлетку, і Захар, добра ведаючы яе, ішоў па ёй хутка, але за камандзірам роты ледзь паспяваў, пачаў нават і адставаць. Файзуло ж бег увішна, лоўка, быццам усё жыццё адно і рабіў, што круціўся па гэтых вузкіх траншэях, потым, калі траншэя ўперлася ў

бліндаж, выскачыў, абабег яго, зноў ускочыў у траншэю, але цяпер глыбейшую і шырэйшую, з добра адладжанымі і замаскіраванымі брустверамі і зручнымі адзіночнымі ячэйкамі, і пабег яшчэ шпарчэй. Захар хутка ўзмакрэў, часта аціраў пот з шыі, але, высільваючыся, не прасіў Фуйзуло запаволіць хаду і дужа ўзрадаваўся, калі траншэя разгаліноўвалася на дзве і ён убачыў новую лінію акопаў, у якіх заняла абарону рота.

Файзуло спыніўся, і Захар, з палёгкай уздыхнуўшы, спытаў са смяшком:

— Ну, дык дзе ж тыя ногі ворага, што задраны ў неба?

Файзуло моўчкі працягнуў яму бінокль, моўчкі павёў указальным пальцам у бок лесу, што шырокім клінам падыходзіў да азёрнай затокі і дзе знікала, як абрэзаная, жоўтая стужка пясчанай дарогі.

Асколкі мін павыгрызалі ў палынах па брустверы акопа шчарбіны, і Захар добра бачыў праз іх у бінокль пізкія квадраты нямецкіх танкаў; адзін з іх спыніўся на ўскрайку пярослага хвойнікам узвышша, другі стаяў крыху ўлева, у засені прысад на дарозе. Там жа, пад бярозамі, стаялі тры машыны, таксама як і танкі, размаляваныя жоўтымі і зялёнымі пісягамі. Паміж машынамі і танкамі, на жоўтым грудку, устанаўлівалі мінамёты, і салдаты цягалі да іх з машын кароткія зялёныя скрыні.

Сівенькае воблачка ўзвілася на грудку, і адразу ж Захар пачуў тонкае скавытанне над галавой, і недзе ззаду бэхнулі два, як спараныя, выбухі мін. Мінамётчыкі яшчэ толькі прыстрэльваліся, білі па партызанскай абароне не вельмі дакладна: спачатку міны ўзрываліся на полі, потым чорныя султаны выбухаў напаўзлі на ўзгорку, як бы пераскочылі акопы, потым пачалі класціся ля вузкіх і чорных байніц бліндажа.

Захар мелькам зірнуў на гадзіннік і зноў прыпаў да шкельцаў бінокля. Сем мінут ён тут, у акопе. А калі яшчэ паўгадзіны гэткага агню? Ды з танкаў ударацць? Да акопаў танкі, магчыма, не дойдуць — у нізіне і на дарозе міны. Рэдкавата, праўда, але ж надзея ёсць: не на адну, дык на другую трапяць. А калі і праскочаць, дык злева тады бранябойкі ўдараць — дзве бранябойкі ў роце. Але ж танкі могуць і не пайсці, будуць гэтак стаяць і лупіць амаль прамой наводкаю па акопах — яны акопы добра бачаць. Ну, вось і танкі пачалі. Выпаўзлі на дарогу, сталі амаль побач. Не, той, што стаяў пад бярозамі, зноў туды адпоўз, спадабалася, мабыць, у цяньку стаяць, не на сонцы пячыся.

З гарматы танка, што стаяў на дарозе, вырвалася тонкае

белае лязо, і сіні дым звіўся з рудым воблачкам, што ўзнялося ад зямлі. Танкавы снарад прасвістаў над акопамі, і Захар, прасачыўшы вачыма тую нябачную вуркатлівую лінію ў тугім, як спрасаваным, паветры, змрочным жартам падкалупнуў Файзуло:

— Бачыш, палкаводзец, як высака ўскідвае ногі вораг?

Файзуло як бы і не чуў Захара, жаліўся сам сабе, роспачна ківаючы галавою з боку на бок:

— О-о-ое-е-е... Зробіш добра — будзеш у славе. Зробіш блага — захлынешся крывёю. О-о-ое-е-е... Блага я зрабіў, камандзір, дужа блага.

Калі Файзуло злаваў, сердаваў ці быў разгублены, ён заўжды казаў не «таварыш камандзір», а толькі «камандзір». Гэта настройвала Захара памяркоўна, у яго заўсёды з'яўлялася жаданне неяк супакоіць і развесяліць камандзіра роты, якога паважаў, нават у нечым і зайздросціў.

— Што ты блага зрабіў? Што? — цяпер чамусьці зварот Файзуло выклікаў раздражнёнасць, і Захар, каб супакоіць сябе, узяўся падлічваць салдат, якія выстрайваліся за машынамі ў нізіне.

— Заслон! Бакавы заслон не паставіў у тым хвойнічку. А-ах, як лоўка б яны зараз улупілі ім па азадку.

— Хто ж ведаў, што яны там спыняцца? Што менавіта адтуль пачнуць, хто ведаў?

— Чуеш крокі лісіцы? Думай пра тыгра — у нас кажуць. О-о дурань удывіцельна ба-альшой. Дуб!

— Чаго ты стогнеш? — абарваў яго Захар, не хаваючы раздражнёнасці, і загадаў, не адрываючы вачэй ад бінокля: — Пасылай сувязнога да Пажогі. Хай узвод кіне. І паспрабуе ўдарыць ад хвойніку. Верхам хай сувязны. На маім кані!

— Гэткага кругаля! Дзе ж ім паспець?

— Паспеюць! — Захар ведаў, што сказаў няпраўду, сказаў тое, у што не верыў, і, наўпярок сваёй волі, паўтарыў зноў: — Паспеюць, калі паварушацца. Скажы: загад мой! Два «дзегцяры» на коней — паспеюць!..

Файзуло знік за паваротнай траншэі, і Захар застаўся адзін. Дзіўна, аніводнага голасу не чуваць у акопах, ні жартаў, ні смеху — як пуста там. Да бою, ведама, рыхтуюцца. І табе, дружа, не пашкодзіць рабіць тое ж самае. Загад ты атрымаў не адступаць? Атрымаў. Цяпер давай, выконвай!

Захар паклаў у нішу, высланую звялымі палынамі, дзве эфкі, побач прыладзіў ракетніцу, якую выцягнуў з палявой сумкі, а сумку, патрымаўшы на руцэ, неахайна кінуў на дол траншэі. Потым зняў з рэменя чахол з запасным аўтаматным

дыскам. Дыск лёгка, як не сам, выкаціўся з брызентавага чахла, і Захар, паклаўшы дыск побач з гранатамі, нечакана да самых нязначных драбніц прыгадаў акопы ля Дзвіны. Гэткімі ж палынамі была заслана ніша ля амбразуры, толькі палыны там былі свежыя, моцна пахлі... Не, тут таксама пах моцны ад іх. Там, перад боем, ён доўга, помніцца, выцягваў запасны дыск з чахла, сціраў крапкі ржы, што аселі ля выбліскванага канта... Усё той жа дыск. Толькі блішчасты, вышараваны — часта выцягваў ты яго з гэтага чахла, нават не наспявае ассецi і крапачка ржы. І дзіркі на чахле пашырэлі, яшчэ крыху, дык і зусім згубіш дыск дзе-небудзь...

Прыціснуўшыся падбародкам да ніжняга краю бруствера, Захар ужо добра бачыў у бінокль чатыры варожыя ланцугі: два заходзяць ад возера, два, бы паралельныя пікі, сунуцца ўсцяж дарогі. Так, Файзуло разумна адступіў пасля кароткага бою за Быстрыцай. Каб застаўся ён на той лініі, дык яны б зараз, танкі, лупілі яму ў спіну, наўрад ці ацалеў бы там хто — прыціснулі б да возера і патапілі б у вадзе. А ён разумна зрабіў: ударыў — адскочыў. Гэтак і тут трэба было б рабіць. Але ж — загад! Загад, паўтораны неаднойчы: не адступаць! І яны, фашысты, як разумеюць гэта. Яны ўжо не падставяць сябе пад раптоўны ўдар, ідуць на Вуглы, ведаючы, што сіла на іх баку, што поспех ім забяспечаны: выбралі добрую пазіцыю для мінамётаў, прыстраляліся танкі, і цяпер асцярожна, не дужа вытыркаючыся, пайшла наперад пяхота... І ты адно можаш рабіць: чакаць. Калі паспее сувязны і Пажогавы кулямётчыкі ўдараць раптоўна ад хвойніку па мінамётчыках, знішчаць іх... Эх, каб паспелі! Тады нешта зменіцца. Але ж яшчэ невядома, што там, дзе трымае абарону рота Пажогі. А што, калі і там вось гэткае?.. Сувязь... Эх, каб была сувязь... Ціхан разумна марыў. Ды, зрэшты, хто не марыць разумнае? Табе б, скажам, зараз тую гарматку, што была ля Дзвіны! Ды тую нечаканасць, што выручыла цябе ў баі ля старых дотаў! Тады атрад падпусціў калону зусім блізка, ударыў амаль ва ўпор, ударыў знянацку. І гармата лупянула прамой наводкаю па адным танку, а другі запаліў Жвірбля. Усё, як у тым баі,— два танкі... Толькі гарматы няма. І няма Жвірблі. І вораг ужо не той, тут табе не санны ланцуг сп'янелых ад вайсковай удачы салдат, якія не бачылі партызанскай засады, наляцелі на яе не ў лесе, а на адкрытым полі, у зацярушаных снегам старых акопах...

Цяпер ты бачыш ворага гэтак жа, як і ў той раз. Толькі ж цяпер і сам бы на далоньцы! Вунь ідуць салдаты! Ідуць смела, разумна, не падстаўляючы сябе пад кулі. Хай абза-

вуцца толькі твае кулямёты — умомант накрыюць іх снарадамі. Не, не так ты ўяўляў сабе бой на гэтых пагорках. Ты думаў, што ляспуцца на фугасах танкі альбо шпокнуць па іх бранябойкі. А пяхоту — секануць станкачы. Два «максімы» ды пяць «дзегцяроў» у роце — не жартачкі! Але ж усё павярнулася не так, як разлічваў Файзуло. Усё пайшло не так, як хацелася табе асабіста. І ты змушаны весці бой, умовы якога табе павязалі і які адразу складвасцца няўдала, зусім не на тваю карысць. Змушаны? Дзе ж змушаны! Хіба не ты гэта рыў тут акопы? Хіба не ты захапляўся вайсковай мудрасцю Файзуло, які, выкарыстоўваючы вопыт абароны ля Дзвіны, і тут зрабіў падманную лінію абароны, ніжэй і вышэй, за дарогаю, і яны, тыя падманныя акопы, прынялі зараз на сябе асноўную частку знішчальнага агню. Але цяпер вораг пачынае мясіць і тут, дзе засела рота. І ты можаш пакуль што адно толькі — глядзець! Злуй, грызі сабе локці ад ярасці — нічога не зменіцца. Можаш сто разоў аблаяць Файзуло — яго сувязны, пасланы ў роту Пажогі, усё роўна не паспее перадаць, каб ударылі з фланга. Не паспее! Вытрымка — адзінае, на што ты можаш разлічваць. Вораг пакуль што не ведае агнявыя кропкі дакладна, не ведае моц абароны. Таму — чакай. Чакай, пакуль варожыя ланцугі не наблізяцца. Падпусціць іх крокаў на трыццаць — мінамёты тады будуць маўчаць, каб не зачапіць сваіх.

«Адзіны... Гэта адзіны наш шанц!»

Свежы вецер ад возера каціў па траве дым выбухаў — на адлегласці ён выглядаў прыгожым сіне-белым клоччам, як туман,— і нізкія ланцугі салдат быццам плылі ў дрогкім вясёлкавым мроіве. І гэты прыгожы дым, і гэтая вясёлкавая імгла, за якой доўгімі перабежкамі прасоўваліся наперад шараватыя постаці, быццам анічым не пагражалі, не таілі ў сабе аніякай небяспекі. Але вось дым пагнала ў траншэю, толькі смурод пачаў душыць, вочы слязіліся, і Захар працягла, з надрывам, закашляўся.

З-за паваротні траншэі выбег Файзуло, прыпаў тварам да амбразуры ў бруствера, сыпануў скарагаворкаю, як пачаў маліцца, зноў заківаў галавой з боку на бок:

— Ду-уб я стары! Цяпер мае ногі задзяруцца ў неба!

— Ты сёння бы той мула: ныеш, стогнеш. Адзінае ў нас выйсце: чакаць і падпусціць ушчыльную. Загадаў роце?

І нешта імгненна змянілася ў твары Файзуло, у абліччы, вочы звузіліся, суровыя складкі ляглі ля вуснаў, сціснутыя ў кулакі рукі зламалі звялыя палыны ў нішы бруствера:

— Загадаў кожнаму, таварыш камандзір. Мы іх навучым свабоду любіць! Гэтак жа, як тады з маім камбатам,— на

пятнаццаць крокаў надпусцім. Галава ў майго камбата ведала, што рабіла...

— Дзіўна,— прамовіў Захар, прыгнечаны тым, што Файзуло сваім напамінкам пра Ягора як бы ўпікае яго, камандзіра атрада.— Мы ж маўчым. А яны — перабежкамі.

— Быстрыца ім у памяці. Бобу яны там нашага наеліся. До-обра наглыталіся. І танкі — вучаныя. Як ведаюць, што фугасікі іх чакаюць,— спыніліся.

— «Дзегцяры» ў цябе надзейныя?

— У маёй роце ўсё надзейнае: і кулямёты і кулямётчыкі...

У тугім і напружаным, як спрасаваным, паветры прыгожа і весела пакацілася бясконца доўгая чарга станкача:

— Та-та-та-та-та-та-та-та-та...

Захар ярасна вылаяўся:

— Дзе тваё пятнаццаць крокаў? Гэтак у цябе выконваюць загады баявыя? Э-э, партачы!

Файзуло садраў з галавы фуражку і гэтак злосна хваснуў ёю сябе па калене, што яна вылецела з пальцаў на дол і пакацілася.

— З ветру не пашыеш халата, з баязліўца не зробіш джыгіта,— прахрыпеў ён і нешта часта-часта, але знаёма, залапатаў на сваёй мове, і Захар здагадаўся: пачаў лаяцца.

Нізка над траншэяй з чмяліным гудам візгануў снарад, і грымлівы выбух зліўся з траскотным выбухам міны, якая ўзарвалася ля кулямётнага бліндажа; з хлябістым клёкатам пырснулі асколкі. Міжвольна прыгнуўшы галаву, Захар скасіўся на Файзуло. Той схапіў з долу фуражку, абтрос яе і націснуў на бакавіну бруствера сабе пад падбародак і нешта ціха, як замову якую, мармытаў, узіраючыся ў бок бліндажа. Чорны дым і пыл закрылі амбразуру і верх бліндажа, але праз гэтую чорна-жоўтую каламуць, як бы з-пад зямлі, драўся да святла, пырхаў вузкімі барвовымі крылцамі жвавы агняны мятлік. Шырокае барвовае кола раптам зглынула яго, у снарадным выбуху адразу зглухла, абарвалася вясёлае татаканне кулямёта.

Файзуло павярнуў галаву, прыціснуў шчакою фуражку, губы яго пакутліва выгнуліся:

— Накрылі... Другім снарадам — дакладна. Але ланцугі цяпераха добра павярпуліся... Зараз, на нашым схіле, яны як на блюдка сядуць — аніводнай схованачкі, аніводнага пагорачка...

— «Максім», падобна, дзеля гэтага і ўдарыў! Хто там першым нумарам? Кімстач?

— Ён. Арол з арлоў. Давайце ракету... Не, трэ крышку счакаем.

— Спяшацца няма куды. Адно хіба, як ты казаў,— і торкнуў рукою ўверх,— на неба. Але яно ад нас не ўцячэ,— і ўзяў у руку ракетніцу.— Чатыры перабежкі ім дамо... Давай лічы!

— Адна,— урачыста зларадным голасам прамовіў Файзуло.— Могуць уварвацца ў акопы!

— Рыхтуй зброю на льва,— адчайна і весела прамовіў Захар і, выцягнуўшы кардонную гільзу з шырокім зялёным капсулем, дзьмухнуў на яе і зноў увагнаў у кароткі шырокі патроннік ракетніцы.

— Марудзяць, аднак... Э, другую перабежку пачалі. Другая!

— Добра лічыш!

Захар прымерыўся, змружыў правае вока. Ён стрэліць не ў неба! Стрэліць па гэтых мышастых фрэнчах. Можа, у каторага гада і пацэліць...

«Маторы! Ці не танкі пайшлі? Не, ззаду грыміць!..»

Ён здагадаўся, што чуе не гул танкавых матораў — гул каціўся не па зямлі, а ўвысі за спіною,— і, трымаючы цяжкую ракетніцу ў правай руцэ, азірнуўся і сустрэў позірк Файзуло, але нічога не прачытаў у яго звужаных, як бы глыбока схаваных, вачах.

— О-о! Цяпер гэтыя тры ішакі на нашу душу,— без жаху, нават з усмешкаю, але нейкай трывожнай і таропкай, сказаў Файзуло.— Ну, камандзір, рыхтуйся. Яны нас у неба разам з капытамі завалакуць. Узні-і-імуць! Ха-арашо заходзяць...

— Дык радуйся,— нічога лепшага не знайшоў Захар і дадаў, падрабляючыся пад настрой Файзуло: — Арламі ў неба! У нябёсах пакружым!

Скоса зірнуў на неба, дзе цяпер пранізліва звінелі маторы самалётаў, і, як знямелы, утаропіўся на нейкі міг позіркам на белыя, падобныя на снегавыя гурбы, воблакі. Калі ён ехаў сюды, на абарону роты, воблакі былі ля сонца, а цяпер, разваліўшыся, распаўзліся па небе, і адтуль, з-за іх, адзін за адным вываліліся тры самалёты і, зніжаючыся ў развароце над возерам, вярнулі сюды, на ўзгорак. Не памыліўся Файзуло, правільна ўгледзеў — тры самалёты. І як нізка ўжо яны ідуць, над вострым вуглом, як пікіруюць. І як жа магутна, зусім незнаёма, равуць маторы, і ўсё набірае моц, сыплецца на зямлю сталёвы роўны гул. І нейкія кароткія ў іх тулавы. І — чорныя! Відаць, таму, што з-пад сонца заходзяць! Та-ак, правільна казаў Файзуло: гэтыя, і сапраўды, разам з

капытамі ўзнімуць у неба. Можа, толькі траншэя ўратуе? Разумна рабіў яе Файзуло, гнаў звілістую, вузкую.

— Пайшлі... Чацвёртая! — Файзуло гукнуў сіпатым галасам і закашляўся.— Ракету, камандзір! Сігналь!.. Агонь!..

Угінаючы галаву ў плечы ад гулу матораў, Захар ціснуўся да сценкі траншэі, быццам сіліўся зліцца з ёю, зашыцца ў глыб зямлі, і адначасова ўзнімаў правую руку. Спуск лёгка паддаўся націску пальца, рука тарганулася, стрэл з ракетніцы пэхнуў глуха. Камяк зялёнага агню, быццам прапароўшы шэрыя ланцугі, мільгануў над імі і паляцеў за дарогу, набіраючы вышыню над танкамі.

Захар сунуў ракетніцу ў сумку, нават торкнуў у вечка раменьчык, акантаваны на канцы бляхаю, і схапіўся за аўтамат. Прыгожа, весела рванулася знаёма доўгая чарга «максіма», сухой скорагаворкаю зайшліся ручныя кулямёты; траскотна, як бы спяшаючыся не адстаць, сыпануў аўтаматны гарох. Стрэлы свайго аўтамата Захару здаліся слабыя, але плячо адчула знаёмае туканне металёвай планкі прыклада.

«А Файзуло на неба ўсё глядзіць!..»

— Самалёты — чорт з імі! Чаго вочы на іх дзярэш! — Захар аж ашалеў і ад ярасці, і ад свайго крыку, і ад злосці на Файзуло, які задраў галаву ў неба.— На зямлю глядзі! Галоўнае — растрэсці, збіць са схілу ланцугі!..

Ён зразумеў яшчэ, што крычыць, быццам бароніцца крыкам ад рову матораў увысі. Праз сяйво страляных гільзаў, што чорным бобам сыпаліся за бруствер — некаторыя нават падалі на запясці, стукалі па плячах,— Захар бачыў, як ламаюцца, курчацца на схіле вышыні постаці ў мышастых фрэнчах. Трымцела пад шчакою жывая, ужо не халодная і каляная дзеравіна прыклада, і Захар, прыціскаючы яго шчыльней да скуры, даў чатыры доўгія чэргі і адразу пачуў, што затвор адскочыў назад і знерухомеў на баявым.

«Няўжо дыск пусты? Так, пусты...»

Захар выхапіў з нішы запасны, прыставіў да проразі і моцна пляснуў далонёю па канцы; заганяючы дыск, адчуў пад рукой рух металёвай зашчапкі і, аглушаны не страляніною, а пранізлівым выццём матораў, учуў нейкі слабы, як падалося, але працяглы, збянтэжаны і здзіўлены голас Файзуло:

— Н-на-а-шы!

Захар перавёў позірк з рукі Файзуло, задранай угару, і вочы ўперліся ў чырвоную зорку на цёмна-зялёным тулаве самалёта. Спачатку нават не захваляваўся, падумаўшы, што прымроілася, падалося, і толькі праз імгненне, убачыўшы гэт-

кія ж зоркі на крылах, зразумеў, што бачыць не варожыя самалёты. Цёкнула, даўшло, прабіла сэрца, бы гарачай стрэмкаю: нашы! Гэта ж нашы самалёты!

Ён не адразу зразумеў, што плача ад радасці. Чырвоныя зоркі раптам здаліся большыя за самалёты, яны заслалі яму вочы мігатлівай мярэжкаю, і праз гэтую танку ён бачыў зоркі і на крылах і на фюзеляжах і зразумеў, што самалёты тут не выпадкова апынуліся.

«Ціхан жа казаў... Гэта ён штурмавікі сюды паслаў!»

Самалёты ішлі да зямлі з нахілам, быццам валіліся на левыя крылы, і Захар пачуў радасныя воклічы ў акопах і злева і справа і сам, адчуваючы боль у перасохлым горле, хацеў зараўці нешта радаснае, але ад болю, што гарачым яблыкам асеў у горле, папярхнуўся, нешта вякнуў, зяваў ротам, як не дыхаў, а выплёўваў смярдзючае ад толавага смуроду паветра.

«Могуць не заўважыць карнікаў! І паляцяць далей!..»

Прыгаломшаны гэтай думкаю, адчуваючы на грудзях, плечах і хрыбціне звілісты рух халодных пацерак поту, ён ліхаманкава нагнуўся, ірвануў раменьчык палявой сумкі з такой сілаю, што з кончыка, бы куля, пырхнула бляшка акантоўкі. Дрыготкімі пальцамі ён увагнаў новую папяровую гільзу ракеты ў патроннік і націснуў халодны спуск. Зялёны камяк агню яшчэ апісваў дымную дугу над грудком ля сасонніку, а Захар зноў выпусціў ракету з ракетніцы, стрэліў вышэй, над ланцугамі салдат у мышастых фрэнчах, якія варушыліся, распаўзаліся па схіле. Зялёная зорка ракеты завісла ў небе над пагоркамі, і, як бы насустрач ёй, з-пад крылаў самалёта вываліліся чорныя слівінкі і ляцелі да зямлі не роўнай лініяй, а наўскасяк, адна над аднОй, лесвічкаю.

«Заўважылі! Зразумелі! Б'юць па фрыцах!..»

Захар бачыў, як строма развярнуліся над возерам два самалёты, валіліся амаль адвесна на сівы каля дарогі соснік. Гайдануўся, як выскачыў з-пад локця, мяккі бруствер, дугнулася, як жывая, тузанулася пад грудзямі сценка траншэі, а другая дала ў плечы, кінула наперад, потым зноў пругка і цвёрда піхнула назад, і Захар убачыў мігатлівыя палосы бляклага, малінава-белага агню, якія ліліся з носа самалёта, што ішоў нізка, быццам цэліў у стары руды чарот на беразе возера за дарогай. У вушах — Захар бразнуўся галавой у цвёрдыя каменьчыкі на кромцы траншэі — звінела ад частых выбухаў. Чорныя султаны дыму гайдаліся над грудком і дарогай, а шэра-бурая хмара, звіваючыся, распаўзлася над маладым соснікам. Траскотныя, як перуны, выбухі на нейкае імгненне прыглушылі жалезны роў матораў, гыркат кулямё-

таў, і з гэтага грымоцця дзікай потаю прарываўся свіст асколкаў і трэск куль.

Захару на міг падалося, што неба складзена з дзвюх частак: верхняй, празрыста-сіняй, з белымі аблокамі, і ніжняй, якая асела над возерам, дрогкім сівым соснікам, і толькі яе, гэтую ніжнюю палову неба, імкліва крояць роўныя, як нажы, малінава-белыя нікі агню, спавітага чорнымі закруткамі; зрэдку гэтыя нікі перакрыжоўваліся, праскоквалі адзін праз адзін, не зломваючыся, не губляючы сваіх колераў.

Шалёна равучы маторамі, выскокваючы з гэтай ніжняй памутнелай паловы неба, самалёты амаль вертыкальна завінчваліся ў чыстую блакітную высь і, як бы адпіхнуўшыся ад яе, зноў валіліся ўніз, выставіўшы перад сабою мігатлівыя малінава-белыя нікі агню. Захар, увесь час адчуваючы то слабае, то дужа моцнае дуганне зямлі пад сабою, прагна цікаваў за гэтымі агнявымі палосамі, глядзеў прагна, напружана, да болю ў шырока адкрытых вачах, нібыта ўсё яго жыццё было пастаўлена ў залежнасць ад таго, ці здолее ён прасачыць за кожным рухам самалётаў, захаваць у памяці кожнае адцення грымоцця, што трэсла задымленае, прасмярдзелае толам паветра над пагоркам.

Адзін самалёт, вырваўшыся з памутнелай палосы над дарогай, як бы перакуліўся з аднаго боку на другі, нізка дужа, дзіўна пагойдваючы крыламі, прамчаў усцяж партызанскай абароны, і Захар убачыў пад празрыстым, як са шкла, каўпаком вясёлы твар лётчыка, нейкую вялізную, чорную і ўзнятую прывітальна руку. Рука лётчыка зрабіла нейкі рух, падобны на прывітанне, але цяпер рух гэты быў злева направа, у бок дарогі, падобны на загад узнімацца і ісці наперад.

«Падалося? Ці сапраўды рука зрабіла знак ісці наперад?..»

Цярнуўшы рукавом па твары, Захар імгненна, як сагнаў, сцёр з вачэй мітуслівую імглу і выразна ўбачыў дымныя факелы над танкамі і грузавікамі, згледзеў, як адпаўзаюць па схіле, быццам коцяцца мяхамі, фашысты, і, яшчэ як след не асэнсаваўшы ўбачаны знак лётчыка, абапёрся левай рукою на прыклад аўтамата, а правай адпіхнуўся ад задняй сценкі траншэі. Але ўжо ў наступны міг, калі ногі яго адарваліся ад зямлі і правае калена ўперлася ў нішу пад бруствeрам, ён ужо ведаў, што і як яму трэба цяпер рабіць, і закрычаў:

— За мно-о-ой! Ур-р-ра!..

Ён лёгка перакінуў сваё цела, якое зрабілася лёгкім, быццам без вагі, цераз бруствер траншэі і адчуў, як злева і справа пакацілася чамусьці таксама слабае, як і яго голас, расцягнутае і сумбурнае:

— ...р-ра-а-а-а...

Раскатны гук асеў у вушах раптоўна, асеў бясконцым бомканнем, якое не мянялася і не знікала, і ўсё наўкола як бы адступіла некуды ўбок, адгарадзілася празрыстай заслонай, за якой апынуўся і роў самалётаў, і мяккія, слабыя выбухі справа, а тое, што бачылі вочы, гэтак жа, як пядаўна неба над галавой, падзялілася на два малюнкі, зробленыя ў розных памерах і колерах: далей ад Захара былі цяпер раптоўна пачарнелыя ланцугі салдат, і адзін канец іх, злева ад дарогі, каціўся да зеленаватых плям у нізкім леташнім трыснягу, а другі вярнуў да сосніку і як бы імгненна раставаў у ім; блізка ж, як дакрануцца рукой, матаўся ланцужок мышастага колеру, рэдкі, як бы састаўлены з мітуслівых і вёрткіх постацей. Бліжэй ад усіх у гэтым мышастым ланцужку была спіна маленькага салдата, тоўсценькага, у расшпіленым фрэнчы, які матляўся ў салдата пад рукамі, быццам яго ўвесь час трэслі і падкідвалі, і Захар, не цэлячыся, не ловячы прыцэльнаю рамкай тонкую мушку на канцы аўтаматнага ствала, паласнуў кароткай чаргой па гэтай спіне. Салдат хіснуўся наперад, потым назад і, выгінаючыся, нейкае імгненне стаяў, не валіўся на зямлю, і Захару падалося, што ён зараз наскочыць на яго, тыцнецца носам у тоўстыя перакошаныя плечы. На правай бартавіне фрэнча дзіўнай зоркай бліснуў адбітак сонца на белым гузіку, і, нібыта ад гэтага бляску, салдат грымнуўся на спіну, амаль пад самыя ногі Захару. Твар гэтага салдата Захар убачыў, але ўбачыў не ўвесь, а толькі тоўсты чырвоны нос, белую шчаку і чамусьці чорныя, як бы запэцканыя зямлёю, губы.

## 14

Ад святла ветаха кожная бульбіна ў кашы выдавала гладкім шэрым мячыкам, а тоўстыя кароткія парасткі льсніліся, быццам змазаныя алеем. Спачатку, як толькі ўзяліся саджаць бульбу — Артур цягнуў кош з насенкаю, Багдан вёў каня за аброць, а Клубіч ішоў за плугам,— Артур браў кожную бульбіну асцярожна, баючыся паабломваць парасткі, але праз гадзіны паўтары, адчуваючы, што працы яшчэ хопіць да світання, выхопліваў іх паспешліва, кідаў у разору размашыста, амаль не гледзячы.

Ветах, узняўшыся ўгару, збялеў, алівавая скібка зарава над лесам здавалася рэдзенькай, як блізкі світанак, і хоць вочы цяпер прызвычаіліся да сумятлівых і дрогкіх ценяў ночы, Артур зусім не бачыў бульбіны, якія кламіся ў разору,—

вочы рэзала ад поту, які сцякаў з ілба на бровы мяккімі буйнымі кроплямі. За спіной форскаў стомлены конь, мякка чмякалі па сырым ворыве капыты і дробна, як хто пстрыкаў па блясе, венькалі цуглі, і нешта ўсё насвістваў і насвістваў, як падганяў, Багдан. Шчымелі далоні; пальцы ўвесь час муляла, аж рэзала, ручка каша, зробленая са старой, спрэс у вузлах, вяроўкі.

Артур усё часцей спыняўся, апускаў кош на зямлю, аціраў твар ад поту, але спыняўся не ад стомы, а каб падагнаць Багдана, які, як яму здавалася, усё марудней працуе. Спыніўшыся, Артур адразу чуў вясёлы голас Санько і раскацісты смех Зімніцкага — на суседнім полі, за нізкімі, як бы зрослымі ў адну суцэльную сцяну вербамі, працавала на пасадцы бульбы яшчэ адна, гэткая ж, з трох чалавек, брыгада — і клікаў, падахвочваў Багдана ісці хутчэй — не адставаць.

— Іду, іду! — Багдан штораз адгукаўся аднастайна, стомлена, бы нудна спяваў.— Іду, іду... Каня вяду...

— Слаба ты неяк ідзеш! Яны там, за вербамі, апошнюю баразёнку, мабыць, гоняць. А мы шчэ і ў палавіну не ўбіліся.

— Э-эх, ночка ўся наперадзе! Паспеем,— нечакана падтрымаў Багдана Клубіч.— А ты, быццам жалезны конь, цягнеш!

— Ён не жалезны! У яго інтэрас жалезны — змыцца з поля!

Артур употай усміхнуўся: жалезны — дык жалезны. І тое, што кажа Багдан, зрабіць пякенска было б і даўно — змыцца адсюль. Сказаў толькі памяркоўна, як бы суцяшаючы і аднаго і другога:

— Марудзіш калі, дык шчэ больш стамляешся. Хутчэй скончым — адпачнём хутчэй.

Адпачываць, аднак, Артур не збіраўся. Пасадзяць бульбу, і ён у той жа міг пліткане з поля — памчыць да Рымы. Рыма — яна ўжо другі дзень у атрадзе, па сакрэту сказала, што прыслана па загаду Ціхана трымаць сувязь са штабам злучэння, бо абароне дарогі між азёрамі надаецца выключнае значэнне,— сказала сёння ўвечары, калі ён выпраўляўся сюды, на пасадку бульбы, што не засне, пакуль ён не вернецца, будзе чакаць. І чакаць не ў хаце, а, як і ўчора, на вышках хлеўчука, што стаіць у канцы саду, амаль на самецькім беразе возера. Цікава, што парабляе Рыма зараз? Ведама ж, не спіць, яго чакае...

У скронях аж зазвінела ад гэтай думкі; знікла стома, падступіла да сэрца злосць на Багдана. Каб не частыя перакуркі,

якія патрабаваў Багдан, можна было б ужо і скончыць тут працу. Гэтулькі часу змарнавалі! А ён, Багдан, па-ранейшаму не вельмі да працы гнецца, усё пнецца языком наболей намянціць, смехаточкі ладзіць...

У канцы разоры, ля вербаў, Артур моўчкі саступіў убок, даючы магчымасць Багдану павярнуць каня на неўзараную палосу поля. З-за цёмнай ільснянай сцяны хмызняку пачуўся вясёлы голас Санько:

— Гэ-эй, разведка! Давід у вас пачуе?.. Няма?.. А дзе ж ён падзеўся?

— У нашых баразёнках няма. У сваіх шукай,— гукнуў Клубіч.

— У сваіх пашукалі. Сарвець насяўную — насенкі ж няма!

— Насенкі! Табе кваску Давідавага хочацца,— пажартаваў Багдан.

Санько ступіў на неўзараную палосу поля, прысвіснуў, адплачваючы Багдану:

— Ю-ю!.. Багдан усё яшчэ гэтую цаліну дзяўбе. Мы ўжо на другі кліп правім! А ён шчэ з намі спаборнічаць меўся!..

Багдан адгукнуўся заклапочана, як бы шукаў спагады і дапамогі, як бы шчыра віпіўся:

— Конь нагу згубіў. І аніякай рады не дасі. Уночы нагу тую зноідзеш хіба? А зноідзеш нягеглую якую-небудзь, дык жа ж і не паставіш на тое месца, дзе была!

— На цыгарку маеш? Дамо тады рады вашаму каню — на нашым полі запасных ног процьма.

— Навальваіцеся, пагарэльцы, навальваіцеся. Бярыце капшук, рабуіце чалавека праведнага і святога.— Багдан выпусціў з рукі аброць, наважыўся рабіць перакур.

Туман нечакана пачаў радзець, як быццам высушаны святлом ветаха, знікаў, і пакрысе рабіліся бачныя квадраты спаленых танкаў, ствалы гармат на іх выдавалі нейкія кароткія і тоўстыя. Танкі быццам рухаліся сюды, у бок поля, як памалу выпаўзалі з туману, і Артур здзівіўся, што ніхто гэтага не заўважае. Санько свіснуў, з-за вербняку выкаціўся, быццам толькі і чакаў сігналу, Зімніцкі, і яны смела і ўвішна ўчапіліся ў капшук, які Багдан выцягнуў з кішэні, скруцілі цыгаркі, дружна задымілі і, замест падзякі, наваліліся з жартамі.

— Слабую, Багдане, склеіў ты брыгаду,— пачаў «заводзіць» Багдана Зімніцкі.

— Не сказаў бы. Брыгадка пенкна, як кветка серад летка.

— Але вось брыгадзір падводзіць,— уставіў Сапько.— Усё сіліцца ён баразну ў бок возера гнаць.

Рагаталі дружна, кожны лічыў сваім абавязкам уставіць пейкую падрабязнасць з таго выпадку, калі Захар, угневаны тым, што гаспадарчы ўзвод сарваў напрадвесні рамонт і выраб новага абутку, загадаў адвесці намесніка камандзіра гаспадарчага ўзвода — на ім ляжала адказнасць за працу майстэрняў,— каб той узарваў чатыры рэйкі, але ішоў у самых драных чаравіках. Гэтая гісторыя мела, бадай што, болей варыянтаў і варыяцый, чым гісторыя са штанамі, якія Багдан мяняў на гарэлку, і таму цяпер, варта было толькі зачапіць яе, жарты, бы з меха, пасыпаліся.

Калі рогат пачаў сціхаць, ад палосы хмызняку пачуўся ціхі, пакрыўджаны голас Тарлера:

— Хацеў бы я ведаць, хто прыдумаў гэты Давідаў квас?

Тарлер, які, нікім не заўважаны, высунуўся з хмызу і цяпер стаяў у чорнай разоры, здаваўся маленькім, кволым і раптам выклікаў дзіўную спагаду ў Артуравым сэрцы, і ён, сумеўшыся, спытаў вінавата:

— Вы ж, напэўна, хочаце пачуць праўду?

Запытанне не знайшло падтрымкі, яго сустрэлі неадабральным маўчаннем, быццам здраду жартам і смеху, што толькі нядаўна гучалі тут і кожнага бадзёрылі, і гэтае асуджэнне Артуравай шчырасці Тарлер, мабыць, зразумеў.

— Адпойчы мой пляменнік — скажам, яго звалі Сёма — учуў на вуліцы благую мянушку пра свайго тату і паўтарыў яе ў хаце. Бацька ўдумаў ударыць свайго сына. І я сказаў: Арон, ты вучыў сваіх дзяцей, каб яны казалі табе толькі праўду. Ты пачуў праўду ў сваёй хаце і хочаш ударыць за яе свайго сына. Але ты ўдарыш не дзіця, ты ўдарыш праўду і страціш права патрабаваць яе ў другі раз. І Арон не ўдарыў свайго сына. І тады мой пляменнік паглядзеў на мяне і на свайго бацьку і зразумеў: ёсць чыстая праўда. Але ёсць і брудная праўда...

Алегорыя была празмерна празрыстая, каб яе не зразумець, і Артур сказаў памяркоўна, каб не абражаць Тарлера:

— Вы зараз чулі брудную праўду.

— Ты гаворыш разумна,— без горычы, з ранейшай дабрадушнасцю адзначыў Тарлер.— А той, хто гаворыць разумна,— чалавек мудры...

— Наш брыгадзір му-удры,— падаў голас Сапько.— А чаму? — ён запытаўся рашуча, і ў запытанні было абяцанне даць поўны і аб'ектыўны адказ, і ўсе гэтага чакалі.— А таму, што Давідаў квас паважае!

Багданаў голас узвіўся радаснай нотаю:

— Давід, каханы ты наш! Правер зараз жа ўсе да адзінай біклагі! Правер усе да адзінай, дарагі камандзір узвода!
— Я — намеснік.
— У добрага намесніка — уся ўлада. Будзеш ехаць сюды зноў — патрусі ўсе каністрачкі па два разы кожную. Ці хочаш, дамо табе памагатага?
— Спраўлюся і сам. Вялікага, адразу кажу, не абяцаю...
Багдан ляпнуў Санько па плячы:
— Пачынаем спаборніцтва. Хто першым завяршыць поле — да таго першым і едзе гаспадарчы ўзвод з каністрачкаю. Прымаеш?
— Нам, татарам, усё адна!

Бліснулі і згаслі за дрэвамі чырвоныя кропкі цыгарак; зарыпелі калёсы. Услухоўваючыся ў звяглівае рыпенне блага падмазаных колаў, якое аддалялася і раставала ў цемры, Багдан з нечаканай сур'ёзнасцю, глухаватым голасам, прамовіў:
— Паміраць збірайся, а жыта засявай, як гаворыцца. Рушылі? Трэба ж гэтых лайдакоў абштопаць,— лагодна, са спачуваннем, прапанаваў: — Можа, каня павядзеш? А я — кош пацягаю.
— Я не стаміўся.
— Ну, глядзі. Будзе цяжка — скажаш...
Артур зноў цягнуўся з цяжкім кашом па свежай разоры, зноў чуў за сваёй спіною знаёмае форсканне каня, топкае венькапне цугляў, размеранае цокканне капытоў. Багдан толькі насвістваў нешта новае, насвістваў імпэтна і ўзрадавана. Цяпер ужо ён надспешваў, падганяў Артура, і гэта цяпер заспакойвала: добра, што Багдан кінуў лайдачыць, пасадку цяпер яны скончаць да світання. Колькі тут ужо і засталося тых баразнаў прагнаць!
Артур неспадзеўкі адчуў тыльным бокам далоні і кончыкамі пальцаў, што зямля ў разоры вільготная, дужа халодная, а кожная новая бульбіна цёплая, нібыта ўгрэтая; гэткімі ж цёплымі здаліся і тоўстыя, але мяккія, як з гумкі, кароткія парасткі, якія прыемна, як дзюбкі кволага птушаняці, нясмела цёкаліся ў скуру, і ён, баючыся іх абламаць і пашкодзіць, з вялікай асцярогаю апускаў у цёмную пашчу разоры бульбіны і з радасным здзіўленнем і захапленнем заўважаў, што яны не губляюцца ў чорнай раллі, а жаўцеюць светлымі жывымі плямкамі.
Гадзіны праз паўтары, якраз у той момант, калі ад дарогі, у бок поля, павярнула фурманка, знаёма парыпваючы коламі, з-за белаватай сцяны хмызу — туман гусцеў цяпер там, як нерапоўз ад бярозавых прысад у заглушш вербняку — выбег Санько, урачыста абвясціў:

— Ур-ра! Наша ўзяла! — і, схапіўшы за аброць каня, на якім прыехаў Тарлер, пакіраваў фурманку на сваё поле, высакародна супакоіўшы перад гэтым Багдана: — Давядзеш апошнюю, Багдане, барозначку — да нас, пераможцаў спаборніцтва, усёй брыгадкаю. Не абдзелім. І без вас усю бульбу з прыску не выграбем.

— От жа шэльма! — Багдан вылаяўся нязлосна.— У іх жа конь — звер,— і, як бы апраўдваючыся перад Артурам, дадаў: — І зямля мякчэйшая. Не наш суглінак!..

Давёўшы апошнюю баразёнку, ён, аднак, не марудзіў, заспяшаўся на суседняе поле адразу ж. Артур ісці туды адмовіўся, і гэта не дужа засмуціла Багдана, ён нават і ўзрадаваўся.

— І разумна робіш,— лагодна ўхваліў ён.— Хоць паспіш па-людску,— і дадаў, быццам менавіта ён навінен быў усім распарадзіцца і ўсё загадаць: — Каня расцугляй, хай травіцы пашукае. Хаця, Клубіч ужо здагадаўся. О, малайчына! Ну, спі, добрае каб саспілася.

Артур і хвілінкі не затрымаўся на полі. Вузкая мяжа вывела яго на дарогу, і ён, упрыдбег, весела пасвістваючы, прашнураваў па ёй крыху, потым пераскочыў канаву, крута заламіў у нізіну і адразу ж адшукаў знаёмую сцежку. Тут ужо і недалёка Быстрыца. Ву-унь ляжаць на пагорку валуны. Ад іх ён наверне ўлева і ўсцяж ручаіны, што выводзіць да возера, умомант дабяжыць да пасёлка, да старога хлеўчука, што стаіць пры саменькім беражочку над вадой, побач з пахілымі лазінамі. Нешта як бліснула ў тым баку. Злева, якраз дзе сцежка верне да возера. Не, гэта запальнічка пстрыкнула ля валуноў!..

Артур прыгнуўся, садраў аўтамат з пляча, завучаным рухам смаргануў рукаятку затвора.

— Артур! — выразна прагучаў Захараў голас.— Куды імчыш? Што, скончылі пасадку?

— Так, цалкам. Хлопцы падсілкоўваюцца. Бульбу ў прыску напяклі. Тады толькі тое, што за дарогаю. Санько тое даручана.

— Іш ты, бульбы напяклі! Загадана агнёў не паліць уночы!

— Увечары цяпельца расклалі. У вароцы ад снарада. Ані полымя, ані дыму.

— А ты чаго ж іх кінуў?

— Не хочацца есці,— схлусіў Артур, вырашыўшы, што пра Рыму яму казаць нельга, што трэба за сабой сачыць, каб не прагаварыцца, бо тады зноў пачнуцца кепікі.— Лепей пасплю...

— Сядай, хвілінačку пасядзі. А потым набяжыш.— Крыху счакаўшы, пакуль Артур прымошчваўся побач на зямлі, дадаў: — Удумаў я, тут седзячы, заіздросціць вам, маладым... Смех у вас там на полі, жарты... Санько пацяшаў?

— Ды ўсе патрошку — яно і весела. Не дужа стамляе тады і праца.

— Гэтак яно, пляммяш, гэтак. А я вось сяджу, галаву сабе ламаю. А што рабіць — не ведаю. Ссў бы дурны акупь у нерат...

Захар маўчаў, і Артур, не дачакаўшыся аніякіх тлумачэнняў, здзіўлена выціснуў:

— Як жа тое сталася?

Зноў цягнулася маўчанне, і яно бянтэжыла Артура. Дзіўна неяк паводзіць сябе дзядзька Захар. Няўжо спецыяльна чакаў яго, Артура, тут, каб паскардзіцца, паказаць сваю слабасць? Ён, камандзір атрада, не ведае, што рабіць? Ды смешна ж гэта! А можа, за той час, што яны саджалі бульбу, нешта здарылася, нешта непрадбачанае, жахлівае?.. Але ж аніякай страляніны не чутно, нават канапада аціхла, што гула ўдзень і ўвечары, зусім растала зарава пажару, якое было добра відаць з поля, дзе саджалі бульбу. Магчыма, пагорак захінуў тое зарава? Не, скрозь далягляд цёмны. І яшчэ больш белым зрабіўся сярпок ветаха, што вісіць нерухома ў зорным, бы ў мароз, небе.

— Як жа тое сталася? — спытаў Захар і нечакана прыгарнуў Артура да сябе, уваткнуўся падбародкам у Артурава плячо, загаварыў марудна, задуменна і роспачна: — А проста, дружа. Мне, дарагі ты мой, увесь час здаецца, апошнім часам здаецца, што гоняць яны нас у мех, бы дурнога рабенькага коціка. Усё злучэнне — у баях. Усе, лічы, атрады нашай брыгады — штодня адбіваюцца ад фрыцаў. А тут — курорт. А тут — цішыня! Ціхан некалі казаў: браму твой атрад вартуе. Пры самай важнай браме атрад стаіць: выспы паміж азёраў гэтых — паўночная брама ў партызанскі край. А ў яе, у браму тую, аніхто і не грукае...

Артур абурыўся, але ўзрадавана, са смяшком:

— Таму і не грукаюць, што адвучылі. Крывёю заліліся, дык і ахвоту зноў грукаць страцілі. Хто фашысту гэткага пытлю, як мы, даваў сёлета? Ды аніхто!

— Яно правільна. Але ж чаму я спаць спакойна не магу? Ціспе, вярэдзіць сэрца нейкае дурное прадчуванне: памылка, Захар!

— Якая памылка? У чым?

— У чым? — Захар папытаў ціха і тут жа адказаў шчыра, як прасіў паверыць яму ва ўсім і адразу: — Не ведаю.

І чыя памылка — не ведаю таксама. І вось сяджу, разважаю пра памылкі, якія ў мяне былі і мне добра вядомыя. Ды слухаю, як вы там па полі рагочаце. І — казаў жа табе — зайздросна: жарты, смех... А тут — скруха, бы вяроўкаю, спавіла... Вось ты кажаш, што яны ў нашу браму не грукаюць, сядзяць ціхутка, бо пыса ў крыві. А бронецягнік навошта ў тупіку на станцыі? А гарматы ля гравійкі?.. А мінамётныя батарэі за чыгункаю?.. Не-е, змыслілі яны адно — у мех нас загнаць. І ведаеш, да чаго ўсё больш і больш схіляюся, да якой жахлівай высновы прыходжу? Памылка ў тым, што сядзім тут. Дарэчы, Ромель мне пра гэта казаў. Настойліва казаў. Раней не верыў яму. А цяпер канчаткова пераконваюся: тое, што атрад і сёння ўсё яшчэ прывязаны да акопаў тут,— памылка наша! Акопы трэба было кідаць. Пасля бою — кідаць. Уночы. І — наперад!

— Як гэта — кідаць? Куды гэта — наперад?

— І прарвацца да Дзвіны,— вёў сваё Захар, не звярнуўшы ўвагі на Артуравы запытанні.— У нашы тыя лясы. На старыя сцежкі, як Ромель кажа.

— Знайшлі каго слухаць!

Захар уздыхнуў, засоп, потым прамовіў з горыччу:

— Вось і Ціхан тое ж кажа. Не, ён, мабыць, згодны са мною. Але ведае тое, што мне невядома. І не гаворыць. Як бы нейкая ў яго задума, а ён пра яе — маўчок ды губу на кручок. Хай, скажам, важны разлік у яго. А перакінуць атрад туды, да Дзвіны, каб зноў у фрыца за спіной апынуцца,— не разлік хіба? Скажы, нас што ў трохкутніку ўратавала? Гэта і ўратавала — за спіну мы ім заскочылі. Яны нас да вады ціснулі, каб у рацэ, як кацянят, патапіць. А мы? Жы-ырх — у іх за спіною. Вось ты мне скажы, што лепшае ў нашай партызанскай тактыцы можна прыдумаць?

Артур канчаткова разгубіўся. У яго просяць парады важнае, парады, ад якой можа залежаць лёс усяго атрада, лёс больш сотні людзей! І хто просіць? Чалавек, у вайсковую мудрасць якога Артур цалкам верыць, ведамі якога захапляецца, у правільнасці загадаў якога аніколі і ані не сумняваецца. А гэты чалавек, выяўляецца, зусім не гэткі і мудры, як тое здавалася, пакутуе гэтак жа, як нскалі пудзіўся Артур! А гэты чалавек, выяўляецца, разгубіўся, убіў сабе ў галаву нейкую бяду, корпаецца ў нейкіх старых памылках, шукае новыя! Ён, гэты мудры чалавек, лічыць памылкаю тое, чым ганарыцца ўвесь атрад! Перамаглі ж ворага, не здалі абарону, не адступілі!.. Дзіўныя думкі ў камандзіра атрада. І самае дзіўнае тое, што ён, гэты мудры чалавек, прыслухоўваецца да нейкага немца! Ён, гэты мудры чалавек, чамусьці просіць

парады не ў людзей дарослых, з вялікім вайсковым вопытам, з вялікімі жыццёвымі ведамі, а ў яго, хлопца маладога зусім, які нядаўна гартаў падручнікі школьныя і, часцяком, меў адзнакі, якімі звычайна не пахваляюцца. Ха! А ён жа, гэты мудры чалавек, здаралася, крычаў на яго, неразумнага, гневаўся, патрабаваў адумацца, за розум узяцца, выкінуць з галавы каханне да Рымы!..

Артуру зрабілася сорамна і брыдка за гэтую сваю зларадпасць. Паводзіць ён сябе, быццам шчанюк! Дарослы чалавек, камандзір атрада раіцца з ім, адкрыў душу, просіць парады, гаворыць з поўным даверам, разлічваючы, што шчырае сэрца перад ім!..

— Зноў да Дзвіны... У тыя нашы лясы...— Артур нетаропка паўтарыў Захаравы словы, дадаў з развагаю, сілячыся закрэсліць ранейшае здзіўленне і паказаць сябе чалавекам самастойным і вопытным: — Але хто ведае, што там зараз дзеецца? Я, напрыклад, там калі быў?.. Больш месяца мінула — нешта ж, напэўна, змянілася ля Дзвіны. Што ў тых нашых лясах? Невядома. Спачатку трэба ўсё разведаць. А тады нешта і вырашаць...

— Невядомасці хапа-ае,— голас Захара загучаў упэўнена, патрабавальна, з адценнем загаднасці: — Скажы, тої раз, калі цябе пад Баравуху пасылалі, ты на рачулцы, дзе Рэвута забілі, быў?

— Мы яе абмінулі, бо па конях імчалі. Там заглуш непралазная — на конях цяжка. Асабліва па правы бераг.

— Па левы бок рачулкі — Маразы, здаецца?

— Яны — далей. А ў тым месцы — доты паўзрываныя. Адтуль, памятаеце, цынкі цалюткія прывозілі. З Ігаркам мы там усё апоўзалі.

— З якім Ігаркам?

— З Падрэзавым сынам.

— А-а-а...

І гэтае працяглае «а-а-а» ўзрадавала Артура. Ад яго, значыцца, чакаюць канкрэтнай прапановы пра разведку да Дзвіны. Але выказаць такую прапанову камандзір атрада пакуль што сам не адважваецца, чакае, каб зрабіў тое сам Артур.

— Дзядзька Захар! Пашліце мяне туды,— папрасіў Артур даверліва, звярнуўся гэтак жа, як у тыя рэдкія хвіліны, калі забываў, што перад ім камандзір атрада.— З групаю, ведама. Праз чатыры дні — поўныя звесткі. І вусна, і пісьмова, і як хочаце.

— Пасылаў ужо трох разведчыкаў. Не вярнуўся ніводны.

— Мы — вернемся!

— Не простая задача. Не простая...

— Аддайце загад. Астатияе — проста.

— Падумаем. Ідзі адпачывай.

Артур узняўся, але вагаўся, нейкі час стаяў на месцы, чакаючы. Няўжо не будзе нейкіх дадатковых тлумачэнняў да кароткага і няпэўнага «падумаем»? Не, маўчыць камандзір атрада, сядзіць нерухома, быццам прырос плячом да гарбатага валуна.

Шыбаваў лугавінаю Артур марудна, усё спадзяваўся: спыняць, паклічуць... Не вытрымаў, азірнуўся. Няўклюдная шэрая постаць камандзіра атрада амаль злілася сваімі абрысамі з гранітам, выдавала вельмі самотнай, адзінокай. Гаруе, ведама, дзядзька Захар, нудзіцца, пакутуе... Гэтулькі бяды давялося перажыць. Цяпер зноў ціснуць горкія думкі пра нейкую памылку, не дае спакою клопат пра лёс людзей... Ды няма, няма апіякай памылкі! Фашыстаў адкінулі, акопы не здалі! Праўда, дзевяць чалавек з атрада загінула — яшчэ адна брацкая магіла пад старымі ліпамі на вясковым могільніку. Але ж выйграць гэткі бой ды не мець страт?.. Тут нічога не паробіш — у кожнага свой лёс!.. А прайсці да Дзвіны ды назад, разведаць, што там і як,— драбяза! Два дні — туды, два дні — адтуль. Дарога? Ды ён, і вочы закрыўшы, пройдзе па ёй у самую цёмную ночку! Нідзе не памыліцца! Самыя дакладныя звесткі атрымае штаб атрада!

Артур ішоў хутка. Думкі пра новае заданне, якое атрымае група, былі прыемныя: лепей за падрыўнікоў з такой адказнай справай апіхто не справіцца! Можна і сёння адправіцца. Не, лепей — заўтра. Сёння чакае Рыма! Ён папярэдзіць яе, параіцца, крыху адпачне. А заўтра, дарэчы, Харэўскі ідзе пад Зябкі. Пайсці, ведама, трэба з ім — там і чыгунку перайсці. Хочацца, ах як жа хочацца ўбачыць Дзвіну, зірнуць на яе, вясновую. Шкада, крыгалом сёлетні пабачыць не давялося. Раней, да вайны, яны з бацькам звычайна кожную вясну ішлі на Дзвіну — глядзелі, як узломвае, крышыць, нясе магутная плынь вясновы лёд. І яшчэ было цікава глядзець здаля, як узрывалі падрыўнікі вялізныя крыгі перад мостам. Аднойчы, калі бацька пакінуў яго з Маратам адных, яны панесліся туды, бліжэй да моста, паглядзець зблізку, як вухкае, выносіць выбух уверх слуп вады, патрушчанага лёду, белых пырскаў... О-ох, сварыўся бацька, калі даведаўся! Дзіўны лёс бацькаў... Сыноў усё сіліўся ўберагчы ад выбухаў надалей. А сыны вось жывыя, а яго самога няма...

Успамін пра бацьку разварушыў у душы стары боль страты. Згадалася маці, якая паводзіць сябе неразумна — усё сядзіць на тым хутары, ля самай бяды, невядома чаго

чакаючы! — і ён з даўкай горыччу зноў падумаў пра тое, што жахліва вінаваты перад ёю, і даў сабе зарок, што, вярнуўшыся ад Дзвіны, не дазволіць маці і хвілінкі заставацца ў той чужой і не вельмі шчаслівай хаціне.

## 15

*БЛАКНОТ РОМЕЛЯ. Старонка дзесятая.*

«Не сцярпеў, зноў сказаў Крупню тое, што думаю: атраду трэба кідаць лінію абароны паміж азёрамі і пачынаць манеўраванне — зрабіць тое ж, што было зроблена летась ля Дзвіны. Бо неразумна, зусім жа неразумна абараняць гэтае азёрнае дэфіле, калі бой грыміць ужо за тваёй спіною. Адно тут атрад чакае — таталь ферлорэн, поўны разгром.

Ён усміхнуўся. Ён адказаў мне гэтак жа, як адказаў яму я ў сорак першым: кіндэр шпіль, маўляў, дзіцячая гульня. Я не зразумеў яго адказ і не разумею і зараз. Што ён — калі, ведама, няма нейкае глабальнае задумы, ад усіх схаванай! — меў на ўвазе? Сваю ўласную пазіцыю? Маю прапанову?

Гэтак жа, мабыць, не разумеў мяне Фрыц Майер, юрыст з Кюстрына, оберст, якога разведчыкі атрада ўзялі ў палон. Мы гаманілі з ім на другі дзень пасля бою, у якім партызанаў падтрымалі савецкія самалёты. Гэткіх самалётаў у дзеянні я не бачыў аніколі: на іх і кулямёты, і гарматы, і бомбы... І яны здаліся мне чорныя. Чорнай, мабыць, будзе і мая смерць.

Мы гаманілі з Майерам: я перакладаў пытанні, якія ставіў камандзір атрада. Майер глядзеў на мяне зверам. Руку — Майер быў паранены — партызанскі ўрач Часлава перавязала яму добрасумленна, не пашкадаваўшы лекаў, якіх у атрадзе небагата, я ведаю гэта дакладна. А ён і на яе глядзеў зверам. Потым, калі допыт быў скончаны, Майер спытаў мяне: хто, адкуль, што раблю, як апынуўся тут... Я не хлусіў. Я адказаў усё шчыра. Нават больш: я сказаў яму, што думаю ўвогуле пра вайну.

Ён не даслухаў, вызверыўся:

— Ты — бруд. Ты — здраднік. Калі пачнецца наш новы наступ ад Одэра на Маскву, ты будзеш першым, каго павесім за ногі.

Я прывёў яму лічбы. Атрад Крупні страціў у гэтым баі дзевяць чалавек. А два нямецкія батальёны, якія вялі наступ, знішчаны амаль поўнасцю. Такія ж, відаць, суадносіны

страт і па фронце. У Расіі больш рэсурсаў. Рускія перамаглі. Гэта бачна і сляпому.

Ён зарагатаў:

— Сляпы ты, ганебны здраднік. Мы не адступаем. Мы адыходзім, каб узяць новую зброю, якую рыхтуе фюрэр. Зброю, якой не бачыў свет і якой свет скарыцца адразу ж!

Майера, кажуць, адправяць за лінію фронту — гаворка пра новую зброю ўсіх зацікавіла.

Новая зброя? Не веру! Ды, зрэшты, хіба не ўсё роўна, з якой — новай ці старой! — падсякуць маё жыццё? Куля ці асколак паставіць апошнюю кропку? У труне ці проста ў пясочку, у чыстай вадзіцы ці смярдзючай багне будзе ляжаць маё цела, у якім не будзе жыцця? Спыніцца сэрца Ромеля на гадзіну ці на стагоддзі — што страціць сусвет, што ў ім зменіцца? Мяне гэта і не цікавіць, і не турбуе!

Турбуе, палохае іншае — слава здрадніка. Але Ромель не здраднік. Ромель ім не быў аніколі. Ромель памыліўся, калі паверыў у тое, у што паверылі мільёны. І калі яны, падманутыя фюрэрам, зразумеюць тое, што зразумеў Ромель, хай жа і яго голас гучыць разам з іхнімі галасамі, што будуць слаць праклёны Гітлеру.

Толькі я кажу першы: праклінаю, праклінаю Гітлера!»

## 16

Пры самым франтоне, які быў зашыты аполкамі толькі з аднаго боку, Рымы — яна звычайна спала тут, з краёчку, пад самай страхой,— не было, і Артур, стоячы на драбінах, збянтэжана абмацваў, варушыў сухую хрусткую канюшыну. Няма! Але ж казала, што будзе чакаць. Не, вось краёк посцілкі!..

Ён кульнуўся з драбінаў на сена, потым прапоўз крыху на каленках, пацягнуў да сябе знаёмую зрэбную посцілку і адразу ж учуў Рыміна заспанае мармытанне, пажартаваў:

— Хэндэ хох!

— Арцік? Вярнуўся? Усё добра?

— У падрыўнікоў, як і ў танкавых часцях,— парадак заўсёды. На поле прыбег Артур — рабі перакур. Бульбы пасадзілі — на пяцігодку драпікаў хопіць!

— Хвалько. А я чакала, чакала і заснула. Чаго сена шуркаеш?

— Цвіка ў страсе шукаю. Быў тут, загнуты добра,— аўтамат павесіць. Ага, знайшоў. Хай вісіць аўтаматік мой.

— Каб на галаву зваліўся? Пакладзі на сена... О-ой,

якi ж ты хало-одны! А ў мяне тут цё-ёпла. Посцілка мя-якаанькая.

— Воў-у... Гэтак, са зброяй, і спіш?

— Прызвычаілася. Кабур сюды, наперад, ссуну і тады адразу засынаю. А як дзягу адшпілю — няма сну...

— Калі я тут, дык дзяга не ўратуе: адшпільвай ці не адшпільвай — сну не будзе!

— А хвалько ты мой любы! Я сама адшпілю. Пачакай жа!..

Рыміны губы пахлі капюшынаю, і валасы таксама струменілі той жа водар, і ўсё вакол пад слабай і дзіравай страхой старога хлява, які стаяў даволі далёка ад хаты, здавалася, перапоўнена пахамі леташняй ляснай травы. У рэзкіх і п'янкіх пахах старога сена, як у глыбокім віры, бясследна знікалі і турбота, і трывога, і неспакой, раставаў увесь ранейшы клопат, сплываў, бы дым; і Артур, правальваючыся ў знаёмую салодкую бездань, смяяўся і радасна мармытаў ласкавыя словы; адчуванне дзівоснай еднасці з Рымай усё расло ў ім, абвастралася гарачым захапленнем, у якім месціўся і яго ўласны шэпт, і гарачыя Рыміны пацалункі, і яе нейкія кароткія, адрывістыя словы пра каханне і трывогу, з якой яна, Рыма, чакала Артура; усё блыталася, звівалася ў адно, і ён ужо не спрабаваў ні падзяліць, ні вызначыць сэнс таго, што чуў...

Пазней, калі Рыміна галава нерухома ляжала ў яго на руцэ, на вышках пасвятлела, быццам недзе зусім побач запалілі вогнішча, і вузкія дзіркі ў страсе з доўгай дранкі зрабіліся светлыя, і дзірак гэтых было шмат, і ўсе яны ўздрыгвалі, рухаліся, бы страха гайдалася. Рыміны вочы бліснулі, бы светлякі,— недзе далёка, у бок станцыі, узляцела ракета.

— І калі на чыгунцы выбухі — дзіркі таксама свіцяцца,— ляпотна, з млявай асалодаю прамовіла Рыма.— Учора я ўсё ляжала і глядзела. Спачатку на драбінах сядзела. А потым тут лягла. Як жывая, страха тады соўгаецца, калі частыя выбухі. І ад ракеты таксама. Бачыш?.. А памятаеш, Захар нам ракету кінуў? Прыгожае ён нам вяселле наладзіў. Праўда?.. Яно ча-аста прыгадваецца. Дарога, наабапал снег зіхаціць, быццам увесь смарагдавы. Уверсе — ракета. І мы — імчым... Небачка! Мне часта здаецца, што гэта было сто год назад! Ці ўвогуле не было, як саснілася. А табе не здаецца?

Рыміна пытанне было нечаканым. Але яшчэ больш нечаканым было адчуванне нейкай нетрываласці, умоўнасці, як бы нерэальнасці ўсяго, што адбывалася ў тую зімовую ноч, якую згадала цяпер Рыма. І жартоўныя тосты, і прыдзірлівае, да адчаю патрабавальнае «горка», і зменлівае дрыготкае

святло чырвонай ракеты, і смарагдавы снег наўкола — усё гэта — яно і Артуру балюча ўрэзалася ў памяць і часта ажывала ва ўспамінах — цяпер, зусім нечакана, набыло адценне нетрываласці і ўмоўнасці, спарадзіла адчуванне невядома якой і невядома перад кім віны.

— Не, не здаецца. А вось зараз адчуванне віны нейкай,— прызнаўся ён і адчуў, што яму робіцца лягчэй, калі ён гаворыць усё Рыме шчыра, быццам спавядаецца.— Дзядзьку Захару за тое наша вяселле наківалі як мае быць. Партыйная вымова — не жартачкі. Нават і цяпер як слова «вяселле» Гусараў пачуе, дык і губы ў яго дрыжаць — прамовіць не можа.

— Няма Гусараву, гляджу, чым займацца. Што, нам з табою ў глыбокае падполле ісці?

— Яно і без таго — сапраўдныя падпольшчыкі: толькі па начах і бачымся. А цяпер дык і таго не будзе. Сёння, відаць, пайду пад Зябкі. Харэўскі ўсё ж той клубочак разблытаў. На хутары адным хаваецца той гад!.. Ну, я ж табе казаў, праз яго бацька загінуў.

— Расстраляеце?

— Загадана даставіць у штаб.

— Значыцца, заўтра мы не ўбачымся?

— І заўтра, і паслязаўтра, і яшчэ, мабыць, дні два. Пойдзем на Дзвіну: разведаць, што там і як...

— А разведка навошта існуе?

Артур наважыўся быў сказаць, што разведчыкі, пасланыя на тым тыдні, не вярнуліся, што Захар ускладае вялікія надзеі на падрыўнікоў, якія неаднойчы ўжо хадзілі да Дзвіны і назад. Але стрымаўся, спахапіўшыся: навошта залішне хваляваць Рыму?

— Хапае і ёй клопату. Штаб пасылае мяне,— ён спахапіўся, што занадта пахваляецца, але быў задаволены, што пра разведчыкаў, якія не вярнуліся, Рыме не сказаў.— Нешта, разумееш, нашага камандзіра мучыць. Нечага прыгадаў сёння тую рачулку, дзе група Рэвута загінула... А я, між іншым, і цяпер не разумею, якім цудам мы з Траянам тады ўратаваліся,— і зноў папракнуў сябе, што дарэмна прыгадвае тыя надзеі, бо яны заўсёды хвалююць Рыму, сказаў зусім пра іншае: — Ціха як... Першую ноч, калі мы тут спалі, дык ажно не па сабе было. Памятаеш, як уздыхала карова ў хляве? Шумна, хрыпата, быццам чалавек над вухам сапе. Уяві сабе: і ў каровы — лёс. Бомба у-унь дзе гакнула, а яе забіла...

Рыма засмяялася, потым, як праглынуўшы смех, сказала з развагаю і марудна:

— Нейкі дзіўны і наш лёс. Сустрэнемся — розную лухту

таўчом. А мне — пра нас толькі гаварыць хочацца. А болей ад усяго — і ўвогуле маўчаць. Толькі каб вось гэтак, побач каб...

Яна няшчотна правяла рукою па аголеных Артуравых плячах, тарошка прыўзнялася, начала ўхутваць іх посцілкаю:

— Скразнякі тут. Застудзішся. Захварэць нам — тое ж, што цяжкая рана.

— Мяне хвароба не бярэ. Дзе ўжо за гэтыя гады качацца ні даводзілася — аніколі не застуджваўся.

— Ёсць нейкая заканамернасць... У атрадзе, мне тое і Чэся казала, не хварэюць людзі. Да вайны, памятаю, толькі ногі змачыла на дварэ — ляжу дома з тыдзень, ухутаўшы гарляк. А як з-за лініі фронту ішлі? У самую халіпу брылі, па вадзе, па раскіслым снезе — анічагуткі. І ніхто ў нас не захварэў. А даводзілася ж і на снезе, і макрусенькімі пад ялінаю спаць — каб табе хто чыхнуў...

— Робіш, намалу, навуковыя адкрыцці!

— Ты вось пацвельваешся. Але ж нейкая, відаць, заканамернасць ёсць. Ведаеш, як я ўсё гэта тлумачу? Чалавек разумее, што нельга хварэць яму, трэба не сагнуцца, выстаяць у змаганні, перамагчы — на тое ўсе думкі яго і скіраваны. Таму аніякая хвароба і не ліпне і не бярэ...

— А чаго ж я ў сорак першым запаленне лёгкіх схапіў? І на ногі потым адбілася. А каб на мяне, непрытомнага, Падрэз не ўзбіўся? Добрая б заканамернасць праявілася!

— А ты ведаеш, я, было, Дзімку і не верыла. Нават і цяпер нешта ад таго засталося. Кінуць хворага і збегчы?.. Не магу я гэта патлумачыць...

Лёгка цяпер, ведама, гаварыць і разважаць, абвінавачваць Траяна. А тады, у тых выключных абставінах? Адзінае было разумным: як найхутчэй бегчы ў горад, паведаміць пра дыверсантаў, дакладныя звесткі пра іх даставіць...

— Спачатку павінен быў дацягнуць цябе да якой-небудзь вёскі! Спачатку — дацягнуць,— безапеляцыйна сказала Рыма.— І толькі тады — бегчы. І маўчы, маўчы! Я ведаю, што ты зараз скажаш: на разважанні, маўляў, часу не было. Гэтак?..

— Прыблізна. Я часцяком тое прыгадваю... Прыгадваю нават маленькае, дробязнае: як храбусцелі верасы пад вухам, які цёплы камель сасны быў, як зорка ў галлі міталася...

— І апрытомнеў ты ўжо ў хаце Падрэза?

— Ну! Я ж казаў табе. Апрытомнеў, памятаю, і аніяк не магу дапяць: дзе я, што са мною робіцца. У памяці і дагэтуль, якія фіранкі былі ў Падрэзавай хаце, якія вазончыкі

на падаконні, якая столь... Потым Падрэз у хату ўваходзіць, гаворыць, што немцы па хатах шныраць, яйкі збіраюць, і мне загадвае: ты, маўляў, мой унук, з горада прыехаў і захварэў... Я падхапіўся, а на нягі не магу ўстаць — драўляныя нейкія яны парабіліся. Немцы? Якія немцы?.. А тут акно — бра-азь, і шыбы пасыпаліся. У акне — мурло. Стукае немец каскаю і патрабуе: яйкі, шнэк, млека! Шнэль, бістро!.. Гаспадыня ў тую каску кладзе яйкі з кошыка, а Падрэз на ложку сядзіць, мяне пагладжвае, супакойвае... Я і дагэтуль памятаю вочы таго фашыста...

— А вось жа мне не расказаў тыя падрабязнасці!

— Калі з усімі падрабязнасцямі — год расказваць!

— Сёння ты мне ўсё раскажаш. Да самай драбнічкі. Ты гавары, а я слухаць буду...

Яна ўзяла яго руку, гушкала ў сваіх далонях, і ён адчуваў цеплыню і мяккасць яе пальцаў. Шэры ядраны світанак накрысе запаўзаў на вышкі. Вузкія шчыліны ў страсе з доўгай пакарабачанай дранкі былі амаль непрыкметныя, іх глушыла цяпер шэрае святло неба, якое, здавалася, ушчыльную падпаўзло да франтона, напалову зашытага аполкамі, і страха выдавала шчыльнай і моцнай. На пасёлку абазваўся певень і змоўк, быццам падсечаны доўгай і гучнай чаргой буйнакаліберпага кулямёта.

— Дзе гэта? — Рыма прыўзнялася.— Ці не Вуглы? Ой, што гэта я! Вуглы зусім у іншым баку. Гэта — Мураў'і.

— У тым баку. Але далей, ля станцыі — на світанні дужа далёка чутно. Два новыя бункеры там з'явіліся — буйнакаліберныя кулямёты прыперлі. І як ваду ліюць.

— Што ты сказаў?

— Строчаць, як ваду ліюць. Нам бы гэтулькі патронаў.

— Патронаў яму мала! Штодня самалёты разгружаюцца.

— Я цяпер на нашых лётчыкаў маліцца гатовы штодня. Уяўляеш? Нейкія дзве мінуткі, і яны ўдрузг размалацілі і танкі, і грузавікі, і мінамёцікі, і салдат пакасілі, як травы. Не самалёты — дзіва! Нездарма іх фашысты завуць «чорная смерць».

— Я тады неслася кулямю. Ціхан загадаў перадаць: не адступаць, штурмавікі дапамогуць, узняліся ўжо...

— Сухава ўсё гэта здымала на кіно. Яна з першым узводам ішла. Адчайная дзеўка!

Рыма выгукнула са шчырым абурэннем:

— Ужо ён на кінааператарку паглядае! Кіно, бачыш, цікавіць!

— Няўжо калі-небудзь гэта ў кіно пабачым? Самалёты, бой, наша атака...

— І — кінаапсратарка. Яна хлопцам галовы надурыла. Усё ў яе — нават Пажога! — закахаліся!

— Адзін я дурненькі — у цябе,— ён павёў далонёю па Рымінай руцэ, і далонь як зачапілася за нейкі тоўсты шархоткі рубец на рукаве.— Падрала ўжо гімнасцёрачку поўненькую.

— Дзе падрала? А-а... Цыраванне — слядок ад кулі зацыравала. Скажы, што не дзіва? Далёка ж яшчэ да вашых акопаў было, а яна — цюкнула. Дурная нейкая куля,— і голас нечакана ўзвіўся радасна, узбуджана і здзіўлена: — Амаль зацвіла ігрушына! Куля — глупства. Ты сюды зірні! Сады амаль чорныя стаяць, а яна — зацвіла. Бачыш, бачыш? Я казала табе!

— Што і калі ты мне казала?

— Казала, што яна тут, ля хлява, раней ад усіх расцвіце. Тут ёй цёпла дужа. Ветру няма. Зацішак.

Ён трымаў далонь на рубцы гімнасцёркі і як не чуў, не хацеў бачыць аніякай ігрушыны-дзічкі, што расцвіла раней ад усіх.

— Ты нават не сказала мне, што гэтак здарылася! Тая дурная куля...

— Магчыма, асколачак гэта — я не ведаю. Ды ліха з ёю, той куляю. Мне варажбітка сказала, што пасля вайны ў мяне — чацвёра дзяцей. Можаш гэта ўявіць сабе?

— Не, такое цяжка ўявіць. Але я — пастараюся!

— Ну-у, хва-алько! Лепей зірні на ігрушыну,— голас яе быў летуценны, але з прытоеным сумам, які яна хавала ў шчырым і празмерна вясёлым захапленні.— А памятаеш Пагіршчыну?.. Я часцяком, ведаеш, як раблю? Закрыю вочы, згадаю сцежку ля Палаты і ўсё-ўсё бачу: і кветкі, і як трава ад ветру хвалямі пераліваецца, і над вадой — лазнякі белаватыя...

Ён моўчкі слухаў яе, і адчуванне, якое ўдарыла сэрца, калі ён падумаў пра тое, што меціна ад кулі на Рымінай гімнасцёрцы магла быць зусім не там, дзе яна зараз ёсць, а крышку правей ці лявей, і што тады не было б Рымы ў жывых, дзіўна сплялося з успамінам пра тое, як яна ўскараскалася на брызгліну, якая цвіла ля Палаты, даўно і далёка адсюль,— там ён упершыню ў жыцці пацалаваў дзяўчыну і гэтай дзяўчынай была Рыма! — сплялося з адкрыццём, якое ён толькі што зрабіў. Раўнуе! Яна, Рыма, раўнуе яго да кінааператаркі, якая і сапраўды надурыла хлопцам галовы і сапраўды дзяўчына прыгожая. Але ж лепей за яе, Рыму, няма на свеце! І прыгажэйшай няма! І што дзіўна! Пачула, што Захар пашле яго за Дзвіну на разведку,— захвалявалася.

Але ж не гэтак, як зараз, калі ён сказаў пра тую кінааператарку!

«Яна мяне дужа кахае. З таго — рэўнасць!»

Адчуванне дзіўнай навіны, якую ён прыкмеціў у паводзінах Рымы, навіны зусім не знаёмай, было мацней за здзіўленне, і гэтая навіна яго дужа ўсхвалявала, прывяла да высновы, ад якой яму зрабілася тужліва. Вось ён поїдзе, поїдзе да Дзвіны, а яна можа зноў куды-небудзь пад кулі кінуцца, кінуцца на злом галавы, і ён не паспее ні папярэдзіць яе, ні ўратаваць.

— Ты часам неразумна робіш,— ведаў, што словы яго гучаць непераканаўча, і ўсё роўна казаў, як бы баронячыся ад раптоўнай тугі.— Гэта не твой абавязак — бегчы на лінію абароны. Ёсць сувязны ад штаба, яго і трэба было пасылаць.

— Наступным разам — пашлю... А зараз ты вочы закрый... Як навошта? Хачу, каб не ігрушына табе бачылася, а брызгліна наша!

У шэрым ранішнім сутонні набохлыя суквецці ігрушы, макавінка якой тырчала ля самага франтона, злёгку трымцелі — Рыма пагладзіла іх рукою,— і здавалася, што дрэўца не стаіць на месцы, а ціха гойдаецца на хвалях. Рыма схілілася, прыткнуўшыся тварам да Артуравай скроні, каротка падстрыжаныя яе валасы рассыпаліся, як абвіслі на вушах, і агалілі шыю. На шыі, за вушамі, на маленькай ямінцы па скуры кучараваліся цёмныя кудзеркі, і Артур зноў адчуў, як сохнуць у яго губы. Ён нахіліўся да яе патыліцы, пацалаваў гэтыя кудзеркі, прызнаўся шэптам:

— Ты побач — і ўсё адлятае. Яе, тую брызгліну, і не бачыш. Быццам у нябыт усё...

— Не, не! Ты закрый вочы. І цяпер расказвай, што бачыш.

— Цябе бачу. Вочы заплюшчыў, а ўсё роўна — бачу.

Яна пакрыўдзілася:

— Зусім без фантазіі чалавек,— і зноў зарадавалася: — А я нашу брызгліну бачу... Уся белая-белая ад квецені. Чмяля бачу... Галіны гайдаюцца... Як жа я тады баялася, што мама дазнаецца — цалавалася з хлопцам. Ведаеш, што я тады рабіла, як дамоў прыбегла?.. Усё мыла твар, адцірала... Усё здавалася, што на губах і на твары — сляды... А мама анічагуткі не заўважыла! І тое мяне дужа ўразіла...— і раптам падхапілася.— Ой, Арцік, даруй! У мяне, дурніцы, зусім з галавы ўсё вылецела, дзе мы цяпер і хто мы цяпер! Мялю луху, а табе ж сёння, неўзабаве, ісці...

— Ага! Поўны дзень наперадзе!

— Усё роўна. Я — дурніца.

Яна села зручней, пагладзіла яму бровы, потым пацалавала, і ён, адкрыўшы вочы, не пазнаў яе твар. Рыміны вочы выдавалі журботнымі і цёмнымі, і цёмныя, нейкія няроўныя плямы былі на шчоках. Яна адпусціла яго руку, узялася папраўляць валасы, быццам яны дужа заміналі ёй, і гэтыя яе рухі былі палахлівыя і паспешлівыя. У нейкае імгненне, што праляцела, калі ён заплюшчыў вочы, у яго душы таксама ўсё пераіначылася. Змены гэтыя пачаліся нават раней, у той самы міг, калі ён дакрануўся засмяглымі губамі да цёмных кудзерак на Рымінай шыі, і як бы завяршыліся цяпер, калі яму прагна і спуджана абцалавалі бровы.

— А ведаеш чаму? Таму, што сядзіш. Кладзіся побач...

Яна паслухмяна лягла, і ён адчуў дотык яе пляча, мяккага, цёплага і ласкавага.

— Папрашуся ў Захара — ты давядзеш мяне да хутара,— нечакана сказала Рыма.— Я пераканаю маці. Вось пабачыш — яна мяне паслухаецца. Ты праўду казаў мне тады, цяпер я разумею. Яна знарок ісці не хоча, каб цябе ўберагчы, каб падказаць, дзе міны ставяць, дзе засады...

— Як падумаеш зараз, як паглядзіш, што наўкола робіцца, дык памалу і цяміш: мела рацыю нейкую маці. Там, на хутары, калі хочаш ведаць, цяпер спакайней, чым тут.

— Не хочаш, каб я ішла з табой? Але ж я ў той жа дзень, на ранку, і вярнуся.

— У гэты раз — далёка ад хутара наша дарога. А вось як вяртацца буду — мама са мною пойдзе. Гэта я цвёрда сабе сказаў.

Рыма зварухнулася, яшчэ шчыльней прыціснулася да яго мяккім цёплым плячом, працягнула спагадліва:

— Не хоча ён, каб я ішла разам з ім,— уздыхнула, пачала разважліва: — Жанчыну, якая кахае, ніхто і ніколі не падмане. Яе сэрца падобна на радыёперадатчык, які працуе на адной пэўнай хвалі. Мне часам аж страшна робіцца: ведаю нават тое, пра што ты мне і не гаворыш. І ведаю, скурай адчуваю, з якой зайздрасцю глядзяць на мяне маладыя кабеты, у якіх няма мужоў зараз... І калі часам з блізкім, знаёмым мне чалавекам здараецца якая-небудзь бяда, сэрца маё сціскаецца: а можа, гэта таму, што я шчаслівая з табою? Можа, напамінак лёсу мне... І часцяком шалёная такая думка: а можа, і тут нейкая пэўная заканамернасць?

— Не навуковыя, павер мне, твае адкрыцці. Ну, разваж! Калі мы з табою не будзем страчацца, дык не зачэпіць людзей бяда? Не будзе ліцца нечая кроў? І нехта не будзе стагнаць ад болю?.. Вайна клятая бяду чыніць... А не нашы з табою стрэчы!

— Ды разумею... Жарт, не больш — тыя заканамернасці.

— А падалося — усур'ёз ты гаворыш.

— Трывожуся за цябе — гэта таму... І ўвогуле — трывожуся. Я, між іншым, таксама заўважыла: маркотны наш камандзір, сумны, нечым дужа заклапочаны, прыгнечаны нават...

— Магчыма, здагадкі нашы... І мне — здаецца. І табе — здаецца.

Ён гаварыў знарок бадзёра, знарок надаваў сваім выказвам беззаперачнасць, упэўненасць і цвёрдасць. Рыма ж яго падробку адчула, не прыняла.

— Не-е, тут я не памыляюся,— працягнула яна і, пасля кароткай развагі, упэўнена падкрэсліла: — Без дай прычыны, сам ведаеш, Захар Крупня галаву не звесіць. Ён і мудры, і вопытны, і ўсё прадбачыць. Таму — заклапочаны. Бяры, напрыклад, такі факт — мяне. Класную радыстку — не насміхайся, я адна з лепшых радыстак у злучэнні, і май гэта на ўвазе! — не выпадкова паслалі сюды. Чаму такая прывілея атраду? Вось ён і спрабуе спасцігнуць гэта, у здагадках губляецца. Лагічна я разважаю? Так, не запярэчыш. Далей... Думаеш, лёгка штомесяц, а не, дык і кожны тыдзень хаваць забітых?.. А ён — камандзір. На ім — адказнасць за жыццё кожнага...

— На яго месцы я б адразу — да Гусарава. Не, да Ціхана напрамкі! Хай скажа, калі ёсць у камандавання нейкая задума, навошта ж у жмуркі гуляць. Калі нейкі аператыўны план — скажы, калі давяраеш!

— Хіба ж пра давер гаворка? Не ўсё, павер мне, і штаб злучэння ведае. Не ўсё і Ціхану твайму гавораць,— і раптоўна добра і шчыра засмяялася: — Ты лепей па мяне вось зірні! Я ж штохвілінна нейкага спосабу шукаю, каб Арціка свайго ад бяды ўберагчы. Я і маму цяпер разумею вельмі — на яе месцы і я да таго хутара б сябе прывязала...

— А кажаш: пайду перакапаю! Непаслядоўная ты сёння!.. Зноў, праклятыя, страляюць...

— Не-еа, калі ты са мною, я заўсёды паслядоўная... А памятаеш, як стралялі, калі мы кацілі ў вазку? — Рыма, узлакціўшыся на левую руку, услухоўвалася ў татаканне буйнакаліберпага кулямёта, што па-ранейшаму было выразным у перадранішняй цішыні, потым схілілася, правяла сухой сцяблінкаю па Артуравай скроні.— Няўжо забыўся? Мы шчэ па ўзбочыне спыніліся і слухалі.

— Там прысады былі. Чатыры старыя бярозы.

— А дзядзька Захар пусціў другую ракету. І конь спалохаўся.

— Значыцца, помніш. Гэта ўсё — да скопу дзён у памяці...

Сапраўды, варта толькі згадаць тую ноч, і ажывае, устае перад вачыма ўсё да драбніц: і як дугаліся зоркі ў небе, і дугаліся зоркі ў Рыміных вачах, бліщчастых і радасных. На паваротку, ля старых бяроз на пагорку, Артур нацягнуў лейцы, спіпаючы ход каня, убачыў іншыя зоркі, над лесам, і гэтыя зоркі не стаялі на месцы, імкліва несліся ў начную высь, і былі чырвоныя, як гарачыя, бы толькі з агню — кулямётныя чэргі ад станцыі. Рыма прыціснулася да Артура, і тады ззаду пыхнула ракета, заліла ўсё ваколле чырвоным святлом, і конь ірвануў і панёс лёгкі вазок, і Артур заспяваў ад радасці...

Адкуль жа цяпер у яго ўспамінах адчуванне нетрывaласці, умоўнасці, як бы нерэальнасці ўсяго таго, што было ў тую зорную ноч? І гэтая невядомая і невядома перад кім віна... І трывога, што балюча вярэдзіць сэрца... І аніяк жа не адшукаеш, не зловіш, не знойдзеш яе вытокі!..

— Я ўсё часцей і часцей баюся,— шэпткам прызналася Рыма.— Усё часцей і часцей — трывога ў сэрцы.

— А чаго? Што фрыцы побач?

— Ведама ж!.. О, цяпер трасіркамі страляюць.

— Хай хоць заліюцца! — Артур засмяяўся незалежна, упэўнена.— Мы — дома. І нам баяцца няма чаго. Гэта няхай яны нас баяцца.

— Ты не зразумеў... Я баюся, калі ты ідзеш на заданне. Каб там бяды не было — вось пра што я кажу.

— І ўчора тое ж самае казала. Як напамінак нейкі.

— Які там напамінак. Я ўжо ўчора адчувала і ведала: зноў ты некуды пойдзеш. Далёка пойдзеш.

— Ты ў мяне варажбітка. Але ж трэба заснуць хоць калі-ва. Чаго табе не спіцца?

— З радасці. Ты — побач. З таго і не сплю...

Яна ціха крапула яго бровы сухой сцяблінкаю, потым павяла яе ніжэй, па шчоках, да вуснаў, і ён злавіў губамі гэтую сцябліну, з сухой галоўкай кветкі на канцы.

— Капюшына?

— Але... Сухая, леташняя, а — водар. На непагадзь — мацней пахне. Я ўжо ўведала. Вось пабачыш, заўтра дождж нагоніць. Нават сёння чакай.

— Добра, калі дождж. Жвір тады на насыпе мякчэйшы — мініраваць лёгка. І нажом можна калупнуць шпарчэй — каменьчыкі, абкачаныя пяском, па метале не звіняць. Той раз я ўсё пальцы на правай паабдзіраў. Сёння, па бульбе, дужа балелі.

— І цяпер баляць?

— Не, у ручаі рукі памыў, а над яблыняй гаючкі насморгаў. Чэся мяне шчэ да вайны навучыла: падрапаў дзе-небудзь пальцы — кладзі травіцу гэтую. А Чэсю бабуля наша навучыла — усе-е травінкі бабуля ведала. А я толькі гаючку памятаю. Скура рудая ад гаючкі робіцца. Але затое ж — гоіць...

— Пакажы руку!

Яна гладзіла, лашчыла яго пальцы, ціха перабірала па адным, гушкала, быццам забаўлялася, і гэтая гульня зачароўвала, супакойвала, як бы закалыхвала, і ён нечакана засаромеўся нядаўняга падману. Навошта ён сказаў, што поўдзе далёка ад хутара? Гэта ж няпраўда! Калі Захар пашле іх у бок Дзвіны, пераходзіць чыгунку яны будуць менавіта там, насупраць хутара, дзе жыве маці. Матчын боль, горыч яе чакання і трывога невядомасці цяпер адкрывалі перад ім зусім іншы сэнс, і гэты сэнс браў вытокі не ў тых словах, якія ён шмат разоў чуў ад маці,— чуў і на падворку, чуў і ў цёмным пакойчыку куханькі, дзе маці прымушала яго піць малако, калі на хутары была карова, чуў пры кожнай стрэчы і расстанні,— а гнездаваўся ў Рыміных прызнаннях: і ў тым, што казала звычайна маці, і ў тым, што ён пачуў тут, толькі што, жыла аднолькавая ўстрывожанасць, аднолькавыя скруха і туга.

«Бацька не вернецца, колькі яго ні чакай. І я таксама аднойчы магу не вярнуцца...»

Ён, аднак, не паверыў у рэальнасць гэтага, а паверыў толькі ў рэальнасць таго, што Рыма будзе пудзіцца, будзе чакаць і плакаць гэтак жа, як чакае там, на хутары, маці. Думка пра тое, што аднойчы бяда сапраўды можа зрэзаць яго, Артура, узнікла і згасла, бы знічка. Але другая думка, думка аб пакутах, якія давядзецца перанесці Рыме, асела ў сэрцы, была невыноснай, і ён не хацеў верыць у рэальнасць яе, крэсліў, упарта гнаў прэч. Гора і бяда ніколі не падступяцца да Рымы, бо з ім, Артурам, нічога благога не здарыцца. Тым не менш ён павінен быць больш абачлівы на заданнях, больш пільны. Хопіць хлапечай рызыкі! Хопіць фатыгоўства, разлічанага на нечас захапленне! Правільна напрадвесні яго ўшчуваў дзядзька Захар: лезе, маўляў, у пекла і шчэ галавой трасе!.. Ён павінен на кожным кроку думаць і пра яе, Рыму сваю!.. Шчасціла яму? Так, шчасціла... Але ж не бясконца тое...

На імгненне, дужа выразнае, як след бліскавіцы, мільганула ў яго перад вачыма тое, чаго ён не хацеў бачыць і пра што думаць не хацеў: пакойчык у хаце на хутары, прыцемкі

і ля стала, з вачыма, мокрымі ад слёз, стаяць Рыма з маці і ціха галосяць...

Сухая галоўка канюшыны зноў казытала яму бровы, зноў папаўзла па шчоках да вуснаў, і ён убачыў цяпер у світальным сутонні рэальны Рымін твар — шчокі бляклыя і змораныя, быццам дужа далёкія, а вочы бліскучыя, як спелыя жалуды, поўныя чакання, ашаламляльнай весялосці і дзёрзкасці. Дурэючы, ён злавіў ротам сухую сцяблінку канюшыны, Рыма лёганька патузала яе, спрабуючы вырваць, але ён трымаў сцяблінку моцна, пацягнуў нават, і ў той жа міг канюшынка зламалася, і ад гэтага ціхага храбусцення як нешта ўзарвалася ў ім, і Артур ірвануў Рыму да сябе і, адчуўшы на сваіх вуснах гарачыя і прагныя Рыміны губы, рэзкім рухам нагі адкінуў зрэбную посцілку, адкінуў гэтак моцна, што яна ўзляцела пад самыя кроквы і зачапілася адным канцом за цвік, на якім вісеў аўтамат, і загайдалася разам з ім...

## 17

Апоўначы глыбокі цяжкі кашаль зусім змучыў Марылю. Каб не пабудзіць Тосі, якая спала ўпобачкі, ля сцяны, яна ссунулася на самы беражок ложка, дыхала слабенька, асцярожна і, баючыся ажывіць кашаль, затуліла рот краёком ватовай коўдры; коўдра адразу ўгрэлася, як на печы паляжала, і на нейкі міг боль у грудзях аціх, галаву атуманіла санлівасць, лёгкая млявасць расплылася па змучаным целе. Але пад ёй, гэтай млявасцю, усё яшчэ жыла шархоткая хваля, памалу зыбалася на адным месцы, пад грудзямі, пастуквала ў рэбры, і водгулле гэтых удараў, мяккіх і запаволеных, аддавала чамусьці толькі ў адно, левае, вуха, прыціснутае падушкаю; Марыля крыху пасунула падушку ўбок, і тады шырока рынуўся з горла боль, ірвануўся хрыпаты кашаль, і сон адляцеў прэч.

«Гэткі ж кашаль, як тады, калі той кляты парасnік секла і застудзілася. А цяпер шчэ і нейкая пошасць прычапілася...»

Пра хваробу думаць ахвоты не было: і той раз кашаль прайшоў, і гэты раз неяк абыдзецца. За акном загрукатала доўгая і працяглая кулямётная чарга, потым абарвалася, быццам растала ў белаватым святле ракеты, што пыхнула зусім блізка на чыгунцы, насупраць хаты, і загучала зноў, але ўжо далёкая, прыглушаная, падобная на рэха. Не, зусім не рэха гэта! Страляніна і недзе ў супрацьлеглым баку ад чыгункі, за лугавінаю, дакладней, за лесам, што падыходзіць да

тоїі лугавіны, але далей, за полем. Цяпер выбухі грукочуць, і водгулле іх нейкае доўгае, працяглае, як патроенае. Не, расплылося і яно, усё аціхла, і, як адразу ярчэйшае, зыбаецца за акном белаватае святло. Вось і ракета згасла, і цемра загусцела, нават зніклі і рамы і шыбы, быццам без акон хата.

Марыля зарадавалася: добра, што Тосі не пабудзіла, хай дзяўчына спіць. Кашаль аціх крыху, анічагуткі не хрыпіць у грудзях. І наўкола ўсё сцішылася, быццам у чаканні. Амаль трэці тыдзень ужо зусім мала страляюць з бункераў на станцыі і ўвогуле на ўсёй чыгунцы — як перакацілася ўся страляніна за лес, дзе толькі што прагучалі тыя выбухі. У тупіку на левы бок станцыі ўдзень разгрузіўся эшалон з салдатамі, увечары палова з іх насела ў вагоны і пакацілa некуды. І неяк увогуле незвычайна густа пайшлі цягнікі па чыгунцы — ідуць і ўдзень і ўночы, і ўсё гружоныя, цяжкія. Раней гружоныя толькі ўдзень ішлі. Цяпер жа — і ўночы шпараць. А пазаўчора апоўдні ў тупіку на правы бок станцыі спыніўся бронецягнік, гадзіны са дзве біў з гармат і потым рушыў у бок Полацка, і недзе там, за рэчкаю, завухкала кананада і не аціхала ажно да вечара. Але гэтыя нядаўнія выбухі нейкія новыя, незнаёмыя, хоць якраз у тым баку, дзе грымела ўчора і пазаўчора — у бок партызанскай зоны. Магчыма, нешта блага там у партызан? Дык жа ж і спытаць няма ў каго. Арціка даўно няма, і ніхто з яго атрада не прыходзіў.

«Можа, што нядобрае прыключылася з сыночкам? Не, не можа нічога благога з ім здарыцца — сны мне ўсё добрыя ішлі...»

Падумала пра сына і захвалявалася. Абяцаў жа яшчэ на тым тыдні, што будзе непадалёк і абавязкова зойдзе. А вось няма і няма: відаць, баі, што грымяць і грымяць у партызанскай зоне, перашкодзілі. Праз тыя баі ім і на чыгунку няма часу падскочыць — з таго, мабыць, і пайшлі цягнікі і ўдзень і ўночы. А можа, куды пайшлі атрады, адступілі?.. Каб хоць дазнацца, дзе Арцік, ці здаровы?.. Калі сёння ён не заявіцца, трэба будзе заўтра паслаць Тосю на Вуглы. Альбо самой пайсці, дарогу яна ведае, хадзіла неаднойчы — шлях знаёмы. Праўда, старой дарогаю не пройдзеш — фашысты паставілі там зеніткі, акопамі зрылі ўвесь пагорак, пачынаючы ад самага пераезда. Але ж той пагорак яна лёгка абміне: па лугавіне спачатку, а потым балацінаю, каб у лес адразу павярнуць. Артур гэтую пуцявінку таксама добра ведае. Каб жа толькі сёння, калі выправіцца сюды, не ўдумаў ісці пагоркам, напрамкі. А можа, Тосю — яна на нагу скорая! — на Вуглы ранкам паслаць?.. Не, хай лепей Тося па станцыі пакруціцца, можа, што новае даведаецца... Але ж яе, між ін-

шым, цяпер і на станцыю насылаць небяспечна: з ёй, гэтай нядаўняй гарэзай, незразумелае нешта творыцца. Як не ў сваім розуме дзяўчына. Праўда, яно патлумачыць можна: бяда падсекла. Пасля пахавання маці была, адпак жа, і спакайнай ужо зрабілася, а цяпер зноў тое ж самае: ёй скажаш што-небудзь — не адразу і сцяміць, што яе гэта тычыцца, як недачула. Альбо засмяецца, быццам нешта дужа смешнае ўведала. Па начах цяпер, як вясна пачалася, блага спіць, праз сон часцяком Дзімачку свайго кліча. Матку-нябожчыцу ўсё радзей і радзей кліча. А гэтага Дзімачку свайго — амаль штоноч... Агонь і бяда наўкола, а дзяўчыне — каханне сэрца віхурыць. Ды, калі разабрацца, ніякага там кахання, можа, і няма зусім — усё гэты Гнацюк ваду муціць і галаву несусыпна дурыць — сватам сябе выстаўляе. Ды шчэ і як! Адна і тая песня, як прыходзіць — вяселле. Напрадвесні было як заваліцца Гнацюк са сваімі хлопцамі ў хату, як пачнуць рагатаць — сцепы ходырам ходзяць. Гнацюк, быццам роўня ім, быццам і не камандзір — першы і заводзіць весялушку: «Така гарна дзяўчына, гаспадынька, расцвіла ў вашай хатачцы! Дужа ж гарна! Таму ў маі — вяселле ладзім. Бо пазней — аніяк нельга! Бо апошнія боты, у сватах ходзячы, дабіваю!» І засмяецца сваім сопкім смехам, языком пацокае. А Тосі з Дзімам тыя жарты — вецер. Як толькі адно на аднаго зірнуць, дык быццам ўсё і ўсіх ад сябе адсунуць: упобачкі ў куточак зашыюцца, пра нешта цішком гавораць, гавораць... І гэты Дзіма як быццам яе затуляе ад усіх сваімі плячыма — хораша збоку і паглядзець. І малады зусім жа хлопец на гадах, а прыгледзішся, дык усю дваццацьпятку дасі: сівізна на правай скроні прабілася пасмаю, быццам крэйдаю запэцканы валасы, падбародак завостраны, шчокі запалыя — дарослы чалавек, умудроны жыццём гаротнік...

Марыля асцярожна выпаўзла з-пад коўдры — добра, што кашаль суняўся, шархоткасць горла не шкрабе: ад хвалявання, відаць, ад успамінаў гэтых,— надыбала да акна. Цёмна на двары — анічагуткі не відаць,— як увосень, у глыбокую ноч. У гэткія ночы раней амаль не гаслі ракеты над станцыяй, з усіх бункераў кідалі іх, быццам спаборнічалі, хто болей. А сёння — адна толькі і пасвяціла, доўга, праўда, не згасала. І гэтая адна-адзіная чарга з кулямёта — нейкая дужа ж доўгая была, зацятая, злосная... А што, як Арцік гэта да чыгункі падбіраўся — цяпер жа яны засады хітра робяць і паўсюль, нават там, дзе раней ніколі не рабілі, куды раней выходзіць ноччу баяліся! — і напароўся на засаду?.. Не, сынок сваіх хлопцаў не павядзе, дарогу не разведаўшы як след, ён папачатку сюды, на хутар, заверне, пра ўсё распытае, аб

усім дазнаецца — ён ужо мудры, ён на злом галавы не кінецца... Але ж чаго гэтак доўга яго няма? Ёсць жа, ёсць нейкая і прычына! Можа, ліха якое напаткала?..

Трывога спустошвала, знясільвала, рабілася цяжка дыхаць, і Марыля прыціснулася плячом да вушака, паспрабавала адчыніць акно. Але зашчапка не паддавалася, як закарэла, і яна больш не чапала яе, каб не бразнуць, не пабудзіць Тосі. Звечара дзяўчына не спала, ледзь заснула потым — няхай пасніць... Вось зноў яго, Дзімачку, паклікала... Той раз, калі Дзіма прыходзіў на хутар, ён сказаў нешта важнае ёй — потым, праўда, тая прызналася, што дужа адказнае заданне ў яго, маўляў, але, відаць, папярэдзіў, каб маўчала. Дзяўчына маўчыць — гэта яна ўмее. А сама ўвесь час устрывожаная, вельмі заклапочаная. Ды яшчэ напалохалася ўчора, калі вартавы ля таго эшалона ў тупіку затрымаў яе: Тося панесла туды яйкі прадаваць — іначай на станцыю і не трапіш цяпер,— увесь тупічок прайшла, ля кожнага вагона была і ўжо назад ішла, а вартавы яе затрымаў, загадаў, каб ішла дамоў і малако і масла прыносіла... Малака і масла ім, бач, хочацца! Зямлю няхай, паганцы клятыя, жаруць! Няхай зямлёю і падавяцца, той зямлёю, на якой гэтулькі крыві людской пралілі. Усе да адзінага!.. Нешта мармыча зноў Тося скрозь сон. Ці падалося? Не, кліча некага... Спуджаны дужа голас...

Марыля асцярожна, на дыбачках, падышла да ложка, угледзелася і прыслухалася. Нешта раптам пасвятлела ў хаце... Але святло не ракеты. Няўжо днець пачало?... Не, гарыць нешта, але далёка, не ў бок станцыі, за лесам недзе: устойлівае святло, не зыбаецца, і ўсё мацнее, мацнее... Відаць, вёска гарыць... Божухна, калі ж тое скончыцца?

Зноў мармытнула нешта Тося, каротка, як усхліпнула. Але не зварухнулася, моцна спіць: скруцілася камячком, каленцамі да сцяны прыціснулася... Гэтак Арцік усё любіў спаць. Мараціка, дык таго гэтак і не прымусіш: на спіне ўсё наравіў заснуць, рукі за галаў закіне, дужа сердаваў, як загадаеш пад шчакой далонькі сашчапіць, на правы бок легчы... А Тося, як Арцік у маленстве, з коўдраю абыходзіцца: адкінула з грудзей, плечы не ўкрытыя... Зусім жа зялёнае дзяўчо, ёй бы ў школу лётаць, партфельчык з падручнікамі цягаць... А яна па начах да чыгункі ходзіць, сцежкі партызанам паказвае, тол цягае... І нічога ж не збаіцца аніколі — толькі скажы! І добра, што шчасціць: на ахову ці засаду аніводнага разу не напаролася. А вось у Шлычыхі — пухам, сомяккім пухам ёй зямелька — лёс зусім іншы, нядобры... І собіла ж! А ўжо гэткая асцярожлівая Тосіна маці была, усё прыкмячала на чыгунцы — аніводны крок аховы ад яе вока

не хаваўся... Але ўжо, відаць, суджана гэтак кожнаму: сваю бяду, якая табе прызначана, ніколі не ўгледзіш загадзя, не абмінеш, не схаваешся... Суджана? Не-е! Каб гэтых нелюдзяў не нагнала, дык Шлычыха была б і здаровая, і разам з дачкою, Ліпачкаю, зямельку не парыла, а жылі б яны ў сваёй хатачцы ды радаваліся сонейку, шчасцю, кожнаму новаму дню... Хто і калі злічыць гора, слёзы, што праз нелюдзяў гэтых паганых людцы пралілі?.. І як увогуле тое злічыш? Вунь недзе хаты ў агні гараць — адразу відно. А тое горачка, што ў сэрцах людскіх?..

Марыля папраўіла коўдру, і гэты ціхі і асцярожны рух адразу пабудзіў Тосю — ускочыла, быццам і не спала зусім.

— О-оўх,— пазяхнула.— Днее ўжо? Няўжо світанак?

— Гарыць за лесам. Вёска, відаць.

— Божухна, калі ж тое скончыцца?

Яна сказала тое, што неаднойчы чула ад Марылі, сказала сталым голасам, як жанчына, якая ўжо ўведала ўсе пакуты, лічыла, што болей гараваць не давядзецца, а тут бачыць новае гора, якое зноў і яе тычыцца асабіста.

— Спі, галубачка.— Марыля ласкава пагладзіла яе па плячах, прымусіла легчы.— Спі...

— Дзе ж заснеш — гэткае страхоцце снілася.

— Ты — ляжы. Ляжы і памалу расказвай, а я слухаць буду. Што табе снілася? Калі сон раскажаш — ён ужо і не вернецца.

— Вагоны ў тупічку сніліся,— пачала Тося неахвотна, але потым заспяшалася, загаварыла хутка, быццам намагалася як найхутчэй расказаць усё і адкінуць, забыцца, больш не прыгадваць.— Я кошык з яйкамі нясу. Раптам — эсэсавец з вагона. І ботам — па кашолцы. Яйкі па рэйках коцяцца, кошык — за імі, але па шпалах усё падскоквае, падскоквае. Сагнуся, каб ухапіць, а ён проста з рукі — круць... А яйкі кладзеш — нерухомы, а потым зноў — са шпалы на шпалу... Але я, яйкі сабраўшы, злаўчылася, ручкаю яго — хо-оп! А-а, цяперака не ўцячэш! А ўзняць — не магу! Цягну, цягну... Ручка выцягваецца дугою, а ён — каб табе з месца. Як прыгваздзачаны да шпалы. Здагадалася: гэта ж ён поўны, ад яек такі цяжкі, адсыпаць крыху трэба. Нахіляю — нічога. Я тады ручку цішком — у кошык. А там — гранаты. «Эфкі» ўсё, як у Дзімы на рэмені, чорныя гэткія, рубчастыя... Ён мне і раіць: за донца, маўляў, бяры. Яго самога няма, а голас — чую. Нагнулася, адной рукою кошык лё-ёганька ўзняла. Гляджу — Дзіма краёчкам насыпу ідзе, рукою на вагоны паказвае. Вагоны па рэйках коцяцца бязгучна, ціха. Я зразумела Дзімаў знак, з кошыка гранаты хапаю. Як вагон —

туды. Як вагон — туды. А яны — не ўзрываюцца. А я іду, гранаты кідаю, а сама плачу, заліваюся слязьмі. А ён да мяне падбег і смяецца: ты, маўляў, чаку не выдзіраеш. Выдрала я чаку, гранату — у вагон. І мы з Дзімам з насыпу — на санках. Па траве санкі коцяць! А трава бела-белая. А ззаду — агонь. У кожным вагоне — агонь, і яны ўсе ў паветры, і ўсе — у агні, і ў паветры развальваюцца. Дзіма саскочыў, па траве бяжыць. А ззаду — кола чорнае. Я крычу, а голасу — няма. Тут і прачнулася...

— Дык добры сон, галубачка,— сказала Марыля, каб супакоіць болей сябе: сон яе ўсхваляваў.

— Чым жа ён добры? Гэткае чорнае кола — на Дзіму коціць. А я і сказаць яму не магу!

— Але ж за спіною яно, тое кола. Значыцца, ззаду — бяда. А чужынцы клятыя — у агні гарадзь. А ты — на лузе беленькім. Луг чысты сасніўся — на добрае гэта. А санкі — едзе сюды чалавек! Едзе да нас!

— А я ўсё бядую: чаго, чаго Дзіму не паслухалася? — Тося спытала разважліва, як бы ўслухоўваючыся ў нейкі клопат, што вярэдзіў душу, з нейкім раўнадушшам і недаверам да таго, у чым намагалася пераканаць яе Марыля.— Ён жа мне казаў той раз: пойдзем у атрад. Цягнуў! А я сказала: вернешся з задання — тады і пойдзем. Цяпер — бядую і шкадую: трэба разам было з ім ісці, тут не заставацца...

Дамовіліся, значыцца. Вось яно што! Вось аб чым Тося з Траянам шапталіся ў куточку гэтак прытоена! А з ёю, Марыляй, не параіліся! І маўчала дагэтуль, не прызнавалася ж увесь час! А хіба яна павінна перад табой спавядацца ва ўсім і штораз? Не маці ты ёй, чужы, лічы, чалавек... А ўсё роўна — крыўдна. Быццам верыш чалавеку, як сабе давяраеш, а ён — падмануў. «...тут не заставацца...» Вось як, значыцца, разлічвала Тося! Толькі аб сабе думае. Толькі аб сабе...

Марыля праглынула крыўду, ані ў чым не папракнула Тосю, сказала памяркоўна:

— А можа, і варта было ісці...

— Мне — пайсці. А вас — кінуць? — спытала, быццам намагалася сябе пераканаць, што пекалі зрабіла правільна, а скончыла сваю думку рашуча і цвёрда: — Калі ісці ў атрад — разам з вамі ісці. Дзіма казаў, што ў гаспадарчым узводзе работы ё — і хлеб пячы, і бялізну памыць, і пашыць... Не абавязкова ж — страляць!

Тосіна прызнанне расчуліла, скасавала крыўду, і Марыля сказала спачувальна, з добрым смяшком:

— А табе ўжо адразу — страляць карціць. Шчэ трэба й навучыцца!

— Навука невялікая. Увосень, калі групу за чыгунку вадзіла, з нямецкага, Дзімавага, аўтамата страляла. Дзіма ўхваліў: дужа трапна стрэліла...

— Добры ён, Дзіма твой.

— Ён не проста добры,— узрадавалася Тося.— Ён — залаты. О-а, каб вы ведалі. І смелы — анічагуткі не баіцца. Калі вайна скончыцца — мы адразу і паедзем. Будзем працаваць і вучыцца з ім.

— А вяселле?

Марыля сказала смехам, жартуючы, спадзеючыся, што гэткі пачуе і адказ. Але Тося сказала сур'ёзна і стала:

— Спачатку — вяселле. А потым — паедзем.

— Гэта ён сплапаваў?

— Не, мы разам сплапавалі: і як працаваць будзем, і як вучыцца...

— А вам патрэбы няма за свет ехаць,— сказала Марыля, як бы даючы добрую параду, якую адкінуць нельга.— Працаваць і вучыцца паблізу можна.

— Дзіма марыць на капітана вывучыцца. Каб параходы вадзіць. Вялікія, у акіяне... Гэта цяжка, вядома. Але ж мэту паставіўшы, можна і дасягнуць. Была б ахвота. Праўда?

— Ведама. Вайна каб толькі хутчэй задушылася. А тады ўсё ў вас добра поїдзе...

Тося прамовіла даверліва, але пошапкам, як бы сярдуючы, што прагаварылася, сказала тое, пра што казаць не мае права:

— Дзіма гаворыць, што гэтым летам скончыцца. Фронт зараз стаіць на месцы, бо рыхтуецца вялікі наступ. Сёлета ўлетку ўся наша зямля будзе вызвалена,— і спахапілася, спытала спалохана, але як бы і ўзрадавана, што можа цяпер пераводзіць гаворку, не выдаваць сакрэтаў: — Чуеце?.. Эшалон коціць. І гружаны, здаецца.

— Ага. Не парожняк. На фронт, значыцца...

Жывучы на хутары, Марыля навучылася беспамылкова, па трымценню слаба акітаванай шыбы кухоннага акна, вызначаць, які цягнік коціць па чыгунцы. Дробна і нудна пазвоньвае шыба — пустыя вагоны гоняць. Цененька-цененька трымціць шкло — пасажырскі шпарыць. Натужна і глуха, разам з рамаю, уздрыгвае акно — цяжка гружоны эшалон імчыць. Цяпер жа гуд незнаёмы, трымціць шкло ліхаманкава, быццам дубцамі па ім сцёбаюць. І гул ад падлогі пакатваецца, быццам падмурак трасуць, зглыбі дзяўбуць нечым. Гэтак жа звінелі шыбы і гула падлога ў той раз, калі каціў да станцыі бронецягнік. Відаць, вяртаецца ад Полацка. Не, зусім жа не з таго боку. Другі, значыцца...

— Гэта не эшалон! — Тося парывіста ўскочыла, села на каленках.— Бронецягнік! Тады гэтак жа шыбы звінелі.

— Не зусім і гэтак, здаецца...

Цяжкі натужны гул мацнеў, і Марыля добра разумела, што гэта сапраўды ідзе бронецягнік, але не хацела пагаджацца з Тосяй. Згадала, як доўга і жахліва білі гарматы з бронецягніка, які пазаўчора з паўгадзіны стаяў ля пераезда, а потым папоўз у тупік, як жаласліва звінелі ўсе шыбы і нават адчынілася, сарваўшыся з клямкі, дзверына ў сенцах.

— Гэтак,— горача запярэчыла Тося.— Я добра памятаю: гэтак! А потым — з гармат ударыў...

Марыля не спрачалася, толькі прамовіла глуха, прамовіла, як замову, страшную і зацятую замову супраць чужынцаў, якіх ненавідзела зараз люта, як ніколі:

— Небачка, дапамажы нашым! Дапамажы нашым адолець, зламаць іх сілу! Дапамажы!..

— Дзіма казаў, што ў лютым яны бронецягнік кульнулі ля Фарынава. Не, падбілі яго з бранябойкі. Хай бы ля хлеўшка ў нас бранябойку паставілі ды лупянулі.

— Усё табе гэтак проста. «Паставілі ды лупянулі...»

— Пакаціў. І на станцыі, здаецца, не спыняецца.

— Хай у багну коціць! Хай пад адхон рынецца...

Цяжкі натужны гул пачаў глухнуць, потым, на кароткі час, як вырваўшыся аднекуль, у начной цемры разлеглася звонкае татаканне колаў і гэтак жа раптоўна абарвалася, і адразу сунялася глухое трымценне шыбаў у акне на куханьцы. Тося зноў сцішылася на ложку, і Марыля, хутаючы ёй плечы, папрасіла, як загадала:

— Ну, спі. Можа б, распранулася? Лягчэй спаць...

— Баюся. Калі што якое, дык не ўхопіш і адзення тады.

— Я таксама звыклася. Без адзення ўжо і не заснеш...— паскардзілася, быццам прасіла прабачыць: — Як лягу — кашаль тады мучыць, б'е дужа. А сядзіш калі — лягчэй...

Тося пазяхнула:

— А я ўжо і засынаю. Толькі вы мяне адразу раскатурхайце, калі Дзіма пастукаецца.

— Думаеш, будуць сёння?

— Напэўна! Ды і самі ж казалі! «Санкі — едзе сюды чалавек! Едзе!» І Дзіма і Арцік ваш прыедзе — вось тады мне скажаце. Але ж, глядзіце, мяне адразу ўспорваіце!

— Ды ўжо ж! Спі... І я прылягу. Можа, адчэпіцца кашаль.

— Адчэпіцца... А-о-ой, спаць як хочацца. Сплю ўжо...

Тося, ціха пазяхнуўшы, павярнулася тварам да сцяны і амаль імгненна заснула. Марыля ляжала без сну, нават не

сілілася заспуць, баючыся, што, заспуўшы, не пачуе, як хто-небудзь ціха пастукае ў акно. Цвёрдая Тосіна перакананасць — «І Дзіма і Арцік ваш прыедзе...» — пасяліла ў душы надзею, хвалявала, адганяла сон. Марыля і верыла, і дзівілася: адкуль у зялёнай дзяўчыны гэткая ўпэўненасць? Няўжо ведае нешта, але не гаворыць?..

Зноў, як ужо і было, Марыля адкінула сваю падазронасць. Не, нічога не ўтойвае Тося. І, ведама ж, не прадчувае. Але ж чаму ў яе, матчыным, сэрцы ніякай упэўненасці, аніякага прадчування, што сёння яна пабачыць свайго сыночка?.. А Тося — прадчувае, напэўна. Але ж — чаму? Можа, маладое сэрца далей бачыць, тančэй прадчувае, кахае больш глыбока і адважна?.. Мажліва... Але ж адкуль у маладога сэрца вопыт, горкі і цяжкі вопыт шляхоў, якія прамераны болем, вопыт уведанай горычы і перажытай бяды?.. Хапіла, хапіла і ім, маладым, і цяжкасцей, і горычы, і бяды... Толькі, мабыць, не гэткія горкія рубцы на сэрцы кладуцца. Але ж хто тыя рубцы памерыць, параўнае? У іх, маладых, на ўсё свая мерка. І не перакапаеш жа, не давядзеш... Хіба ж разумна думаць пра каханне зараз, калі бяда не тоіцца, адкрыта сядзіць ля парога твае хаты?.. Трэба адкінуць, знішчыць бяду, а потым ужо думаць аб каханні, нешта планаваць... Тосю, значыцца, ты асуджаеш! А свайго Арціка?.. Гэтае яго каханне, гэтае вяселле з Рымаю!.. Хіба ж гэткім бачылася табе сынава каханне да вайны? Да вайны... Да вайны ты з Пахомам пасмейвалася з тых сынавых лістоў. Праўда, Важнік, калі са школы прыходзіў, папярэджваў. Але ж і захапляўся! А ты? Забаўкаю лічыла тое сяброўства з Рымаю, з усмiхам тыя лісты прыгадвала, калі ў цягніку да мужа ехала... А як яно павярнулася? Так, маладыя сэрцы, выяўляецца, далей бачаць, больш адважныя і дальнабачныя яны, меней іх палохаюць розныя складаныя абставіны. Мажліва, мажліва... Чужы вопыт — заўсёды чужы, пакуль яго, той вопыт, на сваім гарбе не выцягнеш. Так, чужая вера — заўсёды чужая вера, пакуль яна ў тваё ўласнае сэрца не пасялілася, не прыжылася там, пакуль не ўвайшла ў розум. Так, чужой вераю моцны не будзеш — сваю трэба займець!.. А можа, яно гэтак і трэба, каб з пакут усё пачыналася?.. Не-е! У гэтым выпадку губляе сэнс вопыт старэйшых, вопыт тых, якія паблукалі, парабілі памылак, але праверылі дарогу, знайшлі самую лепшую, разумную, правільную... Не, не! Не дужа разумна добры вопыт адкідваць, бо без вопыту як сляпы чалавек... Лёгка ёй, Тосі, усё планаваць. Сэрца маладое, яно ва ўсё, што здумала, верыць, чакае

і спадзяецца. А ято ж часам і марнае выходзіць, тое чаканне...

«Які год ужо чакаю Пахома. А каб жа хоць вестачка!..»

Кароткі міг сумнення Марылю напалохаў, яна імкліва закрэсліла яго, закрэсліла ярасна, ненавідзячы сябе за тое, што дазволіла падумаць пра марнасць свайго ўласнага чакання. Вернецца Пахом! Вось жа Ягор жывы! А разам з Пахомам быў у той калатнечы! І таму Пахом таксама адшукаецца. Пакуль яна жывая — дагэтуль будзе верыць, не пахавае Пахома! Будзе спадзявацца. Будзе чакаць! Чакаць гэтак жа, як чакае Тося. Верыць гэтак жа! Спадзявацца гэтак жа! У добрае трэба верыць, мужна чакаць, спадзявацца — тады тое, добрае, не абміне чалавека!..

«Цень... Як нейкі цень мільгануў на падворку!..»

Марыля стаіла дыханне, прыўзнялася, уся напружылася ад гэтага слабага, ледзь улоўнага руху за цёмным акном. І пастукалі ж, здаецца!.. Не, гэта ў грудзях грукоча! Божухна, як жа сэрца калоціцца! Быццам уся скура напята і гудзе... Падалося ці сапраўды яна бачыла цень?.. Нейкі рух за акном быў, яна не магла памыліцца, бачыла яна гэты рух!.. І вось зноў!.. Цень, цень варухнуўся! І нешта ціха трэснула, як бы чым падчапілі раму і кручок саскочыў, бразнуў... Ды не! Стукаюць! Дужа асцярожна стукаюць у акно!

Марыля парывіста адкінула коўдру, ускочыла на ногі, і ад гэтага руху прахапілася Тося, села на ложку.

— Стукалі?

— Падалося, магчыма... А чаго не спіш? — спытала Марыля, і гэтае пытанне не здалося ёй дзіўным.

— Стукалі — я гэта чула. Як толькі пастукаюць — адразу прахаплюся. Дужа ж светла на падворку. Днее, відаць?

— Усё тое ж... Усё шугае пажар за лесам...

Зноў, гэтак жа асцярожна, як і ў першы раз, але цяпер больш працягла і настойліва, затрымцела шыба — нечым жалезным дробненька малацілі па шкле,— і Тося саскочыла на падлогу.

— Дзе ж падалося?! Дзіма стукае! — голас у яе быў ломкі ад напружання.— О-ой, сон жа мой і пацвердзіўся!.. Але ж чаму не ў кухоннае стукае?.. Ён звычайна пальчыкам — тук-тук па раме. І Арцік гэтак жа... П-праўда... Ой, цень які!.. Можа, ад Дзімы чалавек? Я пагляджу...

— Чака-ай,— Марыля схапіла Тосю за руку.— З куточка зірнём. Асцярожненька...

Марыля з вугла, не нахіляючыся блізка да шыбы, намагалася разгледзець, што рабілася на падворку. Тося з-за

пляча ўзіралася ў акно, потым учапілася рукою ў Марылі-на плячо, шапарнула:

— О-ой, незнаёмыя... Ву-унь і ля хлеўчука стаяць.

— Схавайся ў бакоўку.

— Не трэба адчыняць. Як нікога няма ў хаце!

На шыбе акрэслілася цёмная доўгая рука — самога чалавека, схаванага сцяной, не было відаць,— і акно зарыпела: рука не стукала ў шыбу, а моцна, як бы выдзірала ўсю раму цалкам, тузала, трэсла акно, і шкло жаласліва рыпела.

— Зараз... Зараз адчыню,— уголас прамовіла Марыля і падыбала ў сенцы. Адчыніла дзверы і, чакаючы, пакуль Тося хавалася ў бакоўку, дадала: — Чую, чую! — убачыла, што Тося стаіць ля шырмачкі, якая закрывала ўваход у бакоўку, сярдзіта прасіпела: — Ха-ава-айся, кажу!..

Халодныя дошкі сенцаў знаёма зарыпелі, і жах адразу знік. Марыля нетаропка, запаволена адчапляла клямку з тоўстага жалезнага прабою, не спяшалася адкінуць яе — выгадвала час. З сенцаў, у шырокую шчыліну пад дзвярыма, добра праглядваўся амаль увесь падворак, пусты, асветлены водсветам далёкага пажару; водсвет быў няроўны, дрыгатлівы, белавата-жоўты, падобны на святло ракеты, якая не згасае. Дзіўна, аніякага руху непрыкметна. Не, ля самай шчыліны варухнулася нешта бліскучае і чорнае... Падобна, аўтамат вытыркаецца з-за сцяны... Чалавек, відаць, стуліўся за сцяною, пабойваецца адкрыта стаяць, аўтамат, аднак, на дзверы наставіў і чакае. І яшчэ ля хлевушка нехта, як жардзіна, высокі, з доўгай, як не да самай зямлі, рукою. Не, гэта ён вінтоўку трымае, з таго і выдае рука доўгай.

Распіралі, дзёрлі грудзі непрыемныя шархоткія колцы, і Марыля зарадавалася, ніяк не сілячыся суняць іх, доўга і працяжна закашлялася. Хай там, за дзвярыма, чуюць кашаль! Спаслаўшыся на хваробу — нядужыцца ж чалавеку! — можна і не адчыняць дзверы, і нікога не пусціць у хату.

— Хворая я.— Марылі падалося, што знадворку ціснуць на клямку, засаўка зараз храсне і незнаёмыя людзі ўломяцца ў хату. Яна зноў зайшлася ў працяглым кашлю, моцна, аднак, трымаючы рукою драўляную засаўку.— Кха-а-а... Ноччу нельга адчыняць анікому... Кха-а-а... Улада забараніла ноччу адчыняць...

— Мы і ёсць улада! Не пазнаяце? То ж я! Гнацюк, мамо! Артур з намі!

У Марылі спалашна забухала сэрца, непрыемныя шархоткія колцы накаціліся ў глыб горла. Яна прыткнулася лбом да вушака, знерухомела на міг, як бы аглушаная.

«Артур з намі!» А дзе ж ён сам? Ісці не ў стане, дык Гнацюка пасылае? Нешта, мабыць, благое здарылася. Вось з чаго і папрыціхлі сёння на чыгунцы...

— А небачка! А чаго ж я стаю і дзверы не адчыняю,— непаслухмянымі і дрыготкімі рукамі Марыля адкінула драўляную засаўку; засаўка глуха, як у пустое, тукнула ў сцяну.— Не пазнала па голасе спачатку, даруйце... Васіль Іванавіч! Даражэнькі! У хату, у хату трэба, лепей не гаманіць на двары...— і спытала ўстрывожана, нахіліўшыся да Гнацюка: — А мой жа хлопец дзе?

— Ля чыгункі. Зараз падыдзе,— паабяцаў Гнацюк і ціха паклікаў чалавека, які стаяў ля хлеўшка: — Кулеш! Каністру сюды!

— Цягну-у-у...

Нешта глуха брэнькнула, і гэта выклікала незадаволены шэпт Гнацюка:

— Адно ён і робіць, што ўсю дарогу мерхаціць. На падворку ж табе тут роўна. Няма на што скардзіцца.

— Дак жа ж лягчэйшая не зрабілася. Цягнуць нязручна...

Марыля, не выпускаючы з рукі засаўкі і ўвесь час абапіраючыся на яе, углядалася ў аблічча чалавека, які ўваходзіў у сенцы. Асцярожна адставіла засаўку ў куток, ступіла ў дзвярны праём, каб лепей бачыць. Кулеш?.. Нешта ж з год прыблізна яна яго не бачыла. Ды і ўвогуле рэдка страчала — разы са тры пасля таго дня, як разам з Гнацюком ён выбраўся з лагера палонных у Баравусе. Нешта дужа змяніўся Кулеш...

«Ён на Пахома зараз падобны!..»

Зноў глуха і сполашна бухала сэрца. От жа дурное яно, гэтае яе сэрца. Зусім жа і не падобны чалавек на Пахома. Праўда, Пахом звычайна вось гэтак вяртаўся з саду, калі дыбаў з патушаным ліхтаром у руках і бляшанкаю з бартулямі: сагнуўшыся, спакваля, часта прыпыняючыся, потым марудна ставіў ля сцяны ліхтар і бляшанку. І Кулеш ля сцяны нешта поркаецца. І дужа газаю засмярдзела: у каністры, відаць, газа...

Пах газы — гэты пах яна не любіла ўсё жыццё і заўсёды сварылася з мужам, калі той прыносіў ліхтар у хату,— цяпер здаўся ёй вельмі прыемным. Яна ўпусціла ў хату Гнацюка, потым Куляша, ад якога, хоць ён быў без каністры, патыхала густым смуродам газы. Яна як нічога цяпер не заўважала, жыла толькі той радасцю, якую, прапусціўшы перад сабою Куляша, наведаміў Гнацюк. Нічога благога

не здарылася з сыночкам. Арцік будзе зараз тут, у хаце, і яна ўбачыць яго, пагаворыць з ім!

— Каністру варта прыхаваць,— прамовіў, як бы раячыся, Гнацюк.— Лепей — надалей ад чужога вока. Ці пераліць газу...

Марыля блага цяміла, пра што казаў цяпер Гнацюк,— жыла толькі думкаю пра сына, прагна ўслухоўвалася, баючыся прапусціць сынавы крокі на падворку. Яна пачуе іх адразу, пазнае тут жа — хай толькі сынок ступіць на падворак! Раней ад усіх пачуе, не памыліцца, не зблытае!

— Ды не варта пераліваць,— абазвалася Тося, якая дагэтуль маўкліва стаяла за посцілкаю, што завешвала ўваход у бакоўку.— На гарышча можна ўсцягнуць. Там схованка ёсць...

— Вось гэта маскіровачка,— Кулеш павярнуўся на Тосін голас — шчыра быў здзіўлены.— Я думаў, што за спіною ў мяне нікога няма. Ажно — ё!

— Вучыся майстэрству,— са смяшком, але строга параіў яму Гнацюк.— І ўсцягні каністру на гарышча.

— Мо сапраўды пераліць газу? — спытала Марыля.— Вам каністра шчэ спатрэбіцца.

— Спатрэбіцца — новую знойдзем. А гэтая — даручэнне Трояна. Казаў, што абяцаў вам.

— Дзіма гэта мне абяцаў.— Тося на момант прыпынілася ля дзвярэй.— Але абяцаў, што сам і прынясе.

— Медыцына яго не пусціла. У шпіталі хлопец раскошвае. А я — апошнія боты дабіваю. Не будзе ў чым і ў сваты заявіцца...

Тося кінулася да Гнацюка:

— Ён паранены?

— Ногі намуляў. Хадзіць цяжка...

— Ён — паранены! Ён — паранены! Прызнавайцеся! Я хачу ведаць праўду!

Гнацюк, ашаломлены Тосіным напорам, ніколі не чутым у яе голасе адчаем, адступіў ад яе на крок, потым засмяяўся:

— Калі тое было! Пасля таго ранення — руку, скуру толькі падрапала асколкам — ён ужо з тыдзень на заданні хадзіў. Нагу намуляў — боты нямецкія новыя надзеў. А яны каляныя, бы з жалеза. Дні са тры будзе яшчэ ў шпіталі.

— Праўда? Вы мне не маніце? Толькі не маніце!

— Артур вось зараз пацвердзіць. Ён ужо на фурманцы сядзеў, калі Дзімка да яго прыбег.

— А казалі — не ходзіць! Як жа гэта — прыбег?

Марыля незадаволена перапыніла Тосю:

— Ідзі дапамажы каністру схаваць. Потым пагамоніш... Жывы твой Дзімачка. Чуеш?

Тося не ішла з хаты, стаяла, як за пешта зачапілася, і Гнацюк, заўважыўшы гэта, зноў ціха засмяяўся:

— Я не казаў, што не ходзіць. Я казаў, што шмат хадзіць яму цяжка. А праз тыдзень — сокілам будзе лятаць.

— Я праверу. Я зараз Артура распытаю. І калі вы мне зманілі, дык я і не ведаю, што з вамі зраблю.

— Яна яшчэ тут! Людзі ж чакаюць, Тоська!

Марыля падштурхнула Тосю і, калі тая ступіла ў сенцы і ціхенька прычыніла дзверы, параіла Гнацюку:

— Не кажыце вы ёй болей пра Траяна. Вы што, не разумееце?

— Дык праўду ж ёй сказаў!

— А ўсё роўна. Ёй імя яго пачуць — ужо нічога разумнага і не слухае. А тут — пра шпіталь.

— Але, не трэба, мабыць, было. Хай бы сам расказаў, як сюды заявіцца.

— Арцік ідзе! Яго крокі!

— Гэта на гарышчы, здаецца.

— Не, не! Яго крокі на падворку!

Марыля памкнулася да дзвярэй. Але ў хату ўвайшла. Тося, паведаміла, аддыхваючыся:

— Схавалі. Надзейна будзе...

— А дзе памагаты?

— Кулеш? На падворку. Сказаў, што да коней поїдзе,— і неспадзеўкі, з рашучасцю, якая ўразіла Марылю, абвясціла: — Я разам з вамі пайду. Пакажу месца, дзе ўчора шпалы мянялі,— увесь насып стаўклі рамонтнікі. Ніхто, як і той раз, і не зразумее ранкам, чые там сляды...

Марыля ўмяшалася — злавала, што памылілася, не пазнала сынавы крокі, пераблытала іх з Тосінымі,— спытала Гнацюка падкрэслена, не надаўшы аніякай увагі таму, што вырашыла Тося:

— Коней вы дзе пакінулі?

— Ля тарпоўні. У альхоўніку, ля старой тарпоўні.

— Добра зрабілі. Але ж з коньмі будзе цяжка пераходзіць.

— Пераходзім мы пеша. Коней Кулеш назад пагоніць.

Марылю словы Гнацюка ўзрадавалі, яна ўздыхнула з палёгкай:

— Разумна, разумна робіце — на дарогу цяпер не ўзбіцца. Скрозь — акопы. Скрозь і траншэі, скрозь... На пагорку — памятаеце, дзе летась праз чыгунку на конях ішлі? — гарматы зенітныя. Дзякуй богу, што вы туды не пакіравалі.

Было чатыры, а цяпер шчэ дзве паставілі. Падковаю яны вакол станцыі.

— Ціка-а-ава,— працягнуў Гнацюк.— Калі ў тую падкоўку трапіш — гапачка адразу ўрэжаш.

Тося, задаволеная, засмяялася:

— Яны ўжо думаюць, што ў партызан і самалёты ёсць цяпер,— і тут жа яе голас змяніўся, загучала ў ім непахіснасць: — Я з вамі паіду да гравійкі, бо цяпер калі не на акопы, дык на траншэі наляціш. Большасць іх за чыгункаю.

Гнацюк устрывожыўся:

— А што, ноччу яны не пустыя?

— Бункеры, дзе кулямёты стаяць, не пустыя і ўночы.

— Ціка-а-ава,— зноў працягнуў Гнацюк і зноў збіўся на тон вясёлы і жартоўны: — Што б нам рабіць без цябе, Тосечка? Пра-а-апалі б як ніць даць. Разумна робіш, што свайго свата беражэш. Без свата — якое ж вяселле,— і павярнуўся да акна, за якім нешта ціха зашорхала.

— Арцік мой ідзе! Я ж казала! — Марыля кінулася да дзвярэй.— Яго крокі я адразу пазнала! Ён і тады гэта крочыў...

Рыпнулі масніцыны ў сенцах, і ў хату ўвайшоў Артур. Марыля кінулася да яго, лашчыла дрыготкімі ад хвалявання рукамі, адразу ад усіх адасобілася, гаварыла толькі з сынам. Не памылілася — адразу адчула, што ён гэта ідзе,— Гнацюк толькі на гарышчы крокі чуў, а яна і тыя, што на гарышчы, чула і гэтыя, сынавы, хоць і былі яшчэ далёкія! Яе не падманеш, яна навучылася пазнаваць крокі роднага дзіцятка здаля, не блытаць ані з чым. Вось ён стаіць перад ёю — раднюсенькі, міленькі... Схуднеў жа як ён — нават у цемры відаць тое! Праўда, быццам і падрос за тыя дні, што не было яго на хутары.

Гнацюк пажартаваў — падбіваў Тосю на спрэчку:

— Праваднiца ў нас адшукалася... Тося хоча нас да гравійкі праводзіць. Разам з намі хоча ісці ўвогуле. З гэткім праваднiком — з песняю пакрочым...

Тося таропка, нібыта спяшалася папярэдзіць іншую гаворку, якую яна прадбачыла і якой не хацела, запэўніла:

— Вырашыла! І — кропка!

— Ну, кропку мы на коску лёгка перaправім,— пажартаваў Артур.

— Гэтую кропку ўжо не пераробіш. Мне і той раз абяцалі. Абяцалі, што возьмеце?

— Было... Было абяцанне.

— Во-ось! Адсюль і кропачка ўзялася!

Цвёрдасць у Тосіным голасе была спакойная, без крыў-

ды, з адценнем нейкай незразумелай пакуль што Артуру перавагі, і таму ён, з адчуваннем невытлумачальнай трывогі, не пагадзіўся, а спытаў у маці:

— А вы што на гэта, матуля, скажаце?

— Не трэба было абяцаць. Слова не верабей...

— Значыцца, згаварыліся,— засмяяўся Артур.— Вы тут ужо самі ўсё вырашылі, а цяпер мяне — да сценкі ціснеце,— і спытаў пра другое заклапочана: — Засады, матуля, не заўважылі ўвечары?

— Няма, сынок, паблізу засады,— паспешліва запэўніла Марыля.— Назірала ўвесь адвячорак. На гарышчы прасядзела.

— Значыцца, так вырашым...— Артур памарудзіў, быццам шукаў патрэбныя словы і не хацеў рабіць нешта паспешліва.— Тося — з намі. А ты ўжо, матуля, тут пасядзі. Праз чатыры дні, роўна апоўначы, мы вернемся. Той, наш умоўны, сігнал дасі, калі тут нядобра будзе. І рыхтуйся — пойдзеш у атрад. Загад камандзіра. Канчатковы і строгі!

— Пайду, сынок, пайду,— пагадзілася Марыля, здзіўленая не тым, што пагадзілася, а лёгкасцю, з якой гэта ўсё ёй далося.— Не застануся я тут тады, шчыра табе, сынок, кажу,— і, спахапіўшыся, замітусілася: — Зараз, мой сыночак, яешаньку згатую. Мігам. Паясце — і пойдзеце.

— Як вяртацца будзем. Тады ўжо,— сказаў Артур.

— А малачка? Ну, хоць малачка! У суседзяў сёння ўзяла спецыяльна. Ведала сэрца: заскочыш у хату...

— Будзем вяртацца — спынімся. Абяцаю, матулька, цвёрда. Хай куркі нясуцца...

Марыля зразумела, што сына ўжо не пераправсіш, павярнулася да Тосі, загадала тое, што казала часцяком, калі ўночы Тося выходзіла з хаты:

— Тося! Кофту надзень.

— Уга! Каб парыцца?

— Дарогаю надзенеш.

— Слухна,— сказаў Гнацюк, кіруючыся да дзвярэй.— Загад ё слушны. Дзе той каптанчык? Дапамагу несці.

— Рукі і ў нас ёсць. Маем. Без дапамогі пакуль што абыходзіліся!..

Гнацюк ціха адчыніў дзверы, нешта жартам, але пошапкам сказаў Тосі. Але слоў Марыля не зразумела, толькі пачула шэпт, стоены дзявочы смех у адказ, і ёй чамусьці толькі цяпер зрабілася крыўдна, што сын адмовіўся ад пачастунку, не хацеў счакаць, пакуль яна, маці, спячэ яешню. Хай сабе няма часу! А шкляначку малака выпіць? Колькі тут часу таго спатрэбіцца?..

Яна добра разумела, што сын на нейкі момант заскочыў у хату, што ночы цяпер трывожныя, не такія, як былі раней, што сыну трэба ісці і ён пойдзе, пойдзе гэтак жа, як толькі што пайшоў Кулеш, потым пайшлі Гнацюк і Тося... Але розум не пагаджаўся з імгненнасцю шчасця, ёй хацелася не адпускаць сына, хоць на хвілінку якую падмануць лёс, аддаліць горыч расстання.

Марыля кінулася ў сенцы, бухнулася на калені, пачала ўзнімаць кароткую масnічыну ў кутку — хацела дастаць глечык з малаком, які стаяў у схованцы пад падлогаю. Яшчэ летась яны з Тосяй укапалі там у зямлю маленькую скрыню, дзе хавалі і яйкі і малако. Звычайна масніцына лёгка паддавалася, але цяпер разбухла ад вільгаці, і Марыля аніяк не магла падкалупнуць яе з пазоў, абдзірала, як не да крыві, пальцы, шаптала задыхана:

— Малачко халодненькае тут... Зараз, сынок, зараз. Папі хоць крышачку. З глечыка і пап'еш...

— Другім разам, матуля. Як вернемся. Бо познімся. Далёкі дужа шлях у нас сёння...

Яна адчула на сваіх плячах сынавы рукі, скаланулася, ускочыла, схапіла сына ў абдоймы і, плачучы, што без прычыны нядаўна злавала і крыўдавала, трымала моцна, нібыта верыла, што зможа анікуды не адпусціць яго ад сябе.

## 18

Захар разумеў, што робіць глупства, прыспешваючы каня, які ўжо стомлены і змучаны дарэшты, але рука міжвольна і ярасна тузанула мокры і слізкі ад поту раменны повад. Крыху спагадзя ён правай рукою, якой дагэтуль прытрымліваў на спіне аўтамат, ласкава і пяшчотна пагладзіў конскую грыву, сказаў услых, быццам размаўляў з чалавекам:

— Даруй мне, дружа. Але ж Ціхан не будзе, сказаўшы прыехаць роўна а шостай, чакаць мяне, калі спазнюся. А трэба ж Гайдаш пабачыць — хоць адным вокам зірнуць, хоць слоўца ёй сказаць якое... Не, ласкавае слоўца скажам! Нам што абыходзіць? Ну, стаміліся, разумею. А ёй жа — баліць. Кляты гэты асколак... Ну, скажы, ёсць там, на небе, справядлівасць?.. Няма, дружа! Няма-а, павер ты мне!..

Конь, быццам зразумеўшы ўсё тое, што казаў Захар, са згодаю матнуў галавой, гучна форскнуў, і ў гэтым форсканні Захару пачулася яго ўласнае, цяпер паўторанае, сцверджанне: «Няма-а!» Захар аж застагнаў. Лепей бы ён не размаўляў услых. Лепей бы нічога не казаў, трымаў усё ў сэр-

цы. Але ж як утрымаеш згрызоту, як утрымаеш боль, куды дзенеш адчуванне сваёй віны?.. Навошта ён тады адказаў на апошні ліст Гайдаш? Адказаў пасланнем доўгім, грунтоўным, з якога толькі апошні дурань не зразумее таго, што было і ёсць у сэрцы. А каб ён не адказаў? Ці адказаў стрымана, адказаў гэтак жа халаднавата, якім было іх расставанне на беразе Дзвіны, калі Гайдаш пайшла з калонаю мабілізаваных? Яна б, магчыма, гэтак не рвалася сюды! Яна б, магчыма, і не прыляцела ўвогуле сюды! І тады не было б гэтага клятага спарада, які выпусціла ў начное неба фашысцкая зенітка недзе ля Віцебска. І не было б гэтага асколка. І не ляжала б зараз Гайдаш параненая ў партызанскім шпіталі, у чаканні самалёта, каб зноў ляцець назад, ляцець туды, адкуль і прыляцела. Ляцець у невядомасць, ляцець, магчыма, на сустрэчу з чарговым асколкам зенітнага спарада...

«Марна я гнаў каня: да гаворкі з Ціханам мне ў шпіталь не паспець аніяк!..»

Ён разумеў, што ў яго не будзе часу, каб пабачыць Гайдаш, але рука міжвольна зноў тузанула размяклы раменны повад, тузанула моўчкі — думкі скіраваліся зусім у іншым напрамку адразу ж, як толькі падумаў пра тое, што позніцца і давядзецца ехаць у шпіталь пасля гаворкі з Ціханам.

«Навошта паклікаў Ціхан?»

Учора ранкам на нарадзе камбрыгаў у штабе злучэння быў Гусараў, Захар уночы сустракаўся з ім — Гусараў склікаў усіх камандзіраў атрадаў у Быстрыцу. Камбрыг пра выклік да Ціхана — ні слоўца. Але тое, што сказаў Гусараў, і асабліва гаворка не ў штабе, а ў Быстрыцы, цяпер неяк звязвалася з гэтым нечаканым выклікам да Ціхана. Хаця, прыпамсі, нічога ўчора на тое і не паказвала аніяк. Гусараў паставіў перад усімі атрадамі адну і тую ж задачу: рыхтавацца да перадыслакацыі. Але куды і калі плануецца яна — не сказаў. Адно толькі паўтарыў двойчы: на абозы не разлічваць, мабільнасць і яшчэ раз мабільнасць. Увесь боезапас — размеркаваць паміж узводамі. Кожнаму ва ўзводах — выдаць харчовы энзэ. Кожны атрад павінен быць гатовы выступіць у той жа час, як толькі будзе аддадзены загад.

Прыгадваючы зараз тую нараду, якая, не ў прыклад усім папярэднім, была кароткая, без дэбатаў і спрэчак, Захар міжвольна цяпер задумаўся. Схітраваў Гусараў ці не? Ведае, мае той загад і чакае пэўнага часу, каб аддаць яго? Не, наўрад. Каб гэты загад быў, ён бы не адпускаў Захара да Ціхана, нават нічым не пацікавіўшыся. Але ж Гусараў нават не ведаў, што Ціхан яго выкліча, загад атрымала Рыма,

і ніякіх тлумачэнняў не было, і загад гэты быў перададзены не са штаба брыгады, а са штаба злучэння. Папярэдне, значыцца, Гусараў пра гэты выклік не ведаў. Не, мабыць, ведаў, бо на запытанне, якое Захар усё ж зрабіў, Гусараў адказаў каротка: «Выклікаюць — адпраўляйся». А навошта выклікаць?.. Дзіўная, між іншым, гэтая штука — радыёсувязь. Тут не пачнеш дэбаты, не возьмешся глядзець у вочы чалавеку, які аддае загад у надзеі нешта прачытаць яшчэ, уведаць тое, што не выказана ў словах... Але нічога, неўзабаве ён пра ўсё дазнаецца. Вунь ужо і лясок, за ім будзе зноў поле, пераехаць яго, павярнуць управа па ўзлеску...

Убачыўшы знаёмую зямлянку Ціхана, Захар захваляваўся, як бы ўжо ведаў, што чакае яго тут нешта дужа незвычайнае. Ля ўваходу стаяла Ванда, і тое, што сказала яна, збіла Захара з панталыку адразу ж. Ціхана — няма! Але ж ён, Захар, не спазніўся, прыехаў дакладна, мабыць, яшчэ нейкія пяць хвілін ёсць у запасе. Не, толькі тры хвіліны. Але ж усё роўна Ціхан не дачакаўся яго. І як увогуле зразумець тое, што ён бачыць? Звычайна ж тут, каля зямлянкі штаба злучэння, ён сустракаў знаёмых і незнаёмых камандзіраў, усё дыхала тут жыццём напружаным і баявым... А зараз? Анікога, апрача Ванды. Дзіўная цішыня на ўзлеску, на сцежцы асмалкі, кавалкі паперы, падрапай дробненька і кінутай... І нейкі выраз вачэй у Ванды дзіўны — самотныя дужа, заклапочаныя вочы.

— Загадана чакаць. Сказаў: буду, маўляў, праз паўтары гадзіны. Хай Захар пачакае... Роўна гадзіну чакаць давядзецца.

— Пачакаць не бегчы. А што тут у вас? — спытаў Захар, схаваўшы збянтэжанасць і нагнаўшы на твар бадзёрасці.

Ванда неяк няпэўна пацiснула плячыма, спытала ў сваю чаргу, спытала таропка, як баючыся новых роспытаў:

— Як жыве там мая родная рота?

Пытанне, ведама ж, трэба было разумець інакш — «як жыве там мой дарагі Файзуло?» — і Захар пажартаваў, каб унікнуць патрэбы тлумачыць усё падрабязна:

— Нармальна. Як і трэба, жыве. Прыехала б ды паглядзела!

Ванда зірнула на гадзіннік і, наважыўшыся ісці ў зямлянку, сказала ў апраўданне:

— Прымаць зводку трэба. Час...

Яму падалося, што Ванда сказала гэта знарок, баючыся нейкіх роспытаў, і ён паспешліва запытаўся, схаваўшы сваю трывогу:

— А чаго Гайдаш учора не адправілі? Самалёт не прыляцеў?

— Чакалі да раніцы. Пра вылет паведамілі. І — ніякай сувязі.

— А дзе ж ён мог падзецца? Мо не туды заляцеў?

Ванда зноў няпэўна паціснула плячыма, і Захар цяпер добра зразумеў, што яна не хоча роспытаў, што ён не мае права яе затрымліваць, як і не мае права ўваходзіць у зямлянку, дзе працуе радыстка.

— Значыцца, гадзіна ў маім распараджэнні. Дык я не буду тут марынавацца, а падскочу ў шпіталь,— і дадаў, зусім не клапоцячыся пра тое, як яго зразумее Ванда: — А як Гайдаш?

— Я сёння там не была. Увесь час — занятая. А гэта разумна — найсці ў шпіталь. Пешкі, сцежкаю. І конь тым часам адпачне. Ён жа мокры, быццам з вады...

Захар скінуў сядло з мокрай конскай хрыбціны, раскілзаў каня, падоўжыў повад і закруціў адзін канец за тонкую рабіну. Выскачыўшы на лясную дарогу, каб з яе павярнуць на знаёмую сцежку да шпіталя, Захар падумаў пра тое, што зрабіў правільна, не пачаўшы распытваць Ванду, куды паехаў Ціхан ці казаў ён што-небудзь яшчэ. Па адным тым, што Ціхан — упершыню! — парушыў завядзёнку, якой строга прытрымліваўся,— назначыў сустрэчу, а сам некуды паехаў! — па той неахайнасці вакол зямлянкі, дзе раней была ўзорная чысціня, дзе раней і паперкі не знойдзеш кінутай, а цяпер поўна рознага смецця, можна было смела выводзіць, што беспарадак гэты нікога не цікавіць — ёсць клопат больш важны і пільны. Мабыць, Ціхан і паехаў туды, дзе становішча пагоршылася, пагоршылася нечакана і непрадбачана. Але ж не скажаш, каб ужо грымела наўкола, як на тым тыдні. Пацішэла і кананада, як адкацілася некуды, і зусім не чуваць гулу самалётаў. Сёння аніводнага разу яму, Захару, на ўсім шляху не даводзілася збочваць з дарогі, хавацца ў лес, чакаючы, пакуль праляціць самалёт — аніводнага ён сёння не бачыў. А наш вось і не прыляцеў учора. Знік, Ванда кажа. Ведае, пэўна, што бяда прыключылася з самалётам, толькі не мае права тое казаць...

Ззаду пачулася тарахценне колаў, тупат капытоў, і Захар азірнуўся. На лясную дарогу з-за павароткі вывернула фурманка, на ёй, з левага боку, сядзела Сухава. Захар паскорыў хаду, каб паспець вільнуць на лясную сцягу, да якой было ўжо крокаў якіх трыццаць, але фурманка пасцігла яго.

— Сядайце, таварыш камандзір,— сказала Сухава, павітаўшыся і нацягнуўшы лейцы — спыніла каня.— Чаго вы

пешкі?.. О! Дык у адным кірунку і едзем — я ж таксама ў шпіталь. Сёння павінна адлятаць — хочацца развітацца з сябрамі. Шмат у мяне тут добрых сяброў — нават і не спадзявалася, што гэткія цудоўныя вы, беларусы!..

Сказала яна гэта з такой мілай усмешкай, з такой шчырасцю і даверам, што Захар не ўтрымаўся, пажартаваў:

— О-ох, будуць ліць горкія слёзы нашы браты-беларусы на развітанне. Уся мая першая рота, па чале з камандзірам!

— А вы іх супакойце — вярнуся неўзабаве. І адразу — у вашу першую роту, далібог,— сказала яна свойскім голасам.— Сядайце, сядайце,— і, як бы ўжо ён і пагадзіўся, кінула яму лейцы на рукі.— Апошнюю касету адстраляю і зачахлю сваю гармату,— яна ўзяла ў рукі кінакамеру ў цёмным зашмальцаваным футарале, пасунула ўглыб сена на перадку фурманкі, як бы вызваляла паболей месца, каб Захару было зручна сядзець.

— Вы ж здымалі, я чуў, шпіталь.

— Здымала. Думаю, што добрыя кадры будуць. Увогуле, у мяне унікальныя кадры ёсць. Ваш той бой, які франтавыя штурмавікі падтрымалі. А пахаванне? А брацкія магілы? А той жа шпіталь? Мне з вамі шчасціць...

Сухава казала з даверам, проста, без пыхі, не намагаючыся паддобрыцца, чаго Захар страшэнна не любіў.

— Шчасціць, значыцца? — перапытаў ён.— А ці пашчасціць мне ўбачыць тыя унікальныя вашы кадры на экране? У кіно ўжо...

— Калі дажывём — убачым. Але вам я скажу шчыра — шлях да экрана яшчэ доўгі... І ўвогуле, я не ведаю, што б і аддала, каб яны не існавалі, усе гэтыя мае унікальныя кадры. Здымаю часам і ўсё думаю, што не на плёнцы, а ў сэрцы ўсё застаецца. Здаецца, вось пакладзі сэрца ў апарат — і пойдуць, паплывуць усе гэтыя жахлівыя кадры... Калі гарэлі вёскі, я здымала кожную хату паасобку, зблізку, буйным планам... Полымя... Чорны кудлаты дым... Жахлівае гора людское... Я не хачу пахваляцца, але мой дакументальны фільм — страшэннай сілы прысуд фашызму... Я ўжо бачу фільм ад першага кадра да апошняга... Уяўляеце?.. Гарэць вёскі. У хатах — расстраляныя дзеці, жанчыны, старыя... Аніякія цітры не патрэбны, толькі адзіны надпіс: гэта — фашызм!

Сухава казала шчыра, у голасе гучаў боль, і Захар слухаў яе з увагаю і шчымлівым адчуваннем, горкім папрокам сабе за тое, што гэтак недарэчы пажартаваў пядаўна.

— Ёсць акты аб зверствах захопнікаў у нашай зоне — складаліся шчэ летась і пазалетась,— сказаў Захар.— Кожны

дакумент напісаны сведкамі, якія на свае вочы бачылі, як фашысты спальвалі людзей, хаты, школы, збожжа на полі... Чаго не наставіць і гэта ў фільм? — і, крыху памаўчаўшы, дадаў пераконана: — А знайсці дакументы лёгка — усе яны адасланы ў Штаб партызанскага руху...

Сухава, якая сядзела бокам, павольна павярнулася, утаропіла на Захара вялікія попельныя вочы, глядзела немігатліва, быццам са здзіўленнем вывучала Захараў твар. Роўныя дужкі светлых броваў, густа зацярушаныя пылам, здаваліся тоўстымі і кудлатымі; пыл ляжаў на бровах толькі зверху і пакрысе апаўзаў уніз, на скуру, і здавалася, што яны ўвачавідкі сівеюць.

— А гэта ідэ-эя,— нараспеў, як бы ўслухоўваючыся ў гучанне свайго голасу, прамовіла Сухава.— Добрую ідэю падкінулі мне. Я адшукаю тыя дакументы. Калі, вядома, шчасліва дабяруся.

— Шчасціць на зямлі — пашчасціць і ў паветры.

Пыл з правага брыва Сухавай ссыпаўся, і Захар раптам згледзеў зменены, адзначаны старымі пакутамі твар і зразумеў, што побач з ім сядзіць жанчына, якая толькі звонку выглядае дзяўчынкаю, а гора ўжо зведала нямала.

— Дачка мая тое ж цвердзіць,— вочы Сухавай падабрэлі.— «Ты, мама,— самы шчаслівы чалавек на зямлі».

— Колькі ж ёй?

— Чатыры гадочкі. У верасні споўніцца. Яна — у бацьку — бялявая,— і раптам, як бы хаваючыся ад гэтай сваёй шчырасці, паспешліва папытала: — А ваша сям'я дзе? За лініяй фронту ці тут, у брыгадзе?

— Там.— Захар, торкнуўшы пальцам у неба над галавой, ненечакана дадаў гэтак жа жорстка, быццам Сухава была ў нечым вінаватая ў яго горы: — Жонку і дзяцей фашысты спалілі. У бацькавай хаце... Першая зіма вайны...

— О-ой... Божухна! Я ж не мела права распытваць. Даруйце за гэты боль...

Ён не сказаў, а неяк з цяжкасцю выціснуў з сябе тры кароткія словы:

— Болю ўжо няма.

— Даруйце, я прычыніла вам боль,— паўтарыла Сухава і апусціла галаву, быццам адно толькі цяпер яе і цікавіла — мыскі ботаў, якія хутаў пыл, што ляцеў з-пад капытоў каня, траляў на колы і церусіўся, як сеяўся з іх.— Я спачуваю... І яшчэ раз даруйце мне...

— Я часцяком параўноўваў свой уласны боль з болем зямлі, народа — болем мільёнаў. Што важыць наш уласны боль у гэтым акіяне, без мяжы і краю?

Сказаўшы, Захар будзёнпа, без згрызоты падумаў пра тое, што схлусіў Сухавай. Няма болю... Мноства, мноства разоў пераконваў сябе ў гэтым, кляўся, што не будзе вярэдзіць душу, кіне варушыць мінулае, не будзе чапаць старую бяду. А што атрымлівалася? Мала было — а можа, і ўвогуле не было, не існавала! — дзёп і начэй, каб нешта не снілася, не згадалася з тых дзён, калі былі жывыя і жонка і дзеці, і бацька і маці... Сухава, здаецца, першы чалавек, які папытаў пра тое, аб чым ніхто ў брыгадзе яго не распытваў ніколі. Дзіўна, чаму ж ніхто не сказаў ёй пра яго бяду?.. Не сказалі дык і не сказалі! І цябе дзівіць?.. Ты хочаш, каб кожны ведаў пра твой асабісты боль, толькі табе асабіста спачуваў, тваё асабістае гора люляў?.. Поўна ў людзей свайго гора, поўна бяды, ажно няма куды больш...

Параўнанне з чужой бядою, вялікім народным горам і ахвярамі, якое Захар рабіў шмат разоў і якое раней заўжды неяк сцішала ўласны боль, гаіла раны сэрца, цяпер растрывожыла, паглыбіла горкае разуменне таго, што Захар аніяк не зможа жыць без тугі і болю страт блізкіх і родных яму людзей, што раны ў сэрцы аніяк не гаіліся, смылелі ўвесь час, пяклі, і дастаткова было кароткага, як зараз, шчырага спачування, каб даўняя бяда ўскіпела, спарадзіла яшчэ большы боль. Значыцца, хлусня гэта, што час гоіць усё? Так, падман — нічога не гояць дні, што адлятаюць у нябыт. Мінаюць дні, не вяртаюцца, а боль можа вярнуцца, калі яму захочацца, ён нікуды не знікае, ён жыве разам з табою, і ён не пусты сон, які можа ўдаўніцца і прапасці назаўжды; невыводная горыч жывога сэрца, яна будзе жыць да скону тваіх дзён, да апошняй лапінкі твае жыццёвае дарогі, якая невядома калі і дзе скончыцца...

І чаго маўчыць Сухава? Што, хочаш новых спачуванняў?.. Не, дарагі, табе не спачуванні патрэбны. Падумай лепей пра тое, што ты скажаш Гайдаш! Якімі словамі яе суцешыш, якімі парадамі, якою споведдзю сунімеш яе боль? Паспрабуй зазірні ў яе сэрца. Паспрабуй зразумець, аблегчыць пакуты, суняць горыч непапраўнай бяды. Яна і тады ішла з калонаю, каб быць ад цябе падалей, ішла, добра разумеючы, што робіць. А цяпер?.. Дамаглася свайго, прыляцела... Дасягнуць свае мэты і павярнуць назад? А можа, узяць ды пакінуць яе тут, у атрадзе? Смешна! Трэба было тады пакідаць! А цяпер ёй патрэбен шпіталь, а не гэтая зямлянка на ўскрайку лесу, куды не сёння, дык заўтра могуць прабіцца карнікі... І чым ты яе тады ўратуеш? Пачнеш жаліцца на свой лёс, на гора, што носіш у сваім сэрцы?..

— Я застануся, мабыць,— парушыла маўчанне Сухава.— Застануся. Галаву не ссякуць!

Захар зразумеў яе па-свойму, агледзеў цёмныя і змрочныя хмары, што паўзлі нізка, як у позпюю восень, быццам чапляліся за вершаліны бяроз, сказаў з упэўненасцю:

— І мне не дужа даспадобы неба. Але ж — вясна. Уночы хмары расцягне. І самалёт прыляціць. Я перакананы.

— І добра, калі гэтак. Плёнкі я адпраўлю, а сама — застануся,— і паўтарыла па-заліхвацку: — Галаву не ссякуць!

— Вы калі гэта вырашылі? Зараз?

— Амаль што,— хутка адказала Сухава і тут жа ўзялася тлумачыць, быццам іранічнае запытанне Захара вымагала тэрміновых тлумачэнняў і абгрунтаванняў: — Думала і раней. Але канчаткова вырашыла зараз.

— Шыкоўнае жыццё ў кінааператараў! Ніякіх табе загадаў — рабі што хочацца!

— Чаму ніякіх загадаў? Загад ёсць, даволі строгі і пэўны: ляцець сёння ж! І разумею — трэба. І тое, што матэрыялаў маіх чакаюць,— ведаю. І таму зраблю я вось так: матэрыял адпраўляю, дакладу да яго тлумачэнне — напісаць паспею. І папрашу, каб прыслалі плёнкі паболей. Хаця, прасі не прасі — па ліміту атрымаеш. Цяпер з плёнкаю не вельмі проста, ведаеце...

— А ваш фільм? — спытаў Захар, разумеючы, што дарэмна пацвельваўся з выгод кінааператарскага жыцця.

— Пакуль апрацуюць плёнку... Думаеце, проста гэта? На ўсё цяпер — чарга. А я тым часам зраблю свае дзве касеты, што ёсць.

Пераканаўчыя развагапні Сухавай выклікалі прыхільнасць. Але Захар, наўпярок волі, пажартаваў:

— Адкуль жа яшчэ адна касета ўзялася? Перад гэтым я, здаецца, чуў, што адна-адзінюсенькая, маўляў, засталася.

Яна развесялілася:

— Калі ваш начштаба піша ў данясенні: у роце, маўляў, на кожнага па дзве абоймы, дык ён жа нічога — гатовы ісці на заклад! — не піша пра патроны, якія ў кожнага ёсць у кішэні. Абоймачка нейкая там заўсёды завалялася. Праўда ж?

— Ху-утка ж вы нашы парадачкі вывучылі-выведалі!

Сухава сказала з даверам:

— Я да людзей — з адкрытай душою. І людзі мне плацяць гэтым жа.

— Значыцца, калі зазірнуць у кішэнь кінааператара, дык там заўсёды запасная плёначка?

— Злапомнасць — рыса беларусам не ўласцівая,— Сухава засмяялася гарэзна.— Адкуль жа яна ў вас?

— Сам не ведаю. Хацеў пажартаваць. Добра, шчыра пажартаваць. А чую — зларадпасць у голасе... Відаць, пакрысе адвучваемся жартаваць ад душы.

— Складаная, скажу я вам, псіхалагічная праблема. Гора, бяда, слёзы... А побач — смех, жарты... Калі я пачула пра гэты партызанскі закон Архімеда, які вывелі ў вашым атрадзе,— зарадавалася. «Стылiста», скажу вам, паважаюць...

— Паспелі пахваліцца? Санько, мабыць?

— Э-э, не-е! Я тайны не выдаю! Але з Санько я пазнаёмілася — чалавек выключны, скажу вам шчыра. Самабытны. І гэткая ж — Гайдаш...

Захару падалося, што яго ўзялі за горла, вывернулі на агульны агляд тое, што ён хаваў глыбока ў сэрцы, і таму схмурнеў:

— А што Гайдаш? Чым яна вас гэтак зацікавіла?

— Доўга ўчора размаўляла з ёю — гераічная жанчына. Сэрца сапраўднага салдата.

— Вы здымалі яе?

— Так, двойчы. Страшэнна ўразілі вочы. Вось ужо мінулі суткі, а мне здаецца — на мне яны спыніліся. І — глядзяць ва ўпор. З такім адчуваннем я сёння прачнулася на золку,— доўгім позіркам агледзела Захараў твар і, быццам нешта ўбачыўшы ў яго за плячыма, утаропілася туды; спытала з развагаю і сумненнем, быццам прасіла парады ў таго чалавека, які быў за плячыма Захара: — Відаць, памылка мая: пашкадавала метр плёнкі...

— Гэта лёгка выправіць.

Сухава развяла рукамі:

— Усім здаецца, што ў нас лёгка: навёў апарат, узвёў затвор, націснуў...

— У гэткай паслядоўнасці, прызнаюся, я і ўяўляў.

— І дарэмна. Добры кадр і каравуліш, і калеш, і ў пекла лезеш, і галавою рызыкуеш... А потым раптам спахопішся, нешта прыгадаеш і кусаеш сабе локці: як, чаму, маўляў, не зняў тое ці гэта. І — не вернеш! І каб жа на гэтым і канец! Здараецца, што і не прапусціш той, патрэбны і самы добры, кадр, а тут — разумнік з нажніцамі. І менавіта на тваю творчую знаходку і нацэліцца: чак-ча-арак! Лёгка, скажыце, такое перажыць?

— Пакуль жывы — перажыць усё можна,— па-філасофску заключыў Захар.— Абы час быў і ахвота.

— Часам і першае ёсць, і другое. А — не перажываецца.

— Здараецца і такое... Вось ужо і шпіталь.

Лясная дарога як бы ўперлася ў нізкі дах зямлянкі, за якой былі відаць вільчыкі яшчэ трох, доўгіх, старанна зацярушаных імхом. Далей праглядвалася прасека, чамусьці дужа светлая, як бы падсветленая сонцам, і Захар нечакана зразумеў, што гэта падман зроку: дарога за дрэвамі па прасецы цёмная, неба ж хмарнае, сонца не відаць, а светлым здаецца паветра і ўсё наўкола ад бялюткіх, быццам нядаўна старанна памытых і адшараваных, маладых бяроз; зіхатлівая бель бярозы быццам вылузвалася з зямлі і паўзла ўгору, і дрэвы, што раслі густа, у нейкім строгім парадку, як саджаныя чалавечай рукою, таксама як бы паволі сунуліся ўгору, і рух гэты быў бясконцы, і дзівосны, і падманны.

Захар спыніў каня ля першай зямлянкі, хацеў дапамагчы Сухавай злезці, але не паспеў — яна імпэтна саскочыла на зямлю, адабрала ў яго лейцы і спрактыкаванай рукой зачапіла іх за пярэдні стаяк фурманкі.

— Вы гэта ўсур'ёз — не ляцець? — спытаў Захар, пранікаючыся незразумелым даверам да гэтай жанчыны, з якой бачыўся дужа рэдка. Цяпер, калі яна стаяла крыху нахіліўшыся, ён зноў быў уражаны падабенствам з Гайдаш, падабенствам, якое патрэсла яго ў тую ноч, калі Сухава прыляцела на тым жа самалёце, на якім прыляцеў і Ціхан.— Паверце мне, праз тыдзень тут усё будзе кіпець, як вада ў кацялку на буйным агні.

Яна коратка, але дужа пранікліва зыркнула на яго, тут жа адвяла позірк убок, сказала задуменна:

— Адчуваю, вы нешта... Вы папрасіць мяне аб нечым збіраліся.

Ён зразумеў, што злоўлены на падмане, і зразумеў, што павінен у гэтым прызнавацца:

— Так, пра Гайдаш хацеў вас папрасіць. Магчыма, у дарозе ёй трэба будзе чым-небудзь дапамагчы... Потым — шпіталь. Хацелася, каб у добры... Да вопытных урачоў. І ведаць адрас...

— Усё гэта зробіцца, паверце... А рашэнне сваё я ўжо не перараблю.— Твар Сухавай імгненна змяніўся, дзіўная сталасць прабілася і на шчоках, і ў звужаных, схмурнелых бровах, ва ўсёй паставе, неяк сіратліва прыгорбленай.— Хочаце — верце, а хочаце — не верце. Але вось прадчуваю: трэба быць мне ля вас!

— Ля мяне? — ён здзівіўся, і здзівіўся шчыра.

— Ля вашага атрада — гэта я мела на ўвазе. Мая галоўная творчая ўдача, мае лепшыя кадры чакаюць мяне там, на тых глеістых выспах паміж азёраў... Я прыехала ў ваш атрад, стала ля бяроз на пагорку, дзе пачынаецца траншэя,

глядзела на чарот і ажно захліпнулася ад прыгажосці: возера тваёй удачы, Сухава,— гэта я сказала сабе. А потым быў бой, і я зразумела, што не памылілася: наўрад ці знойдзецца дзе-небудзь хто з нашага брата, кіношніка, хто зняў тое, што на маіх плёнках,— атаку партызан прыкрываюць з паветра нашы штурмавікі... І я ведаю: адна з галоўных падзей гэтай партызанскай вясны — там, у вас, яна яшчэ будзе. Як жа я магу ўцякаць?..

Голас Сухавай гучаў шчыра; але невядома чаму — ці ад яе аблічча, ці ад таго, што карцела хутчэй гаворку скончыць,— падплывала да сэрца трывога, Захар хваляваўся, нерваваўся, быццам нехта ўвесь час цікаваў іх, падслухваў. Сухава не глядзела цяпер на яго, яе позірк быў скіраваны некуды ў дол, зацярушаны леташнім бярозавым лісцем, праз якое гнаў сакавітыя попельна-зялёныя лісціны сон баравы, з нізкімі тоўстымі галоўкамі фіялетавай, з махрамі, квецені, і Захар павярнуў галаву ўлева, быццам з таго боку і накатвалася хваляванне, ішоў неспакой, і знямеў, сустрэўшыся з позіркам Гайдаш.

Яна ляжала за накатым дахам зямлянкі на яловых галінах, засланых карычневай зрэбнай посцілкай. Адзін канец посцілкі быў у яе пад бокам, другім былі ўхутаны ногі, і плечы Гайдаш здаваліся худзенькія, дужа змізарнелыя, як усохлыя, і сама яна выглядала дужа кволай, несамавітай, зусім не такой, якой ён запамятаў яе на беразе Дзвіны. У вачах Гайдаш быў боль, і вочы глядзелі на яго ўважна, з недаверам, асуджэннем і нейкім горкім спачуваннем, і ад гэтага позірку ён сумеўся, адчуў, што яго калоцяць дробныя непрыемныя дрыжыкі.

Сухава, нічога не сказаўшы болей, усё гэтак жа старанна аглядаючы дол пад нагамі, як бы нічога і нікога не заўважаючы, апрача вузенькай палоскі зямлі перад сабою, як бы адразу закрэсліўшы размову з Захарам, пайшла ў зямлянку; Гайдаш яна, здаецца, нават і не заўважыла; а можа, заўважыла, але знарок зрабіла выгляд заклапочаны і вырашыла быць падалей.

Моўчкі, марудна перастаўляючы нацяжэлыя, як каменныя, ногі, Захар наблізіўся да бяроз, пад якімі было зроблена лежава, сеў побач, павітаўся, спытаў Гайдаш пра адчуванне і нічога не пачуў у адказ. Па тужліва сціснутых вуснах і бляклых, амаль празрыстых, нейкіх нетутэйшых вачах ён зразумеў, што Гайдаш чула яго размову з Сухавай, чула і вельмі пакрыўдзілася. І натуральна: стаіць, з кінааператаркай пра нешта дамаўляецца, а яе, Гайдаш, быццам і пад увагу не бярэ!

— Возера маёй удачы.— Гайдаш паўтарыла словы Сухавай з развагаю, тугой і скрухай, цалкам і адразу пацвердзіўшы Захараву здагадку.— А мне трэба сказаць іначай... Я, праўдзівей, сама сабе і кажу: маё апошняе возера...

Яму зрабілася горача, ён рыўком расшпіліў усе гузікі на сваёй скуранцы і не адчуў аніякай палёгкі — не хапала паветра, быццам нехта перасмаргнуў калянай вяроўкаю горла.

— Гэта возера нашай радасці,— запярэчыў Захар, намагаючыся, каб голас гучаў даверліва і проста.— І не трэба адчайвацца. Ты вернешся са шпіталя, а тут ужо — вольны край. Ад возера, дзе зараз наша абарона, да нашай Дзвіны. Абяцаю: адвязу адразу ж цябе туды, дзе ты перапраўлялася з калонаю. І раскажу пра тое, аб чым думаў, калі калона ішла і я глядзеў на яе і на Дзвіну...

— Я таксама прыняла рашэнне: не ляцець,— сказала Гайдаш голасам, які ён не пазнаў — ні ўдзячнасці, ні спагады, ні прыхільнасці.— Ноччу мне было добра, плячо зусім не балела — гоіцца рана. На світанні я і накрэмзала рапарт на імя камбрыга і на імя камандзіра атрада — субардынацыю захавала,— і яна працягнула яму аркушок паперы, разлінаваны чорнымі лініямі; над кожнай лініяй месціліся два радкі, напісаныя алоўкам.— Тут усё абгрунтавана: я застаюся ў брыгадным шпіталі. Гусараў, відаць, рапарт ужо атрымаў. А гэты — вам асабіста...

Ён, не чытаючы, згарнуў аркушок у чатыры столкі, засунуў у кішэню скуранкі.

— Скажы, як пачуваеш?

— Добра. Так што назад я не палячу!

— Боязна, што звалішся з самалёта? — няўдала і зусім не да месца пажартаваў ён.

— Я цяпер нічога не баюся.

— Даруй, па-дурному жартую. Але ляцець табе трэба!

Хацеў сказаць шмат, сказаць, што самае разумнае — ляцець, выкарыстаць магчымасць, якой праз дзень-другі можа не быць зусім. Але сказаў толькі тое, што сказаў, і сам сабе загадаў нічога ёй больш не тлумачыць.

— Хачу быць з атрадам. Я з ім — ад першага дня,— яна паступова адыходзіла ад гаворкі ўпартай, нейк расслаблялася, быццам падводзіла і яго да думкі не спрачацца, пагадзіцца з ёю, паверыць у шчырасць яе слоў.— Хачу ў ліку першых на свае вочы ўбачыць мой Віцебск вызваленым... Вольны!.. Мне вулка наша часта сніцца... Мост на Віцьбе... Парк... І бераг Дзвіны... Пад самы горад фронт выйшаў!

— Ты ўжо ведаеш? А я хацеў узрадаваць.

— Я ўжо чула, як вы мяне хацелі «ўзрадаваць». Бы малое я вам дзіця... Я ўсю гаворку вашу чула!

Дзіўным чуццём ён зразумеў, што яму нельга апраўдвацца, нельга паводзіць сябе чалавекам, які ў нечым вінаваты.

— Цярпі, Зося, так прыйшлося,— сказаў ён весела, але грубавата.— Усё гаварылася разумна: ляцець табе трэба. Гэтага шпіталя,— ён павёў рукою наўкола, быццам пералічваў зямлянкі ў бярэзніку,— можа і не быць неўзабаве.

— І мяне — таксама.

Ён злавіў у яе голасе зусім новыя ноткі горкай развагі, крыўды, добрага ўсведамлення таго, што чакае яе наперадзе, і раптам падзівіўся: яна гэтага і не тоіць ад яго.

— Табе — сто гадоў зязюля адлічыла,— сказаў Захар робленым бадзёрым голасам.

— Тым больш! Няма таму аніякай патрэбы мяне адпраўляць,— і змоўкла на момант, быццам сказала непатрэбнае, непрадуманае, і спалохалася. Але, схамянуўшыся, дадала без горычы, не ўмольным і вінаватым голасам, а цвёрда, пераконана: — Хай усё тут круціцца, як у кацялку. Хай мне суджана ў гэтым кацялку загінуць... Але — побач з табою.

Ён збянтэжыўся ад гэтага ціхага, упершыню пачутага «з табою», не ведаў, што рабіць, што сказаць, як зірнуць на яе. На нейкі міг ён як бы адключыўся ад усяго, чым жыў яго розум, ад клопату, ад трывогі, жыў толькі гэтым, што пачуў, і хваляваўся, як малы, не разумеючы, што пачуў праўду, якую чалавеку казаць заўсёды цяжка.

Недзе ў тым баку, адкуль яны прыехалі з Сухавай, пачала свой размераны, абыякавы падлік зязюля, і Захар, крыху палічыўшы яе «ку-ку», прамовіў, надаўшы свайму голасу штучную абыякавасць — вырашыў гэтым бараніцца ад шчырасці, якой не хацеў зараз і якой баяўся:

— Трэці год хаджу без грошай,— і з усмiхам паляпаў сябе па кішэнях: — Вясной зязюля кукуе — лічы грошы, кажуць. А ў мяне? Каб табе капеечка ў кішэні завалялася. Значыцца, да наступнага года — без капейчыны ў кішэні. Жах!

— З табою ўвесь час — жах. Я прыкмеціла гэта даўно. А зараз ведаю зусім дакладна. Ты толькі не хочаш яго прызнаць, жах гэты свой!..

Збянтэжанасць ад таго, што яна гаварыла яму даверліва «ты», мінула, саступіўшы месца здзіўленню ад абвінавачвання, якое кінулі яму ў твар.

— Жах? Са мною? Што ты мелеш?

— Я правая, ды сарочка дзіравая...

Ён прыкмеціў, што яна як бы і не слухала яго, сказала адчэпнае, занятая нейкім іншым клопатам, нейкай іншай

думкаю, якую пнулася схаваць, утоіць. Не стрымаўся, папракнуў:

— Размаўляеш са мною. Але слухаеш — не мяне!

— Зязюлю слухаю... І думаю... І думаю пра тое, ад чаго баліць сэрца.

— Ты ацалела цудам. І я... Я не пакіну цябе тут! Сілаю ўвапхну ў самалёт. Ведай!

— Чатырнаццаць... Пятнаццаць... Нехта ж будзе яшчэ гэтулькі жыць!

— Нехта? Мы будзем!

— Ты — пакрыўдзіўся. Але я сказала праўду... І гэта не ты, а твой жах гнаў Гайдаш з атрада...

— Што ты мелеш? — ён адчуваў перакананасць у яе словах, верыў ім, і гэта яго дзівіла.— Які жах?

— Увесь час яго адчувала. І як ты злаваў, што недарэка-Гайдаш апынулася ў атрадзе... Калі злаваў? А на тым полі, як Балаш ляжаў паранены. Адчувала, як ты радаваўся, што з калонаю пайшла — падалей ад вока... Скажаш, памыляюся?

Ён разумеў, што не мае права гаварыць праўду ёй цяпер, калі павінен прымусіць яе адмовіцца ад сваёй задумы заставацца тут і не ляцець за лінію фронту ў шпіталь, і таму няпраўда вырвалася як бы сама па сабе:

— Нехта ж павінен быў ісці з калонаю? Павінен быў! І я паслаў цябе, паслаў гэтак жа, як паслаў перад гэтым Чаславу. Я выконваў свой салдацкі абавязак. І хто мне зараз скажа, што ёсць у нас цяпер нейкі іншы?

— Я скажу. Берагчы адно аднаго — хіба не абавязак?.. Я пайшла тады з калонаю, ім кіруючыся — абавязкам. Пайшла, каб не страціць тое, чым ганарыцца чалавек, які мне дарагі...

— Нешта слаба даходзіць. Патлумач!

— Ты ганарышся, што камандуеш атрадам. Справядлівы і мужны, ты не хацеў анічога запляміць. І не мог, не хацеў дазволіць сабе тое, што бязлітасна асуджаў у другіх. Тваё сэрца як не жыло тады...

— І з гэтага — жах?

— Жах быў ва мне таксама. Жах таго, што на цябе хто-небудзь кіне вокам, паглядзіць з прытоенай усмешачкаю, калі я буду побач... І табе — забаліць... Мне — лепей хай куля, чым табе — боль...

Ён слухаў яе, і гады, што аддзялялі яго ад жытнёвага поля, асветленага водбліскамі агню, які жэр горад, бачыліся яму ў яснай, але дзіўнай праекцыі — неяк усё скампанавалася, збілася ў адно месца, але нагрувашчвання не было, а ўсё месцілася ў строгім і дакладным парадку,— і разуменне

таго, што ён зрабіў вялікую памылку, адказаўшы ў свой час на ліст Гайдаш, не прыгнятала яго. Няма і не было аніякай памылкі! Гайдаш разумна зрабіла, пайшоўшы тады з калонаю мабілізаваных за лінію фронту. Каб ён тады сваёй уладаю затрымаў яе ці яна, паддаўшыся парыванню сэрца, засталася побач, іх дарогі, напэўна б, разышліся і яго збалелае сэрца не прыняло б ад Гайдаш нічога. А яе сэрца яму б нічога не даравала, мабыць... Дзівак, аднак, ты, Захар! Разважаеш пра свой лёс і пра лёс Гайдаш з упэўненасцю чалавека, у якога ўсё склалася добра, які ведае, што адбудзецца сёння і заўтра, як усё павернецца, якія і куды дарогі павядуць цябе, што чакае Гайдаш... Разважаеш як чалавек, які цвёрда перакананы, што наперадзе яго чакаюць толькі светлыя, толькі шчасныя дні, дні без клопату, без турботы... Але ж хто можа зараз паручыцца, што менавіта так і здарыцца? Ніхто, мабыць, не можа... Так, ніхто! Ніхто не можа сказаць з упэўненасцю, што і яна і ты ацалееце ў гэтай віхуры... Шмат, шмат ты ўжо думаў пра тое! Ды, зрэшты, навошта заглядваць далёка! Ты, напрыклад, не ведаеш, будзе сёння самалёт ці не, а калі будзе, дык ці шчасліва даляціць да месца. Больш таго, ты нават не ведаеш, не можаш прадбачыць, што пачуеш праз гадзіну: добрае ці благое скажа табе Ціхан. Ды дзе ж праз гадзіну! Хвіліны толькі і засталіся да часу, які вызначыла табе Ванда!.. Усё круціцца, усё змяньваецца, усё іначыцца непрадбачана, аніяк незапланавана, аніяк непрадугледжана... Відаць, і ў Ціхана не ўсё атрымліваецца гладка, паварочваецца зусім непрадбачана і нечакана. Дзе ж — відаць! Гэтак і ёсць! Ён планаваў, што брыгады змогуць трымаць лініі абароны гэтулькі часу, колькі спатрэбіцца, што яны не пусцяць ворага ў свой партызанскі край, пратрымаюцца да таго часу, пакуль не рушыць у наступ фронт. А фронт неяк стабілізаваўся, праўда, ён грыміць штодня, і грыміць ужо зусім блізка. Але ж, па сутнасці, усходні край партызанскай абароны цяпер значна далей ад яго, чым месяц перад гэтым... А фашысцкія танкі і самаходкі — франтавыя, рэгулярныя часці, падтрыманыя авіяцыяй! — крок за крокам нішчаць партызанскую абарону, сціскаюць кола блакады. Ды гэта, зрэшты, і не нейкая блакада — агульны наступ, наступ па ўсіх напрамках... Гэта якраз тое, чаго баяўся ён, Захар, тое, што апошнім часам непакоіла дужа: іх гоняць у мех! І трэба — Ромель і той гэта сцяміў! — ірваць мех! Трэба было рваць даўно! А Ціхан — чакаў! Чакаў аж да гэтага дня. Відаць, нарадзе камбрыгаў гэта і давялося абмяркоўваць — як зламаць кола і вырвацца на прастор. Відаць? Гусараў жа табе ясна сказаў і зразумела:

перадыслакацыя. Увесь баявы рыштунак — на свае плечы. Харчовы энзэ — у кішэні. Паспрабуй скажы Гайдаш, што атрад мае загад быць гатовым выступіць адразу ж, як толькі камандаванне палічыць тое неабходным! Навошта ж яе палохаць! Трэба, каб яна верыла, што шпітальныя зямлянкі будуць і сёння і заўтра, што прыляціць самалёт і ўсіх параненых вывезуць за лінію фронту, вывезуць гэтак жа, як вывозілі напрадвесні і ўзімку... Не трэба ёй ведаць, што, можа, заўтра атрад пойдзе па лясах і балотах і што параненых не будзе каму несці, што партызанская тактыка імкліва змяншаецца... Так, так! Нешта ж змысліў Ціхан! А ёсць жа і Штаб, што вышэй за Ціхана! Ёсць, ёсць абавязкова нейкі топкі стратэгічны разлік, нейкі сакрэтны план... А што, скажам, каб сабраць усе партызанскія сілы зоны ў адзін кулак і ўдарыць у бок Віцебска? А фронт — адтуль! Не, нерэальна! Праўдзівей, позна. Поспех задумы мог быць недзе напрадвесні, калі партызанскія брыгады былі не зматаныя баямі, стаялі бліжэй да фронту, калі не было гэтулькі параненых... Ціхан казаў... Не, ён жа і цяпер нешта гаворыць! Недзе зусім побач гаворыць! Яго голас!..

Захар павярнуўся ўлева, управа зыркнуў — дрэвы заміналі добра бачыць — і тады ўгледзеў ля апошняй шпітальнай зямлянкі Ціхана, прыгорбленую постаць галоўнага ўрача, які быццам намагаўся адпіхнуць, адціснуць плячом Сухаву; крыху воддаль стаяў Велікапец.

— Слухай, Кася, мяне ўважліва,— таропка прамовіў Захар, назваўшы Гайдаш ласкава, назваў так, як звычайна звярталася да яе Часлава, і ўпершыню ім ужыты зварот нечакана адкрыў Захару тое, у чым ён неахвотна прызнаваўся нават сабе: гэтая маленькая, саслабелая ад раны, кволая дзяўчына вельмі блізкая яго сэрцу, і адзінае, што зараз яго непакоіць — каб шчасліва склаўся яе лёс.— Будзе самалёт — ніякіх выбрыкаў. Ляці! Буду жывы — я цябе знайду. Мы не згубімся, павер. І нічога не кажы больш. Ляжы. Чакай самалёт. І вер у тое, што я табе сказаў. Добра?

Ён схіліўся над ёю — змысліў, што ласкава і пяшчотна пацалуе яе ў скронь,— і насустрач яму мітнуліся рукі Гайдаш, моцным замком сашчапіліся на патыліцы. Яна пацалавала яго моцна, парывіста, адчайна, гарачымі, але шархоткімі вуснамі і тут жа адпіхнула, і яму здалося, што не рукі адштурхнулі, а таропкі, бязлітасны шэпт:

— Добра! І ты ідзі! І не азірайся! Толькі не азірайся! Малю!..

Захар узняўся і адчуў, што яго водзіць у бакі. Але ён крочыў, ставіў ногі роўна, і боты як праваліваліся ў апалае

леташняе лісце, і тоўстыя попельна-фіялетавыя пупышкі сну баравога рыпелі пад падэшвамі. Захару здавалася, што зямля зыбаецца ў яго пад нагамі, і прымушаў сябе ісці цвёрда і не азірацца.

Спакойна, цвяроза падумаць пра тое, што адбылося паміж ім і Гайдаш, Захар не паспеў — прыкмеціў, што Ціхан бачыць яго, цікуе за ім, і таму знарок запаволіў хаду, каб неяк ачомацца, супакоіцца, суняць мітуслівае тоўханне крыві ў скронях, грукат спалоханага і ўзрадаванага сэрца. Словы Гайдаш жылі ў ім, ён быццам увесь час чуў іх, усё яшчэ адчуваў на сваіх вуснах яе гарачыя шархоткія вусны. Дзіўная думка незразумела і ўпарта давіла, ціснула, крышыла радасць — думка пра здраду свайму сямейнаму мінуламу. Здавалася дзіўнай не сама думка — шмат разоў ён спрабаваў пераканаць сябе, што страціў сям'ю назаўсёды, што ён не адзіны такі гаротнік,— а тое, што ён не зведаў радасці і ад прызнання Гайдаш, і ад яе дзікаватага, парывістага пацалунка. Дакладней, радасць была, але нейкая апантаная, зацятая, якая ўпарта церабіла сабе дарогу, і жаданай палёгкі яна, гэтая радасць, не прыносіла, і горыч адзіноты не знікала.

Ціхан ішоў яму насустрач — Захар нават не заўважыў, куды падзеліся людзі, якія толькі што былі побач з ім,— гукаў здаля, не вельмі прыветна:

— Чаго прахалоджваешся? Цябе куды паклікалі? Дзе загадалі чакаць?

Апошнія словы прагучалі рэзка, раздражнёна, але Захар не лічыў сябе вінаватым і раптоўна адчуў, што тая радасць, якая быццам і не прынесла жаданай палёгкі, цяпер надзейна бараніць ад усяго, нават ад Ціханавай незадаволенасці.

— Мне сказалі, што толькі праз паўтары гадзіны будзеш.

— Яму — сказалі. А табе сядзець і чакаць трэба было. Каб мне не лётаць і не шукаць,— таропка паціснуў руку, павярнуўся: — Пайшлі!

Захар тэпаў следам за Ціханам па сцежцы, якая вяла да дарогі, і яму ўвесь час здавалася, што Ціхан бачыў, як Гайдаш цалавала яго,— таму гэткі хмурны і раздражнёны. Каб супакоіць сябе, падумаў пра тое, што нічога Ціхан не бачыў, проста зазлаваў, што яго загад быў нявыкананы. Управіўся, прыехаў раней, а ён, Захар, недзе швэндаецца. Давялося вось ісці сюды, да шпітальных зямлянак, шукаць чалавека, які павінен быў сядзець на вызначаным месцы і чакаць. Не, тут нешта іншае, Ціхан нечым дужа заклапочаны, устрывожаны — твар чалавека, якога ціспе нейкі цяжар. Ха, нейкі! Клопат пра лёс Гайдаш перавярнуў табе душу, вывеў з раў-

навагі. Толькі адпой Гайдаш! Нават калі гэта адкінуць — адзін жа толькі атрад на тваіх плячах. А па Ціханавых? Дзесяткі атрадаў, лёс тысяч мірных жыхароў. І трэба гэта разумець. І тое, што ты прымусіў Цікана шукаць, нервавацца,— віна твая.

— Я вінаваты,— глуха прамовіў Захар, гледзячы ў Ціханаву спіну. Шпітальныя зямлянкі засталіся ззаду, наперадзе была відаць лясная, добра ўезджаная пуцявіна, і Захар адчуў сябе крыху вальней.— Мне трэба было чакаць там, куды загадана было прыехаць,— і дадаў ад душы, каб змякчыць Цікана і выклікаць спагаду: — Абяцаю. Болей не паўторыцца.

— Болей не паўторыцца.— Ціхан уздыхнуў, і Захар гэтую змену ў яго настроі не зразумеў адразу.— А што яшчэ паабяцаеш?

Захара раззлавала запытанне, і ён адказаў стрымана, падкрэсліваючы, што на спагаду не разлічвае, і ў душы адзначаючы, што рабіў нядобрасумленна, на гэтую спагаду разлічваючы:

— Нічога. Адно толькі запытацца карціць: патлумач, чаму не рухаецца фронт?

— Спытай у самога сябе.

— Запытваў сто разоў, калі не больш.

— Значыцца, кепска запытваўся. І мяне дзівіць, што адзін з самых баявых камандзіраў партызанскіх глядзіць на падзеі па-школярску...

— Школяр. Хай сабе.

Ціхан спыніўся, не выходзячы на лясную ўезджаную дарогу, быццам упёрся ў бярэзіну на сваім шляху, стаяў, разглядаючы белыя, амаль празрыстыя пасмы бяросты, паміж якімі споўдалі мурашы.

— Ажылі мурашачкі. Ажылі на сонейку...

Захар хмыкнуў — мурашы Ціхана цікавяць! — сказаў з напорам, адчуўшы, што не можа і не будзе пагаджацца з Ціханам ва ўсім:

— Хай сабе — школяр. А ты — розум. А ты — стратэг. Дык вось адкажы мне, чаму наш фронт не наступае тут, у Беларусі, рашуча? Хай фрыцы падціснулі нас. Але ж і сёння цэлы край — сотні кіламетраў — вольны! Дарогі, па якіх можна і ўдзень ісці без адзінага стрэлу... Вышыні, якія сёння не трэба штурмаваць... А фронт марудзіць. Чаму?

— Не ведаю.

У Захара ажно адвісла сківіца.

— Н-не ведаеш?

Ціхан моўчкі, са згодаю, кіўнуў галавой, і Захар быў ашa-

ломлены, усё яшчэ не верачы ў тое, што пачуў, перапытаў зноў:

— Н-не ведаеш? Ты не ведаеш?

Ціхан, па-ранейшаму разглядаючы тонкія рудыя струменьчыкі мурашоў, што віліся паміж скрутачкамі бяросты, адказаў ціха, але цвёрда і жорстка:

— Не ведаю. Праўда, здагадваюся... І таму скажу табе больш... Скажу тое, чаго не казаў на нарадзе. Сёння ранкам на нашу шыфроўку адказалі са Штаба адкрытым тэкстам — акажам, маўляў, дапамогу толькі авіяцыяй. Разумееш? Толькі авіяцыяй. Значыцца, іншай дапамогі фронт аказаць не можа нам сёння. І заўтра таксама. Узнікае пытанне: чаму? Няма чым? Не, ёсць. За апошнія два месяцы мы атрымалі патронаў і зброі больш, чым за ўвесь мінулы год. А колькі параненых вывезлі! А колькі бомбавых удараў нанеслі нашы штурмавікі па фашыстах, каб падтрымаць партызанскую абарону!.. Але скажы: чаму — толькі авіяцыяй? Чаму паведамляюць пра тое адкрытым тэкстам?..

— Ты хочаш сказаць...— пачаў быў Захар і асекся — цяжка было прамовіць тое, пра што падумалася. Але перасіліў сябе, скончыў думку: — Хочаш сказаць, што фронт на Віцебскім напрамку не гатовы ісці ў наступ? І не пойдзе ў бліжэйшы час?

— Рэчкі — разліліся, нізіны — размяклі, балоты — кісель... Гэта, мабыць, Стаўка ўлічвае. І мая асабістая думка: фронт тут у бліжэйшы месяц не зрушыцца...

Ціхан гаварыў шчыра, гаварыў, несумненна, тое, што па службоваму абавязку не меў увогуле права вымаўляць услых. Але Захар, ведаючы, разумеючы, што павінен ганарыцца гэтым даверам, стрымаць сябе ўжо не мог. Нейкая дзіўная крыўда несла яго, і ён напусціўся на Ціхана, быццам знайшоў вінаватага ў той крыўдзе:

— За гэты месяц, каб ты ведаў, іхнія танкі з нас мліва зробяць. Разумееш? Мліва!.. Ды даўно, даўно трэба было дзерці гэты мех, куды нас, бы дурных кацянят, гоняць!

— Мы выконвалі загад!

— Мы — выконвалі! А там? — ён торкнуў рукою некуды на лес, у напрамку няпэўным і яму зусім невядомым — рука патрабавала руху, імклівасці.— Не маглі пачаць напрадвесні? Калі па ўсіх балотах — з прынеўкамі каціся? Чаму ж за зіму не падрыхтаваліся?

Ціхан адказаў стрымана:

— Я табе не Стаўка Вярхоўнага. Аналізую факты.

— Якія факты?

— А тыя, што і табе вядомыя,— з ранейшай стрыманасцю адказаў Ціхан.— Бяром першы... Напрадвесні фашысты спешна перакідвалі войскі з Беларусі на поўдзень. І перакідваюць і зараз. Другі табе факт: ярасная, спешная «чыстка» тылоў Трэцяй танкавай арміі. Лічы па пальцах, што яны кінулі на наш кут партызанскі. Салдат — больш за шэсцьдзесят тысяч. Танкаў — сто трыццаць сем. Гармат — дзвесце трыццаць. Тысячы кулямётаў...

Захар упершыню пачуў гэтыя лічбы, ён слухаў Ціхана ўважна, але потым не вытрываў, перапыніў:

— А гэтыя лічбы... Дакладныя лічбы?

— Пералічыць табе нумары палкоў? Назвы батальёнаў? — Ціхан адхіснуўся ад бярэзіны, ступіў на дарогу, нейкі час глядзеў у той бок, дзе яна паварочвала ў малады бярэзнік, над якім пунсавела слабая палоска па попельным, як падбеленым, небе.— Улічы і лістоўкі, што, маўляў, Сталін вас кінуў на волю лёсу... Гэта — факт дужа сімптаматычны. Знерваваны фашыст — не ведае, дзе яго ўлетку стукнуць. А магутна стукнуць! Я перакананы: рыхтуецца нешта грандыёзнае. Гэткі ж, магчыма, кацялочак, як пад Сталінградам быў. Не ад добрага жыцця фрыцы гэтак ціснуць, ведаюць, што ад нашых, партызанскіх, дроўцаў кацялочак хутчэй закіпіць. Закіпі-іць!

— Гусараў бы табе зараз працытаваў паэтава: «Жаль, только жить в эту пору прекрасно...»

Ціхан зноў зірнуў на слабую пунсовую палоску на попельным, як падбеленым, небе, азірнуўся наўкола, моўчкі прайшоўся крокаў з пяць, спыніўся перад сцежкаю, якая вярнула з лясной уезджанай дарогі ў бярэзнік, азірнуўся, быццам дзівіўся, што гэтак хутка дайшоў да патрэбнай сцежкі, сказаў ціха:

— Пажывём мы ў тую «пору прекрасную», пажывём, Захарка. Ведаеш, як мне аднойчы Веліканец баяў? Вельмі цяжка, маўляў, дажыць да дзевяноста дзевяці гадоў. А потым ужо зусім лёгка жывецца, само сабою жыццё коціць.

— Ён, між іншым, на гэтых сваіх гігіках і пражыве да дзевяноста дзевяці. Упэўнены!

— Дай бог, як гаворыцца. Але ведай: Веліканцу даручана ўзначаліць дадатковую групу прарыву, якая дадаецца брыгадзе — дзевяць «ручнікоў», дваццаць пяць аўтаматаў.

Захар кінуў, усё яшчэ пад уплывам крыўды, якая жыла ў ім, невядома адкуль з'явіўшыся:

— Гусарава ты ўзрадаваў.

— Не Гусарава, а цябе. Твой атрад — вось,— і Ціхан выцягнуў перад сабою сціснуты кулак.— Ты — на вастрыі. Пой-

дзеш без абозаў. Улетцы. З усіх атрадаў брыгады самае цяжкае — твайму атраду дастаецца. Таму цябе паклікаў. І слухай мяне цяпер уважліва. Тое, што я табе скажу, будзеш ведаць толькі ты адзін у брыгадзе. Нават Гусараў не будзе ведаць...

Ціхан галінкаю, якая невядома як і калі апынулася ў яго руцэ, намаляваў на пяску ля сцежкі тры лініі, падвёў да іх пяць кароткіх стрэлак і ўзяўся нетаропка, як бы ўслухоўваючыся ў гучанне кожнага слова, тлумачыць задуму, сэнс якой Захар злавіў адразу ж. Злавіў і сцяўся ад непрыемнай дрыготкі, што тонкім скразняковым струменьчыкам пракацілася па хрыбціне. Брыгаду пасылаюць на смерць! Яна робіць падманны ўдар, імітуючы спробу прарыву ў паўночным напрамку, да берагоў Дзвіны, каб выйсці ў лясныя масівы Расоншчыны. Потым жа, калі асноўныя партызанскія сілы зоны прарвуць блакаду ў паўднёвым напрамку, брыгада вернецца назад і таксама выйдзе з кола. Але, павярнуўшы, ёй зноў давядзецца пераходзіць гравійку, чыгунку, зноў гравійку... Дзесяткі бункераў, акопаў, знішчальны агонь бронецягнікоў!..

Попельнае, як падбеленае, неба святлела, пунсовая палоска шырэла, і рыскі на пяску пачалі расплывацца, як бы праваліваліся ў глыб пяску, і Захар неспадзеўкі, з вастрынёй дзіўнай, убачыў аголеную праўду, якая адразу яго гэтак уразіла, калі Ціхан узяўся тлумачыць задуму: брыгада павінна — і, у першую чаргу, яго, захараўскі, атрад! — будзе ахвяраваць сабою дзеля выратавання асноўных сіл злучэння і тысяч мірных жыхароў, якія аселі ў лясах, у цэнтры блакаднага кола. Ён на міг уявіў сабе, як з кожнай гадзінаю бою ўсё расце, павялічваецца адлегласць паміж атрадам, брыгадай і асноўнымі партызанскімі сіламі, і непрыемны халадок зноў папоўз па хрыбціне. За чыгунку, нанасячы ўдар па трох напрамках, брыгада, ведама ж, прарвецца. Але, павярнуўшы назад, будзе заціснута, як у абцугі, паміж гравійкаю і чыгункаю, і там, пры святле дня, рэшткі атрадаў дамалоцяць бронецягнікі, што стаяць у тупіках Фарынава і Загацця. Так, ісці следам за асноўнымі сіламі ўжо не будзе каму. А можа, гэтак і трэба? Загіне адна тысяча, загіне і смерцю сваёй уратуе амаль дваццаць тысяч і дзесяткі тысяч мірных жыхароў...

— Я хачу ў цябе спытаць,— пачаў Захар і раптам адчуў, што не ведае, якую ісціну карціць яму даведацца.

— Спытай. І я — адкажу. Але спачатку паспрабуй прыгадаць тое, што я казаў табе ўлетку сорак першага.

— Дзе канкрэтна?

— У абкоме. Калі развітваліся. Памятаеш, што я асабліва падкрэсліваў? Каб не дужа кіраваўся інструкцыямі, якія атрымаў.

— А-а... Памятаю. Дужа тады я здзівіўся.

— І я табе паўтару зноў: ты зараз, нават болей, чым у сорак першым, будзеш змушаны кіравацца не інструкцыямі. Задачу атраду камбрыг паставіць. Але адказнасць за лёс атрада — на табе асабіста. Ты — яго лёс. Прымай рашэнні, калі пачнеш бой, самастойна, дзейнічай, як падкажуць абставіны. Усё залежыць ад таго, як складзецца бой. Прадбачыць — не магу. І таму няма ў мяне гатовых рашэнняў на кожны міг. Зразумеў?

— Але...

— Цяпер кажы тое, што ты хацеў спытаць.

— Ты прадбачыш лёс брыгады? — Захар паважыўся быў сказаць «лёс атрада» і не змог.

— Амаль дакладна ведаю. Ёй будзе цяжка.

— Нам, карацей кажучы, трэба зрабіць амаль немагчымае. Таму ты і паклікаў, каб развітацца. Ведаеш, што пасылаеш на верную смерць і хочаш у апошні раз зірнуць на мяне. Гэтак?

Пытанне вырвалася непрадбачана. Напачатку Захар толькі паважыўся сказаць тое, чаго не сказаў Ціхан, як бы падкрэсліць тым, што ўсё разумее, што ведае, дзеля чаго ён пакліканы Ціханам, і не вінаваціць яго, і не хоча шукаць, не просіць лепшага, больш лягчэйшага, і не збіраецца гэтую, самую цяжкую, задачу перакласці на чыя плечы. Але гэтае кароткае, поўнае тугі «гэтак?» як бы падвяло рысу, пераступіць якую ён, Захар, дазваляў ужо Ціхану, а не сабе.

— Перад смерцю ўсе мы роўныя. І паклікаў я цябе таму, што самае цяжкае — твайму атраду. Асноўны ўдар — яго. Я веру ў твой атрад. Веру ў мабільнасць брыгады. Таму і сказаў больш, чым трэба. І таму нічога ад цябе не таіў. І не буду таіць, што не ведаю, дзе будзе больш крыві: на вашым напрамку ці на нашым.

— Так, з меха, у якім ужо заселі глыбенька, без крыві не выдрацца,— сказаў Захар, сказаў без папроку, разумеючы, што абвінавачваў некалі Ціхана несправядліва.

— Не лічы, калі ласка, што яны загналі нас у мех, мы — калі ўжо на ўсю праўду! — з сорак першага ў гэтым мяху ходзім. Але ж наша абарона адцягнула на сябе вялікую сілу, паралізавала, лічы, тыл Трэцяй танкавай. І ў той перамозе, якая ўжо блізка, кроў, што пралілася тут густа і праліецца яшчэ, марна не прападзе. У гэта я веру,— і скончыў з прытоеным сумам, які Захар добра адчуў: — Магчыма, што-не-

будзь было ў нас з табою не так, як табе хацелася. Ты мне прабач тое...

Давер гэты расчуліў Захара, і, перасіліўшы сябе,— не хацеў, не збіраўся прасіць! — ён ціха папрасіў:

— Зрабі мне ласку...— сказаў і крыху счакаў, прозвішча Гайдаш вусны ўпарта не вымаўлялі.— Адпраў... Адпраў Гайдаш у шпіталь. За фронт. Сёння.

Ціхан няспешна, але рашуча запэўніў:

— Адпраўлю першым самалётам, які прыляціць. Ты пра гэта не думай.

Захару зноў зрабілася прыкра ад свае нядаўняе незадаволенасці і крыўды. За якія віны ён папікнуў Ціхана? За тое, што варожае кола сціснула партызанскія брыгады? За тое, што фронт стаіць на месцы і Ціхан не ведае прычыны?.. Нібыта Ціхан меней яго, Захара, пакутуе ад гэтай невядомасці! Ён, зрэшты, мог нічога і не казаць, мог абмежавацца толькі тым, пра што гаварыў на парадзе. А ён сказаў табе значна больш таго, што сказаў іншым камандзірам. Сказаў, каб не проста наспачуваць і паспавядацца роднаму чалавеку. Сказаў, каб праверыць свае ўласныя думкі, свае здагадкі, каб адчуць, што не страціў веру ў добрае, у тое, дзеля чаго жыве...

— Ну, развітаемся...

Ціхан расцёр ботам лініі і рыскі на пяску ля сцежкі, узмахнуў дубцом, быццам закідваў вуду, і гэты рух братавай рукі нагадаў Захару далёкае дзяцінства, кароткі міг з таго далёкага часу. Ён убачыў сябе на Дзвіне — Захар яшчэ тады і ў школу не хадзіў, а Ціхан быў ужо ў шостым,— убачыў ля чоўна з вудамі. Захар залез у човен, а Ціхан пайшоў у лазнякі. «Падважу вяслом бервянцо струхлелае, над ім чарвякі вёрткія чырвоныя — на акуня». Пайшоў і нечага забавіўся. Захару ж надакучыла чакаць, і ён узяўся арудаваць вяслом, заграбаў у адзін бок і ў другі, і човен раптам адплыў ад берага. Захар разгубіўся, не адразу паклікаў брата, а калі і загукаў, дык човен ужо гнала плынь. Ціхан выскачыў з лазнякоў, кінуўся наўздагон, круціў над галавой вяслом, пагражаў, крычаў, нешта загадваў. Захар урэшце здагадаўся: трэба грэбці вяслом у адным напрамку. Човен перастала круціць, бераг наблізіўся, і Ціхан ускочыў на карму. Пырскі ўзляцелі высока, і над кармой узнікла няроўнае, але дужа прыгожае вясёлкавае кола, і Ціхан быў у гэтым коле...

— Ну, развітваемся,— паўтарыў Ціхан і, убачыўшы ўсмешку на Захаравым твары, насцярожыўся: — З чаго развесяліўся?

— Прыгадалася... Човен наш гоніць... А ты — лупіш берагам і мне вяслом пагражаеш.

— Блытаеш ты нешта...

— Няўжо не памятаеш? Рыбалілі на Дзвіне і злавілі вугра. Здараве-еннага. На донку сеў.

— О, цяпер прыгадаў! Вугра мы тады па вуліцы адкрыта неслі, каб усе бачылі: рыбакі ідуць хвацкія. Але што вяслом табе пагражаў... Ты чаго гэта біяграфію начальства нейкімі змрочнымі фактамі ўпрыгожваеш? Не можа быць у такой біяграфіі гэткіх непрыгожых фактаў! На маленькага хлопчыка ды з вяслом? Не, сапраўднасці не адпавядае!

— Э, можа, сасніласяʼ?

— Во-о, яно ўжо і бліжэй да праўды. Гэтак і запішам: памроілася!

Засмяяліся, бы па камандзе, засмяяліся, радасныя, узрушаныя ўспамінамі пра дзяцінства, нічым не азмрочанае. І гэтак жа, як і пачалі, разам і памоўклі, быццам праглынулі вясёлы смех — недзе блізка за лесам забуркатала канонада. Выбухі былі нейкія паспешлівыя, мітуслівыя,— і гэткае ж было і рэха! — быццам па няроўным бруку з грымлівым лёскатам, набіраючы хуткасць, каціліся каламажкі, нагружаныя жалезнымі бочкамі.

## 19

У сенцах, ля дзвярэй, адразу ж за нізкім і счасаным, як каромысла, парожкам Марыля ўгледзела смецце — дробная карычневая пацяруха з леташняй яблыневай лістоты ляжала ўперамешку з кароткімі, як звязанымі крыж-накрыж, саломінкамі — і сумелася. Учора ж памыла сенцы, памыла, рыхтуючыся да сустрэчы з сынам, да майскага свята, да якога два дні і застаецца. Старанна ж, здаецца, памыла падлогу скрозь, а смецця — поўна. І адкуль? Відаць, ветрам нагнала з падворка: учора ж гэткі ветраны дзень быў.

Стары венік — бярозавы галяш,— якім Тося звычайна падмятала падлогу, адразу трапіў на вочы. Але Марыля, узяўшы яго ў руку, прыпынілася — прыцісңула горкая развага. Нядобрая, благая дужа гэта прыкмета, калі з хаты хтонебудзь выбраўся ў дарогу, а ты вымятаеш смецце. Не, не! Дзе ж следам! Чатыры дні мінула, як Артур і Тося пайшлі,— можна месці хату. І ўчора можна было, і яна, Марыля, добра зрабіла, што ўчора ўзялася наводзіць парадак у хаце, дзе ж тут за адзін дзянёк управіцца. А Тося як сёння вернецца — у чыстае вернецца. Праўда, яна, Марыля, абяцала сы-

ну, што разам з ім пойдзе ў атрад. Але ж усё роўна: брудпай хату пакідаць нельга. І гапак не зашкодзіць да ладу давесці. Памыць ганак — гэта добра: на госця, кажуць, каб чалавек добры да хаты прыбіўся, жаданы...

Старанна і доўга Марыля шаравала дзеркачом старыя, выбеленыя часам масніцыны, на якіх шляпкі цвікоў вытыркаліся на краях, бы маладзенькія апенькі; потым, падахвоціўшыся, пачала мыць падлогу ў хаце, у сенцах і ліла, не шкадуючы, ваду.

Павесіўшы, як скончыла працу, на плот падраную, амаль пасуха выкручаную анучу, яна села пад акном на цёплую, угрэтую сонцам удзень, прызбу, з асалодай зморшчыла вочы, звяла стомленыя рукі на каленях. Стома была прыемная, як звычайна ў даваенныя перадсвяточныя дні, калі ўсё ў хаце мылася, чысцілася, прыводзілася ў парадак, калі пахла смачнымі стравамі, і асабліва моцна — пірагамі з карыцаю, без якіх Пахом не лічыў свята святам.

«Трэці Першамай без Пахомкі страчаю...»

Падлік, які зрабіўся як бы сам па сабе, скалануў Марылю, яна падхапілася з прызбы, нібыта памылілася ў нечым жахліва, непапраўна. Прыгадала раптам, што з Артурам яна і слоўца не сказала пра свята. І ён нічога не сказаў, як не ведаў, што ў самы пярэдадзень свята вернецца. Не ведаў? Не, гэтага не магло здарыцца. Ён ведаў і ведае. І Тося ўвесь час цвердзіла, што майскае свята іх хутар не абміне — прыйдзе, абавязкова прыйдзе нехта з атрада. І тое, што пайшоў Артур цяпер дужа далёка,— таксама звязана, мабыць, са святам. Напэўна! Якраз напярэдадні свята ён і вернецца. І яна, Марыля, будзе яго частаваць. Добра гэта яны з Тосяй прыдумалі — рыхтавацца да свята, каб было чым дарагіх гасцей пачаставаць, калі ў хату завітаюць.

Марыля таропка пайшла ў сенцы, адкрыла спратку хутка і лёгка. І гэтая лёгкасць, з якой выдралася, як сама вылезла з пазоў, масніцына, абудзіла ў душы горкі ўспамін. Каб тады, у тую ноч, яна гэтак лёгка і хутка адкрыла схованку, Артур, мажліва, паспеў бы выпіць шкляначку халодненькага малачка. Ці яйка сырое выпіў бы. А яна і пакрыўдзілася, і разгубілася, і нават не прапанавала нешта з сабою ўзяць. А сальца ж было, і каўбасачка ляжала...

Схіліўшыся над схованкаю, яна агледзела з усіх бакоў маленечкі брусочак сала, густа пакраплены кменам, абцерла далапёю маленечкае колца каўбасы, пералічыла курыныя яйкі. Ёсць, ёсць чым пачаставаць і сыночка і сяброўку яго ў святочны дзень. Каўбаса, праўда, гэта ж тая, што ў сакавіку Артур ёй прынёс разам з брусочкам сала гэтага, у падарунак

на жаночае свята. Яны з Тосяй не чапалі ні каўбасу, ні сала — пакінулі, жартавалі, што і ў іх, як у партызан, ёсць свой «недатыкальны запас». Цяпер, на свята, запасец і прыдасца, спатрэбіцца...

Ад паху кмену ў роце збеглася сліна, і Марыля праглынула яе. Смачная, відаць, каўбасачка... Не, не! Яна, Марыля, не зачэпіць яе! І да сальца не дакранецца. Сынок недзе ў дарозе, знясілены, утомлены, галодны, напэўна ж. А яна тут сама раскашаваць пачне. Не вялікая пані, абыдзецца і бульбінаю: там, на патэльні, шчэ засталося каліва нейкае...

Сеўшы ля прыпечка, Марыля ўмомант падчысціла халодную бульбу з патэльні — вырашыла не распальваць трэскі, наберагчы на ноч. Бульба здалася ёй дужа смачнай і салодкай здалася сыракваша, якой было з паўкубачка. Думкі ішлі толькі ў адным кірунку — што зрабіць яшчэ, каб сустрэць уночы дарагіх людзей з усёй гасціннасцю. Прыгадала: вады трэба прынесці. Каб свежанькай вадзіцаю маглі памыцца пасля цяжкой дарогі...

Да студні ішла пасвяжэлым, споркім крокам. На крайку зруба, калі наважылася была ўзяцца за ручку калаўрота, убачыла мятліка, белага, з ружовымі крапачкамі на крылцах, як празрыстых. Стаілася, знерухомела, але мятліка спалохала, ён узляцеў, і яму насустрач, аднекуль з узмежка за студняй, пырхнуў яшчэ адзін, і яны лёгка закруціліся ў паветры. Марыля стаяла нерухома, пакуль маленькія белыя плямкі не раслалі ўдалечыні над лугавінай.

«Добрая прыкмета. Мятлікі белыя — госці жаданыя ў хату!..»

Яна азірнулася, быццам тыя жаданыя госці, якіх яна чакала, пра якіх думала і трывожылася, былі ў яе за спіною. Убачыла за яблынямі, пасвятлелымі ад зрушанай вясновым цяплом будучай квецені, шэры насып чыгункі, блішчастыя каўпакі над кулямётнымі вышкамі, і радаснае ўзрушэнне затухла. Уздыхнула. Пачапіла вядро на ланцуг. Крутнула калаўрот. Набіраючы хуткасць, драўляны барабан круціўся, візгатліва рыпеў, і чорная жалезная ручка трэслася, мільгацела ў паветры, потым тузанулася ў другі зусім бок; у глыбіні студні гучна бухнула вядро, забрэнькаў па блясе ланцуг і, нацягнуўшыся, спыніў рух калаўрота.

Зноў абсачыўшы той краёк саду, куды паляцелі мятлікі, Марыля ўзялася за ручку калаўрота. Пазвоньваў струною нацягнуты ланцуг, цмокнула, вырваўшыся з вады, паўпусткае вядро, і тады нечакана, быццам выдраўшыся з цёмнага чэрава студні, ударыў па вушах гул блізкай кананады. Падалося, што гэта яна, Марыля, нацягнула ланцугом нейкую

застаўку, выпусціла на волю жалезны грукат, і цяпер ён коціцца па лугавіне, распаўзаецца над выганам і лесам, і ад яго трымціць не толькі паветра, адугаецца, як бы скача па гарбатых хмарах вечаровае сонца. Час ад часу з грукатлівага гулу вырываліся моцныя выбухі, як бы секлі яго на часткі, і тады ў прагалах тых усчыналася дудуканне буйнакаліберных кулямётаў, і яно было асабліва густое за лесам, якраз у тым месцы, дзе штопочы шырокай барвовай падковаю палала неба.

«Бой... Зноў там б'юцца... Няхай нашы адолеюць паганцаў! Няхай перамогуць!..»

Марыля прыткнулася лбом да жалезнай ручкі калаўрота, адчула звон напятага ланцуга, і ёй падалося, што трымціць ён не ад цяжару поўнага вядра, а гэта асядае ў саржавелых, пацёртых звеннях рэха грукатлівага жалезнага грымоцця.

Кананада раптоўна аціхла, потым, калі Марыля выцягнула вядро са студні, усчалася зноў. Але варта было ёй адчапіць халодны і слізкі крук з дужкі вядра, як грукатлівае грымоцце зноў абарвалася, як адсечанае. Марыля счакала, азірнулася наўкола, убачыла, што сонца пачало запаўзаць у хмару, нерухома завіслую на даляглядзе, і тут жа ўчула гул цягніка, які бліщчастай яшчаркаю выпаўз з-за бярозавага ўзлеску. Пасажырскіх вагонаў — адразу і звыкла ўсё пералічыла! — пяць, далей ідуць таварныя і платформы. На платформах, пад шэрым брызентам, акрэсліваюцца абрысы нейкіх машын, але на кожнай платформе — розныя. Чамусьці дужа ціха сунецца эшалон, як запыняецца. Не, толькі здаецца тое — хутка коціцца. Каб жа яшчэ хутчэй імчаў, ды не па рэйках, а — пад адхон! Каб зямелька пахавала і вагоны гэтыя, і платформы, і тое, што на платформах, і тое, што ў вагонах,— каб усё дымам пайшло, каб вецер той дым адразу ж і растрос, каб і знаку ад яго не засталося...

Нічога, як і звычайна, не змянілася і цяпер ад яе зацятых і ярасных праклёнаў. Упэўнена татакалі колы, упэўнена каціліся па рэйках вагоны пасажырскія, з бліщчастымі шыбамі акон, наглуха закрытыя вагоны таварныя, нізкія, як абламаныя, платформы, і тоўсты сонечны прамень, што выбіўся з-пад хмары, быццам надпіхваў апошні вагон.

На ўзмежку за студняй Марыля яшчэ на тым тыдні агледзела лапікі шчаўя і цяпер здзівілася: як жа хутка падрасло! За нейкія паўгадзінкі насмаргала ў хустку жменяў з дзесяць доўгіх сакавітых лісцінак. Дужа добра, што паскубла яна шчаўя: зварыць пазней, будзе трымаць у печы гарачым — можа, сынок гарачанькага варыва захоча пасёрбаць. Не, Арцік малачко халодненькае больш спанаравіў. Вось ча-

го яна шчэ не зрабіла — па малачко на суседскі хутар не злётала. Людзі там добрыя, але ж, праўда, напавер нічога не дадуць. Марыля ім за тую ласку аддала выпас за садам — малаком цяпер сплачваюць.

Завязаўшы канцы хусткі, Марыля рушыла дахаты, ішла таропка, па чарзе зменьвала ў руках ношку — тонкая жалезная дужка вядра рэзала далонь, а маленечкі клуначак са шчаўем студзіў, лашчыў скуру. І збанок з малаком, як несла яго з суседскага хутара, гэтак жа студзіў рукі, і яна вярталася дамоў у настроі лагодным, спешаным. Цяпер ужо, здаецца, усё парабіла як след, як належыць. Толькі адно застаецца — сыночка дачакацца!

Марыля ўзышла на падворак і спынілася, ледзь не выпусціла збанок з рукі — з другога боку, ад чыгункі, падыходзілі да хаты салдаты. Уваччу пацямнела, і ў горле, быццам трапіла туды асцё, запяршыла, і яна, сагнуўшыся, закашлялася. Напачатку — усяго ж якія дваццаць хвілін, пакінуўшы вядро на ганку і шчаўе, яна не была ля хаты! — падумалася: ахова чыгункі. Салдаты, якія сёлета патрулявалі пасып ад гарнізона ля пераезда да станцыі — старыя, траха не пенсійнага ўзросту,— часцяком прыходзілі сюды на хутар, і хутчэй не патрабавалі, а выпрошвалі яйкі, зялёную цыбулю, і нават плацілі за тое, што бралі, акупацыйнымі маркамі. Тых салдат амаль усіх Марыля ведала ў твар. Але тут — незнаёмыя, усе маладыя, увішныя... І адзенне нейкае незвычайнае... А долечка! Сем іх на падворку... Не, яшчэ два з кулямётам у палісаднік паламіліся. І ў гародчыку чарнеюць постаці, і за плотам завіхаюцца... І зусім па-гаспадарску паводзяць сябе, нібыта шмат разоў былі тут і ўсё добра ведаюць. А на яе, Марылю, і не зважаюць, быццам яе ўвогуле няма на падворку. За начальніка ў іх, мабыць, гэты, што стаіць ля кадамажкі, у акулярах, гарбаносы... Паслаў двух у хату. Цяпер загадвае каламажку адкаціць. Навошта? А-а, кулямёт яны там стаўляюць. А кулямёт ля плота ўжо ўладкаваны... І нешта рыюць за хлевушком — чуваць, як звініць рыдлёўка...

«Засада! На засаду салдаты прыйшлі!»

Адчула боль у пальцах — гэтак моцна ўчапілася ў донца і ручку збанка. Усё тое, што Марыля, сагнуўшыся і кашляючы, абсачыла позіркам умомант, цяпер склалася ў выснову пэўную і выразную: дазналіся, што ўночы пойдуць тут партызаны, і вырашылі іх падпільнаваць. Дазналіся? Але ж адкуль? Не маглі дазнацца!.. А можа, выпадковасць?.. Ідуць некуды, а тут спыніліся, каб перадыхнуць, а потым, як ацямнее добра, куды-небудзь і пасунуцца... Не, на ноч уладкоўваюцца: два кулі саломы салдат прынёс з хлевушка, ля куля-

мёта растрэсвае — каб не на голай зямлі ляжаць. А другі — посцілкі з хаты валачэ...

— А во-о-о!.. А што ж гэта робіцца? — Марыля кінулася да салдата, які растрэсваў кулі, быццам салома была даражэй за посцілкі, якія другі салдат сцяліў на зямлі пад плотам.— Саломку глуміць узяліся! Я ж яе цэлую зімку захоўвала і берагла. За яе малачко мне людцы дадуць...

Спыніў яе рэзкі покліч афіцэра. Яна пачула гэты покліч і зразумела загадны ўзмах рукі, але зрабіла выгляд, што нічога не цяміць. Да яе — афіцэр казаў нешта яшчэ, казаў хутка, і тут яна ўжо і сапраўды нічога не зразумела — падбег салдат, худы, з вадзяністымі, халоднымі вачыма, аўтаматам паказаў на хату, загадаў неяк шапялява, але лагодна:

— Дом, матка, дом!..

Потым ён апярэдзіў Марылю, сам ірвануў перад ёю дзверы ў сенцы і адчыніў дзверы ў хату, і яна ішла, па-ранейшаму сутаргава сціскаючы чамусьці адразу пацяжэлы збанок з малаком. Салдат абмінуў яе ў хаце, зазірнуў за шырмачку, што загароджвала ўваход на куханьку, потым агледзеў бакоўку, абшарыў вачыма кожны кут і сеў на крэсла ля акна. Аўтамат, якім салдат здзёр фіранку, ён паклаў сабе на калені і ўсё тым жа шапялявым голасам прапанаваў:

— Млека — чы-чы,— выставіў перад сабою левую далонь, сціснутую жменькаю, паторкаў у цэнтр пальцамі правай рукі і імі ж, але знізу, як бы пацягнуў нябачныя ніткі.— Чы-чы — млека. Кубак — фуф-фуф... Гер афіцырэн — піць млека!

Працадзіўшы — расшалопала, што гэта значыць «млека — чы-чы»,— малако і выціраючы памыты кубак ручніком, Марыля назірала за салдатам і здагадвалася, што той пасланы ў хату сачыць за ёю, і намагалася паказаць сваю ўвішнасць і згоду выконваць усе загады: усё яшчэ жыла надзея, што афіцэр, напіўшыся малака, не затрымаецца тут, паедзе салдат далей. Нават не было шкада малака. Няхай п'юць, няхай жлукцяць, праклятыя! Толькі каб пайшлі адсюль, не засталіся да ночы!

— Яйкі,— патрабавальна прамовіў салдат.

— Нямашака. Аднесла на станцыю. Учора. Як і загадана.

— Дорт? — ён торкнуў аўтаматам у акно.— Хле-ев! Ко-ко-о!

— У хляве? Можа, знесліся тамака. То пайду пагляджу...

Выйсці з хаты яна не паспела. Увайшоў афіцэр у акулярах, з фуражкаю ў руцэ. Салдат паслужліва падсунуў яму

крэсла, і афіцэр сеў, асцярожна паклаў фуражку на стол. У фуражцы было шэсць яек.

«Знесліся куркі, усе шэсць сёння знесліся. Апароў, выграб жа, гад, каб табе вантробы начыста павыграбала!..»

Сціснуўшы губы, Марыля перавяла позірк з фуражкі на афіцэра. Сівізна ў валасах густая. Акуляры нібыта памяняў: там, на двары, былі чорныя, шырокія, а тут тонкія, з бліскучым абадком... І як, гад, рыхтуецца есці! Яйка з усіх бакоў агледзеў, рушнічком абцёр, быццам запэцканае яно... Цяпер выцягнуў з кішэні сцізорык, калупнуў яечка з вострага носіка, потым ціхенька цюкнуў у тупы і, адкінуўшыся спіною на спінку крэсла, паставіў яечка на губы, быццам чакае, што яно прыклеіцца. Не, губы зварухнуліся, гучнае і частае цмоканне перарастае ў ціхі і працяглы свіст — бы ўвосень комін ад ветру вые...

Праз акно Марыля добра бачыла падворак. Аніякага руху! Як пусты падворак зусім, быццам няма нікога. Можа, рушылі?.. Не, стаіць кулямёт па дрывотні, ад хлевушка два салдаты цягнуць у садок пляскатыя скрыні, зялёнага колеру, з ручкамі па баках.

«Міны ў гэтых скрынях! Значыцца, у садзе — мінамёт у іх!»

Задушная гаркота сціснула грудзі. Значыцца, ведаюць! Ведаюць, што партызаны сёння будуць пераходзіць чыгунку менавіта тут, што абавязкова на хутар зойдуць! Але ж адкуль маглі ўведаць? Можа, яшчэ ў тую ноч Артура яны заўважылі, але не зачапілі, чакалі, калі назад будзе ісці? Магчыма гэткае? Не-е! Каб прыкмецілі іх тады з чыгункі — адразу б ракету патрулі кінулі, з вышак бы кулямёты смальнулі... Не, нічога ахова ў тую ноч не заўважыла. І не заўважыла ўранні. Уранні?..

Марыля ліхаманкава прыгадвала ўсё тое, што адбылося пасля той ночы, калі сын пайшоў за чыгунку. На світанні заляскатала дрызіна — правяралі рэйкі. Нідзе дрызіна, пакуль яе Марыля бачыла, не запынілася, бо нічога падазронага салдаты не заўважылі. Потым узышло сонца, густа пакацілі цягнікі. Перад полуднем прыцягнуліся два старыя немцы з аховы. Але ж яны нічым не цікавіліся, ні пра што не распытвалі, былі нейкія сумныя, маркотныя, узялі крыху зялёных пёркаў цыбулі і заплацілі за яе шчодра, амаль удвая супраць звычайнага... А ўчора анікога з чужых на хутары не было. І пазаўчора... А можа, вартавым было загадана не прыходзіць, толькі пазіраць адпекуль?.. Праўда ж, поўныя два дні ахова чыгункі абмінала хутар!..

Тое, што раней толькі здзівіла, цяпер ператварылася ў

злавесную прыкмету. Нешта яна, Марыля, своечасова не заўважыла, мабыць! Недзе памылку зрабіла. Але ж — якую? Калі?..

Усё перабрала ў памяці — анічога не прыгадала такога, што б хоць неяк пацвердзіла здагадку. Але адчуванне таго, што нешта ў гэтыя дні адбылося, адбылося жахлівае і ёй пакуль што не вядомае, усё не праходзіла. Яна скаланулася, нечакана дужа выразна ўявіўшы сабе тое, што можа адбыцца па хутары ўночы, калі салдаты не пойдуць куды-небудзь далей, а застануцца тут.

«Тося прывядзе Артура і хлопцаў сюды, на хутар... Пад кулямёты фашысцкія...»

Марылю кінула ў пот, яна адвярнулася, пачала ўздымаць з падлогі фіранку, і ўздымала яе доўга, і гэтак жа доўга скручвала яе, быццам толькі адным і была заклапочана, каб роўненька скруціць, не пакамечыць. Але думкі снавалі ў галаве мітусліва, хутка, і ўсё пра адно і тое ж: папярэдзіць сына, адвесці бяду! Але ж як яе адвядзеш? Калі будуць сядзець вось гэтак ля стала — як жа ты дасі знак? Паспрабуй запалі лямпу — на месцы прыстрэляць! Адразу ж!..

Адно за адным афіцэр высмактаў тры яйкі, паклаў пустое шалупінне на беражок стала і моцнымі пстрычкамі, бы гульню цікавую знайшоў, пачаў скідаць, цаляючы ў прыпечак. Але лёгкае шалупінне далёка не ляцела, падала на падлогу ля печы, суха храскала. Марыля рушыла да печы, сабрала шалупінне, кінула на прыпечак. Задушная гаркота ў горле памацнела, Марыля закашлялася і, заўважыўшы, што афіцэр падазрона паглядае на яе, закашлялася надрыўна, хапаючы ротам паветра, згінаючыся крукам.

— Кранк? — запытаў афіцэр, і салдат пачаў нешта яму тлумачыць.

— Хворая, зусім я хворая,— прамовіла Марыля і зноў закашлялася, пазіраючы на салдата, быццам сілілася пераканаць яго толькі, каб не афіцэр, а ён паверыў.— Зусім скруціў кашаль. А чаго кашаль — не ведаю. Застудзілася шчэ напрадвесні, вось ад таго і цягнецца...

Афіцэр, клапатліва ўзняўшы фуражку з яйкамі, нешта загадаў салдату і пайшоў з хаты. Следам за ім, прыхапіўшы кубак і збанок з малаком, рушыў і салдат. Марыля памкнулася следам. Але салдат ля парога прыпыніўся, сказаў не загадна, працягла, быццам праспяваў:

— Цу-уру-ук!

— Які ж цурук? — Марыля сцяміла, што ёй загадана застацца ў хаце.— Куркі на ноч не ўпарадкаваны. Работы ў мяне поўна...

Дзверы былі ўжо адчынены, салдат папіхваў іх ботам, як бы гуляў з імі, і гэтая гульня і забаўляла, і нечым прыцягвала яго.

— Работа — ёсць ютрам,— як не Марылі, а дзвярыне сказаў салдат.

— Ютрам? Нельга мне ютрам.— Марыля, ужыўшы салдатава вымаўленне, запярэчыла горача, нібыта быў перад ёю чалавек, з якім можна аб усім дамовіцца і які проста яшчэ не зразумеў яе: — Яйкі дык вы сёння грабеце. А курачак хто на седала пасадзіць? Шашок падбярэцца — падушыць...

Працягла, але цяпер ужо злосна, салдат загадаў:

— Цу-уру-ук!

Салдат ступіў у сенцы і моцна, ботам, піхнуў дзверы, і яны грукнулі перад Марыліным носам. Ад удару з клямкі вывалілася шпуля, пакацілася са звонам, быццам пералічвала маспічыны. Марыля знайшла яе і, сціснуўшы ў руцэ, стала ля дзверыны. Вырвацца трэба адсюль! Шуснуць у гародчык, потым у сад, пераскочыць пераезд, сустрэць Артура яшчэ там, за чыгункаю, папярэдзіць, абавязкова папярэдзіць! Ёй нельга чакаць ночы! Трэба бегчы насустрач сыну, сказаць, паведаміць пра засаду! Бегчы? Трэба спачатку хоць нейкую дзірачку ў гэтай пастцы нагледзець!

Яна пабегла да акна аднаго, да другога. Салдат яшчэ болей, чым было! І не толькі ля хаты! Рыюць акопы і ў садзе, і ля сцежкі, што вядзе на выган, і на выгане чорныя постаці завіхаюцца. Дзе ж тут бегчы за чыгунку! Загналі цябе, галубачка, у пастачку надзейную. І ўночы трапіць у гэтую пастку кожны, хто будзе ісці да хутара...

Шумлівае тлумнае бомканне, што поўніла галаў і вострым болем асядала ў патыліцы, раптам крыху паслабла, і Марыля загадала сабе: супакойся, не мітусіся.. Трэба чакаць! Чакаць поўначы і, як і дамовіліся, даць знак сыну... Летась, увосень, калі фашысты зрабілі засаду на пераездзе, яны з Тосяй заўважылі, папярэдзілі падрыўнікоў, і яны лоўка абмінулі тую засаду, пад самым носам аховы паставілі міну, і ўранні кульнуўся пад адхон фашысцкі эшалон... І цяпер яна папярэдзіць сыночка. Ён апоўначы будзе чакаць знаку, і яна дасць яго што б там ні стала! Дасць раней, неяк жа злаўчыцца! У Тосі добры зрок. І ў Арціка добры зрок! Яны ўбачаць святло ў кухонным акенцы адразу, здагадаюцца, што ісці ля хутара нельга. І не трэба будзе і здагадвацца: гэтак жа і дамовіліся! Трэба толькі загадзя ўсё падрыхтаваць: і лямпу, і запалкі, і месца. Галоўнае, каб пад рукамі ўсё было, каб не спазніцца, у вызначаны час знак даць...

Марыля хуценька пашыбавала на кухню, зняла з цвіка, прыкрытага шпалерамі, гадзіннічак, выцягнула з запечка запалкі, пераставіла лямпу з палічкі на падаконнік, потым села на крэсла і крыху супакоілася: зрабіла, зрабіла патрэбныя падрыхтаванні. Яна цяпер — як піць даць! — абвядзе вакол пальца клятую хеўру, што залегла вакол хаты. Не ў сваю міску гэтае гадаўё кінулася, пойдуць яны адсюль як мыла з'еўшы!..

За акном чамусьці неяк дужа хутка гусцеў змрок. Хмары насунуліся — таму гэтак хутка ацямнела. Калі неба зорнае, дык цяпер, вясною, і апоўначы светла. А тут шчэ толькі на дзесятую верне — і цёмна зусім...

Зыркнула на пацямнелыя шыбы і спалохалася. А долечка! І лямпу падрыхтавала, і запалкі, і на гадзіннік штохвіліпна глядзіць. А вокны — не пазавешвала! Трэба ж толькі палову шыбіны ў кухонным акне пакінуць незакрытай і ля яе запаліць лямпу — тады гэтую плямку святла ўбачыш толькі з аднаго месца за чыгункай, ад бяроз, што стаяць на паваротцы селавой дарогі. Адтуль і будзе сыночак глядзець на хутар. Адтуль і Тосечка будзе цікаваць патрэбны знак...

Марыля прыладзіла посцілку, пакінула напалову закрытай толькі адну шыбу кухоннага акна, вобмацкам знайшла крэсла — у хаце зрабілася цёмна, як у глухім склепе,— і села. Зноў зірнула на гадзіннічак, які, зняўшы са сцяны, не выпускала з рукі. Стрэлкі і рыскі — усярэдзіне белыя, а па краях зеленаватыя — свіціліся ў цемры загадкава. Але гэты загадкавы рух зеленаватай стрэлкі па рысках на цыферблаце абуджаў у душы цеплыню — прыгадала, як набычыўся Артур, пачуўшы ад дзядзькі пра падарунак. Марат падарунку зарадаваўся, бярог дужа — нават з сабою гадзіннічак не ўзяў, калі на другі дзень вайны паклікалі ў ваенкамат. «Хай, матулька, дома застаецца гадзіннічак!» І хаты той ужо няма, дзе Ягорка чапляў на руку Марату гадзіннічак, а гадзіннічак і дагэтуль цалюткі — берагла Марыля яго. Спраўна, без стомы ходзяць і ходзяць стрэлкі... А як тады Артур адбіваўся ад дзядзькавага падарунка: ад кепікаў, маўляў, не жыць у школе, буржуй, маўляў, скажуць, бо анікога ж у класе з гадзіннікам! А Марату падарунак — па сэрцы быў. Дзядуля, помніцца, тады Ягора струніў: купецкія, маўляў, падарункі робіш, хлопцаў мне псуеш. Ягор — рагатаў, спяваў нават: «Ой, вы, хлопцы, арлы баявыя! Баявыя вы хлопцы мае!..» Потым дзядуля падбіў Ягора на Дзвіну — рыбаліць. А Пахом з тых рыбакоў пацвельваўся, казаў, што сапраўдны рыбак на рэчку не пойдзе, бартулёў не назбіраўшы...

Змружыла вочы і ўбачыла Пахома. Ноч... Туман ад ра-

кі... Пахом ходзіць па садзе з ліхтаром у пошуках бартулёў, і ліхтар, як зорка, вагаецца пад клёнамі, быццам плыве ў паветры... А яна, Марыля, сядзіць на тэрасе... На якой гэта тэрасе? Яна ж у хаце, на хутары сядзіць!..

Марыля паднесла гадзіннічак пад самыя вочы. Яшчэ крышку самую счакае, і трэба будзе запаліць лямпу... Запалкі тут, пад рукамі. Усё, здаецца, усё прадугледжана, разлічана. А долечка — дзверы! Дзверы ж не зачыніла ў сенцах! Каршуны гэтыя лямпу разам з рукамі вырвуць!..

Намацала на стале жалезную шпулю, уставіла яе ў дзюрачку пад клямкаю ціхутка, з асцярогаю, адчыніла дзверы. Прайшла сенцы на дыбачках, нячутна накінула цяжкі крук, усунула ў клямары драўляную завалу. Нейкі час стаяла, аціраючы папацелы ад напружання лоб, дыхала цяжка, як доўга бегла па сыпкім пяску. Але адчувала, што як пасвяжэла, падужэла ад гэтае працы, якая звычайна рабілася лёгка і неўпрыкмет. Але — усё! Цяперака не дужа ткі і адчыніш знадворку. Дзверы трэба спачатку разнесці, тады толькі ў сенцы ўломішся!..

Паспешліва павярнуўшыся, Марыля зачапіла локцем драбіны, па якіх звычайна ўзбіралася на гарышча, ледзь не абярнула іх. Стаілася: мо ўчулі на двары? Не, ціха там... Хацела ўранні, як парадак у хаце навяла, драбіны пасунуць у кут, дый забылася. Яны і ўвогуле тут непатрэбныя — на гарышча калі-нікалі зазірнеш. Гарышча?.. Вось адкуль — з гарышча! — трэба даць знак. Акно ж там, у франтоне, і якраз у бок дарогі, дзе бярозы, і глядзіць. Сынок здаля агеньчык — умоўны знак іх — убачыць зможа!

Узяўшы лямпу і запалкі, Марыля ўскараскалася на гарышча і, разважыўшы, усцягнула туды і драбіны. Перад тым як цягнуць іх, адставіла лямпу, потым, паклаўшы драбіны, зноў хацела ўзяць яе і не знайшла. Спалохаўшыся, папаўзла на каленках, абмацваючы вакол сябе пясок, змешаны з пілавіннем і сухой кляновай лістотаю; лістота хрустка крышылася пад пальцамі. Лямпа як вадой разлілася!

На нейкі час Марыля спыніла пошук, аднаўляла ў памяці паслядоўнасць сваіх рухаў: узлезла, лямпу паставіла злева, драбіны паклала, калі ўсцягнула, па правую руку ад сябе, павярнулася... Направа павярнулася...

«А трэба ж было зрабіць крок назад ды налева павярнуць. Гэтак! Вось дзе яна, міленькая!»

Намацала халодны беражок лямпы і ледзь не засмяялася ўголас. Знайшла! Не згубіла! Вось і до-обранька. Колькі зараз на гадзінічку?.. З паўгадзінкі да таго часу, пра які з сынам дамаўляліся. Але гэта і добра: лепей крышку раней за-

паліць святло, даць знак раней — хай здаля сыночак убачыць, што бяда тут, што ісці сюды нельга!..

Кнот загарэўся адразу, праўда, слаба, капціў. Але пасля таго, як Марыля надзела на тонкія бляшаныя рагулькі шкло, ён даў добрае святло, без дыму, і ад яго быццам адскочылі, зашыліся па кутках, ціснуліся глыбей пад стрэшку некалі неахайна раскіданыя па гарышчы рэчы: зламанае крэсла, скрыня з пакуллем, плеценая кашала з рыззём, звязкі рудых пазалеташніх венікаў... І толькі рама, выстаўленая з франтона яшчэ ў сакавіку, весела паблісквала шклом, і святло лямпы, адбіваючыся ў кожнай шыбіне, стварала ўражанне, што недзе ўглыбі, пад страхой, гараць чатыры маленькія агеньчыкі і ўвесь час дугаюцца і трымцяць.

«Трэба паставіць лямпу вышэй, на сярэдзіну акна, і трымаць рукою, каб не звалілася!»

Цемра за франтонам ад святла лямпы як наблізілася, загусцела. Шмат, шмат разоў удзень і, часцей, па адвячорку Марыля сачыла з гэтага месца за чыгункаю, прыкмячала кожны рух на насыпе, вакол бункераў па пераездзе, на кулямётных вышках — усё было быццам на далоні. Адсюль, з гарышча, удзень добра відаць бярозы на паваротцы дарогі, нізкі хвойнік на ўзгорку. Мабыць, адтуль... Адтуль, напэўна, з таго хвойніку, Арцік і пакіруе да бяроз, спыніцца пад імі, будзе ўглядацца сюды, у бок хутара... Магчыма, ён там ужо і стаіць, і бачыць, папераджальны знак, і разумее, што тут, на хутары, небяспека, што трэба ісці іншым шляхам... Нават калі ён не дайшоў да бяроз, да той селавой дарогі, ён ужо ад таго хвойніку бачыць гэтае асветленае акно франтона. І Тося напэўна ж угледзела святло — у яе вочы добрыя таксама, бачыць далёка і добра...

Унізе, на падворку, усчалася грозная лаянка. Глуха забухалі ў дзверы сенцаў, потым зазвінела разбітае шкло — салдаты, відаць, ламіліся ў хату праз вокны. Марыля зарадавалася: стукайце, ірвіцеся хоць на кавалачкі — святло не згасіце! А сыночак ужо знак напэўна ж убачыў. Ён ведае цяпер, што бяда, смертачка тут яго пільнуе! Сюды ён хлопцаў сваіх не павядзе!

«Доўга буду лямпу трымаць гэтак, каб напэўна ўжо было. А на гарышча паганцы не адразу і ўскараскаюцца!..»

На падворку злосна гергеталі салдаты, чуліся пеўкія рэзкія каманды і загады. Але ўсё гэта даходзіла да Марылі як здаля, нібыта адбывалася не ўнізе, на падворку, а недзе ў закрытай будыніне, як у сне, нерэальнасць якога разумееш, але спыніць не можаш. Потым на зямлі, як не пад самымі нагамі, затрашчала аўтаматная чарга, з цемры пырснулі па-

церкі агню, і гарачы балючы штуршок у левае плячо піхнуў Марылю ад акна.

«Куля, відаць, у плячо ўдарыла...»

Уся левая частка цела ад галавы да ступакоў зрабілася як не свая, грузла ў нешта гарачае і колкае. Але Марыля не павалілася, не выпусціла з рукі лямпы.

«Добра, што шкло не пабілі. Трымаць трэба моцна, каб свяціла. І каб не паваліцца мне!..»

Жаданне гэтае — не паваліцца, трымаць лямпу! — адсунула ўсе іншыя думкі, адсунула боль, боль нясцерпны, гарачы, і Марыля, звесіўшы правую руку на знешні бок франтона, намацала там шчыліну паміж дошкамі, запусціла ў яе пальцы, і яны ўчапіліся там за нейкую планку намёртва; сагнутая ў локці рука, бы кламар, прыціснула лямпу да стаяка.

«Цяпер не паваліцца лямпа. Будзе свяціць!..»

Зноў унізе на зямлі, але цяпер далей, ад саду, загрукацела доўгая аўтаматная чарга, і нейкія каляныя цвікі прабілі Марылі жывот, а ззаду, за плячыма, у правым кутку пад дахам, за скрыняй з пакуллем, бэхнуў мяккі выбух, і ўсё гарышча адразу заліло густым і рэзкім крывавым святлом. Марыля заплюшчыла вочы ад нясцерпна рэзкага агню, ад болю, што паглыбіўся ў плечы, круціўся ўсярэдзіне, пад рэбрамі, поўз, быццам наплываў на сэрца, і тады, як уяве, убачыла дарогу з узбочынамі, якія густа абсыпаў буйны белы рамонак, убачыла бярозы, і пад імі стаяў Артур.

«Убачыў мой знак сынок! Святло маё ўбачыў...»

Цяпер ужо не было патрэбы трымаць лямпу, але яна загадала сабе, што патрымае яшчэ крыху, каб сынок мог дакладна ўсё разгледзець, і адчувала, што лямпа выпаўзае, як выслізгвае з-пад рукі, і некуды адплывае, быццам высыпаецца з-пад ног пясок гарышча, змешаны з пілавіннем і сухім кляновым лісцем.

Губляючы прытомнасць, Марыля асела побач з лямпаю, якая бразнулася ля ног, адчула, што адплывае ў нейкую светлую гарачую прастору, адкуль нехта выкаціў два каляныя барвовыя сонечныя цэбры і сіліцца заштурхнуць іх ёй у вочы. Яна памірала і не разумела, што канае, нават ужо не бачыла, як пыхнула, бы порах, сухое пакулле ў скрыні, аблітае газаю з каністры, што ўзарвалася ад кулі, як агонь расцякаецца пад ніжнімі дошкамі франтона, прагна жарэ смаляную, да чарнаты ссушаную вятрамі і сонцам, тонкую дранку страхі...

На пераправе праз Быстрыцу, якая пасля вясновай паводкі — улетку дык амаль скрозь нераскочыць можна — яшчэ не ўвайшла ў берагі, Захар, пачуўшы плач дзіцяці, нацягнуў павады і саскочыў з каня. Злева і справа то цішэла, то зноў набірала сілу бязладная гамана людзей, мыкалі каровы, нехта ярасна і глуха лаяўся. Але гэты тонкі дзіцячы галасок гучаў нейкай своеасаблівай чыстай і трывалай нотаю, і Захар чотка і выразна, а галоўнае, канчаткова зразумеў, што калі ён зараз, неадкладна не зробіць нейкія цвёрдыя і маланкавыя захады і не навядзе парадак у гэтым бязладдзі, дык баявы загад камбрыга не будзе выкананы: у вызначаны час атрад не паспее выйсці на той рубеж, адкуль ісці трэба будзе ўжо не гэткім вось натоўпам, а ісці з боем — прарывацца ў невядомасць.

Напачатку такая думка завітала да яго на самым пачатку маршу, калі ён убачыў, што патаемна пакінуць лінію абароны паміж азёрамі атраду не ўдалося. Па вёсках, па лясных кутках, дзе атабарыліся мясцовыя жыхары, ратуючыся ад фашысцкіх куль, бомб і снарадаў, нібыта перададзеная па радыё, пранеслася вестка аб тым, што атрад будзе ўночы вырывацца з блакаднага кола, і, узнятыя ёю, быццам па трывозе, табары вяскоўцаў рушылі следам за партызанскімі ротамі. Наўкола далягляд быў асветлены барвамі далёкіх і блізкіх пажараў, несціхана гула то ў адным, то ў другім баку кананада, час ад часу недзе не дужа далёка ўсчыналася кулямётная страляніна, і гэта яшчэ больш узвінчвала людзей. Фурманкі, калы, вазкі, нейкія старасвецкія тарантасы з хатнім набыткам, жывёла, старыя, жанчыны з дзецьмі на руках наўпярок усім патрабаванням і намаганням раз'ядноўвалі ўзводы, заміналі ротам захоўваць дыстанцыю, і праз паўтары гадзіны калона амаль утрая падаўжэла, запаволіла рух — замест баявой і мабільнай сілы плыла, цякла, варушылася ў начной цемры гаманкая няўклюдная стужка, кіраваць якой было амаль ужо немагчыма аператыўна.

Дзіцячы плач аддаліўся і сціх. Захар убачыў Голуба, якога вызначыў за сувязнога ад першай роты, загадаў:

— Адшукай Яштокіна,— і тут жа змяніў рашэнне, сказаў іншае і, як яму здалося, правільнае: — Яштокіна я сам знайду. Шукай камісара. Скажы, каб да нас Юрша імчаў. Я — у галаве калоны буду...

Голуб адразу ж, як растаў, знік у начной цемры, а Захар ускочыў у сядло. Ён ехаў дзе рыссю, дзе марудна зусім, абмінаючы фурманкі, што загароджвалі дарогу і заміналі, дзе

зноў падспешваў каня. Але ўвесь час ён як бы прабіваўся праз хвалі людской гаманы, лаянкі, чужых, незнаёмых галасоў, потым усё гэта засталося ззаду, і, крыху спагадзя, на скрыжаванні прасёлачных дарог ён дагнаў узвод Бялова, які ад самага пачатку маршу рухаўся ў галаве калоны, крыху адарваўшыся ад патоку бежанцаў з вёсак.

Убачыўшы высокую постаць Бялова, які нешта вясёлае расказваў Яштокіну, убачыўшы роўныя, падцягнутыя ланцужкі партызан, Захар нечакана зразумеў, што рашэнне, якое прапаноўваў Яштокін на пачатку маршу, трэба неадкладна ажыццявіць, не марудзіць. Не ля Вялікага Сяла, а менавіта тут, на гэтым скрыжаванні, трэба разбіць калону на два патокі. У першым — баявыя ўзводы. У другім — мірныя жыхары, вясковы абоз, і гэты, другі паток даручыць узводу Бялова. Ён, узвод Бялова, павядзе калону мірных жыхароў тым шляхам, пра які казаў Ціхан — наўздагон асноўных партызанскіх сіл. Вядома, адсутнасць моцнага ўзвода Бялова паслабіць баявую моц атрада. Але, калі не зрабіць гэтага, атрад проста не здолее талкова павесці бой, не кажучы ўжо аб нечаканасці ўдару, дакладным і строгім выкананні пастаўленай задачы.

Бялоў выслухаў загад моўчкі, ніяк яго не аспрэчваў, толькі спытаў з тугой у голасе, якую прыхаваць не змог:

— А можа, аддзялення хопіць?

— Аддзялення? — перапытаў Захар рэзка, счакаў, дадаў нетаропка, растлумачваючы: — Аддзяленне ты тут, на скрыжаванні, пастаў. А сам — наперад. Калі ўсіх вяскоўцаў мы за табой павернем, яно, тваё аддзяленне, табе — ар'ергард. Зразумеў?

— Так точна. Дазвольце выконваць?

— Выконвай,— і, павярнуўшыся, ціха папрасіў Яштокіна: — У Сяле — спынімся. Дзесяць хвілін — адпачынак. Не больш. Аддай распараджэнне па ротах...

Застаўшыся адзін, Захар нейкі час стаяў на месцы, быццам нешта трымала яго, невядомае і незразумелае. У тым баку, адкуль рухалася калона, з няроўнымі інтэрваламі, то прападала, то зноў бурчала кананада, глухая, няроўная, і як бы падтрэсвала святло пажару ў тым месцы, дзе яна ўсчыналася; водбліскі на небе то даўжэлі, то шырэлі, гарбаціліся, бы выгіналіся адразу, але толькі па краях. Сярэдзіна злавеснай агнянай падковы ўвесь час была нязменная, але дужа знаёмая. Гэтак жа свяціўся далягляд, калі Захар адводзіў атрад ад бруканкі, за якой, разам з хатай дарожнага майстра, дагаралі штабныя машыны гітлераўцаў. Часцей ад усіх вялікіх і малых пажарышчаў, на якія ўдосталь давялося на-

гледзецца, паўставала перад вачыма Захара мепавіта тое зарава над бярозамі, прыходзіла нават у снах. Зрэшты, няма тут з чаго і дзівіцца, усё натуральна, усё заканамерна: адтуль, ад той брукаванкі, пачалася доўгая і цяжкая дарога баёў, малых і вялікіх страт, няўдач, перамог... Але слодыч першай перамогі над ворагам ён, Захар, зведаў менавіта там, ля той брукаванкі ў далёкім цяпер сорак першым, цяжкім і незабыўным. Ад тых горкіх і сумных дзён, ад той маленькай перамогі ён вёў людзей да гэтай, што стаіць ужо ля парога, да якой ужо блізка зусім... Ціхан прадбачыць нешта грандыёзнае, дужа вялікае. Але ці суджана табе пабачыць тое велічнае і грандыёзнае? Што чакае цябе пасля гэтай ночы, у якую ты вядзеш атрад? Э-эх, каб яму гэткі атрад, з гэткім, як цяпер, узбраеннем, з гэткім вопытам, ды тады, ля той брукаванкі!..

Ён глядзеў у начную цемру, тоячы нават ад сябе сумненні ў правільнасці таго, што загадана яму рабіць, адчуваючы згрызоту, што тоіць ад сваіх сяброў гаворку з Ціханам, быццам падманвае і Яштокіна, і Юршу... Быццам?.. Не, дружа! Аніяк не быццам, а гэтак яно і ёсць, гэтак жа сталася: не сказаў ты ім праўду і не скажаш. Ты сказаў тое, што табе загадалі сказаць: уся брыгада прарываецца ў прыдзвінскія лясы, прарываецца ў трох месцах, і кожнаму атраду трэба ведаць толькі свае месца, ведаць дакладна, і ведаць агульны для ўсіх атрадаў час пачатку аперацыі.

«Скажу Яштокіну і Юршу тое, што мне сказаў Ціхан!..»

Рашэнне выспявала ў яго сэрцы спакваля, але ўпарта і няўхільна, неадступна і пакутліва. З'яўляліся і знікалі ў цемры постаці людзей, час ад часу ўзгараліся спрэчкі на скрыжаванні, потым гамана памацнела, загучаў упарты старэчы голас:

— А навошта мяне сюды вернеш? Я з атрадам іду. А гэтая дарога — назад. Кругаля дасць полем і — назад выведзе, да вёскі нашай. Да возера выведзе! Я ведаю!

— Ну, дзед! Усё ён ведае!

— Гэтулькі, з маё, пажывеш — і ты ўведаеш не горай.

— Давай, дзед, махнём,— прапанаваў нехта з цемры.— Дзесятку маіх гадоў, шчэ непражытых, на пяток тваіх, жыццём ужо гарантаваных...

Зноў заплакала дзіця, старэчы голас пачаў супакойваць малое, і Захару падалося, што ён чуў гэты голас і гэты плач дзіцяці, калі пераправляўся праз Быстрыцу. Ён наблізіўся, сказаў лагодна, але і загадна, разумеючы, што гэты ўпарты дзядуля можа ўзбухторыць людзей, парушыць парадак руху, які ўжо складваецца:

— Загад, бацька, усім трэба выконваць. Мы — у бой. Вам, вяскоўцам,— гэтай дарогаю. Унука нясеш?.. Гарласты, заўважаю, ён удаўся.

— Але. Унука, таварыш Крупня. Бацька яго, сын мой, быў адразу змабілізаваны на фронт. Матку ж напрадвесні самалёт — хай яму магіла! — забіў. Дык я ўжо — адзінае апірышча малому. А малец слаўны расце і, праўда ваша,— гарласты...

І тое, што незнаёмы дзядуля адразу пазнаў яго, і гэты плач дзіцяці, пра якое ён ужо нешта ведаў, зноў выклікалі ў Захаравым сэрцы пачуццё згрызоты і сораму. Разумеў, што павінен нешта зрабіць неадкладна, гэтак жа неадкладна, як прымаў тое рашэнне аб падзеле калоны на скрыжаванні дарог, зрабіць ці нешта сказаць, каб пазбавіцца гэтага паганага пачуцця, ураўнаваць сябе з чалавекам, які з гэткай павагаю вымавіў яго, Захарава, прозвішча.

— На кані можаш, бацька, сядзець? — ужо канчаткова зразумеўшы, што знайшоў тое, што шукаў гэтак пакутна, уціснуў повад у руку старому.— Садзіся. І вязі ўнука свайго гарластага да цішыні. Трэба ж, каб бацька з фронту вярнуўся і малога свайго пабачыў і голас пачуў.

— Вам, камандзіру, без каня няможна!

— Можна, бацька, можна,— сказаў Захар і працягнуў руку да старога.— Давай сюды мальца. Патрымаю, пакуль на каня ўзлезеш. Ці дапамагчы?

— Ды шчэ ж не забыўся. Калгасны конюх ды каб забыўся? Гэта ж няможна. Можа, чулі? Ахрэмчык я. Калгас «Прагрэс». Мяне скрозь ведаюць...

Страмёны выслізгвалі з-пад ног Ахрэмчыка, конь круціўся, але Захар чакаў, разумеючы, што абразіць старога чалавека, калі возьмецца дапамагаць. Ён трымаў у руках маленькі, амаль няважкі згортачак, і кволая жывая істота, захутаная ў нейкае зрэб'е, цяпер не падавала аніякай пагудкі аб сваім жыцці, быццам адчувала і ведала, што апынулася ў чужых руках. Але адразу, адчуўшы рукі знаёмыя, хлопчык заварушыўся, нешта загаманіў, і стары тут жа і супакоіў яго з нейкім невыразным мармытаннем, сэнс якога Захар не зла віў, але якое было дужа ж адпалькавае з тым, што некалі ўжываў і ён сам, люляючы сваіх немаўлят.

Захар звёў рукі на грудзях, сціснуў далонямі рэбры. Згадка пра сваіх уласных дзяцей, мову якіх ён, Захар, разумеў гэтак жа, як разумеў гэтага малога стары Ахрэмчык, зноў апякла сэрца сціснутым, але незагоеным болем.

— Добрай дарогі,— сказаў Захар і адчуў, што боль у

сэрцы як бы аддаляецца, суціхае ад таго, што ён аддаў старому каня, пажадаў добрай дарогі.

— Добрай і вам. Каня я, таварыш Крупня, захаваю. Потым возьмеце, як вернецеся. За Ахрэмчыкам не прападзе...

Тупанне капытоў аддалілася, яго глушыла гамана людзей, якая хутка набліжалася, пашыралася, як бы расцякалася паабапал дарогі, гусцела рыпенне фурманак — перла, рухалася, кацілася ў цемры калона. Захар, верха, выяўляецца, намнога яе апярэдзіў.

Дачакаўшыся Юршы, Захар пайшоў побач з ім, паведаміў адразу, быццам толькі тое яму і балела:

— Каня малому з Ахрэмчыкам сплавіў. Пасадзіў, каб ехалі верха.

— Каб ты ўвесь атрад пасадзіў на коней — тады можна было б і пахваліцца.

— Я табе іншым пахвалюся. Дзелім калону тут — інакай прападзём: паблізу станцыі гэтага не зробіш... Бялоўскі ўзвод пайшоў ужо, павёў першых... Аддзяленне — на скрыжаванні застанецца. Яно і замкне калону...

Юрша задаволена засмяяўся:

— А я адразу, як толькі Голуб падбег, здагадаўся, што гэтак і зробіш. Але ж і я пачаў самастойнасць праяўляць — групу Веліканца напрамкі паслаў у Сяло. Яна, мабыць, ужо і там,— і нечакана дадаў, быццам некаму сіліўся давесці тое: — Ціхан Елісеевіч зарадаваўся б, каб убачыў, як кожны — самастойныя рашэнні прымае. Любіць ён гэта паўтараць, каб кожнаму — у вушы: самастойнасць, самастойнасць...

Нешта пачулася крыўднае ў тым, што сказаў пра Ціхана Юрша, і Захар адразу ўзяў брата пад абарону:

— Калі кулі не свішчуць над галавой, дык добра вучыць самастойнасці. А ў баі не дужа-ткі пачнеш гуляць у яе. Аднак жа і без яе — прападзеш. Так што за навуку трэба толькі дзякуй казаць.

Юршу гэта не закранула, ён, быццам нічога іншага і не чакаў пачуць, сказаў заклапочана:

— А ты бачыш, што ў тым баку, за нашай спіною, дзеецца? Гарыць небачка. А тут, куды мы ломім,— цішыня. Спакой і цішыня.

— У ціхім балоце, сам ведаеш, што водзіцца.

Захар пажартаваў, але на душы не палегчала. Сапраўды, загадкавая нейкая цішыня наперадзе. Затое ў тым баку, дзе заўтра павінны пайсці на прарыў блакаднага кола асноўныя сілы злучэння, шырокім агністым колам то асвеціцца, то затрымціць малінавымі палосамі далягляд. А ў бок Вялікага

Сяла — цішыня, неба змрочнае, нават аніводнай зоркі не бліснє.

Затое ў вёсцы ён адразу ж, як толькі параўняўся з першай хатай, убачыў, як нешта выблісиула, быццам мільгануў агеньчык над доўгім, скасабочаным, як завіслым з францёна, вільчыкам. Здагадаўся адразу ж, хоць напачатку і не верылася ў гэта: зорку бачыць на небе. Захар паўглядаўся і тады заўважыў, як імкліва несліся па небе хмары і зорка то прападала, то зноў бліскала і дугалася, быццам кацілася і аніяк не магла зваліцца з вільчыка. Бліснуў агеньчык, падобны на россып зорак, і ў адчыненых нахлашч дзверах хаты, і ў садзе пад яблынямі — курылі, не таячыся. З саду далятаў і вясёлы гучны смех.

— Як да цешчы на бліны прыкаціліся,— уголас пабедаваў Захар, быццам скардзіўся Юршу, і гукнуў у бок саду: — Гэ-эй, курцы. У рукавы дыміце!

З хаты выбег Веліканец, адрапартаваў адразу ж:

— Размясціў у садзе кулямётчыкаў. Аўтаматчыкі — з Файзуло. Ён павёў іх.

Захар спытаў коратка і незадаволена:

— Дзе камандзір роты зараз?

— На тым канцы вёскі,— і лагодна прапанаваў: — Асвяжыць горла не хочаце, таварыш камандзір? Бярозавік ё.

— Апаролі ўжо недзе,— ні то з ухвалаю, ні то з папрокам прамовіў Юрша.

— Пад бярозаю знайшлі Санькоўы хлопцы. На стале стаіць цяпер.

— Гэтыя і з-пад зямлі дастануць,— Захар падтрымаў Юршу, але рабіў тое толькі таму, што быў незадаволены Веліканцам. Быў жа аддадзены загад захоўваць цішыню на маршы, не курыць адкрыта на прывалах.

— Людзі стаміліся. А ражачку гаспадар кінуў, гэта ж зразумела. Што кепскага, што людзі смагу натоляць? Яны ж — бегма ўсю дарогу.

Захар толькі цяпер дапяў, што не зразумеў Юршу. Той, ведама ж, пажартаваў, зусім не меў намеру папракаць Веліканца, хоць той у атрадзе адразу пачаў задзіраць нос.

— Ты даўно ўжо тут? — спытаў Захар, і гэта яго адразу і сапраўды зацікавіла; вырашыў, аднак, што папіць бярозавіку не зашкодзіць.

— З паўгадзіны роўна... Хадземце, пачастуйцеся бярозавікам. Халодненькі і салодкі.

— Пачастуемся і самі. Ты ідзі, сваіх арлоў папярэдзь, каб не курылі гэтак адкрыта. І не рагаталі. На станцыі ж, па-

пэўна, чуваць такіх гарластых,—і, крыху памарудзіўшы, спытаў: — Падрыўнікі з табою? Падашлеш сюды Артура...

Веліканец ступіў убок, і адразу ж яго постаць змізарнела ў цемры і знікла за дрэвамі; агеньчыкі цыгарак у садзе імгненна згаслі.

— Навошта ты клічаш хлопца? — спытаў Юрша.— Яго зараз лепей не чапаць. Ён ажно счарнеў увесь. Хутар жа ў яго на вачах гарэў...

— А ты яму благое ў галаву не ўбівай. Магчыма, неяк выратавалася Марыля, ацалела... Хай у гэтым кірунку думае!

— Не, лепей ужо адразу — праўду.— Юрша пачаў прагна, прыцмокваючы губамі, піць бярозавік адразу ж, як толькі яны ўвайшлі ў хату.— Калі гарыць душа, дык праўда, бы гэты бярозавік, студзіць. Чалавек адгаруе — пачне супакойвацца. А хлуснёю спакою не дасягнеш.— Учуў гаворку на вуліцы, насцярожыўся, пачаў глядзець у незачыненыя, папярэднім нахлапч, дзверы.— Падобна, Файзуло голас. Зараз вярнуся, зірну...

Захар зачэрпнуў з цёмнай ражачкі поўную конаўку, выпіў нагбом, потым зноў зачэрпнуў гэтак жа з каптуром, поўненькую, і, трымаючы ў руках, выйшаў з хаты, пастаяў на ганку, потым сеў, прыслухаўся. Былі ж галасы, чуў і ён іх, а цяпер быццам вымерла вуліца вёскі — трывожная, загадкавая цішыня. І дужа пасвятлела наўкола. Э, гэта ж чыстае неба!

Хмары зніклі, густа заззялі ўвысі зоркі, і ў конаўцы на цёмнай паверхні затрымцелі слабыя, але густыя адбіткі. Захар крыху нахіліў конаўку — адбіткі зорак затрымцелі і зніклі.

Пачуліся хуткія і мяккія, але дужа знаёмыя крокі — ішоў Артур. Стаў побач, не абзываўся, чакаў.

— Хочаш бярозавіку? — спытаў Захар.— Смагу ім я адразу сагнаў.

— Дзеля гэтага мяне і паклікалі, таварыш камандзір?

Суха, незнаёма прагучаў Артураў голас, з дакорам. «Яго лепей не чапаць...» Разумна, мабыць, раіў Юрша. Але сказаць параду — лёгка. А вось як суцешыць чалавека? Ды не, не пра тое павінен быць клопат: досыць сэрца вярэдзіць, жывым — пра жывое думаць.

— Я што хацеў спытаць у цябе.— Захар счакаў, пакуль Артур прагна выпіў бярозавік, узяў у яго конаўку, паўтарыў, але цяпер без развагі, з цвёрдым запытаннем: — Што хацеў у цябе папытаць? Усё тое ж. За гравійкаю, кажаш, акопаў ты не заўважыў?

— Не заўважыў. Іх там тады не было.

— Значыцца, думаеш, што за гэты час яны маглі і з'явіцца?

— Пашліце ў разведку. Вярнуся — далажу.

— Няма часу на тую разведку. Наперадзе — бой.

— Тады чаго седзімо? Калі вырашана, дык трэба рвануць!

Смешная, але няўмольная логіка. Прынята рашэнне прабіцца за чыгунку менавіта тут, паміж пераездам і станцыяй? Прынята. Усе камандзіры ўзводаў ведаюць яго? Ведаюць. Тады навошта ён зноў распытвае Артура пра тое, што ўжо добра, падрабязна вядома, дэталёва вывучана? Ды не, не проста ты распытваеш. Цябе ўсё яшчэ прыгнятае тая згрызота, што мучыла ля скрыжавання дарог, калі ты прыняў рашэнне, якое не выканаў і не выканаеш,— рашэнне сказаць Яштокіну і Юршу ўсю праўду пра гаворку з Ціханам. Ты, відаць, і Артура толькі на тое і паклікаў, што згрызота не прайшла, мучыць.

«Перад смерцю мы ўсе роўныя...»

Ціханавы словы жылі, загучалі ў яго вушах, і ён толькі цяпер зразумеў, што той меў на ўвазе. Ён, Захар, ведае больш, чым ведае Яштокін, Юрша, Артур... Але ж гэта анічога — літаральна анічога! — не зменьвала і не зменьвае ў той роўнасці перад смерцю, пра якую казаў Ціхан. Значыцца, і ў самы апошні міг свайго жыцця ты не здолееш сягнуць за гэтую мяжу роўнасці, бо яна не падуладна анікому.

— Трэба ісці,— паўтарыў Захар Артуравы словы, паўтарыў, бы прызнаваўся, што даводзіцца рабіць тое, на што вялікай ахвоты няма і ад чаго ён бы з радасцю адмовіўся.— Ведама, трэба,— і запытаўся ўжо звыкла і загадна: — Асноўную задачу група памятае добра? Галоўнае — радыёперадатчык. Беражы яго, як сваю ўласную галаву. Шчэ нават і больш!

— Учора ў мяне іншы загад быў.

— Які іншы? — Захару падалося, што ён недачуў, што Артур жартуе, а ён яго не зразумеў.

— Галоўнае — радыстка.

— Гэта ўсё непадзельна, Арцік, непадзельна... Ну, развітаемся?.. Развітаемся, дарагі мой пляменнік!..

Артур не прыняў шчырасці, спытаў з прытоеным і незадаволеным усміхам:

— А навошта? Сто разоў жа сёння будзем сустракацца!

— І праўда. Ідзі ў групу!..

Захар разлічваў на гутарку шчырую, сардэчную, падобную на тую, што была з Ціханам. Цяпер, памыліўшыся, пакрыўдзіўся. Дарэмна не паслухаў камісара. Той, выяўляецца, усё прадбачыў: Артур нацягнуты бы струна. І, магчыма, ён,

Захар, памыліўся, калі даручыў ахову радысткі Артуравай групе... Ды якая, галубок, яна яму радыстка! Ён жа ўсё роўна будзе побач з ёю. Ну, кропка! Хопіць разваг! Трэба, як казаў Артур, ірвануць!

Ён зайшоў у хату, выпіў, зноў з вялікай ахвотаю, яшчэ адну, паўнюткую, конаўку бярозавіку і ёмка, быццам пячатку прыляпіў, паставіў яе на стол побач з цёмнай ражачкаю. І адбылося нешта дзіўнае, яму самому не зусім зразумелае: на ганак Захар выйшаў з адчуваннем сілы, бадзёрасці і ўпэўненасці. Падумаў быў на кароткі міг — бярозавік прычынаю. І тут жа і сам пасмяяўся з свае здагадкі: не, не ў бярозавіку ўсё заключаецца. Так, не бярозавік тут прычынаю: спрацаваў, бы магутная спружына, вопыт баявых гадоў, што былі за плячыма, тое, што зрабілася звычкаю, якая падграбала пад сябе ўсё. Ён — камандзір. Ён — вядзе людзей. Ён — усім і кожнаму прыклад.

Адчуванне гэтае было з ім цяпер увесь час, і Захар падпарадкоўваўся яму машынальна, нават не задумваючыся: ён быў як тая куля, што ляціць і ўжо не можа свой рух змяніць. Загадаўшы пачынаць рух з вёскі, ён па-сяброўску паціснуў спачатку руку Яштокіну, які вёў першую роту правым флангам, потым Юршу, які ішоў з другой ротай на левым фланзе, і сказаў жартоўна Веліканцу, які чамусьці трымаўся ўвесь час побач з ім, заўсёды на роўнай адлегласці, быццам адмераў гэтую дыстанцыю і няўхільна яе захоўваў:

— Як твае курцы? Не ўсю табаку зрасходавалі?

Веліканец прыняў жарт:

— Сваю табаку падчыстую дабілі. У фрыцаў пазычым. На замен. Яны — табакі. Мы — аганьку добрага!..

Ён быў удзячны Веліканцу за гэты жарт, які чулі аўтаматчыкі, што ішлі роўнымі ланцужкамі пасярэдзіне вясковай вуліцы. З удзячнасцю згадаў гаворку з Ціханам, які, разумеючы ўсю складанасць задачы, што належала выканаць атраду, дадаў гэтую ўдарную групу, узброеную толькі аўтаматычнай зброяй. Згадаў і ўпершыню за гэты час, што мінуў пасля вяртання з далёкага рэйду Артура, па-сапраўднаму паверыў у мудрасць Ціханавай задумы, паверыў у поспех, які будзе спадарожнічаць ім усім.

З гэткім адчуваннем ён ішоў па вясковай вуліцы, мінаў цёмныя, стоеныя хаты, у якіх ужо не было жыцця, глядзеў на дрэвы ў садах, якія былі святлейшыя, чым хаты і хлявы, і ад якіх нават у цемры быццам цеплыня бруілася, і ад гэтага святла і цеплыні, стоенай і далёкай, трывожна было на сэрцы.

Усё з тым жа адчуваннем веры ў поспех ён, калі ад чыгу-

начнага насыпу грымнуў першы стрэл, імкліва ўзняў цяжкую ракетніцу і паслаў у неба ракету, чырвоную — загад ісці толькі наперад. Захар, убачыўшы, як скрыжаваліся злева і справа каляровыя ленты трасірных куль, усё з тым жа радасным адчуваннем веры ў поспех, сунуў ракетніцу за дзягу, і павярнуўшы наперад ствол аўтамата, які вісеў на грудзях, чамусьці падумаў не пра тое, што чакала яго наперадзе,— падумаў пра старога з малым, якога нядаўна пасадзіў на свайго каня.

Насып наблізіўся з цемры імкліва, святло ракеты як бы выкінула яго насустрач, пад ногі, і Захар, сігаючы праз блішчастыя, бы ў рабаціннi, рэйкі, заўважыў, што ленты трасірак ляцяць яму насустрач і злева і справа. Але варта яму было саскочыць з насыпу, як гэтыя ленты раздвоіліся, панесліся леваруч і праваруч, а наперадзе, зусім блізка, запырхалі ад зямлі мятлікі то белага, то нейкага чырвона-сіняга агню; россып іх быў няроўны, палосамі, і палосы гэтыя выгіналіся, то падскоквалі ўверх, то западалі ў глыб зямлі і зноў выпырвалі, быццам каціліся долам, рассыпаючыся на буйныя іскры. Захар, амаль аглушаны суцэльным несціханым грукатам страляніны, бег проста на іх, страчыў кароткімі чэргамі і заўважаў, як робіцца ўсё радзейшым пырханне чырвона-сініх мятлікаў, якія быццам шыліся ў белаваты, падобны на туман, дым, што зыбаўся над зямлёю.

Яшчэ перад насыпам у перасохлым ад хвалявання горле ўзнік шархоткі камяк, які замінаў дыхаць, і Захар увесь час сіліўся праглынуць яго. Але за кожным намаганнем камяк выкатваўся назад, да паднябення, пакідаючы боль, быццам драпаў горла вострымі цвікамі. Урэшце Захар праглынуў той камяк, але боль пакаціўся следам за ім у грудзі, і ён крутнуў галавою, потым выгнуўся грудзьмі наперад, быццам выштурхваючы той боль з сябе, і зрок схапіў зеленавата-белую зорку, якая, куляючыся, ляцела з высі.

«Граната!.. Гэта — граната!..»

Ён бразнуўся на дол, прыкрываючы галаву прыкладам аўтамата; лоб тыцнуўся ў нейкі пляскаты шырокі граніт, і з бакавіны гэтага каменя, і яшчэ справа, адразу закрэсліўшы і адкінуўшы страляніну, сыпанула ў вочы грымотная барвовая зямля.

«Забіты?.. Не, я не забіты!..»

Ён добра чуў, што прамовіў гэтыя словы, і ўслухоўваўся ў іх гучанне без болю і пакуты, і адчуваў, як яго мякка, быццам гушкаючы на цёплай коўдры, некуды цягне, адносіць калянная і гарачая зямля. Ён яшчэ нейкі час чуў нечыя галасы, добра ўсведамляў, што не ляжыць на месцы, а рухаецца

наперад. Потым галасы зглухлі, але адчуванне руху засталося, было толькі аддаленае, успрынятае цяпер хутчэй не целам, а толькі розумам, і Захара дзівіла цяпер не гэта, а тое, што ён чуе аддаленыя стрэлы, але не бачыць лёту аніводнай трасіркі.

## 21

Адчуванне таго, што ён не рухаецца, што ўсё вакол спынілася, што рукі ляжаць на адным і тым жа месцы, было раптоўнае, як моцны штуршок, і тады адразу праясніліся галасы, з іх вылучыўся знаёмы басок Веліканца, але нейкі запаволены, прыглушаны, быццам са скляпення:

— Таварыш камандзір... Таварыш камандзір...

Захар выразна бачыў твар Веліканца, які схіліўся над ім, зразумеў, што ноч мінае, што пачынаецца світанне, але добра не мог сцяміць, што адбылося, дзе ён, чаму спыніўся рух.

— Чаго мы спыні...

Ён не дагаварыў, далонь Веліканца закрыла яму рот. Але цяпер адчуванне руху зноў было, быццам ён плыў па коўдры — коўдра цяпер выдавала цвёрдай і халоднай,— і Захар, адкінуўшы руку Веліканца, спытаў, не пазнаючы свайго глухога, сіпатага голасу:

— Дзе атрад?

— Роты прарваліся, думаю. Флангі прарваліся...

— А мы? — і адчуў боль у шыі, скаванай нейкім абручом, абмацаў гэты абруч, зразумеў, што гэта закарэлыя бінты, і ўсё да дробязі прыгадаў.— А мы што? Залеглі?

— Але... Гравійка наперадзе...

— Навошта залеглі? Чаму?

Захар зазлаваў і, злуючы, пачынаў разумець, што ён сам прычынаю таго, што бачыць. Ён прыгадаў агеньчык нямецкай гранаты, якая ляцела з высі, і доўгі пляскаты камень, які, мабыць, і ўратаваў яго. Веліканец, ведама, заўважыў, што Захара параніла, рух група замарудзіла і цяпер вось залегла непадалёк ад гравійкі.

— Акопы тут у іх густа,— пошапкам патлумачыў Веліканец, як бы дзівячыся з таго, што Захар не можа гэтага сцяміць.— Першую і другую лініі мы размалацілі і праскочылі. Вас на другой зачапіла...

— Загад жа быў адзін: наперад!

— Развіднее крышку — рушым.

— Добра, што не зусім развіднела. Трэба гэта выкарыстаць.

— Позна. Хай зусім развіднее.

— І не ведаеш, дзе роты?

— Ім напэнціла. А дапамагло што? Калі мы сюды ўперліся — на нас увесь агонь пайшоў.

— Страты ў цябе ёсць?

Веліканец маўчаў, потым уздыхнуў:

— Сем чалавек. Добрыя дужа хлопцы. У ротах — больш палягло. На першай лініі многа людзей страцілі.

— Удзень нас тут усіх пакладуць.

— Памерці, таварыш камандзір, заўсёды паспееш.

Ён пакінуў без увагі словы Веліканца, шэптам паўтарыў:

— Удзень нас тут усіх пакладуць!

— Спярша мы ім вочы высмалім.

— Ты на нешта разлічваеш? — па здушаным голасе Веліканца Захар здагадаўся, што галоўнае да яго не дайшло.

— На бога. І на сасоннік. Бог — далёка. Сасоннік — блізе-е-нька. А там мы — па-айшлі. Галоўнае — на ўдар падпусціць. Каб з акопаў выманіць... Я загадаў сваім — мерцвякамі прыкінуцца. Каб аніякага руху. Нават калі і сонца ўзыдзе — ляжаць! Дам ракету — тады наперад,— і дадаў, як бы апраўдваючыся: — Ракетніцу я вашу ўзяў — яна пад дзягаю ў вас не трымалася... І вас я ледзь не згубіў. Бой, мітусня... Ціха! — Веліканец знерухомеў, пачаў услухоўвацца, углядацца наперад і па баках, часцей ад усяго пазіраючы ў той бок, куды вярнула разора.— Падобна, што заварушыліся... Яны, халера, акуратныя. Да снядання ўсё тут аглядзяць абавязкова. На гэта — увесь наш разлік...

У шэрым ранішнім сутонні ўжо добра акрэсліліся чорны сасоннік за гравійкаю, нізкія прысады ля дарогі. У тым баку загучалі нейкія невыразныя і прыглушаныя галасы, пачулася бразгаценне, быццам малацілі таўкачом па драўляным цэбры. Потым галасы загучалі правей прысад, бразгат ціх, але ніякага руху не прыкмячалася нідзе.

Захар павярнуўся на правы бок, каб лепей было бачыць прысады, за якімі прапалі галасы. Муляла бок, ціснула на паясніцу рабрыстая граната, і ён, сунуўшы руку ў кішэню наскуранкі, абмацаў халодныя рэбры «эфкі». «Мой родны, надзейны шпіталь...» Гэтак аднойчы сказала Рыма, калі Захар убачыў у яе процівагазнай сумцы, прыладжанай пад энзэ і патроны, гранату. Ах, як ён, Захар, тады сварыўся, як лаяўся, гатовы быў ударыць Рыму за маладушнасць. Потым астыў, сустрэўшы халодны позірк, у якім не было ні разумення, ні спагады. Як добра, аднак, што Рыма пайшла з першай ротай! Калі роты прарваліся, дык яны зараз далёка... Велі-

канец як прадбачыў, настояў, каб група Артура ішла не з імі... А цяпер, мабыць, ён яго, Захара, ва ўсім абвінавачвае...

Захару падалося, што позірк, поўны пагарды і крыўды, свідруе яму патыліцу, і ён марудна павярнуў галаву. Так, у Веліканца ёсць падставы яго абвінавачваць. «Я вас ледзь не згубіў...» Значыцца, шукаў. Таму і затрымалася група, і цяпер ляжыць у гэтай вузкай пакручастай разоры, на ўскрайку чорна-зялёнага поля. Гэтая разора ды мяжа, на якой густа чарнеюць вывернутыя камяні, іх пакуль што і ратуе. Ды рунь яшчэ — густая і ладная. Каб не гэтая разора ды жыта — іх адтуль, ад гравійкі, ужо відаць было б, прыкмецілі б, напэўна. А скурчаныя постаці партызан здаля наўрад ці адрозніш ад каменя на ўзмежку.

«Жытнёвае поле... І добрае жыта расце. Ладны хлебец ужо!»

Ён працягнуў руку, адшчыкнуў каліва жыта і марудна зжаваў. У зялёных сцяблінах не было аніякай слодычы, але не было і гаркавасці; у роце пасвяжэла, і Захар адчуў незнаёмую раней прыкрасць, якую абудзіў смак маладога жыта. Ён зноў працягнуў руку да маладой руні, гладзіў, перабіраў пальцамі халодныя сцябліны, і ўсё ў душы нечпадзеўкі сціснулася ад думкі, якая зноў завітала, але цяпер мела і працяг, які і спарадзіў незнаёмую прыкрасць і боль.

«Мой родны, надзейны шпіталь...»

Зноў абмацаў «эфку» ў кішэні, зноў адчуў горкую прыкрасць, адчуў боль у сэрцы, быццам яму зараз і трэба было выцягваць тую гранату, высмаргнуць чаку, прыкласці да сэрца. Дзіўна, аднак, ён скіроўвае свае думкі! Трэба думаць пра добрае. Цікава, які сёння будзе дзень? Сонечны, мабыць: жыта мокрае ад расы, дужа густая раса — на пагоду. Неўзабаве яно выкаціцца на далягляд, будзе грэць зямлю. Пройдзе час, і тут зашуміць збажына, наліюцца зярняты, і нехта з песняю выйдзе на жніво. Так, да жніва чужынцаў тут ужо не будзе.

«Слаўна было б раніцою прыехаць сюды. Хоць адным вокам зірнуць на жніво...»

Ён узняў свой аўтамат, адчуў яго лёгкасць і здагадаўся, што дыск пусты. Выцягнуўшы з брызентавага чахла на рэмені запасны, ён памяняў дыскі і ўважна разглядаў той, што быў дагэтуль у аўтамаце. Дыск, відаць, яго, Захара, таксама ўратаваў. Прыклад пашчапала граната. А ў дыск, здаецца, трапіла куля. Так, разрыўная. Значыцца, не лёс быў паміраць уночы!

Думка ўразіла яго, ён падумаў пра тое, што павінен сказаць добрае слова Веліканцу, слова шчырай падзякі. Не, Ці-

хапу, у першую чаргу: ведаў, каго пасылаць на дапамогу атраду. А каб не група Веліканца — усё інакш магло б скласціся сёння ўночы. Магло б?.. Ды склалася б, напэўна, горш, значна горш, і, у першую чаргу, для цябе самога. Лічы, што ён цябе ўратаваў. Не прыклад і дыск аўтамата — ён, Веліканец!..

Падзякаваць ён, значыцца, Веліканцу хоча? А што ён, Веліканец, табе скажа? Падзякуе за тое, што праз цябе ляжыць тут, у гэтай разоры, ляжыць у чаканні бяды? Падзякуе, што страціў сем чалавек, амаль трэцюю частку сваёй групы?

«У ротах — больш...»

Жахлівы сэнс сумнага і горкага прызнання, якое зрабіў нядаўна Веліканец, толькі цяпер паўстаў перад ім бязлітасна, аголена і ашаломіў. Ты думаеш пра нейкае слова падзякі, якое мусіш сказаць Веліканцу! Ты, камандзір, на якім уся адказнасць і за гэтыя сем чалавек, што ляжаць забітыя, і за страты, што панеслі роты!..

Ён абвёў позіркам поле, здзіўлена заўважыў, што яно ўвачавідкі зменьвае свой колер. Толькі што было чорна-зялёнае, а цяпер насвятлела, густа зеляніцца ля рукі, а далей — не чарнізна, а густая сінеча, быццам там, вышэй жыта падсіненае нечым. І сінеча гэтая не аднолькавай гушчыні, шырокімі палосамі, што наўскасяк дзеліць поле на сціснутыя трохкутнікі, і канцы іх там, дзе ляжаць камяні, быццам прапорваюць узмежак.

«Ды не камяні ж там ляжаць! Забітыя!..»

Захар жахнуўся і зненавідзеў сябе за свої лёс, які напаткаў яго ў гэтую ноч. Разумеў, што не мае права на гэта, разумеў, што над сваім уласным лёсам не ўладарны, што ён, Захар, не вінаваты ў стратах, якія панеслі роты, якія панесла група Веліканца, і ўсё ж усведамленне таго, што атрад пайшоў наперад без яго, камандзіра, што ён, камандзір, толькі замінаў атраду, прымусіла яго пакутаваць.

Захар адчуў лёгкі штуршок у левую нагу, павярнуў галаву і сустрэўся позіркам з Веліканцам. Веліканец вачыма паказаў у канец узмежка, і Захар, прасачыўшы за яго кароткім кіўком галавы і позіркам, напружыўся, націху падгроб аўтамат яшчэ бліжэй да сябе, пад правую руку.

Неба над хвойнікам пасвятлела, але над полем яшчэ грувасцілася шэрае ранішняе сутонне, і ў ім, як за тонкай тканкаю, трыма няроўнымі ланцугамі рухаліся па жыце салдаты. Яны ішлі марудна, часам то адзін, то другі спыняліся, нешта разглядалі на зямлі, і тады да іх набліжаліся яшчэ дзве ці тры постаці, згіналіся, быццам спрабавалі нешта ўзняць з

зямлі, і потым зноў ішлі наперад. Раскацiста бэхнуў адзіночны стрэл, сакатнула кароткая аўтаматная чарга. Але гэта не раскідала цёмна-шэрыя ланцужкі, нават не змяніла напрамак іх руху, і яны паволі набліжаліся да разоры, вырасталі, бы таўсцелі на вачах. Разам з імі набліжалася гаворка, і рабіліся выразнымі рэзкія, адрывістыя каманды: «Лянгзам, лянгзам!», «Лінкс, лінкс!»

Словы былі зразумелыя. Нехта ўпарта загадваў салдатам ісці марудна, забіраць усё лявей і лявей. Захар напацеў. Бачаць партызан і не жадаюць з імі сутыкацца? Ды не! Гэта ж, калі ўлева вярнуць з поля,— проста сюды, па разору, кірунак. Значыцца, заўважылі!..

Не паварочваючы галавы, Захар накасіўся на Веліканца, убачыў толькі яго руку з ракетніцай, якая ляжала ў маладой руні. Кончык указальнага пальца, які сагнуўся на спускавым кручку, канвульсійна ўздрыгваў, быў чорны ад зямлі, як усохлы струк бобу, і Захару падалося, што гэты палец Веліканца і спускавы кручок ракетніцы зроблены з аднаго і таго ж чорнага металу. Захар бачыў і гэты палец, і цёмную постаць салдата, які набліжаўся, тэпаў увішна па руні, быццам згледзеў ракетніцу, і паважыўся апярэдзіць усіх, і першым ухапіць яе.

Кароткая агністая страла з гучным пояканнем выдралася з куртатага ствала ракетніцы, і чырвоны камяк агню, быццам слізгануўшы над нагамі салдата, мільгануў над полем, пакідаючы белы дымны след, і як узарваўся ў вершаліне бярозы ля гравійкі, чырвонымі зоркамі пасыпаўся на галлі.

Захар ускочыў. Боль ірвануў яму шыю, тузануў плячо і хрыбціну, хіснуў галаву з боку на бок. Але ён перасіліў боль, перасіліў слабасць у нагах, прыхінуўся шчакою да прыклада і гэтак, ловячы не на мушку, а па канец ствала постаці, якія дзіўна ваталіся і падскоквалі на зялёным жыце, ірвануўся наперад, следам за Веліканцам; Веліканец бег і страчыў з ручнога кулямёта, які віссў у яго на грудзях на рэмені.

Захар і сам не заўважыў, як аказаўся наперадзе ўсіх, ён як бы сплачваў гэтым адчайным нарываннем за тыя хвіліны, што праляжаў у непрытомнасці, за тую віну, якую ўзвёў на сябе і не скідаў. Ён не зважаў на кулі, якія ціўкалі вакол яго, ён зноў быў камандзірам, якім быў усе гэтыя гады, і не адчуваў аніякага жаху. Смерці не было — ён не адчуваў яе прысутнасці,— як не было і будучыні, і не было ўвогуле нічога, апрача чорнага сасонніку за гравійкаю, да якога ён вырашыў дабегчы першым, і ведаў, што дабяжыць, што кулі яго не зачэпяць; у яго свядомасці жоўтая палоса гравійкі ператварылася ў нейкую дзіўную выратавальную мяжу, якую ён наві-

неп быў дасягнуць, мяжу, за якой будзе ўсё інакш, зусім не гэткім, як было дагэтуль. Ён імчаў наперад, сціснуўшы зубы ад болю ў шыі і плячы, ад нянавісці, што драла сэрца, і, адчуваючы пругкае дуганне прыклада, разумеў, што аўтамат працуе бездакорна.

Жытнёвае поле скончылася. Ад гравійкі Захара аддзяляла цяпер толькі вузкая лугавіна, і ён — бегчы тут было лягчэй, ногі не правальваліся ў мяккую раллю, сцябліны жыта не чапляліся за боты — нібыта пераляцеў праз яе, ускочыў на дарогу і кумільгам скаціўся ў кювет; доўгая стужка агню, што вырвалася з рабрыстай тоўстай рулі нямецкага кулямёта, прайшлася ў яго над галавой. Захар нічога не загадваў сабе, рукі ўсё зрабілі самі, амаль аўтаматычна: выхапілі гранату з кішэні, выдралі, не адгінаючы вусікаў, чаку і мітнулі яе дакладна пад тое дымнае агнянае лязо на канцы чорнай рабрыстай рулі. Бела-жоўтае полымя пыхнула дзіўна, не ўверх, а па зямлі, задрала ўверх тоўстую рулю кулямёта, і ён хіснуўся і як растаў у чорна-шэрай каламуці выбуху.

Падхапіўшыся, Захар пераскочыў напаўразбураны акоп, сакануў чаргою па цёмных постацях, што ўзнімаліся з-за суседняга бруствера, і ўбачыў, як яны ляглі, заваліліся на брустверы, быццам матнулі галовамі ў бок сасонніку. Блізка як сасоннік! Крокаў паўсотні — не больш! Але ж там — людзі! Фрыцы? У сасонніку сядзелі? Ды не! Юрша ж гэта наперадзе бяжыць!..

Ён бачыў постаці людзей, што выскачылі з сасонніку і беглі насустрач, але беглі не россыпам, а нейкімі двума лапцужкамі, нібыта адкрывалі яму, Захару, чыстую дарогу да сасонніку. Захар бачыў усё гэта нейкім расплывістым зрокам, быццам праз белы дым, і ў гэтым дыме яркай і выразнай была прыгнутая постаць Юршы, які бег наперадзе ўсіх, і над яго галавой буйнымі чорнымі чмялямі густа раіліся страляныя аўтаматныя гільзы.

## 22

*БЛАКНОТ РОМЕЛЯ. Старонка адзінаццатая.*

«Паверыў у свой шчаслівы лёс канчаткова: ад кулі я не загіну. І ўвогуле, не загіну тут, на чужой мне зямлі.

Ззаду, за спіной, яшчэ адно кола пекла, у якім засталася як не палова атрада. А мне — напэцціла. Цалюткі! Толькі драпіна ля правага калена і калашына падраная — на высечцы альховай няўдала паваліўся. Можна радавацца, а мне —

сорамна. Сорамна глядзець Крупню ў вочы, нібыта толькі мая віна ў тым, што гэтулькі ягоных сяброў засталіся ляжаць ля чыгункі, на пагорках перад гравійкаю, на полі перад узлескам.

Яшчэ больш сорамна ад думкі зусім іншай, з атрадам не звязанай. Што чакае мяне дома? Я цяпер не проста веру, але і ведаю: вярнуся дамоў, мяне не заб'юць тут, у гэтых лясах. А чым стрэне мяне родная зямля, мой фатэрлянд? Пагардай? Зняважай? Гэткімі ж словамі, якімі хвастаў мяне Майер, той юрыст з Кюстрына? Мы, маўляў, ваявалі, змагаліся, пакутавалі... А ты? На табе — кроў тваіх суайчыннікаў, не ворага!

Я шмат ужо думаў над тым, што адкажу. Ёсць, ёсць што сказаць у апраўданне! Калі я раскажу ўсё, што тут пабачыў,— аніхто не адважыцца кінуць у мяне камень. Зрэшты, хай кідаюць, хай! Мне б толькі ўбачыць мой фатэрлянд, толькі б дакрануцца рукою да роднага парога. А там — можна і памерці, бо жыццё не будзе ж цягнуцца бясконца.

Вясною думкі пра смерць выглядаюць дзікунствам. Вясною ўсё прагне любові, прагне цяпла, прагне сонца, уся прырода, абудзіўшыся ад зімовага сну, пачынае новае кола прыгажосці бясконцай і мудра-мудрай. І толькі людзі — самыя мудрыя з усіх зямных істот — забіваюць сабе падобных, ліюць кроў і кажуць: у імя жыцця...

Здаецца, я спасціг тут і гэтую мудрасць. Спасціг сёння, калі ўбачыў, як Шлык адпачывае пасля працы — на гародах спаленай ушчэнт вёскі саджалі бульбу. Атрад галадае, а бульбу — пасадзіў. Каму прынясе плён гэтае, уробленае і маім мазалём, поле?

Шлыка, як падалося, такое пытанне не хвалюе ані. Стомлены працаю, ён ляжаў пад яблыняю, утаропіўшы вочы ў блакіт неба: плечы ў маладой траве загрузлі, перапэцканыя ворывам рукі зліліся з зямлёю і колерам і формаю, быццам вырастаюць адтуль, з раллі. Яны, рускія, зрасліся з сваёй зямлёю, яны непадзельныя з ёю, спасціглі яе і мову і сутнасць — у гэтым іх сіла і розум.

Дзівакі, неразумныя дзівакі былі за дарадцаў у нашага фюрэра: возьмем, маўляў, у славян іхнюю «жыццёвую прастору». А яна, гэтая прастора, выяўляецца, не абстрактная велічыня, яна складаецца з дзвюх частак — зямлі і народа. Паасобку нельга ўзяць аніводнай паловы, бо яны — непадзельныя. А разам узяць — немагчыма. Анікому і аніколі.

Няўжо трэба было зведаць гэтулькі пакуты, болю і тугі, каб дайсці да простай высновы? Відаць, трэба было. Толькі на нялёгкай — пакутнай і горкай — дарозе знаходзім мы муд-

расць сапраўдную. На ўсіх астатніх — толькі падман. Толькі мана, хоць часам вельмі ж прыгожая, спакуслівая, і сэрца чалавечае часцей толькі яе і прагне.

Зямля мая! Дарагі мой фатэрлянд! Чакай мяне, я вярнуся!

Я — іду к табе!

Чуеш? Іду, іду толькі к табе!..»

## 23

Пакручасты і звонкі, з мудрагелістымі і задзірлівымі каленцамі, спеў салаўя наблізіўся, гучаў недзе на самым ускрайку чаромхавай заглушы, і Захар знерухомеў, толькі шнырыў вачыма па галінах, абсыпаных буйнай квеценню, белай нават у вечаровых прыцемках. Шчасціць яму на гэтыя салаўіныя канцэрты — да вайны рэдка слухаць іх даводзілася, вельмі ж рэдка. А цяпер кожную вясну — да ачмурэння наслухаешся. Летась, помніцца, Ціхан павёў салаўёў слухаць. Аднак тут, ля Дзвіны, яны яшчэ мадней шыя каленцы бяруць. Надзейна схаваўся гэты адмысловы спявак — аніяк не ўгледзіш. А недзе ж зусім блізенька, як на тваім плячы сядзіць. Прымоўк нечага. А-а, крокі пачуў — Гайдаш упрыдбег шнуруе ад лесу. Шарэюць ззаду сосны, нейкія тоўстыя, аграмадныя ў змроку, і таму постаць Гайдаш выдае такой танюткай і кволай... І нейкія бліскучыя кропелькі ў яе па фрэнчыку, як прапалены ён наскрозь.

«Гузікі блішчаць! Гузікі блішчаць па фрэнчыку!»

Гэтае адкрыццё і, галоўнае, тое, што Гайдаш спяшаецца, імчыць бы па крылах, адразу супакоілі, і ён памкнуўся ёй насустрач.

— Цябе не адразу і ўгледзіш,— задыхана, стоеным пошапкам, прамовіла Гайдаш і плюхнулася побач на траву.— Напалохала, здаецца?

— Не, я пазнаў здаля: ты ідзеш.

— Я аб салоўках кажу. Бегла ж ці-іхенька. А вось жа бачыш — напалохаўся. За Быстрыцай, у рове, я іх наслухалася. Перад тым як чыгунку пераходзіць, я там цалюткі дзень і вечар адлежала. І анікуды не падаткнуцца — скрозь ці немцы, ці бобікі.

— А ты мне пра гэта не расказвала.

Яна ціха і шчасліва засмяялася:

— І ўчора — адно і тое ж ад цябе чула: «гэта ты мне не казала», «пра гэта не гаварыла»... Пакрысе ўсё ж прыгадваеш.— Твар яе быў змораны, а вочы нейкія як бы спалоха-

пыя.— Аб усім расказваць — на ўсё жыццё, мабыць, хопіць. Дакладней, на два: на тваё і на маё...

— А я ўсё пра адно думаю: адчайная ты галава! Брыгада не здолела прабіцца. Мы ледзьве жывыя выдраліся. А яна — адна. Ды шчэ — параненая.

— Я ж цябе прасіла: пра рану не нагадвай: загаілася яна, быццам на сабаку. Я даўно прыкмеціла: калі чалавек пра рану не думае, пра нешта важнае ў яго галоўны клопат, рана тая ў яго гоіцца дужа ж хутка...

— А ты пра што думала, калі адна засталася?

— Захар увесь час у думках быў. Дзе ён? Што з ім? Ці жывы?

Патыліца ў Захара напацела ад сораму; сорам быў радасны, і ўсё ж гэта быў сорам, і глядзець у вочы Гайдаш было няёмка. Як знарок, прымушае ён гаварыць аб ім, быццам не верыць ёй і хоча ў нечым пераканацца. А ён жа ўсё-ўсё добра ведае — учора, па гэтым вось месцы, але ўдзень, Гайдаш доўга і падрабязна расказвала пра свой цяжкі і гаротны шлях сюды, у лясы ля Дзвіны, у славуты трохкутнік, з якога атраду летась давялося пайсці, адступіць. Самалёт, аб якім казаў Ціхан Захару, не прыляцеў. На адвячорку фашысты прарваліся да партызанскага шпіталя, быў бой, і ўночы, адстаўшы ад сваіх, Гайдаш засталася адна. Пад раніцу яна выбілася да былой лініі абароны ля Суйскага возера і ў напаўразбураным выбухам снарада бліндажы пракачалася амаль з тыдзень. Потым яна блукала па начах, шукаючы брыгаду Гусарава. Захараўскі атрад яна не знайшла, аніводнага атрада з брыгады — таксама. Але пошукі не былі марныя: зусім выпадкова яна даведалася, што Захар павёў атрад за чыгунку, да Дзвіны. Дачуўшыся, паверыла адразу. Адразу ж і вырашыла: трэба і ёй ісці следам. Тыдзень яна правяла ля Вуглоў, у старых бульбяных ямах, дзе знайшлі сабе прытулак дзве вуглянскія куркі. Яйкі і кавалачак сухара на дзень — гэтым яна жыла. Потым — чатыры доўгія дні — у Пліґаўскім лесе. Метр за метрам, асцярожна, як звер, яна набліжалася да чыгункі, і памяць яе ўратоўвала: Гайдаш ішла тым жа шляхам, якім летась вёў Захар атрад з трохкутніка...

Усё гэта Захар ведаў. Дык чаго ж ён цяпер не хоча адкрыта глядзець у вочы Гайдаш? У чым ён хоча пераканацца? Сядзіць жа з ім побач чалавек, які зрабіў амаль немагчымае, прайшоў шлях, які ўявіць сабе цяжка: шлях ад смерці да жыцця. Так, ад вернай смерці яна ўратавалася. Прабілася сюды, да Дзвіны, і знайшла атрад! Цябе знайшла! А ты хоць разочак яе тут, ля Дзвіны, прыгадаў? Ды дзе ж там! Адзіны клопат тваё сэрца вярэдзіць усе апошнія дні: як пакарміць

людзей, як памагчы параненым, як дастаць патроны. Ты клапаціўся пра ўсіх, але ж і пра цябе людзі клопат мелі. А пра яе апіхто ж увесь гэты месяц амаль не паклапаціўся! Яна, гаротніца, адна-адзінюсенькая брыла, саслабеўшы і ад раны і ад голаду. І мара гэткая ж адзінюсенькая яе вяла — цябе, дурня, пабачыць!

Зноў, як і шмат разоў учора і сёння, ажыла ў памяці хвіліна іхняга расстання ля шпітальнай зямлянкі. Усё, аказваецца, у памяці. Нават тое, якія каляныя былі яе тады вусны...

— А я пра цябе думаў,— схлусіў ён і не адчуў згрызоты. Але хлусіць больш не адважыўся, сказаў шчыра: — Быў перакананы, што ты там, за фронтам.

— Гэта — лёс, як ні кажы.

— Я і сам не ведаю, што гэта за праява. Гусараў жа вось пра лёс не думаў, хацеў як лепш — ад «а» да «я» загад выканаў. Павярнуў назад, разлічваючы, што паспее за асноўнымі сіламі. А што атрымалася? Ты ведаеш хіба, якія страты ў атрадах? Жывых і палову не набярэцца.

— Можа, болей ацалела. Дакладна ж яшчэ невядома.

— Я пра іншае кажу. Я вось загад на свой лад выконваў. І што маю? Цябе стрэў. Жывую! Наш Багдан адно цвердзіць: шчаслівы лёс!

— А яму, між іншым, фартуна заўсёды ўсміхнецца. Учора ён, мяне ўбачыўшы, ледзьве не ў скокі пайшоў,— заўважыла, што гаворка пра Багдана не па душы Захару, дадала катэгарычна: — Але ў гэтае аторвы — не лёс на першым плане, а — хітрасць. У адпаведнасці з ёю і жыве, і дзейнічае.

— Да пары ваду збан носіць, як гаворыцца.

— Ты чуеш? Шуміць і грыміць. Можа, фронт ідзе ў наступ?

— Ідзе, ды не наш. На Другім Украінскім, перадалі пазаўчора, фашыст ірвануў у наступ.

— У наступ? — з жахам і недаверам выгукнула Гайдаш.

— Ну. Вялікія ахвяры панеслі, але ў нашу абарону ўкліпіліся. Нязначна, праўда. На Ленінградскім у нас добра. Баі пад Выбаргам.

— А на Беларусі — ні гу-гу. Дзіўна неяк. Лета пачынаецца, а фронт — спіць.

І жах, і цікавасць да падзей на фронце выглядалі штучнымі — Гайдаш, безумоўна, ведала аб падзеях на фронце, бо не магла не пацікавіцца імі ў Рымы, з якой правяла і ўчарашні і сённяшні дні разам,— і Захар разумеў, што яна хаваецца за гэтай гаворкай ад гаворкі іншай. Тады, пры развітанні пад бярозай ля шпітальнай зямлянкі, ён абяцаў ёй шмат, абяцаў, у прыватнасці, што пры сустрэчы — мелася на ўвазе, што

стрэпуцца яны, ужо як скончыцца вайна! — ён падрабязна расказа пра тое, аб чым думаў, калі яна, Гайдаш, пераправілялася за Дзвіну з калонай мабілізаваных: Хай вайна сабе ідзе яшчэ. Але ж яны стрэліся! Стрэліся ля Дзвіны! Дык чаго ж ён маўчыць? Маўчаў учора, маўчыць і сёння. Ха, чаго! Ён гэтак жа, як і яна, уцякае ад той гаворкі за словы нейтральныя.

— Ёсць і на фронце свае абставіны,— Захар працягваў гаворку, якая анічога ад яго не вымагала.— Іх можна зразумець. А вось іншае цяжка сцяміць. І Румыніі, скажам, і Венгрыі, і Фінляндыі было пасланне, каб з вайны выходзілі. А яны ўсе — маўчок. Ды язык — на кручок.

— Як у вароты іхнія малаціць пачнём, дык язычкі развяжуцца. Уга-а, як гаварыць пачнуць. І саюзнічкі нашы заспяшаюцца. Во ўжо накармілі нас абяцанкамі пра другі фронт. Сорак чацвёрты на дварэ! А яны — прымерваюцца.

— А я поўню бачу.— Захар глядзеў на лазнякі, за якімі, па той бок Дзвіны, акругліўся вялізны аранжавы дыск, падобны на вечаровае, без промняў, сонца.— А пад ёю — аблачынка. На самалёт падобная. Цьфу! — Захар ціха чартыхнуўся.— Усё, што на небе ўбачу,— на самалёт здаецца падобнае. Трэці раз просім, а ў адказ усё тое ж: паведамім, будзе груз,— кінуў каменьчык, які намацаў пальцамі, у затоку і глядзеў, як загайдаліся на цёмнай паверхні адбіткі белай кветкі.— Быццам срэбныя колцы на вадзе.

— А што, калі скупнуцца?.. Вада, напэўна ж, зараз цяплейшая, чым нават удзень. Я ўчора яшчэ гэта змысліла рабіць. Але адна не адважылася. Рыму клікала, а яна мяне аблаяла. Хаця, яе і зразумець можна: галава іншым ачмурана і зачмурана.

— Цікава, чым жа гэта галава ў яе зачмурана?

— Ты быццам і не ведаеш!

— Арцік?

— Здагадаўся ўрэшце,— і тут жа таропка, быццам мела намер апраўдаць свой папрок, дадала: — Ён раздражнёны. Знерваваны зрабіўся — не пазнаць. Я сказала яму: меней, маўляў, пра раны думай — хутчэй загояцца.

— Раны ў яго і сапраўды благія.

— Я б не сказала. Косць нідзе не зачапіла, асколачкі дробныя былі і неглыбокія — праз тыдзень-другі павінна загаіцца. Не саўсім, ведама, але ж хадзіць зможа,— і ўздыхнула ціха, не таячыся.— Яго не раны мучаць: смерць маці перад вачыма стаіць. Не проста гэткую бяду з розуму выкінуць.

— Ён і Траяна не можа забыць. Ля чыгункі, разумееш, Дзімка Артура ўратаваў. Паміж імі граната нямецкая шмяк-

нулася, і Траян яе к сабе падгроб. Ён закрыў Артура. Вось усё тое і вярэдзіць душу...

— А я тое поле пад Віцебскам зараз згадала. Памятаеш Балаша? Ён жа тады бінты паздзіраў зпарок, каб памерці, каб пам, жывым, пе замінаць.

— О-ох і зазлаваў я тады па цябе.

— Гэта пераджыць лёгка, што зазлаваў. А вось Балаш...

— Закоп вайны: пехта памірае і гэтым, сваёй смерцю, ратуе жывых.

— Змрочная ў нас з табой размова,— сумна заўважыла Гайдаш.— Але я дзіўлюся пе з гэтага, а з таго, пра што ты гаворыш. Нейкая жорсткая і я зрабілася. Гэтулькі людзей нашых загінула, і я іх добра ведала. А сэрца па іх як бы і не баліць, быццам загінулі яны даўно, мінула шмат часу, усё і імкліва неяк удаўпілася. Боль ёсць, але ж ён бытта прыгаснуў, не ўва мпе... О-ой, думкі ж і мае змрочныя.

— Бо вясёлага мала. Бяда ды бяда наўкола. А тут яшчэ сядзіш без патронаў. Усе ж доты напава абшукалі, усё перавярнулі — сотні са дзве знайшлі. Калі самалёт не скіне нам груз...

— Скіне. І ты гэта ведаеш.

— Хто ж ведае, што нас увогуле чакае? Я толькі не хачу пакуты. Калі ўжо мяжа, дык хай адразу — у сэрца. Гэтак хачу.

— А я — іначай.

— Іначай? — Захар не паверыў ёй шчыра.

— Да перамогі хачу дажыць — толькі гэта. Хоць адным вокам зірнуць, якое жыццё будзе. Людзі забудуць пра вайну. Гэтае слова ўвогуле з ужытку знікне.

— Хто ж яго ведае, як там і што будзе. Але адно я табе скажу дакладна: мы будзем адразу іншыя. Я пра гэта часта думаю.

— Крыху старэйшыя — вось і ўсё.

— Не-е! Зусім, зусім, думаецца, іншыя. Вось пабачыш.

— Здагадваюся, што за гэтым крыецца,— голас загучаў гулліва.— Пацалаваць мяне ты ўжо не захочаш.

— Яшчэ больш. І — мацней захачу.

— Ты тое гаворыш, як саюзнічкі — пра другі фронт: аніякай пэўнасці!

— Хочаш зараз і перакапацца?

Япа засмяялася ледзь чутпа, але ў прыглушаным, як рэха, голасе трымцела пасмешлівасць, бруілася радасць:

— І сведку запрасіў. Поўня ж на нас толькі і глядзіць!

— Япа — наш сябар. Апікому і слоўца пе скажа, павер.

— Ты — вар'ят,— голас загучаў цяпер ласкава і пяшчот-

на, і далонь, якой яна правяла па Захаравых бровах, была мяккая і цёплая.— І дужа ж стомлена выглядаеш.

— Адно і бачыш штодня: смерць, смерць, смерць... Тут, сапраўды, можна і з катушак далоў.

— Ты благое не прыгадвай,— далонь Гайдаш зноў праплыла па Захаравых бровах, на міг закрыла вочы.— Зусім не прыгадвай. І не зважай на тое, што мінула...

— Як скажаш, беражаначка мая, гэтак і будзе!

Захар абняў яе за плечы, моцна і рэзка прыцягнуў да сябе, і яна не адштурхнула рукі, сціснулася ў абдоймах, потым прыціснулася лбом да яго падбародка, і валасы яе рассыпаліся па Захаравым твары. Захар шаптаў нешта ласкавае, тлумнае і раптам адчуў, як штосьці цяжка бухнула ў грудзі, як гарачыня затухкала ў скроні; ашаломлены, прыгаломшаны, ён абвяў, змоўк. Ад валасоў Гайдаш ішоў пах дыму, мокрага попелу, нейкай незразумелай горкласці — гэтак пахне свежае, залітае вадой папялішча; самотная і тужлівая хваля, поўная горычы і адчаю, наплыла на сэрца, і Захар моўчкі выпусціў Гайдаш з абдымкаў, пакінуўшы толькі правую руку, нерухомую і абвялую, на яе левым плячы.

— Ты стомлены,— пошапкам сказала яна.— Табе трэба добра адпачыць...

— Не, нешта іншае. Незразумелае.

— Проста ўсё... Мы — яшчэ чужыя. І на тваёй душы — рана...

— Ты — мудрая... Дзіўна пахнуць твае валасы.

— Чым яны пахнуць? — яна засапла носам, прынюхваючыся да пасмы валасоў, якую зграбла рукой і трымала ля носа.— Праўдачка! Дымам! І нейкім паганым,— і ўсміхнулася, і смех пакаціўся, бы рэха, далёкім званочкам.— А-а, ведаеш, што гэта? Каніна. Чаславе дапамагала варыць, ля вогнішча разам стаялі. Амаль тры гадзіны на агні — не ўварылася. Толькі пену гоніць з вядра на вуголле — смурод з таго ў валасах і асеў.

— Каніна нас і ўратавала. Вёскі, што ад агню ацалелі, пустыя стаяць.

— Не спявае.

— Ад канінкі не заспяваеш.

— Салавей, кажу, аціх,— і зноў засмяялася ціхенька, і смех зноў пакаціўся званочкам.— Ты мне яшчэ даражэйшы зрабіўся, сівы мой саколік. І ты паспрабуй гэта зразумець: Кася — твая да скону. Да скону твая беражаначка. Хораша ты гэта прыдумаў — беражаначка.

— Аднойчы ты мне снілася.

— Цяжка табе было схлусіць? Сказаў бы, што часта снілася.

— Гэта раней, да блакады, той сон быў. Бытта ўяве. Прыдрамаў, помніцца, ля жытнёвага кліна, і ты сасснілася.

Ён разумеў, што хаваецца за гэтай гаворкаю ад сораму, які ніколі раней неражываць не даводзілася; разумеў, што Гайдаш усё патлумачыла па-свойму, толькі не прызналася, сказала словы суцяшальныя, а сама ставіцца да яго, Захара, з пагардаю, і таму пакутаваў невыносна. На нейкі міг завітала думка пра тое, што ён увогуле не зможа кахаць Гайдаш, не зможа з-за нейкай, пакуль што яму не зразумелай, прычыны, але якая застанецца з ім назаўжды, і дзіка спалохаўся, адсунуўся, потым сеў, абшчаперыўшы калені перакрыжаванымі рукамі.

Поўня ўзнялася вышэй, і яе густы аранжавы колер цяпер прарэдзіўся, быццам да яго дадалі белай фарбы, і ў затоцы пад пізкім супрацьлеглым берагам зазіхацела срэбрам вузкая доўгая сцяжынка. Мяккае зіхаценне вады не супакойвала, не ўлагоджвала, яно, зіхаценне гэтае, быццам пасмейвалася, біла па вачах, і яму раптам захацелася разбурыць яго, зламаць, сцерці і знішчыць.

— Палезу ў ваду. Скупнуся, як ты гаворыш,— і ён рашуча ўзняўся, крыху памарудзіў, працягнуў руку.— Пайшлі? Усё ліха з сябе змыем!

— Ты сапраўды будзеш купацца?

— Сама ж чалавека падбухторыла. А цяпер — спалохалася.

— Ідзі, ідзі! Смяльчак гэткі. Пагляджу на цябе.

— Паглядзі, паглядзі. Потым захочаш паплаваць — не пушчу. Ведай!

Захар ступіў на пясчаны бераг затокі, скінуў боты і ажно падскочыў — пясок здаўся дужа халодным. Ён сагнуўся, пабоўтаў у вадзе рукою — цёплая, як угрэтая. І пясок ужо зусім не студзіць ступакі. І, галоўнае, няма куды адступацца: Гайдаш, вядома, пачне пацвельвацца.

Захар ліхаманкава садраў з сябе надзяванку і шуснуў у затоку адчайна — даў пырца. На імгненне дрыготкія спазмы скруцілі ікры ног, потым агпяныя токі прайшлі па скуры, і ён выбіўся з глыбіні на паверхню. Радаснае ўзрушэнне ахапіла яго, і Захар узбуджана, але ціха паклікаў:

— Беражаначка! Бяры прыклад — не пашкадуеш. Затока маленькая, прагрэлася лепей, чым у Дзвіне,— як у лазні, вадзіца.

— Зацягнуць у вір змысліў?

— Ды адплывуся. Ідзі смялей. Памерці, як кажа Велікапец, заўсёды паспееш.

Ен адплыў ад берага, і Гайдаш асцярожна паблізілася да пясчанай палосы, сагнулася, памацала рукою ваду:

— Праўдачка! Цё-ёплая!

— Смялей, смялей!

— Слухай, смелы, ты на той бок плыві. А я тут памыюся. Памерай там дно. Ёсць?

— А куды яно магло падзецца? У-р-р-р,— і пайшоў стаяка ў ваду, потым выбіўся на паверхню, пакруціў галавой, форскаючы, бы конь.— Фу-у-ур-р-р... Глыбака толькі пасярэдзіне...

Затока была вузкая, і Захар, колькі разоў узмахнуўшы рукамі, пераплыў яе, адчуў пад нагамі пясчанае дно і стаяў, шаруючы твар далонямі. Ен чуў, як за спіной, ля таго берага, войкае, вохкае Гайдаш, уваходзячы ў ваду, потым адштурхнуўся ад дна і наўскасяк, сажонкамі, вярнуўся пад чаромхавае голле; рукою зачапіў ніжнюю галіну, і з яе пасыпаліся пялёсткі, загайдаліся на цёмнай, але бліскучай вадзе, паплылі.

— Ідзі сюды, беражаначка! Нечуванае дзіва — гэткая прыгажосць!

— Ты куды праваліўся? Голас чую, а цябе — не бачу.

— Тут, пад чаромхаю. І неба белае, і вада белая, і дрэвы белыя — у жыцці такога не бачыў аніколі.

— Там цямрэ-эча. Жахліва.

— Ды не, светла ж зусім.

Яна падплыла, трымаючыся, аднак, бліжэй да берага, спытала, здзьмухваючы перад сабой белыя пялёсткі на вадзе:

— А стаяць тут можна? О-ой, бачыш? Па самы гарляк вада!

— Бліжэй пад бераг станавіся. Там няглыбака... Бачыш, праўда ж мая. А зараз дзіва табе адбудзецца.

Ен зачапіў чаромхавую галіну рукой, патрос, і з высі густым сяйвом пасыпаліся дробныя пялёсткі. Цёмна-белы россып не знікаў углыбі, трымаўся на паверхні, і здавалася, што ваданазначана па ўсёй затоцы срэбнымі гузікамі і рыскамі.

— А над тым берагам і яшчэ прыгажэй. Паплылі туды, паглядзім, што там ёсць,— прапанаваў Захар і з трывогай чакаў яе згоды.

— Ты — першы. Я — за табою.

Ен плыў паволі, ціха заграбаў рукамі, баючыся бунтаваць чаромхавыя пялёсткі. Поўня цяпер была справа за галінамі, быццам асела на іх, і ад гэтага яе цяжару яны гэтак і схіліліся, аселі над вадой, і далей, углыбі, усё было яшчэ больш

таямнічае і загадкавае. Потым белы россып на вадзе парадзеў, радзела і голле ўверсе, а затока ўсё шырэла, і; урэшце, чаромхавая заглуш засталася ззаду. Злева і справа на пакатых берагах роўным шнурам стаяў малады бярэзнік, і кожнае дрэўца ля зямлі было белае, быццам дбайна і шчодра набеленае вапнаю ў камлі. Поўня хавалася за чаромхі, белыя шаты якіх быццам усплылі над вадой і злучылі, звязалі белым мостам берагі.

— Нібыта казка. Гэткае — ніколі не бачыла нідзе.

— І мне не даводзілася. Шкада, што адцвітае чаромха. Каб яшчэ на беразе забавілася, дык нічога б і не ўбачыла, беражаначка.

— Але пад чаромхаю ўтульней. Тут адчуванне такое, быццам ва ўсіх навідавоку. Вернемся...

Ён пагадзіўся, плыў хутчэй за яе, першы апынуўся пад чаромхавымі шатамі, намацаў цвёрдае дно нагамі, чакаў, пакуль надплыве Гайдаш.

— У вадзе значна цяплей. Ты заўважаш? — папытаў ён.— Плечы вось тырчаць з вады, дык ім і холадна.

Надплыўшы і стаўшы побач, яна сказала са згодаю, быццам за нешта дзякавала:

— Праўду гаворыш. І за гэтае адкрыццё заслугоўваеш узнагароды. Памы-ыю твой тварык,— і, зачэрпнуўшы вады ў прыгаршчы, мякка і ласкава пашаравала яму твар.— Будзеш у мяне чысценькі, прыгожанькі...

На плечы ёй насыпаліся чаромхавыя пялёсткі, і калі яна варушыла рукамі, пялёсткі пагойдваліся, і пагойдваліся пакатыя, у зыркіх бліскаўках ключыцы, і пялёсткі на іх былі падобны на колцы белага агню; з іх зрываліся тонкія, як стрэлкі, промні, яны асядалі ў Захаравым сэрцы, збіраліся ў гарачы пругкі камяк.

— До, до! Удачу змыеш. Падзяка і табе належыць — плечучкі адшарую...

Захар, смехам, наважыўся быў пашараваць ёй плечы і пацягнуў Гайдаш за руку; яна хіснулася, як валілася ўглыб, і ён падтрымаў яе, падхапіў. Гайдаш аказалася цяпер да яго тварам, які свяціўся ў белым змроку, быў увесь у дробных светлых плямках, быццам складзены з адных чаромхавых пялёсткаў; ён правёў рукою па яе шчоках, быццам зграбаючы тыя белыя плямкі.

— Усё,— дрогкім голасам сказала яна.— Я — на бераг!

Гайдаш выскачыла з вады, пачала апранацца, і Захар, раскінуўшы рукі ў вадзе і лянотна варушачы імі, бачыў кожны яе рух: надзела фрэнчык, павесіла дзягу на шыю, прычэсваецца, зламала галінку чаромхі, стаіць цяпер нерухома;

бліснуць спражка на рэмені, бы зорка над чаромхаю запалілася.

«Калі яна зараз мяне пакліча — ліха нас не зачэпіць. Жывыя будзем! Перамогу ўбачым!..»

Захар толькі паспеў моўчкі загадаць гэта, як ад чаромхі пачуўся патрабавальны, але з усміхам, голас:

— Гэ-эй, шаноўны купальшчык! А ці не хопіць у вадзе вам боўтацца?

— Іду-у-у!

Імкліва выбраўшыся з вады на бераг, Захар патупаў на адной назе, потым на другой, нахіляў галаву то на адзін бок, то на другі — вытрэсваў ваду з вушэй, потым ацёр далонямі грудзі і плечы, заганяючы кроплі. Апрануўся ён у адзін міг, бадзёра пабег на ўзвал, гатовы раўці на ўвесь свет ад радаснага ўзрушэння: ён адчуваў сябе мужчынам, моцным, добрым, і ўсёй гэтай дабрыні быў абавязаны жанчыне, якая стаяла ля чаромхі і пакорліва чакала яго.

— Бачыш, беражаначка, які паслухмяны купальшчык? — Захар ласкава абняў Гайдаш за плечы.— Слова сказала — ён ужо і тутачкі.

Яна пацерлася шчакою аб Захараву шчаку, прамовіла сарамліва, але з папрокам, і ў папроку гэтым гучала падзяка, захапленне і нейкая новая, упершыню ім ад яе пачутая, радасць:

— На цябе гледзячы, і я вар'яцець пачала. От жа неразумныя мы з табою... А каб там віп які? Пайшлі б на дно...

— Ха, беражаначка ты мая! Мне цяпер які хочаш вір — па калена! Якія хочаш віры мы цяпер з табою пераплывём,— прамовіў Захар, і ў яго душы ўсё мацнела пачуццё залілавапасці, любові і ўдзячнасці ёй, жанчыне, якая здолела не проста зразумець яго ва ўсім, а падтрымаць і ўзвысіць.— Ведаеш, што загадаў зараз, перад тым як з вады шуснуць? Паклічаш — жывыя застанемся. Толькі падумаў — твой голас! Клічаш мяне!

Ён прыцягнуў Гайдаш да сябе, пацалаваў у бровы, потым у губы, і рукі яе моцным замком спляліся ў яго на шыі.

— Ты што, Захарачка? — Гайдаш спытала радасным шэптам.— Ты што?

— Ты мая, беражаначка! — Захар цалаваў яе валасы ля вуха, ля скроняў, потым вочы і вусны і ўсё шаптаў, не разумеючы, што гаворыць і навошта.— Ты мая, беражаначка, на ўсе вякі. Ты толькі даруй, бо дурны я. Дурань самы апошні, усё пнуўся, каб ты надалей ад мяне была, надалей...

— А-а-о-ох, Захарачка! Дужа ж светла!

— Хай сабе. Ты і пры святле — мая. І без святла — мая. Ты гэта ведай! Веда-ай!..

Валасы Гайдаш пахлі чаромхаю, губы таксама пахлі чаромхаю, і зверху, з галінак, якія ён зачапіў рукою, сыпалася і сыпалася, не радзеючы, густое белае сяйво дробных пялёсткаў; Захар быццам ляцеў праз іх і ледзь не роў ад радасці, што ён з Гайдаш гэткі ж дужы, якім быў у маладосці. Ён галубіў яе ярасна, у адчайным шалу, усё закрэсліўшы і адкінуўшы, і яна нешта шаптала яму і цалавала моцна, адрывіста, як бы заціскаючы ў вусны чаромхавыя пялёсткі, і ён злізваў іх і глытаў, і хоць вочы яго былі заплюшчаныя, ён бачыў яе ўсю, бачыў яе валасы і вочы, бачыў белыя шаты чаромхі, якія амаль кляліся ім на плечы; рукі Гайдаш, хуткія, моцныя, быццам спляталіся з голлем чаромхі, і Захару здавалася, што ён з Гайдаш не тут, на зямлі, а недзе ўжо ўвысі, над чаромхаю, і белая тонкая хваля зыбае і нясе іх у белую зіхатлівую прастору...

Спакваля, марудна вяртаўся Захар з тае дзівоснае прасторы і зноў, як бы нанава, адкрываў свет вакол сябе. Некуды знікла поўня, сцямнела чаромха, голле яе як бы адскочыла ўверх. Гайдаш, невымерна родная і блізкая, была побач з ім, сцішаная, маленькая, і яна як бы злілася з ім, і ён чуў яе затаволенае дыханне. Потым ён пачуў гул самалётаў, заварушыўся і асцярожна, каб не адштурхнуць Гайдаш, сеў:

— Самалёты. Чуеш?

— Дужа далёка,— сказала яна ціхім, як бы санлівым голасам і заварушылася, умошчваючы сваю галаву на яго каленях.— Можа, да нас?

— Не-е... Бачыш, бачыш? Туды, за Дзвіну, глядзі!

Далягляд за ракой, схаванай у цемры за лазнякамі, раптам пыхнуў малінавым святлом, яно паўзло на неба, усё выразней высвятляючы зубчыкі блізкага лесу, потым шырокія, цаглянага колеру штыкі рванулія праз гэты водсвет, разадралі яго, стаичэлі і выгнуліся злавеснай агнянай дугой; дуга была няроўная, яна то западала па зубчык цёмнага лесу адразу ў розных напрамках, то лезла ўгару пакручастымі стужкамі, быццам з чорнай высі нехта цягнуў іх нябачным, але трывалым дротам; крыху спагадзя, з таго боку даляцеў зглушаны глыбінны грукат.

— Ці не фронт гэта рушыў,— атарапела прамовіла Гайдаш і ўскочыла, пацягнула Захара за руку.— Не, гэта ж зусім блізка ад нас. Мабыць, горад самалёты нашы малоцяць.

— І горад, і станцыю, і ўсё разам — Полацк жа якраз дакладна ў тым баку. Спачатку ракеты асвятляльныя павесілі. А тады — бомбы пайшлі.

— Горача тамака фрыцам. Забач, што дзеецца! Неба — у агні.

— Трэба ў лагер хутчэй,— ён таропка ўзняў з зямлі рэмень з цяжкім парабелумам, зашпіліў спражку.— Можа, шукаюць мяне.

— Ніхто нас не шукае. Але ісці — трэба,— і дадала цвёрда, як бы менавіта ёй трэба было ўсё вырашаць: — Ты — у штаб. А я — у першую роту. Там буду.

— Чаго гэта? У першай — Часлава ёсць.

— Мы ўжо з ёю дамовіліся, толькі я табе сказаць не паспела. Я цяпер у першай роце буду. А яна — у другой. Часлава бліжэй да штаба хоча. Мы з камісарам ужо гаварылі...

— А я хачу, каб ты бліжэй да штаба была. І, зрэшты, не табе гэта рашаць,— перапыніў ён яе і адчуў, што хлусіць, што рашэнне, якое прыняла Гайдаш, яго не толькі задаволіла, але і выклікала незразумелую палёгку, і ён, злуючыся на тое, што сам даў жыццё сваёй хлусні, дадаў, нагнаўшы ў свой голас жартоўнай строгасці: — Раскамандаваліся, ведаеш, без мяне. Камандзір атрада рашае, каму і дзе знаходзіцца.

— Гэтак лепей будзе, Захарачка, павер мне!

— З чаго ты ўзяла?

— Баюся.

— Каго? Мяне?

— Заўтрашняга дня. Пры дні ўсё будзе іначай. І гэтага я і збаялася,— і нечака́на зноў, бы далёкае рэха, загучаў у яе голасе званочак: — А потым ты прыедзеш. Хіба ж далёка? А гукнеш — я і сама сюды прыбягу... Толькі не заўтра, прашу. Хай міне дзень, другі...

— Гаворыш абы-што!

— Абяцай, што зробіш так!

— Знайшоў цябе, каб згубіць?

— Ды не згубіцца твая беражаначка... Ну, добра, добра, не злуй... Паслязаўтра тут, ля чаромхі нашай, спаткаемся. Увечары. Згода? Як толькі ацямнее. Абяцаеш?

— Абяцаю... Калі ўжо ты з глузду з'ехала. А зразумець — не магу.

— А вось гэта, каб зразумеў,— і парывіста ашчаперыла Захараву галаву гнуткімі халаднаватымі рукамі, гэтак жа, як баючыся, што страціць, парывіста абцалавала яго твар, на міг сцішылася ў яго на грудзях і потым імгненна, як вавёрка, адскочыла, кінулася прэч і як растала ў зыбкім белаватым святле, што ўхутала зямлю.

Непадалёк, ззаду за спіной, у лазняках ля Дзвіны, білі каленцы салаўі, спявалі зацята, як бы выхваляючыся адно

перад адным, і Захару зрабілася змрочна і пагана ад адзіноты, творцаю якой быў ён сам. Чаму не затрымаў Гайдаш? Чаму дазволіў ёй прыняць рашэнне самастойна? А-а... Як сабе самастойнасць — дык ты з Ціханам чубіцца быў заўжды гатовы. А як ёй, Гайдаш? Ціха, ціха... Ніякая тут не самастойнасць прычынаю! А што, калі сэрца Гайдаш учула тую нечаканую палёгку, якая нарадзілася ў тваім сэрцы? Мана гэта, падман гэта — палёгка нейкая!

«Яна хоча ўберагчы мяне ад плётак... Ад размоў розных непатрэбных уберагчы...»

Гэтак, толькі гэтак трэба ўсё разумець! Тхнула зноў да сэрца радасць, якая толькі што была перажыта ім, і ён зразумеў, што гэткую радасць панесла ў сваім сэрцы і Гайдаш, і ледзь стрымаў сябе, каб не кінуцца следам, вярнуць, пераканаць, што яна памыляецца, што не трэба яго берагчы ад нейкіх непатрэбных людскіх размоў, ад нейкіх плётак.

«Навошта ж нам хавацца? Не будзем мы ад людскіх вачэй хавацца анікуды і аніколі!..»

Захар ішоў, і пакрысе да яго пачала даходзіць нерэальнасць таго, што ён убіваў сабе ў галаву. Але цвёрда стаяў на сваім, лічыў, што не яна, а вось гэтае ягонае рашэнне самае правільнае і патрэбнае. Але цвёрдасці ўсё ж у гэтай выснове не было, і не было цвёрдасці ў хадзе, і ногі ступалі асцярожна, быццам намацвалі сцежку, што вяла да лесу. Ён ішоў, і ўвесь час па левую руку ад яго, то ўзвышаючыся да высокай пранізлівай ноты, то амаль заціхаючы, каб зноў набраць грымлівую вышыню, марудна пагойдвалася рэха выбухаў; потым кананада наблііжалася, трэсла начное паветра, і ад яе, здавалася, хістаецца ў небе бела-жоўтая поўня, дугаецца малачковая тканка на цёмным узлеску, які выплывае насустрач Захару, і скрозь трымціць у доле зіхатлівая, з алавяным адлівам, густа пакропленая расой, маладая трава.

## 24

Артур хмыкнуў, зыркнуў ваўкавата, рашуча адсек Захарава запытанне, у якім была толькі цікавасць і спагада, і голас задрыжаў ад хвалявання і абурэння:

— Вас што цікавіць, таварыш камандзір? Мае раны? Ці тое, як група выканала заданне?

— І першае. І другое,— пачаў быў Захар, але, прыгледзеўшыся да начырванелага ад крыўды Артуравага твару, сказаў прымірэнча: — Але болей — заданне. А яго твая група выканала выдатна. Звесткі каштоўныя.

— Вось аб іх і распытвайце!

Захар быў у добрым настроі. Уночы прыляцеў самалёт, скінуў два кантэйнеры — патроны, гранаты, узрыўчатку. Толу, праўда, малавата, затое аўтаматных і вінтовачных патронаў амаль удвая больш таго, што прасіў і на што разлічваў Захар. Цяпер з добрымі весткамі вярнуўся Артур: мост на гравійцы, ля якога Яшткін хоча зрабіць засаду — выйсці ўсім атрадам! — удзень не ахоўваўся. Значыцца, удзень трэба там і засесці. Адно толькі блага: ніяк не ўтрымаеш Артура ў лагеры — на кожнае заданне з групай ірвецца, не хоча, каб хто-небудзь іншы камандаваў групаю. Ды ніхто ж у яго камандаванне гэтае і не збіраецца ўзяць. А хочаш ты ўтойваць, што раны яшчэ не зусім загаіліся і набольваюць? Утойвай! Сабе ж горш зробіш!..

— Дзе ў вас Кушлікі былі, як вы ад дарогі ішлі? Справа? Ты кажаш, што справа? — спытаў Захар дзелавым тонам, падумаўшы пра тое, што гэтая акалічнасць — зноў Артур групай камандуе — лепшыя лекі, магчыма, для такой гарачай натуры.

— Ну!

Кінуўшы гэтае адчэпнае «ну», Артур паглядзеў на Захара з недаверам. Чаго гэта камандзір атрада імгненна перамяніўся? Ды не, без падробкі, здаецца, гаворыць, натуральная цікавасць. Але тое, што ён, камандзір групы, даў належны адпор — не пашкодзіць, хай ведаюць: ён і за сябе, і за групу сваю пастаяць зможа. І камандзір, здаецца, гэта добра сцяміў.

— Што яшчэ незвычайнае прыкмеціў? — Захар спытаў з усмікам, бо заўважыў, што Артур уважліва слухае несціханую кананаду, што грыміць, здаецца, наўкола лесу.— Ля Дзвіны канапада чуваць?

— Гэткага яшчэ не было. Ля асакі нахілішся, дык трымціць вада, здаецца.

— Хай фрыцы слухаюць, як трымціць. І — калоцяцца, адпаведна. Нам — сваё рабіць. Справа мост, значыцца?

— Ну.

— Ну ды ну — баранкі гну. Ты месца пакажы.— Захар дастаў з сумкі трафейную карту-кіламетроўку, складзеную квадратам.— Вось шаша. Чорныя рыскі — мост. Зялёныя — бярэзнік.Ахова дзе сядзела ўночы?

— Здаецца, тут.

— А калі без «здаецца»?

— Тут вось.— Артураў палец закрыў чорныя рыскі і палову зялёных.— Ужо добра развіднела... Сонца паказвалася, калі я папоўз адтуль.

— Чаго ж папоўз? Ты ж казаў, што мост удзень не ахоўваецца.

— Ахова пайшла, а тады і я папоўз. Навошта ж вытыркацца? І дрэвы, кажуць, вочы маюць.— Артур нечакана пакруціў галавой, аблізнуў абветраныя, парэпаныя губы.— Мяса варaць,— і, заўважыўшы, што Захар ускінуўся на яго позіркам, патлумачыў: — Смачным, кажу, пагыхнула. Мяса ў лесе варaць, напэўна.

—Хочаш есці? Хаця, чаго ж я пытаюся.

— Аб учарашнім абедзе. Згаладаліся. Хлопцаў я паслаў есці.

— Бяжы і ты падсілкуйся. І заставайся пры штабе. Магчыма, спатрэбішся неўзабаве.

— Загадана вярнуцца. Адразу пасля дакладу. Камроты загадаў.

Захар сказаў лагодна:

— Яму — паведамяць. Дарэчы, ты чуў пра другі фронт? Адкрылі саюзнікі, урэшце.

— Рыму бачыў — яна сказала. Спахапіліся, калі пірог на стале пакроены. Лоўкія саюзнічкі.

— Ну, ідзі, міністр замежных спраў,— пажартаваў Захар.— І паспяшайся, бо да пустога катла падскочыш. А як паясі — адпачывай. Твая група, магчыма, сёння спатрэбіцца...

Захар ведаў, калі і навошта яму спатрэбіцца Артурава група, і не хацеў адсылаць яго ў роту. Завітала на міг думка: ён, Захар, павінен зрабіць тое, што ў яго сілах — паберагчы Артура, не пасылаць яго болей на рызыкоўныя і небяспечныя заданні. Думка пакінула ў душы непрыемную горыч — прыгадаў, як Часлава пазалетась ірвалася ісці з калонаю мабілізаваных за лінію фронту. Гэтак жа і ён, Артур, асабліва цяпер, пасля трагічнай і жахлівай смерці маці, ірвецца ў самае пекла, не можа ўседзець на месцы, утойвае ўсяляк, што не ўсе раны загаіліся. А калі даведаецца, што хочаш яго схаваць падалей ад бяды,— крыку будзе, аніякі загад твой ён не выканае, сваё будзе гнуць. І атрымаецца так, што ён, Захар, яшчэ горш зробіць.

Захар зазірнуў у пусты будан, потым рашуча залез у яго, вырашыўшы крыху паспаць пасля ночы, якая прайшла без сну — зноў былі разам з Гайдаш ля Дзвіны і рассталіся на золку. Лежачы цяпер на яловых лапках, засланых трафейнай плашч-палаткай, ён марна спрабаваў заснуць: вуха ўвесь час лавіла ў глыбі зямлі несціханы далёкі гул — недзе далёка лютавала на зямлі смерць.

«Перад смерцю мы ўсе роўныя...»

Згадалася гаворка з Ціханам, і думкі пайшлі ў звыклым,

знаёмым напрамку. Чаму Ціхан ані слова не перадаў ухвалы яму, Захару, за гэты рэйд? Сюды, да Дзвіны, прабіліся толькі яны, захараўцы, і атрад на-ранейшаму баяздольны! А што замест падзякі? Кароткі загад, які прыняла Рыма ўжо тут, у старым лясным лагеры: «Заставацца на месцы. Дзейнічаць адпаведна. Паведаміць адрас бацьку».

Шмат паламаў ён галаву, нават паспрачаўся з Юршам і Яштокіным, спрабуючы дакапацца да асноўнага і нэўнага сэнсу ўсяго загаду. Апошнюю, трэцюю, частку ён зразумеў адразу ж і выканаў дакладна. «Бацьку» — аператыўнай групе пры штабе фронту — паведамілі каардынаты, папрасілі прыслаць патроны, гранаты, узрыўчатку: тут, у трэцяй часткі загаду,— асабліва цяпер, калі самалёт дакладна скінуў груз! — усё было зразумелым. Дзве ж часткі давалі абсяг для развагі і меркаванняў самых розных. На якім месцы заставацца? Як гэта дзейнічаць — адпаведна? Дакладных адказаў ён не знаходзіў, сумненні, якія прараслі ў душы, таіў ад усіх. Часам пачынала здавацца, што ён увогуле дзейнічаў неразумна. Была ж магчымасць і ў яго, Захара, прыняць гэткае ж рашэнне, якое прыняў Гусараў! І, можа, каб ён тое зрабіў, інакш склаўся б і лёс брыгады і Гусарава? Каб ён, Захар, ударыў з фланга, прыкрыў адыход Гусарава... Не, не было ў яго такой магчымасці: рашэнне за яго прымаў Веліканец. Дакладней, не прымаў, а дакладна выконваў загад, які ён, Захар, аддаў перад пачаткам бою: рухацца толькі наперад. Цяпер жа быццам усё склалася няблага: атрад дыслацыруецца ў знаёмых мясцінах, да яго далучыліся групкі з іншых атрадаў, якім пашчасціла прасачыцца праз варожую абарону і таксама выйсці сюды, у лясы на левы бок Дзвіны. Цяпер, калі паглядзець на ўсё здаля, дык ён, зрабіўшы гэты дзёрзкі прарыў, апынуўся па-за блакадным колам, за спіною ў тых, хто цягнуў блакадны невад па партызанскай зоне. Дык чаго ён ірве сабе душу нейкімі дурнымі сумненнямі! Гайдаш? У думкі аб ёй ён нічога і нікога не пусціць: гэта — святое! І ён не павінен болей даваць волю сумненням іншым, ён абавязаны адкінуць іх адразу і цалкам: тое, як ён зразумеў першую і другую часткі загаду, мепавіта і ёсць адзіна правільнае, як і трэба было разумець! Ціхан жа казаў, каб не кіраваўся інструкцыямі, прымаў самастойныя рашэнні. Вось ён іх і прымае, робіць усё такім чынам, як лічыць правільным. Ён! Каб жа! Ён ужо даўно адмовіўся ад таго, каб толькі самому рашаць лёс атрада: ёсць камісар, ёсць начальнік штаба — з імі лягчэй.

Зглядзеў Юршу, які кіраваўся ў гэты бок, да Захара, але ішоў марудна, час ад часу спыняўся, услухоўваўся ў несці-

хапую канападу — цяпер яна быццам памацнела і пашырылася,— і палез з будана. Не заспеш. І есці захацелася. Дзіва што: не спедаў жа сёння.

— Артур-ткі праўду казаў,— прамовіў Захар, калі Юрша наблізіўся і сеў ля сасны, грузна прыхінуўся да тоўстай жардзіны, зачапіў рукою дах будана; будан загайдаўся.— Абернеш мне хату!

— Да перамогі дажыве неяк. Не бядуй. Дык якую табе праўду Артур казаў?

— Смачным ад ручая цягне — гэта казаў. Дыму не відно — водар толькі гоніць ад вогнішчаў. Мяне гэты водар і вытурыў з будана.

— А я быў думаў, што мне насустрач камандзір лезе! Усё роўна: гарачанькага ўхапіць не пашкодзіць. Невядома шчэ, які дзень будзе — грыміць жа незвычайна.

— Здаецца мне — фронт рушыў. Але чаго наша разведка нічога пэўнага не гаворыць? Чаго рух на дарогах той жа?

— Натуральна. Нечаканым гэта будзе і фрыцам, і нам з табою.

— Скажа-аш,— працягнуў Захар і ўзяўся разглядаць бот на левай назе, які патрабаваў неадкладнага рамонту.— Кожны ранак з думкаю пра тую нечаканасць і прасынаешся.

— А пачнецца — нечакана. Вось пабачыш. Здаецца, яно і пачалося.

— Калі твая праўда — з мяне паўлітэрка.

— Сёння нават з Давіда напарстка не выцыганіш. Жабракі нашы гаспадарнікі.

— За мной, як за царом: не прападзе. А пакуль што — пайшлі канінкаю закусваць!

Захару карцела апынуцца сярод людзей, пачуць нешта новае, добрае — настойлівасць Юршы пачала пераконваць яго, што зрушыўся, пайшоў у наступ фронт. Ведаў, што апіякіх пацверджанняў гэтага ля вогнішчаў не дачуецца, але ўпэўненасць ужо жыла, і ён з надзеяй услухоўваўся ў далёкую магутную канападу.

Выйшлі на ўзлесак, і ад яго праставалі напрамкі праз вузкую лапіну поля, і па сцежцы, што вілася пад старымі вольхамі, спусціліся да ручая. Унізе, ля самай вады, гарэлі два вогнішчы, моцна патыхала едкім смуродам падгарэлага мяса. Але дыму амаль не відно было, ён расплываўся па густой заглушы адцвіўшай чаромхі і лазнякоў.

— Разумна Падрэз прыдумаў — па схіле ручая вогнішчы раскладаць,— сказаў Юрша.— У лесе дым не схаваеш, а тут — бы вадою разліецца. Смурод, аднак, у нос дае добра.

— Дарэмна яны мяса смажаць. Лепей — варыць.

— Яны яго і вараць. Праўда, пена гарыць па вуголлі. Мяса гэтае і гадзіну і дзве варыш, а пену — гоніць і гоніць. Як з аднае пены тое мяса.

— На смак — няблага,— голасна, каб чуваць было і ў чаромхавай заглушы, прамовіў Захар.— Учора мяне Хакім частаваў — пальчыкі я аблізваў.

— У Хакіма — свой метад. Ён варанае не любіць.

— А конь — худы, карослівы... На яго глядзець моташна было.

Юрша сказаў з усмешкаю — прыгадаў вясёлае і добрае:

— Санько сёння ранкам усіх пасмяшыў, Хакіма перадражніваючы. «Каня пакушал — сам рысаком па-абежал». І — рогат. А канінку аплятаюць будзь здароў!

На вузкім каменным перакаце пазвоньвала вада, і Захар нахіліўся, памыў твар. Спытаў, шаруючы рукі:

— Хакім кулямётчыкам у Веліканца. Ты пра яго гаворыш?

— Ну. Двойчы ўцякаў з палону. За трэцім разам толькі пашэнціла. А я толькі тут пра тое дачуўся. Цяжкі ў яго лёс.

Захар сказаў з выклікам:

— А ў нас — лёгкі. Ды на вайне, калі не туляешся нідзе, лёгкага лёсу няма. Ведаеш, хто гэта сцвярджае?

— Хто б ні сцвярджаў, але яно — гэтак. Аднак жа ёсць і яе вялікасць удача. У яе я веру.

— У яе, ведаеш, лягчэй верыцца, калі пад'еў добра, дыскі патронамі набіў. А ў кішэнях — граната адна ды другая. Чакай, вяскоўцы чаго тут? Вырашана ж, вяскоўцы — каб у лесе.

— Тут — вада побач. Яштокін параіў з лесу сюды перабірацца ўсім. І зямлянкі ў схілах лягчэй рабіць,— і дадаў з развагаю, быццам развражаў сам-насам: — Неяк вось чалавек болей не да лесу, а да зямліцы хінецца, да поля: яно і корміць, і затуліць, і ад бяды ўратуе...

У крутых схілах ручая, часцей у вымоінах, пад тоўстымі і рудымі, як мокрыя вяроўкі, каранямі дрэў шарэлі, надобныя на норы, схованкі. Было задушна, нават горача, у паветры вісеў несціханы людскі гармідар, але ішоў ён здаля, з-за глухой чаромхавай сцяны. Зямлю, траву, асабліва каменне, што густа вытыркалася з вады, густа пакрапілі белыя пялёсткі. Старая лазіна, сагнутая як не дугою, з абламанымі галінамі, была абвешана кашулямі са зрэбіны, нядаўна памытымі; на макавіне дрэва сушыліся біпты, скрозь у застарэлых плямах, якія і не адсціраліся. Там-сям горбіліся неахайна паскіданыя, быццам непатрэбшчына якая, хатулі — звязаныя крыж-накрыж посцілкі, коўдры, нехта нават напакаваў, як

торбу, старую палаплецую гімнасцёрку, звёўшы вузлом рукавы.

Дзіўна зашыла сэрца. З чаго гэта? Хіба мала ён, Захар, пабачыў за вайну гэткіх хатулёў? Бачыў ён іх і ў гразі пад дажджом, пад сонцам у пыле дарогі, пад ялінамі і соснамі, на траве ўзгоркаў, у ямінах ад бомб і снарадаў, на купінах у багне, на зялёнай руні, у разорах бульбяных палеткаў, на прыступках здзічэлых хат... Чаму ж цяпер непрыемна ные і ціспе сэрца? А-а, дужа ж знаёмая гімнасцёрка, напакаваная, бы мех. Яе недзе бачыў таксама...

У вушах тонка пазвоньвала, быццам пехта за спіною барабаніў у пустое вядро, і Захар азірнуўся наўкола. Можа, гэта толькі з ім такое творыцца?.. Не, утаропіўся нечага і Юрша ў адну кропку за лазіною, сціснуў вусны. Што ён там згледзеў? А-а, на Падрэза глядзіць. Падрэз гэта і барабаніць. А ён, Захар, быў ужо і спалохаўся: кепскае нешта са слыхам адбываецца.

Падрэз сядзеў на кукішках ля вогнішча, акантаванага вострым і доўгім каменнем, і сам быў падобны на граніт, што вылузнуўся з зямлі — не адразу і прыкмеціш чалавека. Камяні былі нахілены ў бок агню, і на іх шчыльна прыціснуліся адна да адной дзве нямецкія каскі, у якіх варылася капіна. Рудая наздраватая пена густа пузырылася, і Падрэз увесь час збіваў яе, пастукваў лазовым кійком па задымленых краях касак, скідаў пену на агонь; вуголле сіпела, попел узнімаўся над вогнішчам і асядаў на пенных кучомках у касках.

Захар пажартаваў уголас:

— Згатавалася баранінка?

— Чорт бы іх драў, каскі іхнія нялюдскія.— Падрэз глуха вылаяўся.— І самі нелюдзі, і каскі такія ж. Як ні паставіш — набок кладуцца.

— Следам за галовамі, мабыць, на якіх некалі красаваліся. Галовы ўжо ў зямлі, дык і каскі туды ж хінуцца.

— А хай бы яны ўжо ўсе тамака апынуліся. Даўно час!

Падрэз ушчаміў гузаваты, абпалены на канцы, лазовы кіёк у расколіну паміж камянямі, выцягнуў з карычневага футарала на рэмені кароткі цясак і лоўка выхапіў ім з рудой пены кавалак чырвонага, як пафарбаванага, мяса. Седзячы нязграбна на кукішках, ён паклаў яго на пляскаты, чорны і блішчасты камень, нядаўна абмыты вадой, і пачаў кроіць капіну на доўгія лусты.

Захар сеў побач на абымшэлы граніт, сачыў за яго рупнымі і ўвішнымі рухамі. Здаецца, гэтым цесаком Падрэз кроіў сала, калі Захар прыязджаў на адведкі да параненага Артура. Гэткімі ж доўгімі лустамі, як зараз мяса, кроіў тады Пад-

рэз не дужа тоўстае, але густа насыпанае кменам, ружаватае на зрэзе сала.

— Налаўчыліся вы кухмарыць,— ухваліў Захар Падрэзаву ўвішнасць.— Зірнеш на лустачкі — слінкі і пацяклі.

— Бяда навучыць.

— Калі кацялок поўны — ад бяды можна бараніцца,— зазначыў Юрша і паварушыў пепу лазовым кійком. Зачапіў каску, яна адразу нахілілася; вуголле засіпела.— Навука, выяўляецца, з гэтым прычындаллем.

— Навука немудроная. Дайце кія...

Падрэз хутка і лоўка паправіў каску, зноў узяўся кроіць мяса. З-за чаромхавай заглушы, як з-пад зямлі, выкаціліся тры дзяўчынкі, басаноож, у доўгіх, з чужога пляча, сукенках. Падрэз кожнай з іх даў па тоўстай мясной лусце. Дзве дзяўчынкі прагна ўчапіліся зубамі ў мяса, завурчалі, засаплі і зніклі за чаромхаю, трэцяя ж засталася стаяць на месцы, трымала мяса ў руцэ, але не ела, як бы нечага чакала.

— Чаго ж не ясі? — спытаў Захар, беручы з Падрэзавых рук кавалак мяса. Адкусіў, пачаў жаваць і, заўважыўшы, што дзяўчынка па-ранейшаму стаіць ля вогнішча, як не адважваючыся есці, паўтарыў ласкава: — Чаго ж не ясі? Даволі, скажу табе, смачна...

— Баліць,— сказала дзяўчынка, але не румзала, вочы яе, сінія, поўныя адчаю, глядзелі немігатліва, з папрокам.

— Зубкі ў яе баляць,— патлумачыў Падрэз і нахіліўся да дзяўчынкі.— Жаваць не трэба, Волечка. Ты асцярожненька, як я цябе вучыў, высмоктвай. Вось гэтак,— ён паклаў лусту мяса ў рот, зачомкаў губамі, гучна, са смакам.— Чам-чам-чам... Давай яго дробненька пасячом,— і хуценька пасек мяса, спляскаў цесаком у блінец, падаў яго дзяўчынцы.— Ад мяса — сіла ў чалавека. А сіла будзе — не прападзеш...

Мясная аладка — дзяўчынка паклала яе ў рот — была такога ж колеру, як і губкі, і здавалася, што ў малой замест рота адзін суцэльны чырвоны камяк, адцепены хваравітай беллю шчок. Ад горкага, зусім дарослага адчаю ў дзіцячых вачах Захару зрабілася ніякавата, і ён апусціў галаву.

— А-ах, бараніпка мая, бараніпка,— нараспеў працягнуў Юрша, ірвучы зубамі цвёрдае валакністае мяса.— Ад гэтай баранінкі мы будзем гойсаць — аніводны фрыц не ўцячэ ад нас.

— Можа, злаўчыцца і ўцячэць. Але ўжо нас — не дагоніць,— Падрэз хмыкнуў.— Але ж няма куды гайсаць...

— А навошта табе гайсаць? Сядзі ля вогнішча, бараніну ўварвай. Навучыцца і ў Хакіма не лішне — ён жа яе сма-

жыць. І няблага, між іншым,— зазначыў Юрша, як не заўважыў Падрэзаву шпільку.

— Смажыць ці варыць — доўга тут не наседзішся!

— Ранавата, Мікола Пятровіч, цікавацца узяўся. Доўга сядзець тут не давядзецца. Чуеце, як грыміць? Гэта — воля! Гэта нашы франтавічкі ім, паразітам, зубы крышаць!

Захару было прыкра і няёмка. Навошта Юрша гаворыць агульныя словы? Каб не маўчаць? Ці хоча падбадзёрыць Падрэза? Але ж Падрэз, безумоўна, не мае патрэбы ў гэтым. Ён жа не Волечка! А можа, ён толькі на тое і гаворыць, каб яно, гэтае дзяўчо, чула яго словы, каб ведала, што трэба спадзявацца на добрае, што яно, гэтае добрае, ужо блізка?..

Гаротная сінеча пакуты, убачаная ў дзіцячых вачах, якія ніколі нідзе не страчаў раней, прыгнятала, асела ў сэрцы незразумелым і крыўдным папрокам. Сказаць што-небудзь ласкавае, каб малую суцешыць? Паабяцаць, што доктар неўзабаве залечыць ёй зубкі і яна зможа без болю есці, есці не гэтую смярдзючую каніну, а добрыя прысмакі, зможа вярнуцца ў сваю хату, заснуць у сваім ложку?..

«А дзе тая хата? Дзе той ложак?..»

У нос дало чадным смуродам, і Захару на міг уявілася, што ён стаіць на папялішчы роднай хаты, стаіць уночы і гэта не вада булькаціць справа на камяністым рэчышчы, а шапаціць вясновы дождж у голлі клёнаў, нудна покае па чорным квадраце, што застаўся ад былога жытла. Мроя была выразная, але бачылася ўсё неяк здаля, і ў сэрцы боль таксама быў далёкі, быццам усё тое, што раптоўна памроілася, адбылося не з ім, Захарам, а з кімсьці яшчэ, і цяпер ён толькі глядзіць на тое, што некалі казаў яму невядомы чалавек.

«Я пачынаю забываць сваіх...»

Выснова была ашаламляльная, ён упершыню адчуў у сваёй душы жорсткасць, якая была яму непадуладна, не разумеў яе, злаваў не на тое, што гэтую жорсткасць не можа ўтаймаваць, а на яе, саму гэтую жорсткасць, вінаваціў толькі яе.

«Дзеля чаго прыгадваю? Навошта крэмзаю сэрца сабе?..»

На нейкую хвіліну ён адчуў сябе настаўнікам, адчуў сябе чалавекам, які стаіць перад вучнямі і змушаны перакапаць іх у тым, што яны нешта зрабілі благое, павінен казаць пра тое словамі даходлівымі, каб яны пераконвалі, суцяшалі, павінен перакапаць не папрокамі, а дабрынёю, пяшчотаю, выключным высакародствам.

Ён ведаў, што гэта мроя, а рэальнасць — вось яна, дзяўчынка; ведаў і тое, што ў яго няма суцяшальных слоў, і, ведаючы, не хацеў, дакладней, баяўся, зноў убачыць адцененыя

хваравітай беллю шчокі. Аднак, наўпярок усяму, пачаў марудна ўздімаць галаву. Убачыў і шчокі, і худзенькія плечучкі, слабенькія рукі, і тонкія ножкі, на якіх, вышэй шчыкалатак, скура чырванела, нашараваная, відаць, крайчыкам доўгай, з рубцамі, сукенкі, мокрай понізу, і ля гэтай чырвонай меткі колцамі збегліся гузы ад камарынай заедзі, а ніжэй, да самых ступакоў, яны былі чорныя, як зямля, пазбіваныя, паабадраныя, са струпамі спёклай крыві па пальцах.

Захар на міг зморужыў вочы, потым адкрыў іх. Дзяўчынка знікла, толькі гайдаліся чаромхавыя галінкі ў Падрэза за спіной.

— А дзе дочка? — вырвалася няпрошанае здзіўленне.

— Бытта вы не ведаеце! — Падрэз махнуў цесаком, як зразаючы кучомку пены, што ўзнялася над каскаю.— Дочка мая далёка, у сорак першым засталася жыць... Кветкі дзяўчаткі на лузе збіралі, а фашыст — па іх з кулямёта. Нізенька самалёт ляцеў, як зямлю коламі не чапаў... Што, не бачыў дзяцей? Бачыў — і страляў,— ён зноў збіў цесаком пену з каскі, і пара курылася над бліскучым лязом, бы прабівала сталь навылёт.— У другі дзень вайны. Ранкам...

— А чыя ж Вольгачка?

— Лабошыхі. І Вольгачка, і тыя дзве. Я іх ля Зуёў знайшоў — над забітай маткаю галасілі. Цягнуць яе за рукі, моляць: «Матулечка, пойдзем! Матулечка, пойдзем!» Ледзь адцягнуў іх...

Перасіліўшы сябе, Захар дажаваў новы скрылік пругкага і цвёрдага мяса.

— Дзяцей трэба за чыгунку... Мы іх туды пераправім,— сказаў ён, дакараючы сябе за рашэнне паспешлівае і не зусім прадуманае, а яшчэ больш за тое, што папытаў Падрэза пра дачку. Ведаў Падрэзаў боль і зноў зачапіў яго. Ведаў, што на сёння нерэальна гэта — перапраўляць дзяцей за чыгунку. І, тым не менш, з яшчэ большай упартасцю паўтарыў: — Мы іх пераправім. Не кінем у бядзе.

— Яно добра было б,— няпэўна і вяла пагадзіўся Падрэз.— Сёння хоць накарміў гэтым іх,— і зноў рэзкім рухам скінуў цесаком пену з каскі.— А заўтра?..

— Узвод накіраваны пад Дзіспу — хутары там немцы не чапалі,— сказаў Захар.— Не думаю, каб з пустым гаспадарнікі вярнуліся. Хлеб вам выдзелім абавязкова,— паабяцаў Захар і, заўважыўшы абыякавасць і недавер у вачах Падрэза, дадаў лагодна, быццам сам пакутаваў ад таго, што змушаны аддаваць гэткі загад.— А табе давядзецца папрацаваць, Пятровіч. Агледзець усе пячоры тут, усе будані. Трэба мець дакладныя звесткі, колькі тут дзяцей.

— Дакладныя? Гэта цяжка,— марудна і няпэўна пачаў Падрэз, быццам намацваючы дарогу да неабвержных пярэчанняў.— Але пастараюся. Абыду ўсе мясціны, дзе атабарыліся вяскоўцы. Якія ведаю і бачыў.

— Пастарайся, Пятровіч. Трэба. І — дзякую за пачастунак.

— Каб было за што!..

Выбраўшыся на лугавіну, Захар ішоў увесь час у чаканні таго, што тут, калі яны засталіся адны, Юрша пачне аспрэчваць прынятае ім рашэнне, даводзіць яго немэтазгоднасць і нерэальнасць. Але той маўчаў, тупаў цяжкімі трафейнымі ботамі, не забягаючы наперад і не адстаючы, і Захар чуў, як ён сапе, як цвенькаюць каменьчыкі, трапляючы пад шырокія, цесненька падбітыя цвікамі падэшвы.

— Дзяцей мы павінны ўратаваць,— сказаў Захар, парушыўшы маўчанне, і дадаў таропка, нібыта была пільная патрэба пераконваць Юршу: — Накарміць, у першую чаргу. Уратаваць!

— Ты гэта гаворыш, нібыта я пярэчу. Але як — уратаваць? Добра, калі гаспадарнікі вернуцца не з пустым. Добра, калі сёння разведчыкі на чыгунцы не спатыкнуцца. А раптам? А калі — ні першае, ні другое?

У запытанні прагучала сумная развага, але нязгоды з рашэннем не адчувалася, і Захара гэта ўзрадавала.

— А раптам ды каб бы — у роце раслі б грыбы,— ён пажартаваў шчыра, але радасці не адчуў, папракаючы сябе за тое, што прымаў рашэнне, як бы не беручы пад увагу Юршаву думку.— Трэба прасіць Ціхана. Ён — зразумее. А пляцоўку самалёту мы б падрыхтавалі...

Юрша, як адразу пагадзіўшыся з Захарам і палічыўшы, што няма аніякай патрэбы нешта больш абмяркоўваць і ўзгадняць, спытаў:

— Ціхан — зразумее. Але як нам разумець тое, што чуем? — і, не чакаючы адказу, сказаў упарта і безапеляцыйна, як ведаючы, што гаворыць праўду: — Фронт мы чуем! Нашы пайшлі ў наступ. Цяпер ты разумееш тую катэгарычнасць загадаў? «Спыніць на два дні рух на чыгунцы Полацк — Варапаева». Спыніць, каб не ўцякалі.

— Гэткія ж загады былі і летась. Прыгадай!

— Былі. Але ж гэткага,— ён павёў шырока рукою наўкола,— гэткага не было. Згодны? І гэтая катэгарычнасць — на два дні. Роўненька два дні і мінула.

— Так, два дні...

Захар са здзіўленнем адзначыў, што гэтыя словы неяк незвычайна хвалююць яго, крэсляць увесь ранейшы клопат

і турботу. Дзіўна! І дзіўная здольнасць у Юршы! Пачні яго слухаць — не заўважыш, як перакапае, пачнеш ягонымі словамі нават гаварыць. І яго праўда: гэткай канапады, густой і блізкай, шчэ чуць ім не даводзілася апіколі. Не, чаму ж пе даводзілася! У сорак першым, калі ішлі баі ля Полацка. Цяпер у тым баку асабліва моцна і грыміць. Нават і не верыцца: няўжо дачакаліся? Няўжо тое і пачалося, пра што думалася, чым жыў кожны ў атрадзе ўсе гэтыя трывожныя і незлічоныя па даўжыні дні?.. Тое, пра што думалася, як пра найвялікшае свята!..

З узлеску на поле выбег Каленчыц, і ў Захара ўстрывожана забілася сэрца. Але захваляваўся гэтак моцна ён не з таго, што ўбачыў мокры ад поту твар камандзіра ўзвода разведкі — твар стомлены, аж белы ад перанапружання,— устрывожыла зусім іншае: учуў бязладны людскі гармідар у лесе.

— Бягуць,— выпаліў Каленчыц, і закашляўся, і, сагнуўшыся, матаў-вадзіў галавой з боку на бок.

— Хто? — Захар схапіў яго за плечы і, убачыўшы мітуслівую радасць у вачах, запеклую сліпу ў куточках губ, зразумеў, што не з благой весткаю, высільваючыся, бег сюды Каленчыц. Але стрымацца ўжо не мог, моцна страсянуў яго.— Хто? Куды?

— Фрыцы. Чыгунку ўжо аднавілі.

— Як аднавілі? — Юрша не паверыў, апярэдзіў сваім запытаннем Захара.— Там жа на добры тыдзень працы, пасля крушэння. Разам з Артурам ты цвердзіў. Хто ж з вас маніў?

— Ніхто не маніў. Падпёрла, дык і зрабілі. І на гравійцы — суцэльны паток: машыны, машыны, машыны,— і раптам выпаліў звонка, аж голас перасёкся: — Фронт! Бяжыць фашыст без аглядкі! Падмазаў пяткі!

— А што ў лагеры? Чаго гармідар?

— Не ведаю.— Каленчыц здзіўлена азірнуўся.— Ціха, здаецца, было,— і прызнаў усё з тым жа здзіўленнем: — Праўда, гамоняць дужа...

— Ану, бягом!

Захар, узляцеўшы на лясную сцягу, ледзь не зваліў з ног Рыму, якая бегла насустрач.

— Фронт! Наступ! Зводка,— задыхана, з кароткімі перапынкамі пералічыла яна.— Вызвалены Віцебск! Вось...

Захар выхапіў з яе рук аркушок паперы са зводкай:

— Калі прыняла? Зараз прыняла?

— Так. Апошнія паведамленні. Наступ пачаўся ўчора.

— Уча-ора? — працягнуў з прысвістам Юрша.— А мы—

прахалоджваемся. Ды трэба туды, да гравійкі, бегчы. Перастрэць каб! Камандзір! Давай каманду: усім — у ружжо!

— Дзе Яштокін? — спытаў Захар у Рымы і, не чакаючы адказу, загадаў Каленчыцу: — Гані сувязнога ў другую роту. Каб па трывозе — сюды. І разведку — зноў у бок гравійкі! Усё ведаць!

Захар аддаваў каманды і са здзіўленнем заўважаў, што пачуццё радасці прыглушвае незразумелая горыч, што асела ў душы пасля слоў Юршы. «А мы — прахалоджваемся!» Сапраўды, на гэта падобна. Ён, камандзір атрада, шпацыруе сабе па лугавіне, спакойна гутарыць з Падрэзам ля вогнішча, складае нейкія планы на заўтра, нешта разлічвае, нешта падвяргае сумненням. А хіба ж гэта ён павінен быў рабіць? Ды даўно трэба было сядзець ля гравійкі! Трэба было даўно — яшчэ ўчора! — вывесці атрад да гравійкі, да чыгункі, зарыцца ў зямлю і аніводнага фрыца не прапусціць і па шашы і па чыгунцы. Трэба было адразу, як толькі атрымалі тол, з розумам даваць заданні падрыўнікам. Узарвалі эшалон? Сядзіце паблізу. Ясна ж было табе, што ў крытычнай сітуацыі аварыю на чыгунцы ліквідуюць хутка. А ён? Ён адразу паверыў у тое, у чым яго гэтак горача запэўнівалі і Каленчыц і Артур. Нават больш, пачаў падумваць пра тое, як уберагчы хлопца, не пасылаць па рызыкоўныя заданні: раны, маўляў, не ўсе як след загаіліся...

Зводка, якую ён прабег вачыма, і асабліва крыўда на камісарава шкадаванне, падобнае на папрок, імгненна знпачылі Захара. Убачыўшы заспанага Артура, разбуджанага гармідарам у лагеры, Захар, нічога не патлумачыўшы, загадаў бязлітасна і строга:

— Узнімай сваіх падрыўнікоў. І — на чыгунку. Каб мёртвай ляжала! Каб аніводны цягнік не праскочыў! Гэта— загад!

— А хіба пусцілі? Там про-оцьма ж работы была — чатыры дні як ніць даць. А не, дык і на тыдзень.

— Выконвайце загад! Без прамаруджвання!

— Удзень — не падыдзем!

— Падпаўзайце, калі падыходзіць вам цяжка! Фронт зрушыў. Разумееш? А мы — прахалоджваемся!

Адаслаў Артура і не пашкадаваў, што абышоўся з ім гэтак рэзка, нічога як след не патлумачыўшы. Шкадаванне было ўзнікла ў той час, калі пачаў аддаваць загад, але, паўтарыўшы словы Юршы, ён як бы закрэсліў у сабе тое шкадаванне — ведаў, што інакш рабіць не мае права.

— Я — у роту,— сказаў Юрша, зразумеўшы яго настрой і вырашыўшы пакінуць на адзіноце.

Захар яго не затрымліваў. Ён зазірнуў у пусты будан, падзівіўся, што ўсё наўкола змянілася, і яшчэ больш падзівіўся з таго, што не разумее змены, што адбыліся і адбываюцца зараз у яго ўласнай душы. Адкуль гэтае паганае адчуванне, што ён нешта ўпусціў, зрабіў не так, як трэба? Ды не, усё гэта ад радасці, ад вялікага ўзрушэння, ад новага жыцця, якое ўваходзіць у яго змучанае і збалелае сэрца!..

Гармідар у лагеры прыглушыў гул матораў, які імкліва наблізіўся і запоўніў лес. Цяпер толькі ён, гэты магутны і незнаёмы гул, здавалася, трос паветра.

— Самалёты! Нашы ідуць,— адразу вызначыў Яштокін, які набліжаўся да будана, час ад часу спыняючыся і ўглядаючыся ў светлыя прагалы паміж шатамі ялін і соснаў.— Рота гатова да руху. Файзуло стрэне нас на выхадзе з лесу — я паслаў дадаткова сувязнога... Ого! Гэта ж нашы самалёты, што нядаўна праляцелі, за Дзвіною малоцяць!

Глухія выбухі бомб, густое, ледзь чутнае сакатанне кулямётаў змешвалася з далёкім выццём матораў, і Захар са здзіўленнем адчуў, як святлее ў душы і чэзне, сплывае горыч. Нічога ты, дружа, не ўпусціў. Усё, што можна было, ты зрабіў, і зрабіў у патрэбны час, і зрабіў добра. Толькі не памыліся цяпер! Не трэба пароць гарачку! Мабілізуй, пакліч на дапамогу ўвесь свой розум, увесь вопыт, за які табе з атрадам даводзілася плаціць часам плату высокую і жахлівую! Памятай, памятай кожную хвіліну тое, пра што табе казаў Ціхан: адказнасць за лёс атрада — на табе асабіста!..

— Патрэбна асцярожнасць,— прамовіў Захар, з хмурынкаю ў голасе, як бы студзячы празмернае захапленне Яштокіна.— Пачулі добрую навіну — і ўжо ў скокі пайшлі. Каб потым слёзы выціраць не давялося... Разведку — наперад. Ад кожнай роты.

— Пайшла ўжо.

— Ну, начштаба — Захар задаволена ўсміхнуўся, як бы просячы прабачыць нечаканую рэзкасць.— Нам з камісарам ужо і рабіць няма чаго.

— Хопіць шчэ работкі. Усім хопіць!

Вясёлая, поўная радасці заўвага Яштокіна канчаткова вярнула Захара ў рэчышча звычайных баявых клопатаў і турботы. Але на полі, як толькі выйшлі з лесу, Захар, адчуўшы сябе няўтульна, зноў ліхаманкава думаў, вывяраў правільнасць рашэння, якое было прынята. Ці разумна ён робіць, ведучы атрад да гравійкі напрамкі, а не ляснымі сцежкамі? Гэтая, кіламетры на чатыры карацейшая, дарога можа дорага ім абысціся. Добра, калі атрад не выявяць. А калі, скажам, самалёты? Ці давядзецца прыняць бой на адкрытым

месцы?.. Хаця, не зусім і адкрытая пойдзе неўзабаве мясціна: бярэзнік паабапал дарогі пачынаецца, пагорачкі. Не кранутая ні коламі, ні капытамі ляжыць палявая дарога, ледзь прыкметная сярод маладой травы. Калі па ёй, гэтай дарозе, ісці ўвесь час, дык якраз і трапіш на гравійку. Праўда, не вельмі зручнае месца для засады, бо па роўным полі каціць гравійка там, і толькі з аднаго боку — рэдзенькі алешнічак. Давядзецца ўзяць крышку правей, да маладзенькага бярэзніку, што вырас на старых пясчаных кар'ерах — адтуль можна будзе ёмка ўдарыць. Э-эх, каб вось тут у засаду засесці! Ручай, мост праз яго ў нізіне некалі быў, паабапал пагоркі — сеўшы на іх, якую хочаш сілу можна спляжыць. А як нявыкрутка — адыходзіць у поўны рост можна, бо пагоркі схаваюць надзейна. Але ж гэтай дарогаю фашысты адступаць не будуць: масты тут скрозь знішчаны.

Мінулі адзін пагорак, другі. Бярэзнік справа пагусцеў. Па левы бок дарогі густа кусціўся малады вольхавы параснік, які месцамі выдаваў чырвоным, як у познюю восень. Чырвань гэтая прывабіла Захара, ён загледзеўся і не заўважыў, калі рух калоны замарудзіўся. Убачыў толькі, што рота Пажогі, якая ішла наперадзе, рассыпаецца ў бярэзніку, займае баявы парадак.

Захар прайшоў па краёчку бярэзніку. Ён ужо здагадаўся, што каманду заняць баявы парадак камандзір роты аддаў не без падстаў, але спытаў Пажогу незадаволена:

— Што здарылася?

— Разведка сігналіць: фашысты.

— Дзе? Тут? — не паверыў Захар, але тут жа адступіў у засень маладых бярозак, прыгнуўся.— Што яны ў гэтай глушэчы згубілі? Але ж, відаць, нешта згубілі...

— А вось зараз даведаемся.— Пажога памкнуўся наперад да Каленчыца, які, прыгнуўшыся, шнураваў па бярэзніку, азіраючыся.— Што чуваць, разведка?

Каленчыц адказаў не яму, а Захару, быццам запытанне ішло толькі ад яго:

— Фашыст, таварыш камандзір. Дазвольце далажыць...

— Дакладвай, дакладвай! Дзе твой фашыст?

— Калона. За пагоркам,— і Каленчыц махнуў рукою ў бок пагорка, за якім хавалася пясчаная дарога.

— Куды рухаюцца? — нецярпліва спытаў Захар.— У якім напрамку? Высветліў?

— Яны не рухаюцца. Яны працуюць. Там масток разбураны, дык яны гаць кладуць. Бярэзнік сякуць і зямлёю забальваюць.

— Колькі іх?

— Сотні паўтары прыблізна. Сем машын — гэта дакладна. Фуры крытыя. Адна машына на гусеніцах. Яна перабралася ўжо на гэты бок ручая і тыя — тросам перацягвае.

— Не чуваць жа матора!

— Пагорак — таму і не чуваць. А можа, трос мацуюць. Не, вось загула. Ромель, таварыш камандзір, туды рвецца. Стрымаць нават цяжка.

— Што, да сваіх захацелася? — Пажога пажартаваў, перасмыкнуўшыся.

— Не. Яны здадуцца, кажа. Яны мне павераць, кажа, не будуць страляць.

— Давай сюды Ромеля! — загадаў Захар і паглядзеў па Яштокіна, чакаючы ўхвалы.— А што, калі паспрабаваць? Ну, праігралі вайну — гэта ж і сляпому відаць. Навошта ж кроў?..

— Іх не пераканаеш. Яны ашалелі ад страху, бо час адплаты настаў за ўсё, што яны тут нарабілі. На шашы — штурмавікі малоцяць. Таму, думаю, прасёлкамі і папаўзлі, бы тыя прусакі!

Нешта падказвала Захару, што трэба пагадзіцца, з Яштокіным не спрачацца. Але наўпярок волі, як самі па сабе, нарадзіліся словы нязгоды з начальнікам штаба:

— Тым не менш паспрабуем. Не думаю, каб ім хацелася паміраць. Вясна ж! — Захар зірнуў на неба і, аслеплены празрыстай сінечаю, сказаў яшчэ, але цяпер ужо цвёрда і бязлітасна: — Паспрабуем! Але ўжо калі стрэляць... Тады ўжо хай літасці не чакаюць,— і павярнуўся да Пажогі: — Перадай па роце: страляць — па маёй камандзе. І перадай гэта ж і Веліканцу. Гэта — загад!..

Чакаючы, пакуль падыдзе Ромель, Захар акінуў позіркам зялёны бярэзнік па правы бок дарогі, у якім залегла першая рота, крутыя пагоркі за дарогай злева, на якіх шчацініўся малады альхоўнік, і да дзівоснай яснасці ўбачыў тое, што можа адбыцца, калі пусціць калону сюды і ўдарыць па ёй з абодвух бакоў. Другая рота — адтуль, з пагоркаў, а першая — з бярэзніку: не выскачыш з-пад гэтага перакрыжавальнага агню. Назад дарогі машынам не будзе — не развернешся. І наперад не вельмі пагоніш — у глыбокіх вымоінах пясчаная дарога. Пастка! Толькі як заманіць сюды звера і прымусіць яго спыніцца, паглядзець на сябе збоку, пагля-дзець і зразумець, што самае разумнае выйсце — скласці зброю?.. Трэба, трэба паспрабаваць! Зрэшты, чаго ты сябе пераконваеш? Рашэнне прынята. Ротам аддадзены баявы загад!.. І Ромель ірвецца да сваіх землячкоў... Вось і хай ідзе, хай сядзе на ўзбочыне і чакае. Наблізіцца калона —

хай узнімецца, спыніць калону, адшукае начальства і прапануе скласці зброю. Адкуль ім ведаць, якой сілай яны абкружаны? I не казаць, якая сіла тут. Фронт! Хай складваюць зброю — гэта гарантуе жыццё кожнаму! А першы стрэл з іх боку — знішчэнне. Поўнае і бязлітаснае!

Захара здзівіла, як нагадзіўся Ромель з тым, што ён прапанаваў — не запярэчыў, не патрабаваў тлумачэнняў, толькі паспешліва кіўнуў галавою:

— Гут.

Стаіўшыся за пагоркам у альхоўніку, Захар сачыў за кожным рухам Ромеля. Крочыць ён нетаропка, але ўпэўнена, кіруе на сярэдзіну нізіны, да каменя, ля якога яму загадалі спыніцца і сесці. Наблізіўся да гарбатага валуна. Садзіцца асцярожна, быццам баючыся запэцкаць штаны. Зняў нямецкую пілотку, з якой не разлучаўся летась нават у самыя спякотныя дні, зберог і да гэтага дня, ці дзе не згубіў зімою. Дастаў белую насоўку, выцірае спацелы твар. Адзіны, здаецца, чалавек у атрадзе, які носіць у кішэні насоўку...

Цяпер, калі Ромель сеў, галіна маладзенькай сасонкі, якія там-сям пракідаліся ў густым вольхавым парасніку, замінала бачыць, і Захар зламаў яе.

«А раптам Ромель які-небудзь выбрык адмочыць?..»

Думка — такая нечаканая і недарэчная думка! — мільганула, але Захара яна не ўстрывожыла, не ўсхвалявала, бо ён не паверыў у тое, пра што падумаў,— паверыў у чалавека, якога паслаў у нізіну і які толькі што абціраў белай насоўкаю твар. Гэтулькі прайсці разам з намі, гэтулькі пабачыць і здрадзіць! Гэта ж роўна таму, што паверыць у тое, што праз хвіліну перавернецца зямля, знікне трава, знікнуць дрэвы, знікнуць гэтыя пясчаныя пагоркі... А гэтага — не будзе! Колькі выпальвалі агнём гэтую зямлю, дратавалі металам, крэслілі нянавісцю... А яна — зноў маладая, зноў цвіце пад сонцам, зелянее... Жыццё мацней смерці! Жыццё заўсёды перамагае! Няўжо гэты чужынец, што сядзіць на замшэлым валуне, таксама разумее гэта? Разумее, бо каб не разумеў, дык не сядзеў бы ён зараз там!..

Ромель сядзеў нерухома, прыгорбіўшыся, потым паклаў на зямлю пілотку і, прымерваючыся, каб яна трапіла пад галаву, адкінуўся на спіну, ашчаперыў перакрыжаванымі рукамі плечы і знерухомеў.

— Э-эх, каб яны яму паверылі... Склалі б зброю, засталіся б жывыя... Вайне ж канец! Няўжо нельга гэтага зразумець? — ціха спытаў Яштокін, які ляжаў па той бок сасонкі за нізкім, але шырокім старым пнём.— Але прадчувае

маё сэрца, што іначай будзе. Неяк дужа ж неахвотна пайшоў Ромель наш...

— Ён жа сам ірваўся. Сам прапанаваў. Ты што, не чуў Каленчыца? Не бачыў, што ён адразу і пагадзіўся?

— Пагадзіўся. Але крочыў неахвотна. Мне нават падалося, што вось зараз спыніцца, назад павернe...

— Ромелеў лёс шчаслівы. Ромель жа з намі з сорак першага. І каб жа хоць адна драпінка. А быў жа разам з усімі ў пекле. І неаднойчы.

— Колькі слаўных хлопцаў мы пахавалі. А гэта — жывы. Бытта заварожаны, гэты «гер афіцырэн»!

Захар злавіў сябе на тым, што думкі яго ідуць у тым жа накірунку, сказаў Яштокіну даверліва, але без ахвоты — нервовае напружанне вымагала разрадкі:

— Нібыта лёсу выклік кінуў — мяне гэта часцяком дзівіла. І цяпер дзівіць. Нас Ромель не любіць — я тое добра ведаю, скурай адчуваю. Але ж да сваіх не ўцёк. А магчымасць жа была ў яго такая. І — не адна, сам добра ведаеш. Вось ты мне можаш сказаць, пра што ён зараз думае?

— Вершы складае.

— Не-а, вершы ён не складае. Кінуў вершы складаць — жыццё адвучыла. Апошні верш ён падараваў камісару. Памятаеш, дзе гэта было?

— Не, не памятаю. А вось зараз у яго, камісара, і запытаем.

Ззаду пачуўся шоргат. Нізка прыгнуўшыся, падбег Юрша, шмякнуўся на зямлю побач з Яштокіным.

— Слухай, начштаб! Велікаицу ты загадаў «дзегцяры» на той бок, пад пагорак, перакінуць? — Юрша глядзеў на Захара, як бы запрашаючы і яго выказаць сваё меркаванне аб тым, што зроблена Велікаицам без дазволу камандавання.

— Ды не загадваў! Толькі сказаў, каб агледзеў месца. Раптам давядзецца пазіцыю памяняць. А ён ужо і зрабіў? — Яштокін пляснуў правым кулаком па левай далоні.— Ну, зараз разбяруся! Гэты мне шчэ махновец!

— Ты не трасі яго адразу за бараду,— параіў, усміхнуўшыся, Захар.— Можа, з таго боку і лацвей кулямётчыкам. У Велікаица — вопыт!

— А ў мяне што? Гэтае самае замест вопыту?

— Не кіпяціся. Спакойна, начштаб, спакойна,— сказаў Захар.

— Я спакойны. Спакойны я...

Яштокін адпоўз, зашоргаў голлем і знік. Юрша, уладкаваўшыся на яго месца, узрадаваўся:

— Угрэў, малайчына, мне месца. І месцейка слаўнае — вось хто клопат пра камісара свайго мае. Чуў крайком вуха, пра вершы вы тут гаманілі?

— Прыгадвалі, дзе і калі табе апошні свой верш Ромель падараваў. Не згубіў?

— Як можна! Захоўваю. Рукапіс верша славутага — а раптам ён і зробіцца славутым? А можа, ужо славуты, а мы не ведаем — нямецкага паэта! Гэта, ведаеш, фа-акт. І яшчэ блакнот сёння даў.

— Які блакнот?

— З паперы, вядома. Спісаны да апошняй старонкі. Прасіў, каб пачытаў і захаваў. Я пагартаў толькі, не чытаў. Почырк у яго дужа складаны. А тут — зводка пра наступ.

— Зноў вершы ў Ромеля?

— Не-а, філасофія. Пачатак першай старонкі асіліў. Увечары пачытаем, не гарыць. Але там — мудрасць. Гэта я сцяміў...

Захар пачухаў патыліцу, якая нясцерпна свярбела ад поту, сказаў з вясёлым папрокам:

— Слухай, мудрая і паэтычная душа, падумаем лепей пра нас з табою. А што, як нявыкрутка? Трэба было б і пра гэта памаргеліць загадзя.

— Нявыкрутка? Ты што! Іх лёс вядзе — нявыкрутка ў іх. У нас цяпер толькі адно — перамога. На нашай вуліцы свята. На нашай! Толькі вось не магу сцяміць, чаго іх сюды пагнала?

Захар абцёр лоб, шчокі, спыніў далонь на падбародку, адчуў пад пальцамі колкую шчэць барады:

— Жыць хочацца, як я разумею.

Юрша неяк весела, з усмешкаю ў прыжмураных вачах, лагодна запярэчыў, папытаў, быццам даўно ведаў тое, пра што яму будуць зараз казаць:

— А факты? Чым пацвердзім гэтую тваю выснову?

— Гравійка — забітая. Цесна па гравійцы, самалёты ясе чэшуць. А тут — любата. А тут — прастора.

— Без фантазіі жывеш, Захар дарагі. Праўда тут зусім іншага смаку.

— Ну-ну, выкладвай!

— Дачуліся, здаецца, што ў захараўскім атрадзе апошні хрэн без солі даядаюць. Вось і вязуць нам хлебец і розныя прысмакі.

Жарт раззлаваў Захара, і ён адказаў грубавата:

— Пасля іхніх прысмакаў, голубе, будзеш ты даядаць тое, што без солі не дасў! Весялун мне знайшоўся!

— Ды ўсміхніся, Захар! Паслухай, якая сімфонія наўкола!

— Паўзе! Машына!..

Канапада, што па-ранейшаму не сціхала, накатвалася хвалямі, і Захару падумалася, што гэта яны, грукатлівыя хвалі, выпіхваюць з-за пагорка шэрую брызентавую фуру. Спачатку паказаўся верх яе, потым уся яна, а затым — блішчастае ад сонца лабавое шкло кабіны і агністыя, з уключаным святлом, фары; урэшце, выпаўзла ўся машына і разам з ёю выкаціўся басавіты гуд матора. Следам за ёю, быццам падпіхваючы першую, выпаўзла другая машына, але нізкая, з браніраванымі бартавінамі, на гусеніцах замест задніх колаў, і фары яе гэтак жа агніста засвяціліся і згаслі.

«Сонца... Гэта ад сонца фары бліснулі. А Ромель — ляжыць! Няўжо заснуў?..»

Ромель ляжаў нерухома, быццам сапраўды заснуў, і заварушыўся толькі тады, калі апошняя машына, адолеўшы пагорак, спаўзла ў нізіну. Ён узняўся неяк марудна, запаволена, быццам нехаця, марудна страсянуў пілотку, надзеў яе на галаву і ступіў на дарогу, размахваючы насоўкай; ступіў, аднак, не да першай машыны, а да другой, падобнай на тую, што ў сорак першым гнаў па дарозе ад сядзібы дарожнага майстра Голуб і якую яны потым затапілі ў багне, калі атрад рушыў у лясныя нетры.

На нейкі міг Захару падалося, што ажыла, выпаўзла з багны тая машына, на якой, пасля разгрому фашысцкага штаба, гэтак фарсіста каціў Голуб з Бяловым. Нават афарбоўка ўсё такая ж — жаўтлявыя, перамешаныя з зялёным, няроўныя плямы маскіроўкі. І кулямёт над браніраванымі бартамі. І колы тыя ж: пярэднія вялізныя, дужа рубчастыя, а заднія ўзяты ў гусеніцы.

«Бялова толькі няма... Каб быў жывы, ён бы цяпер парадаваўся. Мог бы і на гэтай пакаціць... Ч-чорт!.. Што Ромель робіць?!»

Ромель нечакана спыніўся, схаваў насоўку ў кішэню, і Захар адцягнуў затвор аўтамата, гатовы да ўсяго. Рука на прыкладзе ў яго адразу напацела. Але тут жа ён згледзеў, што Ромель здзёр з галавы пілотку і цяпер размахвае ёю, круціць патрабавальна, загадваючы спыняцца.

Машына, гайдануўшы, спынілася, вузкая дзверца ў бакавіне адчынілася, і ў ёй з'явілася галава чалавека; бліснулі на сонцы акуляры. Машына, што ішла следам, спынілася таксама, і спыніліся за ёй усе астатнія, стаялі гэтак шчыльна, быццам упёрліся адна ў адну. Вырвалася наперад толькі першая, і была яна ўжо гэтак блізка, што Захар нават бачыў

незразумелыя дзіркі на правай бакавіне капота. Але вось спынілася і яна. З кабіны выкаціўся афіцэр, лысаваты, у расшпіленым на ўсе гузікі фрэнчы, з парабелумам у правай руцэ. Пастаяў нейкі міг, азіраючыся наўкола, потым шпарка памчаў да машыны на гусеніцах.

Ромель загаварыў — голас яго гучаў звонка і быў добра чуваць, але загаварыў дужа хутка, і ўсе словы зліваліся, з іх не выбівалася аніводнага, знаёмага Захару. З фураў пачалі саскокваць салдаты — чамусьці па два ад кожнай машыны, беглі да Ромеля, станавіліся злева і справа, быццам бралі яго ў кола.

Афіцэр у акулярах бразнуў дзверцаю, падбег да салдат, нешта крыкнуў загадпае і рэзкае. Салдаты не зварухнуліся, тады ён піхнуў аднаго, другога, падскочыў да Ромеля, трасучы парабелумам.

— Дойчэ зольдатэн! — голас Ромеля раптоўна ўзвіўся дрыготкім, але выразным і звонкім фальцэтам.— Кріг капут!

Суха трэснуў стрэл з парабелума. Ромель схапіўся рукамі за грудзі. Потым адна рука яго прыўзнялася, заціснутая ў ёй пілотка чорным мятлікам пыхнула над галавой, асела на валасы, і Ромель паваліўся на дарогу. Салдаты пасунуліся назад ад яго, і Захар убачыў, як рука Ромеля сутаргава торкнулася ўверх, як матлянулася пілотка, робячы знаёмы рух — спыняйцеся.

Гарласта і працягла зароў лысаваты афіцэр:

— А-абфарэн! А-абфарэн алес!

Каманду абсекла доўгая і захлёбістая чарга — біў кулямёт з браніраванай машыны. Чэргі ішлі густыя, траскотныя, і, зрэзаная імі, на Захарава плячо звалілася макавінка сасонкі. Захар добра бачыў, як салдаты кінуліся да машын, як лысаваты афіцэр шпарка бег па ўзбочыне, час ад часу азіраючыся, як шафёр першай машыны адчыніў перад ім дзверцу кабіны і той злавіў яе правай рукой. Перш чым ускочыць на падножку, афіцэр зноў азірнуўся, потым рэзка павярнуў галаву ў бок альхоўніку, быццам толькі цяпер зразумеўшы, што галоўная небяспека пагражае яму адтуль, і тройчы стрэліў з парабелума.

Куля праспявала справа ад Захара, вельмі блізка, і ён, злавіўшы на мушку расхрыстаны афіцэрскі фрэнч, павольна і не спяшаючыся націснуў на спуск. Захар бачыў, як афіцэр завіс на дзверцы, гайдануўся з ёю ў бок капота, потым назад, быццам збіраўся зачыніць яе, і раптам выпусціў дзверцу. Але ён не паваліўся на зямлю, а лёг грудзьмі на падножку, ашчаперыўшы яе правай рукою, а левай марудна

надграбаў пясок дарогі, быццам кідаў яго пад пярэдняе кола...

Наступную чаргу Захар даў вышэй, як бы разразаючы кабіну ад борта фуры да капота, потым павёў доўгай чаргою назад, ад капота да колаў, і прашыў ёю крыж-накрыж ніз кабіны і ніз брызентавай фуры, і адтуль павёў далей, па салдатах, якія выскоквалі з машын. Ён страляў дакладна і добра бачыў гэта. Кулі шчапалі дошкі борта, рыкашэцілі ад жалеза, вігатліва несліся некуды ў прастору, выбіваючыся дзіўнай палахлівай нотаю з агульных траскотных залпаў. Раптоўна ўзарваўся бензабак, жоўтае полымя накрыла афіцэра на падножцы, мітнулася ўверх, выгнулася чорным хвастатым шлейфам над фурай, апала на дарогу, як бы папаўзла па ёй, звязваючы машыны ў адзіны дымны ланцуг.

Браніраваная машына, вырваўшыся з гэтага ланцуга, павярнула ў бок бярэзніку, але прапаўзла метраў пяць. Пасечаныя кулямі, пярэднія колы загрузлі ў неглыбокай яміне, машына нахілілася; пярэднія колы шалёна круціліся, выкідваючы струмені пяску і асядаючы яшчэ глыбей, і тоўстая руля кулямёта цяпер амаль упёрлася ў дол. Але кулямёт працаваў: па схіле пагорка, побач з радыятарам, разрыўныя кулі ўзорвалі зямлю, раскідваючы па баках дробна пасечаныя дзірваны. Потым над задняй бартавінай, зрэзанай наўскасяк, узарвалася кімсьці трапна кінутая граната, і кулямёт змоўк.

— Спыняем агонь,— гукнуў Юрша і, не ўзнімаючыся, павярнуўся да Захара:— Навошта ж страляць? Канцы ім!

Захар загадаў спыніць агонь, але ўзняўся, не прытупіўшы пільнасці. Трымаючы аўтамат напагатове, ён ступіў на дарогу, паклікаў да сябе камандзіраў рот. Узрадаваны, што страт у ротах няма, што няма і параненых, ён, аднак, папярэдзіў Файзуло і Пажогу дужа строга:

— Глядзіце, каб цяпер на якую выпадковую дурынду-кулю хто-небудзь не нарваўся! Галаву здыму!

— Няма каму тут ме пасылаць, тую кулю,— сказаў Юрша, не зняўшы, тым не менш, аўтамат з баявога ўзвода.— Дурні зачмураныя! Казалі ж, прасілі іх: не страляйце — жывыя будзеце! Дык вось жа і маеш, як не расшалопілі...

Гарэлі ўсе машыны, апрача адной фуры. Шафёр не паспеў выбрацца з кабіны, сядзеў, наклаўшы адну руку на абаранак руля, а другую закінуўшы на прыклад карабіна, які быў прымацаваны пад закратаваным акенцам у задняй сценцы: смерць напаткала яго ў гэтым парыванні

схапіць зброю, і па твары, перакошаным ад жаху, застыла горыч, што не паспеў схапіць карабін і стрэліць.

— Муштраваныя, аднак, салдаты. Ваякі! — Захар рыўком адчыніў дзверцу кабіны. Побач з шафёрам скурчыўся маладзенькі афіцэр: галава ўкрыта пілоткаю, аўтамат скіраваны на дзверцу, як бы гатовы пыхнуць агнём. Але аўтаматны ражок пусты, без патронаў — афіцэр быў, відаць, больш увішны за шафёра, паспеў стрэліць.

— Бачыш? — спытаў Юрша, прытрымліваючы дулам аўтамата дзверцу кабіны.— Афіцэрык па нас поўны ражок высмаліў. А запасны паставіць часу ўжо і не хапіла.

— Пад гэткі агонь, як наш, трапіш — не дужа будзеш адстрэльвацца. Па кожнай машыне — добры дзесятак ствалоў!

— А каб на хвіліну якую спазніліся мы — яны б нам бяды маглі нарабіць...

Юрша дулам аўтамата пасунуў пілотку на галаве забітага; пілотка звалілася на сядзенне, адкрыўшы каротка падстрыжаныя бялявыя валасы і пасінелы, заліты крывёю твар.

— Нават хлапчукоў падгроб фюрэр. Шкада іх... Маладыя, а з жыццём развіталіся,— шчыра пабедаваў Захар.

— Яны б цябе не пашкадавалі, можаш не сумнявацца. Бачыў Ромеля? Свайго — ва ўпор. А ён жа іх да жыцця зваў!

— Можа, шчэ жывы? Ідзём да яго...

Ромель быў мёртвы. Ён ляжаў крыху павярнуўшы галаву ў бок поля, прыціснуўшыся грудзьмі да зямлі, і адтуль, з-пад грудзей, яшчэ выцякала, расплываючыся па гліністай лапіне, цёмная густая пляма. Захар схіліўся над забітым, укрыў твар знаёмай пілоткаю.

— Пахаваем яго... Пахаваем не з імі!

— Я згодзен. Ён жа з намі быў, з намі ішоў усюды... Дамоў толькі не дайшоў,— голас Юршы таксама прагучаў засмучона.

На апошняй машыне, ахопленай агнём, грымнуў выбух. Захар загадаў Яштокіну адводзіць роты ў бярозавы гай за пагоркам і першы пайшоў да яго — напрамкі праз поле. Зноў бухнула недзе ў кузаве граната, пачалі лопацца ад агню патроны. Шмат разоў узнікала жаданне азірнуцца, але Захар глушыў яго, гнаў сябе прэч ад дарогі, ішоў і глядзеў толькі наперад. Хутчэй адсюль! Надалей ад смярдзючага дыму! Хутчэй глытнуць чыстага паветра!

Бярэзнік наблізіўся, справа адкрылася невялікае возера, заціснутае з двух бакоў пагоркамі, і Захар спыніўся, заўважыўшы, што камісар спяшаецца за ім следам. Усё наўкола,

здавалася, прапахла аерам, і Захар прагна дыхаў гэтую чыстую азёрную слодыч. Удалечыні, па левы бок возера, жаўцела ў рэдзенькай хмурнасці сонца, завісла над пагоркам, і здавалася, што гэта ад яго цяжару сярэдзіна пагорка накатапрагнулася.

— Што ўгледзеў? — спытаў Юрша; ён, паблізіўшыся, стаў ад Захара праваруч.

— Гляджу на той ву-унь пагорак — над ім сонца завісла якраз. Гравійка ўлева ад яго. Кіламетраў жа сем шчэ адсюль.

— Прыблізна. Ты хочаш адразу — туды? Але ж людзі стаміліся! Зброі трафейнай поўна — несці цяжка.

— І камісар наш стаміўся?

— А ён табе не жалезны, ведаеш...

— Пра тое і гаворка. Робім зараз адпачынак, а як сонца сядзе — на гравійку. Перастрэнем, калі якая калона будзе, ударым і — адскочым,— і, разумеючы, што прыняў разумнае рашэнне, усё ж папрасіў у Юршы падтрымкі і ўхвалы:— Па сэрцы табе гэты план?

— Пачалося жніво, дык чаго ж у шапку спаць!

— А мы і не будзем спаць у тую шапку. Ранкам — зноў ударым. У другім толькі месцы. Калі светла — прыцэльнасць, меней паветра будзем калаціць. Адно толькі непакоіць: чым людзей пакормім?

— Правіянту Веліканец прыхапіў — у яго хлопцы як агонь. У другой ад канца фуры яго было поўна,— і падміргнуў па-свойску, радуючыся, што ёсць магчымасць пажартаваць.— Камісар табе казаў, што прысмакі нам вязуць? Казаў! Так што той, апошні, хай нашы ворагі даядаюць — colькі мы ім не пашкадуем, спаўна сыпанём!

Захар, узіраючыся ў высветленыя сонцам грабяні пагоркаў, прамовіў:

— Бакавыя дазоры — ад кожнай роты. Хай Яштокін распарадзіцца. Але і ты прасачы. І да заходу сонца — прывал!

— Цудоўная работка — прывал. Гэта не засаду рабіць, як Санько гаворыць,— сказаў Юрша і памалу пайшоў, як бы адразу зразумеўшы Захарава жаданне — пабыць на адзіноце.

Захар падыбаў да возера, але да берага не дайшоў — напароўся на крынічку, што бруілася з-пад карапёў нізенькай, дужа кудлатай бярозкі. У тонкай нітачцы-ручаінцы, амаль непрыкметнай у траве, ён узяўся мыць рукі, доўга і старанна шаруючы іх пясочкам. Вада хутка змыла гразь, скура зрабілася ад халоднай крынічнай вады чырвонай, касцякі

пальцаў былі аж ліловыя. Зачэрпнуўшы поўныя прыгаршчы вады з крыніцы, прагна напіўся, потым зноў зачэрпнуў і памыў твар.

Павярнуўшы ад крыніцы ўправа, Захар не адразу пашнураваў да бярэзніку, дзе атабарыліся на прывал роты, крыху пастаяў, аглядаючы наваколле. Нехта бег з кацялком да крыніцы, як ведаў, што яна тут, пад гэтай кудлатай бярозкай; ужо крочылі ўтрох на тым баку возера, нешта выглядаючы ў радкаватым трысці; сіні дымок выбіваўся з узлеску, і адтуль накатвалася знаёмая людская гамана.

«А канапада сцішэла, павярнула на Захад, буркоча цяпер далей, у тым баку, дзе сонца садзіцца...»

Задаволены адкрыццём, якое зрабіў, улагоджаны мірным запяткам людзей, якія толькі што выйшлі з бою, Захар марудна дыбаў па схіле пагорка, зрэдзь часу зыркаў на сонца, што цяпер завісла ў седлавіне паміж краёчкамі далёкіх узгоркаў, і было ўжо не зіхатлівае, як прыгаслае. Макавінкі старой яліны, што адзінока стаяла на тым баку возера, нібыта прапорвалі сонца ўсё глыбей і глыбей, і, урэшце, выкінуўшы чорную піку-прамень, як бы развалілі аранжавае кола на палавінкі: правая, здавалася, вісіць ніжэй і не апускаецца, а марудна адвальваецца ўбок. Увачавідкі гусцеў цёмны колер рудаватага і нізкага трысця, каштанавае сутонне падпаўзала да бярозак, што купкай раслі па левы бок ад старой яліны; з правага боку, на гліністым схіле пагорка, усё святлейшым рабіўся шнур выгоністых маладых сасонак; яны былі далёка ад берага, але адбіткі іх выразна адлюстроўваліся ў вадзе, падобнай на тонкі сіні лёд, толькі былі не роўныя, а нейкія сплясканыя.

Захар павольна дайшоў да берага і гэтак жа, не спыняючыся, пацёгся ўсцяж возера, пакрысе набліжаючыся да соснаў. Час ад часу ён азіраўся, са здзіўленнем заўважаў, што жаўтлявыя адбіткі на зыркай паверхні возера меншаюць, як бы ідуць углыб, апускаюцца на дно, і, ўрэшце, калі ён наблізіўся да соснаў, яны зніклі зусім; змяніўся і колер вады, яна не была падобна на тонкі сінявы лёд, неяк загадкава чарнела, разрэзаная пасярэдзіне доўгім звілістым пасам слабага, крыху зіхатлівага толькі з аднаго боку рабацірня.

Унізе, бліжэй да вады, паветра было вільготнае, а тут, пад соснамі, панавала пахкая чабаровая цеплыня: угрэтая ўдзень сонцам, гліністая зямля ля камлёў, парослая маладым чабаром, струменіла толькі яго водар. Але здавалася, што гэтыя густыя хвалі ідуць не ад зямлі пад соснамі, а вы-

катваюцца з маладога ядлоўцу, які, купкамі, пляміў увесь схіл пагорка, павернуты да возера.

Захар расцягнуўся на зямлі пад першай сасной, з асалодаю расправіў рукі, раскінуў іх на бакі і ляжаў нерухома, мружачы ад задаволення вочы. Праз голле было відаць неба, без адзінай хмурынкі, цёмна-блакітнае за макавінай сасны і рудаватае, з шырокім лязом чарнаватай імглы над грабянём пагоркаў справа.

«Дым над дарогай. Расплыўся дым ад спаленых машын...»

Дарэмна, зусім дарэмна зірнуў ён у той бок, дзе нядаўна адгрукацеў кароткі, у нейкія пяць хвілінак усяго, ярасны бой. Каб ён не згледзеў гэтае шырокае лязо чорнага дыму, што завісла ў паветры, дык, напэўна ж, не згадаў бы так хутка шалёны роў аўтаматаў і кулямётаў, не згадаў бы маладзенькага белагаловага афіцэра, не згадаў бы цёмную пляму над грудзямі забітага Ромеля. Чаму яны, тыя, што ехалі на машынах, не паверылі яму, чалавеку, які гаварыў на зразумелай ім мове? Ён жа сказаў ім, што вайне капут, што ім гарантавана жыццё — трэба толькі не страляць, скласці зброю... А яны — стралялі!.. Чаму яны выбралі смерць, а не жыццё? Не, яны нічога не выбіралі. Яны атрымалі іншы, вядомы ім, загад і выконвалі яго. А можа, проста не паверылі словам?.. Відаць, яно бліжэй да ісціны... Яны не паверылі гэтак жа, як не паверыў ён, Ромель, тым словам, якія некалі казаў яму Захар... Ён жа тады смяяўся над словамі Захара, смяяўся, бо тое, што казаў Захар, здавалася яму смешным, дзіцячым наівам, смяяўся, бо верыў зусім у іншае... А можа, гэтыя таксама верылі ў нешта? Памятаеш, што казаў той афіцэр, якога ўзялі ў палон непадалёк ад Быстрыцы?.. Фюрэр, маўляў, дасць нам новую зброю, і мы пойдзем наперад. Вы, маўляў, пачалі наступ ад Масквы, а мы пачнём — ад берагоў Одэра, бо там вас чакае наш Сталінград. Смешна гэта: гісторыя не паўтараецца! Хто нас сёння можа спыніць? Няма гэткай сілы ў свеце — пра тое нават Ромель казаў адкрыта!.. Але ж дзеля чаго ты, дружа, нервуешся ў тым, што ўжо аніколі і ніхто не верне: Ромель ужо далёка, гэтак жа далёка, як і тыя, забітыя на дарозе, як і тыя, хто знік у полымі, што спапяліла машыны, на якіх страляў і ты...

«А колькі сёння забіў я?.. Афіцэра і тых двух, што сядзелі ў кабіне?..»

Захар сеў, падхапіўшыся, нібыта не ў ім, не ў яго розуме ўзнікла гэтае запытанне, а прагучала побач, вымаўленае голасам строгім і патрабавальным. Падсунуў аўтамат, потым

выцягнуў дыск і адкрыў яго. Два патроны і засталося! Ён пакратаў іх пальцамі, падкруціў пружыну, потым пачаў стаўляць патроны, якія выцягнуў з мяшэчка, што ляжаў у кішэні скуранкі. Патроны вышараваліся ў мяшэчку, былі блішчастыя, навюсенькія, а ў дыску нейкія цёмныя, запыленыя. Ён выцягнуў іх, старыя, пачысціў і, перш чым наставіць у дыск, паважыў на далоні, пакратаў жоўтыя носікі куль. Шэсць дзесяткаў вось гэткіх куль паслаў ён, Захар, сёння. Колькі з іх знайшлі сваю мэту? Дзве вось гэтыя не знайшлі, засталіся ў дыску, нечае жыццё не зачапілі... Хай стаяць побач з новымі. Пружына іх прыцісне, яны выстраяцца ў роўныя пругкія віткі, і тут ужо не адрозніш, дзе якая: аднолькавым мядзяным бляскам зіхацяць іх тупыя, куртатыя носікі...

Закрыўшы крышку, Захар паставіў дыск у аўтамат і неяк адразу супакоіўся, быццам выканаў тую працу, якая, нязробленая, замінала яму ляжаць пад сасной, захапляцца залацістым колерам голля і далёкай невымернай глыбінёю сінечы над галавой. Захар прыдрамаў як праваліўся ў тую далёкую сінечу, і прахапіўся ў прыцемках, калі сонца схавалася і неба за краёчкамі пагоркаў вогненна свяцілася. Прачнуўся ён ад нейкага ціхага шалахцення справа, скасіў туды вокам і адчуў, што ў яго адвісла ніжняя сківаца.

«Аўтамат ажыў! Паўзе, сунецца па зямлі, як жывая істота!..»

І тут жа ўсміхнуўся, угледзеўшы, што аўтамат паўзе, бо яго цягне за рэмень рука чалавека, які стуліўся за камель сасны. Гэта ж Юршава рука! Жартуе камісар — вырашыў у яго, соннага, паціхеньку сцягнуць аўтамат!..

Імклівым рухам Захар крутнуўся на бок, але схапіць аўтамат яму не ўдалося — пальцы толькі слізганулі з прыклада, які тут жа і знік за сасной.

Захар засмяяўся ад гэткай увішнасці цельпукаватага Юршы:

— Ну-у, спе-е-ец! Пакладзі на месца! І сядай побач!

— Ці-іха,— прагучаў уладарны загад з-за камля.— Узняцца. Ісці да кустоў ядлоўцу.

— Кінь кепікі ладзіць, камісар! Я цябе адразу пазнаў! Калі захочаш, дык ты — вё-ёрткі. Вавёрку абскачаш!

— Ма-арш. Іначай — ссячом з бязгучкі. Ма-арш.

Незразумелая ўладарная сіла была ў гэтым загадным голасе, чужым, не Юршавым, і Захар, падпарадкоўваючыся яму, узняўся, прымерваючыся, як яму лацвей выхапіць з футарала фінку, якую запясце правай рукі адчувала. Не сцяміўшы як след, ці гэта адбываецца з ім у яве, ці памро-

ілася і ён чуе і робіць усё ў сне. Захар ахапіў позіркам і пагоркі, вельмі выразныя на агністым даляглядзе, і сіні шлейф дыму, што поўз з бярэзніку і слаўся над вадой, і плямістае адзенне чалавека ў кірзавых ботах, які левай рукою падгроб да сябе Захараў аўтамат, а правую трымаў на спуску свайго, куртатага і чорнага, настаўленага на баявы ўзвод; у поле зроку трапілі і дзве постаці ля кустоў ядлоўцу, і Захар адкінуў думку, якая мільганула, калі ён узнімаўся з долу. Ён нават не паспее справіцца з гэтым — хай і выхапіць фінку, што вісіць у скураным футарале на рэмені справа,— як яго зрэжуць тыя, што прыгнуліся за ядлоўцам.

Не было ні жаху, ні разгубленасці, ні здзіўлення, калі ён, перш чым ступіць за нізкі куст ядлоўцу, у глыб цёмнай купкі, скоса зірнуў у бок сасны, ля камля якой па-ранейшаму нерухома ляжаў чалавек у кірзавых ботах і зеленаватым плямістым адзенні, падобным на нямецкую плашч-палатку, толькі з большай колькасцю плям жоўтага колеру. Адчуванне нерэальнасці ўсяго таго, што з ім адбываецца, узмацнялі пустыя берагі возера: каб жа табе хоць адзіная душа мільганула! І хадзілі ж, і ў трыснягу поркаліся, а цяпер — анікога! Як павымірала ўсё наўкола! Толькі паціху паўзе і паўзе гэты сінявы дым з бярэзніку, у якім то ўзнікне, то прападзе слабая людская гамана.

Але адчуванне гэтае знікла, выпарылася адразу ж, як толькі Захар ступіў у сярэдзіну цёмнага трохкутніка, які ўтварылі кусты ядлоўцу — яго адразу абкружылі з трох бакоў людзі ў плямістых маскхалатах і пілотках з чырвонымі зоркамі.

«Гэта ж свае! Франтавая разведка, мабыць!»

— Нашы... Хлопцы,— выгукнуў ён і адчуў, што ядлоўцавыя свечкі гайдануліся ў яго перад вачыма.— Свае!.. Браточкі!

— Хто вы? — загадна кінуў той, што стаяў справа, круглатвары, нечым дужа нагадваючы Файзуло, толькі значна маладзейшага.

— А вы?

— Гэтак мы мала што высветлім.— Ён нехаця ўзняў руку да пілоткі, казырнуў: — Камандзір групы далёкага пошуку. Гвардыі лейтэнант Лісавенка. Дакументы.

— А я — Захар Крупня. Камандзір патрызанскага атрада.

— Што за людзі ў бярэзніку?

— Партызаны! Атрад! Мой атрад, лейтэнант! Дарагі ты наш!

Ад возера прагучаў працяглы, але не вельмі гучны покліч Юршы:

— Захар Елісеевіч! Дзе ты падзеўся?

— Камісар гэта! Юрша.— Захар крутнуўся, налёг грудзьмі на ядловец і ледзь не паваліўся, затрос рукою ў паветры.— Юрша! Сюды, камісар! Фронт тут! Гвардыя наша! Нашы!..

Сарваў голас у крыку, напярхнуўся, закашляўся і, заўважыўшы, што Лісавенка ўсё яшчэ туліцца ў цень ядлоўцу, кіснуўся да яго, узяў за руку і раптам не вытрымаў, схапіў у абдоймы, уваткнуўся тварам у плямісты каўнер курткі, пацёрся аб яе, сціраючы з вачэй слёзы, потым працёр вочы рукою і, ніколькі не саромеючыся, што плача, паўтараў усё адны і тыя ж словы:

— Хлопцы! Франтавікі! Ро-одненькія вы нашы!

— На шашы... На дарозе, што за пагоркам, не ваша работка? — Лісавенка спытаў, упершыню прыязна паглядзеўшы на Захара.

— А што? Кепская хіба?

— Выдатная. Франтавая, можна лічыць.

— Лейтэнант... О-ой, колькі ж мы вас чакалі. Ажно не верыцца! Штурхані, каб адчуць, што не сасніласяі!

Лейтэнант хуткім, амаль няўлоўным рухам правай рукі штурхануў Захара ў плячо, і Захар ледзь устояў на нагах, і гэта прывяло яго ў яшчэ большае захапленне:

— Але ж і рука ў цябе, лейтэнант. Асілак! А з выгляду — слабачок!

— У нас на выгляд мала глядзяць. Нам — дзела давай!

З бярэзніку ўжо сыпанулі партызаны. Наперадзе ўсіх, апярэдзіўшы Юршу, імчаў Файзуло, і Захару — мокрыя вейкі ўздрыгвалі, дугаліся, замінаді бачыць наваколле добра — здалося, што ён не бяжыць, а чорным мячыкам коціцца, падскокваючы, па схіле пагорка, пярэстага, падзеленага зялёнымі і жоўтымі шнурамі.

## 25

Старыя бярозы ўскрай могільніка, нейкія бляклыя, з чорнымі кучомкамі грачыных гнёздаў, здаваліся як нежывыя. Захар убачыў іх чарнаватыя, быццам закопчаныя, галіны адразу ж, як толькі павярнуў на вузкі завулак, а цяпер, падышоўшы бліжэй, згледзеў, што не памыліўся: агонь нажадыру падпёк лістоту, яна ўчарнела, скурчылася і цяпер, абсыпаная пылам, попелам і сажаю, была падобна на шматкі зга-

рэўшай паперы. На дрэвах, што былі крыху далей ад папялішчаў, лістота была крыху святлейшая, але колер яе выдаваў нейкім штучным.

У Захаравай душы памацнела самота, што агарнула адразу ж, як толькі ён ступіў з брукаванкі на гэты вузенькі, зарослы трыпутнікам завулак.

«І тут, на ўскрайку, усе хаты папалены. Ушчэнт фашысты выкацілі горад...»

Цяжкі, але няўстойлівы пах папялішчаў — вецер яго то адгоніць, то зноў падверне — абуджаў горыч. Стомлены беганінай і розным клопатам, які быў звязаны з падрыхтоўкаю да партызанскага парада — яго прызначылі на беразе Дзвіны на дванаццаць гадзін,— Захар цяпер пашкадаваў, што вырашыў паглядзець бацькаву магілу не адзін, а разам з Артурам і Гайдаш. Лацвей было б, ведама, ісці яму без спешкі, нетаропка, спакваля разважаць у хадзе і аб сваім жыцці, і аб жыцці другіх. Праўда, без Артура яму б не адшукаць бацькавай магілы. Але ж паспрабуй зганіся цяперака з ім — ляціць, бы конь малады. І Гайдаш адно і робіць, што ўпобачкі рвецца: як знарок яго, Захара, аднаго пакінулі, на адзіноце. Але ж адзіноты жаданай няма: увесь час гэтых, маладых бегунцоў, вокам лові ды не адстаць пнешся. Шчэ ў дадатак гэтая клятая скуранка ўгрэлася на сонцы, пячэ, муляе шыю, рэмень аўтамата ціспе, аж гарыць плячо. Боты таксама напалены сонцам — быццам па гарачай жарстве крочыш. Не, вось скончылася сцежка пясчаная, трава ў калена, мокрая ад расы — адразу нагам палёгка.

Ісці зрабілася лягчэй. Але самота на душы не паменела: не самым лепшым чынам ідуць у яго, Захара, справы ў апошнія дні. Усё подбегам даводзіцца рабіць, у імклівым тэмпе. Нават сюды, на старыя могілкі па правы бок Палаты, таксама — у спешцы. Але ж, калі разважыць, іншага выйсця і няма: калі сёння ён не ўбачыць бацькаву магілу, дык невядома, ці давядзецца тое зрабіць у бліжэйшы час. Пасля парада атраду дасцца адпачынак на два дні, а яму, Захару, трэба неадкладна, сёння ж, выбірацца ў Віцебск. Калі вернешся адтуль — невядома. А ехаць туды, не паглядзеўшы бацькавай магілы, аніяк нельга: Ціхан жа, безумоўна, адразу ж папытае, ці быў ён на могілках, у якім стане магіла роднага чалавека. Ды, зрэшты, і не гэта галоўнае,— папытае ці не папытае Ціхан пра могілкі? — а тое, што ў яго, Захаравым, сэрцы было і ёсць штодня, калі ён крочыць па вуліцах горада, дзе абарвалася бацькава жыццё: горкае адчуванне непапраўнай страты, адчуванне свае ўласнае віны, якое не прайшло і не праходзіць.

Увесь час, калі атрад шнырыў па лясах, вылаўліваючы фашыстаў і іхніх паслугачоў, якія не складвалі зброю і дробнымі групкамі, нават і паасобку, упарта прабіваліся на Захад, спрабуючы дагнаць далёкі ўжо адсюль фронт, Захар часцяком дакараў сябе: амаль жа два тыдні мінула, як яны злучыліся з фронтам, а ён так і не знайшоў часу адшукаць бацькаву магілу, пастаяць ля яе. Дакладней, планаваў неаднойчы, ды ўсё не выпадала. Сёння ж ён туды ідзе. Ідзе з горкімі думкамі, з адчуваннем свайго святога абавязку, нясе ў кішэні, загарнуўшы ў насоўку, каліўца попелу з папялішча бацькавай хаты і жменьку зямлі з гарадской плошчы, адтуль, дзе нават і за гэтыя доўгія гады не зараўнялася, не заплыла глыбокая варонка ад фашысцкай бомбы, якая спапяліла маці. Матулю Захар не мог ўратаваць. А ў смерці бацькі яго, Захара, віна ёсць. Ціхан прасіў, Ціхан настойваў, каб забралі бацьку ў атрад, і Захар абяцаў тое зрабіць. Ён, праўда, і прыняў адпаведныя захады, і Марылю прасіў, каб перакапала старога не заставацца ў горадзе, але той заўпарціўся.

У памяці выразна ажылі тыя дні, і Захар нечакана падумаў пра тое — думаў ён гэтак ужо неаднойчы! — што марна папракае сябе. Бацька заўпарціўся — гэта праўда. Але гэткая ж праўда і тое, што ўсё, прынамсі, было больш складана ў тыя, гэткія цяпер далёкія і па-ранейшаму горкія, дні. Атраду патрэбны былі людзі ў горадзе — свае, надзейныя, правераныя, якім можна было давяраць цалкам і ва ўсім: кожны такі чалавек быў на вагу золата. І на вагу золата быў кожны ўзброены чалавек у атрадзе. Прынамсі, і той, хто быў у горадзе, і той, хто быў у атрадзе, рабілі адну і тую ж справу — жылі і змагаліся дзеля перамогі над ворагам. І цяжка было вызначыць, хто больш рызыкуе. Аднак, калі на поўную шчырасць прыгадваць падрабязнасці таго часу, дык яму, Захару, здавалася тады, што старому чалавеку лягчэй будзе перасседзець зіму ў горадзе, не дужаткі будуць чапіцца фашысты да нейкага дзядулі. А потым у жыцці атрада пайшла паласа няўдач, зімовы лагер быў разбураны, знішчаны, а вясной — атрад амаль разгромлены...

Боль старой няўдачы ажыў, нібыта яна, тая няўдача, падсекла яго ўчора, і Захар зябка перасмыкнуўся, прыгадаўшы, як ён імчаў па лясной дарозе, як зляцеў з забітага кулямётнай чаргой каня, як потым зблізку, траха як не ва ўпор, біў з аўтамата па фашыстах, якія неслі ў пілотках смаржкі, як два дні збіраў рэшткі свайго атрада...

Цяпер яно, тое даўняе, бачыцца добра, на цяперашні розум дык кожны зроблены некалі крок быццам на далоні від-

но. І, калі ўсё агледзець і ўзважыць, няма падстаў у Захара папракаць сябе. Няма! Чаго ж тады, з якое прычыны гэтак ціспе сэрца, калі пачынаеш прыгадваць той час, калі бацька не хацеў ісці ў атрад?.. Відаць, гэта ўсё ж твая памылка, што не зрабіў так, як раіў і патрабаваў Ціхан. І лёгка ж тое было зрабіць: паклікаць бацьку з горада, каб паказаў схованку са зброяй, а там і не адпускаць, у атрадзе пакінуць! Але ж у тую восень зброі ў атрадзе хапала, патронаў таксама. Веры толькі некаторым не ставала, упэўненасці, што адолеюць і снягі і марозы. Нават цябе самога сумненні, здаралася, падціскалі. Дакладней, не сумненні, а тое, чаго не мог ты спасцігнуць сваім розумам. О-о, каб на тыя часы ды цяперашні розум, ды цяперашні вопыт, веданне таго, што пражыта, што ўжо за плячыма, што набыта, што аплачана болем, тугою і крывёй!..

Праз брамку, жыўцом выдраную з учарнелага шула, ад часу струхлелага ля самай зямлі, Захар увайшоў на могілкі. Артур з Гайдаш па-ранейшаму несліся наперадзе, не спыняліся, і ён усё больш і больш адставаў ад іх. Ішоў ён цяпер марудна, цяжка пераваліваючыся з нагі на нагу, і неўзабаве зусім спыніўся — убачыў на правы бок сцежкі знаёмы гранітны помнік, абымшэлы і пахілы, што амаль схаваўся ў густы частакол цёмна-зялёных касачоў за нізкай, уціснутай у зямлю жалезнай агароджаю, з якой даўно аблупілася сіняя фарба. Ішлі ж яны ўжо тут толькі што! І гэты разгалісты куст язміну ён бачыў. Кругаля далі, няйначай. І Артура не відно. І Гайдаш знікла. Гамапілі ўвесь час, а цяпер дык і галасоў не чуваць. Куды ж яны падзеліся?..

Наважыўся быў паклікаць і тут жа ўбачыў Артура і Гайдаш — яны выйшлі на сцежку з-за кудлатага, у стаўбунках адцвілой квецені, куста бэзу.

— Ты, я гляджу, у трох соснах заблудзіўся,— панікнуў Захар, аціраючы далонёю спацелую пад каўняром скуранкі шыю.

Артур вінавата развёў рукамі, усміхнуўся:

— Здэцца, да той бярозы нам трэба. Крыж Кандрат з ясеню зрабіў — заўсёды здаля ўбачыш...

— Хадзем разам, хадзем,— падспешыла яго Гайдаш.

Захар застаўся адзін, і адразу падступіла, ударыла ў сэрца паганая туга. Кандрат, значыцца, расстараўся крыжа на бацькаву магілу. Ды шчэ з ясеню, каб доўга стаяць! Зноў, браце, у твой лёс уломліваюцца людзі, да якіх аніколі не гарнулася твая душа. І ты да гэтага дня не ведаў, каму абавязаны, што крыж на бацькавай магіле надзейны, з ясеню...

«З Кандратавай хаты выпаўзла здрада...»

Словы, з якімі Часлава кінулася тады напрадвесні да Захара ў партызанскім лесе, ажылі, спарадзілі самоту і скруху яшчэ большую, чым тая, з якой Захар увайшоў па магілкі. Ляжыць у зямельцы стары Кандрат, і недзе ляжыць таямніцаю даўняя здрада, анікім не выкрытая, аніяк не пакараная... А мо і яна таксама звяла бацьку ў магілу? Не, бацька загінуў па неабачлівасці сваёй, нешта не разлічыў — яго знайшлі забітым непадалёк ад развярочанай выбухам топкі лакамабіля. А Зінаіда з дзецьмі — гэта ўжо дакладна, што нехта навёў па іх след фашыстаў. Не, спачатку — Балаш. Затым ужо Зінаіда з дзецьмі загінула. Потым — Бахнар... Дзе, хто і калі будзе шукаць магілы Балаша і Бахнара? Вецер развеяў іх прах. І магілу Зінаіды і дзяцей табе шукаць патрэбы няма... Няма яе, магілкі той: зжэр іх агонь, потым попел залілі дажджы, быльнёг і крапіва захінулі ад вока людскога папялішча...

Захар змружыў на момант вочы, і папялішча, густа нарослае крапівой і дзядоўнікам — Захар прыходзіў туды ў першы ж дзень, як трапіў у вызвалены горад, і прыходзіў аднойчы пазней, разам з Гайдаш,— зноў паўстала перад яго вачыма. Комін хаты абваліўся, цэгла тырчала з быльнягу трыма вострымі пірамідкамі — адна высокая, а дзве ніжэйшыя,— і дзядоўнік, які гайдаўся ад ветру, па чарзе захінаў іх; Захару, калі ён упершыню пабачыў гэта, падалося, што папялішча не стаіць на месцы, а зыбаецца, памалу асядае ў зямлю...

Мроя была дужа выразная, быццам ён нічога не прыгадваў, а сапраўды стаяў там, ля зруйнаванага злым агнём селішча, слухаў, як шамаціць ад ветру дзядоўнік, з белаватымі, як з махрамі спадыспаду, шырокімі лісцінамі.

— Сюды! Знайшоў! Сюды, сюды!

Захар пачуў Артураў покліч і адкрыў вочы. Артур і Гайдаш стаялі непадалёк, побач са старой бярозай, робячы хуткія знакі рукамі. Знайшлі, значыцца, магілку!

— Што тамака? — гукнуў, як усё роўна не паверыўшы.

— Тутака яна! Адшукалася! Сюды, дзядзька Захар!

Захар хутка, амаль упрыдбег, пашнураваў да старой бярозіны. Старанна дагледжаная магіла яго здзівіла. Белыя стужачкі стакротак на краях і ружовая плямка кветак ля крыжа. Кветкі пасаджаны даўно, не сёлета — вунь колькі іх насеялася. А вось крыж абшкрэбены нажом нядаўна ад цвілі, і пустазелле павырвана ўжо сёлетняй вясною, таксама нядаўна, бо сцябло скрозь звялае, але не зусім і насохлае. Так, былі тут людзі на тым тыдні, відаць: выразныя сляды

вакол магільнага пагорка, белы пясочак, аднекуль прынесены і насыпаны па бережках магілы акуратненька... Зусім свежы пясочак — на ім захаваліся нават адбіткі пальцаў!..

— Нехта прыходзіў,— прамовіў Захар збянтэжана.— І не на тым тыдні, як падалося спачатку. Значна ж свяжэйшыя сляды, як я пагляджу.

— Учора, здаецца, ніяк не пазней. Каб пазаўчора, дык сляды б гэтак не захаваліся.

— Відаць, твая праўда,— пагадзіўся Захар.— Я спачатку пра гэта не падумаў. А пазаўчора ж дождж увечары хвастаў. А гэта пасля дажджу зроблена...

Прыгнуўшыся, Артур уважна вывучаў сляды на пясчаным доле, як не абнюхваў кожную ямінку, потым узняўся, папляхаў далонямі, абтрэсваючы з іх пясок:

— Часлава і Багдан сляды пакінулі. Яны сюды прыходзілі.

— Ну-у, следапыт,— і Захар з недаверам пачаў углядацца ў сляды на пяску.— Гэта ж па якіх прыкметах ты выводзіш?

— Школа, дзядзька Захар.

— Якая шчэ школа тут?

— Хто след харашо сматрэл — мяса кушал.

— А-а, ведаю,— здагадаўся Захар.— Файзуло гэтак вас вучыў. Яго, адчуваю, мудрасць.

— Ну! Вось бачыце гэты след? Палова жалезнай падкоўкі на левым мыску — Чаславы след. Аб заклад пайду — яе след. А вось абцас шырокі на правым боце — па чатыры шляпкі ў тры радкі. А на левым — дзве шляпкі ўсяго. Астатніх — няма. Багданавы боты! Мы шчэ ў лагеры над гэтымі абцасамі пацвельваліся.

Паверыў быў Артуру адразу, але тут жа і засумняваўся:

— А чаго ж яны нам не сказалі? Разам учора б і пайшлі.

— Вы на парадзе былі,— Артур зноў абтрос з далоняў пясок, паправіў дзягу на рэмені.— На абедзе як заселі ў райкоме, дык да вечара. А яны, мабыць, сюды і пайшлі.

— Чаго ж цябе, следапыта, не паклікалі?

— Мажліва, шукалі, ды не знайшлі. З раніцы — цяслярыў. Потым, паабедаўшы, пяткі на сонейку ля Дзвіны выграваў і жывоцік песціў.

— Добра табе жывецца!

— Добра, бо штаб атрада клапоціцца. Учора на абедзе ваш загад абвясцілі: галіцца, чысціцца, адзенне драіць — парадны наводзіць бляск на ўсім.

Гайдаш схамянулася, як бы адчуўшы сябе лішняй у гаворцы, прапанавала:

— Пайду і вадзіцы прынясу. Кветкі палісм. Гэта не пашкодзіць ім, я думаю.

Яна, не чакаючы ўхвалы ці забароны, павярнулася і скоранька пашнуравала па схіле пагорка да рэчкі, атуленай рэдкімі, як драныя, вербамі; на той бок рэчкі, за вербамі, бялела абкоранай вяршыняй і гэткімі як белымі, абламанымі галінамі старая таполя.

— Трэба памагчы Гайдаш, — спахапіўся Артур. — Дзе яна тут бляшанку знойдзе? Мы зараз і вернемся.

— Праўда, прынясіце вады. Паліем кветкі,— пагадзіўся Захар, сам яшчэ не разумеючы, што ў гэты міг яму аніхто не патрэбен, што не аб кветках клопат яго прыгнятае: карцела застацца на адзіноце, сам-насам з гэтым маленькім магільным пагорачкам.

Укленчыўшы ля краёчка магілы, ля белай, з роўнымі барвовымі плямкамі стужкі стакротак, ён пагладзіў рукою чорны ад часу надпіс на драўляным крыжы. Драўніна была каляная і цвёрдая, і далонь каўзанула па ёй, быццам па халоднай касці, і затрымалася толькі на літарах, няроўных і мяккіх ад пылу, што насеў у глыбокія ямінкі-выпалінкі, зробленыя цвіком.

«Плямяш надпіс зрабіў старанна. Малайчына хлопец. Дзядулю свайго ён любіў, хоць і пазаляў часам...»

Захар прачытаў літары прозвішча марудна, але ўголас — цвіль была састружкана з крыжа нажом дбайна, а літары лязо не зачапіла, і таму цяпер яны выразна чарнелі на жаўтлявай і гладкай паверхні,— прачытаў і лічбы, якія сведчылі, калі пачалося і калі абарвалася жыццё чалавека. Потым ён дастаў з кішэні скуранкі пасоўку, завязаную на два вузлы. Аўтамат замінаў яму, і ён зняў яго з пляча, паклаў на траву побач з магільным пагорачкам і, развінуўшы хустачку, асцярожна высыпаў тое, што ў ёй было, ля драўлянага крыжа і пачаў раўнаваць зямлю даланёю, падбіваючы яе пад зялёныя, крыху абвялыя па краях лісціны.

«Але... Вадзіца стакроткам не пашкодзіць. Гайдаш гэта добра надумала... Сэрца ў Гайдаш ласкавае...»

Ён быццам бараніўся гэтай думкай ад болю, які мацнеў і рос у сэрцы і які чамусьці нараджаўся спачатку ў кончыках пальцаў, быццам рукі выграбалі яго з паверхні магільнага пагорка. Зямля з бомбавай варонкі не перамяшалася ў насоўцы з шараватым попелам, але ўгрэлася ў кішэні скуранкі, і дробныя зярняткі вуголля былі асабліва цёплыя, а жвір на магіле халодны, і ад дотыку да яго ў кончыках пальцаў спачатку ўзнікала адчуванне, што ў скуру ўразаюцца дробныя льдзінкі, а потым нараджаўся слабы боль і, мацнею-

чы, поўз уверх і асядаў у грудзях. У сэрцы гэты боль адразу набываў знаёмыя Захару адценні, і Захар пазнаваў гэты боль, бо перажыў яго неаднойчы; цяпер жа боль быў незвычайна востры, колкі, і ад яго сэрца быццам бы адасоблілася ад грудзіны, падпаўзло да гарляка і там засела, білася натужна, тугімі шухатлівымі штуршкамі. Ён хрыпата кашлянуў, і гаючае паветра шырокім струменем прарвалася ўсярэдзіну, спавіла сэрца, і сэрца адкацілася назад, стала на сваё ранейшае месца, тухкала там рытмічна, але гулка і цяжка.

У голлі бярозы, праз каляны і сухі шурхат учарнелай лістоты, што ляпа, марудна трымцела ад цёплых ветравых павеваў, прабіўся тужлівы, як дзіцячы, погалас, аціх, а потым зноў пачуўся, цяпер ужо больш выразны і яшчэ больш жаласлівы, але настойлівы, і Захар узняўся. Ву-унь якая тут праява: жулан аднекуль заявіўся, жаліцца на нешта, падскокваючы на бярозавай галінцы і як бы падмятаючы яе доўгенькім, мяцёлачкай, хвосцікам. Белаваты гарлячок, падобны на няроўна павязаны гальштучак, быццам цягнуў жуланаву галоўку з бліскучастай шэрай дзюбкаю ўніз, да зямлі. Кончыкі цёмных крылцаў то апускаліся на фісташкавага колеру падбрушша, то ўзнімаліся, і Захару падалося, што птушка дрыжыць ад жаху. Зноў узнік знаёмы погалас, але цяпер не ўвысі, на бярозе, а злева, у густым натапыраным кусце глогу, якім заканчваўся зялёны клін хмызу, што надпіраў край могілак ад рэчкі.

«Гняздоў'е, мабыць, там жуланава. А мы папалохалі птушак».

Бацька аднойчы паказваў гняздзечка жулана, змайстраванае на тоненькіх галінках-рагульках бузіны, дакладней не яму, Захару, паказваў — Ігарку, праўнуку свайму любімаму. Можа, гэта толькі здавалася, што Ігарок быў самы блізкі сэрцу старога. Артура, часцяком, ён не вельмі мілаваў — гэта ў памяці. І яшчэ помніцца, як з Пахомам чубіўся: занадта, маўляў, бацькі гэтым вісусам дазваляюць, волю ва ўсім даюць. А тады, як Ягор з Акадэміі вярнуўся і гадзіннік пляменніку прывёз, стары у-унь як усхадзіўся, купецтва, маўляў, хлопцаў толькі псаваць падарункамі. А Ягор усё смяяўся, спяваў пават, па свой лад перарабіўшы ўсім вядомую песню...

«Дзіўна, я ўсё часцей пачынаю тое прыгадваць!..»

Зноў — у каторы ўжо раз! — ажыло ў Захаравай памяці тое радаснае застолле ў бацькавай хаце. Зноў — у каторы ўжо раз! — вярэдзіла сэрца знаёмая скруха, прыводзячы за сабою нярадасную і горкую развагу. Нібыта на агледзіны якія перад гаротнымі днямі, пазляталіся тады дзеці ў родную хату. Ні-

быта спяшаліся, прадбачачы горкія і жахлівыя страты, і нагаманіць, і пажартаваць, і паспяваць... Нямнога, зусім нямнога ацалела тых, хто сядзеў на тым шчодрым і шыкоўным застоллі, багатым на добрыя жарты і смех. Няма бацькі. Няма маці. Няма Пахома. Няма Марылі. Няма Лавягіна, які тады гэтак ваяўніча размахваў рукамі. Няма Сагановіча, які тады болей ад усіх устрывожыўся, пачуўшы тое, што цішком расказаў Ягор. Няма і Важніка, які тады са смешнай сваёй турботаю прыбег,— мудры і слаўны чалавек. Добра табе было, што ўсе гэтыя гады ішоў ён побач з табою: мудры дарадца, чулы таварыш, адважны салдат. Каб не Важнік, маглі б згубіць цябе, аглушанага выбухам, маглі б увогуле не прарвацца праз апошнюю лінію акопаў ля гравійкі. Гэта ж загад Важніка выконваў Велікапец: затаіцца, дачакацца святла, а потым ірвануцца наперад. Ён, Важнік, закрыў тады сваімі грудзьмі кулямёт, што ўлупіў з бункера, калі ўзнялася парадзелая група прарыву для апошняга кідка да ўзлеску. Побач з Важнікам загрукацеў тады кулямёт, і няма, не было чым задавіць яго — сваімі грудзьмі закрыў.

Зноў, да болю знаёмае, паўстала перад ім попельнае ад ранішняй расы жытнёвае поле, дымнае лязо гранатнага выбуху, які перакуліў фашысцкага кулямётчыка разам з кулямётам. А каб не было тады ў тваёй кішэні рабрыстай «эфкі»? Ці зрабіў бы ты тое, што зрабіў на другім канцы жытнёвага поля Важнік? Зрабіў бы, вядома, каб ведаў, што іншага выйсця няма! Але ж хто можа ведаць, што падкіне пад ногі сёння ці заўтра крывавы і жорсткі лёс вайны. Чалавек ніколі не ведае, што чакае яго за павароткай нават самай гладкай і роўнай дарогі. Хіба ж не гладкія былі рэйкі, па якіх каціўся вагон, дзе ехала Зінаіда з дзецьмі?.. А куды прывялі тыя роўненькія рэйкі?.. На папялішча прывялі... Вось ляжыць ён, попел адтуль... Жменька попелу... І жменька зямлі, што апаліла, выкінула з глыбіні фашысцкая бомба... Не перамяшалася ў хусцінцы зямля і попел. А вось на магіле цяпер і не адрозніш, змяшаўся попел з гэтым жвірам, са светлым пясочкам, які невядома адкуль прыцягнула пядаўна Часлава. Ці Багдан? Зноў — Багдан! Неадчэпна, як прыстаўлены кімсьці, ідзе гэты чалавек следам за тваім лёсам. І, відаць, даравала яму Часлава, калі разам тут былі. Ну, былі. Дык што з таго? Чаго ты чужы клопат па сваёй, табе вядомай і сэрцу блізкай, каляіне скіраваць хочаш? Незалюбіў ты Роўдаў гэтых... Але ж каб не Багдан — ляжала б даўно ў зямельцы Часлава. Але ж каб не Багданаў бацька — куды б занесла цябе вясновая паводка? Усё ведаеш, усё разумееш, а падзякі ў тваім сэрцы і на ка-

ліўца няма! А можа, яно, сэрца, далей бачыць, чым твае вочы? Можа, яно, сэрца, болей ведае? Часлава ж казала, што ў той жахлівы вечар прыцёгся да яе Багдан нейкі ўстрыбушаны, не пусціў потым бегчы да хаты, якая ўжо ў агні была...

Ліпеньскае сонца смаліла ўсё мацней, скуранка добра ўгрэлася, і Захару на міг падалося, што смаліць яму ў плечы той круты агонь, што жэр Райнскаву хату. Полымя гудзе, гнуцца і лопаюцца фіялетавыя ад агню шыбы, дзынькаюць і бомкаюць разрыўныя кулі, і ў дымным мроіве дугаюцца за Дзвінскім узвалам попельныя лазнякі — прапоўз, прабіўся туды Багдан з тым жаўтлявым скураным ранцам!

Захар зварухнуўся, і тады адразу дзіўная мроя адвалілася, растала. Не полымя гэта гуло — вецер налятае парывамі, трасе доўгае бярозавае голле, учарнелая лістота на іх жвуркае, шухціць, быццам зробленая з бляхі. У глогавым параснiку мітаецца, трывожна зіўкаючы, спалоханы жулан. Артур нясе ў руках зялёную каску з вадой, вада плешчацца, праліваецца на боты, і мыскі ботаў блішчаць на сонцы.

Вострая, бы стрэмка, нарадзілася ў сэрцы трывога. А куды ж гэта Гайдаш знікла?

— Яна тым краем пайшла,— Артур хітнуў галавой на глогавы парасник.— Ля брамкі, сказала, пачакае нас.

— Каску ён недзе апароў.

— У лазняках іх поўна. Я нават нагамі футболіў — не прайсці. Дзіва нейкае.

— Фашысцкіх касак не бачыў? Дзіва, бач ты, знайшоў!

— Цэлых няма, вось што. Якую не зачэпіш — з дзюркаю: ці малая, ці вялікая прабоіна. Франтавічкі нашы, мабыць, толькі па галовах іхніх лупілі. Вось, гэта таксама цурчыць...

Артур пасунуў палец, які трымаў пaнізу каскі, і адтуль тонкім струменьчыкам зафантаніла вада. Сапраўды, бы палівачка — усю палосу стакротак захоплівае.

Паліўшы кветкі, Артур зайшоў за бярозу, размахнуўся і шпульнуў каску. Апісаўшы дугу, яна звалілася на зямлю, накацілася па траве і, прабарабаніўшы па камянях, знікла ў густой крапіве пад вербамі.

— Пойдзем,— Захар, зрабіўшы колькі крокаў, заўважыў, што Артур стаіць на месцы, і павярнуўся: — Ты чаго?

— Гляджу.

— Куды ты глядзіш?

— Месца выглядаю. Бярозы, рэчка, птушкі спяваюць... Тут, побач з дзядулем, бацькаву магілу зраблю. І мамiну. Каб разам ляжалі. Перазахаванне можна рабіць — мне Багдан казаў. Ён хоча свайго бацьку таксама тут пахаваць.

Зноў — Багдан! Захар сурова звёў бровы, сцяў зубы, потым перамог сябе, памяркоўна паабяцаў:

— Скончыцца вайна — тады. Не цяпер жа!

— Я не кажу, што цяпер, зараз вось тое трэба зрабіць...

Яны ішлі моўчкі да самай агароджы могільніка, скрозь струхлелай, а месцамі і зусім зламанай. Ад могілак агароджа, зацененая густым дзядоўнікам і мяцёлкамі конскага шчаўя, струхлела больш, чым ад вуліцы, і Захару падалося, што сівым, замшэлым штакецінам не дае паваліцца толькі быльнёг. Захар з робленай цікавасцю разглядаў штакеціны, хаваючы за гэтай сваёй цікаўнасцю ніякаватасць, якую выклікалі Артуравы словы. Непавісны табе Багдан і тут, выяўляецца, паспеў забегчы наперад: не з табою, а з ім ужо Артур раіцца. А хіба не ты павінен быў пра ўсё гэта сказаць яму, пляменніку? Пахом — брат родны. І пакłапаціцца аб ім належала табе, а не нейкаму Багдану! А Багдан цябе апярэдзіў. Ён, як бачыш, раней за цябе на могілках быў, нават месца для магілы Кандрата нагледзіў. Ну, аторва мужык — пробы няма дзе паставіць!

«Але ж побач з маім бацькам Кандрат, паліцай гэты, ляжаць не будзе! Не дазволю!»

Захар з цяжкасцю стрымаў у сабе гэты выбух і, сілячыся надаць свайму голасу спакойную цвёрдасць і развагу, прамовіў, паляпаўшы Артура па плячы:

— Скончыцца вайна, і мы ўсіх партызан, што загінулі, у адным месцы перазахаваем. І — помнік,— Захар адчуў, што яго голас набыў упэўненасць і самавітасць, і гэта, як і думка пра помнік, вельмі яму імпанавала: хай ведае Артур, што ён, камандзір атрада, мысліць шырэй за таго Багдана.— Самае прыгожае і шыкоўнае месца адшукаем. Каб на кургане якім высокім, ля дарогі магістральнай. І — помнік прыгожы, каб лепшыя майстры зрабілі. І імёны народных мсціўцаў, хто загінуў,— на мармур. У бронзу! Каб кожны спыніўся, прачытаў імёны герояў, схіліў галаву, кветкі паклаў. На вякі стане помнік. От тады скажаш!

— Гэта безумоўна. Інача́й нельга. Я Багдану гаварыў...

І тое, што ён не здзівіў Артура, што той, выяўляецца, паспеў і гэта абгаварыць з Багданам, зноў сапсавала настрой Захару. Ва ўспаміны, што наплылі там, ля бацькавай магілы, Артуравы словы дадалі цяпер горычы, і Захар, сам таго не заўважыўшы, халаднавата паставіўся да Гайдаш, якая чакала іх за агароджай могільніка. Яна нешта спытала, і ён нешта адказаў, ішоў марудна, звесіўшы галаву.

«Мінулае, выяўляецца, не адышло, яно ўчэпіста жыве ў душы, прабіваецца невідочнымі і непрадбачанымі ніцямі... Іх

быццам і няма, але яны жывуць ува мне — не пазбавіцца, не закрэсліць, не нарваць...»

Наперадзе, па левы бок дарогі, зачарнеў дах млына, пачуўся плёскат вады. Гайдаш, як бы ўслухоўваючыся ў гэты пошум, спынілася, потым прысела на камень, на рабрынах якога звісала касмылямі звялая, недзе скошаная трава, паскардзілася:

— Нешта ж муляе нагу. Каменьчык трапіў, ці што...

— Я пайду,— сказаў Артур весела і, змяніўшы тон, дадаў дзелавіта, падкрэслена па-вайсковаму: — Дазвольце бегчы, таварыш камандзір атрада. Кросік дам невялічкі.

— Іш, марафонец адшукаўся,— пачаў быў Захар, але, злавіўшы ўмольны выраз у вачах Гайдаш, ухвальна махнуў рукою.— Бяжы, калі сілы няма куды дзяваць,— і тут жа спахапіўся, вырашыў перадаць даручэнне Яштокіну, зрабіць якое падказала яму гарачыня: — Адшукаеш начштаба. Скажы, каб вады з крыніцы падвезлі да трыбуны. Людзі хоць горла асвяжаць. Такая спякота смаліць.

— Будзе абед — тады асвяжаць. Багдан казаў...

— Ты што, недачуў? — узарваўся Захар, зноў пачуўшы Багданава імя.

— Ёсць адшукаць начштаба і перадаць, каб падвезлі вады з крыніцы на месца партызанскага параду.

— Вось цяпер — па-партызанску. А то дык і развучыўся ўжо. Зарана! Бяжы!

Артур казырнуў, перабег па зыбкіх мастках на той бок драўлянай плаціны і знік за будынкам млына. Гайдаш глядзела ў той бок, куды пабег Артур, але не спяшалася здымаць бот, сядзела, з дзіўнаватай увагаю аглядала Захара.

— Горача. Задуха — дыхаць няма чым,— і яна імкліва ўзнялася.— Трэба твар вадзіцаю памыць і асвяжыць.

— Ты ж мелася пераабуцца!

— Ды я знарок сказала. Прыкінулася, каб з табою пабыць. Без сведак.

Ён зірнуў на яе маркотны, нечым дужа заклапочаны твар і зазначыў дзелавіта, як гавораць пра тое, што вырашана канчаткова і перарабіць нельга:

— Ціхана возьмем за галоўную сведку.

— Ён будзе на парадзе?

— Пакуль што невядома. Але ў Віцебску — будзе. Пасля параду — шуснем туды. Аформім усё як належыць. І скончыцца наша туляние. І табе гэта абрыдла. І мне. Праўда ж?

Яна не адказала, запыталася сама, неяк задумліва, з прытоеным сумам:

— А ты канчаткова вырашыў даваць згоду на гэтую

працу ў абкоме? — і дадала, быццам даючы магчымасць не спяшацца з адказам, нешта ўзважыць і абдумаць: — Ці згода тут нічога не значыць і не важыць?

— Яшчэ як важыць! Калі няма ахвоты — ніхто не прымусіць. Але ж такую прапанову трэба лічыць за вялікі гонар. Не ўсім такое і прапаноўваюць,— і ён размашыста, як стандартны задавака, сам над сабою смеючыся, расправіў рэмень, набарабаніў па верхніх гузіках скуранкі.— А Захара твайго, як бачыш, шчэ і ўпрошваюць!

— Партыйная работа — гэта ж складана дужа, як мне здаецца. Ды цяпер: суцэльнае разбурэнне, скрозь усё фашыстамі паншчана...

— Ёсць у мяне сумненні, ёсць,— даверліва прызнаўся ён, адкінуўшы роблепую пыху.— Складана — ведаю. Што цяжка будзе — гаворкі няма. Мяне толькі што суцяшае і абнадзейвае? Аддзел жа школ весці! А хіба ж я школу не ведаю? І я, між іншым, умову абавязкова пастаўлю: выкладчыцкую работу не кідаю. Гадзіну ці дзве — у школе.

Яна прамовіла няпэўна:

— Наўрад ці магчыма такое сумяшчэнне.

— Немагчымага цяпер для нас, беражаначка, няма. Ды адмоўлюся, калі на тое пайшло, ад гэтае работкі начальніцкай. І пакоцім мы з табою ў родныя нашы партызанскія мясціны. Хіба кепска будзе ў Вуглах, скажам? Альбо ў Баноні? Будынак бальніцы там ацалеў, адрамантаваць толькі — табе ёсць месца, дзе працаваць. А школу — адбудуем. І ўяві сабе: човен я змайструю, пасля работы, па адвячорку — на азярцо з вудамі. Слаўна?

— Ты калі гэта надумаў? Цяпер вось?

— Але... А што, кепска хіба надумаў?.. Асцярожна, асцярожна! Камяні тут мокрыя, бачыш, пыл вадзяны асеў? Слізганеш ды ў вір...

Яны спусціліся з пляціны на чысты, затрамбаваны хвалькамі пясок прыберага. Захар павесіў аўтамат на рабрыну граніту, ружаватага, з буйнымі лушпайкамі слюды, якая зіхацела, бы шкло, кінуў поверх скуранку, рашуча садраў гімнасцёрку і, шумна форскаючы, пачаў мыцца да пояса. Гайдаш жа доўга і старанна мыла толькі рукі, потым, сагнуўшыся, гэтак жа доўга плёхкала вадою сабе на твар.

З праломак у ставах вырываліся тугія, сінявыя па краях і белыя ўсярэдзіне струмені, білі ў зялёны, зацвілы вадазліў і звальваліся ў пенную, вірлівую прорву; ад пошуму і плёскату вады пазвоньвала ўвушшу, галасы гучалі глуха.

— Мне здаецца, што ты ў наш вуглянскі план не дужа і верыш,— прамовіў Захар, але, гаворачы, не глядзеў на Гай-

даш, расціраў рукамі грудзі.— Ухвалы я пакуль што не пачуў. Баноць ці Вуглы табе больш па душы?

— Ёсць адзінае месца, якое больш ад усяго мне на душы — Віцебск. Там нарадзілася. Там вырасла. Там вывучылася. Віцьба і бераг Дзвіны мне мільён разоў сніліся...

— Вось сны твае і спраўдзіліся. Але толькі адно ты ведай цвёрда: наўпярок тваёй ахвоце я нічога ніколі не буду рабіць. Як скажаш — гэтак і будзе! — Захар пляснуў далонямі сабе па грудзях, як бы ставячы кропку на тым, што сказаў.

— Праўда?

Халаднаватая вада сагнала кволасць і расслабленасць, ва ўсім целе была бадзёрасць: Захар адчуваў сябе задаволеным і ад таго што зрабіў, і ад таго, што сказаў,— добры настрой вярнуўся. Усё бачылася наперадзе чыстым, ясным, без буйнай турботы і смутку, і ён паўтарыў велікадушна, надзяваючы гімнасцёрку рашучымі рухамі:

— Словы на вецер твой Захар калі кідаў? Ты ж гэта ведаеш. Я табе кажу: як сэрца падказвае — гэтак і зробім. Як зараз скажаш — гэтак і будзе.

— Ты толькі не крыўдуй.— Яна правяла па яго твары рукою, на міг затрымала далонь на вуснах, потым перавяла на падбародак і, апусціўшы павольна, пачала зашпільваць на яго гімнасцёрцы гузікі.— Толькі ты не крыўдуй. Добра?

— Крыўдаваць? Ты што гаворыш? На першым часе ў Віцебску, праўда, будзе нам цяжкавата. Шкада, я не папытаў у Ціхана пра жытло. Але ж неяк будзе...

— І правільна зрабіў.

— Ты ведаеш, я таксама гэтак думаю,— ён, задаволены, з удзячнасцю ўглядаўся ў яе вочы.— Я ніколі не быў тарбахватам. Спачатку — праца. Усё астатняе — потым: самі сабе дарогу працярэбім. І жытло будзе, і ўсё, што трэба. Не маленькія.

— Ты не зразумеў. У Віцебск я не паеду.

— Я-яа-ак? Ты ж толькі што сказала, што гэты горад табе па душы! Ці, можа, мне падалося?

— Не, не падалося. І жыць я хачу толькі ў сваім горадзе — у Віцебску. Але цяпер — пад Шаўляй мая дарога.

— Пад Шаўля-яй?!

— Але... Франтавы шпіталь адпраўляецца туды заўтра. Пад сакрэтам сказаў Мішчанка. Ён — начальнік шпіталя.

— А ты якое дачыненне да таго шпіталя маеш?

— Мне прапанавалі. Сёння ранкам. І я дала згоду.

— Згоду дала? Я затое згоды не дам! — Захар ярасна цярпнуў кулаком па лбе. Ён ажно нанацеў ад раптоўнага ўзру-

шэпня.— Мішчанка мне нейкі адшукаўся! Хто яму дазволіў людзей з атрада забіраць? Паламаю я ўсё гэта. Не паедзеш! Што ўдумала! З Мішчанкам нейкім ехаць? Я табе па-аеду!

Ён памахаў рукамі, страсаючы вадзяныя кроплі, нахіліў галаву, паматаў ёю, быццам спрабуючы адштурхнуцца, пазбавіцца ад слоў, якія толькі што пачуў і якім не паверыў, потым зноў паглядзеў на твар Гайдаш уважна і строга. На бровах Гайдаш бліпчалі кроплі вады, сонечныя промні драбіліся, адскоквалі ад іх, і за гэтым бляскам смарагдавых бусінак вялікія светла-шэрыя вочы выдавалі незвычайна глыбокімі. Ён правёў рукою па яе бровах, і кропелькі вады зніклі, і ён пакратаў зноў пальцамі бровы, нібыта прыгладжваў іх, потым пасунуў далонь вышэй, па гладкім і халаднаватым ілбе; пальцы заглыбіліся ў мяккія шаўкавістыя валасы, і ён адчуў іх выбуховую цеплыню.

«Валасы ў яе цёплыя заўсягды. Мя-якаенькія, бы ўгрэтыя...»

І, разам з гэтай думкаю, абрынулася на яго гарачыня тых начаў, што правялі яны разам, і ажылі словы, якія ён шаптаў ёй і якія вымаўлялі яе вусны, ажылі і з гэтакай жа раптоўнасцю аддаліліся, зніклі, і яму падалося, што яны падманулі, ашукалі нечакана і бессаромна, вызналі, выцыганілі сакрэт, які ён бярог у сваім сэрцы, таіў ад усіх, і цяпер, вызнаўшы, забралі той сакрэт сабе, а яго кідаюць, адкідваюць, бы пустую абалонку, якая анікому больш не патрэбная.

— Да мяне толькі цяпер дайшло,— ціха прамовіла Гайдаш.

Ён глядзеў на яе, быццам усё яшчэ не верыў, потым з цяжкасцю выціснуў, і голас яго прагучаў сіпла:

— Што?.. Што да цябе дайшло?

— Назвы не магу дабраць.

— Я магу табе падказаць яе, тую назву. Падказаць?

— Маўчы, Захарачка, маўчы! Ты зараз скажаш тое, што казаць апяк не трэба. Ну, як гэта табе патлумачыць,— на яе твары была роспач, шчырая, не робленая, а тая, што ішла ад збалелага і спакутаванага сэрца.— Нават не ведаю дакладна... Раней я нават і не верыла, што раблю правільна,— як ішлі сюды, не верыла. Толькі ты зразумей, Захарка. Гэта мне толькі тут, калі ты на могільніку стаяў ля магілы бацькавай, адкрылася. І я тады ўбачыла, тады і зразумела: ты — не мой яшчэ. Ты яшчэ ў тым мінулым, там, дзе жыў раней, і нам удваіх гэтага не закрэсліць. Адзін — ты гэта зробіш. А калі я побач — не зможаш. Я побач буду — на мяне абрынецца гнеў мінулага, і твой гнеў таксама, які ты нават патлумачыць не зможаш. Ты адзін павінен прайсці на гэтым

горадзе, на адзіноце навінен перажыць горыч таго попелішча. І ў Віцебску зведаеш горыч — яна пойдзе следам. Але там у тваім сэрцы не будзе адзіноты. Там — буду я, беражаначка твая. Табе вулкі — пра мяне нагадаюць. Віцьба — пра мяне заплюскоча. Табе Дзвіна — пра мяне загамоніць. Мужчына гэтага не зможа зразумець адразу... А мы, жанчыны, разумеем гэта таичэй, глыбей, адразу... І ты ведай: ува мне ты будзеш штодня, дзе б я ні была. Беражаначка к табе вернецца. Былі б толькі крылы. А крылы мне ты даў!..

— Нешта не тое ты гаворыш, што трэба. Мяне папярэдзіла, а сама і гаворыш тое, што не трэба. І робіш не тое, што трэба рабіць!

— Тое, Захарка! Тое! Я хачу, каб ты ішоў па вуліцах, а шэпту за тваёй спіной не было. Хачу, каб ты ішоў адзін. Ганарлівы. Незалежны. Мудры і справядлівы. Ганарлівы ў сваёй праўдзе. Мужны ў сваёй бядзе. А я здаля буду ганарыцца табою. Сваім Захаркам буду ганарыцца. І здаля і зблізку. Вось гэтак, як беражаначка твая — бачыш, бачыш, яна ляціць?! — буду да цябе імчаць!

— Ты кідаеш мяне. Я пачынаю гэта разумець.

— Не! І мільён разоў — не! Толькі мая дарога к табе — цяжкая. О-ой, ты зірні. Яны тамака гняздуюць. Туды беражаначкі ляцяць...

У пошуме вады, што скатвалася з вадазліва, голас Гайдаш гучаў глуха, і было дзіўна бачыць, як бязгучна хістаюцца ад ветру кудлатыя вербы, як бязгучна праносяцца над вадой беражанкі, як правальваюцца ў чорныя адтуліны ў жаўтлявым касагоры, які то знікае, то раптоўна выныравае з-за зялёна-жоўтага лісця. Захар глядзеў на той касагор, бачыў, як знікаюць у тых чорных ямінках-пячорках імклівыя беражанкі і зноў выныраюць, праносяцца нізка ля вады, строма завіхваючыся над вадазлівам у блакітную прастору, і штораз, калі гнуткія галіны вербаў адкрывалі россып чорных дупельцаў на жаўтлявай гліністай строме, яму здавалася, што ён бачыць удалечыні нейкі надпіс; яму мроілася, калі пачынаў углядацца ўважна, што літары зараз складуцца ў нейкае слова, якое яму вельмі патрэбнае, якое можа адкрыць яму нейкі важны, дужа неабходны сэнс, але ў той міг, калі, здавалася, ён ухопліваў пачатак таго слова, парыў ветру, бы зялёнаї мяцёлкаю, сціраў на жаўтлявай дошцы касагору тыя літары; за кожным разам літары мяняліся, змяншаўся іх памер і колер, і толькі аднолькава густым і ярасным быў узмах гнуткіх галін, што знішчалі тыя незразумелыя фрэскі, сэнс якіх да Захара не даходзіў аніяк.

— Сёння я анікуды не паеду. Пачакаюць яны мяне там. І аддзел той пачакае. Праўда ж? — Захар уклаў у гэтае запытанне ўсю сваю ярасць, якую ледзьве стрымліваў, уклаў нязгоду з тым чалавекам, якога не ведаў і які зманіў Гайдаш да сябе ў шпіталь.

Яна адказала ціха, таячы радасць:

— Як скажаш — гэтак і будзе.

Яго ўласныя словы ў вуснах Гайдаш набылі новы сэнс, якога ён не ведаў раней і аб якім не здагадваўся, і Захар зразумеў, што праўда на баку гэтага сэнсу і супраць гэтай праўды ён не можа ісці і ніколі не пойдзе.

## 26

Плынь Дзвіны ціха гнала човен усё далей і далей ад горада, і гарадскія гмахі, задымленыя, з чорнымі праваламі замест акон, здаваліся злавеснымі і засталіся ззаду ўжо; была відаць выразна толькі вежа старадаўняй Сафіі, якая то раздвойвалася, то зноў як злучалася ў адну і стромай белай лініяй крэсліла блакітнае неба; паабапал ракі, над узваламі, то пакатымі, то няроўнымі і гарбатымі, бязгучна гнуліся і матляліся жаўтлява-чырвоныя лазнякі; часам, калі ветравы подых быў працяглы і моцны, лістота варушылася, лазнякі зменьвалі свой колер, рабіліся падобнымі на попельны палыновы пласт, і тады яшчэ мацней рабілася ўражанне, што човен нікуды не плыве, стаіць на месцы, а паціху сунецца, адплывае назад усё тое, што ёсць на беразе.

Туды ж, назад, у зіхатлівы бляск вады, адплывала і Багданава песня, якая закалыхвала Чаславу, але не спараджала сапліваспі, абуджала ў душы сум і незразумелую трывогу.

Халодным срэбрам з'яюць хвалі
Між гор лінучайся ракі...

Як жа ўсё знаёма! Гэтак жа вось, на другі дзень пасля вяселля, плылі яны з Багданам на чоўне па Дзвіне. І ён, вось гэтак жа, як і зараз, спачатку плёхкаў вёсламі, выбіваючы пырскі, а потым не весляваў, сядзеў, падпіраючы плячыма борт, спяваў на поўны голас, спяваў нешта вясёлае, бязладнае, і голас яго шырока разлягаўся над вадой і сцішанымі берагамі. Менавіта вось у гэткай паставе і сядзеў!.. Моцна, выяўляецца, засела ў душы мінулае, учэпіста прыляпілася. За два ж гады да пачатку вайны было тое. Ды ішчэ віхурны ваенны час, год за годам, круціў і нес, Чаславу, і

яго, Багдана. І нічога, аказваецца, не выветрылася з душы, не сплыло з памяці!..

Часлава была ўражана не ўспамінамі, якія населі раптоўна, а тым, што яна надае ім нейкае значэнне, аналізуе іх. Ды каб жа па адзіноце ў сваёй душы корпалася! Дык не ж, яна зноў разам з Багданам, разам сядзіць у чоўне, разам плыве па Дзвіне. Канчаткова, значыцца, зламалася твая даўняя, Чаславачка, непрыязнасць да Багдана? Канчаткова, значыцца, ты яму ўсё даравала? Але ж дзе, калі тое адбылося? Але ж дзе, калі настаўлена гэтая новая і, разам з тым, апошняя кропка па тваім недаверу да Багдана?

Дзіўна...

Дзіўна, ведама, цяжка нават і патлумачыць.

Але самае, мабыць, дзіўнае тое, што яна, Часлава, разматвае клубок тут, у чоўне, вырашыла высвятляць усё менавіта зараз, калі назад ужо і не павернеш. Пагадзілася ехаць? Пагадзілася, ніхто сілком не цягнуў — дык сядзі цяперака. Сама, па сваёй волі ўлезла ў човен? Сама, ніхто не прымушаў — дык і не бунтуй! Яна, зрэшты, і не бунтуе. Толькі ж як спасцігнуць, як патлумачыць гэтую невядомую, незразумелую трывожную дваістасць, што не праходзіць, жыве невыводна ў сэрцы?.. І не проста ж жыве! Ад самага першага дня, як злучыўся атрад з рэгулярнымі часцямі арміі, аніводнай ночкі не прайшло, каб не нудзілася, не балела сэрца. Жывая засталася, дык тут бы радавацца, у скокі пайсці, спяваць! А ёй, Чаславе, аніяк на спакой не выбіцца, усё як нечага чакае яна, сама сабе робіцца брыдкай, за тое, што напусцілася, саўладаць з сабою не можа.

Увесь апошні час Багдан нібыта пільнаваў Чаславу. Атрад шмат калясіў і ўдзень і ўночы па лясах, вылаўліваючы фашысцкіх недабіткаў,— Багдан заўсёды побач апынецца. Ніякай перадыхі і потым атраду не было — сенакос пачаўся, трэба было вяскоўцам дапамагчы. І як не дапаможаш, калі па лугах толькі жанчыны ды падлеткі — рэдзенькі, кволы ланцужок дзе-ндзе ўбачыш. А травы нарасло! Як уздыхнула вольна зямля, скінуўшы з сябе фашысцкую погань,— ірванулася трава да сонца. Бралася варочаць пракосы Часлава ці падграбаць сена — Багдан навідавоку, як прывязаны да яе, швэндаецца.

І амаль не было таго дня, каб ён не цвердзіў, што трэба падскочыць у той дот, дзе Часлава ляжала параненая — забраць дакументы, якія яны тады прыхавалі. Вялікай патрэбы рабіць тое, як здавалася Чаславе, не было. Шпітальныя спісы параненых партызан нікому зараз непатрэбныя, бо састарэлі — Яштокін склаў ужо справаздачу аб дзейнасці

атрада ў апошні час і прозвішчы параненых партызан, якіх лячыла Часлава зімой і напрадвесні, там ёсць. Ды і ўвогуле, што там, у тым доце, цяпер знойдзеш? Ладна ж дзён мінула, зжэрла, мабыць, вільгаць тыя паперкі, што заціснулі яны тады ў старым пагбаны цыні: ад патронаў.

Усе яе пярэчанні Багдан не абвяргаў. Але ўсё роўна настойваў, даводзіў, што трэба схадзіць, адшукаць і забраць дакументы, каб яны, пры якім-небудзь выпадку, не трапілі ў чужыя рукі. Дакумент — ён, маўляў, заўжды дакумент. А ў спісах параненых адрасы ёсць — ён гэта бачыў. Навошта ж, каб злыдню якому трапілі партызанскія паперы праз яго, Багданаву, ляноту?..

Калі празмерна падакучвала такая настырнасць, пачынала раздражняць Чаславу,— а Багдан, між іншым, адразу ж тое прыкмячаў! — ён пачынаў жартаваць. Хіба, маўляў, не хочацца ёй, пры святле дня мірнага, паглядзець на калыску, дзе другі раз нарадзілася на свет боскі? Хіба, маўляў, не хочацца ёй па Дзвіне паплысці, на светлае неба паглядзець, пра будучыню памарыць пад плёскат вады і пошум травы? Хіба ж, маўляў, не хочацца ёй пасядзець увечары ля вогнішча, зварыць «мірную юшачку»?

Яна пасмейвалася: хочацца, безумоўна, і тую калыску паглядзець, і на чоўне пакатацца, і пра будучыню памарыць, і «мірнай юшачкі» пасёрбаць. Пасмейвалася і нічога пэўнага не казала і не абяцала.

А сёння, перад пачаткам партызанскага параду на беразе Дзвіны, Багдан, пачаўшы сваю звычайную гаворку, быў упарты і настойлівы надзіва. Сёння і заўтра, як вядома, вольны ў іх з Чаславай час, надвор'е спрыяе, каб «катануць па Дзвіне», а заўтра можа ўдарыць дождж, а калі і не будзе таго дажджу, дык на «мірную юшачку» часу не знойдзецца — атрад на тыдзень, як ён даведаўся, зноў пасылаюць касіць сена, дапамагаць калгасам у аднаўленні грамадскай гаспадаркі. А потым увогуле невядома, як яно павернецца, бо ўсіх маладзейшых з атрада забіраюць у армію, і ён, Багдан, напэўна ж не застанецца на аднаўленні горада, ды, уласна кажучы, няма ахвоты заставацца, лепей пайсці да канца, паглядзець на той Берлін. Ён, Багдан, вернецца з таго клятага фашысцкага логава дамоў і, вярнуўшыся, абавязкова павязе Чаславу ў чоўне па Дзвіне, абавязкова зварыць юшачку акунёвую... А раптам і не вернецца? Ён, Багдан, хоча, каб у Чаславы засталася добрая памяць аб ім, гаротніку, які толькі ў тым і вінаваты, што аднойчы пакахаў адну жанчыну і не можа аніяк закрэсліць яе ў сваім сэрцы.

Ён казаў шчыра і пераканаўча. І зусім не па камень,

о-ой не на камень кляліся яго словы — жанчына ж слухала! Яна, праўда, наспрабавала бараніцца ад яго настырнасці і апошнім: дзе, маўляў, зараз човен знойдзеш, калі ўсё скрозь пабіта, разбурана, паламана. Ён абярнуў і гэтую яе спробу адмовіцца, абярнуў з усмешкаю і лагодаю. Човен? Пяты дзень, маўляў, чакае. Нават шнуры падрыхтаваны, бартулі запашаны. Яна засмяялася, уражаная і задаволеная яго клопатам і ўвішнасцю: от жа які пралаза, от жа які прапыра!

«Багдан, мабыць, ва ўсіх сваіх парываннях да мяне шчыры і непасрэдны. Ён — кахае!..»

Гэтая думка сагрэла, усхвалявала і прымусіла завагацца. А ён, злавіўшы перамену ў яе настроі, адразу кінуў на шалі тое, што прымусіла сэрца Чаславы закалаціцца. Пошук дакументаў, рыбалка — гэта, маўляў, толькі адчэпнае, дэкарацыя. Што галоўнае? Яго цягне ў тыя мясціны, дзе некалі ён, Багдан, быў шчаслівы. Цягне і ў тыя мясціны — усё ж у той бок плыць, па Дзвіне! — дзе загінуў яго бацька: хоць кветку якую пакласці на магілу чалавека, які быў і ёй, Чаславе, некалі не чужы, які ставіўся да яе з павагаю, клапаціўся шчыра, па-бацькоўску.

Як тут было запярэчыць?

Але апошняе слова, як ні дзіўна, належала Захару. Каб ён тады, пасля параду, не проста кінуў адчэпнае, паспешліва — «У Віцебск еду. Загадана»,— а пра нешта пагаманіў сардэчна, пра той загад хоць збольшага расказаў, усё, магчыма, павярнулася б неяк інакш. Мажліва? Ды аніколі б у жыцці не дала б яна згоду ехаць з Багданам! Ды аніколі ў жыцці не была б яна разам з Багданам у чоўне! Але тое, як ішоў Захар да Гайдаш, якая воддаль ад усіх чакала яго, як ён смяяўся, нешта расказваючы ёй, было, мабыць, апошняй кропелькаю. Змрочнай ліпучай хваляй падціснула сэрца туга і адзінота, нарадзілася нечаканая крыўда на Захара. Родны брат і той як здрадзіў ёй — іш, як папыліў да Гайдаш! А хіба ж не мог ён паклікаць яе, Чаславу,— сястра яна, не чужы чалавек! — прапанаваць разам правесці гэты дзень, пабедаваць разам, пра нешта падумаць? Мог! І абавязаны быў! Дык жа ж не! Толькі адну гэтую сваю «беражапачку» і бачыць! А Багдан сядзіць, упурыўшыся, ля вады, яе, Чаславу, толькі чакае, толькі аб ёй і думае!

І тады ўсё ў душы перайначылася, ліпучая хваля самоты пачала чэзнуць, расплывацца. Толькі Багдан яе не кінуў! Як сабака адданы ёй, след у след ходзіць, з надзеяй у вочы глядзіць. Дык чаго ж ёй не ўсміхнуцца яму! Чаму не ўсміхнуцца небу і сонцу? З гэткага віру выдралася, да святла

прабілася, да жыцця! Дык досыць маркоціцца! Далоў нуду! Скруху — прэч!

Прыгадваючы цяпер усё тое, яна прыходзіла да высновы, што зрабіла разумна. Тое, што пратэст жыве нейкі ў душы,— натуральна. Але гэта добра, што яна пагадзілася сесці ў човен і паехаць на Дзвіне. Ззаду — разбураны горад, чорныя, задымленыя гмахі, спякота, дымны смурод. Наперадзе перад ёю — бляск вады, пахкае паветра, сінеча чыстай, нічым не заплямленай высі. Добра будзе і пасядзець ля вогнішча, пасёрбаць «мірнай юшачкі», паразважаць аб тым, што было, што страчана, што набыта, неяк адысці ад скрухі і тугі, ад трывогі, ад жахаў нядаўніх дзён, адчуць сябе ў жыцці без стрэлаў, з добрай надзеяй у заўтра, і аб ім, заўтрашнім жыцці, паразважаць спакойна, анікуды не спяшаючыся, без адчування таго, што камандзір зараз цябе пакліча, нешта загадае. Трэба, перш-наперш, падумаць і пра галоўнае: што рабіць, калі яна атрымае адказ на сваё запытанне ў дзіцячы дом, дзе гадуецца яе Толічак? Паехаць туды адразу і прывезці сыночка сюды? Ці пачакаць да канца вайны? Перамога блізка, вайне не сёння, дык заўтра — канец! Пачакаць, вядома, крышку давядзецца. Але ж не гэта галоўнае. Галоўнае — яна разам з Толічкам будзе побач: ён — вучыцца пойдзе, а яна — працаваць... Гэтае, галоўнае, не вымагае ад яе напружання і нейкай развагі: тут усё ясна, як гэтае неба над галавою, дзе аніводнай хмурынкі. Тым не менш паразважаць проста неабходна: і з жытлом шчэ не вырашана — ушчэнт жа горад разбураны і спалены, і з будучай работаю не ўсё вызначылася...

Але думкі ўпарта не ішлі ў тое заўтрашняе — у тым заўтрашнім не было няпэўнасці і трывогі,— яны ўпарта круціліся вакол мінулага, вакол таго, што было даўно. І тое, даўняе, помніцца, бачыцца нават лепей, больш выразна, чымся тое, што адбывалася нядаўна. І дзіўна не толькі гэта, а нейкае абвостранае адчуванне, што нічога наўкола не змянілася пасля вяселля, пасля тых дзён, што адляцелі ў нябыт, зрабіліся даўнінаю.

«Нібыта ўсё той жа і човен, і бераг, і лазнякі, і Багдан, і я сама...»

Усміхнулася, галавой пакруціла. Не, галубка, падман гэта. Той човен, на якім вы тады плылі, быў добра прасмолены, пафарбаваны, а гэты — з адзінай лаўкаю, патрушчаным стаяком у карме — нехта жыўцом выдраў-выкруціў прабоі, да якіх мацаваўся некалі ланцуг,— з бартамі, што ў многіх месцах пасечаны кулямі і цяпер назатыканы анучамі. Той човен даўно, відаць, на дне рачным альбо пасечаны і ў печы

спалены; ці, магчыма, нехта вось гэтак жа на ім плыве ды пра сваю долю маракуе... Так, не той гэта човен, не тыя і берагі. На берагах стаялі тады старыя клёны, а зараз аніводнага не відно, спілавалі, мабыць, на дровы гараджане, і чаромхі, здаецца, паменела — адны тонклявыя лазнякі скрозь. Багдан быў тады летуценны, узнёслы, а цяпер вунь і сівізна на скронях, чырвоны рубец праз усю шчаку і ля вуха, быццам уціснута ў скуру гузаватая вяроўка; завастрыўся падбародак і цёмная ручаінка-зморшчына ўелася ў сярэдзіну лба; радзейшыя зрабіліся і валасы, ужо амаль і не кучаравяцца...

«А сама ты якая? Ты на сябе, галубачка, паглядзі!..»

Бачыць сябе хацелася прыгожай і маладой. Яна звесіла галаву да вады, узіралася ў свой адбітак, бачыла гожы твар, пышныя валасы і доўгія — радавалася. Але ў сэрца глыбока радасць не прабівалася — падціскалі думкі зусім не вясёлыя. Зусім не тая Часлава плыве зараз у чоўне — з гэтым не будзеш спрачацца! Тады была дзяўчына, поўная радасці і адчаю, ганарлівая, што перамагла, не паддалася падману, найшла з чалавекам, які кахае,— пайшла з Багданам, кінуўшы Мсціслава Балаша, які — у адзін жа голас цвердзілі сяброўкі! — здрадзіў ёй, плёткі розныя пускаў... А потым, праз няпоўны год, горка плакала, прыціскаючыся да грудзей гэтага, ненавіснага нядаўна, які, выяўляецца, і не здрадзіў, і аніякіх плётак не пускаў... Прыціскалася і прасіла дараваць. І ён таксама прасіў дараваць, ва ўсім, што здарылася, толькі сябе вінаваціў...

«Чаго ж цяпер, калі даўно сатлела ў зямлі тое, аддаеш і вернаеш сэрца, я спрабую зноў прайсці па шляхах сваіх памылак, памылак дурноты і маладосці?..»

Адвяла позірк ад вады, глядзела на неба — прыходзілі думкі сталыя і цвярозыя, бязлітасныя ў сваёй праўдзе. Не дзяўчынка ты, Часлава. Добра, што хоць цяпер разважаеш па-даросламу. Вочы бачылі, што рукі бралі? Бачылі. І сядзіць цяпер побач муж твой. І ён кахае цябе, у гэтым няма сумнення. Кахай і ты яго! Закрэслі тое, што не вернецца! Жыві тым, што ёсць! А што ёсць? Тое, што бачаць вочы. Вось сядзіць ён, чалавек, які ўратаваў табе жыццё. Цябе ратуючы, ён неадпойчы рызыкаваў жыццём. А якую клятву даў узімку, калі пайшла ты з калонаю мабілізаваных за лінію фронту? Паспрабуй закрэслі гэта ў сэрцы!..

> Дзе блішча збожжа ў яснай далі,
> Сінеюць міла васількі...

Багдан выхапіў з песні — ён ужо двойчы даводзіў яе да канца, спяваў з адчайнай, непрытоенай тугою — гэтыя два радкі, выхапіў з горкай развагаю, вывеў на высокай ноце, а потым нечакана абарваў спеў, прамовіў са шкадаваннем, запусціўшы руку ў ваду за борт чоўна:

— А якая тады вада была — не памятаю...

— Калі гэта? — Часлава спытала знарок, адразу здагадаўшыся, што меў на ўвазе Багдан.

— Як плылі з табой пасля вяселля. Неба — памятаю. Берагі — таксама. А вось вада... Няма яе, той вады. Тая вада далёка, не вернецца аніколі. Яна ўжо там, дзе «сінеюць міла васількі...», як у песні пяецца...

— Ты мудры зрабіўся.

— Значыцца, раней дурны быў. У тваіх разважаннях заўсёды логіка жалезная. Ты толькі не крыўдуй. І скажы шчыра: не шкадуеш? Маю на ўвазе гэта,— і ён пастукаў мокрай даланёю па борце чоўна; на дошках засталіся адбіткі пальцаў, нейкіх дужа доўгіх, і па іх сцякала вада.— Ну, што едзем... Гэта маю на ўвазе.

— Не, Багданка, не шкадую. Ты гэта здорава прыдумаў. І тое, што настояў — разумна зрабіў. Я табе нават удзячная. Калі ўжо шчыра аб усім да канца, дык і тое, што жывая,— твая заслуга. Мог жа кінуць тады, параненая калі была... А вось жа не кінуў. І суцяшаў усё, абнадзейваў — гэта з памяці не сатрэш...

— Я выконваў загад. Захар сказаў: без яе ў атрад не прыходзь. А Захара ты ведаеш. Дарэчы, ты не чула, навошта яго ў Віцебск выклікаюць? Розныя, чуў, пагудкі ідуць.

— Пагудкам я не веру. Я ўзяла і папытала. І ён мне ўсё расказаў, бо ніякага тут сакрэту няма.

Часлава пачала расказваць пра тое, аб чым дачулася ад Захара, і, расказваючы, зноў пакутавала праз тую няўвагу, з якой ён, дзеля адчэпкі, паведаміў, што яго выклікаюць у Віцебск і прапаноўваюць працу ў абкоме.

— Разам з маладой жоначкаю паедзе,— перапыніў яе Багдан, і яна зразумела, што ён ведае больш за яе.

— І ў гэтым аніякага сакрэту няма!

— Што праўда, дык праўда. Яны ўжо і не тояцца: як галубочкі адно ля аднаго. Заўважыла?

— Заўважыла. І не толькі гэта!

— Нават? Ну-у-у! І што ж заўважыла?

— А тое, што гэткага хараства, як тут, у іх зараз і няма.

— Значыцца, не крыўду-еш,— працягнуў Багдан і, узбунтаваўшы рукою ваду, сыпануў пырскамі на Чаславу.— Золата табе за гэта! Смарагды!

— Танныя твае смарагды!

— За мной, як за царом, не прападзе: будуць і сапраўдныя. Усю цябе імі асыплю.

— Добра, пачакаю.

— Навошта чакаць? Верыць трэба!

Ён выцягнуў вёслы з жагалёў, наклаў іх на борт, а сам асеў у носе чоўна, задраў галаву ў неба і зноў зацягнуў песню спачатку:

Ад родных ніў, ад роднай хаты...

Купецкая фанабэрыя, з якой Багдан паабяцаў ёй незлічоныя багацці, адчайнасць у голасе, шчырая абыякавасць да ўсяго свету, што выразна прабівалася ў Багданавай паставе, выклікала захапленне. І яно, гэтае захапленне, Чаславу напалохала. Яна зноў звесіла галаву над вадой, са здзіўленнем углядалася ў высветленую глыбіню, таямнічую і загадкавую. Сонца было па той бок чоўна, і адсюль, ля зацененага борта, увесь час на рачным дне як бы сунулася светлая, падобная на скасабочаны прамавугольнік палоса, і ўсё тое, што трапляла ў яе, было добра відаць. Напачатку нават здалося, што пад дні́шчам чоўна ёсць нейкае акенца, у ім гарыць святло і святло тое прабівае тоўшчу вады, па чарзе, метр за метрам, высвятляючы рачное дно. Вось шэрыя, як замшэлыя, граніты, побач светлыя каменьчыкі, вузкі клін жоўтага жвіру, гнуткія фіялетавыя водарасці, ля якіх спаважна варушачы плаўнікамі, стаіліся дзве вялікія рыбіны. Не, вось крутнуліся рыбіны, зніклі ў цемры, што неадступна сунецца за светлым прамавугольнікам. І нават здаецца, што і голас Багдана таксама ліецца адтуль, з таго асветленага акенца. Гайданууся, звузеў і знік светлы прамавугольнік — плынь пакруціла човен. Сонца цяпер з гэтага боку чоўна, і вада ўглыбі цёмная, б'е ў вочы зыркае зіхаценне плыні. І гэткае ж зіхаценне ў немігатлівых Багданавых вачах.

— Дзівосныя твае вочы, Чэська. То чорныя яны, бы ненавісць, то ласкавыя, як васількі,— глухавата прамовіў Багдан, узіраючыся ў сінявае мроіва над вадой.— Яны, твае вочы, мяне на гэтай зямлі ўтрымалі. І трымаюць, загінуць не даюць. Я толькі цяпер, апошнімі днямі, зразумеў, што тады, цябе ратуючы, свой уласны лёс ратаваў...

— Няўжо Захар быў гэткі жорсткі? Без яе, маўляў, і ў атрад не прыходзь?

— Ха-ха! Не прыходзь! Ведаеш, што ён мне тады паабяцаў? Не знойдзеш... Не, ён не так сказаў. «Расстраляю, калі не знойдзеш!» Дакладныя яго словы.

— Гэта ён у гарачцы паабяцаў.

— Цяпер лёгка казаць. А вось пасядзела б ты тады ў маёй скуры!

— За тваё добрае лёс табе і ўсміхаецца.

— Мой лёс — ты. Мне добра толькі тады, калі ты мне ўсміхаешся...— Багдан утаропіўся ў сінечу неба, потым змружыў вочы, зацягнуў да адчайнай звонкасці ў голасе: «...сінеюць мі-і-і-іла ва-а-асі-і-ількі-і-і-і...»

Аўтаматы, што ляжалі ў карме чоўна, укрытыя ватоўкаю, мулялі бок, Часлава пасунула іх локцем, глядзела на вастраверхія шаравата-белыя валуны, што вытыркаліся з вады. Удалечыні, пад левым берагам асабліва, дзе мроіва над вадой густа сінела, камяні, здавалася, выстрайваліся суцэльнай сцяною, але спакваля, калі да іх падплывалі, сцяна тая адсоўвалася, пакідаючы на рачной плыні гарбатыя блішчастыя граніты. На адным з валуноў мітусілася плісачка, то падбягала да вады, быццам нечага ў ёй выглядаючы, то ўзлятала па сярэдзіну вострага грэбеня, трэсла доўгім чорным хвосцікам, вінькала, быццам увесь час некага жаласліва клікала.

«Вось я, між іншым, бы гэтая плісачка...»

Параўнанне не абразіла Чаславу, не выклікала шкадавання, толькі сціснулася, як ад смагі, горла. Сапраўды, мітусіцца яна... А дзеля чаго? Што шукае? Багдан жа кахае яе. І даўно, сто разоў даўно гэта. Балаш жа... Знічкаю мільгануў і знік! Вось і скажы сабе, што не было гэтага ў тваім жыцці. Саснілася аднойчы, памроілася. А ранкам — расплылося. Не было! Няма!..

«Дзіўна, аднак, як лёгка гэта гаворыцца: няма!..»

Яе дзівіла і гэтае адкрыццё, і тое, што Багдан, як бы набыўшы нейкае чароўнае майстэрства, спявае без стомы, спявае ладна і прыгожа. Даўшы песню да канца, ён выхоплівае з яе нейкі радок, вёў яго, паўтараючы двойчы, потым паўтараў без слоў, цягнуў толькі адну мелодыю, і яна гучала выразна, адчайна горка і жаласліва. Песня адгукалася ў сэрцы Чаславы то сумам, то абуджала добрыя надзеі, і яна ўсё сілілася пераканаць сябе, што калі і была шчаслівая яна, Часлава, дык вось гэта зараз. А што? Хіба было калі-небудзь за апошнія гады хораша ёй вось гэтак, як зараз?.. Не, не было. Увесь час яна жыла ў трывозе, непакоі, у турботах, у хваляванні, у думках пра страты непапраўныя, у думках пра малога сыночка, ва ўпартым чаканні светлага і добрага. А зараз яна поўнасцю раскаваная, і няма адчування, што яна некуды і ад некага ўцякае. Дый сапраўды: ёй няма куды спяшацца, няма чаго непакоіцца, няма чаго думаць пра тое, куды плыве човен. У чоўна ёсць гаспадар — Багдан. Ён, Баг-

дан, прыдбаў недзе гэты човен, ён ім кірус, па ім увесь клопат. А ёй, Чаславе, адно толькі і трэба рабіць: грэцца на сонцы, мружыць ад задаволенасці вочы, слухаць песню. Гэтак, мабыць, спрадвеку было ў жаночым лёсе: прыходзіў мужчына, прыходзіў гаспадар і вёў яе, сваю абранніцу, за сабою, і яна, жанчына, была шчаслівая. Відаць, ёй, Чаславе, таму зараз гэтак хораша і ўсцешна, што яна не адна, што ёсць побач мужчына, які ведае, куды трэба павярнуць, куды трэба скіраваць і човен і лёс. Песня вось толькі пачынае абуджаць самоту. Як ніякай іншай больш Багдан і не ведае. І дзіўна: не стамляецца ж! Усё адно і тое ж спявае і спявае, і аніяк яна, гэтая песня, яму не надакучыць. Не, аціх. Загрукацеў вось вяслом. Верне човен.

— Што? — Часлава схамянулася.— Чаму спыняемся?

— Станцыя Беразай — каму трэба, вылязай!

— Ну-у, прыдумшчык! Яшчэ да нашага дота плысці і плысці.

— Пачакае дот. Ён — з каменю.

— А тут што ты знайшоў? — Часлава прыўзнялася і ўзіралася ў цёмны заглуш чаромхі на беразе, які разразала затока з высокімі абрывістымі ўзваламі.

— Хіба не пазнаеш? Глядзі ўважней на берагі!

— Ручай бачу,— і раптам абрысы крутых узвалаў і цёмны заглуш чаромхавых галін здаліся ёй знаёмымі, асабліва правы бераг ручая, з глiністым выступам, падобным на каменны.— Гэта ж — наш! Ву-унь, на тым узвале мы тады сядзелі. Праўда ж?

— Дзякуй, Чэська!

— Дзякуй? За якія такія даброты?

— За тое, што ручай наш пазнала. Я ехаў і думаў: калі пазнае яна наша тое месца — шчаслівы твой лёс, Багданка. Але я ў гэтым, між іншым, аніколі не сумняваўся. А вось у чоўне — загадаў. І лёс — пацвердзіў.— Ён асцярожна паклаў вясло, учапіўся, калі карма мякка цюкнулася ў пясок, ў борт і, стоячы па калена ў вадзе, усцягнуў човен падалей на бераг.— Шпуруем туды, на ўзвал!

— Як жа туды ўзлезем? — спытала з недаверам, але руку, якую ён працягнуў, узяла.— Джунглі тут сапраўдныя цяпер...

— Партызаны, ды каб не прабіліся? Знойдзем усё, нават сцежку. Наперад!

Сцежкі, аднак, не адшукалася. Але перад чаромхавым голлем паводка пакінула тэраску, і яны, бы па прыступках, хутка ўскараскаліся на ўзвал, які густа парос белай і роўнай, як падстрыжанай, канюшынай. Часлава бухнулася на

калені, потым лягла ніцма, павярнулася на правы бок, зыркнула на Дзвіну і ўголас войкнула ад шчырага здзіўлення:

— Як жа тут хораша! Капюшынка, бытта дыванок, пасцелена. Тады яе тут меней было. Памятаеш?

— Але... Толькі вунь там, пад дрэўцам, яна тады расла. О-ой, якая каралеўна выкацілa. Ты паглядзі на бярэзінку. Вы-ырасла.— Багдан ласкава абмацаў галіны бярозкі.— А была ж тады мале-е-ча саўсім.

— Яна тады далей ад краю, здаецца, расла. Бытта пасунулася.

— Бераг ж штогод паводка мые. Вось бярозка і сунецца да краю ўзвала, паўзе. Як чалавек, адным словам: год мінуў — ён ужо да свайго краю бліжэй,— і раптам уздыхнуў: — Гады два ёй тут пастаяць. Я гэта, між іншым, прадбачыў тады. І думка была: перасадзіць.

— А чаго ж не перасадзіў?

— Ты вінаватая.

— Я-я-а?

— Ну... Ласкава на мяне гэтак паглядзела — у галаве тлум адразу. Пра бярозку болей і не прыгадваў...

Унізе, пад узвалам, вагаліся пад ветрам, выгінаста матляліся макавінкі лазнякоў і чаромхі. Дрэвы былі ўнізе, голле іх, месцамі густа пераплеценае ажынаю і дзікім хмелем, захінала ўвесь левы бераг, а другі, супрацьлеглы, з чарадою старых соснаў на глiністым абрыве, здаваўся блізкім, быццам пагойдваўся на зіхатлівай плыні. Потым нешта цёмнае наплыло на сосны, і Часлава толькі нейкі міг спагадзя сцяміла, што гэта вагаецца ў яе перад вачыма бярозавая галіна, якую сагнуў Багдан.

Яна адвяла рукою бярозавую галіну ўбок, але на Багдана не зірнула, уражаная ўсё яшчэ тым, што ён толькі што сказаў. Караскаючыся па пясчаных прыступках, пераплеценых гузаватым карэннем лазнякоў і чаромхі, яна была задыхалася і цяпер тут, на гэтым касагоры, абдзьмутым ласкавым ветрам, адчувала сябе яшчэ лепей, чымся на карме чоўна. Там прыпякала сонца, было нават задушна, а тут павяваў вецер, і яго парывы несцілі, як некуды неслі. Але так было толькі напачатку, да таго часу, пакуль Багдан не зрабіў свайго прызнання пра той далёкі дзень, калі яны былі разам тут: той тлум, пра які казаў Багдан, быццам перакінуўся на яе, ударыў у галаву, і яна адчула, што ёй зноў робіцца горача, як там, на карме чоўна.

Чорна-белымі маланкамі праносіліся над макавінкамі лазнякоў і чаромхі стрыжы, кулямі завінчваліся ў сінечу і знікалі з поля зроку, каб праз нейкае імгненне зноў пачаць

свої імклівы, з посвістам, лёт. Часлава адшчыкнула бярозавую лісцінку, узяла ў зубы, прыкусіла і гэтак трымала, быццам закрывала ёю вусны ад сонца, потым запыталася, асцярожна варушачы вуснамі, засяроджаная толькі тым, каб лісцінка не зваліласяя:

— А цяпер?

— Што, цяпер? — голас Багдана прагучаў сіплавата.

— Цяпер, кажу, тлуму таго няма ўжо? — спытала, усё гэтак жа асцярожна варушачы вуснамі, баючыся, каб не стрэсці лісцінку.

Над самай кромкай узвала, нібыта вырваўшыся з цёмнай лістоты ўнізе, з цвыркапнем, пранесліся стрыжы. Яны былі ўжо недзе ў далёкай сінечы неба, а тужлівы посвіст іх яшчэ жыў, быццам ассў, заблытаўся ў белаватай капюшыне, памалу каціўся пад узвал.

— Цяпер? — Багдан нахіліўся, рэзкім рухам зваліўшы лісцінку з вуснаў, прыўзняў яе галаву, узіраўся ў вочы прагна і ўпарта.— Цяпер тлуму няма, Чэська. Аніякага. І дурноты няма. І я адно ведаю: нікому цябе не аддам. Ніколі! Хай неба глядзіць на мяне! Хай сонца чуе! Перад усім светам прысягаю!..

Яна адчула сябе няўтульна пад гэтым прагным позіркам, нібыта тая лісцінка на вуснах затуляла яе, а цяпер, зваліўшыся, адкрыла не толькі губы, але і яе ўсю. Свой адбітак, маленькі, зменены, у Багданавых вачах, у тых блішчастых зеленаватых зрэнках, яна бачыла як не сваім зрокам, як бы здаля, і яе дзівіла думка пра тое, што яна сама ўвайшла ў дзівосны новы свет, з якога ёй аніколі і анікуды ўжо не вырвацца. Яна адчувала, што знаёмая, даўно перажытая хваля пяшчоты тлуміць ёй розум, і не баранілася ад гэтай хвалі, ішла ёй насустрач, адразу і ўсё закрэсліўшы ў мінулым...

І ад сораму, ад шчасця, ад вялікай удзячнасці Багдану менавіта за тое, што ён настояў сёння на сваім, звёз яе сюды, у тыя дні пяшчоты і дзіўнага падману, яна змружыла вочы, абцiскала Багданавы плечы адчайна і смела, быццам палахліва ўцякала ад горычы, што нядаўна апякала ёй сэрца, ад болю, які ссушыў яе, і цяпер, адчуўшы, што гэты боль растае, што яна не пагубляла сваю пяшчоту, а як бы нанава ўзрадзілася ў ёй, цалавала Багдана прагна, быццам сілілася скрышыць, сцерці нават думку пра той, стары, боль, і з радасным шалам заўважала, што Багдан нейкі новы зусім, ва ўсім адчайна-нястрыманы, незвычайна ласкавы і сарамлівы, разумее яе парыў і аддае ёй сябе цалкам, ні пра што не клапоцячыся...

...Першае, што Часлава пачула, калі ачуняла ад шалёнай і прагнай пяшчоты, быў пошум лазнякоў і посвіст стрыжоў, што раз-пораз прапосіліся траха не ля самай галавы, на-над грэбнём узвала. Часлава адкінула руку, звесіла яе ўніз, і ёй здалося, што стрыжы крапаюць яе пальцы; адчуванне было не мройнае, рэальнае, і яна скоса зыркнула ўніз, засмяялася.

— Гэта ж лістота. А мне здалося — крылы стрыжоў.

— Іх не зловіш. Вё-ерткія. Малым, памятаю, мы норы беражанак спрабавалі раскапаць. Аніводнага разу да гняздзечка не дакапваліся — гэткія глыбокія норы. І абавязкова — на вышыні. На самай кручы гняздзечкі робяць.

— Там ім добра.

— А са мною табе добра?

— Ты ў мяне не пытайся пра гэта.

Ён працягла, але без крыўды, уздыхнуў:

— Зноў — забароны.

— Ты ж усё бачыш... Усё разумееш... Навошта словы?

— А мне і слоў хочацца. Ласкавых слоў я даўно не чуў... Нанова нам з табою трэба ім, гэтым словам, вучыцца.

— Навучымся. Была б толькі ахвота. Без яе нічога не дасягнеш. Нешта я човен не бачу!

— А навошта ён табе спатрэбіўся? Паляжым тут. На ўзвале до-о-обра. Задухі няма. Вецер ласкавы навявае... Зброю вось толькі... Нашу зброю дарэмна там пакінулі. Трэба было яе сюды цягнуць.

— Затужыў ужо? — Часлава, дурэючы, узбухмаціла яму валасы.— Пастраляць карціць?.. Мне дык зброя абрыдла. Хай бы яе век мне не бачыць больш.

Багдан паварушыўся, пашкроб пяцярнёю патыліцу:

— Нейкае дурное адчуванне, быццам нечага не стае табе. Як згубіў нешта важнае і каштоўнае. Без зброі — дык і рукі пустыя.

— У-ух, які ж ты ваяўнічы! А ў мяне, можаш мне паверыць, гэткага адчування зусім няма. Сапліваець наваліваецца. Здаецца, вось сто год бы тут ляжала ды на сонейку грэлася,— і сапліва пазяхнула.— Човен жа мы, здаецца, добра ўсцягнулі, каб вадой толькі не сагнала. На чым тады вернемся?

Ён падхапіўся, стаў на калепкі, углядаўся ў зіхатлівае рабаціпне Дзвіны, прамовіў заклапочана:

— Можна і пешачкі вярнуцца — задачка простая. А вось юпачку без чоўна не згарбузуеш. Тут, ведаеш, плоткі, як калодкі. І акуні — гарбылі.

— Паляжы крышку.— Яна ўзяла яго за плячо, паспраба-

вала прымусіць легчы на ранейшае месца, але ён не паддаў ся, насцярожыўся.

— Галінка трэснула. Чула?

— Гэта варона. Ву-унь, на сухастоіне сядзіць.

— Ты — ляжы. А я — да чоўна злётаю.

Ён узняўся, і яна стала побач з ім, сказала незадаволена:

— От жа чалавек! Усё яму не ляжыцца на месцы. Што ля таго чоўна рабіць? На гэтых берагах вайна скончылася! Мір тут,— і ўзняла рукі ў неба, патрэсла імі, быццам заграбала да сябе сінечу нябёсаў.— Мі-і-ір гэтай зямлі! Мір табе, бярозка! Мір табе, Дзвіна мая родная!

— Вось і зоймемся мірнай працаю. Я што кажу? Шнуры ў ваду закінем. На вячэру — юшачка. Што, марна я кацялок прыхапіў? А пад ляжачы камень, як гаворыцца, вада не цячэ!

— Угамону няма на гэтага чалавека. Хадзем, калі гэтак ужо табе руніць.— Часлава неахвотна патупала за Багданам. Але вельмі хутка развесялілася, добры настрой вярнуўся да яе, і яна ціха заспявала тую ж песню, што спяваў у чоўне Багдан; спявала ціхенька, як сабе толькі.

Па старых сваіх слядах яны спусціліся з узвала да вады. Багдан адразу ж узяўся ладкаваць шнуры — чапляў, раскруціўшы іх ля борта чоўна, на кручкі тоўстых і тлустых чарвякоў. Зрабіўшы потым з тоўстай лазовай галіны кіёк, Багдан уваткнуў яго ў бераг ля самай вады, папрасіў Чаславу трымаць, а сам сеў у човен і пагнаў наўскасяк плыні, пагнаў адным вяслом, якое трымаў правай рукою, левай жа разматваў шнур і час ад часу пакрыкваў Чаславе:

— Мацней трымай! Сарве з калка шнур — пішы прапала! Без юшачкі застанемся!

— Ён трымціць! Бытта жывы! Зломіцца зараз!

— Хай трымціць. Не зломіцца, не хвалюйся. Ты глыбей яго ў пясок цісні. Сіла ж у цябе ёсць. Я ве-едаю!

Шнур часам выскакваў з вады, звінеў, напяты струною, кручкі, на якіх былі начэплены доўгія вёрткія чарвякі, падскоквалі над вадой, і Чаславе здавалася, што яны зараз разляцяцца ў розныя бакі.

— Усё-ё-ё! — Багдан абвясціў гэта ўрачыста, кідаючы ў ваду камень, да якога быў прывязаны канец шнура.— Лавіся рыбка малая і вялікая. Але лепей — вялікая!

Пакуль Багдан, весела насвістваючы, выграбаў да берага, Часлава памыла твар рачной вадой, адразу адчула, як адлягела, бы адвалілася, стома, саступіўшы месца дзіўнай лёгкасці і бадзёрасці.

— А дзе ж рыбачка? — Часлава, дурэючы, схапілася за

борт чоўна, трымала яго, нагойдваючы, не даючы Багдану выграбаць на сухое.— Які ж гэта рыбак, калі на бераг — без рыбы! Мы яго на бераг і пускаць не будзем!

— А навошта ж яе зараз нам, гэтую рыбачку? Гэта ўжо калі вогнішча раскладзём, як бульбіну зрыхтуем — тады і рыбку ў кацялок. Каб све-жанькая, адразу з вадзіцы.

— Тут бы хоць якую замораную ўлавіць!

— А ты — цішэй пра тое. Рыба не любіць, калі па яе крычаць. Хай рыбка ў цішыні чарвячкоў глытае — і акунькі, і плотачкі, і вугорыч маленечкі.— Багдан саскочыў на бераг, учапіўся ў стаяк кармы.— Ну, дапамагай рыбаку, зарабляй на юшачку. Го-о-оп-ля!..

Адцягнуўшы човен надалей ад вады, Багдан закінуў абодва аўтаматы за плечы, прапанаваў цвёрда, быццам усё было дэталёва абгаворана і вырашана:

— Цяпер на ўзвал гэтым кірункам пойдзем,— і ён махнуў рукою на левы бераг ручая.— За алешнікам — поле. А далей, над лес,— Райнекаў брат некалі жыў. Там Багдан твой аднойчы ледзь не згарэў, Захара ратуючы...

— Гэта Файзуло трэба дзякуй сказаць. Каб не ён — вас бы там усіх накрылі...

— Ты блытаеш,— перапыніў яе Багдан.— Трапашка тады на машыне падскочыў. Выпадковасць. Дзіўная выпадковасць. А нам — паратунак. А Файзуло нам зусім у іншым месцы руку працягнуў. Гэта ля Начы ўжо было. Памятаеш?

— Праўда, праўда... Гэтак, неўзабаве, з памяці ўсё начыста павылятае!

Багдан азірнуўся, як бы нечым дужа ўстрывожаны, засмяяўся:

— Хай усё вылятае — бяды вялікай не будзе. Абы Багдан там, у памяці тваёй, заставаўся заўжды.

— І — юшачка! Гэта ў мяне з памяці не выскачыць!

— За Багданам — як за царом: не прападзе. Мы як вернемся — адразу шнуры праверым. Буйную рыбу — засмажым, а з дробнай — юшачку варым. Пярэчанні ёсць?

— Ёсць. Па-першае, дай сюды аўтамат.— Узяла аўтамат, закінула за плячо.— Па-другое, дарогаю нам трэба спыніцца і шчаўя насмаргаць. Тады ўжо гарантавана, што не пусты кацялок будзе!

— Не верыш, значыцца, рыбаку славутаму?

— Верыць я веру. Але ж раптам — толькі буйная рыба на кручкі наначаплялася. А драбязы — няма. З чаго тады юшачку нам варыць?

— Пасячом буйную дробненька.

— З табою не прападзеш. Дарогу ты хоць ведаеш?

— Тут я ўсё ведаю.— Багдан азірнуўся.— Дзе ў нас сонца?.. Захад — там. Лес — там,— махнуў рукою на лазнякі.— Туды — і налева! Наперад!

— Толькі ты не ляці гэтак. За табой не згонішся, прападзеш тады ў гэтай заглушы.

— Ты не хвалюйся. Я цябе анідзе не кіну, каб заўжды ведала...

Ён ішоў упэўнена, смела, рукамі адкідаў гнуткія лазнякі, жартаваў, глядзеў на Чаславу ўлюбёна. Яны вельмі хутка і лёгка мінулі прырэчную заглуш хмызу і апынуліся на вузкай лугавіне, за якой, амаль побач, быў узлесак старога саснова-га бору. Але Багдан не пайшоў напрамкі па лугавіне, а пашнураваў сцежкаю ўсцяж берага, ля кромкі лазнякоў, што роўным шнурам цягнуліся панізу ўзвала. На ўскрайку затравелага поля, там-сям над падбелам і лапінкамі суданкі, узвышаліся мяцёлкі конскага шчаўя, бліжэй да сцежкі, амаль непрыкметнай, цвілі, астраўкамі, валошкі.

Багдан сарваў пук валошак, паклаў Чаславе на рукі:

— Бачыш? Як у песні — «сінеюць міла васількі»...

Яна ўзяла кветкі, зарылася ў іх разгарачоным тварам.

— Пакладзём іх на магілку,— сказаў Багдан.

— На маю? — спытала Часлава і сумелася, адразу адчуўшы недарэчнасць свайго жарту.

— На бацькаву. Без труны чалавек пахаваны.

— Добра, што хоць магілка вядома. А колькі людцаў зямлёю ўкрыліся і следу няма? А колькі магільных пагорачкаў, пад якім, толькі неба ведае, хто ляжыць?..

Багдан шчыра пабедаваў:

— Так, Чэська, лягло нашага брата нямала. І ў балотах, і ў пяску, і ў гразюцы... Не кожнаму і кветкі прынясуць — травіца парасце...

— Мсціслаўчыкаву магілку колькі я ні шукала — не знайшла. А недзе ж зямелька яго прыняла...

Багдан спыніўся, ваўкавата зыркнуў, папрасіў незнаёмым, дрогкім і сіпатым голасам:

— Вось што... Разумей як хочаш... Але пры мне гэтае імя не гавары. Каб я не чуў яго больш!

Яна сумелася ад нечаканасці, але не змоўчала, сказала з папрокам:

— Мсціслаў загінуў па-геройску. Калі магіла знойдзецца — як кветку не занесці? Падумай, што гаворыш!

— Падумаў... Корань ім у душу.— Багдан злосна, невядома каго аблаяў.— Але і ты падумай. Я — сказаў, сказаў ясна. А ты — падумай!

— Падумаю...

Паабяцала і не падманула: увесь час думала толькі пра Балаша. Неяк недарэчна тады, у той апошні дзень, у іх атрымалася. Нават і пасварыліся крыху. Як прадчувала Часлава тады, раіла не вяртацца ў горад, заставацца ў атрадзе. І, можа, было б усё добра. І шкада, вельмі ж шкада, што загінуў Кандрат. А можа, гэтак і ляцеў у атрад стары, што нешта важнае хацеў паведаміць Захару?.. Відаць, гэтак яно і было. Але ж цяпер ужо нічога ад яго не пачуеш, цяпер Кандрат далёка, цяпер анічога ў яго не папытаеш, анічога не даведаешся...

Маладыя вольхі перагарадзілі лугавіну, і гэты цёмны клін, павернуты вастрыём на пясчаную дарогу, павярнуў, як зламаў, і сцежку. Часлава ступіла на дарогу і злева ўбачыла каміны спаленых хат, ля кожнага коміна чарнелі нежывыя, абпаленыя агнём яблыні. Недзе ў тым баку, за камінамі, чулася дзынькание пілы і раз-пораз, са звонам, бухала сякера. Багдан павярнуў галаву, услухоўваючыся, потым шырокім крокам перайшоў дарогу і крута заламіў на лес, які быў ужо зусім блізка.

Часлава моўчкі дыбала следам. Занятая сваімі думкамі, яна ледзь не наляцела на Багдана, які раптоўна спыніўся ля старой сасны, што як бы адскочыла з узлеску ў поле. Саступіўшы ўбок, Часлава ўбачыла жаўтлявы пагорак, на якім рэдзенька прабіваўся з бурай жарствы сівец. Бялеў бярозавы слупок, неахайна счасаны сякерай ўверсе, з аднаго боку, і на гэтым кароткім тоўстым аполку чарнелі, амаль сцертыя зусім, літары. Па іх цьмяных абрысах Часлава хутчэй здагадалася, чым прачытала, што тут пахаваны Кандрат Роўда, схілілася, паклала валошкі, якія сярод убогага сіўчыку выглядалі ўрачыста, шыкоўна.

— Чакай, трэба ж спачатку парадак навесці, хоць збольшага,— сказаў Багдан, прыклепчыўшы ля магілы.

Стоячы на каленях, ён пераклаў пук валошак з магілы на траву, узяўся выдзіраць з жарствы сівец і пырнік, які прабіўся ля слупка. Яна ўклепчыла побач, пачала дапамагаць Багдану і, калі рукі заглыбіліся ў халодны жвір, адчула, што з вачэй пацяклі слёзы. Ёй зрабілася дужа шкада старога Кандрата, але плакала яна не з гэтае прычыны. Нядаўняя Багданава забарона не вымаўляць пры ім імя Мсціслава як бы нанова адкрыла перад ёй свой бязлітасны і жорсткі сэнс, узмацніла да вастрыні незвычайнай боль і крыўду. Магілу старога Кандрата — добры быў чалавек, душэўны, благога слова ад яго Часлава не чула, малога Толічка любіў і песціў, як роднага сыночка,— яна даглядае вось, сівец выполвае, кветкі прынесла. А хто ж на тую магілку, на магілку Толіч-

кавага бацькі, кветачку прынясе? Дзе яна ўвогуле, тая магілка? Але ж ёсць недзе тое месца, дзе ён ляжыць. І яна, Часлава, яго знойдзе! Усё жыццё будзе шукаць — але ж знойдзе! Знойдзе і Толічку пакажа. І забарона Багданава тут нічога не зменіць. Імя Мсціслава, магчыма, і няма патрэбы пры Багдану казаць. Але ж з сэрца гэтае імя не сатрэцца, яно, гэтае імя, будзе з ёю да скону дзён. І з гэтым Багдану давядзецца змірыцца. І ён, Багдан, хай не лезе сюды, сваю забарону хай адкіне, пры сабе трымае!..

Убачыла гаротна сціснутыя Багданавы губы, пачула, як ён хліпнуў носам, і даўнюю глухую варожасць, што на міг варухнулася ў душы, здзівіўшы Чаславу, адціснула, прыглушыла жаласлівасць. Багдан пакутуе. Багдан прынёс табе шмат радасці сёння, дапамог вырвацца з мінулага. Багдан аддадзены табе гэтак жа, як ён аддадзены гэтай магіле. Глядзі, як ён пяшчотна прыгладжвае пясок магілы, пакраплены адбіткамі і тваіх пальцаў. Трэба быць справядлівай: ты павінна разумець і яго, Багданава, гора... Трэба быць справядлівай: Багдану ты абавязана, што сама не ляжыш пад гэткім вось магільным пагоркам!..

Вецер шумеў у голлі сасны весела і звонка, а з глыбіні лесу даносіла густы, працяглы пошум хвояў. Ад моцнага парыву ветру вершаліна сасны загула ўстрывожана, з голля насыпалася на магілу сухое шыгалле. Дзве шыгалінкі, нераз'яднаныя, як звязаныя смаляной кропляю, стукнуліся аб белы корань пырніку, перакуліліся, уваткнуліся ў жвір, натырчалі вострымі карычневымі пікамі, гайдаючыся, і ляглі плазам. З-пад карэньчыка выбег вялікі, як надвое перавязаны нябачнай ніткаю, мураш, абмацаў смаляную кроплю і нацягнуў шыгалінкі ў бок бярозавага слупка на магіле.

— Людзі,— нечакана прамовіў Багдан.— Там — людзі. І дымок слабенькі круціцца.

— Дзе ты бачыш?

— Ля коміна. Першага, што бліжэй ад усіх да нас. Райнекава сядзіба была.

— З вяскоўцаў нехта, мабыць.

— Дзіўна.— Багдан упершыню пасля таго, як яны выбраліся ад чоўна на ўзвал, усміхнуўся лагодна.— Мільганула чалавечая постаць — адразу і трывога ў сэрцы: хто? Свой ці чужы?

— Дзеці там. І жанчына вунь...

— Праўда. Пайшлі, зойдзем да іх. Гэта там, мабыць, жонка Райнекі з дзецьмі. Дзіна Пілінаўна...

— Воўк ты, аднак! Усіх жанчын па левы бераг Дзвіны ведаеш!

— Мы з ёю, як нас тут фрыцы ледзь не падняклі, разам да лесу перлі. Яна з-за Дзвіны ехала... А я танкавую калону на плячах пёр!

— Калону? Што ты чаўпеш?

— Ранец на плячах цягнуў. А ў ім — грошы, аблігацыі, пярсцёнкі залатыя. Людцы нашы ўсё на танкі аддавалі, не шкадуючы...

— Праўда, гэта ж тады і было!

— Кепска ты баявое жыццё Багдана ведаеш! Гераічны чалавек перад табою! Ты ганарыцца ім павінна!

— А я гэта і раблю,— смеючыся, сказала Часлава.

Яны вельмі хутка дайшлі да селішча, павіталіся з жанчынаю, якая сядзела на сасновым карчы. Перад ёю ў гаршку, які быў зацiснуты паміж дзвюх цаглін, булькацела нейкае варыва цёмна-рудога колеру.

— Мірная зацірачка варыцца, Дзіна Піліпаўна? — весела запытаўся Багдан.

Жанчына паправіла мужчынскую ватоўку, якая была ўскінута наапашкі на плечы, зыркнула насцярожана, потым паспакайнела, зрабіла выгляд, што пазнала Багдана, калі ён сказаў, з якога атрада і што добра ведае Райнеку. Пачуўшы, што Райнеку накіравалі ў Віцебск і што сёння ён паехаў туды, яна крыху ажывілася. Але ненадоўга, і насцярожанасць у яе не знікла. Нават на дзяўчынку, якая вынаўзла з сутарэння, зробленага ў старым склепе, яна пасварылася дужа неяк зацята, быццам гэтаю сваркай выказвала сваю нязгоду не з ёю, малой, а з тым, што людзі са зброяй стаяць на падворку, як чакаючы нейкага пачастунку.

— Людзей не бачыла? — напусцілася яна на малую.— Табе я што сказала? Малога люляць я сказала. Заснуў Дзімачка?

— Не хоча ён спаць. Зноў — есці просіць. Пах зацiркі чуе ды з таго і не спіць.

Малая працягнула маці анучу, якую трымала дагэтуль за спіной. Дзіна Піліпаўна змачыла анучу ў вядры з вадой, выкруціла, аддала дачцэ, сказаўшы, каб павесіла насушыць. Малая трымала анучку ў руках, нікуды не ішла, яна як бы прыклеілася вачыма да цёмнай зацiркі, што булькацела ў гаршку; трэскі паміж цаглінамі згарэлі, але варыва ў кацялку кіпела, гнала ўверх пару.

— Ідзі, ідзі, дачушка,— мякка папрасіла Дзіна Піліпаўна.— Зараз зварыцца — будзем есці,— і таропка патлумачыла, як бы саромелася таго, што даводзіцца апраўдвацца: — Есці хочуць, дык гатовы ў самы агонь ускочыць, падварушыць. Бытта з таго хутчэй яно зварыцца...

Часлава перахапіла позірк жанчыны, скіраваны на Багдана, які прыпюхваўся да пахаў з кацялка, і зразумела, што жанчына па-ранейшаму насцярожаная і пабойвацца нечаканых гасцей.

— Хадзем, Багдан.— Яна крапула яго за руку.— Час ужо...

Убачыўшы, што яны не затрымліваюцца і зараз пойдуць, жанчына зусім паспакайнела, паспяшалася паведаміць, нібыта ведала, што менавіта гэта яе гасцей і цікавіць:

— Калі старшыню шукаеце, дык тут не знойдзеце — у Начу паехаў. Сёння яго не дачакаецеся.

— Не, у нас — свая справа,— сказала Часлава.

— Рыбацкая справа ў нас,— пажартаваў Багдан, вырашыўшы тэрмінова ўдакладніць тое, што сказала Часлава.— На акунёў і самоў нацэліліся. Калі пашэнціць — рыбачкі і вам падвалім. Рыхтуйце, адным словам, патэльню.

— Дзякую, навошта ж вам лішні клопат. Вы ўжо аб сабе думайце. Нам ужо і таго радасці — жывыя...

— А што, вяскоўцаў многа вярнулася ў вёску?

Жанчына зыркнула на Багдана з ранейшай насцярожанасцю, і ў вачах яе, карых, пранізлівых і строгіх, мільганула непрыхаваная падазронасць.

— Хто ацалеў — той і вярнуўся. На гэты бок ручая — мы толькі. Там,— яна хітнула галавой у бок ручая, які падзяляў былую вёску,— дзве сям'і,— і раптам яе твар пасвятлеў, карыя вочы атуманіла павалока. Жанчына ступіла да Багдана бліжэй, углядалася ажыўлена і зацікаўлена.— Вось калі я вас пазнаваць пачала... Гэта ж тады, як хата гарэла, вы па лазняках беглі. А з малымі дзеткамі сваімі я — з таго боку на чоўне граблася...

— Няўжо гэтак змяніўся, што і пазнаць цяжка? — Багдан узрадаваўся, зухавата падміргнуў Чаславе.

— Тады ў вас рудыя вусы былі, доўгія. І адзенне не гэткае... А можа, і гэткае — не ў памяці.

— А я і сам ужо не памятаю, што на мне тады было. Вось ты, Часлава, прыгадай тагачасную маю адзяванку.

— Быў мне час прыглядацца тады!

— Памяць наша, памяць... У гэтым і бяда — часцяком яна нас і падводзіць.

— Калі ласка, сядайце, сядайце,— жанчына прапанавала гэта шчыра, ад душы. Памяшала варыва ў кацялку драўлянай лыжкаю, якую ўзяла з бляшанай місачкі ля вядра з вадой.— Гарачанькага зараз і з'ясце — чым багаты, тым і рады, як гаворыцца. А вы ж з горада зараз? Хоць раскажыце, як там у горадзе сёння. Гаруюць гэтак жа, як і мы тут, людцы.

Хаця, нам цяпер — радавацца. Гэта хай у Берліне гаруюць... Але ж чаго не сядаеце? Калі ласка, прашу вас...

— Дзякуем. Другім разам і прысядзем. А зараз — часу няманака ані крошелькі,— Часлава зноў неўпрыкмет тузанула Багдана, даючы знак, што трэба ісці і не затрымлівацца.

А ён быццам і не пачуў яе, прысеў на кукішкі ля чорных цагліп, як бы спрабуючы даследаваць варыва, што булькацела ў гаршку.

— Правільна вы гаворыце, Дзіна Піліпаўна. Хай цяперака ў Берліне гаруюць ды патыліцу чэшуць. На нашай вуліцы свята! Як сказала гэта Масква шчэ ў сорак першым — гэтак і сталася. І я таксама слоў на вецер не кідаю. Патэльню рыхтуйце, каб рыбачку пасмажыць,— ён узняўся, падсунуў далонь пад рэмень аўтамата.— Да хуткай сустрэчы!..

Часлава ішла з вёскі першай. Але на лугавіне Багдан апярэдзіў яе, дыбаў шырокім крокам, насвістваў, быў нечым дужа задаволены. І гэты хуткі пераход ад суму ля бацькавай магілы да весялосці і жартаў, і асабліва Багданава гаворка з жанчынай ля спаленага селішча, усё больш і больш раздражняла Чаславу.

— Ну, не ведала я, што ты гэткі хвалько зрабіўся,— урэшце выпаліла яна ў спіну Багдана.— Дзе твая рыба? Намуціў, намуціў чалавеку вады... От жа лобус святы!

Багдан, смеючыся радасна і задаволена, паляпаў Чаславу па плячы, зноў падміргнуў зухавата:

— Кундаль-мундаль, цюцькін сын, значыцца, Багдан? Э, не. Не! Багданава слова, як гвозд, крэпкае. І ведай: наша рыбка не ў вадзе, а ў гаршку ўжо!

І засвістаў узрадавана, тупаў гэтак борздзенька, што Часлава ледзьве паспявала за ім. Добры настрой не прайшоў у Багдана і на беразе, калі ён, неахайна кінуўшы аўтамат на затравелую прыступку пад лазнякамі, узяў вясло і ўскочыў у човен. Стоячы ў карме, Багдан піхаў човен, падганяў бліжэй да каменя, што шырокім гарбом вытыркаўся з вады, націскаў з усяе сілы, і вясло аж гнулася ў яго руках.

— Зломіш вясло,— гукнула Часлава.— Як тады ехаць? О-ой, зломіш!

— Побач з табой, паўтараю, чалавек гераічны. Кожны яго крок — варты пераймання.— Багдан на момант спыніў свае намаганні, папытаў: — Ну, роўна стаіць човен? Я гэта на тое раблю, каб з кармы ты на камень лёгенька перабіралася — вада тут чысцейшая. Усё аб табе клопат,— і зноў налёг грудзьмі на вясло.— Ящчэ тут крыш...

Суха храснуўшы, вясло зламалася. Багдан пляснуўся на борт, але не злаваў, смяяўся, усім задаволены:

— Памыў твар, бо даўно збіраўся. Усё часу бракавала. Ха! Затое на лінеечцы стаў човен.— Ускочыў на камень, выбіў чачотку.— Залатыя рукі ў твайго Багдана. У цябе — сэрца залатое. А ў мяне — рукі. Залатая парачка!

Смеючыся і жартуючы, ён адразу ж, як толькі выбраўся на бераг, узяўся збіраць ламачча. Часлава дапамагала яму, і яны ў адзін міг нацягалі высокі грудок сухога голля, кавалкаў дошак, кароткіх паленцаў, прыгнаных і пакінутых у лазняках вясновай паводкаю.

— Тут палім вогнішча? — Багдан патупаў нагою па чыстым, прамытым вадой пяску пад лазнякамі.

Ён прымерыўся, дзе распаліць вогнішча, паклаў сухога ламачча, а з двух бакоў уваткнуў у пясок дзве лазовыя рагулькі, на іх паклаў тоўсты кіёк, каб павесіць кацялок. Потым прысеў ля лазовага калка, узяў канец шнура, асцярожна падцягнуў яго да сябе, потым адпусціў, і рабіў гэта тройчы. Паківаўшы галавою, узняўся, атрос рукі, абвясціў без горычы і разгубленасці, як бы нават радуючыся:

— Пусценька! Абмежаваліся акуні, пакуль што, сардэчнымі прывітаннямі ў нас адрас.

— З прывітанняў юшачка будзе сма-ачная.

— А яшчэ смачнейшая будзе яна ў нас з чаго? А з таго, з чаго і была запланавана. Твой славуты рыбак адпраўляецца на дыпламатычныя перамовы з акунямі і шчупакамі. Яны не дурныя — адгукнуцца!

— Далёка куды ты сабраўся?

— Да ручая толькі. Пяць хвілінак — можаш лічыць!

Ён зняў боты, узяў кацялок, салютнуў рукою і пайшоў усцяж берага, ля самай вады, час ад часу спыняўся, біў нагою асаку, быццам нешта стрэсваў са ступакоў, потым зноў ішоў ля вады і вельмі хутка схаваўся за лазнякамі. Прысеўшы на борт чоўна, Часлава пачала шараваць рукі, якія былі чорныя — некаторыя паленцы, што яны цягалі да вогнішча, былі абгарэлыя, як ужо гарэлі недзе на агні,— і здрыганулася: у тым баку, дзе знік Багдан, глуха бухнуў выбух. Чародка малявак, як пырскі, сыпанула з вады ля чоўна, мітнулася ад берага.

«Гранату кінуў. Гэта ж ён рыбу глушануў!..»

Здагадалася адразу ж, здагадалася, толькі цяпер зразумеўшы вясёлую Багданаву самаўпэўненасць. І таму не кінулася ў той бок, дзе грымнуў выбух, спакойна дашаравала пясочкам рукі, памыла твар, дастала з кішэні ватоўкі шчарбаты грабянец, абламаны з абодвух бакоў, узялася прычэс-

ваццa, пазіраючы ў спакойную плынь ля чоўна, як у люстэрка. Глухі выбух гранаты як бы пешта перавярнуў у душы, выклікаў крыўду. Чаму Багдан нічога ёй не сказаў? Баяўся, што яна не пагадзіцца глушыць рыбу? Відаць, гэтага і пабаяўся. І ўсё цішком вырашыў зрабіць. І як жа, калі паспеў гранату з кішэні ватоўкі выхапіць? А можа, ён яе і не чапаў? Не, пустая кішэня. Была граната, і няма гранаты. Цішком — злаўчыўся ж, што яна нават і не ўгледзела! — выцягнуў, цішком і кінуў. Няўжо спадзяваўся, што і выбух утоіць, ад яе схавае?..

«Усё жыццё ягонае — круцельства. Маніў скрозь...»

Да чоўна, пасвістваючы, набліжаўся Багдан. Ішоў ён зноў ля самай вады, ганарліва ўскінуўшы галаву. Кашуля расшпілена, рукавы закасаны па локаць, левая калашына закасана да калена, правая, мокрая знізу, абкруцілася вакол нагі, як прыляпілася да скуры. Нібыта на адной назе чалавек чыкільгае! А ў руках — здабыча. І ладная ж! Кацялок з каптуром набіты рыбаю, на лазіне паначапляны буйныя акуні і два ладныя шчупакі.

— Бачыш? — ён урачыста ўзняў лазовую начопку з рыбай, потым кацялок, які трымаў у левай руцэ, і, заўважыўшы хмурны позірк Чаславы, засмяяўся:

— Ты што, гранату шкадуеш? Трафейная ж. Іх знішчаць трэба!

— Глушыць рыбу забаронена. Загад жа строгі аб'яўлены.

— Дарэмна ты,— ён патрос кацялком.— Мясілі і бомбы Дзвіну і снарады. Ад гранаты-малечы не дужа ёй і забаліць. Дзвіна наша нам даруе.

Часлава ўздыхнула, села на борт чоўна, пабарабаніла пальцам па ручцы цесака:

— Пагана на душы. І рыба твая не ўсцешыла...

— Затое іх усцешыць. Ды шчэ і як усцешыць,— і ён упарта хітнуў галавой у бок лазнякоў на ўзвале.— Ты ж бачыла, як малая на кацялок глядзела. А Райнечыха? Дзеці галодныя да кацялка ліпнуць, а тут — мы. У мяне ажно ўсё ў сэрцы забалела. Я тады, шчэ там, вырашыў: лупяну рыбачкі гранатаю. Занясу ім зараз, хай малыя дзеткі паласуюцца. Без бацькі ж расці ім... Вогнішча табе распаліць?

— Сама спраўлюся,— сказала Часлава, дзівячыся з таго, што ў яе душы крыўда саступае месца знаёмаму захапленню ўвішнасцю Багдана. Думка пра тое, што ён меў у душы клопат пра малых дзяцей, якія прагна чакалі, пакуль зварыцца тая нішчымная зацірка, расчуліла Чаславу, і яна спытала заклапочана: — Аўтамат бярэш?

— Навошта. Я мігам злётаю.

— Слухай, цягні ты ім і другога шчупака. Нам на юшку нават і драбязы замнога. Потым жа па шнуры начапляецца, думаю, вялікая. І гэта шчэ ім не пашкодзіць,— нахілілася над чоўнам, выцягнула з кішэні ватоўкі акраец хлеба, цесаком распалавініла яго.— Нам з табою і гэтага хопіць...

Апошнія словы Чаславы яго асабліва ўзрадавалі.

— Ты добрая,— сказаў Багдан з ласкавай усмешкаю.— Я гэта ўсё жыццё ведаў. Ад тваёй дабрыні дык і я лепшы раблюся...

Ён начапіў на лазіну і другога шчупака, дадаў яшчэ двух вялікіх акунёў, салютнуў важкай пачопкаю і знік за лазнякамі. Нейкі час пагадзя з узвала загучала, аддаляючыся, вырванае з песні і знаёмае Чаславе:

Сінеюць мі-і-іла ва-а-асі-і-ількі-і-і...

Часлава пакруціла галавой, уголас хмыкнула, зноў адчуваючы, што захапляецца Багданам. Нейкі скрозь ён пярэсты — у словах, у справах, у кожным руху. Але сэрца ў яго вунь як да чужой бяды павярнулася. Гэта ж ён там, на падворку, ля коміна спаленай хаты Райнскі вырашыў, што рыбіну дзецям панясе. Можа, гэтак вось недзе і твайму Толічку нехта рыбінку зловіць, пачастуе. Дарэмна, о-ой дарэмна яна сёння на Багдана напусцілася за гэтую гранату, што кінуў ён у затоку. Пра добрае ён мысліў. Сварыцца, злаваць на чалавека за дабрыню нельга...

Зверху ў кацялку былі адны акунькі, і яна з імі змучылася: шкрабеш, шкрабеш луску, а яна быццам прыварaная. З плотачкамі было лягчэй, і праца пайшла спарней. Яна неўзабаве пачысціла ўсю рыбу, двойчы перамыла ў вадзе, склала на прыгнутую асаку.

Чэрпала ваду, стаўшы на камень. Падумала пра Багдана з цеплынёю. Яна яго, маўляў, лаяла, рагатала, як ён, весла зламаўшы, у ваду носам зарыўся, а ён жа толькі пра тое і дбаў, каб ёй, Чаславе, зручней было. І сапраўды: ля каменя вада плыткая, чысценькая — у кацялку аж свеціцца.

«Час распальваць вогнішча. Вуголле ж не адразу нагарыць...»

Часлава падумала пра гэта, радуючыся, што ўсё ў яе ладзіцца, што будзе чым пахваліцца, калі Багдан вернецца.

Камлі соснаў на супрацьлеглым беразе пакрысе набывалі агняны колер, быццам браліся полымем, а шаты цямнелі, і ў іх, тых сіне-чорных кучомках, як сполахі агню, мядзяна свіціліся жоўтыя тоўстыя галіны. І як нейкі посвіст адтуль, ад тых соснаў. Не, гэта ж за лазнякамі!

На ўзвале мацнела, цяпер добра знаёмае і выразнае, насвістванне — вяртаўся Багдан. Усё тая ж мелодыя, усё тая ж песня, з якой і пайшоў. Нейкі нават і ў спевах Багдан пастырны, зацяты: убіўся вось у гэтую песню, дык і не адвяжацца.

Затрашчала сухое голле. З шоргатам расступіліся лазнякі, быццам выкідваючы Багдана да вогнішча.

— Дзе ты гэтулькі швэндаўся? — Часлава таіла за гэтым здзіўленнем шчырае ўзрушэнне — радавалася, што з Багданам нічога кепскага не прыключылася і ён вярнуўся задаволены.— Я ўжо ўсё тут парабіла. Бульбачка ўжо і варыцца.

Багдан зазірнуў у кацялок, укрыты параю:

— Э, не-а. Чаму бульбачка кіпіць? Бо ў гаспадыні — рукі залатыя,— абхапіў яе, пацалаваў у шыю.— І рукі залатыя. І сэрца. І ўся яна, мая жоначка,— камяк сапраўднага золата!

Яна адпіхнула яго рукі. Але адпіхнула нязлосна, з усмешкаю, дзіўна расчуленая гэтымі Багданавымі словамі, у якіх не было шчырасці, чулася нейкая надробка, штучнасць. Адчула гэтую штучнасць і ўсё ж прымала яе, прымала ўсе словы цалкам, нават была ўпотай за гэтыя словы ўдзячная яму.

— Як цябе там Дзіна Піліпаўна сустрэла?

— Добра.— Ён выцягнуў з кішэні цыбуліну з кароткімі зялёнымі пёркамі-стрэлкамі.— Вось, у юшачку прысмакі маем.

— Навошта браў? Гаруе жанчына — двое ж дзетак. А ты — пагарэльцаў рабуеш.

— Ды не хацеў, не хацеў я браць гэтую цыбуліну. Дык яна ж — сілком,— і горка ўсміхнуўся, пачаў прыгадваць тое, што давялося пабачыць на падворку спаленай хаты.— А малыя, калі мяне ўбачылі,— у міску ўчапіліся: думалі, мабыць, што адбяру зацірку. Я, праўда, пажартаваў быў, што, маўляў, шчупакі на смачную зацірку з вады выскачылі, да міскі нашпарылі...

— А табе — абы насмяяцца!

— І яны смяяліся. О-о, як шчупакам тым узрадаваліся. Ты малайчына, што падказала абодвух занесці. Калі на шнурах што будзе ладнае — заўтра ім аднурым! — І зноў нахіліўся над кацялком.— Яшчэ хвіліначак пяць пакіпіць бульбачка — кладзі рыбку і цыбульку. Кропчык і соль таксама. А я тым часам дам храпавіцкага. Пабудзіш тады. Гуду-уць ногі, як званы велікодныя...

Ён расцягнуўся на плашч-палатцы, якую выкінуў з чоўна і насцяліў над лазнякамі, і амаль імгненна, як толькі раскінуў рукі на бакі, заснуў. Час ад часу ён смешна цмокаў губамі,

пасвістваў носам, пахропваў нават тады, як павярнуўся на правы бок, і ляжаў, сагнуўшыся, закрыўшы сагнутай рукою галаву.

Калі юшка зварылася, Часлава ціха паклікала Багдана. Але ён не прасынаўся, спаў па-ранейшаму моцна, зрэдзь часу смешна цмокаючы губамі, і яна пашкадавала: здарожыўся, лётаў туды і сюды, хай насніць яшчэ крышку.

Яна зняла і наставіла кацялок на краёчку вогнішча, каб юшка не выкіпала і не студзілася, а даварвалася на мяккім агеньчыку. Прынесла з чоўна лыжкі і трафейны пляскаты кацялок, у якім быў акраец хлеба, выцягнула яго, пакроіла на чатыры лусты. Хлеба, ведама, будзе малавата. Лусты, аднак, тоўсценькія, можна было па адной пакінуць сабе, а дзеткам тым болей адкроіць. Але ж не бегчы зноў. Хай бы пашчасціла, на шнуры добрая рыбіна села — заўтра дзеткам быў бы добры гасцінец.

Часлава склала хлеб у глыбокую крышку ад кацялка і паставіла побач з лыжкамі на асаку, якую парэзала і паслала роўным маленечкім квадратам — бы столік зялёны! — непадалёк ад вогнішча. Выбрала потым з грудка ламачча дзве кароткія дошчачкі, паклала на абодва бакі ад парэзанай асакі, прымерылася нават — сядзець дужа зручна. Затым адшукала яшчэ адзін зусім кароценькі ўломак дошкі, прымайстравала на ім кацялок і, удыхаючы смачны водар юшкі, паклікала голасна і рашуча:

— Хопіць, хопіць спаць, Багданка. Узнімайся! Есці дужа ж хочацца.— Пачула за спіной рух, але нейкі шархатлівы, расплывісты, і пажартавала: — Ведай, Багданка, самую вялікую лыжку сабе вазьму. Будзеш маленькаю сёрбаць. Чуеш, Баг...

Асеклася, павярнулася, не дагаварыла да канца. Траіцца ў вачах, ці што? Багдан сядзіць на плашч-палатцы, пазяхае, націрае рукамі вочы. І яшчэ тры Багданы з лазнякоў вылузнуліся!..

«Фашысты! Гэта ж фашысты!..»

Дайшло толькі цяпер, што нічога ёй не памроілася, што бачыць яна жывых людзей, якія высунуліся з лазнякоў. Багдан згледзеў яе спалоханы, перакошаны жахам твар, павярнуў галаву і імгненна скурчыўся, упёрся рукамі ў пясок, каб ямчэй ускочыць на ногі.

— Хальт!

— Сядзець! На месцы!

Гэтыя два загады прагучалі аднача́сова, і амаль аднача́сова тры фашысты апынуліся ля кацялка з юшкай. Яны былі дужа напалоханыя, азіраліся па баках, але не спускалі вачэй

з Багдана і Чаславы, і аўтаматы, што боўталіся на грудзях у дваіх, былі скіраваны ў бок вогнішча; трэці быў без аўтамата, але на рэмені вісела расшпіленая чорная кабура, з якой тырчаў парабелум. Гэты, трэці, першы ўхапіў лусту хлеба, нешта хутка-хутка загергетаў, потым, прагна жуючы і давячыся, накідаў хлебныя лусты першаму і другому, кінуў ім лыжкі, сабе наліў юшку ў крышку ад кацялка і пачаў яе піць, як з конаўкі. Схапіўшы лыжкі, два фашысты нахіліліся над кацялком, сёрбалі гарачае варыва, апякаючы губы, чаўкалі, цмокалі. Але за тым, што адбываецца вакол іх, сачылі пільна, і варта было Багдану варухнуцца, як адразу фашыст, які быў да яго бліжэй, торкнуў у той бок дула аўтамата.

«Галодныя. Да сваіх прабіваюцца...»

Думка гэтая падала Чаславе раўнавагі; прарэдзілася, як растала, шэрая дрогкая заслона, за якой толькі што трымцелі лазнякі, не гэткімі няўклюднымі і вялізнымі здаваліся постаці фашыстаў. Цяпер яна ўжо бачыла не толькі заплямленае, перапэцканае адзенне, але адрозніваліа гэтае адзенне і твары. З крышкі прагна цмокаў юшку афіцэр. Той, што справа, таксама афіцэр. Пагоны на светла-зялёных мундзірах вензелястыя, нейкага срабрыстага колеру, і на пілотках, што заціснуты пад рамяні, такога ж колеру каёмка. Боты ў афіцэраў хромавыя, з высокімі халявамі. І не толькі адзеннем падобныя, нават у тварах шмат агульнага, быццам блізняты: вострыя насы, тоўстыя бровы, рудая шчэць на шчоках і барадах, зліплыя ад поту, белаватыя, каротка падстрыжаныя валасы; рукі брудныя, пальцы чырвона-карычневыя, і на правай руцэ ў кожнага — бліскае пярсцёнак. А ў гэтага, што побач амаль з Багданам, боты салдацкія, з шырокімі халявамі, у якія запраўлены карычневыя, як падгарэлыя, штаны. І фрэнч гэткага ж колеру — ашмоткі павуціння, падобнага на пакулле, зачапіліся за гузікі, дзе некалі мацаваліся пагоны,— падраны ля правай кішэні, з нашыўкаю на правым рукаве. Пілотка насунута задам наперад, але простая, салдацкая, зеленаватага колеру. Валасы чорныя, кучаравыя ля вуха, і барада, кароткім клінам, таксама чорная, з ніцямі павуціння, а вочы нейкія рабыя, мітуслівыя і злосныя.

— Э-э! Су-устрэ-эча! — працягнуў салдат у пілотцы і, не перастаючы сёрбаць юшку, утаропіў вочы на Багдана.— Не пазнаеш Багданка? — Ен нешта хутка лапатнуў афіцэрам па-нямецку і зноў кінуў Багдану, голасам дзіўна павесялелым: — Паўлюка не прызнаеш? У твайго бацькі, старога Кандрата, я гасцяваў. І цябе ад вернай пелькі ратаваў. Ну, круці мазгаўнёю, пакручвай!

Багданаў твар дзіўна бялеў, але бялеў няроўна, плямамі ля носа і губ, якія пачалі трэсціся. Багдан нахіліўся, памкнуўся быў узняцца, але салдат асадзіў яго:

— Сядзець! Куды хацеў?

— Хлеба з чоўна прынясу. Чаго голую юшку сёрбаць...

У Чаславы пачалі мерзнуць, быццам на лёдзе стаяла, ступакі. І нейкімі драўлянымі парабіліся пальцы рук.

«Дурная галава! Хлеба ж няма ў чоўне больш. Пра аўтаматы Багдан гаворыць! Ён жа мне знак дае!..»

— Сядзі! Яна прынясе.— Салдат хітнуў галавой у бок Чаславы.— Слаўную кабету ты прыдбаў. Жонка? Ці чужую звёў?

— Жонка. Рыбалім тут... Шнуры кінулі...

— Вось яна і прынясе,— і вышчарыўся, падміргнуў Чаславе, быццам даўно добра ведаў яе.— Цягні хлебец, светлавокая. А можа, і шнапсік маеш? На рыбалку ж не галаруч прыехаў.

— Няма,— глуха выціснуў Багдан.

— Усё несці, што ёсць? — спытала Часлава і ўбачыла ў вачах Багдана дзікі, ніколі раней нябачны жах.

— Усё, усё цягні, светлавокая. І хутчэй, хутчэй, бо афіцэры ў мяне стро-огія,— і, як забыўся адразу на Чаславу, сказаў Багдану ўжо, да яго павярнуўшыся тварам: — Чыны вялікія. Уратуем іх — у золаце да скону дзён нам жыць,— і засмяяўся грубым, як даўно і моцна прастуджаным голасам: — А не ўратуем іх — ты, Багдане, мяне да скону свайго карміць будзеш. Чаму? А таму, што тваю запісачку на таго Балаша я з кабуры сваёй цішком начальству падкінуў. А як ты яе ў кабуру соваў — бачыў. А каб сказаў?.. У пельку даўно б пайшоў. І Кандрат — следам. Але ж я не сказаў. Я ж цябе не прадаў. Гэта — за золата даражэй!

Часлава на міг прыпынілася, здрыгануўшыся. Яе быццам ударылі моцна ззаду ў паясніцу, але боль быў пад сэрцам і ў скронях. Рот у яе раскрыўся, яна заціснула яго рукой, быццам запіхвала назад, у горла, немы крык, што дзёр грудзі.

— Лухта! — візгатнуў Багдан.— Брэшаш! Брэшаш, гад! Чэська, стой! Ён — брэша!

— Лёс! Лёс, шчаслівучык, нас зводзіць,— і зноў забухаў грубы, як даўно прастуджаны голас.— Мяне ўжо былі і пахавалі. А Паўлюк — жывы! А чаму жывы? Бо галава ў яго варыць... Ты чаго пырхаеш? Ся-ядзі! Каму гавораны? Сядзець, я сказаў! Ці-іха!

Сосны на супрацьлеглым беразе здаліся Чаславе барвовыя, і гэтыя барвы білі ў вочы, сляпілі. Яна не разумела, што бачыць не барвы вечаровага сонца, а гэта паліць вочы агонь

знутры, тое пякельны агонь нянавісці, што ўзарвалася ў сэрцы і цяпер шухнула ў вочы, як заслала іх чырвоным туманам. Човен здаўся ёй далёкім, гэткім далёкім, што да яго, відаць, ёй ніколі не дайсці. І пясок як агняны пад ступакамі. І вада агняная. І гарацць ступакі, быццам па вуголлі яна ідзе. Не, човен ужо блізенька, крокі чатыры ёй зрабіць!..

«Ідзі марудна!.. Ідзі марудна!.. Ідзі марудна!..»

Гэтыя словы свідравалі ёй галаву, яна паўтарала іх у думках, як замову, баранілася імі ад усяго — ад нагапай дрыготкі ў плячах і паясніцы, ад холаду ў ступаках і пальцах рук, ад таго жахлівага сэнсу адкрыцця, якое абвалілася на яе нечакана, непрадбачана, неспадзявана. Вось як загінуў Мсціслаў! Не-е, не падманвала яе, Чаславу, прадчуванне — з Кандратавай хаты выпаўзла здрада. А Захар жа не паверыў. Таму, старому Кандрату, паверыў, здрадніку даверыўся. На Захара, значыцца, усё валіш! А сама? Ты ж, бы тая апошняя дурніца, пахавала свае прадчуванні! На магілу старога злыдня кветачкі панесла, травіцу выполвала! І сама ж сёння Багдана кахала!..

«Вось гэтымі рукамі яго галубіла!.. Забойцу Мсціслава галубіла!..»

Уперлася рукамі ў борт чоўна, пакруціла далоні ўверх, крыху падціснула пальцы, быццам не верыла, што гэта яе ўласныя рукі. Скура на далонях чысценькая, вышаравалася, усе рэпінкі відаць, пальцы ад вады размяклыя, як распараныя. Акунёвая луска блішчастай плямкаю прыклеілася ля правага запясця. Яна мезенцам скалупнула яе, і на скуры засталася маленькая светлая плямка, быццам скура была прапаленая наскрозь...

— Гэ-эй, светлавокая! Хлеб чакаем!

І адтуль жа, ззаду, ад вогнішча, нерасекшы гэты загад, ірвануўся адчайна-ўмольны Багданаў крык:

— Чэ-эська! Брахня гэта! Не слухай брахуна! Касі яго! Усіх!..

Дрыготка ад гэтага адчайнага крыку знікла, яна прабілася ўсярэдзіну, асела тонкай колкай ільдзінкаю ў скронях, ціснула галаву халоднымі калянымі кляшчамі. Рукі спаўзлі з борта чоўна, шуснулі пад ватоўку. Пальцы дакрануліся да металу аўтамата, і Часлава зарадавалася, зарадавалася гэтак жа, як у тыя дні, калі на рукі брала сына, і губы мімаволына прашапталі:

— Ро-одненькі мае...

Левай рукою яна ўзнімала аўтамат, узнімала разам з ватоўкаю, і над ватоўкаю правай рукою ўзяла затвор.

Нейкае імгненне яна прамарудзіла, скідаючы з аўтамата

ватоўку, дакладней, не яна прамарудзіла, а ўсё сапсаваў Багдан, які ўскочыў на ногі і паспрабаваў зваліць паліцэйскага. Той паспеў затрымаць Багдана, учапіўся ў яго і цяпер закрываўся ім, як шчытом. За яго спіну шуснуў і афіцэр, які сядзеў на левы бок ад вогнішча, і яны адступалі, падаваліся назад, да лазнякоў.

— Брахня, Чэська! Касі іх! Не шкадуй!

— Нікс шысэн! — гукнуў адчайна афіцэр, які не ўскочыў на ногі, сядзеў на плашч-палатцы, сціскаючы крышку ад кацялка ў левай руцэ. Правая ж рука ліхаманкава рвала з кабуры парабелум.

— Касі іх, Чэська! Усіх, карань ім у душу, касі-і-і!..

Афіцэр, які туліўся за спінамі Багдана і паліцэйскага, мітнуўся ў лазнякі, і Часлава націснула на спуск. Бляклы агонь ірвануўся з аўтаматнага ствала, і яна кінула гэты агонь на афіцэра, які распіхваў локцямі лазнякі ля зямлі, потым секанула па Багдану і паліцэйскаму. Дакладней, яна меціла ў паліцэйскага, але той крутнуўся следам за афіцэрам і як бы піхнуў Багдана пад бляклы агонь з аўтаматнага ствала, і яна закрычала нешта незразумелае, без сэнсу, як бы выкінула з сябе жмут адчаю, жаху і нянавісці, і павярнула агонь на афіцэра, які быццам прыклеіўся да плашч-палаткі і ўсё яшчэ не мог саўладаць з кабурай парабелума, і зноў кінула бляклы агонь назад, на лазнякі, ля якіх, дзіўна выгнуўшыся, асядалі, як бы злітыя ў адно, постаці, зноў павяла ствалом у бок плашч-палаткі — меціла ў плечы афіцэра, які паваліўся наўзніч, закрыўшы галавой палову вогнішча.

Аўтамат аціх раптоўна, і яна, не адразу паверыўшы, што скончыліся патроны, сунула палец у вузкую прорэзь дыска, намацала планку пружыны, якая мякка падалася, западаючы ўглыб. І гэты рух нежывога металу, і тое — яна з жахам убачыла! — як звіваюцца, бяруцца дымам на вуголлі вогнішча валасы забітага афіцэра, апаломілі яе. Часлава падалася назад, зрабіла адзін, другі крок і гэтак дайшла да вады, кінула аўтамат у карму і, адпіхнуўшы човен ад берага, звалілася на цёплае, угрэтае і высмаленае сонцам драўлянае, чорнае ад старога вару днішча...

**Савіцкі А.**

С 13 Памерці заўсёды паспееш: Раман.— Мн.: Маст. літ., 1983.— 343 с.

У пер.: 1 р. 70 к.

Раман — заключная, трэцяя, кніга пісьменніка, у якой паказана шырокая панарама партызанскага руху ў рэспубліцы ў гады Вялікай Айчыннай вайны.

Калі ў раманах «Верай і праўдай» і «Літасці не чакай» паказваюцца пачатак і разгар барацьбы народных мсціўцаў з ворагам, то ў рамане «Памерці заўсёды паспееш» аўтар прыводзіць сваіх герояў да заключных баёў, да дзён вызвалення нашай зямлі ад фашысцкай навалы...

С $\frac{4702120200-097}{М302(05)-83}$ 25—83

ББК 84Бел7

Бел2

**Александр Ануфриевич Савицкий**

**УМЕРЕТЬ ВСЕГДА УСПЕЕШЬ**

Роман

Минск, издательство «Мастацкая літаратура»

На белорусском языке

Рэдактары М. М. Ваданосаў, І. І. Кагановіч. Мастацкі рэдактар М. Я. Янчук. Тэхнічны рэдактар Л. М. Шлапо. Карэктар Л. П. Бялова.

ІБ № 1487

Здадзена ў набор 03.09.82. Падп. да друку 25.05.83. АТ 12046. Фармат 84×108¹/₃₂. Папера друк. № 1. Гарнітура звычайная новая. Высокі друк. Ум. друк. арк. 18,06. Ум. фарб.-адб. 18,06. Ул.-выд. арк. 21,63. Тыраж 12 000 экз. Зак. 2951. Цана 1 р. 70 к.

Выдавецтва «Мастацкая літаратура» Дзяржаўнага камітэта БССР па справах выдавецтваў, паліграфіі і кніжнага гандлю. 220600, Мінск, праспект Машэрава, 11.

Мінскі ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга паліграфкамбінат МВПА імя Я. Коласа. 220005, Мінск, Чырвоная, 23.